ARCHE Зьмест № 4’2001 СКАРЫНА

1. Зьмест / Уводзіны
2. Выбары прэзыдэнта крэолаў. Валерка Булгакаў у ARCHE 4(18)-2001. "...Выйгралі ўсе. Нават тыя, хто прайграў, адчулі сваю рэальную вагу і палітычную глебу, зразумелі, што зь імі лічацца і будуць лічыцца, што ад сёньняшняй паразы пачынаецца шлях да будучых перамогаў..."
3. Выбары прэзыдэнта крэолаў. Валерка Булгакаў у ARCHE 4(18)-2001. "...Выйгралі ўсе. Нават тыя, хто прайграў, адчулі сваю рэальную вагу і палітычную глебу, зразумелі, што зь імі лічацца і будуць лічыцца, што ад сёньняшняй паразы пачынаецца шлях да будучых перамогаў..."
4. Пасткі на хайвэі постмадэрнізму. Даніла Жукоўскі ў ARCHE 4(18)-2001. "...Нашы экстрэмісты пераканаыя ў немагчымасці ўласнае перамогі. Гэта надае ім смеласць то Пушкіна назваць “някепскім паэтам”, то выкласці ў газеце думкі пра інтымнае жыццё калегі, то даць палітычны прагноз, які не мае дачынення да рэальнасці, але спраўна працуе на ненавіснікаў Беларусі..."
5. Пасткі на хайвэі постмадэрнізму. Даніла Жукоўскі ў ARCHE 4(18)-2001. "...Нашы экстрэмісты пераканаыя ў немагчымасці ўласнае перамогі. Гэта надае ім смеласць то Пушкіна назваць “някепскім паэтам”, то выкласці ў газеце думкі пра інтымнае жыццё калегі, то даць палітычны прагноз, які не мае дачынення да рэальнасці, але спраўна працуе на ненавіснікаў Беларусі..."
6. Да гішпанскага сябра. Анатоль Сідарэвіч ў ARCHE 4(18)-2001. "...Дарагі Мігель, я ўхваляю Тваё жаданьне вывучыць гісторыю беларускае літаратуры і магу толькі разьвесьці рукамі ў адказ на Тваё пытаньне: а што чытаць?.."
7. Да гішпанскага сябра. Анатоль Сідарэвіч ў ARCHE 4(18)-2001. "...Дарагі Мігель, я ўхваляю Тваё жаданьне вывучыць гісторыю беларускае літаратуры і магу толькі разьвесьці рукамі ў адказ на Тваё пытаньне: а што чытаць?.."

8. Аляксандр Лукашэнка і беларусы ў люстэрку анекдотаў. Амандзіна Рэгамэ ў ARCHE 4(18)-2001. "...Сексуальная прыгажуня ў жарце — ніхто іншы, як прэзідэнтава каханка, бо “ўсе ж ведаюць”, што жонка Лукашэнкі..."
9. Аляксандр Лукашэнка і беларусы ў люстэрку анекдотаў. Амандзіна Рэгамэ ў ARCHE 4(18)-2001. "...Сексуальная прыгажуня ў жарце — ніхто іншы, як прэзідэнтава каханка, бо “ўсе ж ведаюць”, што жонка Лукашэнкі..."
10. Ці належыць Расія да Эўропы? Ален Бэзансон: палеміка з Марціном Малем ў ARCHE 4(18)-2001. "...Асноўны тэзыс гучыць так: не існуе нічога, што можна назваць існасьцю Расіі, альбо, як кажуць, “Вечнай Русьсю”. Нельга гаварыць таксама пра канчальны й анталягічны саюз Расіі з..."
11. Ці належыць Расія да Эўропы? Ален Бэзансон: палеміка з Марціном Малем ў ARCHE 4(18)-2001. "...Асноўны тэзыс гучыць так: не існуе нічога, што можна назваць існасьцю Расіі, альбо, як кажуць, “Вечнай Русьсю”. Нельга гаварыць таксама пра канчальны й анталягічны саюз Расіі з..."
12. Адказ на эсэ Алена Бэзансона. Марцін Маль у ARCHE 4(18)-2001. "...Ален Бэзансон падрыхтаваў ідэальнае рэзюмэ — такое, пасьля якога карціць прачытаць саму кнігу. Увадначас, аналіз майго сябра нямала зьбянтэжыў мяне, бо я не да канца разумею, у якім кірунку разьвіваецца ягоная думка..."
13. Адказ на эсэ Алена Бэзансона. Марцін Маль у ARCHE 4(18)-2001. "...Ален Бэзансон падрыхтаваў ідэальнае рэзюмэ — такое, пасьля якога карціць прачытаць саму кнігу. Увадначас, аналіз майго сябра нямала зьбянтэжыў мяне, бо я не да канца разумею, у якім кірунку разьвіваецца ягоная думка..."
14. Палітыка vs Гісторыя між Усходам і Захадам. Даніэль Бавуа ў ARCHE 4(18)-2001. "...Некаторыя даўнейшыя пэрыяды, якімі тэарэтычна нішто не перашкаджае займацца ў новых палітычных умовах, дагэтуль застаюцца недасьледаванымі з палітычна-нацыянальных прычынаў. Расея й Украіна так і не наважыліся цалкам высьветліць усе чорныя плямы сваёй гісторыі..."
15. Палітыка vs Гісторыя між Усходам і Захадам. Даніэль Бавуа ў ARCHE 4(18)-2001. "...Некаторыя даўнейшыя пэрыяды, якімі тэарэтычна нішто не перашкаджае

займацца ў новых палітычных умовах, дагэтуль застаюцца недасьледаванымі з палітычна-нацыянальных прычынаў. Расея й Украіна так і не наважыліся цалкам высьветліць усе чорныя плямы сваёй гісторыі..."

16. Летаргія беларускай лінгвістыкі. Юлія Канцэвіч, Сяргей Сматрычэнка ў ARCHE 4(18)-2001. "...Увогуле, кніжка вельмі павучальная. Па яе прачытанні мы ў чарговы раз пераканаліся ў слушнасці правіла, што ўсё добра ў свой час..."
17. Летаргія беларускай лінгвістыкі. Юлія Канцэвіч, Сяргей Сматрычэнка ў ARCHE 4(18)-2001. "...Увогуле, кніжка вельмі павучальная. Па яе прачытанні мы ў чарговы раз пераканаліся ў слушнасці правіла, што ўсё добра ў свой час..."
18. Крыху пра нашы нацыянальныя рысы. Валеры Пазьнякоў ў ARCHE 4(18)-2001. "…Трэба памятаць, што архітэктура — гэта яшчэ і від мастацтва. Магчыма, калі б за тэму “Нацыяналныя рысы беларускай архітэктуры” ўзяўся мастацтвазнаўца, ён раскрыў бы яе інакш..."
19. Крыху пра нашы нацыянальныя рысы. Валеры Пазьнякоў ў ARCHE 4(18)-2001. "…Трэба памятаць, што архітэктура — гэта яшчэ і від мастацтва. Магчыма, калі б за тэму “Нацыяналныя рысы беларускай архітэктуры” ўзяўся мастацтвазнаўца, ён раскрыў бы яе інакш..."
20. Аўтарытарныя культуры. Віржынія Шыманец ў ARCHE 4(18)-2001. "...Трэба таксама зразумець, чым было паняцце культуры ў краіне з аўтарытарным рэжымам, які часткова апраўдвае насілле культурнымі традыцыямі. Мы ведаем, што аўтарытарныя лідэры ў сваіх дыскурсах зацікаўленыя вызначаць культуру як застылую, нерухомую суцэльнасць..."
21. Аўтарытарныя культуры. Віржынія Шыманец ў ARCHE 4(18)-2001. "...Трэба таксама зразумець, чым было паняцце культуры ў краіне з аўтарытарным рэжымам, які часткова апраўдвае насілле культурнымі традыцыямі. Мы ведаем, што аўтарытарныя лідэры ў сваіх дыскурсах зацікаўленыя вызначаць культуру як застылую, нерухомую суцэльнасць..."
22. Вершы Алеся Аркуша ў ARCHE 4(18)-2001. "...Сярод чаратоў / схавалася маленькае гнязьдзечка / з адным

яечкам / з іголкаю зачараванай..."
23. Вершы Алеся Аркуша ў ARCHE 4(18)-2001. "...Сярод чаратоў / схавалася маленькае гнязьдзечка / з адным яечкам / з іголкаю зачараванай..."
24. Філязофія самадастатковасьці. Барыс Ляпешка, рэдакцыя ARCHE. Палеміка ў ARCHE 4(18)-2001. "...Няма чаго чакаць, што з дня на дзень на нас пральецца жыцьцядайны дождж у выглядзе эпахальных канцэпцыяў, адпаведных тэорыяў і поглядаў. Такога кшталту рэчы — маю на ўвазе, ведама, ідэалёгію — нацыя мусіць выпакутаваць, а не атрымаць у гатовым выглядзе. І відавочна, што ў гэтым сэнсе ні “Масква”, ні “Захад” нам не памочнікі...“ — „...“Нашае “славянафільства” і “заходніцтва” ёсьць карыкатурай на сапраўды глыбокія і зьмястоўна насычаныя арыгінальныя ідэйныя плыні”, — сьцьвярджае Барыс Ляпешка, і, відаць, сам не адчувае, наколькі ён мае рацыю..."
25. Філязофія самадастатковасьці. Барыс Ляпешка, рэдакцыя ARCHE. Палеміка ў ARCHE 4(18)-2001. "...Няма чаго чакаць, што з дня на дзень на нас пральецца жыцьцядайны дождж у выглядзе эпахальных канцэпцыяў, адпаведных тэорыяў і поглядаў. Такога кшталту рэчы — маю на ўвазе, ведама, ідэалёгію — нацыя мусіць выпакутаваць, а не атрымаць у гатовым выглядзе. І відавочна, што ў гэтым сэнсе ні “Масква”, ні “Захад” нам не памочнікі...“ — „...“Нашае “славянафільства” і “заходніцтва” ёсьць карыкатурай на сапраўды глыбокія і зьмястоўна насычаныя арыгінальныя ідэйныя плыні”, — сьцьвярджае Барыс Ляпешка, і, відаць, сам не адчувае, наколькі ён мае рацыю..."
26. Філязофія самадастатковасьці. Барыс Ляпешка, рэдакцыя ARCHE. Палеміка ў ARCHE 4(18)-2001. "...Няма чаго чакаць, што з дня на дзень на нас пральецца жыцьцядайны дождж у выглядзе эпахальных канцэпцыяў, адпаведных тэорыяў і поглядаў. Такога кшталту рэчы — маю на ўвазе, ведама, ідэалёгію — нацыя мусіць выпакутаваць, а не атрымаць у гатовым выглядзе. І відавочна, што ў гэтым сэнсе ні “Масква”, ні “Захад” нам не памочнікі...“ — „...“Нашае “славянафільства” і “заходніцтва” ёсьць карыкатурай на сапраўды глыбокія і

зьмястоўна насычаныя арыгінальныя ідэйныя плыні”, — сьцьвярджае Барыс Ляпешка, і, відаць, сам не адчувае, наколькі ён мае рацыю..."

27. Кнігі — Рэакцыі: Сны Ігара Бабкова, запісаныя Францішкам Эн. Леанід Галубовіч у ARCHE 4(18)-2001. "…"
28. Кнігі — Рэакцыі: Проза для няўдачнікаў. Павал Абрамовіч у ARCHE 4(18)-2001. "...Увесь час Станкевіч даследуе адну і тую ж тэму — лёс беларускай нацыі. І кожны раз, з маніякальнай паслядоўнасцю, ён ставіць дыягназ: выраджэнне..."
29. Кнігі — Рэакцыі: Зьбіральнік жахаў. Генадзь Туровіч у ARCHE 4(18)-2001. "...Зразумела, чаму прозай Дастаеўскага захапляюцца на Захадзе, чаму Мэрылін Манро гэтак марыла выканаць ролю Грушанькі з “Братоў Карамазавых”. Людзі спрабуюць зьмяніць сьвет, і раз-пораз у іншых краёх гэта ім удаецца..."
30. Кнігі — Рэакцыі: Вырваны з агню. Уладзімер Сакалоўскі ў ARCHE 4(18)-2001. "…"

[image]

A R C H E **S k a r y n a** **№ 4 (18) – 2001**

[image]

[image]

[image]
[illegible][image]2001
аналітыка • эсэістыка • крытыка • рэцэнзіі
[image] [image] [image]

З ь м е с т

Валерка Булгакаў
Выбары прэзыдэнта крэолаў
„…Выйгралі ўсе. Нават тыя, хто прайграў, адчулі сваю рэальную вагу і палітычную глебу, зразумелі, што зь імі лічацца і будуць лічыцца, што ад сёньняшняй паразы пачынаецца шлях да будучых перамогаў…“ {далей}
Даніла Жукоўскі
Пасткі на хайвэі постмадэрнізму
„…Нашы экстрэмісты перакананыя ў немагчымасці ўласнае перамогі. Гэта надае ім смеласць то Пушкіна назваць “някепскім паэтам”, то выкласці ў газеце думкі пра інтымнае жыццё калегі, то даць палітычны прагноз, які не мае дачынення да рэальнасці, але спраўна працуе на ненавіснікаў Беларусі…“ {далей}
Анатоль Сідарэвіч
Да гішпанскага сябра
„…Дарагі Мігель, я ўхваляю Тваё жаданьне вывучыць гісторыю беларускае літаратуры і магу толькі разьвесьці рукамі ў адказ на Тваё пытаньне: а што чытаць?..“ {далей}
Амандзіна Рэгамэ
Аляксандр Лукашэнка і беларусы ў люстэрку анекдотаў
„…Сексуальная прыгажуня ў жарце — ніхто іншы, як прэзідэнтава каханка, бо “ўсе ж ведаюць”, што жонка Лукашэнкі…“ {далей}
Ален Бэзансон
Ці належыць Расія да Эўропы? (палеміка з Марціном Малем)

„…Асноўны тэзыс гучыць так: не існуе нічога, што можна назваць існасьцю Расіі, альбо, як кажуць, “Вечнай Русьсю”. Нельга гаварыць таксама пра канчальны й анталягічны саюз Расіі з…“ {далей}

Марцін Маля

Адказ на эсэ А. Бэзансона

„…Ален Бэзансон падрыхтаваў ідэальнае рэзюмэ — такое, пасьля якога карціць прачытаць саму кнігу. Увадначас, аналіз майго сябра нямала зьбянтэжыў мяне, бо я не да канца разумею, у якім кірунку разьвіваецца ягоная думка…“ {далей}

Даніэль Бавуа

Палітыка vs Гісторыя між Усходам і Захадам

„…Некаторыя даўнейшыя пэрыяды, якімі тэарэтычна нішто не перашкаджае займацца ў новых палітычных умовах, дагэтуль застаюцца недасьледаванымі з палітычна-нацыянальных прычынаў. Расея й Украіна так і не наважыліся цалкам высьветліць усе чорныя плямы сваёй гісторыі…“ {далей}

Сяргей Сматрычэнка, Юлія Канцэвіч

Летаргія беларускай лінгвістыкі

„…Увогуле, кніжка вельмі павучальная. Па яе прачытанні мы ў чарговы раз пераканаліся ў слушнасці правіла, што ўсё добра ў свой час…“ {далей}

Валеры Пазьнякоў

Крыху пра нашы нацыянальныя рысы

„…Трэба памятаць, што архітэктура — гэта яшчэ і від мастацтва. Магчыма, калі б за тэму “Нацыяналныя рысы беларускай архітэктуры” ўзяўся мастацтвазнаўца, ён раскрыў бы яе інакш…“ {далей}

Віржынія Шыманец

Аўтарытарныя культуры

„…Трэба таксама зразумець, чым было паняцце культуры ў краіне з аўтарытарным рэжымам, які часткова апраўдвае насілле культурнымі традыцыямі. Мы ведаем, што аўтарытарныя лідэры ў сваіх дыскурсах зацікаўленыя вызначаць культуру як застылую, нерухомую суцэльнасць…“ {далей}

Алесь Аркуш

Вершы

„…так так

з той самай славутай іголкай
у якой жыцьцё цмока захоўваецца…“ {далей}
Барыс Ляпешка

Філязофія самадастатковасьці (Палеміка)

„…Няма чаго чакаць, што з дня на дзень на нас пральецца жыцьцядайны дождж у выглядзе эпахальных канцэпцыяў, адпаведных тэорыяў і поглядаў. Такога кшталту рэчы — маю на ўвазе, ведама, ідэалёгію — нацыя мусіць выпакутаваць, а не атрымаць у гатовым выглядзе. І відавочна, што ў гэтым сэнсе ні “Масква”, ні “Захад” нам не памочнікі…“ {далей}
— рэдакцыя ARCHE

Ад рэдакцыі (Палеміка)

„…“Нашае “славянафільства” і “заходніцтва” ёсьць карыкатурай на сапраўды глыбокія і зьмястоўна насычаныя арыгінальныя ідэйныя плыні”, — сьцьвярджае Барыс Ляпешка, і, відаць, сам не адчувае, наколькі ён мае рацыю…“ {далей}
Кнігі — Рэакцыі

Леанід Галубовіч

Сны Ігара Бабкова, запісаныя Францішкам Эн

Павал Абрамовіч

Проза для няўдачнікаў

Генадзь Туровіч

Зьбіральнік жахаў

Уладзімер Сакалоўскі

Вырваны з агню

[image]
[image]

№ 4 (18) – 2001

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 04-08-2001

[image]

Валерка Булгакаў

Выбары прэзыдэнта крэолаў

Сёлетнія выбары прэзыдэнта выклікалі вялікае напружаньне і ўзрушэньне ў беларускіх масах. Цягам летніх месяцаў наконт іх вынікаў выказваліся самыя незвычайныя прагнозы. У дзеяньне былі прыведзеныя агромністыя людзкія і матэрыяльныя рэсурсы. У нейкі момант здалося, што 9 верасьня мы станем сьведкамі сьмяротнай сутычкі дзьвюх найважнейшых у краіне сілаў — сыстэмы ўлады і сыстэмы апазыцыі. Значэньне гэтай даты дружна падкрэсьлілі абодва палітычныя антаганісты. Дзейны прызыдэнт Лукашэнка — словамі *“...прэзыдэнцкія выбары — больш чым выбраньне таго ці іншага палітыка. Гэта — вызначэньне лёсу дзяржавы”*. Адзіны кандыдат дэмакратычных сілаў Уладзімер Ганчарык — параўнаньнем саміх выбараў зь бітвай паміж Дабром і Злом.

Аднак пасьля выбараў, з далейшае пэрспэктывы, здаецца, што маштаб гэтай падзеі быў моцна завышаны. Для лукашэнкаўцаў яна стала нагодай для яшчэ адной дэманстрацыі свайго

ВАЛЕРКА БУЛГАКАЎ галоўны рэдактар часопісе “ARCHE”, укладальнік зборніка “Быць (або ня быць) сярэднеэўрапейцам. Сучаснае польскае мысьленьне” (“Энцыклапедыкс”, 2000). Апошняя ягоная публікацыя ў часопісе — артыкул “Эканамічны нацыяналізм супраць культурнае экспансіі” (№3/2001).

палітычнага, адміністрацыйнага, ідэалягічнага і інш. патэнцыялу, для дэмакратычных сілаў — спробай павялічыць сваю грамадзкую вагу, утрываліць свае пазыцыі, стварыць надзейны падмурак для будучай барацьбы. Мы дапушчаем, што пасьля цьвярозай ацэнкі бягучага палітычнага моманту стратэгамі дэмакратычных сілаў ужо ня ставілася заданьне перамагчы за любы кошт. Яго заступіла ўсьведамленьне неабходнасьці дасягнуць “пазыцыйнай выгады”, г. зн. павялічыць сацыяльны засяг апазыцыі і праверыць дзеяздольнасьць яе цэнтральных і рэгіянальных структур ува ўмовах прэсінгу з боку дзяржавы. Вялікай перамогай апазыцыі ўяўляецца сам факт, што Ўладзімер Ганчарык з кіраўніка арганізацыі, якая яшчэ год таму *de facto* ішла на кампраміс з лукашэнкаўскай дзяржавай, стаў бескампрамісным апазыцыйным лідэрам, які ўжо ня мае шляху назад.

Выбарчая кампанія пакіне пазытыўны сьлед у калектыўнай памяці беларусаў. Як адна зь нячастых падзеяў агульнанацыянальнае цікавасьці, яна вастрынёй сюжэту і супярэчлівасьцю прыцягнула да сябе ўвагу ўсіх пластоў грамадзтва. І хоць яно ў каторы раз аказалася падзеленым ня проста сьветапоглядна, а культурна, тое, што беларускія грамадзяне некалькі месяцаў цалкам былі захоплены пэрыпэтыямі айчыннай палітыкі, нашмат важнейшае. Прэзыдэнцкія выбары прывучаюць людзей быць грамадзянамі ўласнай дзяржавы і тым самым фармуюць незалежніцкія настроі ў масах. Людзі пачынаюць ня толькі жыць, але і мысьліць у каардынатах незалежнай дзяржавы. Выбары канструююць рэальную палітычную гісторыю Беларусі і ствараюць неацэнны гарызонт досьведу, да якога будуць рэгулярна зьвяртацца ў далейшым.

Мінецца яшчэ крыху часу, і савецкая эпоха будзе на масавым узроўні ўспрымацца ўсяго толькі як перадгісторыя незалежнай Беларусі.

Выйгралі ўсе. Нават тыя, хто прайграў, адчулі сваю рэальную вагу і палітычную глебу, зразумелі, што зь імі лічацца і будуць лічыцца, што ад сёньняшняй паразы пачынаецца шлях да будучых перамогаў[1].

[1] Савецкія сэлекцыянэры за часоў

існаваньня СССР ператварылі беларускую культуру ў бясконца далёкае ад рэальнага грамадзтва “аранжарэйнае мастацтва”, а яе дзеячам, ладная часьціна якіх цяпер знаходзіцца ў апазыцыі да Лукашэнкі, забясьпечылі дэкаратыўнае існаваньне ў цяплічных варунках. Гэтаму прыйшоў канец разам зь перамогай Лукашэнкі на выбарах 1994 году, калі тэма беларускай культуры была сілком уцягнутая ў агрэсіўныя палітычныя гульні. Нярэдка здаецца, што апазыцыйнасьць некаторых цяперашніх

беларускіх
апазыцыянэраў
якраз і
тлумачыцца
гэтай тугой за
“згубленым
раем”, і каб жа
ім удалося
вярнуць
страчанае, то
ад іхнай
апазыцыйнасьці
не засталося б і
знаку. Агулам,
нельга
адназначна
сьцьвярджаць,
што за
Лукашэнкам
беларуская
культура
трапіла ў
горшыя
варункі, як за
савецкіх часоў.
Калі ў
далукашэнкаўскія
часы яна
няўхільна
выраджалася ў
закасьнелы
рытуал, то
эпоха
лукашызму
дала ёй шанец
нарэшце стаць
грамадзка
значнай
практыкай,
выпрацаваць

надзейныя мэханізмы адаптацыі да зьменлівай сацыяльна-палітычнай рэальнасьці і тым самым пацьвердзіць сваю жыцьцяздольнасьць.

Нацыянальная праблема на выбарах

Выбарчая кампанія стала яшчэ адным сьведчаньнем таго, што незалежнасьць і дзяржаўны сувэрэнітэт для бальшыні беларусаў — катэгорыя не культурная, а палітычная, што яны зьвязваюцца з рэалізацыяй палітычных, а не культурных правоў нацыі. Тыя палітычныя сілы, якія рабілі акцэнт на рэалізацыі культурных правоў, у 90-х гадах апыналіся ў меншасьці. Акурат таму нацыянальная праблема аказалася на гэтых выбарах на другім пляне.

Увага да нацыянальных сымбаляў была прытупленая як у лягеры лукашэнкаўцаў (што й ня дзіўна), так і ў лягеры дэмакратычных сілаў. Патлумачыць гэта можна прагматычным чыньнікам — сёлета галоўнае спаборніцтва паміж дзьвюма найбольш уплывовымі ў краіне палітычнымі сіламі разгарнулася за тую частку электарату, якая да апошняга не магла вызначыцца з сваім выбарам. Паводле розных падлікаў, гэтая частка складае 20—30 % ад усіх беларускіх выбарцаў. Яе аснова — расійскамоўныя, схільныя да навеяных культурнымі рэаліямі фрустрацый людзі, у якіх нацыянальныя сымбалі Беларусі так і не здабылі прызнаньня.

Ігнараваньне апазыцыяй нацыянальнае праблемы было значнай перамогай лукашэнкаўцаў: барацьба ішла на іхным полі і паводле іхнага сцэнару.

Сыстэма апазыцыі на выхадзе з выбараў

Напярэдадні выбараў правацэнтрысцкая апазыцыя не змагла

знайсьці поўнага паразуменьня з Захадам у абліччы Кансультацыйна-назіральнае групы АБСЭ ў Менску, рэгулярна разыходзячыся зь ёю ў стратэгічных і тактычных пытаньнях. Можа, заходнія назіральнікі некрытычна засвоілі спэкуляцыйныя меркаваньні менскіх расійскамоўных лібэральна настроеных інтэлектуалаў аб адчужэньні між рэальным беларускім грамадзтвам і беларускамоўнымі палітыкамі з выразна апазыцыйным і незалежніцкім іміджам? Адначасна выбары не прывялі да ўзбуйненьня беларускіх палітычных сілаў. Апазыцыя застаецца атамізаванаю, а "самотныя палітыкі" па-ранейшаму маюць, прынамсі, ня меншую палітычную вагу, чым лідэры партый. Плённа было б, каб дробныя палітычныя лідэры адракліся прыватных амбіцый і каб у Беларусі ўтварыліся некалькі супэрпартыяў, арыентаваных на розныя сацыяльныя групы, а ня ўсе прытном на патрыятычную інтэлігенцыю і сярэднюю клясу, як цяпер. Такая патрэба падаецца ўдвая пільнейшаю пасьля таго, як у пэўныя моманты перадвыбарнай гонкі партыйныя лідэры дэманстравалі больш зацікаўленасьці ў выжываньні сваіх партыйных структураў пасьля выбараў, чым у дасягненьні тактычных і стратэгічных мэтаў на гэтым этапе.

Узбуйненьне палітычных структур дэмакратычных сілаў Беларусі ўсё роўна адбудзецца ў агляднай будучыні, бо ў яго аснове ляжыць ня чыйсьці асабісты валюнтарызм, а аб'ектыўны мэханізм самарэгуляцыі палітычнага рынку. Нешта падобнае назіраецца ў эканоміцы: пасьля першаснага назапашваньня капіталу сярод мірыядаў дробных-драбнюсенькіх суб'ектаў гаспадараньня крышталізуюцца эканамічныя структуры большай вагі. Наява мноства партый сьведчыць пра неразьвітасьць палітычнага рынку краіны. Выйграе той, хто першы зразумее непазьбежнасьць узбуйненьня.

Новыя супэрпартыі маглі б узначаліць дэмакратычныя лідэры, якія сталі вядомыя грамадзтву дзякуючы сёлетняй прэзыдэнцкай кампаніі. Палітычную партыю, якая б выступала за сацыяльна арыентаваную рынкавую эканоміку, заваёўвала сымпатыі прамысловых работнікаў і службоўцаў дзяржаўнага апарату ("сацыял-дэмакратычную" ў эўрапейскай тэрміналёгіі), мог бы ачоліць фаварыт дэмсілаў Уладзімер Ганчарык або нехта зь ягонага выбарчага штабу (напрыклад, Валянціна Палевікова, якая мае досьвед партыйнага будаўніцтва). У сваю

чаргу, Сямён Домаш мог бы стаць на чале партыі, якая б вызнавала кансэрватыўныя вартасьці і пры гэтым выступала за лібэралізацыю ўсіх сфэраў жыцьця нашага грамадзтва. Далейшае самаакрэсьленьне “левага” і “правага” блёку дэмакратычных сілаў, безумоўна, пазытыўны вынік выбараў. Аднак само сабою гэта ніяк ня зьменшыць цяжару праблем, якія навісьлі над беларускімі партыямі дэмакратычнай арыентацыі. Канец гэтага году можа азначыцца крызысам у БНФ (ужо цяпер сярод часткі фронтаўцаў чуюцца галасы, што буйной памылкай кіраўніцтва гэтай арганізацыі было “невылучэньне” свайго кандыдата; маўляў, калі не на гэтых, дык на наступных выбарах ён мог бы мець добрыя пэрспэктывы), а таксама ў АГП. Яе лідэры ў асобе Анатоля Лябедзькі і Аляксандра Дабравольскага цяпер як ніколі блізкія да “Рэгіянальнай Беларусі” Сямёна Домаша. Увогуле, стала відавочна, што структуры “новага трэцяга сэктару” маюць большую палітычную вагу, чым усе партыі “апазыцыйнай арыентацыі” накшталт БНФ або АГП разам узятыя.

Чаму Ганчарык?

І Ганчарык, і Домаш сваім зьяўленьнем на палітычнай сцэне былі абавязаны структурам беларускага трэцяга сэктару. Толькі Ганчарык быў кандыдатам ад “савецка-постсавецкага” трэцяга сэктару, які ў агульных рысах сфармаваўся пры канцы існаваньня СССР і адносна пасьпяхова прыстасаваўся да ўмоваў незалежнай Беларусі, а Домаш — ад “новага незалежніцкага” трэцяга сэктару, які ўзьнік пасьля лістападаўскага канстытуцыйнага пераварота 1996 г. Гэтае адрозьненьне тлумачыць і памяркоўнасьць пазыцый Ганчарыка, і большую колькасьць подпісаў у сваю падтрымку, сабраную Домашам. Новы “трэці сэктар” болей а болей робіцца рэзэрвуарам чыстай апазыцыйнасьці, бо абсарбуе людзей, якія з тых ці іншых прычын адмаўляюцца ад супрацоўніцтва зь беларускім рэжымам. З гэтым, дарэчы, зьвязана адна далекасяжная слабасьць беларускага рэжыму. Пры дэмакратычным грамадзкім ладзе кіраўніцтва дзяржавы імкнецца па магчымасьці не выключаць сацыяльна рэлевантных індывідаў з працэсу рэпрадукцыі ўсяго грамадзтва. Тым часам за сем гадоў лукашэнкаўскага кіраваньня тысячы адукаваных, ахвотных

працаваць для дабра дзяржавы кадраў аказалася папросту лішнімі для сфармаванай канструкцыі ўлады. Большая частка іх, ня маючы іншага выйсьця, знайшла прытулак у інстытуцыях “новага трэцяга сэктару”.

У сваю чаргу, адток “палітычна нядобранадзейных” ува ўстановы “новага трэцяга сэктару” не вястуе нічога добрага і тым структурам, якія пэрсаніфікуе Ўладзімер Ганчарык. Будучы за савецкім часам зародкамі грамадзянскай супольнасьці пры аўтарытарнай палітычнай сыстэме, яны не далі рады ажыцьцявіць глыбокую аўтатрансфармацыю за дзесяць гадоў беларускай незалежнасьці. Таму яны ў многіх праявах функцыянуюць не як рэальныя, а як *сымбалічныя* сацыяльныя інстытуты.

Парадаксальна, але з гледзішча пэрспэктывы перамога лукашэнкаўскага рэжыму над прафсаюзнай імпэрыяй Ганчарыка будзе азначаць не падрыў жыцьцядзейнасьці дэмакратычных сілаў, а хутчэй прымусовую санацыю дэмакратычнага лягеру ад яго нежыцьцяздольных структурных элемэнтаў[2].

[2] Санацыя, або чыстка палітычнага поля ад яго нежыцьцяздольных суб’ектаў, таксама ў прынцыпе ёсьць пазытыўным наступствам сёлетніх выбараў.

Пры гэтым асабісты палітычны лёс Уладзімера Ганчарыка можа скласьціся

інакш, чым у Міхаіла Чыгіра або Зянона Пазьняка. Бо апошнім толькі цуд дапаможа застацца на першых ролях на беларускай палітычнай сцэне. У сваю чаргу, зьняцьцё Сямёна Домаша зь перадвыбарнай гонкі ў пэўнай ступені вывела з-пад удару структуры “новага трэцяга сэктару”, які дагэтуль знаходзіцца ў фазе станаўленьня і ня быў цалкам гатовы да змаганьня.

Выбар кандыдатуры Ўладзімера Ганчарыка ў якасьці адзінага кандыдата ад апазыцыі можна тлумачыць меркаваньнямі ня толькі “перадвыбарнага”, але і “пасьлявыбарнага” характару. Можна зь вялікай доляй пэўнасьці сьцьвярджаць, што пасьля перамогі беларускі рэжым захоча паквітацца зь “мяцежнай” Фэдэрацыяй прафсаюзаў беларускай і яе вышэйшым кіраўніцтвам. Але інстытуцыянальны канфлікт паміж дзяржапаратам і інтэгральным элемэнтам грамадзянскай супольнасьці, якім зьяўляюцца прафсаюзы, не абяцае быць лёгкім, а перамога лукашэнкаўцаў — беззасьцярожнай. У кожным разе, пры такім сцэнары разьвіцьця падзеяў

адказнасьць за дэстабілізацыю палітычнай сытуацыі ў Беларусі ўскладзецца на рэжым.

Гайдукевіч

Постаць гэтага “кандыдата ад трэцяй сілы” найбольш яскрава сьведчыць пра наяўны ва ўладаў патэнцыял для маніпуляцыі грамадзкай думкай. Былі ў абозе Лукашэнкі і іншыя псэўдакандыдаты, якіх адсеялі па дарозе. Гайдукевіч жа, за якім, паводле чутак, стаіць шэры бізнэс і крыміналізаваныя структуры, дайшоў да выбараў, каб аказаць пасільную падтрымку Лукашэнку на апошнім этапе кампаніі. Ні Машэрава, ні Сініцын, ні Марыніч такога посьпеху дабіцца ня здолелі. А Гайдукевіч дабіўся, бо зьяўленьне яго прозьвішча ў выбарчых бюлетэнях выглядала найбольш праўдападобна. Фактычна, вынікі збору подпісаў за кандыдатаў паказалі, што ў краіне маюцца чатыры рэальныя палітычныя сілы. Тры зь іх досыць стабільныя: посткаляніяльны адміністрацыйна-гаспадарчы апарат, стаўленік кланаў якога — Лукашэнка (395 тыс. подпісаў), незалежнае беларускае грамадзтва (Домаш, 161 тыс. подпісаў), шэры бізнэс, цесна зьвязаны з карумпаванай часткай дзяржаўнага апарату (Гайдукевіч, 136 тыс. подпісаў). Чацьвертая ж — гэта ўтвораны бягучай каньюнктурай хісткаваты альянс расчараванай у палітыцы Лукашэнкі намэнклятуры, прыватнага бізнэсу, “старога трэцяга сэктару”, а таксама той часткі дзяржаўных службоўцаў, інтарэсы якіх палітыка Лукашэнкі ставіла пад пагрозу. Уладзімер Ганчарык сабраў 123 тыс., але цяжка прадказаць доўгатрываласьць гэтага палітычнага хаўрусу. У той жа час пэрспэктывы росту палітычнае вагі незалежнага беларускага грамадзтва, і Домаша як палітыка ў прыватнасьці, залежаць ад таго, наколькі чуйна змогуць яны працаваць з падмуркамі гэтае чацьвертае сілы. Наяўнасьць сярод гэтых чатырох сілаў “шэрага бізнэсу” ня можа не трывожыць, асабліва напярэдадні непазьбежнае лібэралізацыі эканомікі, прыватызацыі часткі дзяржаўнае ўласнасьці і агрэсіўнага напору расійскага капіталу.

Мабілізацыйная кампанія

Галоўная мэта сёлетняй мабілізацыйнай кампаніі дэмсілаў

палягала ня столькі ў вывадзе беларускіх выбарцаў на ўчасткі — яны і без таго дэманстравалі высокую ступень гатоўнасьці ўзяць удзел у вырашэньні лёсу краіны, колькі ў дэманстрацыі схаванага патэнцыялу дэмакратычных арганізацый (неправамерна ставіць пытаньне, адлюстравала мабілізацыйная кампанія разьвітасьць ці неразьвітасьць палітычнай культуры лідэраў і шараговых прыхільнікаў апазыцыйнага руху). Мабілізацыйная кампанія была абмежаванаю і не вылучала перад сабой колькі-небудзь прэтэнцыёзных заданьняў. Стаўка, як пры савецкай ваенізаванай юнацкай гульні “Зарніца”, была зроблена перадусім на гульнёвыя віды дзейнасьці — расклейку налепак і ўлётак, выраб і нашэньне маечак з нанесенымі на іх дэмакратычнымі заклікамі, лякальныя паводле сацыяльнага рэзанансу і колькасьці ўдзельнікаў акцыі грамадзкага непадпарадкаваньня, пэрформансы і канцэрты, прабегі на роварах, паходы і падарожжы на платох. Наша апазыцыя маладая, што й гаварыць!.. Такі характар мабілізацыйнай кампаніі сьведчыць і пра тое, што стратэгі дэмакратычных сілаў, шмат высілкаў паклаўшы на стварэньне беларускага рэжыму іміджу “жорсткай пэрсаналісцкай дыктатурай”, нарэшце самі паверылі ў гэта. Акцэнт на кантактнай працы з выбарцамі не рабіўся.

Пазытыўны вынік мабілізацыйнае кампаніі — выяўленьне новых імёнаў, уцягненьне новых людзей у палітычную барацьбу. Асноўнае адрозьненьне мабілізацыйнай кампаніі беларускіх дэмсілаў ад яе клясычных першаўзораў палягае ў тым, што звычайна да яе рэалізацыі прыцягваюцца сілы, якія маюць пазытыўнае сацыяльнае аблічча, тады як у Беларусі гэтая кампанія праводзілася рэсурсам апазыцыйных асяродкаў (перш за ўсё маладзёвых), характар дзейнасьці якіх у варунках беларускага палітычнага рэжыму, як правіла, малавядомы ўсяму беларускаму грамадзтву, а калі і вядомы, дык перадусім у тэндэнцыйным асьвятленьні дзяржаўных СМІ. У выніку кампанія займела ў вачох некаторых беларусаў вобраз маштабнай апазыцыйнай акцыі, якая спрыяе канфрантацыі, а не кансалідацыі грамадзтва. Гэта не магло не адбіцца нэгатыўна на папулярнасьці апазыцыйнага кандыдата.

У любым разе за пяць гадоў грамадзтва падыдзе да новых выбараў з істотна лепшым досьведам падрыхтоўкі і да мабілізацыйнай кампаніі, і да назіраньня за выбарамі.

Лукашэнка і лукашэнкаўцы

Актыўна выкарыстоўваючы савецкі сымбалічны капітал цягам сваёй першай кадэнцыі, Лукашэнка сам падсёк сук, на якім сядзіць. Нельга не канстатаваць, што пасьля такога частага ўжываньня-злоўжываньня Лукашэнкам і лукашэнкаўцамі ўкарэненыя савецкія міты ў масавай сьвядомасьці губляюць сваю прыцягальную сілу, а агрэсіўна-ксэнафобская рыторыка не знаходзіць былога пачуцьцёвага водгуку. Атаесамленьне сучасных адраджэнцаў зь нямецкімі паліцаямі-халуямі, а дэмакратычных лідэраў з прадажнымі юдамі паціху становіцца знакам благога густу.

Дзякуючы гэтаму дэфіцыту выяўленчых сродкаў на працягу наступных пяцёх гадоў мы напэўна станем сьведкамі асваеньня Лукашэнкам і яго кадрамі новых тэматычных гарызонтаў. Хоцькі-няхоцькі яму ўсё часьцей давядзецца зьвяртацца да фігуры незалежнай Беларусі, яе нацыянальных і геапалітычных інтарэсаў.

Савецкая міталёгія губляе вартасьць на беларускім палітычным рынку. Адчуваючы дэвальвацыю гэтай вартасьці, Лукашэнка ўжо ў сваёй цяперашняй перадвыбарнай праграме паабяцаў маштабную эканамічную лібэралізацыю (чаго варты толькі пасаж “колькасьць ліцэнзаваных відаў дзейнасьці будзе скарочана да 10—12”), згортваньне кантрольнага апарату дзяржавы.

Дарэчы, адным зь нешматлікіх аб’ектыўных дасягненьняў лукашэнкаўскай сямігодкі трэба прызнаць узмацненьне гэтай кантралюючай функцыі дзяржавы. З пункту гледжаньня простага беларуса крызыс беларускай дзяржавы адразу пасьля набыцьця незалежнасьці тлумачыўся ня тым, што яна была недастаткова беларуская. Для звычайных людзей ён меў два вымеры — першы заключаўся ў рэзкім зьняшэньні яе адміністрацыйнай эфэктыўнасьці, другі датычыў слабасьці яе кантралюючага патэнцыялу. Адміністрацыйнай эфэктыўнасьці пры недэмакратычным, аўтарытарным дзяржаўным ладзе дасягчы ў прынцыпе немагчыма, тымчасам як пазытыўныя зрухі ўва ўзмацненьні кантралюючай функцыі дзяржавы навідавоку і сустракаюць пазытыўны сацыяльны водгук. Можна будзе толькі пашкадаваць, калі беларуская дзяржава паддасца

націску сілаў карупцыі і аслабіць увагу да сваіх кантралюючых функцыяў.

На самым конадні выбараў Лукашэнка даслаў “Вітаньне дэлегатам афіцэрскага сходу ўзброеных сілаў Рэспублікі Беларусі”, у якім неаднакроць падкрэсьліў непарушнасьць нацыянальнае незалежнасьці: *“Рэспубліка Беларусь была, ёсьць і будзе сувэрэннай, незалежнай эўрапейскай дзяржавай... Нашы ўзброеныя сілы ёсьць вытварам беларускага народу і яго нацыянальнай гордасьцю” [3].*

[3] Правядзеньне перад выбарамі найбольшых у гісторыі Беларусі вайсковых вучэньняў “Нёман-2001”, падчас якіх “чырвоныя” пад асабістым кіраўніцтвам Лукашэнкі перамаглі “сініх”, а заразом зьнішчылі 79 умоўных самалётаў і 13 умоўных крылатых ракет праціўніка, таксама мела незалежніцкі падтэкст, бо ў іх дэманстратыўна ўзялі ўдзел толькі часткі беларускага войска, у

адсутнасьць
“саюзных”
расійскіх.
Больш за тое,
дзяржаўныя
СМІ дружна
разрэклямавалі
факт, што
супрацьпаветраныя
комплексы,
ужытыя падчас
вучэньняў, былі
ня толькі
выраблены, але
і распрацаваныя
ў Беларусі.

Фактычна, ужо
цяпер беларускі
прэзыдэнт узяў
на ўзбраеньне
рыторыку
нацыянальна-
дэмакратычных
сілаў, якой тыя
паслугоўваліся
ў пэрыяд
набыцьця
Беларусяй
незалежнасьці.
Тую самую
рыторыку ў
характэрнай
для яго
абсурднай
манеры
падхапіла
постчыкінскае
БТ. У. Ганчарык

быў ім абвінавачаны ў *“заігрываньні з Расіяй”*, што нібыта нясе пагрозу нацыянальнай незалежнасьці. Вядома, гэткая рыторыка мела на мэце найперш узбудзіць недавер да Ў. Ганчарыка з боку нацыянал-дэмакратычнага электарату, але яна ёсьць паказальнаю і з гледзішча разрастаньня незалежніцкага дыскурсу.

Трэба чакаць, што цягам найбліжэйшых гадоў тэма беларуска-расійскай інтэграцыі будзе з фактару вонкавай палітыкі Беларусі больш а больш ператварацца ў фактар унутранай палітыкі. Ужо цяпер яна адкрыта выкарыстоўваецца для мабілізацыі прыхільнікаў сёньняшняга палітычнага курсу ў патрэбны палітычны момант.
Выбары таксама паказалі, што дэмакратычныя сілы недаацэньваюць інтэлектуальны патэнцыял лукашэнкаўцаў. Нягледзячы на выкрыцьці ў справах зьніклых (забітых?) палітыкаў і прадпрымальнікаў, мэдыйныя скандалы з удзелам перакінчыкаў з лукашэнкаўскага лягеру, цягам перадвыбарнага маратону ўвесь час складалася ўражаньне, што дэмакраты так ня здолелі перахапіць у лукашэнкаўцаў ініцыятыву. Тым удавалася ўсё задуманае — дабіцца нэўтралітэту новапаўсталых бізнэс-элітаў, заручыцца падтрымкай Расіі і

іншых краінаў СНД, разрэклямаваць у СМІ эканамічны ўздым, укідваньнем тузіну псэўдакандыдатаў зьбіць з панталыку незалежныя СМІ, адных падкупіць, другіх падмануць. Карацей, усё, што ўдалося пару гадоў раней іхным расійскім, украінскім, казахскім калегам.
Недаацэнка “мазгавога цэнтру” лукашэнкаўцаў, што пад уплывам нацыяналізуючага менскага асяродзьдзя дасягнуў значнай самастойнасьці ў прыняцьці рашэньняў, а значыць і здольнасьці адэкватна рэагаваць на выклікі часу і непаўторныя рэаліі постсавецкай Беларусі, сьведчыць пра завышаную самаацэнку шмат якіх лідэраў дэмсілаў і адсутнасьць у іх рэальнага ўяўленьня пра цяперашні дзяржаўны апарат. Ягонае функцыянаваньне падчас перадвыбарнай кампаніі паказала моц бюракратычнае сыстэмы, умацаванае Лукашэнкам.

Нацыяналізуючы ўплыў менскага асяродзьдзя
Лукашэнка ўзору 2001 году — гэта не Лукашэнка ўзору году 1994-га. Менскае асяродзьдзе, у якім ён круціцца вось ужо дзесяць гадоў, моцна на яго паўплывала. Новая беларуская ідэнтычнасьць і яе крэольскія дэфармацыі ў сталіцы ўмацаваліся непараўнальна лепш, чым ува ўсходніх рэгіёнах краіны.
Стойкі лукашэнкаўскі электарат — гэта крэалізаваная частка беларускага грамадзтва. Выбары пацьвердзілі статус Лукашэнкі як прэзыдэнта ўсіх беларускіх крэолаў. У беларускім кантэксьце з крэоламі ня варта атаясамліваць толькі этнічных беларусаў, якія дагэтуль не набылі акрэсьленай нацыянальнай ідэнтычнасьці. Трэба падысьці шырэй: крэолы — носьбіты ідэнтычнасьці, сфармаванай яшчэ за часоў данацыянальнага грамадзтва. Юры Сівакоў, Урал Латыпаў і Аляксандар Лукашэнка ў гэтым сэнсе мала розьняцца.
Расійска- і піджынамоўныя крэолы з пашпартамі грамадзян Рэспублікі Беларусі непазьбежна ўтвараюць асноўны рэсурс для рэпрадукцыі палітычнага рэжыму, створанага Лукашэнкам. Дзякуючы сваёй культурнай непаўнавартасьці і выніку гэтага — псыхалягічнай няўстойлівасьці, яны асабліва чуйныя на ідэалягічную індактрынацыю і іншыя маніпуляцыі з палітычнымі мэтамі. Толькі крэолы могуць забясьпечыць стварэньне такой канструкцыі ўлады, якая магла б утрымацца

адносна вялікі гістарычны прамежак часу, дасягненьне “пераемнасьці ўлады”, пра што так марыць Лукашэнка. Лукашэнкаўскія рэфэрэндумы 1995 і 1996 гг., апрача тымчасовых палітычных эфэктаў, зьнялі ўсе абмежаваньні з рэпрадукцыі крэолаў у маштабе ўсяго грамадзтва, ператварыўшы тым самым гэтую рэпрадукцыю ў адну з найважнейшых мэтаў дзяржаўнай палітыкі[4].

[4] На працягу ўсёй сваёй прэзыдэнтуры Лукашэнка ў сваёй актыўнасьці рэгулярна выходзіў за рамкі бягучай неабходнасьці, г. зн. зьдзяйсьняў учынкі і праводзіў захады, якія немагчыма было патлумачыць простай палітычнай мэтазгоднасьцю — тыя самыя рэфэрэндумы. Гэтым Лукашэнка даваў знак беларускаму грамадзтву, што ён не зьвязаны нейкімі палітычнымі канвэнцыямі, а

жывіцца
запатрабаваньнямі
шараговага
беларускага
выбарца. Сваім
гіпэрбалізаваным
палітычным
валюнтарызмам
Лукашэнка
таксама ўсяляк
падкрэсьліваў
незапраграмаванасьць
сваёй перамогі
над Кебічам на
першых
прэзыдэнцкіх
выбарах і
дыстанцыю,
якая адасабляе
яго ад
палітыкаў і
стылю
кіраваньня
“кебічаўскай”
школы.

Зьнішчэньне амаль усіх прарасійскіх структур і выданьняў, якія вызнавалі прынцып дыяспарнасьці (сучасны разнавід імпэрскай дактрыны пра трыадзіны расійскі народ), падчас курыраванай Уладзімерам Замяталіным перарэгістрацыі партый і грамадзкіх аб’яднаньняў, выглядае яшчэ адной шматзначнай праявай гэтай палітыкі.

Крэольская маса — ня столькі пагроза для дзяржаўнасьці Беларусі, чаго так баялася нацыянальная інтэлігенцыя, колькі зарука стабільнасьці і непарушнасьці аўтарытарызму.

Вядома, расійска-беларуская інтэграцыя для беларускіх крэолаў мае сымбалічнае значэньне. Яна забясьпечвае ім пазытыўны эмацыянальны тонус, стварае ілюзію супадзеньня іх пэрсанальных і дзяржаўных інтарэсаў. Для задавальненьня

гэтай ілюзіі і сам Лукашэнка працягвае трымаць у сваім атачэньні жменьку цьвердалобых русафілаў, такі сабе доказ прарасійскасьці палітычнага курсу беларускага рэжыму. Але пры гэтым сам Лукашэнка выдатна разумее: адчужэньне Беларусі і Расіі будзе нарастаць у меру ўмацаваньня новай расійскай нацыянальнай ідэнтычнасьці ці, прынамсі, новай ідэнтычнасьці грамадзянаў Расійскай Фэдэрацыі.
Як аўтарытарная дзяржава, Беларусь няздольная да інтэграцыі. Утварэньне стабільных супольных структур магчымае толькі пры дэмакратычным ладзе і на дэмакратычным грунце. Інтэграцыя ў рамках Эўразьвязу гэтаму прыклад. Аўтарытарная ж дзяржава выкарыстоўвае інтэграцыю для ўмацаваньня рэжыму, здабыцьця дадатковых рэсурсаў для ўнутранай кансалідацыі.
Крэолы не пагроза незалежнасьці найперш таму, што яны палітычна бязвольныя і імі лёгка маніпуляваць. З тае ж прычыны яны не нясуць пагрозы анахранічнаму палітычнаму рэжыму і ягонаму эксцэнтрычнаму кіраўніку.

[image]
[image]

№ 4 (18) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: **05-10-2001**
[image]

Валерка Булгакаў

Выбары прэзыдэнта крэолаў

Сёлетнія выбары прэзыдэнта выклікалі вялікае напружаньне і ўзрушэньне ў беларускіх масах. Цягам летніх месяцаў наконт іх вынікаў выказваліся самыя незвычайныя прагнозы. У дзеяньне былі прыведзеныя агромністыя людзкія і матэрыяльныя рэсурсы. У нейкі момант здалося, што 9 верасьня мы станем сьведкамі сьмяротнай сутычкі дзьвюх найважнейшых у краіне сілаў — сыстэмы ўлады і сыстэмы апазыцыі. Значэньне гэтай даты дружна падкрэсьлілі абодва палітычныя антаганісты. Дзейны прызыдэнт Лукашэнка — словамі *“...прэзыдэнцкія выбары — больш чым выбраньне таго ці іншага палітыка. Гэта — вызначэньне лёсу дзяржавы”*. Адзіны кандыдат дэмакратычных сілаў Уладзімер Ганчарык — параўнаньнем саміх выбараў зь бітвай паміж Дабром і Злом.

Аднак пасьля выбараў, з далейшае пэрспэктывы, здаецца, што маштаб гэтай падзеі быў моцна завышаны. Для лукашэнкаўцаў яна стала нагодай для яшчэ адной дэманстрацыі свайго

ВАЛЕРКА БУЛГАКАЎ галоўны рэдактар часопісе “ARCHE”, укладальнік зборніка “Быць (або ня быць) сярэднеэўрапейцам. Сучаснае польскае мысьленьне” (“Энцыклапедыкс”, 2000). Апошняя ягоная публікацыя ў часопісе — артыкул “Эканамічны нацыяналізм супраць культурнае экспансіі” (№3/2001).

палітычнага, адміністрацыйнага, ідэалягічнага і інш. патэнцыялу, для дэмакратычных сілаў — спробай павялічыць сваю грамадзкую вагу, утрываліць свае пазыцыі, стварыць надзейны падмурак для будучай барацьбы. Мы дапушчаем, што пасьля цьвярозай ацэнкі бягучага палітычнага моманту стратэгамі дэмакратычных сілаў ужо ня ставілася заданьне перамагчы за любы кошт. Яго заступіла ўсьведамленьне неабходнасьці дасягнуць “пазыцыйнай выгады”, г. зн. павялічыць сацыяльны засяг апазыцыі і праверыць дзеяздольнасьць яе цэнтральных і рэгіянальных структур ува ўмовах прэсінгу з боку дзяржавы. Вялікай перамогай апазыцыі ўяўляецца сам факт, што Ўладзімер Ганчарык з кіраўніка арганізацыі, якая яшчэ год таму *de facto* ішла на кампраміс з лукашэнкаўскай дзяржавай, стаў бескампрамісным апазыцыйным лідэрам, які ўжо ня мае шляху назад.

Выбарчая кампанія пакіне пазытыўны сьлед у калектыўнай памяці беларусаў. Як адна зь нячастых падзеяў агульнанацыянальнае цікавасьці, яна вастрынёй сюжэту і супярэчлівасьцю прыцягнула да сябе ўвагу ўсіх пластоў грамадзтва. І хоць яно ў каторы раз аказалася падзеленым ня проста сьветапоглядна, а культурна, тое, што беларускія грамадзяне некалькі месяцаў цалкам былі захоплены пэрыпэтыямі айчыннай палітыкі, нашмат важнейшае. Прэзыдэнцкія выбары прывучаюць людзей быць грамадзянамі ўласнай дзяржавы і тым самым фармуюць незалежніцкія настроі ў масах. Людзі пачынаюць ня толькі жыць, але і мысьліць у каардынатах незалежнай дзяржавы. Выбары канструююць рэальную палітычную гісторыю Беларусі і ствараюць неацэнны гарызонт досьведу, да якога будуць рэгулярна зьвяртацца ў далейшым.

Мінецца яшчэ крыху часу, і савецкая эпоха будзе на масавым узроўні ўспрымацца ўсяго толькі як перадгісторыя незалежнай Беларусі.

Выйгралі ўсе. Нават тыя, хто прайграў, адчулі сваю рэальную вагу і палітычную глебу, зразумелі, што зь імі лічацца і будуць лічыцца, што ад сёньняшняй паразы пачынаецца шлях да будучых перамогаў[1].

[1] Савецкія сэлекцыянэры за часоў

існаваньня СССР ператварылі беларускую культуру ў бясконца далёкае ад рэальнага грамадзтва “аранжарэйнае мастацтва”, а яе дзеячам, ладная часьціна якіх цяпер знаходзіцца ў апазыцыі да Лукашэнкі, забясьпечылі дэкаратыўнае існаваньне ў цяплічных варунках. Гэтаму прыйшоў канец разам зь перамогай Лукашэнкі на выбарах 1994 году, калі тэма беларускай культуры была сілком уцягнутая ў агрэсіўныя палітычныя гульні. Нярэдка здаецца, што апазыцыйнасьць некаторых цяперашніх

беларускіх
апазыцыянэраў
якраз і
тлумачыцца
гэтай тугой за
“згубленым
раем”, і каб жа
ім удалося
вярнуць
страчанае, то
ад іхнай
апазыцыйнасьці
не засталося б і
знаку. Агулам,
нельга
адназначна
сьцьвярджаць,
што за
Лукашэнкам
беларуская
культура
трапіла ў
горшыя
варункі, як за
савецкіх часоў.
Калі ў
далукашэнкаўскія
часы яна
няўхільна
выраджалася ў
закасьнелы
рытуал, то
эпоха
лукашызму
дала ёй шанец
нарэшце стаць
грамадзка
значнай
практыкай,
выпрацаваць

надзейныя мэханізмы адаптацыі да зьменлівай сацыяльна-палітычнай рэальнасьці і тым самым пацьвердзіць сваю жыцьцяздольнасьць.

Нацыянальная праблема на выбарах

Выбарчая кампанія стала яшчэ адным сьведчаньнем таго, што незалежнасьць і дзяржаўны сувэрэнітэт для бальшыні беларусаў — катэгорыя не культурная, а палітычная, што яны зьвязваюцца з рэалізацыяй палітычных, а не культурных правоў нацыі. Тыя палітычныя сілы, якія рабілі акцэнт на рэалізацыі культурных правоў, у 90-х гадах апыналіся ў меншасьці. Акурат таму нацыянальная праблема аказалася на гэтых выбарах на другім пляне.

Увага да нацыянальных сымбаляў была прытупленая як у лягеры лукашэнкаўцаў (што й ня дзіўна), так і ў лягеры дэмакратычных сілаў. Патлумачыць гэта можна прагматычным чыньнікам — сёлета галоўнае спаборніцтва паміж дзьвюма найбольш уплывовымі ў краіне палітычнымі сіламі разгарнулася за тую частку электарату, якая да апошняга не магла вызначыцца з сваім выбарам. Паводле розных падлікаў, гэтая частка складае 20—30 % ад усіх беларускіх выбарцаў. Яе аснова — расійскамоўныя, схільныя да навеяных культурнымі рэаліямі фрустрацый людзі, у якіх нацыянальныя сымбалі Беларусі так і не здабылі прызнаньня.

Ігнараваньне апазыцыяй нацыянальнае праблемы было значнай перамогай лукашэнкаўцаў: барацьба ішла на іхным полі і паводле іхнага сцэнару.

Сыстэма апазыцыі на выхадзе з выбараў

Напярэдадні выбараў правацэнтрысцкая апазыцыя не змагла

знайсьці поўнага паразуменьня з Захадам у абліччы Кансультацыйна-назіральнае групы АБСЭ ў Менску, рэгулярна разыходзячыся зь ёю ў стратэгічных і тактычных пытаньнях. Можа, заходнія назіральнікі некрытычна засвоілі спэкуляцыйныя меркаваньні менскіх расійскамоўных лібэральна настроеных інтэлектуалаў аб адчужэньні між рэальным беларускім грамадзтвам і беларускамоўнымі палітыкамі з выразна апазыцыйным і незалежніцкім іміджам? Адначасна выбары не прывялі да ўзбуйненьня беларускіх палітычных сілаў. Апазыцыя застаецца атамізаванаю, а "самотныя палітыкі" па-ранейшаму маюць, прынамсі, ня меншую палітычную вагу, чым лідэры партый. Плённа было б, каб дробныя палітычныя лідэры адракліся прыватных амбіцый і каб у Беларусі ўтварыліся некалькі супэрпартыяў, арыентаваных на розныя сацыяльныя групы, а ня ўсе прытном на патрыятычную інтэлігенцыю і сярэднюю клясу, як цяпер. Такая патрэба падаецца ўдвая пільнейшаю пасьля таго, як у пэўныя моманты перадвыбарнай гонкі партыйныя лідэры дэманстравалі больш зацікаўленасьці ў выжываньні сваіх партыйных структураў пасьля выбараў, чым у дасягненьні тактычных і стратэгічных мэтаў на гэтым этапе.

Узбуйненьне палітычных структур дэмакратычных сілаў Беларусі ўсё роўна адбудзецца ў агляднай будучыні, бо ў яго аснове ляжыць ня чыйсьці асабісты валюнтарызм, а аб'ектыўны мэханізм самарэгуляцыі палітычнага рынку. Нешта падобнае назіраецца ў эканоміцы: пасьля першаснага назапашваньня капіталу сярод мірыядаў дробных-драбнюсенькіх суб'ектаў гаспадараньня крышталізуюцца эканамічныя структуры большай вагі. Наява мноства партый сьведчыць пра неразьвітасьць палітычнага рынку краіны. Выйграе той, хто першы зразумее непазьбежнасьць узбуйненьня.

Новыя супэрпартыі маглі б узначаліць дэмакратычныя лідэры, якія сталі вядомыя грамадзтву дзякуючы сёлетняй прэзыдэнцкай кампаніі. Палітычную партыю, якая б выступала за сацыяльна арыентаваную рынкавую эканоміку, заваёўвала сымпатыі прамысловых работнікаў і службоўцаў дзяржаўнага апарату ("сацыял-дэмакратычную" ў эўрапейскай тэрміналёгіі), мог бы ачоліць фаварыт дэмсілаў Уладзімер Ганчарык або нехта зь ягонага выбарчага штабу (напрыклад, Валянціна Палевікова, якая мае досьвед партыйнага будаўніцтва). У сваю

чаргу, Сямён Домаш мог бы стаць на чале партыі, якая б вызнавала кансэрватыўныя вартасьці і пры гэтым выступала за лібэралізацыю ўсіх сфэраў жыцьця нашага грамадзтва. Далейшае самаакрэсьленьне “левага” і “правага” блёку дэмакратычных сілаў, безумоўна, пазытыўны вынік выбараў. Аднак само сабою гэта ніяк ня зьменшыць цяжару праблем, якія навісьлі над беларускімі партыямі дэмакратычнай арыентацыі. Канец гэтага году можа азначыцца крызысам у БНФ (ужо цяпер сярод часткі фронтаўцаў чуюцца галасы, што буйной памылкай кіраўніцтва гэтай арганізацыі было “невылучэньне” свайго кандыдата; маўляў, калі не на гэтых, дык на наступных выбарах ён мог бы мець добрыя пэрспэктывы), а таксама ў АГП. Яе лідэры ў асобе Анатоля Лябедзькі і Аляксандра Дабравольскага цяпер як ніколі блізкія да “Рэгіянальнай Беларусі” Сямёна Домаша. Увогуле, стала відавочна, што структуры “новага трэцяга сэктару” маюць большую палітычную вагу, чым усе партыі “апазыцыйнай арыентацыі” накшталт БНФ або АГП разам узятыя.

Чаму Ганчарык?

І Ганчарык, і Домаш сваім зьяўленьнем на палітычнай сцэне былі абавязаны структурам беларускага трэцяга сэктару. Толькі Ганчарык быў кандыдатам ад “савецка-постсавецкага” трэцяга сэктару, які ў агульных рысах сфармаваўся пры канцы існаваньня СССР і адносна пасьпяхова прыстасаваўся да ўмоваў незалежнай Беларусі, а Домаш — ад “новага незалежніцкага” трэцяга сэктару, які ўзьнік пасьля лістападаўскага канстытуцыйнага пераварота 1996 г. Гэтае адрозьненьне тлумачыць і памяркоўнасьць пазыцый Ганчарыка, і большую колькасьць подпісаў у сваю падтрымку, сабраную Домашам. Новы “трэці сэктар” болей а болей робіцца рэзэрвуарам чыстай апазыцыйнасьці, бо абсарбуе людзей, якія з тых ці іншых прычын адмаўляюцца ад супрацоўніцтва зь беларускім рэжымам. З гэтым, дарэчы, зьвязана адна далекасяжная слабасьць беларускага рэжыму. Пры дэмакратычным грамадзкім ладзе кіраўніцтва дзяржавы імкнецца па магчымасьці не выключаць сацыяльна рэлевантных індывідаў з працэсу рэпрадукцыі ўсяго грамадзтва. Тым часам за сем гадоў лукашэнкаўскага кіраваньня тысячы адукаваных, ахвотных

працаваць для дабра дзяржавы кадраў аказалася папросту лішнімі для сфармаванай канструкцыі ўлады. Большая частка іх, ня маючы іншага выйсьця, знайшла прытулак у інстытуцыях “новага трэцяга сэктару”.

У сваю чаргу, адток “палітычна нядобранадзейных” ува ўстановы “новага трэцяга сэктару” не вястуе нічога добрага і тым структурам, якія пэрсаніфікуе Ўладзімер Ганчарык. Будучы за савецкім часам зародкамі грамадзянскай супольнасьці пры аўтарытарнай палітычнай сыстэме, яны не далі рады ажыцьцявіць глыбокую аўтатрансфармацыю за дзесяць гадоў беларускай незалежнасьці. Таму яны ў многіх праявах функцыянуюць не як рэальныя, а як *сымбалічныя* сацыяльныя інстытуты.

Парадаксальна, але з гледзішча пэрспэктывы перамога лукашэнкаўскага рэжыму над прафсаюзнай імпэрыяй Ганчарыка будзе азначаць не падрыў жыцьцядзейнасьці дэмакратычных сілаў, а хутчэй прымусовую санацыю дэмакратычнага лягеру ад яго нежыцьцяздольных структурных элемэнтаў[2].

[2] Санацыя, або чыстка палітычнага поля ад яго нежыцьцяздольных суб’ектаў, таксама ў прынцыпе ёсьць пазытыўным наступствам сёлетніх выбараў.

Пры гэтым асабісты палітычны лёс Уладзімера Ганчарыка можа скласьціся

інакш, чым у Міхаіла Чыгіра або Зянона Пазьняка. Бо апошнім толькі цуд дапаможа застацца на першых ролях на беларускай палітычнай сцэне. У сваю чаргу, зьняцьцё Сямёна Домаша зь перадвыбарнай гонкі ў пэўнай ступені вывела з-пад удару структуры “новага трэцяга сэктару”, які дагэтуль знаходзіцца ў фазе станаўленьня і ня быў цалкам гатовы да змаганьня.

Выбар кандыдатуры Ўладзімера Ганчарыка ў якасьці адзінага кандыдата ад апазыцыі можна тлумачыць меркаваньнямі ня толькі “перадвыбарнага”, але і “пасьлявыбарнага” характару. Можна зь вялікай доляй пэўнасьці сьцьвярджаць, што пасьля перамогі беларускі рэжым захоча паквітацца зь “мяцежнай” Фэдэрацыяй прафсаюзаў беларускай і яе вышэйшым кіраўніцтвам. Але інстытуцыянальны канфлікт паміж дзяржапаратам і інтэгральным элемэнтам грамадзянскай супольнасьці, якім зьяўляюцца прафсаюзы, не абяцае быць лёгкім, а перамога лукашэнкаўцаў — беззасьцярожнай. У кожным разе, пры такім сцэнары разьвіцьця падзеяў

адказнасьць за дэстабілізацыю палітычнай сытуацыі ў Беларусі ўскладзецца на рэжым.

Гайдукевіч

Постаць гэтага “кандыдата ад трэцяй сілы” найбольш яскрава сьведчыць пра наяўны ва ўладаў патэнцыял для маніпуляцыі грамадзкай думкай. Былі ў абозе Лукашэнкі і іншыя псэўдакандыдаты, якіх адсеялі па дарозе. Гайдукевіч жа, за якім, паводле чутак, стаіць шэры бізнэс і крыміналізаваныя структуры, дайшоў да выбараў, каб аказаць пасільную падтрымку Лукашэнку на апошнім этапе кампаніі. Ні Машэрава, ні Сініцын, ні Марыніч такога посьпеху дабіцца ня здолелі. А Гайдукевіч дабіўся, бо зьяўленьне яго прозьвішча ў выбарчых бюлетэнях выглядала найбольш праўдападобна. Фактычна, вынікі збору подпісаў за кандыдатаў паказалі, што ў краіне маюцца чатыры рэальныя палітычныя сілы. Тры зь іх досыць стабільныя: посткаляніяльны адміністрацыйна-гаспадарчы апарат, стаўленік кланаў якога — Лукашэнка (395 тыс. подпісаў), незалежнае беларускае грамадзтва (Домаш, 161 тыс. подпісаў), шэры бізнэс, цесна зьвязаны з карумпаванай часткай дзяржаўнага апарату (Гайдукевіч, 136 тыс. подпісаў). Чацьвертая ж — гэта ўтвораны бягучай каньюнктурай хісткаваты альянс расчараванай у палітыцы Лукашэнкі намэнклятуры, прыватнага бізнэсу, “старога трэцяга сэктару”, а таксама той часткі дзяржаўных службоўцаў, інтарэсы якіх палітыка Лукашэнкі ставіла пад пагрозу. Уладзімер Ганчарык сабраў 123 тыс., але цяжка прадказаць доўгатрываласьць гэтага палітычнага хаўрусу. У той жа час пэрспэктывы росту палітычнае вагі незалежнага беларускага грамадзтва, і Домаша як палітыка ў прыватнасьці, залежаць ад таго, наколькі чуйна змогуць яны працаваць з падмуркамі гэтае чацьвертае сілы. Наяўнасьць сярод гэтых чатырох сілаў “шэрага бізнэсу” ня можа не трывожыць, асабліва напярэдадні непазьбежнае лібэралізацыі эканомікі, прыватызацыі часткі дзяржаўнае ўласнасьці і агрэсіўнага напору расійскага капіталу.

Мабілізацыйная кампанія

Галоўная мэта сёлетняй мабілізацыйнай кампаніі дэмсілаў

палягала ня столькі ў вывадзе беларускіх выбарцаў на ўчасткі — яны і без таго дэманстравалі высокую ступень гатоўнасьці ўзяць удзел у вырашэньні лёсу краіны, колькі ў дэманстрацыі схаванага патэнцыялу дэмакратычных арганізацый (неправамерна ставіць пытаньне, адлюстравала мабілізацыйная кампанія разьвітасьць ці неразьвітасьць палітычнай культуры лідэраў і шараговых прыхільнікаў апазыцыйнага руху). Мабілізацыйная кампанія была абмежаванаю і не вылучала перад сабой колькі-небудзь прэтэнцыёзных заданьняў. Стаўка, як пры савецкай ваенізаванай юнацкай гульні “Зарніца”, была зроблена перадусім на гульнёвыя віды дзейнасьці — расклейку налепак і ўлётак, выраб і нашэньне маечак з нанесенымі на іх дэмакратычнымі заклікамі, лякальныя паводле сацыяльнага рэзанансу і колькасьці ўдзельнікаў акцыі грамадзкага непадпарадкаваньня, пэрформансы і канцэрты, прабегі на роварах, паходы і падарожжы на платох. Наша апазыцыя маладая, што й гаварыць!.. Такі характар мабілізацыйнай кампаніі сьведчыць і пра тое, што стратэгі дэмакратычных сілаў, шмат высілкаў паклаўшы на стварэньне беларускага рэжыму іміджу “жорсткай пэрсаналісцкай дыктатурай”, нарэшце самі паверылі ў гэта. Акцэнт на кантактнай працы з выбарцамі не рабіўся.

Пазытыўны вынік мабілізацыйнае кампаніі — выяўленьне новых імёнаў, уцягненьне новых людзей у палітычную барацьбу. Асноўнае адрозьненьне мабілізацыйнай кампаніі беларускіх дэмсілаў ад яе клясычных першаўзораў палягае ў тым, што звычайна да яе рэалізацыі прыцягваюцца сілы, якія маюць пазытыўнае сацыяльнае аблічча, тады як у Беларусі гэтая кампанія праводзілася рэсурсам апазыцыйных асяродкаў (перш за ўсё маладзёвых), характар дзейнасьці якіх у варунках беларускага палітычнага рэжыму, як правіла, малавядомы ўсяму беларускаму грамадзтву, а калі і вядомы, дык перадусім у тэндэнцыйным асьвятленьні дзяржаўных СМІ. У выніку кампанія займела ў вачох некаторых беларусаў вобраз маштабнай апазыцыйнай акцыі, якая спрыяе канфрантацыі, а не кансалідацыі грамадзтва. Гэта не магло не адбіцца нэгатыўна на папулярнасьці апазыцыйнага кандыдата.

У любым разе за пяць гадоў грамадзтва падыдзе да новых выбараў з істотна лепшым досьведам падрыхтоўкі і да мабілізацыйнай кампаніі, і да назіраньня за выбарамі.

Лукашэнка і лукашэнкаўцы

Актыўна выкарыстоўваючы савецкі сымбалічны капітал цягам сваёй першай кадэнцыі, Лукашэнка сам падсёк сук, на якім сядзіць. Нельга не канстатаваць, што пасьля такога частага ўжываньня-злоўжываньня Лукашэнкам і лукашэнкаўцамі ўкарэненыя савецкія міты ў масавай сьвядомасьці губляюць сваю прыцягальную сілу, а агрэсіўна-ксэнафобская рыторыка не знаходзіць былога пачуцьцёвага водгуку. Атаесамленьне сучасных адраджэнцаў зь нямецкімі паліцаямі-халуямі, а дэмакратычных лідэраў з прадажнымі юдамі паціху становіцца знакам благога густу.

Дзякуючы гэтаму дэфіцыту выяўленчых сродкаў на працягу наступных пяцёх гадоў мы напэўна станем сьведкамі асваеньня Лукашэнкам і яго кадрамі новых тэматычных гарызонтаў. Хоцькі-няхоцькі яму ўсё часьцей давядзецца зьвяртацца да фігуры незалежнай Беларусі, яе нацыянальных і геапалітычных інтарэсаў.

Савецкая міталёгія губляе вартасьць на беларускім палітычным рынку. Адчуваючы дэвальвацыю гэтай вартасьці, Лукашэнка ўжо ў сваёй цяперашняй перадвыбарнай праграме паабяцаў маштабную эканамічную лібэралізацыю (чаго варты толькі пасаж “колькасьць ліцэнзаваных відаў дзейнасьці будзе скарочана да 10—12”), згортваньне кантрольнага апарату дзяржавы.

Дарэчы, адным зь нешматлікіх аб’ектыўных дасягненьняў лукашэнкаўскай сямігодкі трэба прызнаць узмацненьне гэтай кантралюючай функцыі дзяржавы. З пункту гледжаньня простага беларуса крызыс беларускай дзяржавы адразу пасьля набыцьця незалежнасьці тлумачыўся ня тым, што яна была недастаткова беларуская. Для звычайных людзей ён меў два вымеры — першы заключаўся ў рэзкім зьняшэньні яе адміністрацыйнай эфэктыўнасьці, другі датычыў слабасьці яе кантралюючага патэнцыялу. Адміністрацыйнай эфэктыўнасьці пры недэмакратычным, аўтарытарным дзяржаўным ладзе дасягчы ў прынцыпе немагчыма, тымчасам як пазытыўныя зрухі ўва ўзмацненьні кантралюючай функцыі дзяржавы навідавоку і сустракаюць пазытыўны сацыяльны водгук. Можна будзе толькі пашкадаваць, калі беларуская дзяржава паддасца

націску сілаў карупцыі і аслабіць увагу да сваіх кантралюючых функцыяў.

На самым конадні выбараў Лукашэнка даслаў “Вітаньне дэлегатам афіцэрскага сходу ўзброеных сілаў Рэспублікі Беларусі”, у якім неаднакроць падкрэсьліў непарушнасьць нацыянальнае незалежнасьці: *“Рэспубліка Беларусь была, ёсьць і будзе сувэрэннай, незалежнай эўрапейскай дзяржавай... Нашы ўзброеныя сілы ёсьць вытварам беларускага народу і яго нацыянальнай гордасьцю” [3].*

[3] Правядзеньне перад выбарамі найбольшых у гісторыі Беларусі вайсковых вучэньняў “Нёман-2001”, падчас якіх “чырвоныя” пад асабістым кіраўніцтвам Лукашэнкі перамаглі “сініх”, а заразом зьнішчылі 79 умоўных самалётаў і 13 умоўных крылатых ракет праціўніка, таксама мела незалежніцкі падтэкст, бо ў іх дэманстратыўна ўзялі ўдзел толькі часткі беларускага войска, у

адсутнасьць
“саюзных”
расійскіх.
Больш за тое,
дзяржаўныя
СМІ дружна
разрэклямавалі
факт, што
супрацьпаветраныя
комплексы,
ужытыя падчас
вучэньняў, былі
ня толькі
выраблены, але
і распрацаваныя
ў Беларусі.

Фактычна, ужо
цяпер беларускі
прэзыдэнт узяў
на ўзбраеньне
рыторыку
нацыянальна-
дэмакратычных
сілаў, якой тыя
паслугоўваліся
ў пэрыяд
набыцьця
Беларусяй
незалежнасьці.
Тую самую
рыторыку ў
характэрнай
для яго
абсурднай
манеры
падхапіла
постчыкінскае
БТ. У. Ганчарык

быў ім абвінавачаны ў *“заігрываньні з Расіяй”*, што нібыта нясе пагрозу нацыянальнай незалежнасьці. Вядома, гэткая рыторыка мела на мэце найперш узбудзіць недавер да Ў. Ганчарыка з боку нацыянал-дэмакратычнага электарату, але яна ёсьць паказальнаю і з гледзішча разрастаньня незалежніцкага дыскурсу.

Трэба чакаць, што цягам найбліжэйшых гадоў тэма беларуска-расійскай інтэграцыі будзе з фактару вонкавай палітыкі Беларусі больш а больш ператварацца ў фактар унутранай палітыкі. Ужо цяпер яна адкрыта выкарыстоўваецца для мабілізацыі прыхільнікаў сёньняшняга палітычнага курсу ў патрэбны палітычны момант.
Выбары таксама паказалі, што дэмакратычныя сілы недаацэньваюць інтэлектуальны патэнцыял лукашэнкаўцаў. Нягледзячы на выкрыцьці ў справах зьніклых (забітых?) палітыкаў і прадпрымальнікаў, мэдыйныя скандалы з удзелам перакінчыкаў з лукашэнкаўскага лягеру, цягам перадвыбарнага маратону ўвесь час складалася ўражаньне, што дэмакраты так ня здолелі перахапіць у лукашэнкаўцаў ініцыятыву. Тым удавалася ўсё задуманае — дабіцца нэўтралітэту новапаўсталых бізнэс-элітаў, заручыцца падтрымкай Расіі і

іншых краінаў СНД, разрэклямаваць у СМІ эканамічны ўздым, укідваньнем тузіну псэўдакандыдатаў зьбіць з панталыку незалежныя СМІ, адных падкупіць, другіх падмануць. Карацей, усё, што ўдалося пару гадоў раней іхным расійскім, украінскім, казахскім калегам.
Недаацэнка “мазгавога цэнтру” лукашэнкаўцаў, што пад уплывам нацыяналізуючага менскага асяродзьдзя дасягнуў значнай самастойнасьці ў прыняцьці рашэньняў, а значыць і здольнасьці адэкватна рэагаваць на выклікі часу і непаўторныя рэаліі постсавецкай Беларусі, сьведчыць пра завышаную самаацэнку шмат якіх лідэраў дэмсілаў і адсутнасьць у іх рэальнага ўяўленьня пра цяперашні дзяржаўны апарат. Ягонае функцыянаваньне падчас перадвыбарнай кампаніі паказала моц бюракратычнае сыстэмы, умацаванае Лукашэнкам.

Нацыяналізуючы ўплыў менскага асяродзьдзя
Лукашэнка ўзору 2001 году — гэта не Лукашэнка ўзору году 1994-га. Менскае асяродзьдзе, у якім ён круціцца вось ужо дзесяць гадоў, моцна на яго паўплывала. Новая беларуская ідэнтычнасьць і яе крэольскія дэфармацыі ў сталіцы ўмацаваліся непараўнальна лепш, чым ува ўсходніх рэгіёнах краіны.
Стойкі лукашэнкаўскі электарат — гэта крэалізаваная частка беларускага грамадзтва. Выбары пацьвердзілі статус Лукашэнкі як прэзыдэнта ўсіх беларускіх крэолаў. У беларускім кантэксьце з крэоламі ня варта атаясамліваць толькі этнічных беларусаў, якія дагэтуль не набылі акрэсьленай нацыянальнай ідэнтычнасьці. Трэба падысьці шырэй: крэолы — носьбіты ідэнтычнасьці, сфармаванай яшчэ за часоў данацыянальнага грамадзтва. Юры Сівакоў, Урал Латыпаў і Аляксандар Лукашэнка ў гэтым сэнсе мала розьняцца.
Расійска- і піджынамоўныя крэолы з пашпартамі грамадзян Рэспублікі Беларусі непазьбежна ўтвараюць асноўны рэсурс для рэпрадукцыі палітычнага рэжыму, створанага Лукашэнкам. Дзякуючы сваёй культурнай непаўнавартасьці і выніку гэтага — псыхалягічнай няўстойлівасьці, яны асабліва чуйныя на ідэалягічную індактрынацыю і іншыя маніпуляцыі з палітычнымі мэтамі. Толькі крэолы могуць забясьпечыць стварэньне такой канструкцыі ўлады, якая магла б утрымацца

адносна вялікі гістарычны прамежак часу, дасягненьне “пераемнасьці ўлады”, пра што так марыць Лукашэнка. Лукашэнкаўскія рэфэрэндумы 1995 і 1996 гг., апрача тымчасовых палітычных эфэктаў, зьнялі ўсе абмежаваньні з рэпрадукцыі крэолаў у маштабе ўсяго грамадзтва, ператварыўшы тым самым гэтую рэпрадукцыю ў адну з найважнейшых мэтаў дзяржаўнай палітыкі[4].

[4] На працягу ўсёй сваёй прэзыдэнтуры Лукашэнка ў сваёй актыўнасьці рэгулярна выходзіў за рамкі бягучай неабходнасьці, г. зн. зьдзяйсьняў учынкі і праводзіў захады, якія немагчыма было патлумачыць простай палітычнай мэтазгоднасьцю — тыя самыя рэфэрэндумы. Гэтым Лукашэнка даваў знак беларускаму грамадзтву, што ён не зьвязаны нейкімі палітычнымі канвэнцыямі, а

жывіцца
запатрабаваньнямі
шараговага
беларускага
выбарца. Сваім
гіпэрбалізаваным
палітычным
валюнтарызмам
Лукашэнка
таксама ўсяляк
падкрэсьліваў
незапраграмаванасьць
сваёй перамогі
над Кебічам на
першых
прэзыдэнцкіх
выбарах і
дыстанцыю,
якая адасабляе
яго ад
палітыкаў і
стылю
кіраваньня
“кебічаўскай”
школы.

Зьнішчэньне амаль усіх прарасійскіх структур і выданьняў, якія вызнавалі прынцып дыяспарнасьці (сучасны разнавід імпэрскай дактрыны пра трыадзіны расійскі народ), падчас курыраванай Уладзімерам Замяталіным перарэгістрацыі партый і грамадзкіх аб’яднаньняў, выглядае яшчэ адной шматзначнай праявай гэтай палітыкі.

Крэольская маса — ня столькі пагроза для дзяржаўнасьці Беларусі, чаго так баялася нацыянальная інтэлігенцыя, колькі зарука стабільнасьці і непарушнасьці аўтарытарызму.

Вядома, расійска-беларуская інтэграцыя для беларускіх крэолаў мае сымбалічнае значэньне. Яна забясьпечвае ім пазытыўны эмацыянальны тонус, стварае ілюзію супадзеньня іх пэрсанальных і дзяржаўных інтарэсаў. Для задавальненьня

гэтай ілюзіі і сам Лукашэнка працягвае трымаць у сваім атачэньні жменьку цьвердалобых русафілаў, такі сабе доказ прарасійскасьці палітычнага курсу беларускага рэжыму. Але пры гэтым сам Лукашэнка выдатна разумее: адчужэньне Беларусі і Расіі будзе нарастаць у меру ўмацаваньня новай расійскай нацыянальнай ідэнтычнасьці ці, прынамсі, новай ідэнтычнасьці грамадзянаў Расійскай Фэдэрацыі.
Як аўтарытарная дзяржава, Беларусь няздольная да інтэграцыі. Утварэньне стабільных супольных структур магчымае толькі пры дэмакратычным ладзе і на дэмакратычным грунце. Інтэграцыя ў рамках Эўразьвязу гэтаму прыклад. Аўтарытарная ж дзяржава выкарыстоўвае інтэграцыю для ўмацаваньня рэжыму, здабыцьця дадатковых рэсурсаў для ўнутранай кансалідацыі.
Крэолы не пагроза незалежнасьці найперш таму, што яны палітычна бязвольныя і імі лёгка маніпуляваць. З тае ж прычыны яны не нясуць пагрозы анахранічнаму палітычнаму рэжыму і ягонаму эксцэнтрычнаму кіраўніку.

[image]
[image]

№ 4 (18) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: **05-10-2001**
[image]

Даніла Жукоўскі

Пасткі на хайвэі постмадэрнізму

ДАНІЛА ЖУКОЎСКІ інжынэр, публіцыст, жыве ў Горадні. Публікуецца ў газэце “Наша Слова” і бюлетэні “Трэці Сэктар”. Пашыраная вэрсія гэтага артыкулу зьмешчаная на інтэрнэт-старонцы sektar.cjb.net.

Аб’ектыўная, а можа і адзіная мера перспектыўнасьці — вольны рынак сусветнай грамадскай думкі. Аблічча, якое мы дэманструем свету, пераважна правінцыйнае. Тое, што нам гэта накінулі, не падлягае сумненню, але не мяняе факту. На вольным рынку толькі нехта сапраўдны знойдзе прызнанне і ўсе спробы падмяніць сусветныя стандарты чымсьці іншым — ці то асветаю, ці хатняю другаснасцю — асуджаныя на няўдачу...

Рыгор Грабовіч, дырэктар Інстытуту ўкраінскіх даследаванняў пры Гарвардскім універсітэце, ЗША

Думаеце, гэта здань? Можа і так, — сказаў Сільвер, — але я не разумею аднаго. Мы ўсе чулі рэха. А хіба ж бачыў хто-небудзь, каб у зданяў быў цень? Дык адкуль тады ўзяцца рэху, калі не можа быць ценю? Не, хлопцы, так не бывае...

Р. Л. Стывенсан. Выспа скарбаў

1

Што за нялад такі ў Беларускім каралеўстве, чаго бракуе беларушчыне, каб шырыцца і заваёўваць прыхільнікаў, што замінае радаваць заўзятараў, якія жыць без яе не могуць, але часцяком з прыкрасцю адкладаюць газету ці кніжку замест таго, каб параіць яе сябрам і знаёмым? Адказ даць нялёгка, больш — адказы могуць розніцца. Я хачу засяродзіць увагу чытача на адным аспекце справы: дачыненнях паміж аўтарамі ды аўдыторыяй.

Блукаючы па небагатых аазісах беларускай публіцыстыкі час ад часу можна назіраць, як сярод бляклых фарбаў пустэчы раптам без дай прычыны шыбуюць угару расліны нечуваныя, кідкія, запавядаючы радыкальныя змены. Але яскравыя кветкі хутка знікаюць, прыгожае лісце засыхае — і маем чарговы, знаёмы да болю, скручаны барацьбой з асяроддзем беларускі саксаул. Арыгінальнасць і экстрэмізм, што так уражвалі ў першае імгненне, падаюцца пазней дзіцячым выбрыкам.

Бязглузда смелыя фармулёўкі і “небяспечныя” заклікі. Уважлівы чытач адразу адчувае: калі б нехта, крый Божа, пачаў дзейнічаць паводле выказаных адважным аўтарам прынцыпаў, той апынуўся б у першых шэрагах напужаных і разгубленых. Як, для прыкладу, пачуваліся б сур’ёзныя дзядзькі і цёткі, што спрабуюць даводзіць ніжэйшасць расейскае мовы за мову беларускую, калі б іхнія дзеці прынеслі са школы заданне напісаць сачыненне на гэткую тэму?

Нашы экстрэмісты пераканаяыя ў немагчымасці ўласнае перамогі. Гэта надае ім смеласць то Пушкіна назваць “някепскім паэтам”, то выкласці ў газеце думкі пра інтымнае жыццё калегі, то даць палітычны прагноз, які не мае дачынення да рэальнасці, але спраўна працуе на ненавіснікаў Беларусі. Калі няма сілы, то ўсё дазволена — на словах — гэтакі дадатак да здабыткаў “някепскага пісьменніка” Дастаеўскага. Баль безадказнасці!

Я назваў гэтую хваробу Сіндром Непераможнага Ворага (СНВ). Ейныя характэрныя рысы знаёмыя кожнаму, хто памятае нядаўняе савецкае мінулае. Тады, каб аслабіць татальны ціск

афіцыйнае дагматыкі, людзі тлумна кпілі з яе. Адзінае на той час выйсце. Сітуацыя змянілася, звычка засталася. Смех ёсць зброяй апошняга шанцу, эфектыўнай, калі небяспека відавочная і немагчымыя іншыя спосабы пратэсту. У іншых умовах ён прыпадабняецца да безадказнасці. Корань ліха, я лічу, у таемнай непавазе да сябе, у захапленні сілаю ворага, прыгажосцю і магутнасцю злога. Тая прыгажосць і моц кідае барвовыя водбліскі на постаць змагара з ім, дадаючы каларыту ягонай мізэрнасці. Гларыфікацыя ворага штурхае да адмовы ад сапраўднае барацьбы, да стварэння фантастычных праектаў, да спадзявання на цуд або да апакаліптычнага візіянерства.
Усё гэта скрайныя праявы хваробы, ейная вострая форма. У ёй маецца добры бок — “вынаходствы” лёгка заўважыць і пазнаць. Больш прыхаваныя, больш фундаментальныя праявы мае хранічны варыянт СНВ. Ці існуе, напрыклад, для чалавека з такім светапоглядам псіхалагічная магчымасць пагадзіцца калі-небудзь, што вораг не ёсць непераможным? Ці не лагічны для яго пошук хаўрусу з “меншым” злом дзеля аховы ад “большага”? Гісторыя даводзіць, што ідэалагічна абгрунтаваная логіка можа часам перамагчы жыццёвыя рэаліі, і чалавек памрэ ад смагі пасярод возера з “няправільнаю” вадою. Небяспека фальшывых крокаў рэальная і для мастака, і для палітыка, і для простага чалавека — выбаршчыка і спажыўца культуры. Адным з яскравых (бо адным з найбольш шкодных) спосабаў хаўрусавання з д’яблам з найлепшых меркаванняў я лічу некрытычнае ўслаўленне беларускіх арганізацый, створаных акупацыйнымі нямецкімі ўладамі ў другую сусветную вайну. “Яны так любілі Беларусь, што пайшлі служыць да немцаў.” Няма горшага спосабу прапаганды патрыятызму, няма лепшага спосабу адштурхнуць чалавека ад беларушчыны, паглыбіць той раскол у грамадстве, які кожны сапраўдны патрыёт, тым болей нацыяналіст, мусіць імкнуцца зменшыць. Немагчыма растлумачыць захапленне лёсам няшчасных людзей, якія апынуліся перад жудасным выбарам паміж дрэнным і горшым, акрамя як ліхаманкавым пошукам сілы, здольнай падмацаваць падупалы ў змаганні з непераможным ворагам, зняверaны ва ўласных сілах дух.
СНВ штурхае на шлях, запраграмаваны супраціўнікам, накідвае няшкодныя для ворага спосабы барацьбы ў той час, калі адказ паводле сваіх магчымасцяў мог бы даць доўгачаканы плён.

Шчыры аналіз сітуацыі, у якой людзі бралі ўдзел у фармаваннях тыпу БКА, супакоіў бы душы і сумленні тых, хто быў па абодвух баках фронту ды іхніх нашчадкаў, і гэткім супакаеннем было б дасягнута значна болей, чымся ўпартым эпатажам, той самаю да абсурду даведзенаю несавецкасцю, якая міжволі прымушае захопленага такою гульнёю чалавека паблажліва глядзець на тое, на што паблажліва глядзець нельга. За захапленнем ворагам ідзе сакралізацыя працэсу бясконцага змагання. Пытанне эфектыўнасці змагання (і якасці твораў) адыходзіць на апошні план. Нягледзячы на бутафорскі характар дзеянняў немагчыма цалкам адкінуць аўтэнтычныя звычкі вайны, перадусім звычкі партызанскія, падпольшчыцкія, дзеля таго, што вораг непераможны. Закрытасць, недавер, бясконцая перасцярога, боязь незнаёмых людзей патрэбныя ў падполлі, але якая іхняя вартасць у культуры?
Пад уплывам СНВ адбываецца спецыфічная пераацэнка вартасцяў. Змаганне з мэтаю шкодзіць ворагу фактычна адкідаецца, як немагчымае. Фармуецца асаблівы вобраз ідэальнага барацьбіта: на першы план выходзіць рамантычны аспект, спрыяючы ідэалізацыі самотніка, вузкага кола аднадумцаў, абсалютызацыі выпрацаваных у малым коле вартасцяў, без выхаду на шырэйшыя, значныя для грамадства абагульненні.
Пасля сустрэчы з маладымі прадстаўнікамі “новае хвалі” беларускае культуры, рэдактарамі “ARCHE” і “Нашай Нівы”, я доўгі час не мог упарадкаваць свае ўражанні, пакуль не знайшоў вобразу: партызанскі атрад на варожай тэрыторыі. Вялікая зямля так далёка, што яе нібыта няма. Вакол дзікі лес і варожыя засады. Ніякіх саюзнікаў. Тыя, хто выходзіць на кантакт, — падазроныя па вызначэнні. Нават тыя, дзеля каго ідзе змаганне, падаюцца часам зданямі. Самотнае змаганне поруч з выжываннем. Людзі жывуць у паўтарамільённым Менску, выдаюць газету, часопіс і лічаць сябе прадстаўнікамі еўрапейскае культуры (пра што будзе гаворка пазней), але іхняя свядомасць там, у лесе з назваю СНВ.

2.

Схільнасць да прымітывізму, ідэйныя спрашчэнні ёсць простым шляхам да ўтопіі, а далей — да таталітарызму. Беларускі

светапогляд без меры абцяжараны такою спадчынай і мусіць пашырацца за кошт нетаталітарных канцэпцый. Яны мусяць утрымліваць плюралізм, павагу да індывідуальнага, прызнанне вынікаў рынкавай канкурэнцыі (то бо выбару спажыўца), імкненне да ўліку нават супрацьлеглых інтарэсаў.
У нас жа адбылася спецыфічная мутацыя ў грамадстве: знікла здольнасць і нават разуменне вартасці для грамадства кансенсусу і дыялогу. Апошняе дзесяцігоддзе адбываецца трансфармацыя, выкліканая зменаю палітычнага рэжыму і грамадскага ладу. Ціск улады на грамадства і творцаў зменшыўся, але яны, цалкам натуральна, дзейнічаюць пад уплывам ранейшага досведу.
Сённяшнія рэдактары з незалежных выданняў не могуць прэтэндаваць на ўладу, якую мелі колішнія з дзяржаўных. Але для іх з'явілася іншая спакуса: вызваліцца ад усіх забавязанняў, самавыявіцца ў абсалютнай свабодзе.
"Перабудова" выявіла найглыбейшы крызіс культуры беларускага грамадства. Знішчаныя, лічы, усе аўтарытэты (акрамя хіба класікаў — Купалы, Коласа, Багдановіча). Дзеючыя пакаленні творчае інтэлігенцыі апынуліся ў незайздросным становішчы. Старэйшыя скампраметаваныя сваёю савецкасцю, адсутнасцю духоўнага супраціву, малым наробкам вольнае культуры. (Прыгадаем у чарговы раз, што ў беларускай літаратуры амаль няма твораў з шуфляды, там іншы раз хаваюцца найбольш ідэалагізаваныя тэксты — цікаўным раю дзённікі П. Панчанкі, надрукаваныя ў "Полымі" за 1998 год.) Маладзейшыя не падрыхтаваныя да ролі правадыроў нацыі, без традыцый вольнасці, без канструктыўнае праграмы. Пачуццё адасобленасці паглыбілася пасля 1994 году з надыходам рэваншу. Творцы схільныя лічыць сябе цэнтрам сусвету, самотны творца — пагатоў.
Лозунгі постмадэрнізму лёгка знаходзілі дарогу да сэрцаў, спавітыя прывабным вэлюмам "заходняе штучкі". Першая спакуса "постмадэрнізму" — ісці лёгкім шляхам. Навошта вырашаць праблему сталення нацыі сучаснымі сродкамі і катэгорыямі? Можна ўзняць "сучасную" тэму (прыкладам, гомасексуалізм). Праблему сталення трэба вырашаць самім. Гатовага рашэння няма, бо амаль усе народы Еўропы (і не толькі) прайшлі гэта дзесяцігоддзі (ці стагоддзі) таму. Другое можна перанесці цалкам, амаль не перарабляючы, бо гэтым

сёння занятыя людзі там, дзе праблемы іншага плану даўно прайшлі фазу першаснага развязання.
Няма забароненых тэм. Ёсць тэмы важныя, ёсць важнейшыя. Постмадэрнізм робіць выгляд, што гэта не так.
Пытанні нацыянальнага вызначэння закранаюць усіх насельнікаў Беларусі. Але ўздымаць іх па-новаму — найцяжэйшая справа. Спакусліва абысці перашкоду дужа сучасным спосабам.
Постмадэрнізм па маім меркаванні — адна з тэхналогій *дасведчанае культуры*, якая зужыла іншыя сродкі, апрацавала сваю ніву (то бо сваё грамадства), даследавала традыцыйнымі спосабамі ўсё і, адчуўшы невычэрпнасць пазнання, спрабуе неразвязаныя таямніцы адолець новым прыёмам. Дадаючы да творчага арсеналу адну маленькую прыладу, постмадэрнізм стварае шматлікія спакусы. Ідэя зыгнараваць звыклую іерархію мае глыбокі сэнс, але ўжываць яе трэба з розумам: лёгка прыпадобіцца да лекара, які робіць пацыенту касметычныя працэдуры, калі таго трэба цягнуць на хірургічны стол. Выданні поўняцца творамі малых жанраў, але вялікіх амбіцый. Дзённікавыя запісы, падарожныя нататкі, абразкі, афарызмы... Бізнэсмен-літаратар дае вострыя характарыстыкі не толькі жывым братам па варштаце, але й класікам сусветнае літаратуры. Дужа рэвалюцыйны шмат у якіх пытаннях паэта публікуе падрабязнасці асабістага жыцця калегаў, за якія класікі забілі б яго на дуэлі ці без яе. Жанр, прызначаны выключна для дужа аўтарытэтнага чалавека, стаў здабыткам шырокіх пісьменніцкіх масаў. Сапраўднае ж крытыкі страшэнны дэфіцыт. Такое ўражанне, што ў большасці аўтараў своечасова нешта ампутавалі, і яны няздольныя да крытычнага *думання*. Для іх існуюць толькі два спосабы ацэнкі: для сваіх — стос кампліментаў, для чужых — агульнае адмаўленне. “Шэдэўраў я не пабачыў”, — заўважыў калісьці вядомы бард-журналіст. А ці парупіўся ён пераканаць нас, што мае да гэтага здольнасці? Калі меркаваць па ягоных творах — хутчэй наадварот. Сваім правяць такія кампліменты, што дзівуешся. Карціць прывесці прыклады, але лепей стрымацца. Важна, што оргія ўзаемнага задавальнення не ўлічвае наяўнасці трэцяга боку — чытача, спажыўца.
Часам пры чытанні ці слуханні чарговага опусу з’яўляецца адчуванне, што з цябе здзекуюцца, робяць з цябе дурня.

Невыпадковае адчуванне: грамадства, хочацца каму ці не, мае выпрацаваныя жыццём вартасці. Калі ж хто насміхаецца ці здзекуецца з іх, то трэ папрацаваць, каб пераканаць чалавека, што ўсё робіцца яму на карысць.

Пры чым тут увогуле постмадэрнізм, скажа нехта. Хіба гэтак нельга паводзіцца пры сацрэалізме, класіцызме ці рамантызме? Хіба гэта нельга назваць уласным імем — бойкай правінцыйных снобаў за манаполію? Натуральна, што можна. "Постмадэрнізм" — маскіровачная сетка. Штука ў тым, як выдатна ён надаецца для гэтае ролі. Местачковасці ён стварае філасофскі базіс, маразму дапамагае выглядаць творчым пошукам, непавагу да чытача выстаўляе клопатам пра ягонае культурнае развіццё. У сённяшніх умовах даволі лёгка кінуць з высока ўзнятаю галавою непадмацаваную думку (прыгожа гэта робіцца ў "Вострай браме" — пад гукі велічнае мелодыі). Нескладана арганізаваць, каб не было як публічна аспрэчыць гэтую думку (чытайце ў "Нашай Ніве" адказы на лісты на апошняй старонцы: "Наша меркаванне не супадае з вашым". Усё. Кропка). Цяжэй растлумачыць, чым гэта розніцца ад практыкі вядомых, зусім не прагрэсіўных, колаў. Постмадэрнізм служыць рэцэптам у такой патрэбе.

Трэба перастаць хавацца за постмадэрнізм і звярнуцца да вырашэння даўно наспелых праблем. Неабходна пагадзіцца з тым, што на *highway* постмадэрнізму нельга трапіць, абмінуўшы тракт Багушэвіча. Не трэба нічога адрынаць. Калі новы арсенал дапаможа — выдатна. Калі не — абмяжуемся старым. Але праблемы мусяць быць вырашаныя. Бо, як казаў апостал, "калі Хрыстос не ўваскрос, то й вера нашая дарэмная".

Беларускія пісьменнікі мусяць звярнуцца да патрэбаў грамадства. Распаўсюджаная дзіўная думка, быццам яны абслугоўваюць вёску. Ці ж вясковыя дзеці не хочуць чытаць прыгодніцкія кнігі? Ці грэбуюць вясковыя падлеткі фантастыкаю? Ці дарослыя пагарджаюць дэтэктывам, любоўным раманам? Чаму ж тады беларускія пісьменнікі, якія іх нібыта абслугоўваюць ужо не адно пакаленне, не зрабілі амаль нічога ў гэтых жанрах? Чаму сёння не робяць? Заклікі ствараць творы для масавага чытача — неад'емны атрыбут кожнай дыскусіі пра беларускую мову, дзе бярэ ўдзел хаця б адзін "чалавек з вуліцы", спажывец культурнага прадукту. А што ж пісьменніцкая грамада? Маўчыць.

3.

Увесь гэты “постмадэрнізм” *маладых*, гэтаксама як дэманстратыўны традыцыяналізм *старых*, ёсць сублімацыяй прыгнечаных СНВ жаданняў. Гэта тая ж хвароба: імкненне ўхіліцца ад непрыемных чыннікаў змушае творцаў дэфармаваць ідэі так, што губляецца грамадскі рэзананс, а значыць, змяншаецца небяспека. Гэтая тактыка ў апошнія гады пазбавілася рэшткаў апраўдання.

Раней улада трымала ўсіх у рызах, але з меркаванняў прэстыжу лічыла неабходным карміць. Цяпер яна дазваляе больш свабоды, але адмаўляецца фінансаваць жыццядзейнасць свабодных творцаў. Асцярожная форма губляе сэнс, калі гаварыць пра стаўленне дзяржавы, і ўплывае згубна, калі гаварыць пра спажыўца — адзіны грунт творцы дзеля апраўдання існавання і дзейнасці. Спажывец хоча, як хацеў раней, каб мастацтва задавальняла *ягоныя* патрэбы, адказвала на балючыя пытанні, закранала душу. Раней ён лічыў, што творца раздзіраецца паміж сваімі жаданнямі і патрабаваннямі ўлады, і таму з удзячнасцю лавіў нат асобнае смелае слоўца. Сёння, разгортваючы незалежнае выданне, ён хоча, каб яно арыентавалася на яго і толькі на яго. Яму незразумела, ад каго хавае аўтар свае сапраўдныя думкі.

Беларускай культуры трэба засяродзіцца на пошуку апірышча. Якая сацыяльная група будзе падтрымліваць новую беларускую культуру? Трэба тэрмінова адказваць — словам і справай. Праблема грунту пад нагамі істотная для ўсяго беларускага руху. Мне ўяўляецца фігура “беларуса”, які абапіраецца на дзве аддаленыя адна ад адной кропкі: традыцыяналісцкую (з мянушкаю “вёска”) і авангардысцкую (з мянушкаю “моладзь”). Паміж імі большасць насельніцтва з мянушкаю “балота”. Без апоры на народныя гушчы рух немагчымы, але стоячы трываць можна. Бяда толькі, “вясковая” купіна паступова растваряецца ў навакольным “балоце”, і хутка “беларус” будзе стаяць на адной назе, як бусел. Авангардысты — асяроддзе капрызнае, утрымацца на іхняй купіне будзе складана.

Прыклад з галіны, што ў апошняе дзесяцігоддзе развівалася ці не найбольш дынамічна: гістарычныя веды. Зроблены велізарны крок ад забыцця і замоўчвання пэўных тэм і постацяў

нашае мінуўшчыны да іхняе прэзентацыі шырокім колам. Відавочныя змены да лепшага. Але ж… Названыя ніжэй часавыя межы, безумоўна, будуць рознымі ў розных людзей, але з'ява закранула амаль усіх, хто меў адпаведныя зацікаўленні.
Спачатку, недзе да 1992 году, усё, што тычылася беларускае гісторыі, чыталася нагбом. Кожны артыкул быў адкрыццём, факт — падзеяй. Мінуўшчына набірала больш акрэсленыя рысы, засялялася выдатнымі асобамі. Пачалі з'яўляцца новыя пытанні: ужо не "хто?" і "што?", але "як?" і "чаму?". На гэтыя пытанні здавальняючых адказаў за ўсе гады з'явілася вельмі мала.
У беларускай культурнай дзейнасці з зразумелых прычынаў непрапарцыйна шмат месца мае першасная індактрынацыя і асветніцтва. Гэта ледзьве не ўсё, на што свядомыя беларусы былі здатныя ва ўмовах уціску. Зразумела і даравальна. Іншая справа, у свядомасці беларускай грамады амаль не прысутнічае разуменне, што такая практыка заганная, што яна ставіць пад пытанне наша права звацца нацыяй.
Сапраўдная, але збольшага патэнцыйная, база беларушчыны — не міфічная вёска і не менш міфічная моладзь. Гэта сярэдні клас, што складаецца з культурных людзей, якім недастаткова простых адказаў на складаныя пытанні, прапанаваных ім маскультурай. Гэтыя людзі патрабавальныя. Да іх трэба звяртацца сур'ёзна, з поўнаю самааддачаю. Яны патрабуюць сапраўдных сэнсу і пачуцця, бо ў іх ёсць выбар: яны могуць шукаць задавальнення сваіх патрэбаў па ўсім свеце. Імітацыі іх адстрашваюць.
Творцы нашыя схільныя да нарцысізму. Яны так шмат увагі аддаюць сабе і сваім калегам, што часам забываюцца на навакольны свет. А потым, схамянуўшыся, крычаць "Бяз нас! (краіна жыве — **Аўт**.)" і сыплюць недарэчныя папрокі сабе ды іншым: *"Калі фармаваліся ідэі Адраджэньня (Ідэальнай Беларусі), хіба можна было ўявіць сабе такую канцэпцыю Беларускай Дзяржавы, якая б адначасна спалучала ў сабе плён савецкай, супольнай беларуска-расейскай і нацыянальна-гістарычнай спадчыны. Хіба што як здзек тады магла быць успрынятая прапанова задзіночыць у межах аднаго дыскурсу ВКЛ і БССР, Слуцкае паўстанне і савецкую партызанку, Астроскага і Жукава, Рэч Паспалітую і СССР, Скарыну і трактар "Беларусь", Грунвальд і вясну 45-га, Дамейку і Чэрскага…"*, — як піша

Валянцін Акудовіч у артыкуле да 10-годдзя аднаўлення “Нашай Нівы”. Хіба можа быць плённым для грамадства дыскурс, які не спалучае гэтых нібытных антыномій? Хіба наша нацыянальна-гістарычная спадчына не ўтрымлівае ў сабе XIX і XX стагоддзяў? У савецкія часы выключалі адну палову спісу, у парыве вызваленчых эмоцыяў — другую. Гэта нармальна — для групы пад уплывам эмоцый. Для эліты нацыі — не. Калі жарсці прыціхлі, трэ было працаваць, каб сінтэз таго, што гісторыя незваротна спалучыла ў жыцці, адбыўся і ў галовах. Не зрабілі. Не адчулі неабходнасці. Не пачулі заклікаў перакінуць масток паміж *незалежнасцю* і *кілбасою* (а колькі было тых заклікаў!), мовай і дабрабытам, Скарынам і масавай культураю. Грунвальд і вясну 45-га не раз згадвалі разам як прыклады змагання з немцамі. Але мусіць ініцыятары гэтага “блюзнерства” не ўваходзяць у “Мы” Валянціна Акудовіча.

Не завязаўся шырокі дыялог, і кандыдаты ў ідэолагі засталіся кожны на сваёй купіне са сваім экстрэмізмам. А для мяне няма бездані паміж Дамейкам і Чэрскім.

Сёння сп. Дынько заклікае да стварэння мастацтва супраціву. Добры заклік. Голы пратэст малапрыдатны. Нельга апеляваць толькі да разбуральных памкненняў. Мастацтва мусіць арыентавацца на стварэнне ў грамадстве новае якасці шляхам задавальнення патрэбаў: старых і тых, што паўсталі ў новай сітуацыі. Ён піша: *“Перад сучаснай беларускай культурай стаіць шэраг задач. Задача “разьдзяржаўліваньня” культуры, падтрымкі незалежнай ініцыятывы. Таксама — праца па запаўненьні лякунаў, што ўтварыліся ў выніку саветызацыі: толькі карпатлівай будзённай працай, ад перакладу сусьветнае клясыкі на беларускую мову да распрацоўкі новых навучальных курсаў, можна дабіцца культурнай паўнакроўнасьці. Важна таксама пераадолець палітычны нігілізм, тую алергію мастацтва на палітыку, што выпрацоўвалася як рэакцыя на савецкі ідэалягічны прымус. Нагвалт патрэбная ангажаванасьць дзеячаў культуры ў грамадзкія справы. На парадку дня стаіць стварэньне мас-культуры. Ад яе будзе залежаць ня толькі самааздараўленьне культурных мэханізмаў як такіх, унезалежненьне іх ад дзяржаўнага кантролю, але і, напэўна, умацаваньне беларускай дзяржаўнасьці”.*

Я маю намер дадаць некалькі сваіх пажаданняў творцам. Перш за ўсё — сціпласці. Разумення таго, што аўдыторыя не саступае

ім у адукацыі і мастацкім гусце. Большай увагі да спажыўца (як казаў Л. Баршчэўскі, пісаць трэба не для народу, а для чытача). Аўдыторыя ў нас не распешчаная. Гэта даводзіць фенаменальная папулярнасць твораў У. Караткевіча. Нягледзячы на фантастычнасць і відавочную ўтапічнасць некаторых ягоных гістарычных канцэпцый, Караткевіч зрабіўся культавай фігурай для сведамых беларусаў, а пэўныя падкрэслена несавецкія аўтары выклікаюць хутчэй неразуменне, а то й агіду.
Я заклікаю творцаў мацаваць і дасканаліць сваю нацыянальную свядомасць. Лічыцца, шго ў беларусаў у цэлым яна слабая, але ў творцаў-нацыяналістаў моцная. Гэта памылковае меркаванне. У апошніх яна таксама слабая. Калі параўнаць моц карпаратыўнай салідарнасці і братніх пачуццяў да сваіх супляменнікаў, то першае ў 999 выпадках з 1000 будзе мацнейшым. Гэта норма для беларусаў (тыя, хто служыў у савецкім войску, лёгка прыгадаюць, што толькі дзве нацыі не гуртаваліся па нацыянальнай прыкмеце: расійцы і беларусы). Гэтую норму трэба змяніць.

4.

Мацнейшая нацыянальная свядомасць будзе падштурхоўваць творцаў больш цвяроза ацэньваць дзейнасць сваіх калегаў прынамсі публічна, у друку, і прыслухоўвацца да спажыўцоў, нават калі яны кажуць непрыемнае. Мы, беларусы, маем супольныя праблемы, іх нельга вырашыць для нейкае групы, не вырашыўшы для ўсяе нацыі. І ёсць падставы меркаваць, што нацыі гэта па сілах. Каб дасягнуць вышэйпамянёнай “культурнай паўнакроўнасці” шмат трэба зрабіць і збольшага вядома, што. Пытанне, як гэта рабіць, чаму гэта не робіцца? І вось тут мне прыгадваецца славуты аргумент Джона Сільвера. Менавіта Рэха і ёсць той нястачай. Рэха — водгук, які мусіць мець падзея, каб стацца падзеяй, каб адчуць, што слова трапіла паводле прызначэння. Як караля стварае атачэнне, так культурным і іншым справам дае жыццё грамадскае рэха. (Для беларусаў гэта заўжды было праблемай. “Людзьмі звацца!”, “А хто там ідзе?”, “Я ж ціха йграю, хто ж ціхіх прымеце?”, — ці гэта не прага водгукаў, ці не пошук рэакцыі атачэння?) Рэха няма, калі вакол крыніцы гуку няма аб’ектаў. Дзіўна ці не, але

Ю. Станкевіч у “Крыніцы” прапанаваў менавіта такі выраз: Вялікая Інтэлектуальная Пустэча.
Наймацней гэта б’е па тых, чые словы гінуць без знаку ў наваколлі, і выклікае шэраг хваравітых рэакцый. Лягчэй за ўсё заўважыць празмерную вастрыню некаторых выказванняў, непатрэбную правакацыйнасць. Чалавек не хоча заставацца без рэха і пачынае завастраць фармулёўку, крычаць, вырабляць розныя штукі, каб прыцягнуць увагу. Гэта не толькі праявы безадказнасці, пра што гаварылася раней. Я схільны бачыць у такіх публікацыях акт адчаю спакутаваных без Рэха людзей. Наўпроставым наступствам нястачы Рэха з’яўляецца, між іншым, страта творцамі пачуцця маштабу. Сталыя рэпе́ры стварае толькі жывая аўдыторыя, здольная жвава рэагаваць. Інакш не могуць існаваць крытэрыі грамадскай вартасці і мастацкай якасці! Акцэнты змяняюцца пад уплывам чыннікаў, што дзейнічаюць у межах вузкага кола і, непазбежная ў прынцыпе, неадпаведнасць паміж ім і аўдыторыяй павялічваецца да непрымальных памераў. Дыспрапорцыі робяць творчую прадукцыю нецікавай. У нармальнай сітуацыі скрыўленні былі б пастаўлены на вартае іх месца, але тут яны без перашкод набываюць статус творчых ды грамадскіх з’яў – *і паспяхова адстрашваюць людзей ад беларускага слова*.
Заканамерная сцяна неразумення, што існуе паміж “ахопленымі беларушчынай” і “несазнацельным населеніем”. Каб пачаць чытаць па-беларуску, патрэбны стымул. Пакуль чалавек не зацікавіўся, ён не ведае, а таму і не ўлічвае і не паважае беларускіх справаў. Няма розгаласу — няма цікавасці — няма суперажывання. Іншымі словамі — усяго таго, за што нібыта змагаецца беларуская грамада. Я не бачу такой спакусы, якая прымусіла б расійскамоўных жыхароў Беларусі тлумна ісці да Беларушчыны, каб, так бы мовячы, не адстаць ад жыцця. Так было ў свой час з творамі Караткевіча, здараецца — з творамі Быкава, але гэтага мала, каб прыцягнуць увагу патрэбнай колькасці людзей да культуры, пазбаўленай Рэха. Развіццё беларушчыны ідзе дрэнна, і гістарычны досвед тлумачыць, што вынікам такога стану будуць вялікія непрыемнасці.
Польскі даследчык Павел Ясяніца піша пра гэта ў эсэ “Польская анархія”, аналізуючы прычыны згубы Рэчы Паспалітай у XVIII стагоддзі. Піша з забойчай дакладнасцю: *“… Так званы*

жыццёвы і палітычны рэалізм часам нагадвае слепату. Хворыя на яго людзі не заўважаюць відавочнага, таго менавіта, што гуманістыка ёсць магутнаю сілай, здольнай займаць пазіцыі, абсалютна недасяжныя для палітыкаў, генералаў і тэхнакратаў. Таго, хто стварае і раздае культурныя вартасці, паўсюдна цэняць. Такому народу лягчэй прабачаюць, дапамагаюць, цяжэй пагаджаюцца з ягонай крыўдай… Свет прызвычаіўся лічыць, што ў краі надвіслянскім ды наднёманскім нічога вартага не паўстае. Калі ж можна без Польшчы абысціся ў культуры, дык гэтак жа лёгка можна і на палітычнай карце”.
Вызначаная панам Грабовічам (глядзі эпіграф) задача пераарыентацыі эліты нацыі з парадыгмы выжывання да парадыгмы развіцця ў Беларусі не выконваецца. З гэтай прычыны культура наша сёння ў стагнацыі, і менавіта культура, зразуметая ў шырокім сэнсе, і цягне сёння на дно беларускую справу. Такія ў яе вага і кошт. Прачытаўшы ўсё вышэйсказанае, шмат хто, магчыма, скажа абурана: “*Ды мы ж пра гэта колькі думалі, начэй не спалі, сэрца сабе ірвалі! А нас тут папракаюць”*. Не пра тое гаворка. Патрабуецца Рэха, публічная дыскусія на вачах досыць шырокай зацікаўленай аўдыторыі. І трэба выконваць правілы гульні.
Дыскусія мусіць ісці публічна і наконт вядомых грамадскасці фактаў, усе бакі павінны разглядацца як роўныя і г. д. Імітацыі, накшталт вядомых адказаў на лісты ў “Нашай Ніве”, дзе чытач бачыць толькі катэгарычны водгук і па ім змушаны меркаваць пра твор, непатрэбныя і шкодныя.
Патрэбна пэўная абазнанасць з думкамі калегаў і гістарычнае вымярэнне. Не варта рабіць выгляд, што аўтар першым у свеце ўзняў нейкую праблему і адразу ж вычарпаў яе дарэшты. Я б зарызыкаваў такую параду: кожны аналітычны артыкул мусіць утрымліваць некалькі цытатаў іншых аўтараў — проста для стварэння рэха. Выдатна было б, каб калегі нагадвалі аўтарам іхнія ранейшыя заявы і цверджанні. Гэта зрабіла б рэвалюцыю ў нашай палітычнай думцы, дзе прароцтвы толькі зрэдку бываюць правільнымі, але амаль заўсёды фармулююцца надзвычай катэгарычна.
Асаблівасцю метаду дыскусіі (або дыялогу) ёсць дадатковыя магчымасці: паводле сваёй прыроды дыскусія асвятляе больш за свой непасрэдны прадмет. Абмяркоўваючы досыць нявінную справу, напрыклад, асабістае жыццё нейкага беларускага

магната, можна без праблем асвятліць розныя пытанні гісторыі Рэчы Паспалітае. Абы ставала кваліфікацыі. Можна ў гаворцы пра беларускі жывапіс ахапіць і разрабаванне расійцамі беларускіх збораў, і асаблівасці нашага Мастацкага музею, і адсутнасць галерэяў у абласных цэнтрах, і Бог ведае што яшчэ. Абы стала імпэту.
Людзі, якія выказваюцца публічна, сваім прыкладам вучаць іншых цікавіцца беларускімі справамі. Дзеля гэтага ім самім трэба вызначыцца: ці ёсць у іх саміх такая цікаўнасць. Стаўленне да ўзнятае праблемы адчуваецца адразу. Дрымотныя перыяды вядомага палітолага на Радыё “Свабода” не могуць выклікаць у слухача ўздыму нацыянальнага пачуцця з прычыны свайго гучання. Яны не выклікаюць мабілізацыі, бо не разлічаныя на водгук. Трэба вучыцца, трэба распрацоўваць метадалогію развіцця дыялогу. У ідэале кожны арыгінальны беларускі твор мусіць мець некалькі публічных водгукаў. Безумоўна, пакуль усё гэта чыстая мара. Але рацыянальная мара. Гэта не панацэя. Наяўнасць Рэха, або — без метафар — дыскусіі ёсць неабходнай умовай нармальнага развіцця. Існуе безліч іншых рэчаў, якія таксама патрэбныя, але яны працуюць слаба, калі няма жывой размовы пра іх. Толькі дыскусія можа абудзіць беларускую грамадскасць, дапамагчы вызначыцца з аўтарытэтамі, мэтамі, сродкамі, адным словам — стварыць для беларусаў рэальны шанс на мадэрнізацыю і адраджэнне.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 4 (18) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: **06-10-2001**
[image]

Даніла Жукоўскі

Пасткі на хайвэі постмадэрнізму

ДАНІЛА ЖУКОЎСКІ інжынэр, публіцыст, жыве ў Горадні. Публікуецца ў газэце “Наша Слова” і бюлетэні “Трэці Сэктар”. Пашыраная вэрсія гэтага артыкулу зьмешчаная на інтэрнэт-старонцы sektar.cjb.net.

Аб’ектыўная, а можа і адзіная мера перспектыўнасьці — вольны рынак сусветнай грамадскай думкі. Аблічча, якое мы дэманструем свету, пераважна правінцыйнае. Тое, што нам гэта накінулі, не падлягае сумненню, але не мяняе факту. На вольным рынку толькі нехта сапраўдны знойдзе прызнанне і ўсе спробы падмяніць сусветныя стандарты чымсьці іншым — ці то асветаю, ці хатняю другаснасцю — асуджаныя на няўдачу...

Рыгор Грабовіч, дырэктар Інстытуту ўкраінскіх даследаванняў пры Гарвардскім універсітэце, ЗША

Думаеце, гэта здань? Можа і так, — сказаў Сільвер, — але я не разумею аднаго. Мы ўсе чулі рэха. А хіба ж бачыў хто-небудзь, каб у зданяў быў цень? Дык адкуль тады ўзяцца рэху, калі не можа быць ценю? Не, хлопцы, так не бывае...

Р. Л. Стывенсан. Выспа скарбаў

1

Што за нялад такі ў Беларускім каралеўстве, чаго бракуе беларушчыне, каб шырыцца і заваёўваць прыхільнікаў, што замінае радаваць заўзятараў, якія жыць без яе не могуць, але часцяком з прыкрасцю адкладаюць газету ці кніжку замест таго, каб параіць яе сябрам і знаёмым? Адказ даць нялёгка, больш — адказы могуць розніцца. Я хачу засяродзіць увагу чытача на адным аспекце справы: дачыненнях паміж аўтарамі ды аўдыторыяй.

Блукаючы па небагатых аазісах беларускай публіцыстыкі час ад часу можна назіраць, як сярод бляклых фарбаў пустэчы раптам без дай прычыны шыбуюць угару расліны нечуваныя, кідкія, запавядаючы радыкальныя змены. Але яскравыя кветкі хутка знікаюць, прыгожае лісце засыхае — і маем чарговы, знаёмы да болю, скручаны барацьбой з асяроддзем беларускі саксаул. Арыгінальнасць і экстрэмізм, што так уражвалі ў першае імгненне, падаюцца пазней дзіцячым выбрыкам.

Бязглузда смелыя фармулёўкі і “небяспечныя” заклікі. Уважлівы чытач адразу адчувае: калі б нехта, крый Божа, пачаў дзейнічаць паводле выказаных адважным аўтарам прынцыпаў, той апынуўся б у першых шэрагах напужаных і разгубленых. Як, для прыкладу, пачуваліся б сур’ёзныя дзядзькі і цёткі, што спрабуюць даводзіць ніжэйшасць расейскае мовы за мову беларускую, калі б іхнія дзеці прынеслі са школы заданне напісаць сачыненне на гэткую тэму?

Нашы экстрэмісты пераканаяыя ў немагчымасці ўласнае перамогі. Гэта надае ім смеласць то Пушкіна назваць “някепскім паэтам”, то выкласці ў газеце думкі пра інтымнае жыццё калегі, то даць палітычны прагноз, які не мае дачынення да рэальнасці, але спраўна працуе на ненавіснікаў Беларусі. Калі няма сілы, то ўсё дазволена — на словах — гэтакі дадатак да здабыткаў “някепскага пісьменніка” Дастаеўскага. Баль безадказнасці!

Я назваў гэтую хваробу Сіндром Непераможнага Ворага (СНВ). Ейныя характэрныя рысы знаёмыя кожнаму, хто памятае нядаўняе савецкае мінулае. Тады, каб аслабіць татальны ціск

афіцыйнае дагматыкі, людзі тлумна кпілі з яе. Адзінае на той час выйсце. Сітуацыя змянілася, звычка засталася. Смех ёсць зброяй апошняга шанцу, эфектыўнай, калі небяспека відавочная і немагчымыя іншыя спосабы пратэсту. У іншых умовах ён прыпадабняецца да безадказнасці. Корань ліха, я лічу, у таемнай непавазе да сябе, у захапленні сілаю ворага, прыгажосцю і магутнасцю злога. Тая прыгажосць і моц кідае барвовыя водбліскі на постаць змагара з ім, дадаючы каларыту ягонай мізэрнасці. Гларыфікацыя ворага штурхае да адмовы ад сапраўднае барацьбы, да стварэння фантастычных праектаў, да спадзявання на цуд або да апакаліптычнага візіянерства.
Усё гэта скрайныя праявы хваробы, ейная вострая форма. У ёй маецца добры бок — “вынаходствы” лёгка заўважыць і пазнаць. Больш прыхаваныя, больш фундаментальныя праявы мае хранічны варыянт СНВ. Ці існуе, напрыклад, для чалавека з такім светапоглядам псіхалагічная магчымасць пагадзіцца калі-небудзь, што вораг не ёсць непераможным? Ці не лагічны для яго пошук хаўрусу з “меншым” злом дзеля аховы ад “большага”? Гісторыя даводзіць, што ідэалагічна абгрунтаваная логіка можа часам перамагчы жыццёвыя рэаліі, і чалавек памрэ ад смагі пасярод возера з “няправільнаю” вадою. Небяспека фальшывых крокаў рэальная і для мастака, і для палітыка, і для простага чалавека — выбаршчыка і спажыўца культуры. Адным з яскравых (бо адным з найбольш шкодных) спосабаў хаўрусавання з д’яблам з найлепшых меркаванняў я лічу некрытычнае ўслаўленне беларускіх арганізацый, створаных акупацыйнымі нямецкімі ўладамі ў другую сусветную вайну. “Яны так любілі Беларусь, што пайшлі служыць да немцаў.” Няма горшага спосабу прапаганды патрыятызму, няма лепшага спосабу адштурхнуць чалавека ад беларушчыны, паглыбіць той раскол у грамадстве, які кожны сапраўдны патрыёт, тым болей нацыяналіст, мусіць імкнуцца зменшыць. Немагчыма растлумачыць захапленне лёсам няшчасных людзей, якія апынуліся перад жудасным выбарам паміж дрэнным і горшым, акрамя як ліхаманкавым пошукам сілы, здольнай падмацаваць падупалы ў змаганні з непераможным ворагам, зняверaны ва ўласных сілах дух.
СНВ штурхае на шлях, запраграмаваны супраціўнікам, накідвае няшкодныя для ворага спосабы барацьбы ў той час, калі адказ паводле сваіх магчымасцяў мог бы даць доўгачаканы плён.

Шчыры аналіз сітуацыі, у якой людзі бралі ўдзел у фармаваннях тыпу БКА, супакоіў бы душы і сумленні тых, хто быў па абодвух баках фронту ды іхніх нашчадкаў, і гэткім супакаеннем было б дасягнута значна болей, чымся ўпартым эпатажам, той самаю да абсурду даведзенаю несавецкасцю, якая міжволі прымушае захопленага такою гульнёю чалавека паблажліва глядзець на тое, на што паблажліва глядзець нельга. За захапленнем ворагам ідзе сакралізацыя працэсу бясконцага змагання. Пытанне эфектыўнасці змагання (і якасці твораў) адыходзіць на апошні план. Нягледзячы на бутафорскі характар дзеянняў немагчыма цалкам адкінуць аўтэнтычныя звычкі вайны, перадусім звычкі партызанскія, падпольшчыцкія, дзеля таго, што вораг непераможны. Закрытасць, недавер, бясконцая перасцярога, боязь незнаёмых людзей патрэбныя ў падполлі, але якая іхняя вартасць у культуры?
Пад уплывам СНВ адбываецца спецыфічная пераацэнка вартасцяў. Змаганне з мэтаю шкодзіць ворагу фактычна адкідаецца, як немагчымае. Фармуецца асаблівы вобраз ідэальнага барацьбіта: на першы план выходзіць рамантычны аспект, спрыяючы ідэалізацыі самотніка, вузкага кола аднадумцаў, абсалютызацыі выпрацаваных у малым коле вартасцяў, без выхаду на шырэйшыя, значныя для грамадства абагульненні.
Пасля сустрэчы з маладымі прадстаўнікамі “новае хвалі” беларускае культуры, рэдактарамі “ARCHE” і “Нашай Нівы”, я доўгі час не мог упарадкаваць свае ўражанні, пакуль не знайшоў вобразу: партызанскі атрад на варожай тэрыторыі. Вялікая зямля так далёка, што яе нібыта няма. Вакол дзікі лес і варожыя засады. Ніякіх саюзнікаў. Тыя, хто выходзіць на кантакт, — падазроныя па вызначэнні. Нават тыя, дзеля каго ідзе змаганне, падаюцца часам зданямі. Самотнае змаганне поруч з выжываннем. Людзі жывуць у паўтарамільённым Менску, выдаюць газету, часопіс і лічаць сябе прадстаўнікамі еўрапейскае культуры (пра што будзе гаворка пазней), але іхняя свядомасць там, у лесе з назваю СНВ.

2.

Схільнасць да прымітывізму, ідэйныя спрашчэнні ёсць простым шляхам да ўтопіі, а далей — да таталітарызму. Беларускі

светапогляд без меры абцяжараны такою спадчынай і мусіць пашырацца за кошт нетаталітарных канцэпцый. Яны мусяць утрымліваць плюралізм, павагу да індывідуальнага, прызнанне вынікаў рынкавай канкурэнцыі (то бо выбару спажыўца), імкненне да ўліку нават супрацьлеглых інтарэсаў.
У нас жа адбылася спецыфічная мутацыя ў грамадстве: знікла здольнасць і нават разуменне вартасці для грамадства кансенсусу і дыялогу. Апошняе дзесяцігоддзе адбываецца трансфармацыя, выкліканая зменаю палітычнага рэжыму і грамадскага ладу. Ціск улады на грамадства і творцаў зменшыўся, але яны, цалкам натуральна, дзейнічаюць пад уплывам ранейшага досведу.
Сённяшнія рэдактары з незалежных выданняў не могуць прэтэндаваць на ўладу, якую мелі колішнія з дзяржаўных. Але для іх з'явілася іншая спакуса: вызваліцца ад усіх забавязанняў, самавыявіцца ў абсалютнай свабодзе.
"Перабудова" выявіла найглыбейшы крызіс культуры беларускага грамадства. Знішчаныя, лічы, усе аўтарытэты (акрамя хіба класікаў — Купалы, Коласа, Багдановіча). Дзеючыя пакаленні творчае інтэлігенцыі апынуліся ў незайздросным становішчы. Старэйшыя скампраметаваныя сваёю савецкасцю, адсутнасцю духоўнага супраціву, малым наробкам вольнае культуры. (Прыгадаем у чарговы раз, што ў беларускай літаратуры амаль няма твораў з шуфляды, там іншы раз хаваюцца найбольш ідэалагізаваныя тэксты — цікаўным раю дзённікі П. Панчанкі, надрукаваныя ў "Полымі" за 1998 год.) Маладзейшыя не падрыхтаваныя да ролі правадыроў нацыі, без традыцый вольнасці, без канструктыўнае праграмы. Пачуццё адасобленасці паглыбілася пасля 1994 году з надыходам рэваншу. Творцы схільныя лічыць сябе цэнтрам сусвету, самотны творца — пагатоў.
Лозунгі постмадэрнізму лёгка знаходзілі дарогу да сэрцаў, спавітыя прывабным вэлюмам "заходняе штучкі". Першая спакуса "постмадэрнізму" — ісці лёгкім шляхам. Навошта вырашаць праблему сталення нацыі сучаснымі сродкамі і катэгорыямі? Можна ўзняць "сучасную" тэму (прыкладам, гомасексуалізм). Праблему сталення трэба вырашаць самім. Гатовага рашэння няма, бо амаль усе народы Еўропы (і не толькі) прайшлі гэта дзесяцігоддзі (ці стагоддзі) таму. Другое можна перанесці цалкам, амаль не перарабляючы, бо гэтым

сёння занятыя людзі там, дзе праблемы іншага плану даўно прайшлі фазу першаснага развязання.
Няма забароненых тэм. Ёсць тэмы важныя, ёсць важнейшыя. Постмадэрнізм робіць выгляд, што гэта не так.
Пытанні нацыянальнага вызначэння закранаюць усіх насельнікаў Беларусі. Але ўздымаць іх па-новаму — найцяжэйшая справа. Спакусліва абысці перашкоду дужа сучасным спосабам.
Постмадэрнізм па маім меркаванні — адна з тэхналогій *дасведчанае культуры*, якая зужыла іншыя сродкі, апрацавала сваю ніву (то бо сваё грамадства), даследавала традыцыйнымі спосабамі ўсё і, адчуўшы невычэрпнасць пазнання, спрабуе неразвязаныя таямніцы адолець новым прыёмам. Дадаючы да творчага арсеналу адну маленькую прыладу, постмадэрнізм стварае шматлікія спакусы. Ідэя зыгнараваць звыклую іерархію мае глыбокі сэнс, але ўжываць яе трэба з розумам: лёгка прыпадобіцца да лекара, які робіць пацыенту касметычныя працэдуры, калі таго трэба цягнуць на хірургічны стол. Выданні поўняцца творамі малых жанраў, але вялікіх амбіцый. Дзённікавыя запісы, падарожныя нататкі, абразкі, афарызмы... Бізнэсмен-літаратар дае вострыя характарыстыкі не толькі жывым братам па варштаце, але й класікам сусветнае літаратуры. Дужа рэвалюцыйны шмат у якіх пытаннях паэта публікуе падрабязнасці асабістага жыцця калегаў, за якія класікі забілі б яго на дуэлі ці без яе. Жанр, прызначаны выключна для дужа аўтарытэтнага чалавека, стаў здабыткам шырокіх пісьменніцкіх масаў. Сапраўднае ж крытыкі страшэнны дэфіцыт. Такое ўражанне, што ў большасці аўтараў своечасова нешта ампутавалі, і яны няздольныя да крытычнага *думання*. Для іх існуюць толькі два спосабы ацэнкі: для сваіх — стос кампліментаў, для чужых — агульнае адмаўленне. “Шэдэўраў я не пабачыў”, — заўважыў калісьці вядомы бард-журналіст. А ці парупіўся ён пераканаць нас, што мае да гэтага здольнасці? Калі меркаваць па ягоных творах — хутчэй наадварот. Сваім правяць такія кампліменты, што дзівуешся. Карціць прывесці прыклады, але лепей стрымацца. Важна, што оргія ўзаемнага задавальнення не ўлічвае наяўнасці трэцяга боку — чытача, спажыўца.
Часам пры чытанні ці слуханні чарговага опусу з’яўляецца адчуванне, што з цябе здзекуюцца, робяць з цябе дурня.

Невыпадковае адчуванне: грамадства, хочацца каму ці не, мае выпрацаваныя жыццём вартасці. Калі ж хто насміхаецца ці здзекуецца з іх, то трэ папрацаваць, каб пераканаць чалавека, што ўсё робіцца яму на карысць.

Пры чым тут увогуле постмадэрнізм, скажа нехта. Хіба гэтак нельга паводзіцца пры сацрэалізме, класіцызме ці рамантызме? Хіба гэта нельга назваць уласным імем — бойкай правінцыйных снобаў за манаполію? Натуральна, што можна. "Постмадэрнізм" — маскіровачная сетка. Штука ў тым, як выдатна ён надаецца для гэтае ролі. Местачковасці ён стварае філасофскі базіс, маразму дапамагае выглядаць творчым пошукам, непавагу да чытача выстаўляе клопатам пра ягонае культурнае развіццё. У сённяшніх умовах даволі лёгка кінуць з высока ўзнятаю галавою непадмацаваную думку (прыгожа гэта робіцца ў "Вострай браме" — пад гукі велічнае мелодыі). Нескладана арганізаваць, каб не было як публічна аспрэчыць гэтую думку (чытайце ў "Нашай Ніве" адказы на лісты на апошняй старонцы: "Наша меркаванне не супадае з вашым". Усё. Кропка). Цяжэй растлумачыць, чым гэта розніцца ад практыкі вядомых, зусім не прагрэсіўных, колаў. Постмадэрнізм служыць рэцэптам у такой патрэбе.

Трэба перастаць хавацца за постмадэрнізм і звярнуцца да вырашэння даўно наспелых праблем. Неабходна пагадзіцца з тым, што на *highway* постмадэрнізму нельга трапіць, абмінуўшы тракт Багушэвіча. Не трэба нічога адрынаць. Калі новы арсенал дапаможа — выдатна. Калі не — абмяжуемся старым. Але праблемы мусяць быць вырашаныя. Бо, як казаў апостал, "калі Хрыстос не ўваскрос, то й вера нашая дарэмная".

Беларускія пісьменнікі мусяць звярнуцца да патрэбаў грамадства. Распаўсюджаная дзіўная думка, быццам яны абслугоўваюць вёску. Ці ж вясковыя дзеці не хочуць чытаць прыгодніцкія кнігі? Ці грэбуюць вясковыя падлеткі фантастыкаю? Ці дарослыя пагарджаюць дэтэктывам, любоўным раманам? Чаму ж тады беларускія пісьменнікі, якія іх нібыта абслугоўваюць ужо не адно пакаленне, не зрабілі амаль нічога ў гэтых жанрах? Чаму сёння не робяць? Заклікі ствараць творы для масавага чытача — неад'емны атрыбут кожнай дыскусіі пра беларускую мову, дзе бярэ ўдзел хаця б адзін "чалавек з вуліцы", спажывец культурнага прадукту. А што ж пісьменніцкая грамада? Маўчыць.

3.

Увесь гэты “постмадэрнізм” *маладых*, гэтаксама як дэманстратыўны традыцыяналізм *старых*, ёсць сублімацыяй прыгнечаных СНВ жаданняў. Гэта тая ж хвароба: імкненне ўхіліцца ад непрыемных чыннікаў змушае творцаў дэфармаваць ідэі так, што губляецца грамадскі рэзананс, а значыць, змяншаецца небяспека. Гэтая тактыка ў апошнія гады пазбавілася рэшткаў апраўдання.

Раней улада трымала ўсіх у рызах, але з меркаванняў прэстыжу лічыла неабходным карміць. Цяпер яна дазваляе больш свабоды, але адмаўляецца фінансаваць жыццядзейнасць свабодных творцаў. Асцярожная форма губляе сэнс, калі гаварыць пра стаўленне дзяржавы, і ўплывае згубна, калі гаварыць пра спажыўца — адзіны грунт творцы дзеля апраўдання існавання і дзейнасці. Спажывец хоча, як хацеў раней, каб мастацтва задавальняла *ягоныя* патрэбы, адказвала на балючыя пытанні, закранала душу. Раней ён лічыў, што творца раздзіраецца паміж сваімі жаданнямі і патрабаваннямі ўлады, і таму з удзячнасцю лавіў нат асобнае смелае слоўца. Сёння, разгортваючы незалежнае выданне, ён хоча, каб яно арыентавалася на яго і толькі на яго. Яму незразумела, ад каго хавае аўтар свае сапраўдныя думкі.

Беларускай культуры трэба засяродзіцца на пошуку апірышча. Якая сацыяльная група будзе падтрымліваць новую беларускую культуру? Трэба тэрмінова адказваць — словам і справай. Праблема грунту пад нагамі істотная для ўсяго беларускага руху. Мне ўяўляецца фігура “беларуса”, які абапіраецца на дзве аддаленыя адна ад адной кропкі: традыцыяналісцкую (з мянушкаю “вёска”) і авангардысцкую (з мянушкаю “моладзь”). Паміж імі большасць насельніцтва з мянушкаю “балота”. Без апоры на народныя гушчы рух немагчымы, але стоячы трываць можна. Бяда толькі, “вясковая” купіна паступова растваряецца ў навакольным “балоце”, і хутка “беларус” будзе стаяць на адной назе, як бусел. Авангардысты — асяроддзе капрызнае, утрымацца на іхняй купіне будзе складана.

Прыклад з галіны, што ў апошняе дзесяцігоддзе развівалася ці не найбольш дынамічна: гістарычныя веды. Зроблены велізарны крок ад забыцця і замоўчвання пэўных тэм і постацяў

нашае мінуўшчыны да іхняе прэзентацыі шырокім колам. Відавочныя змены да лепшага. Але ж… Названыя ніжэй часавыя межы, безумоўна, будуць рознымі ў розных людзей, але з'ява закранула амаль усіх, хто меў адпаведныя зацікаўленні.
Спачатку, недзе да 1992 году, усё, што тычылася беларускае гісторыі, чыталася нагбом. Кожны артыкул быў адкрыццём, факт — падзеяй. Мінуўшчына набірала больш акрэсленыя рысы, засялялася выдатнымі асобамі. Пачалі з'яўляцца новыя пытанні: ужо не "хто?" і "што?", але "як?" і "чаму?". На гэтыя пытанні здавальняючых адказаў за ўсе гады з'явілася вельмі мала.
У беларускай культурнай дзейнасці з зразумелых прычынаў непрапарцыйна шмат месца мае першасная індактрынацыя і асветніцтва. Гэта ледзьве не ўсё, на што свядомыя беларусы былі здатныя ва ўмовах уціску. Зразумела і даравальна. Іншая справа, у свядомасці беларускай грамады амаль не прысутнічае разуменне, што такая практыка заганная, што яна ставіць пад пытанне наша права звацца нацыяй.
Сапраўдная, але збольшага патэнцыйная, база беларушчыны — не міфічная вёска і не менш міфічная моладзь. Гэта сярэдні клас, што складаецца з культурных людзей, якім недастаткова простых адказаў на складаныя пытанні, прапанаваных ім маскультурай. Гэтыя людзі патрабавальныя. Да іх трэба звяртацца сур'ёзна, з поўнаю самааддачаю. Яны патрабуюць сапраўдных сэнсу і пачуцця, бо ў іх ёсць выбар: яны могуць шукаць задавальнення сваіх патрэбаў па ўсім свеце. Імітацыі іх адстрашваюць.
Творцы нашыя схільныя да нарцысізму. Яны так шмат увагі аддаюць сабе і сваім калегам, што часам забываюцца на навакольны свет. А потым, схамянуўшыся, крычаць "Бяз нас! (краіна жыве — **Аўт**.)" і сыплюць недарэчныя папрокі сабе ды іншым: *"Калі фармаваліся ідэі Адраджэньня (Ідэальнай Беларусі), хіба можна было ўявіць сабе такую канцэпцыю Беларускай Дзяржавы, якая б адначасна спалучала ў сабе плён савецкай, супольнай беларуска-расейскай і нацыянальна-гістарычнай спадчыны. Хіба што як здзек тады магла быць успрынятая прапанова задзіночыць у межах аднаго дыскурсу ВКЛ і БССР, Слуцкае паўстанне і савецкую партызанку, Астроскага і Жукава, Рэч Паспалітую і СССР, Скарыну і трактар "Беларусь", Грунвальд і вясну 45-га, Дамейку і Чэрскага…"*, — як піша

Валянцін Акудовіч у артыкуле да 10-годдзя аднаўлення “Нашай Нівы”. Хіба можа быць плённым для грамадства дыскурс, які не спалучае гэтых нібытных антыномій? Хіба наша нацыянальна-гістарычная спадчына не ўтрымлівае ў сабе XIX і XX стагоддзяў? У савецкія часы выключалі адну палову спісу, у парыве вызваленчых эмоцыяў — другую. Гэта нармальна — для групы пад уплывам эмоцый. Для эліты нацыі — не. Калі жарсці прыціхлі, трэ было працаваць, каб сінтэз таго, што гісторыя незваротна спалучыла ў жыцці, адбыўся і ў галовах. Не зрабілі. Не адчулі неабходнасці. Не пачулі заклікаў перакінуць масток паміж *незалежнасцю* і *кілбасою* (а колькі было тых заклікаў!), мовай і дабрабытам, Скарынам і масавай культураю. Грунвальд і вясну 45-га не раз згадвалі разам як прыклады змагання з немцамі. Але мусіць ініцыятары гэтага “блюзнерства” не ўваходзяць у “Мы” Валянціна Акудовіча.

Не завязаўся шырокі дыялог, і кандыдаты ў ідэолагі засталіся кожны на сваёй купіне са сваім экстрэмізмам. А для мяне няма бездані паміж Дамейкам і Чэрскім.

Сёння сп. Дынько заклікае да стварэння мастацтва супраціву. Добры заклік. Голы пратэст малапрыдатны. Нельга апеляваць толькі да разбуральных памкненняў. Мастацтва мусіць арыентавацца на стварэнне ў грамадстве новае якасці шляхам задавальнення патрэбаў: старых і тых, што паўсталі ў новай сітуацыі. Ён піша: *“Перад сучаснай беларускай культурай стаіць шэраг задач. Задача “разьдзяржаўліваньня” культуры, падтрымкі незалежнай ініцыятывы. Таксама — праца па запаўненьні лякунаў, што ўтварыліся ў выніку саветызацыі: толькі карпатлівай будзённай працай, ад перакладу сусьветнае клясыкі на беларускую мову да распрацоўкі новых навучальных курсаў, можна дабіцца культурнай паўнакроўнасьці. Важна таксама пераадолець палітычны нігілізм, тую алергію мастацтва на палітыку, што выпрацоўвалася як рэакцыя на савецкі ідэалягічны прымус. Нагвалт патрэбная ангажаванасьць дзеячаў культуры ў грамадзкія справы. На парадку дня стаіць стварэньне мас-культуры. Ад яе будзе залежаць ня толькі самааздараўленьне культурных мэханізмаў як такіх, унезалежненьне іх ад дзяржаўнага кантролю, але і, напэўна, умацаваньне беларускай дзяржаўнасьці”.*

Я маю намер дадаць некалькі сваіх пажаданняў творцам. Перш за ўсё — сціпласці. Разумення таго, што аўдыторыя не саступае

ім у адукацыі і мастацкім гусце. Большай увагі да спажыўца (як казаў Л. Баршчэўскі, пісаць трэба не для народу, а для чытача). Аўдыторыя ў нас не распешчаная. Гэта даводзіць фенаменальная папулярнасць твораў У. Караткевіча. Нягледзячы на фантастычнасць і відавочную ўтапічнасць некаторых ягоных гістарычных канцэпцый, Караткевіч зрабіўся культавай фігурай для сведамых беларусаў, а пэўныя падкрэслена несавецкія аўтары выклікаюць хутчэй неразуменне, а то й агіду.
Я заклікаю творцаў мацаваць і дасканаліць сваю нацыянальную свядомасць. Лічыцца, шго ў беларусаў у цэлым яна слабая, але ў творцаў-нацыяналістаў моцная. Гэта памылковае меркаванне. У апошніх яна таксама слабая. Калі параўнаць моц карпаратыўнай салідарнасці і братніх пачуццяў да сваіх супляменнікаў, то першае ў 999 выпадках з 1000 будзе мацнейшым. Гэта норма для беларусаў (тыя, хто служыў у савецкім войску, лёгка прыгадаюць, што толькі дзве нацыі не гуртаваліся па нацыянальнай прыкмеце: расійцы і беларусы). Гэтую норму трэба змяніць.

4.

Мацнейшая нацыянальная свядомасць будзе падштурхоўваць творцаў больш цвяроза ацэньваць дзейнасць сваіх калегаў прынамсі публічна, у друку, і прыслухоўвацца да спажыўцоў, нават калі яны кажуць непрыемнае. Мы, беларусы, маем супольныя праблемы, іх нельга вырашыць для нейкае групы, не вырашыўшы для ўсяе нацыі. І ёсць падставы меркаваць, што нацыі гэта па сілах. Каб дасягнуць вышэйпамянёнай “культурнай паўнакроўнасці” шмат трэба зрабіць і збольшага вядома, што. Пытанне, як гэта рабіць, чаму гэта не робіцца? І вось тут мне прыгадваецца славуты аргумент Джона Сільвера. Менавіта Рэха і ёсць той нястачай. Рэха — водгук, які мусіць мець падзея, каб стацца падзеяй, каб адчуць, што слова трапіла паводле прызначэння. Як караля стварае атачэнне, так культурным і іншым справам дае жыццё грамадскае рэха. (Для беларусаў гэта заўжды было праблемай. “Людзьмі звацца!”, “А хто там ідзе?”, “Я ж ціха йграю, хто ж ціхіх прымеце?”, — ці гэта не прага водгукаў, ці не пошук рэакцыі атачэння?) Рэха няма, калі вакол крыніцы гуку няма аб’ектаў. Дзіўна ці не, але

Ю. Станкевіч у “Крыніцы” прапанаваў менавіта такі выраз: Вялікая Інтэлектуальная Пустэча.
Наймацней гэта б’е па тых, чые словы гінуць без знаку ў наваколлі, і выклікае шэраг хваравітых рэакцый. Лягчэй за ўсё заўважыць празмерную вастрыню некаторых выказванняў, непатрэбную правакацыйнасць. Чалавек не хоча заставацца без рэха і пачынае завастраць фармулёўку, крычаць, вырабляць розныя штукі, каб прыцягнуць увагу. Гэта не толькі праявы безадказнасці, пра што гаварылася раней. Я схільны бачыць у такіх публікацыях акт адчаю спакутаваных без Рэха людзей. Наўпроставым наступствам нястачы Рэха з’яўляецца, між іншым, страта творцамі пачуцця маштабу. Сталыя рэпе́ры стварае толькі жывая аўдыторыя, здольная жвава рэагаваць. Інакш не могуць існаваць крытэрыі грамадскай вартасці і мастацкай якасці! Акцэнты змяняюцца пад уплывам чыннікаў, што дзейнічаюць у межах вузкага кола і, непазбежная ў прынцыпе, неадпаведнасць паміж ім і аўдыторыяй павялічваецца да непрымальных памераў. Дыспрапорцыі робяць творчую прадукцыю нецікавай. У нармальнай сітуацыі скрыўленні былі б пастаўлены на вартае іх месца, але тут яны без перашкод набываюць статус творчых ды грамадскіх з’яў – *і паспяхова адстрашваюць людзей ад беларускага слова*.
Заканамерная сцяна неразумення, што існуе паміж “ахопленымі беларушчынай” і “несазнацельным населеніем”. Каб пачаць чытаць па-беларуску, патрэбны стымул. Пакуль чалавек не зацікавіўся, ён не ведае, а таму і не ўлічвае і не паважае беларускіх справаў. Няма розгаласу — няма цікавасці — няма суперажывання. Іншымі словамі — усяго таго, за што нібыта змагаецца беларуская грамада. Я не бачу такой спакусы, якая прымусіла б расійскамоўных жыхароў Беларусі тлумна ісці да Беларушчыны, каб, так бы мовячы, не адстаць ад жыцця. Так было ў свой час з творамі Караткевіча, здараецца — з творамі Быкава, але гэтага мала, каб прыцягнуць увагу патрэбнай колькасці людзей да культуры, пазбаўленай Рэха. Развіццё беларушчыны ідзе дрэнна, і гістарычны досвед тлумачыць, што вынікам такога стану будуць вялікія непрыемнасці.
Польскі даследчык Павел Ясяніца піша пра гэта ў эсэ “Польская анархія”, аналізуючы прычыны згубы Рэчы Паспалітай у XVIII стагоддзі. Піша з забойчай дакладнасцю: *“… Так званы*

жыццёвы і палітычны рэалізм часам нагадвае слепату. Хворыя на яго людзі не заўважаюць відавочнага, таго менавіта, што гуманістыка ёсць магутнаю сілай, здольнай займаць пазіцыі, абсалютна недасяжныя для палітыкаў, генералаў і тэхнакратаў. Таго, хто стварае і раздае культурныя вартасці, паўсюдна цэняць. Такому народу лягчэй прабачаюць, дапамагаюць, цяжэй пагаджаюцца з ягонай крыўдай… Свет прызвычаіўся лічыць, што ў краі надвіслянскім ды наднёманскім нічога вартага не паўстае. Калі ж можна без Польшчы абысціся ў культуры, дык гэтак жа лёгка можна і на палітычнай карце”.
Вызначаная панам Грабовічам (глядзі эпіграф) задача пераарыентацыі эліты нацыі з парадыгмы выжывання да парадыгмы развіцця ў Беларусі не выконваецца. З гэтай прычыны культура наша сёння ў стагнацыі, і менавіта культура, зразуметая ў шырокім сэнсе, і цягне сёння на дно беларускую справу. Такія ў яе вага і кошт. Прачытаўшы ўсё вышэйсказанае, шмат хто, магчыма, скажа абурана: “*Ды мы ж пра гэта колькі думалі, начэй не спалі, сэрца сабе ірвалі! А нас тут папракаюць”*. Не пра тое гаворка. Патрабуецца Рэха, публічная дыскусія на вачах досыць шырокай зацікаўленай аўдыторыі. І трэба выконваць правілы гульні.
Дыскусія мусіць ісці публічна і наконт вядомых грамадскасці фактаў, усе бакі павінны разглядацца як роўныя і г. д. Імітацыі, накшталт вядомых адказаў на лісты ў “Нашай Ніве”, дзе чытач бачыць толькі катэгарычны водгук і па ім змушаны меркаваць пра твор, непатрэбныя і шкодныя.
Патрэбна пэўная абазнанасць з думкамі калегаў і гістарычнае вымярэнне. Не варта рабіць выгляд, што аўтар першым у свеце ўзняў нейкую праблему і адразу ж вычарпаў яе дарэшты. Я б зарызыкаваў такую параду: кожны аналітычны артыкул мусіць утрымліваць некалькі цытатаў іншых аўтараў — проста для стварэння рэха. Выдатна было б, каб калегі нагадвалі аўтарам іхнія ранейшыя заявы і цверджанні. Гэта зрабіла б рэвалюцыю ў нашай палітычнай думцы, дзе прароцтвы толькі зрэдку бываюць правільнымі, але амаль заўсёды фармулююцца надзвычай катэгарычна.
Асаблівасцю метаду дыскусіі (або дыялогу) ёсць дадатковыя магчымасці: паводле сваёй прыроды дыскусія асвятляе больш за свой непасрэдны прадмет. Абмяркоўваючы досыць нявінную справу, напрыклад, асабістае жыццё нейкага беларускага

магната, можна без праблем асвятліць розныя пытанні гісторыі Рэчы Паспалітае. Абы ставала кваліфікацыі. Можна ў гаворцы пра беларускі жывапіс ахапіць і разрабаванне расійцамі беларускіх збораў, і асаблівасці нашага Мастацкага музею, і адсутнасць галерэяў у абласных цэнтрах, і Бог ведае што яшчэ. Абы стала імпэту.
Людзі, якія выказваюцца публічна, сваім прыкладам вучаць іншых цікавіцца беларускімі справамі. Дзеля гэтага ім самім трэба вызначыцца: ці ёсць у іх саміх такая цікаўнасць. Стаўленне да ўзнятае праблемы адчуваецца адразу. Дрымотныя перыяды вядомага палітолага на Радыё “Свабода” не могуць выклікаць у слухача ўздыму нацыянальнага пачуцця з прычыны свайго гучання. Яны не выклікаюць мабілізацыі, бо не разлічаныя на водгук. Трэба вучыцца, трэба распрацоўваць метадалогію развіцця дыялогу. У ідэале кожны арыгінальны беларускі твор мусіць мець некалькі публічных водгукаў. Безумоўна, пакуль усё гэта чыстая мара. Але рацыянальная мара. Гэта не панацэя. Наяўнасць Рэха, або — без метафар — дыскусіі ёсць неабходнай умовай нармальнага развіцця. Існуе безліч іншых рэчаў, якія таксама патрэбныя, але яны працуюць слаба, калі няма жывой размовы пра іх. Толькі дыскусія можа абудзіць беларускую грамадскасць, дапамагчы вызначыцца з аўтарытэтамі, мэтамі, сродкамі, адным словам — стварыць для беларусаў рэальны шанс на мадэрнізацыю і адраджэнне.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 4 (18) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: **06-10-2001**
[image]

Анатоль Сідарэвіч

Да гішпанскага сябра

Лісты пра мэтад і гонар

АНАТОЛЬ СІДАРЭВІЧ філёзаф, лёгік, літаратуразнаўца, ідэоляг адроджанай беларускай сацыял-дэмакратыі. Яго першая апошняя публікацыя ў часопісе — артыкул “Поўны не акадэмічны” (ARCHE Скарына, №6/2000).

Ліст першы

Дарагі Мігель,

я ўхваляю Тваё жаданьне вывучыць гісторыю беларускае літаратуры і магу толькі разьвесьці рукамі ў адказ на Тваё пытаньне: а што чытаць? Кнігі, напісаныя за камуністычным часам, для гэтае мэты (вывучэньня гісторыі) не надаюцца. Першая іх вада — замоўчваньне даробку шмат каго зь пісьменьнікаў, замоўчваньне саміх імёнаў; другая — замоўчваньне твораў тых пісьменьнікаў, чые прозьвішчы было дазволена згадваць безь зьневажальных эпітэтаў, і нават тых аўтараў, якім камуністычны рэжым паставіў помнікі; трэцяя вада — абавязак гісторыка ўлічваць афіцыйныя (выпрацаваныя ў інстанцыях КПСС) ацэнкі творчасьці тых ці іншых пісьменьнікаў, ацэнкі тых ці іншых твораў, характарыстыкі тых ці іншых інстытуцыяў (палітычных партый, рэдакцыяў газэт, выдавецкіх таварыстваў і да т. п.), у якіх пісьменьнікі

працавалі, рэалізоўвалі свой творчы і грамадзка-палітычны патэнцыял. Гісторык павінен быў глядзець на ўсё праз прызму “адзіна правільнае” ленінска-сталінскае дактрынальнае вучэнне, ленінска-сталінскае, а не марксісцкае; рацыю мае нобелеўскі ляўрэат Чэслаў Мілаш, які адмыслова зьвяртае ўвагу на адрозьненьні паміж марксізмам і ленінізмам-сталінізмам ды піша, што, прыкладам, творчасьць такога выдатнага дасьледчыка літаратуры й эстэтыка-марксіста, як Дзьёрдзь Лукач, была асуджана партыяй, бо выходзіла за межы, акрэсьленыя “Палітычным Бюро ў Маскве”[1].

[1] **Мілаш Ч. Скутак розуму. Менск-Вільня, 2000. С. 210.**

Думаю, Табе ня трэба тлумачыць, што такое афіцыйная ідэалёгія й цэнзура.

Ты пішаш, што наш сябар Багдан прывёз у Таледа два тамы “Гісторыі беларускай літаратуры ХХ стагоддзя”, напісанае ў Інстытуце літаратуры Нацыянальнае Акадэміі навук Беларусі. Праўду кажучы, я не чытаў гэтых кніг, а таму не магу адказаць на Твае пытаньні. Абяцаю: як толькі прачытаю абодва тамы, напішу Табе ліст, у якім пастараюся адказаць на Твае пытаньні. Прывітаньне Тваім бацькам, сястры, заўзятару “Барсы” Фэдэрыка (спадзяюся, ён ня ўзяўся загрудкі з заўзятарам “Рэалу” Багданам).

Да наступнага ліста.
З прывітаньнем
Анатоль

Ліст другі

Салют, Мігель!

Собіла ж Багдану прывезьці Табе тыя два тамы! Ён сам не чытаў, бо калі б прачытаў, не павёз бы іх у Кастыльлю. Гэтая кнігі нельга даваць чалавеку без грунтоўнай гістарычнай і літаратурнае падрыхтоўкі, а тым больш іншаземцу, які ня знаёмы з гісторыяй Беларусі, яе духовае культурнае жыцьцё. Тое пытаньні выдатна сьведчаць пра тое.

Вось Ты пытаешся, што гэта за газэты “Наша Доля”, “Наша Ніва”, часопісы й альманахі “Загляне сонца і ў наша ваконца”, “Палачанін” ды “Саха”. А я вымушаны пісаць Табе, што *“Актывізацыя кнігадрукавання, з’яўленне першых пасьляваенных выданняў на беларускай мове, газет “Наша Доля”, “Наша Ніва”, часопісаў і альманахаў “Загляне сонца і ў наша ваконца”, “Палачанін”, “Саха” і інш. — усё гэта садзейнічала* [2]

[2] **Можна даведацца, што ў лістападзе 1918 г. на Віленскай і Менскай пралягала лінія фронту і перавыконца”, пераб**

Францішкаў Ант. Нарысы гісторыі літаратуры Беларусі. Т. 2. Мн., 1994. С. 18.

1-м томе — вынік недагляду й аўтара, і акадэміка Тараруя, і проста рэдактара, бо насамрэч не было такіх часопісаў, альманахаў, як “Загляне сонца і ў наша ваконца” і “Палачанін”.

Наагул, Мігель, у гэтых кнігах шмат і стылістычнай нядбайнасьці, і фактычных памылак[2], і звычайных апісак — таго, што называюць памылкамі друку, або карэктарскімі памылкамі. Дарэчы, у абодвух тамах не пазначана прозьвішча карэктара. Значыць, яго не было.

Ты зьвяртаеш увагу на напісанае акадэмікам Іванам Навуменкам (т. 1, с. 123): *“Спачатку Купала пішацца польскай мове. Але вось трапляюць яму ў рукі беларускія (магчыма, пасля знаёмства з пісьменнікам Ядвігінам (Антонам Лявіцкім)), і, як прызнаецца паэт, “усё*

“пайшло насмарку””. Купала ўсведамляе, што пісаць беларуску, што гэта ягонае сапраўднае прызванне”. Звярнуў ўвагу на гэты абзац, Ты пытаешся ў мяне і Багдановіча: дзе праўда? Вы мне казалі, што Купала стаў беларускім пасьля сустрэчы зь беларускімі сацыялістамі, але ня ведаў, што акадэмік піша...”. Праўда на нашым баку, Мігель. У 1961 г. у літаратуры зьявілася сьцьвярджэньне, што Янка Купала і беларускага руху далучылі браты Іван і Антон Луцэвічы, Алесь Бурбіс, Сяргей Скандракоў ды Ўладзімер Ліпскі. У 1999 г. гэты тэзыс быў падмацаваны ў артыкуле “Янка Луцэвіч”[4], у якім працытаваны адпаведны дакумэнт рукою Янкі Купалы. Мушу зацеміць: акадэмік ня толькі тым, што піша праўду (*“магчыма”*). Акрамя таго, дакумэнт недакладна цытуе Янку Купалу. Нарэшце, дакумэнт (дакладней, яго фатакопія) захоўваецца ў Літаратурным музэі Янкі Купалы, і пры жаданьні акадэмік — аўтар кнігі пра Купалу! — мог бы прачытаць напісанае паэтам, зрабіць гіпотэзу, якая пярэчыць даўно вядомаму факту. А ты зробіш: акадэмік-купалазнавец не прачытаў як сваіх Купалы. Не зьдзіўляе тое, пра што Ты пішаш далей. А Ты можаш з прачытаных тэкстаў зразумець, у якіх умовах разьвівалася беларуская літаратура, якія былі агульныя і спэцыфічныя заканамернасьці яе разьвіцьця, чаму менавіта гэткая, а ня іншая пэрыядызацыя. Цябе цікавіць разьвіцьцё відаў эпасу, лірыкі й драмы, зьяўленьне тых ці іншых жанраў. Я спагадаю Табе, дружа.

---

[2] Гл.: **Сідарэвіч А.** *Пра Антона Луцкевіча (заўвагі да выдання)* // **Зьвязда**, 1993, 3 ліп.; **Зуенка А.** Пра выданьне твораў Янкі Купалы // **Полымя**, 1993, № 8; **Бурбіс А.** Пра выданьне твораў Янкі Купалы // **Полымя**, 1993, № 8; **Самойла Ю

Прачытаўшы абодва тамы, я зразумеў, што галоўная праблема, якая стаяла перад кіраўнікамі (рэдакцыйнай калегіяй) “Гісторыі беларускай літаратуры ХХ стагоддзя”, была праблема мэтадалёгіі. Прытрымлівацца ленінска-сталінскае мэтадалёгіі нават у Беларусі і нямодна, і непрадукцыйна, а іншае яны, мусіць, баяцца.

Што такое ленінска-сталінская мэтадалёгія, у якіх адносінах да марксісцкае яна знаходзіцца?

Вядома, што “*Маркс не надаваў першачарговае ўвагі пытаньню мэтаду ні на адным з этапаў эвалюцыі сваіх поглядаў*”[5]. Акрамя таго, філёзаф Маркс *“паступова ішоў ад філязофіі да гісторыі, затым да эканомікі як асноўнага абсягу дасьледаваньня”*[6]. Ён ніколі дакладна не выкладаў сваіх эпістэмалягічных прынцыпаў. За Маркса гэтыя прынцыпы дадумвалі і абгрунтоўвалі Фрыдрых Энгельс, Георгі Пляханаў, Уладзімер Ленін ды інш., аднак гэта рабілася без уліку значнае часткі Марксавых прац (асабліва раньняга, маладога Маркса, які займаўся менавіта філязофіяй).

[5] **Мандэрштам Я. Размышления о марксизме. Минск, 1991. С. 65–66.**

[6] **Там самае. С. 65.**

І вось тут нас чакае самае цікавае. Разьвіваючы *палітычную* філязофію Маркса, Ленін прынцып клясавае барацьбы (клясавасьці й партыйнасьці) перанёс на філязофію, літаратуру ды мастацтва, на ўсё грамадазнаўства. *Абсалютызацыя барацьбы клясавых інтарэсаў, іх незаміральнасьці і ёсьць сутнасьць ленінізму-сталінізму.* Але вядома таксама, што клясавае ў ленінізьме-сталінізьме насамрэч зводзіцца да партыйнага. Лідэры бальшавіцкае партыі проста цудоўна прызнавалі, што гэтак званая дыктатура пралетарыяту ёсьць дыктатураю партыі. Паводле ленінскага разуменьня дыялектыкі, інтарэсы партыі (як “авангарду”, “перадавога атраду пралетарыяту”) абвяшчаліся інтарэсамі ўсяго пралетарыяту. Паводле афіцыйнай догмы, усталяваньне “дыктатуры пралетарыяту” азначала не спыненьне клясавае барацьбы, а працяг у новых формах і новымі сродкамі[7]. Тэорыя Леніна Сталіна пра абвастрэньне клясавае барацьбы ў міры прасоўваньня грамадзтва да сацыялізму арганічна вынікала з тэорыі й практыкі ленінізму. Акурат Ленін быў ініцыятарам прыняцьця пастановы пра адзінства партыі (1921), якое забараняліся стварэньне фракцыяў і ідэйныя спрэчкі. У 1922 г. Ленін выслаў за мяжу вялікую групу філёзафаў, сацыёлягаў і эканамістаў. Калі хворы Ленін зьлёг, пачалася

[7] **Глуховский Ф. Ф., Кохан М. М. Философский энциклопедический словарь. Минск, 1983. С. 165, 259. Зварот ўзяты: сьнежань 2015 г.**

барацьба з іншадумцамі ў самой партыі, якая прывяла да ўстанаўленьня дыктатуры Сталіна. У ідэйных спрэчках усё рэшце рэшт вырашаў *argumentum ad baculinum*. Адпаведна клясавым (партыйным) інтарэсам было абвешчана, што адпавядала інтарэсам самога Сталіна й яго атачэньня. Бючую ўсталяваная жорсткая партыйная цэнзура, якую ніводзін параўнаць ні з царскаю (да 1917 г.), ні з польскаю (1918–1939). Калі царская й польская цэнзуры сачылі за палітычным зьместам твораў навукі ды мастацтва[8], то бальшавіцкая забараняла навуковыя творы, у якіх не праводзіўся прынцып клясавасьці й партыйнасьці, а мастацкія творы яшчэ й таму, што іх форма не адпавядала ўстаноўленым у партыйных кабінэтах канонам (гэтак званы прынцып народнасьці, зразумеласьці твораў літаратуры і мастацтва; адкуль барацьба з фармалізмам, абстракцыянізмам у літаратуры, жывапісе й г.д., адсюль і савецкі андэграўнд). Гэтая ж сапраўды татальная цэнзура.

Энгельс (напр., у лісьце да Карла Каўцкага за 23 кастрычніка 1891 г.) дапусьціць ня мог, што ў партыі можа быць уведзена цэнзура, Эдуард Бэрнштайн як дзікунства разглядаў ідэю ня думку аб партыйнасьці навукі, а для бальшавікоў Расеі, Савецкага Саюзу, для камуністычных краін гэта стала нагодай. Нягледзячы на публікацыю працаў маладога Маркса, нягледзячы на сьмерць Сталіна ды хрушчоўскую “адлігу”, пераглядаць прынцыпы, выпрацаваныя Леніным, было забаронена. *“Навуковым” быў такі падыход да ацэнкі мастацкіх зьяваў і працэсаў, які адпавядаў ленінска-клясавым догмам з улікам пэўных кан’юнктурных змяненьняў, якія былі санкцыянаваныя Палітычным Бюро ў Маскве, цэнтрам ідэалягічнымі службамі партыі.* Калі гэта называць марксізмам, дык усё ж такі з засьцярогаю: марксізм у ленінска-сталінскай інтэрпрэтацыі, які стаіць вельмі далёка ад заходняга марксізму Лукача, Карла Корша, Тэадора Адорна, Гербэрта Маркузэ, Макса Горкгаймэра, Вальтэра Бэн’яміна, Луі Альтюсэра, Гальвана Дэльля Вольпэ, Жана-Поля Сартра, Анры Лефэўра ды інш.[9]

Калі б аўтары стваралі сапраўды *акадэмічную гісторыю літаратуры*, яны мусілі б кіравацца даўно апрабаванай гегелеўска-марксісцкім мэтадам узыходжаньня ад абстрактнага да канкрэтнага[10]. Гэты мэтад выдатна працуе, калі

[8] **Самі сабою, не дапускаліся нападкі на кіраўніцтва, на Цюрму, Царкву, забараняўся нават нічыя дзеяньні. І ніхай краіне толькі пачалі друкаваць працы Энгельс, Маркс, Ленін, Сталін, Троцкі, Адорна, Гальвана Дэльля Вольпэ, Анры Лефэўра, Жана-Поля Сартра, Гербэрта Маркузэ, Макса Горкгаймэра, Вальтэра Бэн’яміна, Луі Альтюсэра, Гальвана Дэльля Вольпэ, Жана-Поля Сартра, Анры Лефэўра ды інш.**

[9] **У нашай краіне толькі пачалі друкаваць працы Энгельс, Маркс, Ленін, Сталін, Троцкі, Адорна, Гальвана Дэльля Вольпэ, Анры Лефэўра, Жана-Поля Сартра, Гербэрта Маркузэ, Макса Горкгаймэра, Вальтэра Бэн’яміна, Луі Альтюсэра, Гальвана Дэльля Вольпэ, Жана-Поля Сартра, Анры Лефэўра ды інш.**

[10] **Самі сабою, не дапускаліся нападкі на кіраўніцтва, на Цюрму, Царкву, забараняўся нават нічыя дзеяньні. І ніхай краіне толькі пачалі друкаваць працы Энгельс, Маркс, Ленін, Сталін, Троцкі, Адорна, Гальвана Дэльля Вольпэ, Анры Лефэўра, Жана-Поля Сартра, Гербэрта Маркузэ, Макса Горкгаймэра, Вальтэра Бэн’яміна, Луі Альтюсэра, Гальвана Дэльля Вольпэ, Жана-Поля Сартра, Анры Лефэўра ды інш.**

ленінска-сталінскую абсалютызацыю клясавае барацьбы (тое, што сацыяльныя або клясавыя інтарэсы былі, ёсць і будуць, што яны знаходзіліся, знаходзяцца й будуць знаходзіцца ўва ўзаемнай супярэчнасьці, ніхто не аспрэчвае), а таксама ўласьцівую бальшавікам аргумэнтацыю (*argumentum ad ignorantiam, argumentum externum, argumentum ad hominem*, і інш.). Каб захаваць прынцып гістарызму, зусім неабходна адмовіцца ад аксіялягічнага падыходу да гісторыі (г. зн. дазволеных даўніх падзеяў з пункту гледжаньня сучасных вартасьцяў).

трэцібнай рэпрэзэнтацыі (адзіная рэдакцыя) // ARCHE, 2001, №2. Варта адцеміць, што за невыхаўніх мастакоў і эстэтыкаў найбольш пашанцавала Ўмбэрта Эка. Заўважаныя наступныя пераклады ягоных твораў: Шэсьць шпацыроў па мастацкіх лясох // Фрагмэнты, 1997, № 1—2; Паэтыка адкрытага твору. // ARCHE, 1999, №1; Пахвала святому Тамашу. Да новага Сярэднявечча. Трызненне Сярэднявеччам // Крыніца, 2001, №5/6. Я не сустракаў у айчыннай літаратуры дасьледаваньняў

заходняга марксізму наагул і творчасьці яго асобных прадстаўнікоў, калі не лічыць прадмовы Сяргея Дубаўца да кн.: Сартр Ж.-П. Мур: Апавяданні. Менск, 1991.

[10] Мэтад гэты прыдуманы ня Гэгелем і ня Марксам, але яны былі тымі філёзафамі, якія карысталіся ім асэнсавана.

На добры лад трэ было б напісаць агульныя ўводзіны дзеля таго, каб:
1) аргумэнтаваць менавіта такую, а ня іншую пэрыядызацыю гісторыі нашае літаратуры, і
2) вызначыць агульныя заканамернасьці яе разьвіцьця ў XX ст. Пэрыядызацыя, прапанаваная рэдакцыйнаю калегіяй, у цэлым ня можа выклікаць пярэчаньняў. Беларуская літаратура прайшла ў XX ст. тры стадыі ў сваім разьвіцьці: 1) дакладкую, 2) савецкую і 3) постсавецкую. Савецкая стадыя ў разьвіцьці беларускае літаратуры пачалася пасьля падпісаньня Рыжскага трактату паміж Польшчай з аднаго боку, Савецкай Расіяй і Савецкаю Ўкраінаю — з другога. Паводле гэтага трактату

[11] Доктар Станіслаў Станкевіч у свой час прапанаваў

заходняя частка нашае краіны была перададзена пад тэрмін
Польшчы. Пачалося 18-гадовае адносна мірнае жыццё
частак Беларусі ў стабільных межах. Паралельна
беларуская савецкая[11] й заходнебеларуская літаратура.
У 1939 г. (пасьля заключэньня пакту Рыбэнтропа—Молатава)
Заходняя Беларусь трапіла пад уладу Масквы ў складзе БССР.
Можна было б гэтаю датаю адзначыць пачатак новага пэрыяду
савецкае стадыі ў разьвіцьці нашае літаратуры, аднак ня менш
важным для Беларусі й сьвету вынікам пакту Рыбэнтропа—
Молатава стала нямецка-савецкая вайна 1941—1945 гг. Гэта
цалкам асобны пэрыяд у гісторыі беларускае савецкае
літаратуры. І ў гісторыі беларускае несавецкае літаратуры
таксама.
Натуральна, што наступны пэрыяд гісторыі беларускае
літаратуры працягваецца ад заканчэньня нямецка-савецкае
вайны да сьмерці Сталіна, а дакладней да XX зьезду КПСС
(1956), калі пачынаецца "адліга". Гэты пэрыяд доўжыўся да
1966 году. Менавіта тады нэасталіністы аднавілі пасаду
генэральнага сакратара партыі, Палітычнае Бюро, а Абрама
Тэрца ды Мікалая Аржака пасадзілі на лаву падсудных (хоць
пачатак апошняга пэрыяду ў гісторыі беларускае савецкае
літаратуры можна датаваць і кастрычнікам 1964 г. — месяцам
прыходу да ўлады Леаніда Брэжнева). Але як будзе праведзена
пэрыядызацыя ў трэцім і чацьвёртым тамох — пабачым.
Ужо ў 20—30-х гг. мы сустракаемся з эміграцыйнаю
беларускаю літаратураю, але найбольшы ад'езд літаратараў за
мяжу (на Захад) зьдзеяўся ў канцы другое сусьветнае вайны.
Беларуская савецкая й беларуская эміграцыйная літаратуры
разьвіваюцца паралельна цягам усяго пасьляваеннага часу (да
перастройкі). Савецкая эпоха заканчваецца тады, калі
пачынаюцца адкрытыя, свабодныя кантакты памі
пісьменьнікамі на Бацькаўшчыне і на эміграцыі. Ня
забываць таксама, што існуе беларуская літаратура ў
Польшчы. Гэта не эміграцыйная літаратура. Гэта
якую творыць аўтахтоннае беларускае насельніцтва
краіны. Кантакты зь ёю ў савецкую эпоху хоць і
таксама былі абмежаваныя. Рэдкалегія "Гісторыі
чытачам прысьвяціць эміграцыйнай літаратуры
разьдзел. Спадзяюся, што ўвагаю ня будзе абыдз
беларуская літаратура ў Польшчы.

[11] Глядзіце: **Дынамика жанровых структур в белорусской прозе XX века. Ньёман, 2001, №2.**

[12] **Слінькова Л. О свободе**

Постсавецкая беларуская літаратура характарызуецца непадзеленасьцю на літаратуру ў Беларусі, у Польшчы і на эміграцыі. У Саюз беларускіх пісьменьнікаў уваходзяць і грамадзяне Беларусі, і грамадзяне Польшчы, Расіі, іншых краін. Пісьменьнікі, якія жывуць за мяжою, нярэдка маюць беларускія пашпарты. Гэта той стан, які лічу нармальным.
Паводле лёгікі, абгрунтаваўшы пэрыядызацыю гісторыі літаратуры ХХ ст., рэдактары павінны былі б паказаць агульныя заканамернасьці яе разьвіцьця. Але яны, што выклікае Тваё зьдзіўленьне, не зрабілі гэтага.
Якія законы разьвіцьця агульныя як для дасавецкае, гэтак і для савецкае стадыі?
Мусіць, на першае месца трэба паставіць закон паскоранага разьвіцьця. Адстаючы, прыкладам, ад расійскае ды польскае літаратуры, беларускае краснае пісьменства зь сярэдзіны XIX ст. даганяла іх і, можна сказаць, пераадолела гэтае адставаньне. Закон паскоранага разьвіцьця літаратуры можна, па-мойму, разглядаць як прыватную праяву закону гістарычнае карэляцыі. Зрэшты, у нас маецца адмысловая праца наконт паскоранасьці разьвіцьця беларускае літаратуры. Яе аўтар — акадэмік Віктар Каваленка — адзін зь сяброў рэдкалегіі чатырохтомніка. Гэта, вядома, не арыгінальная канцэпцыя В. Каваленкі, але яна добра дапамагае зразумець літаратурны працэс у нашай краіне ў XIX і XX стст.
Другая агульная заканамернасьць літаратурнага працэсу ў Беларусі ХХ ст. — гэта адсутнасьць спрыяльных умоваў для разьвіцьця краснага пісьменства. Ні дасавецкая, ні савецкая, ні заходнебеларуская літаратура ніколі цягам ХХ ст. ня мелі перш за ўсё спрыяльных *палітычных* умоваў для развіцьця. Гэтую заканамернасьць нельга ня ўлічваць, калі аналізуеш тое, што літаратуразнаўцы называюць дынамікаю жанравых структураў[12].
Некаторыя нашы гісторыкі спрабавалі сказаць пра гэтую заканамернасьць ужо ў брэжнеўскі пэрыяд, але адкрыта гаварыць пачалі толькі ў гады перастройкі.
Хоць наша літаратура разьвівалася паскорана, літаратурны працэс ХХ ст. характарызуецца дыскрэтнасьцю, перарывістасьцю, якая наўпрост тлумачыцца ня толькі палітычным рэжымам, але й “надвор’ем” (“адліга”, “замарозкі”, “аслабленьне”, “закручваньне гаек” і г. д.). Асабліва

запаволіўся рух літаратуры ў пэрыяд культурнага генацыду беларусаў (сталінскі таталітарызм), а гэта чвэртка стагодзьдзя. Мне здаецца, што для дасавецкае літаратуры найбольш спрыяльныя былі 1906—1914 і 1917—1920 гг., для савецкае — 1921—1929 гг. і пэрыяд хрушчоўскае “адлігі”. Асэнсаваньню падлягае брэжнеўскі пэрыяд. Што датычыць заходнебеларускае літаратуры, дык яна несумненна дала выдатных паэтаў.

У Заходняй Беларусі, як і ў царскай Расіі, пісьменьнікаў не стралялі; калі ў людзей былі грошы й яны не вялі адкрытае антыдзяржаўнае агітацыі, дык маглі выпускаць газэты й часопісы, вакол якіх канцэнтраваліся літаратурныя сілы, выдаваць кнігі (права ўласнасьці ды гаспадарчае дзейнасьці паважалася).

Вядома, напісаўшы агульныя ўводзіны, рэдактары ці іншыя аўтары павінны пісаць уводзіны да кожнага разьдзелу або тому, паказваючы, як агульныя заканамернасьці разьвіцьця літаратуры выяўляюцца на паасасобных этапах гісторыі. У прыватнасьці, з Тваіх пытаньняў, Мігель, вынікае, што такія адмысловыя ўводзіны патрабуюцца абавязкова.

Яшчэ адно мэтадалягічнае пытаньне — манаграфічныя артыкулы, прысьвечаныя паасобным пісьменьнікам. Дзе іх друкаваць? Што б там ні казалі, а пісаць пра ўсю творчасьць Купалы ў 1-м томе, пакуль не паказана разьвіцьцё літаратуры 20—30-х гг., пэрыяду другой сусьветнай вайны, — нонсэнс. Што датычыць Якуба Коласа, дык гэты клясык памёр на пачатку “адлігі”. Значыць, патрабуецца асэнсаваньне яшчэ й паваеннага дзесяцігодзьдзя, а тым часам Табе, дружа, ужо паднесьлі й ягоны “творчы партрэт”.

Не зьдзіўляйся. Я Табе зараз растлумачу, чаму гэтак здарылася й будзе здарацца. Калі карыстацца мэтадам узыходжаньня ад абстрактнага да канкрэтнага, то ў 1-м томе трэба пакінуць артыкулы пра тых пісьменьнікаў, чый творчы або жыцьцёвы шлях завяршыўся ў дасавецкую эпоху: Ядвігіна Ш., Цётку, Максіма Багдановіча й Алеся Гаруна. Але ў нас за савецкім часам выпрацавалася своеасаблівая “фэўдальная лесьвіца”, на якой кожнаму пісьменьніку адведзена сваё месца. Нельга зьмяшчаць разьдзел пра Янку Купалу пазьней, чым пра Алеся Гаруна або Максіма Багдановіча. Такое няпісанае правіла. Уявім, што манаграфічныя артыкулы перанесеныя наагул на канец “Гісторыі...”. Лепш не ўяўляць, бо, чаго добрага,

артыкулы пра народных паэтаў і пісьменьнікаў пойдуць раней, чым артыкулы пра клясыкаў, якіх, дзякуй Богу, не зьняважылі гэтым званьнем, — таго ж Максіма Гарэцкага або Кузьму Чорнага.
Мусіць, спатрэбіцца шчэ не адзін дзясятак гадоў, каб пазбыцца гэтых савецкіх комплексаў, каб усё стала на сваё месца ў адпаведнасьці з эстэтычнымі крытэрамі.
Адчуваю, што Табе спатрэбіцца час, каб усё гэта асэнсаваць. Таму пісаньне сваё заканчваю.
Да наступнага ліста!
Анатоль

Ліст трэці

Салют, Мігель!
Я ведаў, што мы з табою аднадумцы, хоць бы таму, што нам падабаецца адно й тое ж віно.
Пытаешся, што б я напісаў ува ўводных артыкулах да кожнага тому? (Другое Тваё пытаньне я пакіну “на дэсэрт” Трубіцкага.)
Ува ўводзінах да 1-га тому я напісаў бы апалёгію капіталізму ў духу Камуністычнага Маніфэсту. Пачытай, там ёсьць цікавыя мясьціны.
Распрыгоненьне сялянства, шпаркае разьвіцьцё капіталістычных адносінаў (шпарчэйшае, чым у Расіі), будаўніцтва чыгунак і шашэйных дарог (даволі густая сетка) вядзе да складваньня рэгіянальных і краёвага рынкаў. Цэнтрам краёвага эканамічнага жыцьця становіцца Менск. Складваецца нацыя (нацыя заўсёды складваецца ў сувязі з разьвіцьцём капіталізму). Гэта пераважна сялянская нацыя. На пачатку стагодзьдзя ў яе няма інтэлігенцыі. Але царскі ўрад падносіць гэтай нацыі падарунак: ведучы палітыку русіфікацыі беларусаў, ён у пэрыяд з 1864 па 1909 г. адчыняе ў гэтым краі шэраг мужчынскіх настаўніцкіх сэмінарыяў (Маладэчанская, Полацкая, Нясьвіская, Сьвіслацкая, Панявеская, Новая-Вялейская, Рагачоўская)[13], настаўніцкіх інстытутаў (Віцебскі, Магілёўскі, Менскі). Унукі прыгонных сялян работаць таксама ўва ўнівэрсытэтах, інстытутах і акадэміях.
У гэтай сялянска-работніцка-рамесьніцкай нацыі няма выразьніка інтарэсаў, а ў інтэлігенцыі, якая вось толькі ўпэўнена выходзіць на сьвет, — свайго цэнтру. Інтэлігенты пачынаюць

[13] **Жаночыя сэмінарыі — Аршанская, Барысаўская, Гомельская і Бабруйская — былі адчыненыя ў 1911—1916 гг.**

[14] **Гл.: Лацкевіч А. Плян работы. // Беларускі Гістарычны Часопіс. 1998, № 2.**

шукаць арганізацыйныя формы. Яны пасьлядоўна ствараюць Беларускую Рэвалюцыйную Партыю, Беларускую Рэвалюцыйную Грамаду, Беларускую Сацыялістычную Грамаду. Яны ствараюць Круг Беларускае Прасьветы і пачынаюць займацца выдавецкаю і культурна-асьветніцкаю дзейнасьцяй. Дзьве падзеі спрыяюць беларускаму руху: дазвол кнігадрукаваньня ў 1904 г. і рэвалюцыя 1905—1907 гг.

Вось тут, Мігель, і варта было пісаць пра тое, пра што пытаўся Ты: заснаваньне выдавецкае суполкі “Загляне сонца і ў наша ваконца”, газэты “Наша Доля”, а потым “Наша Ніва”, выдавецтва “Нашае Нівы”, выдавецкае суполкі “Наша Хата”, Беларускага Выдавецкага Таварыства, газэты “Biełarus”, альманаху “Маладая Беларусь”, часопісаў “Лучынка” й “Саха” ды інш. праектаў.

Перад першай сусьветнай вайной у беларусаў склаліся тры цэнтры нацыянальна-культурнае працы: Вільня (“Наша Ніва”, Беларускае Выдавецкае Таварыства, Каталіцкая духоўная сэмінарыя, Беларускі музычна-драматычны гурток), Пецярбург (“Загляне сонца і ў наша ваконца”, універсытэт, духоўная акадэмія), Менск (часопісы “Саха” й “Лучынка”). У 1914 г. лідэры беларускага руху разглядалі пляны разгортваньня культурніцкае працы. Яны намерваліся: наладзіць выданьне газэты і ў Менску, заснаваць дзіцячы й жаночы часопісы, Беларускае Навуковае Таварыства, Беларускі музэй[14].

Вайна ўнесла свае карэктывы ў гэтыя пляны. Ведама ж, асобнага разгляду патрабуе літаратурнае жыцьцё ў той частцы Беларусі, якую акупавала кайзэраўская армія (восень 1915 — вясна 1918 г.). А там адбываліся цікавыя падзеі: адчыняліся беларускія школы, працавалі беларускія настаўніцкая сэмінарыя й настаўніцкія курсы, выходзіла “Гоман”, выдаваліся кнігі для школаў...

Ты слушна заўважыў, што 1-ы том дзіўна скампанаваны. Сапраўды, напісаныя манаграфічныя артыкулы пра дзеячоў і карыфэяў (многія зь іх жывыя і здаровыя), а потым раптам разьдзел “Літаратура перыяду рэвалюцыі і грамадзянскай вайны” (быццам да гэтага пэрыяду ня мелі дачыненьня ні Купала, ні Колас, ні Луцкевіч, ні Ластоўскі...). Ня менш дзіўна, што пералік газэт і часопісаў гэтага пэрыяду робіцца не на пачатку тому або разьдзелу, а ў другім артыкуле (“Кароткі нарыс літаратуразнаўства. 1917—1920”, аўтар д-р Міхась Мушынскі).

15 **Баўтовіч** **Гэтую кнігу** **Хаця і** **Гучыць** **пагрому** **не** **належыць** **служыць**[14]. **парадку ў** **нашай** **Дарэчы,** **украінскай** **батальёны** **“ходзіць** **ваяваў** **набожнікі** **прадрэнкаў** **капітана** **Цэйтлін.**

16 **Юрэвіч**

Спіс
літаратуразнаўства
Мушынскі.3

Што тычыцца мяне, дык прапанаваная рэдкалегіяй назвы гэтага разьдзелу — “Літаратура перыяду рэвалюцыі і грамадзянскай вайны” — выклікае пярэчаньне.

Хто дакажа мне, што ў Беларусі была грамадзянская вайна?

Якая палітычная сіла ў Беларусі вяла збройную барацьбу за аднаўленьне расійскае манархіі, памешчыцкага землеўладаньня і *“единой і неделимой”* імпэрыі? Хто, ўзначальваў беларускі контрарэвалюцыйны лягер і зь збройныя сілы? Дзе (у якой мясцовасьці) адбываліся крывавыя сутычкі й бітвы, праходзілі франты паміж адной часткаю ўзброеных беларусаў і другою часткаю ўзброеных беларусаў? Гэтыя пытаньні, Мігель, я задаю не Табе. У Расіі і Украіны йшла грамадзянская вайна: белыя арміі Аляксандра Калчака, Антона Дзянікіна, Пятра Ўрангеля ды інш. ваявалі супроць Чырвонае Арміі за аднаўленьне манархіі й г. д. У Беларусі нічога падобнага не было. У лютым 1918 г. бальшавікоў з большае часткі нашае краіны выгнала нямецкая армія; пасьля зрыненьня манархіі ў Нямеччыне (лістапад 1918 г.) большую частку Беларусі ўзяла Чырвоная Армія; зь вясны 1919 г. Чырвонай Арміі давялося адступаць пад ударамі Войска Польскага да Дняпра; у ліпені 1920 г. Чырвоная Армія пайшла на Варшаву, але ў наступным месяцы прымушаная была адступіць да Менску. Могуць нагадаць пра палескі паход генэрала Станіслава Булак-Балаховіча ў канцы 1920 г. Дык жа армія Балаховіча змагалася ня з арміяй ССРБ (у фармальна незалежнай ССРБ войска не было), а з расійскай Чырвонай Арміяй. Мала таго, калі прайшлі весткі пра габрэйскія пагромы ў Пінску[15], урад БНР звольніў Балаховіча са службы[16], а на Нацыянальнай палітычнай нарадзе ў Празе (1921 г.) ад яго адракліся ўсе беларускія сацыялістычныя партыі[17].

Калі на падзеі 1917—1920 гг. зірнуць не з Крамля і не празь ленінска-сталінскую прызму клясавага змаганьня, дык відавочнымі становяцца наступныя факты.

1) Беларусь у гэты пэрыяд была арэнаю барацьбы геапалітычных інтарэсаў іншых дзяржаваў (Расіі й Нямеччыны, Расіі й Польшчы) і разглядалася гэтымі дзяржавамі як разьменная манэта (Берасьцейскі і Рыскі трактаты 1918 і 1921 гг., мірная дамова РСФСР зь Літвою). Пра гэта, дарэчы, піша й аўтар першага артыкулу ў разьдзеле Ўладзімер Казьбярук.

2) Ня маючы войска, Урад БНР не ваяваў з Урадам ССРБ, бо

[15] Сакавіка

[16] Літаратура і грамадзянскай вайны

[17] Архівы БНР. Т. 1, кн. 2. Вільня—Нью-Ёрк—Менск—Прага, 1998. Сс. 1221—1222.

[18] Сакавіка

ССРЛіБ, а ўрады ССРБ і ССРЛіБ, ня маючы свайго войска[18], не ваявалі з Урадам БНР.

3) Ролю контрарэвалюцыянэраў (у сацыяльнай гарантыі за ўсё вяртаньнем зямлі памешчыкам) у Беларусі адыгрывалі нямецкія й польскія акупанты.

4) У сацыяльнай палітыцы паміж беларускімі сацыялістамі і камуністамі не было нераадольных рознагалоссяў. Пасьля ўзгаду нэпу гэтыя адрозьненьні былі малаістотныя. Партыя сацыялістаў-рэвалюцыянэраў дзейнічала ў БССР да 1924.

5) Галоўныя адрозьненьні паміж сацыялістамі й камуністамі палягалі ў галіне нацыянальна-палітычнай. Беларускія сацыялісты й беларускія камуністы выступалі за самавызначэньне Беларусі. Ініцыятарамі абвяшчэньня незалежнасьці БНР і абвяшчэньня БССР былі беларускія марксісты (сацыял-дэмакраты й камуністы). У барацьбе з польскімі акупантамі беларускія сацыялісты-рэвалюцыянэры й сацыялісты-фэдэралісты, якія ўваходзілі ўва Ўрад БНР, супрацоўнічалі з камуністамі. Аднак сацыялісты й камуністы па-рознаму падыходзілі да пытаньня пра самавызначэньне (патрабаваць неадкладнага вяртаньня ў склад СССР беларускіх зямель, ці толькі частак Віцебскае ды Смаленскае губэрняў, усяе Віцебскае ці Магілёўскае[19] ці не; самастойнасьць без прывязкі да Масквы ці саюз з Масквою; сваё войска (усеагульнае ўзбраеньне народу) ці апора на расійскую армію; надаваць беларускай дзяржаўнасьці дзяржаўнае ці не). Пасьля таго, як польскія (апанаваныя) памешчыкі ўцяклі, не апошнім было й пытаньне пра палітычны рэжым: дыктатура пралетарыяту ці Рэспубліка сярэдніх работнікаў ды працоўнае інтэлігенцыі?

Калі ўважліва прайсьціся па пунктах 4 і 5, дык усім, хто ведае гісторыю Беларусі, зразумела, што не было ніводнага такога пункту, па якім беларускія сацыялісты й камуністы не маглі прыйсьці да згоды. У 1921—1927 гг. у ССРБ праводзілася палітыка разьвіцьця крэдытнае, спажывецкае ды збытавое каапэрацыі, ствараліся каапэратывы саматужнікаў (гэтыя палажэньні былі ці не галоўныя ў праграмах сацыял-дэмакратаў і эсэраў); праводзілася землеўпарадкаваньне, ствараліся селішчы й хутары, мэтаю было стварэньне шырокага пласту заможнага працоўнага сялянства (народніцкага земляробства Зьміцер Прышчэпаў — былы эсэр), праводзілася беларусізацыя дзяржаўнага апарату, асабліва

[18] **1919 г. Заходняя расійская дабрахвоцкая армія была перайменаваная ў Беларускую Ліхоўскую армію. Але хто дасьць нам, ці ССРЛіБ Літвы і Беларусі была самастойная армія і ці ССРЛіБ была незалежнаю дзяржавай? Ужо 17 сьнежня 1919 г. Беларуская Ліхоўская армія стала часткаю расійскай арміяй.**

[19] **У красавіку 1919 г. урад РСФСР Магілёўскую губэрню ўключыў**

частак, была створана шырокая сетка беларускіх школ, на беларускай мове выдаваліся амаль усе мясцовыя газеты, у беларускую літаратуру й мастацтва прыйшлі сотні новых імёнаў і дзяўчат; у 1924—1927 гг. у склад БССР была вернута значная частка ўсходнебеларускіх земляў...

Паўтараю, Мігель: не было ніводнага такога пункту, дзе б беларускія сацыялісты й камуністы не маглі прыйсці да ўлады, але супярэчнасьці паміж імі існавалі з тае прычыны, што беларускія камуністы былі несамастойныя: да 1924 г. кампартыя Беларусі ўваходзіла ў склад Расійскай кампартыі; у 1924 г. РКП(б) стала называцца Ўсесаюзнаю камуністычнаю партыяй, але сутнасьць ад гэтага не памянялася: — жорсткая цэнтралізацыя ня толькі захоўвалася — рабілася яшчэ больш жорсткаю. На чале КП(б)Б увесь час стаялі небеларусы.

Успомні і тое, што я пісаў на пачатку другога ліста: ніякага іншадумства нават у сваёй партыі, ленінска-сталінскага клясавае барацьбы... Менавіта гэта прывядзе да буйнейшай трагедыі 30-х гг.

Тэзыс аб грамадзянскай вайне ў Беларусі 1917—1920 гг. перанесены з маскоўскай глебы. Гэта быў *пэрыяд барацьбы за беларускую дзяржаўнасьць.* Змагаліся, паўтараю, і беларусы, і камуністы. Ставячы перад сабою розныя нацыянальныя дзяржаўныя мэты, яны вялі паміж сабою вайну... на старонках газэтаў. Сацыялістычны Ўрад БНР[20] не ваяваў з камуністычным урадам ССРБ хоць бы з тае прычыны, што абодвум не было каго пасылаць у бой[21].

Зрэшты, пытаньне пра тое, была грамадзянская вайна ў Беларусі ці не было яе, гісторыкі літаратуры не вырашаюць, але, прыняўшы тэрмін “грамадзянская вайна”, яны павінны былі б асьвятляць і літаратурны працэс з гэтага гледзішча. І тут, Мігель, мы бачым дзіўную карціну: на баку бальшавікоў няма (калі не лічыць Цішкі Гартнага[22]) ніводнага прыкметнага літаратурнага імені. Якуб Колас жыве ў Расіі, але як пісьменьнік маўчыць[23]. Беларуская мастацкая інтэлігенцыя за маскоўскім бальшавізмам не пайшла таму, што ён прынёс ёй варожы беларускай культуры. Янка Купала, Зьмітрок Бядуля, Алесь Гарун, Максім Гарэцкі[24], Францішак Аляхновіч, Уладзіслаў Галубок, Флярыян Ждановіч[25], Уладзімір Жылка — усіх гэтых і шмат іншых дзеячоў мастацтва мінулага моманту прыходу бальшавікоў (ліпень 1920 г.) у Менску або ў

Дзевяцьцю павятаў у склад Гомельскае губэрніі адзін (Мсьціслаўскі) у склад Смаленскае і адзін (Сеньненскі) — у склад Віцебскае губэрні. Тады ж у склад Полацкае губэрніі трапіў таксама Дзісенскі павет (грамадзянскай вайны ў сваіх межах), і Менскую губэрнію.

[20] Прывяла ўва Ўрад БНР адхілі эміграцыі нейкім чынам

[21] Пра гэта ў

[22] Пра яго

[23] Пра гэта ў

Вільні. Малады беларускі камуніст Міхась Кудзелька (ён жа Міхась Чарот) да прыходу бальшавікоў друкуецца ў выдавецтвах БНР. А кіраўнік Беларускай Камуністычнай Арганізацыі Ўсевалад Ігнатоўскі выкладае ў Менскім пэдагагічным інстытуце, які знаходзіцца пад эгідаю Ўраду БНР. Ці ведаюць пра іх партыйнасьць, але “суворых мераў” не ўжываюць. Такім чынам, *грамадзянскае вайны ў галіне культуры, у беларускай літаратуры таксама не было*. Пра аўтар разьдзелу Ў. Казьбярук не адцеміў, але гэта ясна з кантэксту.

Натуральна, ува ўступным артыкуле да 1-га тому ня мог не сказаць, што ў пэрыяд 1900—1920 гг. беларуская літаратура зрабіла такі скачок у сваім разьвіцьці, роўнага якому ня пазьней. Калі гаварыць аб творчых мэтадах, школах і напрамках, мы ўбачым і рэалізм, і нэарамантызм, і сымбалізм, і нават містыцызм... Нельга было не сказаць пра ўзбагачэньне, пра засваеньне мастацкіх вартасьцяў іншых нацыяў (пераклады)...

Натуральна, што, адкрываючы другі том, неабходна пісаць і пра нэп, і пра беларусізацыю, і пра карані, і пра “ўзбуйненьне” ССРБ, і пра Інстытут беларускае культуры, і пра Акадэмію, і пра пастанову ЦК УсеКП(б) аб мастацкай літаратуры (1925), і пра газэты з часопісамі, і пра той самы ЎКП, і пра “Узвышшам”, пра якія пытаешся Ты[26], і пра іншыя аб’яднаньні, і пра тэатральную дыскусію, і пра вынікі універсытэту, і пра згортваньне нэпу, і пра наступленьне, ува ЎсеКП(б), і пра “Саюз Вызваленьня Беларусі”, і пра “Народную Грамаду”, і пра стварэньне Саюзу савецкіх пісьменьнікаў, і пра ўсталяваньне “адзіна правільнага” творчага мэтаду... Вось ад гэтага “абстрактнага” пытаньня спакойна ўзыходзіць да канкрэтнага.

А паколькі ў 1921—1941 гг. мы маем справу з усімі гэтымі адрознымі пэрыядамі ў разьвіцьці беларускае савецкае літаратуры, дык мо ня трэ было б пісаць адзіныя нарысы пра прозу, драматургію й крытыку 20—30-х гг.?

Пішучы пра заходнебеларускую літаратуру, д-р Дабрэіс слушна вылучае тры пэрыяды: 1920—1926 гг. (“Вызваленая Літва”, эндэцкая, парлямэнцкая Польшча); 1926—1939 гг. (ад майскага пераварота і разгрому Беларускае Сялянска-Работніцкае Грамады да расправы з соймавым кампаніяй

[21] Ты цікаўны Сяўцік пытаньне 1920-х. Ці ўстаноўлены ў гэтай галіне ўжо сёньня? Пытаньне вялікае, але ня ведаю, ці варта яго ставіць.

[22] “Айцец” і сыны” ня ведаю, ці ёсьць у Ўраду. Шчыра кажучы, ня ведаю, ці ёсьць яе ў нас. Ці ня лепш, каб яе ня было? Ці ня лепш, каб яе ня было? Ці ня лепш, каб яе ня было?

“Змаганьне” і ўневажненьня мандатаў паслоў на сваіх спадчыннікаў Беларускае Хрысьціянскае Дэмакратыі і Беларускага Сялянскага Саюзу); 1930—1939 гг. (пэрыяд “найлепшага” курсу польскае палітыкі ў дачыненьні да беларусаў). Яраўскі ведае праблемы, Мігель, і таксама пытаюся: чаму ўва ўступе да разьдзелу не патлумачаны прычыны таму або ўва ўступе да разьдзелу не патлумачаны прычыны таму, што “Сярэдняя Літва”, БХД, БСРГ, БСС, “Змаганьне”? Дарагі мой дружа, Тваё ўражаньне, што гэтыя тамы пісаныя для знаўцаў беларускае гісторыі, але вернемся да артыкулу дзе Ліс. Гэта здаецца, адзіны аглядавы артыкул, у якім пераклад разглядаецца як від мастацкае творчасьці. Хачу звярнуць зьвярнуць Тваю ўвагу на адну канцэпцыю разьвіцьця беларускае літаратуры ў 30-х гг. Канцэпцыя, што нараўне новая, але забытая, і д-р Ліс яе аднаўляе. У 1937 г. адбываецца чарговы, але самы крывавы пагром літаратуры, і заходнебеларускі крытык А.Бужанскі (псэўданім не разгаданы) пісаў:

“У той час, калі зь беларускай літаратуры на Ўсходзе сілком зрабілі рыкшу,... літаратура на Захадзе пачала таптацца на месцы, узбагачаючы форму й шліфуючы дэталі. Паўстала паэзія зачараванага кола, каторую цягнулі песьняры ў ярме старых канонаў.

Потым — зарысаваўся сылюэт Максіма Танка”.

Думаю, я ня надта рызыкую, калі скажу: *сваёю творчасьцю у 30-х гг. XX ст. Максім Танк уратаваў гонар беларускае паэзіі, літаратуры наогул.* Не адно гэты пясьняр (побач называлі Натальля Арсеньнева, Хведар Ільляшэвіч, іншыя пісьменьнікі), але Максім Танк быў самаю прыкметнаю фігураю ў гэтонайў творчасьці спалучаліся і эстэтызм, і грамадзянскасьць.

Гэта я пішу і дзеля таго, каб зьвярнуць увагу на разьмаўленьне д-рам Лісам канцэпцыю, і дзеля таго, каб падзяліць Тваё неўразуменьне з прычыны манаграфічных артыкулаў у 2-м томе. Сапраўды, калі ў гэтым томе зьмешчаныя артыкулы пра тых, хто пражыў і 30-я, і 70-я гг., дык міжволі насоўваецца пытанне: а чаму тут няма артыкулу пра самага выдатнага паэта 30-х гг. Максіма Танка й артыкулу пра выдатных паэтак Натальлю Арсеньневу ды Яўгенію Пфляўмбаўм? Зьвярні ўвагу яшчэ на адно. Безумоўна, першыя паэты 20-х гадоў — ня лічачы “старых” Купалы і Коласа, — **хвайцца**

былых

наўлетнікаў

ва Ўкраіне і

сустрэнах зрабіў.

Яшчэ адно з

“пайдоў” БССР

дні Міхася Гіка,

публіцыста

Фабіяна

Шантыра — на

парадку 1920

БССР

ратэгіі.

23 Маўчыць, але піша новую зямлю” ды Сымона-музыку”, складваюцца ў яго й “Казкі жыцьця”...

24 Гэты клясык, што праўда, пэўны час супрацоўнічаў з бальшавікамі. На “свежых сьлядох” ён напісаў аповесьць “Дзьве душы”, у якой паказаў норавы новых

(1919; 1922), Уладзімер Жылка (1920; 1923), Уладзімір Дубоўка (1921; 1923), Язэп Пушча (1922; 1925). Іх дэбюты абазначаюць год дэбюту ў беларускім друку і год выхаду першае кнігі. Адмысловаю славаю валодаў сатырык Кандрат Крапіва (1922; 1925). Слава першых празаікаў (значнай часткі лічачы “старых” Коласа, Гарэцкага, Бядулі) замацавалася над канец 20-х гадоў за Кузьмою Чорным (1923; 1925), Міхасём Зарэцкім (1922; 1925). Набыў славу й навэліст Міхась Лынькоў (1926; 1927). У 1924 і 1927 гг. дэбютавалі і хуткаю славаю Андрэй Мрый ды Лукаш Калюга. Паэт Пятрусь Броўка дэбютаваў у 1926 г., а ягоная першая кніжка выйшла ў 1930 г. і беларускую паэзію мала ўзбагаціла. А цяпер зірнем, як разьмешчаныя манаграфічныя артыкулы ў 2-м томе “Кандрат Крапіва”, “Кузьма Чорны”, “Пятрусь Броўка”, “Міхась Чарот”, “Уладзімір Дубоўка”, “Міхась Зарэцкі”, “Язэп Пушча”, (яшчэ шэсьць артыкулаў), “Уладзімір Жылка”, “Лукаш Калюга”... Зноў мы маем справу з “фэўдальнаю лесьвіцаю”. Крапіва, Лынькоў і Броўка, як бачым, атрымалі ад кампартыі годнасьць народных пісьменьнікаў (два першыя) і паэта. Вось у адпаведнасьці з гэтымі годнасьцямі і занялі яны першыя месцы. Вось і апынуўся Броўка *на трэцім сваіх папярэднікаў.*[27] Праўда, у рэдактараў стала годнасьці ўшанаваць талент Кузьмы Чорнага — пісьменьніка, паўтаруся, не зьняважылі званьнем “народнага”.

А як на разумны лад, тут трэ было б пакінуць артыкулы пра Гарэцкага, Чарота, Жылку, Зарэцкага, Платона Галавача, Янку Нёманскага, Андрэя Мрыя, Васіля Каваля, Сымона Лукаша і Лукаша Калюгу — тых, чый жыцьцёвы й творчы шлях ідзе ў 30-х.[28]

...На пачатку гэтага ліста я абяцаў пакінуць Тваё пытаньне “на дэсэрт”.

Ты пішаш, што мэтад узыходжаньня ад абстрактнага да канкрэтнага вядомы кожнаму пачаткоўцу ў навуцы. Згодзен, дружа. Ты пытаешся: чаму ж акадэмікі й дактары кіраваліся гэтым апрабаваным мэтадам? Дзеля адказу на пытаньне трэба ўважліва прачытаць уступ (т. 1, с. 5–10). Аўтары гэтага тэксту выдатна ўсьведамляюць усю хібу чатырохтомніку і пісалі ўступ дзеля таго, каб зацягнуць крытыкі. (У беларусаў гэта называецца “паслацьвіць”, каб не было балюча падаць”.) Гаворыцца ў тым Уступе, што

[25] Міхась Лынькоў пачаў друкавацца ў 1918 г. Мяжа 1920-х гг. — гэта ўжо беларускі друк, а не “Крывіцкая праца”, “Наша ніва” ці “Беларускі шлях”.

[26] Інфармацыю пра тое, што Зарэцкі ў 1930-х гг. працаваў у Тэатры БНР, можна знайсці ў кнізе Зоі Капыскай “Крывіцкая і беларуская літаратурныя плыні” (Мюнхен, 1986).

[27] Цытата з Ліста Максіма Танка (Максіма Лужаніна) Францішку Аляхновічу (Ф. Янкоўскаму) ад 1 ліпеня 1930 г. (Архіў Ф. Янкоўскага ў Нью-Йорку).

[28] Гэтае пытаньне (“Чаму ў 30-х гг. не было напісана манаграфічных артыкулаў пра Гарэцкага, Чарота, Жылку, Зарэцкага, Платона Галавача, Янку Нёманскага, Андрэя Мрыя, Васіля Каваля, Сымона Лукаша і Лукаша Калюгу?”) я ставіў у 1980 г. у Мюнхэне ў прыватнай размове з Янкам Запрудзкім (Янкам Юхімовічам), Янкам Станкевічам, Янкам Шпакоўскім, Янкам Юхнавецам, Янкам Юшкевічам, Янкам Янушкевічам, Янкам Ясеньскім, Янкам Янішчыцам і Янкам Ясінскім (Ф. Янкоўскім). Адказ быў адзін: “Не было часу”.

“метадалагічныя складанасці”. Ёсць і прызнаньне, што аўтарскі калектыў гэтае працы *“не здолеў пайсці ў прынцыпе рускімі даследчыкамі так далёка ў напрамку “карэнай перапрацоўкі” зробленага раней”*, бо, выяўляецца, *“прынцыпу літаратуразнаўству не хапае сучаснага філасофска-тэарэтычнага патэнцыялу” “для больш рашучага рэшэньня важнейшых праблем развіцця нацыянальнай літаратуры”*. І наогул, вядучая навуковая ўстанова краіны прадэманстравала *“хай на сённяшнім “пераходным этапе” кожная група, калектыў аднадумцаў творча мабілізуюцца і напружана працуюць над гісторыю літаратуры”*. А мы, хацца дадаць адпаведна Уступу, умываем рукі.

Каб апраўдаць слабасьць свае працы, аўтары ўстрымліваюцца, гаварыць за ўсё беларускае літаратуразнаўства: яно, маўляў, не стае філязофска-тэарэтычнага патэнцыялу. З гэтым я не згаджуся. Рэдакцыйнай калегіі гэтага чатырохтомніка, большасьць у якой складаюць вэтэраны беларускага літаратуразнаўства, бракуе іншага — навуковае грамадзянскае мужнасьці. Яны выдатна ўсьведамляюць, што ў Беларусі знаходзяцца нэабальшавікі, якія жарсьці распаліліся вакол Інстытуту гісторыі Нацыянальнае Акадэміі навук[29], вырашылі засьведчыць дзеля гэтага пазьбягаюць выразнае канцэпцыі, эклектычна крытэраў і вяртаюцца да старых савецкіх *argumentum* ды *argumentum ad hominem*.

І ўсё ж ня гэта я пакідаў Табе “на дэсэрт”. Вучоныя-літаратуразнаўцы, усьведамляючы ўсе вады свае, спачатку вырашылі былі даць чатырохтомніку назву “Нарысы гісторыі беларускай літаратуры XX стагоддзя”. Заўважым, што слова “нарысы” ратавала б ізнюю працу ад крытыкі: гэта нешта незакончанае, незавершанае, накіды, эскізы кіраўнікі Інстытуту літаратуры, мусіць, вырашылі, што слова “нарысы” гучыць несалідна. Не папярэджваючы аўтараў калектыў, яны ў апошні момант вырашылі адмовіцца ад гэтага слова і падставілі яго пад удар.

Ты не ўбівайся, браце. Прыедзе Багдан у Таледа, прымусь лекцыі чытаць. Няхай ведае, як нечыта замежжа вазіць.

ко ўнам, якая ўтрымлівае з нерасшыфраваныя ірмінам ктталту прадмету ды нтызму) падаецца, хай пасьля праведзеных пра нядоляў прозу й драматургію, якіх ня Мінцаю і “Машэрак”, і “Ўзвышша”, і нават Авэрбах ульпарэнні з, Бэндэ (але намучыць без “парыбзка” да ПАППу, прабаткам “пятнаццаці” ВелАПП). Між тым перанос інфармацыі “Нарысы ці “Нарысы” ўжо дзіўна. Да таму, што слова “нарысы” ў назвах маніфэстаў гэтых Ты яго ці ядзінаю даваў бы

Прывітаньне ўсім маім знаёмцам у Таледа.

Анатоль.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага
br.by

магчымасьць лепш разумець клімат, у якім жылі й працавалі пісьменьнікі, погляды, якіх яны прытрымліваліся.

27

Разьбіраючы “Прамову фактамі” і зборнік “Цэхавыя будні” (1931), М. Арочка

справядліва піша, што Броўкавы творы засьведчылі зарыентаванасьць аўтара на агітку, на тэорыі антыпсыхалягізму ды антылірызму. Ня лічыць д-р Арочка творчым дасягненьнем і Броўкаву паэму “Кацярына”. У цэлым аб’ектыўна ацэньвае творчасьць Броўкі і аўтар артыкулу пра яго д-р Мікола Мішчанчук. Але нельга ня выказаць нязгоды з наступным цьверджаньнем: *“П. Броўка, як і А. Куляшоў, М. Танк, Н. Арсеннева, Хв. Ілляшэвіч, П. Глебка, В. Казлоўскі і іншыя аўтары,*

шукаў новыя формы лірызму”. **Фраза надта агульная. Усё-ткі ў гэты творцаў былі розныя зыходныя пункты. Апрача таго, Броўка (прынамсі Броўка 30-х гг.) аніяк ня ўпісваецца ў адзін творчы шэраг з Натальляй Арсеньневай, Танкам ды Хедарам Ільляшэвічам хоць бы таму, што гэтыя паэты ад самага пачатку сваёй творчасьці не былі ані антылірычныя, ані антыпсыхалягічныя.**

[28] У гэты час у ССРБ палітычная сыстэма не дае раскрыцца мноству

талентаў. Многія зьнішчаныя фізычна. Ды ўсё ж быў сярод паэтаў той, каго сярод іншых заўважыў і вылучыў Якуб Колас. Гэта — Аркадзь Куляшоў. У 30-х гг. ён шмат экспэрымэнтуе ў галіне формы. І слушна робіць аўтар артыкулу “Паэзія 30-х гадоў” д-р Мікола Арочка, калі ставіць упобачкі талент Танка і талент Куляшова. Муза Куляшова, насуперак вядомай прыказцы, на ўвесь голас прамовіла толькі ў вайну. Другі раз яна загаворыць у

гады “адлігі”. А Максіма Танка, калі Заходняя Беларусь была далучаная да СССР, Якуб Колас таксама заўважыў і вылучыў.

[29] Гл.: Сагановіч Г. Вайна з беларускай гісторыяй // ARCHE, 2001, №3.

Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: 06-10-2001
[image]

Анатоль Сідарэвіч

Да гішпанскага сябра

Лісты пра мэтад і гонар

АНАТОЛЬ СІДАРЭВІЧ філёзаф, лёгік, літаратуразнаўца, ідэоляг адроджанай беларускай сацыял-дэмакратыі. Яго першая апошняя публікацыя ў часопісе — артыкул “Поўны не акадэмічны” (ARCHE Скарына, №6/2000).

Ліст першы

Дарагі Мігель,

я ўхваляю Тваё жаданьне вывучыць гісторыю беларускае літаратуры і магу толькі разьвесьці рукамі ў адказ на Тваё пытаньне: а што чытаць? Кнігі, напісаныя за камуністычным часам, для гэтае мэты (вывучэньня гісторыі) не надаюцца. Першая іх вада — замоўчваньне даробку шмат каго зь пісьменьнікаў, замоўчваньне саміх імёнаў; другая — замоўчваньне твораў тых пісьменьнікаў, чые прозьвішчы было дазволена згадваць безь зьневажальных эпітэтаў, і нават тых аўтараў, якім камуністычны рэжым паставіў помнікі; трэцяя вада — абавязак гісторыка ўлічваць афіцыйныя (выпрацаваныя ў інстанцыях КПСС) ацэнкі творчасьці тых ці іншых пісьменьнікаў, ацэнкі тых ці іншых твораў, характарыстыкі тых ці іншых інстытуцыяў (палітычных партый, рэдакцыяў газэт, выдавецкіх таварыстваў і да т. п.), у якіх пісьменьнікі

працавалі, рэалізоўвалі свой творчы і грамадзка-палітычны патэнцыял. Гісторык павінен быў глядзець на ўсё праз прызму “адзіна правільнае” ленінска-сталінскае дактрынальнае вучэнне, ленінска-сталінскае, а не марксісцкае; рацыю мае нобелеўскі ляўрэат Чэслаў Мілаш, які адмыслова зьвяртае ўвагу на адрозьненьні паміж марксізмам і ленінізмам-сталінізмам ды піша, што, прыкладам, творчасьць такога выдатнага дасьледчыка літаратуры й эстэтыка-марксіста, як Дзьёрдзь Лукач, была асуджана партыяй, бо выходзіла за межы, акрэсьленыя “Палітычным Бюро ў Маскве”[1].

[1] **Мілаш Ч. Скутак розуму. Менск-Вільня, 2000. С. 210.**

Думаю, Табе ня трэба тлумачыць, што такое афіцыйная ідэалёгія й цэнзура.

Ты пішаш, што наш сябар Багдан прывёз у Таледа два тамы “Гісторыі беларускай літаратуры ХХ стагоддзя”, напісанае ў Інстытуце літаратуры Нацыянальнае Акадэміі навук Беларусі. Праўду кажучы, я не чытаў гэтых кніг, а таму не магу адказаць на Твае пытаньні. Абяцаю: як толькі прачытаю абодва тамы, напішу Табе ліст, у якім пастараюся адказаць на Твае пытаньні. Прывітаньне Тваім бацькам, сястры, заўзятару “Барсы” Фэдэрыка (спадзяюся, ён ня ўзяўся загрудкі з заўзятарам “Рэалу” Багданам).

Да наступнага ліста.
З прывітаньнем
Анатоль

Ліст другі

Салют, Мігель!

Собіла ж Багдану прывезьці Табе тыя два тамы! Ён сам не чытаў, бо калі б прачытаў, не павёз бы іх у Кастыльлю. Гэтая кнігі нельга даваць чалавеку без грунтоўнай гістарычнай і літаратурнае падрыхтоўкі, а тым больш іншаземцу, які ня знаёмы з гісторыяй Беларусі, яе духовае культурнае жыцьцё. Тое пытаньні выдатна сьведчаць пра тое.

Вось Ты пытаешся, што гэта за газэты “Наша Доля”, “Наша Ніва”, часопісы й альманахі “Загляне сонца і ў наша ваконца”, “Палачанін” ды “Саха”. А я вымушаны пісаць Табе, што *“Актывізацыя кнігадрукавання, з’яўленне першых пасьляваенных выданняў на беларускай мове, газет “Наша Доля”, “Наша Ніва”, часопісаў і альманахаў “Загляне сонца і ў наша ваконца”, “Палачанін”, “Саха” і інш. — усё гэта садзейнічала* [2]

[2] **Можна даведацца, што ў лістападзе 1918 г. на Віленскай і Менскай пралягала лінія фронту і перавыконца”, пераб**

Францішкаў Ант. Нарысы гісторыі літаратуры Беларусі. Т. 2. Мн., 1994. С. 18.

1-м томе — вынік недагляду й аўтара, і акадэміка Тараруя, і проста рэдактара, бо насамрэч не было такіх часопісаў, альманахаў, як “Загляне сонца і ў наша ваконца” і “Палачанін”.

Наагул, Мігель, у гэтых кнігах шмат і стылістычнай нядбайнасьці, і фактычных памылак[2], і звычайных апісак — таго, што называюць памылкамі друку, або карэктарскімі памылкамі. Дарэчы, у абодвух тамах не пазначана прозьвішча карэктара. Значыць, яго не было.

Ты зьвяртаеш увагу на напісанае акадэмікам Іванам Навуменкам (т. 1, с. 123): *“Спачатку Купала пішацца польскай мове. Але вось трапляюць яму ў рукі беларускія (магчыма, пасля знаёмства з пісьменнікам Ядвігінам (Антонам Лявіцкім)), і, як прызнаецца паэт, “усё*

“пайшло насмарку””. Купала ўсведамляе, што пісаць беларуску, што гэта ягонае сапраўднае прызванне”. Звярнуў ўвагу на гэты абзац, Ты пытаешся ў мяне і Багдановіча: дзе праўда? Вы мне казалі, што Купала стаў беларускім пасьля сустрэчы зь беларускімі сацыялістамі, але ня ведаў, што акадэмік піша...”. Праўда на нашым баку, Мігель. У 1961 г. у літаратуры зьявілася сьцьвярджэньне, што Янка Купала і беларускага руху далучылі браты Іван і Антон Луцэвічы, Алесь Бурбіс, Сяргей Скандракоў ды Ўладзімер Ліпскі. У 1999 г. гэты тэзыс быў падмацаваны ў артыкуле “Янка Луцэвіч”[4], у якім працытаваны адпаведны дакумэнт рукою Янкі Купалы. Мушу зацеміць: акадэмік ня толькі тым, што піша праўду (*“магчыма”*). Акрамя таго, дакумэнт недакладна цытуе Янку Купалу. Нарэшце, дакумэнт (дакладней, яго фатакопія) захоўваецца ў Літаратурным музэі Янкі Купалы, і пры жаданьні акадэмік — аўтар кнігі пра Купалу! — мог бы прачытаць напісанае паэтам, зрабіць гіпотэзу, якая пярэчыць даўно вядомаму факту. А ты зробіш: акадэмік-купалазнавец не прачытаў як сваіх Купалы. Не зьдзіўляе тое, пра што Ты пішаш далей. А Ты можаш з прачытаных тэкстаў зразумець, у якіх умовах разьвівалася беларуская літаратура, якія былі агульныя і спэцыфічныя заканамернасьці яе разьвіцьця, чаму менавіта гэткая, а ня іншая пэрыядызацыя. Цябе цікавіць разьвіцьцё відаў эпасу, лірыкі й драмы, зьяўленьне тых ці іншых жанраў. Я спагадаю Табе, дружа.

---

[2] Гл.: **Сідарэвіч А.** *Пра Антона Луцкевіча (заўвагі да выдання)* // **Зьвязда**, 1993, 3 ліп.; **Зуенка А.** Пра выданьне твораў Янкі Купалы // **Полымя**, 1993, № 8; **Бурбіс А.** Пра выданьне твораў Янкі Купалы // **Полымя**, 1993, № 8; **Самойла Ю

Прачытаўшы абодва тамы, я зразумеў, што галоўная праблема, якая стаяла перад кіраўнікамі (рэдакцыйнай калегіяй) “Гісторыі беларускай літаратуры ХХ стагоддзя”, была праблема мэтадалёгіі. Прытрымлівацца ленінска-сталінскае мэтадалёгіі нават у Беларусі і нямодна, і непрадукцыйна, а іншае яны, мусіць, баяцца.

Што такое ленінска-сталінская мэтадалёгія, у якіх адносінах да марксісцкае яна знаходзіцца?

Вядома, што “*Маркс не надаваў першачарговае ўвагі пытаньню мэтаду ні на адным з этапаў эвалюцыі сваіх поглядаў*”[5]. Акрамя таго, філёзаф Маркс *“паступова ішоў ад філязофіі да гісторыі, затым да эканомікі як асноўнага абсягу дасьледаваньня”*[6]. Ён ніколі дакладна не выкладаў сваіх эпістэмалягічных прынцыпаў. За Маркса гэтыя прынцыпы дадумвалі і абгрунтоўвалі Фрыдрых Энгельс, Георгі Пляханаў, Уладзімер Ленін ды інш., аднак гэта рабілася без уліку значнае часткі Марксавых прац (асабліва раньняга, маладога Маркса, які займаўся менавіта філязофіяй).

[5] **Мандэрштам Я. Размышления о марксизме. Минск, 1991. С. 65–66.**

[6] **Там самае. С. 65.**

І вось тут нас чакае самае цікавае. Разьвіваючы *палітычную* філязофію Маркса, Ленін прынцып клясавае барацьбы (клясавасьці й партыйнасьці) перанёс на філязофію, літаратуру ды мастацтва, на ўсё грамадазнаўства. *Абсалютызацыя барацьбы клясавых інтарэсаў, іх незаміральнасьці і ёсьць сутнасьць ленінізму-сталінізму.* Але вядома таксама, што клясавае ў ленінізьме-сталінізьме насамрэч зводзіцца да партыйнага. Лідэры бальшавіцкае партыі проста цудоўна прызнавалі, што гэтак званая дыктатура пралетарыяту ёсьць дыктатураю партыі. Паводле ленінскага разуменьня дыялектыкі, інтарэсы партыі (як “авангарду”, “перадавога атраду пралетарыяту”) абвяшчаліся інтарэсамі ўсяго пралетарыяту. Паводле афіцыйнай догмы, усталяваньне “дыктатуры пралетарыяту” азначала не спыненьне клясавае барацьбы, а працяг у новых формах і новымі сродкамі[7]. Тэорыя Леніна Сталіна пра абвастрэньне клясавае барацьбы ў міры прасоўваньня грамадзтва да сацыялізму арганічна вынікала з тэорыі й практыкі ленінізму. Акурат Ленін быў ініцыятарам прыняцьця пастановы пра адзінства партыі (1921), якое забараняліся стварэньне фракцыяў і ідэйныя спрэчкі. У 1922 г. Ленін выслаў за мяжу вялікую групу філёзафаў, сацыёлягаў і эканамістаў. Калі хворы Ленін зьлёг, пачалася

[7] **Глуховский Ф. Ф., Кохан М. М. Философский энциклопедический словарь. Минск, 1983. С. 165, 259. Зварот ўзяты: сьнежань 2015 г.**

барацьба з іншадумцамі ў самой партыі, якая прывяла да ўстанаўленьня дыктатуры Сталіна. У ідэйных спрэчках усё рэшце рэшт вырашаў *argumentum ad baculinum*. Адпаведна клясавым (партыйным) інтарэсам было абвешчана, што адпавядала інтарэсам самога Сталіна й яго атачэньня. Бючую ўсталяваная жорсткая партыйная цэнзура, якую ніводзін параўнаць ні з царскаю (да 1917 г.), ні з польскаю (1918–1939). Калі царская й польская цэнзуры сачылі за палітычным зьместам твораў навукі ды мастацтва[8], то бальшавіцкая забараняла навуковыя творы, у якіх не праводзіўся прынцып клясавасьці й партыйнасьці, а мастацкія творы яшчэ й таму, што іх форма не адпавядала ўстаноўленым у партыйных кабінэтах канонам (гэтак званы прынцып народнасьці, зразумеласьці твораў літаратуры і мастацтва; адкуль барацьба з фармалізмам, абстракцыянізмам у літаратуры, жывапісе й г.д., адсюль і савецкі андэграўнд). Гэтая ж сапраўды татальная цэнзура.

Энгельс (напр., у лісьце да Карла Каўцкага за 23 кастрычніка 1891 г.) дапусьціць ня мог, што ў партыі можа быць уведзена цэнзура, Эдуард Бэрнштайн як дзікунства разглядаў ідэю ня думку аб партыйнасьці навукі, а для бальшавікоў Расеі, Савецкага Саюзу, для камуністычных краін гэта стала нагодай. Нягледзячы на публікацыю працаў маладога Маркса, нягледзячы на сьмерць Сталіна ды хрушчоўскую “адлігу”, пераглядаць прынцыпы, выпрацаваныя Леніным, было забаронена. *“Навуковым” быў такі падыход да ацэнкі мастацкіх зьяваў і працэсаў, які адпавядаў ленінска-клясавым догмам з улікам пэўных кан’юнктурных змяненьняў, якія былі санкцыянаваныя Палітычным Бюро ў Маскве, цэнтрам ідэалягічнымі службамі партыі.* Калі гэта называць марксізмам, дык усё ж такі з засьцярогаю: марксізм у ленінска-сталінскай інтэрпрэтацыі, які стаіць вельмі далёка ад заходняга марксізму Лукача, Карла Корша, Тэадора Адорна, Гербэрта Маркузэ, Макса Горкгаймэра, Вальтэра Бэн’яміна, Луі Альтюсэра, Гальвана Дэльля Вольпэ, Жана-Поля Сартра, Анры Лефэўра ды інш.[9]

Калі б аўтары стваралі сапраўды *акадэмічную гісторыю літаратуры*, яны мусілі б кіравацца даўно апрабаванай гегелеўска-марксісцкім мэтадам узыходжаньня ад абстрактнага да канкрэтнага[10]. Гэты мэтад выдатна працуе, калі

[8] **Самі сабою, не дапускаліся нападкі на кіраўніцтва, на Цюрму, Царкву, забараняўся нават нічыя дзеяньні. І ніхай краіне толькі пачалі друкаваць працы Энгельс, Маркс, Ленін, Сталін, Троцкі, Адорна, Гальвана Дэльля Вольпэ, Анры Лефэўра, Жана-Поля Сартра, Гербэрта Маркузэ, Макса Горкгаймэра, Вальтэра Бэн’яміна, Луі Альтюсэра, Гальвана Дэльля Вольпэ, Жана-Поля Сартра, Анры Лефэўра ды інш.**

[9] **У нашай краіне толькі пачалі друкаваць працы Энгельс, Маркс, Ленін, Сталін, Троцкі, Адорна, Гальвана Дэльля Вольпэ, Анры Лефэўра, Жана-Поля Сартра, Гербэрта Маркузэ, Макса Горкгаймэра, Вальтэра Бэн’яміна, Луі Альтюсэра, Гальвана Дэльля Вольпэ, Жана-Поля Сартра, Анры Лефэўра ды інш.**

[10] **Самі сабою, не дапускаліся нападкі на кіраўніцтва, на Цюрму, Царкву, забараняўся нават нічыя дзеяньні. І ніхай краіне толькі пачалі друкаваць працы Энгельс, Маркс, Ленін, Сталін, Троцкі, Адорна, Гальвана Дэльля Вольпэ, Анры Лефэўра, Жана-Поля Сартра, Гербэрта Маркузэ, Макса Горкгаймэра, Вальтэра Бэн’яміна, Луі Альтюсэра, Гальвана Дэльля Вольпэ, Жана-Поля Сартра, Анры Лефэўра ды інш.**

ленінска-сталінскую абсалютызацыю клясавае барацьбы (тое, што сацыяльныя або клясавыя інтарэсы былі, ёсць і будуць, што яны знаходзіліся, знаходзяцца й будуць знаходзіцца ўва ўзаемнай супярэчнасьці, ніхто не аспрэчвае), а таксама ўласьцівую бальшавікам аргумэнтацыю (*argumentum ad ignorantiam, argumentum externum, argumentum ad hominem*, і інш.). Каб захаваць прынцып гістарызму, зусім неабходна адмовіцца ад аксіялягічнага падыходу да гісторыі (г. зн. дазволеных даўніх падзеяў з пункту гледжаньня сучасных вартасьцяў).

трэцібнай рэпрэзэнтацыі (адзіная рэдакцыя) // ARCHE, 2001, №2. Варта адцеміць, што за невыхаўніх мастакоў і эстэтыкаў найбольш пашанцавала Ўмбэрта Эка. Заўважаныя наступныя пераклады ягоных твораў: Шэсьць шпацыроў па мастацкіх лясох // Фрагмэнты, 1997, № 1—2; Паэтыка адкрытага твору. // ARCHE, 1999, №1; Пахвала святому Тамашу. Да новага Сярэднявечча. Трызненне Сярэднявеччам // Крыніца, 2001, №5/6. Я не сустракаў у айчыннай літаратуры дасьледаваньняў

заходняга марксізму наагул і творчасьці яго асобных прадстаўнікоў, калі не лічыць прадмовы Сяргея Дубаўца да кн.: Сартр Ж.-П. Мур: Апавяданні. Менск, 1991.

[10] Мэтад гэты прыдуманы ня Гэгелем і ня Марксам, але яны былі тымі філёзафамі, якія карысталіся ім асэнсавана.

На добры лад трэ было б напісаць агульныя ўводзіны дзеля таго, каб:
1) аргумэнтаваць менавіта такую, а ня іншую пэрыядызацыю гісторыі нашае літаратуры, і
2) вызначыць агульныя заканамернасьці яе разьвіцьця ў XX ст. Пэрыядызацыя, прапанаваная рэдакцыйнаю калегіяй, у цэлым ня можа выклікаць пярэчаньняў. Беларуская літаратура прайшла ў XX ст. тры стадыі ў сваім разьвіцьці: 1) дакладкую, 2) савецкую і 3) постсавецкую. Савецкая стадыя ў разьвіцьці беларускае літаратуры пачалася пасьля падпісаньня Рыжскага трактату паміж Польшчай з аднаго боку, Савецкай Расіяй і Савецкаю Ўкраінаю — з другога. Паводле гэтага трактату

[11] Доктар Станіслаў Станкевіч у свой час прапанаваў

заходняя частка нашае краіны была перададзена пад тэрмін
Польшчы. Пачалося 18-гадовае адносна мірнае жыццё
частак Беларусі ў стабільных межах. Паралельна
беларуская савецкая[11] й заходнебеларуская літаратура.
У 1939 г. (пасьля заключэньня пакту Рыбэнтропа—Молатава)
Заходняя Беларусь трапіла пад уладу Масквы ў складзе БССР.
Можна было б гэтаю датаю адзначыць пачатак новага пэрыяду
савецкае стадыі ў разьвіцьці нашае літаратуры, аднак ня менш
важным для Беларусі й сьвету вынікам пакту Рыбэнтропа—
Молатава стала нямецка-савецкая вайна 1941—1945 гг. Гэта
цалкам асобны пэрыяд у гісторыі беларускае савецкае
літаратуры. І ў гісторыі беларускае несавецкае літаратуры
таксама.
Натуральна, што наступны пэрыяд гісторыі беларускае
літаратуры працягваецца ад заканчэньня нямецка-савецкае
вайны да сьмерці Сталіна, а дакладней да XX зьезду КПСС
(1956), калі пачынаецца "адліга". Гэты пэрыяд доўжыўся да
1966 году. Менавіта тады нэасталіністы аднавілі пасаду
генэральнага сакратара партыі, Палітычнае Бюро, а Абрама
Тэрца ды Мікалая Аржака пасадзілі на лаву падсудных (хоць
пачатак апошняга пэрыяду ў гісторыі беларускае савецкае
літаратуры можна датаваць і кастрычнікам 1964 г. — месяцам
прыходу да ўлады Леаніда Брэжнева). Але як будзе праведзена
пэрыядызацыя ў трэцім і чацьвёртым тамох — пабачым.
Ужо ў 20—30-х гг. мы сустракаемся з эміграцыйнаю
беларускаю літаратураю, але найбольшы ад'езд літаратараў за
мяжу (на Захад) зьдзеяўся ў канцы другое сусьветнае вайны.
Беларуская савецкая й беларуская эміграцыйная літаратуры
разьвіваюцца паралельна цягам усяго пасьляваеннага часу (да
перастройкі). Савецкая эпоха заканчваецца тады, калі
пачынаюцца адкрытыя, свабодныя кантакты памі
пісьменьнікамі на Бацькаўшчыне і на эміграцыі. Ня
забываць таксама, што існуе беларуская літаратура ў
Польшчы. Гэта не эміграцыйная літаратура. Гэта
якую творыць аўтахтоннае беларускае насельніцтва
краіны. Кантакты зь ёю ў савецкую эпоху хоць і
таксама былі абмежаваныя. Рэдкалегія "Гісторыі
чытачам прысьвяціць эміграцыйнай літаратуры
разьдзел. Спадзяюся, што ўвагаю ня будзе абыдз
беларуская літаратура ў Польшчы.

[11] Глядзіце: **Дынамика жанровых структур в белорусской прозе XX века. Ньёман, 2001, №2.**

[12] **Слінькова Л. О свободе**

Постсавецкая беларуская літаратура характарызуецца непадзеленасьцю на літаратуру ў Беларусі, у Польшчы і на эміграцыі. У Саюз беларускіх пісьменьнікаў уваходзяць і грамадзяне Беларусі, і грамадзяне Польшчы, Расіі, іншых краін. Пісьменьнікі, якія жывуць за мяжою, нярэдка маюць беларускія пашпарты. Гэта той стан, які лічу нармальным.
Паводле лёгікі, абгрунтаваўшы пэрыядызацыю гісторыі літаратуры ХХ ст., рэдактары павінны былі б паказаць агульныя заканамернасьці яе разьвіцьця. Але яны, што выклікае Тваё зьдзіўленьне, не зрабілі гэтага.
Якія законы разьвіцьця агульныя як для дасавецкае, гэтак і для савецкае стадыі?
Мусіць, на першае месца трэба паставіць закон паскоранага разьвіцьця. Адстаючы, прыкладам, ад расійскае ды польскае літаратуры, беларускае краснае пісьменства зь сярэдзіны XIX ст. даганяла іх і, можна сказаць, пераадолела гэтае адставаньне. Закон паскоранага разьвіцьця літаратуры можна, па-мойму, разглядаць як прыватную праяву закону гістарычнае карэляцыі. Зрэшты, у нас маецца адмысловая праца наконт паскоранасьці разьвіцьця беларускае літаратуры. Яе аўтар — акадэмік Віктар Каваленка — адзін зь сяброў рэдкалегіі чатырохтомніка. Гэта, вядома, не арыгінальная канцэпцыя В. Каваленкі, але яна добра дапамагае зразумець літаратурны працэс у нашай краіне ў XIX і XX стст.
Другая агульная заканамернасьць літаратурнага працэсу ў Беларусі ХХ ст. — гэта адсутнасьць спрыяльных умоваў для разьвіцьця краснага пісьменства. Ні дасавецкая, ні савецкая, ні заходнебеларуская літаратура ніколі цягам ХХ ст. ня мелі перш за ўсё спрыяльных *палітычных* умоваў для развіцьця. Гэтую заканамернасьць нельга ня ўлічваць, калі аналізуеш тое, што літаратуразнаўцы называюць дынамікаю жанравых структураў[12].
Некаторыя нашы гісторыкі спрабавалі сказаць пра гэтую заканамернасьць ужо ў брэжнеўскі пэрыяд, але адкрыта гаварыць пачалі толькі ў гады перастройкі.
Хоць наша літаратура разьвівалася паскорана, літаратурны працэс ХХ ст. характарызуецца дыскрэтнасьцю, перарывістасьцю, якая наўпрост тлумачыцца ня толькі палітычным рэжымам, але й “надвор’ем” (“адліга”, “замарозкі”, “аслабленьне”, “закручваньне гаек” і г. д.). Асабліва

запаволіўся рух літаратуры ў пэрыяд культурнага генацыду беларусаў (сталінскі таталітарызм), а гэта чвэртка стагодзьдзя. Мне здаецца, што для дасавецкае літаратуры найбольш спрыяльныя былі 1906—1914 і 1917—1920 гг., для савецкае — 1921—1929 гг. і пэрыяд хрушчоўскае “адлігі”. Асэнсаваньню падлягае брэжнеўскі пэрыяд. Што датычыць заходнебеларускае літаратуры, дык яна несумненна дала выдатных паэтаў.

У Заходняй Беларусі, як і ў царскай Расіі, пісьменьнікаў не стралялі; калі ў людзей былі грошы й яны не вялі адкрытае антыдзяржаўнае агітацыі, дык маглі выпускаць газэты й часопісы, вакол якіх канцэнтраваліся літаратурныя сілы, выдаваць кнігі (права ўласнасьці ды гаспадарчае дзейнасьці паважалася).

Вядома, напісаўшы агульныя ўводзіны, рэдактары ці іншыя аўтары павінны пісаць уводзіны да кожнага разьдзелу або тому, паказваючы, як агульныя заканамернасьці разьвіцьця літаратуры выяўляюцца на паасасобных этапах гісторыі. У прыватнасьці, з Тваіх пытаньняў, Мігель, вынікае, што такія адмысловыя ўводзіны патрабуюцца абавязкова.

Яшчэ адно мэтадалягічнае пытаньне — манаграфічныя артыкулы, прысьвечаныя паасобным пісьменьнікам. Дзе іх друкаваць? Што б там ні казалі, а пісаць пра ўсю творчасьць Купалы ў 1-м томе, пакуль не паказана разьвіцьцё літаратуры 20—30-х гг., пэрыяду другой сусьветнай вайны, — нонсэнс. Што датычыць Якуба Коласа, дык гэты клясык памёр на пачатку “адлігі”. Значыць, патрабуецца асэнсаваньне яшчэ й паваеннага дзесяцігодзьдзя, а тым часам Табе, дружа, ужо паднесьлі й ягоны “творчы партрэт”.

Не зьдзіўляйся. Я Табе зараз растлумачу, чаму гэтак здарылася й будзе здарацца. Калі карыстацца мэтадам узыходжаньня ад абстрактнага да канкрэтнага, то ў 1-м томе трэба пакінуць артыкулы пра тых пісьменьнікаў, чый творчы або жыцьцёвы шлях завяршыўся ў дасавецкую эпоху: Ядвігіна Ш., Цётку, Максіма Багдановіча й Алеся Гаруна. Але ў нас за савецкім часам выпрацавалася своеасаблівая “фэўдальная лесьвіца”, на якой кожнаму пісьменьніку адведзена сваё месца. Нельга зьмяшчаць разьдзел пра Янку Купалу пазьней, чым пра Алеся Гаруна або Максіма Багдановіча. Такое няпісанае правіла. Уявім, што манаграфічныя артыкулы перанесеныя наагул на канец “Гісторыі...”. Лепш не ўяўляць, бо, чаго добрага,

артыкулы пра народных паэтаў і пісьменьнікаў пойдуць раней, чым артыкулы пра клясыкаў, якіх, дзякуй Богу, не зьняважылі гэтым званьнем, — таго ж Максіма Гарэцкага або Кузьму Чорнага.
Мусіць, спатрэбіцца шчэ не адзін дзясятак гадоў, каб пазбыцца гэтых савецкіх комплексаў, каб усё стала на сваё месца ў адпаведнасьці з эстэтычнымі крытэрамі.
Адчуваю, што Табе спатрэбіцца час, каб усё гэта асэнсаваць. Таму пісаньне сваё заканчваю.
Да наступнага ліста!
Анатоль

Ліст трэці

Салют, Мігель!
Я ведаў, што мы з табою аднадумцы, хоць бы таму, што нам падабаецца адно й тое ж віно.
Пытаешся, што б я напісаў ува ўводных артыкулах да кожнага тому? (Другое Тваё пытаньне я пакіну “на дэсэрт” Трубіцкага.)
Ува ўводзінах да 1-га тому я напісаў бы апалёгію капіталізму ў духу Камуністычнага Маніфэсту. Пачытай, там ёсьць цікавыя мясьціны.
Распрыгоненьне сялянства, шпаркае разьвіцьцё капіталістычных адносінаў (шпарчэйшае, чым у Расіі), будаўніцтва чыгунак і шашэйных дарог (даволі густая сетка) вядзе да складваньня рэгіянальных і краёвага рынкаў. Цэнтрам краёвага эканамічнага жыцьця становіцца Менск. Складваецца нацыя (нацыя заўсёды складваецца ў сувязі з разьвіцьцём капіталізму). Гэта пераважна сялянская нацыя. На пачатку стагодзьдзя ў яе няма інтэлігенцыі. Але царскі ўрад падносіць гэтай нацыі падарунак: ведучы палітыку русіфікацыі беларусаў, ён у пэрыяд з 1864 па 1909 г. адчыняе ў гэтым краі шэраг мужчынскіх настаўніцкіх сэмінарыяў (Маладэчанская, Полацкая, Нясьвіская, Сьвіслацкая, Панявеская, Новая-Вялейская, Рагачоўская)[13], настаўніцкіх інстытутаў (Віцебскі, Магілёўскі, Менскі). Унукі прыгонных сялян работаць таксама ўва ўнівэрсытэтах, інстытутах і акадэміях.
У гэтай сялянска-работніцка-рамесьніцкай нацыі няма выразьніка інтарэсаў, а ў інтэлігенцыі, якая вось толькі ўпэўнена выходзіць на сьвет, — свайго цэнтру. Інтэлігенты пачынаюць

[13] **Жаночыя сэмінарыі — Аршанская, Барысаўская, Гомельская і Бабруйская — былі адчыненыя ў 1911—1916 гг.**

[14] **Гл.: Лацкевіч А. Плян работы. // Беларускі Гістарычны Часопіс. 1998, № 2.**

шукаць арганізацыйныя формы. Яны пасьлядоўна ствараюць Беларускую Рэвалюцыйную Партыю, Беларускую Рэвалюцыйную Грамаду, Беларускую Сацыялістычную Грамаду. Яны ствараюць Круг Беларускае Прасьветы і пачынаюць займацца выдавецкаю і культурна-асьветніцкаю дзейнасьцяй. Дзьве падзеі спрыяюць беларускаму руху: дазвол кнігадрукаваньня ў 1904 г. і рэвалюцыя 1905—1907 гг.

Вось тут, Мігель, і варта было пісаць пра тое, пра што пытаўся Ты: заснаваньне выдавецкае суполкі “Загляне сонца і ў наша ваконца”, газэты “Наша Доля”, а потым “Наша Ніва”, выдавецтва “Нашае Нівы”, выдавецкае суполкі “Наша Хата”, Беларускага Выдавецкага Таварыства, газэты “Biełarus”, альманаху “Маладая Беларусь”, часопісаў “Лучынка” й “Саха” ды інш. праектаў.

Перад першай сусьветнай вайной у беларусаў склаліся тры цэнтры нацыянальна-культурнае працы: Вільня (“Наша Ніва”, Беларускае Выдавецкае Таварыства, Каталіцкая духоўная сэмінарыя, Беларускі музычна-драматычны гурток), Пецярбург (“Загляне сонца і ў наша ваконца”, універсытэт, духоўная акадэмія), Менск (часопісы “Саха” й “Лучынка”). У 1914 г. лідэры беларускага руху разглядалі пляны разгортваньня культурніцкае працы. Яны намерваліся: наладзіць выданьне газэты і ў Менску, заснаваць дзіцячы й жаночы часопісы, Беларускае Навуковае Таварыства, Беларускі музэй[14].

Вайна ўнесла свае карэктывы ў гэтыя пляны. Ведама ж, асобнага разгляду патрабуе літаратурнае жыцьцё ў той частцы Беларусі, якую акупавала кайзэраўская армія (восень 1915 — вясна 1918 г.). А там адбываліся цікавыя падзеі: адчыняліся беларускія школы, працавалі беларускія настаўніцкая сэмінарыя й настаўніцкія курсы, выходзіла “Гоман”, выдаваліся кнігі для школаў...

Ты слушна заўважыў, што 1-ы том дзіўна скампанаваны. Сапраўды, напісаныя манаграфічныя артыкулы пра дзеячоў і карыфэяў (многія зь іх жывыя і здаровыя), а потым раптам разьдзел “Літаратура перыяду рэвалюцыі і грамадзянскай вайны” (быццам да гэтага пэрыяду ня мелі дачыненьня ні Купала, ні Колас, ні Луцкевіч, ні Ластоўскі...). Ня менш дзіўна, што пералік газэт і часопісаў гэтага пэрыяду робіцца не на пачатку тому або разьдзелу, а ў другім артыкуле (“Кароткі нарыс літаратуразнаўства. 1917—1920”, аўтар д-р Міхась Мушынскі).

15 **Баўтовіч** **Гэтую кнігу** **Хаця і** **Гучыць** **пагрому** **не** **належыць** **служыць**[14]. **парадку ў** **нашай** **Дарэчы,** **украінскай** **батальёны** **“ходзіць** **ваяваў** **набожнікі** **прадрэнкаў** **капітана** **Цэйтлін.**

16 **Юрэвіч**

Спіс
літаратуразнаўства
Мушынскі.3

Што тычыцца мяне, дык прапанаваная рэдкалегіяй назвы гэтага разьдзелу — “Літаратура перыяду рэвалюцыі і грамадзянскай вайны” — выклікае пярэчаньне.

Хто дакажа мне, што ў Беларусі была грамадзянская вайна?

Якая палітычная сіла ў Беларусі вяла збройную барацьбу за аднаўленьне расійскае манархіі, памешчыцкага землеўладаньня і *“единой і неделимой”* імпэрыі? Хто, ўзначальваў беларускі контрарэвалюцыйны лягер і зь збройныя сілы? Дзе (у якой мясцовасьці) адбываліся крывавыя сутычкі й бітвы, праходзілі франты паміж адной часткаю ўзброеных беларусаў і другою часткаю ўзброеных беларусаў? Гэтыя пытаньні, Мігель, я задаю не Табе. У Расіі і Украіны йшла грамадзянская вайна: белыя арміі Аляксандра Калчака, Антона Дзянікіна, Пятра Ўрангеля ды інш. ваявалі супроць Чырвонае Арміі за аднаўленьне манархіі й г. д. У Беларусі нічога падобнага не было. У лютым 1918 г. бальшавікоў з большае часткі нашае краіны выгнала нямецкая армія; пасьля зрыненьня манархіі ў Нямеччыне (лістапад 1918 г.) большую частку Беларусі ўзяла Чырвоная Армія; зь вясны 1919 г. Чырвонай Арміі давялося адступаць пад ударамі Войска Польскага да Дняпра; у ліпені 1920 г. Чырвоная Армія пайшла на Варшаву, але ў наступным месяцы прымушаная была адступіць да Менску. Могуць нагадаць пра палескі паход генэрала Станіслава Булак-Балаховіча ў канцы 1920 г. Дык жа армія Балаховіча змагалася ня з арміяй ССРБ (у фармальна незалежнай ССРБ войска не было), а з расійскай Чырвонай Арміяй. Мала таго, калі прайшлі весткі пра габрэйскія пагромы ў Пінску[15], урад БНР звольніў Балаховіча са службы[16], а на Нацыянальнай палітычнай нарадзе ў Празе (1921 г.) ад яго адракліся ўсе беларускія сацыялістычныя партыі[17].

Калі на падзеі 1917—1920 гг. зірнуць не з Крамля і не празь ленінска-сталінскую прызму клясавага змаганьня, дык відавочнымі становяцца наступныя факты.

1) Беларусь у гэты пэрыяд была арэнаю барацьбы геапалітычных інтарэсаў іншых дзяржаваў (Расіі й Нямеччыны, Расіі й Польшчы) і разглядалася гэтымі дзяржавамі як разьменная манэта (Берасьцейскі і Рыскі трактаты 1918 і 1921 гг., мірная дамова РСФСР зь Літвою). Пра гэта, дарэчы, піша й аўтар першага артыкулу ў разьдзеле Ўладзімер Казьбярук.

2) Ня маючы войска, Урад БНР не ваяваў з Урадам ССРБ, бо

[15] Сакавіка

[16] Літаратура і грамадзянскай вайны

[17] Архівы БНР. Т. 1, кн. 2. Вільня—Нью-Ёрк—Менск—Прага, 1998. Сс. 1221—1222.

[18] Сакавіка

ССРЛіБ, а ўрады ССРБ і ССРЛіБ, ня маючы свайго войска[18], не ваявалі з Урадам БНР.

3) Ролю контрарэвалюцыянэраў (у сацыяльнай гарантыі за ўсё вяртаньнем зямлі памешчыкам) у Беларусі адыгрывалі нямецкія й польскія акупанты.

4) У сацыяльнай палітыцы паміж беларускімі сацыялістамі і камуністамі не было нераадольных рознагалоссяў. Пасьля ўзгаду нэпу гэтыя адрозьненьні былі малаістотныя. Партыя сацыялістаў-рэвалюцыянэраў дзейнічала ў БССР да 1924.

5) Галоўныя адрозьненьні паміж сацыялістамі й камуністамі палягалі ў галіне нацыянальна-палітычнай. Беларускія сацыялісты й беларускія камуністы выступалі за самавызначэньне Беларусі. Ініцыятарамі абвяшчэньня незалежнасьці БНР і абвяшчэньня БССР былі беларускія марксісты (сацыял-дэмакраты й камуністы). У барацьбе з польскімі акупантамі беларускія сацыялісты-рэвалюцыянэры й сацыялісты-фэдэралісты, якія ўваходзілі ўва Ўрад БНР, супрацоўнічалі з камуністамі. Аднак сацыялісты й камуністы па-рознаму падыходзілі да пытаньня пра самавызначэньне (патрабаваць неадкладнага вяртаньня ў склад СССР беларускіх зямель, ці толькі частак Віцебскае ды Смаленскае губэрняў, усяе Віцебскае ці Магілёўскае[19] ці не; самастойнасьць без прывязкі да Масквы ці саюз з Масквою; сваё войска (усеагульнае ўзбраеньне народу) ці апора на расійскую армію; надаваць беларускай дзяржаўнасьці дзяржаўнае ці не). Пасьля таго, як польскія (апанаваныя) памешчыкі ўцяклі, не апошнім было й пытаньне пра палітычны рэжым: дыктатура пралетарыяту ці Рэспубліка сярэдніх работнікаў ды працоўнае інтэлігенцыі?

Калі ўважліва прайсьціся па пунктах 4 і 5, дык усім, хто ведае гісторыю Беларусі, зразумела, што не было ніводнага такога пункту, па якім беларускія сацыялісты й камуністы не маглі прыйсьці да згоды. У 1921—1927 гг. у ССРБ праводзілася палітыка разьвіцьця крэдытнае, спажывецкае ды збытавое каапэрацыі, ствараліся каапэратывы саматужнікаў (гэтыя палажэньні былі ці не галоўныя ў праграмах сацыял-дэмакратаў і эсэраў); праводзілася землеўпарадкаваньне, ствараліся селішчы й хутары, мэтаю было стварэньне шырокага пласту заможнага працоўнага сялянства (народніцкага земляробства Зьміцер Прышчэпаў — былы эсэр), праводзілася беларусізацыя дзяржаўнага апарату, асабліва

[18] **1919 г. Заходняя расійская дабрахвоцкая армія была перайменаваная ў Беларускую Ліхоўскую армію. Але хто дасьць нам, ці ССРЛіБ Літвы і Беларусі была самастойная армія і ці ССРЛіБ была незалежнаю дзяржавай? Ужо 17 сьнежня 1919 г. Беларуская Ліхоўская армія стала часткаю расійскай арміяй.**

[19] **У красавіку 1919 г. урад РСФСР Магілёўскую губэрню ўключыў**

частак, была створана шырокая сетка беларускіх школ, на беларускай мове выдаваліся амаль усе мясцовыя газеты, у беларускую літаратуру й мастацтва прыйшлі сотні новых імёнаў і дзяўчат; у 1924—1927 гг. у склад БССР была вернута значная частка ўсходнебеларускіх земляў...

Паўтараю, Мігель: не было ніводнага такога пункту, дзе б беларускія сацыялісты й камуністы не маглі прыйсці да ўлады, але супярэчнасьці паміж імі існавалі з тае прычыны, што беларускія камуністы былі несамастойныя: да 1924 г. кампартыя Беларусі ўваходзіла ў склад Расійскай кампартыі; у 1924 г. РКП(б) стала называцца Ўсесаюзнаю камуністычнаю партыяй, але сутнасьць ад гэтага не памянялася: — жорсткая цэнтралізацыя ня толькі захоўвалася — рабілася яшчэ больш жорсткаю. На чале КП(б)Б увесь час стаялі небеларусы.

Успомні і тое, што я пісаў на пачатку другога ліста: ніякага іншадумства нават у сваёй партыі, ленінска-сталінскага клясавае барацьбы... Менавіта гэта прывядзе да буйнейшай трагедыі 30-х гг.

Тэзыс аб грамадзянскай вайне ў Беларусі 1917—1920 гг. перанесены з маскоўскай глебы. Гэта быў *пэрыяд барацьбы за беларускую дзяржаўнасьць.* Змагаліся, паўтараю, і беларусы, і камуністы. Ставячы перад сабою розныя нацыянальныя дзяржаўныя мэты, яны вялі паміж сабою вайну... на старонках газэтаў. Сацыялістычны Ўрад БНР[20] не ваяваў з камуністычным урадам ССРБ хоць бы з тае прычыны, што абодвум не было каго пасылаць у бой[21].

Зрэшты, пытаньне пра тое, была грамадзянская вайна ў Беларусі ці не было яе, гісторыкі літаратуры не вырашаюць, але, прыняўшы тэрмін “грамадзянская вайна”, яны павінны былі б асьвятляць і літаратурны працэс з гэтага гледзішча. І тут, Мігель, мы бачым дзіўную карціну: на баку бальшавікоў няма (калі не лічыць Цішкі Гартнага[22]) ніводнага прыкметнага літаратурнага імені. Якуб Колас жыве ў Расіі, але як пісьменьнік маўчыць[23]. Беларуская мастацкая інтэлігенцыя за маскоўскім бальшавізмам не пайшла таму, што ён прынёс ёй варожы беларускай культуры. Янка Купала, Зьмітрок Бядуля, Алесь Гарун, Максім Гарэцкі[24], Францішак Аляхновіч, Уладзіслаў Галубок, Флярыян Ждановіч[25], Уладзімір Жылка — усіх гэтых і шмат іншых дзеячоў мастацтва мінулага моманту прыходу бальшавікоў (ліпень 1920 г.) у Менску або ў

Дзевяцьцю павятаў у склад Гомельскае губэрніі адзін (Мсьціслаўскі) у склад Смаленскае і адзін (Сеньненскі) — у склад Віцебскае губэрні. Тады ж у склад Полацкае губэрніі трапіў таксама Дзісенскі павет (грамадзянскай вайны ў сваіх межах), і Менскую губэрнію.

[20] Прывяла ўва Ўрад БНР адхілі эміграцыі нейкім чынам

[21] Пра гэта ў

[22] Пра яго

[23] Пра гэта ў

Вільні. Малады беларускі камуніст Міхась Кудзелька (ён жа Міхась Чарот) да прыходу бальшавікоў друкуецца ў выдавецтвах БНР. А кіраўнік Беларускай Камуністычнай Арганізацыі Ўсевалад Ігнатоўскі выкладае ў Менскім пэдагагічным інстытуце, які знаходзіцца пад эгідаю Ўраду БНР. Ці ведаюць пра іх партыйнасьць, але “суворых мераў” не ўжываюць. Такім чынам, *грамадзянскае вайны ў галіне культуры, у беларускай літаратуры таксама не было*. Пра аўтар разьдзелу Ў. Казьбярук не адцеміў, але гэта ясна з кантэксту.

Натуральна, ува ўступным артыкуле да 1-га тому ня мог не сказаць, што ў пэрыяд 1900—1920 гг. беларуская літаратура зрабіла такі скачок у сваім разьвіцьці, роўнага якому ня пазьней. Калі гаварыць аб творчых мэтадах, школах і напрамках, мы ўбачым і рэалізм, і нэарамантызм, і сымбалізм, і нават містыцызм... Нельга было не сказаць пра ўзбагачэньне, пра засваеньне мастацкіх вартасьцяў іншых нацыяў (пераклады)...

Натуральна, што, адкрываючы другі том, неабходна пісаць і пра нэп, і пра беларусізацыю, і пра карані, і пра “ўзбуйненьне” ССРБ, і пра Інстытут беларускае культуры, і пра Акадэмію, і пра пастанову ЦК УсеКП(б) аб мастацкай літаратуры (1925), і пра газэты з часопісамі, і пра той самы ЎКП, і пра “Узвышшам”, пра якія пытаешся Ты[26], і пра іншыя аб’яднаньні, і пра тэатральную дыскусію, і пра вынікі універсытэту, і пра згортваньне нэпу, і пра наступленьне, ува ЎсеКП(б), і пра “Саюз Вызваленьня Беларусі”, і пра “Народную Грамаду”, і пра стварэньне Саюзу савецкіх пісьменьнікаў, і пра ўсталяваньне “адзіна правільнага” творчага мэтаду... Вось ад гэтага “абстрактнага” пытаньня спакойна ўзыходзіць да канкрэтнага.

А паколькі ў 1921—1941 гг. мы маем справу з усімі гэтымі адрознымі пэрыядамі ў разьвіцьці беларускае савецкае літаратуры, дык мо ня трэ было б пісаць адзіныя нарысы пра прозу, драматургію й крытыку 20—30-х гг.?

Пішучы пра заходнебеларускую літаратуру, д-р Дабрэіс слушна вылучае тры пэрыяды: 1920—1926 гг. (“Вызваленая Літва”, эндэцкая, парлямэнцкая Польшча); 1926—1939 гг. (ад майскага пераварота і разгрому Беларускае Сялянска-Работніцкае Грамады да расправы з соймавым кампаніяй

[21] Ты цікаўны Сяўцік пытаньне 1920-х. Ці ўстаноўлены ў гэтай галіне ўжо сёньня? Пытаньне вялікае, але ня ведаю, ці варта яго ставіць.

[22] “Айцец” і сыны” ня ведаю, ці ёсьць у Ўраду. Шчыра кажучы, ня ведаю, ці ёсьць яе ў нас. Ці ня лепш, каб яе ня было? Ці ня лепш, каб яе ня было? Ці ня лепш, каб яе ня было?

“Змаганьне” і ўневажненьня мандатаў паслоў на сваіх спадчыннікаў Беларускае Хрысьціянскае Дэмакратыі і Беларускага Сялянскага Саюзу); 1930—1939 гг. (пэрыяд “найлепшага” курсу польскае палітыкі ў дачыненьні да беларусаў). Яраўскі ведае праблемы, Мігель, і таксама пытаюся: чаму ўва ўступе да разьдзелу не патлумачаны прычыны таму або ўва ўступе да разьдзелу не патлумачаны прычыны таму, што “Сярэдняя Літва”, БХД, БСРГ, БСС, “Змаганьне”? Дарагі мой дружа, Тваё ўражаньне, што гэтыя тамы пісаныя для знаўцаў беларускае гісторыі, але вернемся да артыкулу дзе Ліс. Гэта здаецца, адзіны аглядавы артыкул, у якім пераклад разглядаецца як від мастацкае творчасьці. Хачу звярнуць зьвярнуць Тваю ўвагу на адну канцэпцыю разьвіцьця беларускае літаратуры ў 30-х гг. Канцэпцыя, што нараўне новая, але забытая, і д-р Ліс яе аднаўляе. У 1937 г. адбываецца чарговы, але самы крывавы пагром літаратуры, і заходнебеларускі крытык А.Бужанскі (псэўданім не разгаданы) пісаў:

“У той час, калі зь беларускай літаратуры на Ўсходзе сілком зрабілі рыкшу,... літаратура на Захадзе пачала таптацца на месцы, узбагачаючы форму й шліфуючы дэталі. Паўстала паэзія зачараванага кола, каторую цягнулі песьняры ў ярме старых канонаў.

Потым — зарысаваўся сылюэт Максіма Танка”.

Думаю, я ня надта рызыкую, калі скажу: *сваёю творчасьцю у 30-х гг. XX ст. Максім Танк уратаваў гонар беларускае паэзіі, літаратуры наогул.* Не адно гэты пясьняр (побач называлі Натальля Арсеньнева, Хведар Ільляшэвіч, іншыя пісьменьнікі), але Максім Танк быў самаю прыкметнаю фігураю ў гэтонайў творчасьці спалучаліся і эстэтызм, і грамадзянскасьць.

Гэта я пішу і дзеля таго, каб зьвярнуць увагу на разьмаўленьне д-рам Лісам канцэпцыю, і дзеля таго, каб падзяліць Тваё неўразуменьне з прычыны манаграфічных артыкулаў у 2-м томе. Сапраўды, калі ў гэтым томе зьмешчаныя артыкулы пра тых, хто пражыў і 30-я, і 70-я гг., дык міжволі насоўваецца пытанне: а чаму тут няма артыкулу пра самага выдатнага паэта 30-х гг. Максіма Танка й артыкулу пра выдатных паэтак Натальлю Арсеньневу ды Яўгенію Пфляўмбаўм? Зьвярні ўвагу яшчэ на адно. Безумоўна, першыя паэты 20-х гадоў — ня лічачы “старых” Купалы і Коласа, — **хвайцца**

былых

наўлетнікаў

ва Ўкраіне і

сустрэнах зрабіў.

Яшчэ адно з

“пайдоў” БССР

дні Міхася Гіка,

публіцыста

Фабіяна

Шантыра — на

парадку 1920

БССР

ратэгіі.

23 Маўчыць, але піша новую зямлю” ды Сымона-музыку”, складваюцца ў яго й “Казкі жыцьця”...

24 Гэты клясык, што праўда, пэўны час супрацоўнічаў з бальшавікамі. На “свежых сьлядох” ён напісаў аповесьць “Дзьве душы”, у якой паказаў норавы новых

(1919; 1922), Уладзімер Жылка (1920; 1923), Уладзімір Дубоўка (1921; 1923), Язэп Пушча (1922; 1925). Іх дэбюты абазначаюць год дэбюту ў беларускім друку і год выхаду першае кнігі. Адмысловаю славаю валодаў сатырык Кандрат Крапіва (1922; 1925). Слава першых празаікаў (значнай часткі лічачы “старых” Коласа, Гарэцкага, Бядулі) замацавалася над канец 20-х гадоў за Кузьмою Чорным (1923; 1925), Міхасём Зарэцкім (1922; 1925). Набыў славу й навэліст Міхась Лынькоў (1926; 1927). У 1924 і 1927 гг. дэбютавалі і хуткаю славаю Андрэй Мрый ды Лукаш Калюга. Паэт Пятрусь Броўка дэбютаваў у 1926 г., а ягоная першая кніжка выйшла ў 1930 г. і беларускую паэзію мала ўзбагаціла. А цяпер зірнем, як разьмешчаныя манаграфічныя артыкулы ў 2-м томе “Кандрат Крапіва”, “Кузьма Чорны”, “Пятрусь Броўка”, “Міхась Чарот”, “Уладзімір Дубоўка”, “Міхась Зарэцкі”, “Язэп Пушча”, (яшчэ шэсьць артыкулаў), “Уладзімір Жылка”, “Лукаш Калюга”... Зноў мы маем справу з “фэўдальнаю лесьвіцаю”. Крапіва, Лынькоў і Броўка, як бачым, атрымалі ад кампартыі годнасьць народных пісьменьнікаў (два першыя) і паэта. Вось у адпаведнасьці з гэтымі годнасьцямі і занялі яны першыя месцы. Вось і апынуўся Броўка *на трэцім сваіх папярэднікаў.*[27] Праўда, у рэдактараў стала годнасьці ўшанаваць талент Кузьмы Чорнага — пісьменьніка, паўтаруся, не зьняважылі званьнем “народнага”.

А як на разумны лад, тут трэ было б пакінуць артыкулы пра Гарэцкага, Чарота, Жылку, Зарэцкага, Платона Галавача, Янку Нёманскага, Андрэя Мрыя, Васіля Каваля, Сымона Лукаша і Лукаша Калюгу — тых, чый жыцьцёвы й творчы шлях ідзе ў 30-х.[28]

...На пачатку гэтага ліста я абяцаў пакінуць Тваё пытаньне “на дэсэрт”.

Ты пішаш, што мэтад узыходжаньня ад абстрактнага да канкрэтнага вядомы кожнаму пачаткоўцу ў навуцы. Згодзен, дружа. Ты пытаешся: чаму ж акадэмікі й дактары кіраваліся гэтым апрабаваным мэтадам? Дзеля адказу на пытаньне трэба ўважліва прачытаць уступ (т. 1, с. 5–10). Аўтары гэтага тэксту выдатна ўсьведамляюць усю хібу чатырохтомніку і пісалі ўступ дзеля таго, каб зацягнуць крытыкі. (У беларусаў гэта называецца “паслацьвіць”, каб не было балюча падаць”.) Гаворыцца ў тым Уступе, што

[25] Міхась Лынькоў пачаў друкавацца ў 1918 г. Мяжа 1920-х гг. — гэта ўжо беларускі друк, а не “Крывіцкая праца”, “Наша ніва” ці “Беларускі шлях”.

[26] Інфармацыю пра тое, што Зарэцкі ў 1930-х гг. працаваў у Тэатры БНР, можна знайсці ў кнізе Зоі Капыскай “Крывіцкая і беларуская літаратурныя плыні” (Мюнхен, 1986).

[27] Цытата з Ліста Максіма Танка (Максіма Лужаніна) Францішку Аляхновічу (Ф. Янкоўскаму) ад 1 ліпеня 1930 г. (Архіў Ф. Янкоўскага ў Нью-Йорку).

[28] Гэтае пытаньне (“Чаму ў 30-х гг. не было напісана манаграфічных артыкулаў пра Гарэцкага, Чарота, Жылку, Зарэцкага, Платона Галавача, Янку Нёманскага, Андрэя Мрыя, Васіля Каваля, Сымона Лукаша і Лукаша Калюгу?”) я ставіў у 1980 г. у Мюнхэне ў прыватнай размове з Янкам Запрудзкім (Янкам Юхімовічам), Янкам Станкевічам, Янкам Шпакоўскім, Янкам Юхнавецам, Янкам Юшкевічам, Янкам Янушкевічам, Янкам Ясеньскім, Янкам Янішчыцам і Янкам Ясінскім (Ф. Янкоўскім). Адказ быў адзін: “Не было часу”.

“метадалагічныя складанасці”. Ёсць і прызнаньне, што аўтарскі калектыў гэтае працы *“не здолеў пайсці ў прынцыпе рускімі даследчыкамі так далёка ў напрамку “карэнай перапрацоўкі” зробленага раней”*, бо, выяўляецца, *“прынцыпу літаратуразнаўству не хапае сучаснага філасофска-тэарэтычнага патэнцыялу” “для больш рашучага рэшэньня важнейшых праблем развіцця нацыянальнай літаратуры”*. І наогул, вядучая навуковая ўстанова краіны прадэманстравала *“хай на сённяшнім “пераходным этапе” кожная група, калектыў аднадумцаў творча мабілізуюцца і напружана працуюць над гісторыю літаратуры”*. А мы, хацца дадаць адпаведна Уступу, умываем рукі.

Каб апраўдаць слабасьць свае працы, аўтары ўстрымліваюцца, гаварыць за ўсё беларускае літаратуразнаўства: яно, маўляў, не стае філязофска-тэарэтычнага патэнцыялу. З гэтым я не згаджуся. Рэдакцыйнай калегіі гэтага чатырохтомніка, большасьць у якой складаюць вэтэраны беларускага літаратуразнаўства, бракуе іншага — навуковае грамадзянскае мужнасьці. Яны выдатна ўсьведамляюць, што ў Беларусі знаходзяцца нэабальшавікі, якія жарсьці распаліліся вакол Інстытуту гісторыі Нацыянальнае Акадэміі навук[29], вырашылі засьведчыць дзеля гэтага пазьбягаюць выразнае канцэпцыі, эклектычна крытэраў і вяртаюцца да старых савецкіх *argumentum* ды *argumentum ad hominem*.

І ўсё ж ня гэта я пакідаў Табе “на дэсэрт”. Вучоныя-літаратуразнаўцы, усьведамляючы ўсе вады свае, спачатку вырашылі былі даць чатырохтомніку назву “Нарысы гісторыі беларускай літаратуры XX стагоддзя”. Заўважым, што слова “нарысы” ратавала б ізнюю працу ад крытыкі: гэта нешта незакончанае, незавершанае, накіды, эскізы кіраўнікі Інстытуту літаратуры, мусіць, вырашылі, што слова “нарысы” гучыць несалідна. Не папярэджваючы аўтараў калектыў, яны ў апошні момант вырашылі адмовіцца ад гэтага слова і падставілі яго пад удар.

Ты не ўбівайся, браце. Прыедзе Багдан у Таледа, прымусь лекцыі чытаць. Няхай ведае, як нечыта замежжа вазіць.

ко ўнам, якая ўтрымлівае з нерасшыфраваныя ірмінам ктталту прадмету ды нтызму) падаецца, хай пасьля праведзеных пра нядоляў прозу й драматургію, якіх ня Мінцаю і “Машэрак”, і “Ўзвышша”, і нават Авэрбах ульпарэнні з, Бэндэ (але намучыць без “парыбзка” да ПАППу, прабаткам “пятнаццаці” ВелАПП). Між тым перанос інфармацыі “Нарысы ці “Нарысы” ўжо дзіўна. Да таму, што слова “нарысы” ў назвах маніфэстаў гэтых Ты яго ці ядзінаю даваў бы

Прывітаньне ўсім маім знаёмцам у Таледа.

Анатоль.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага
br.by

магчымасьць лепш разумець клімат, у якім жылі й працавалі пісьменьнікі, погляды, якіх яны прытрымліваліся.

27

Разьбіраючы “Прамову фактамі” і зборнік “Цэхавыя будні” (1931), М. Арочка

справядліва піша, што Броўкавы творы засьведчылі зарыентаванасьць аўтара на агітку, на тэорыі антыпсыхалягізму ды антылірызму. Ня лічыць д-р Арочка творчым дасягненьнем і Броўкаву паэму “Кацярына”. У цэлым аб’ектыўна ацэньвае творчасьць Броўкі і аўтар артыкулу пра яго д-р Мікола Мішчанчук. Але нельга ня выказаць нязгоды з наступным цьверджаньнем: *“П. Броўка, як і А. Куляшоў, М. Танк, Н. Арсеннева, Хв. Ілляшэвіч, П. Глебка, В. Казлоўскі і іншыя аўтары,*

шукаў новыя формы лірызму”. **Фраза надта агульная. Усё-ткі ў гэты творцаў былі розныя зыходныя пункты. Апрача таго, Броўка (прынамсі Броўка 30-х гг.) аніяк ня ўпісваецца ў адзін творчы шэраг з Натальляй Арсеньневай, Танкам ды Хедарам Ільляшэвічам хоць бы таму, што гэтыя паэты ад самага пачатку сваёй творчасьці не былі ані антылірычныя, ані антыпсыхалягічныя.**

[28] У гэты час у ССРБ палітычная сыстэма не дае раскрыцца мноству

талентаў. Многія зьнішчаныя фізычна. Ды ўсё ж быў сярод паэтаў той, каго сярод іншых заўважыў і вылучыў Якуб Колас. Гэта — Аркадзь Куляшоў. У 30-х гг. ён шмат экспэрымэнтуе ў галіне формы. І слушна робіць аўтар артыкулу “Паэзія 30-х гадоў” д-р Мікола Арочка, калі ставіць упобачкі талент Танка і талент Куляшова. Муза Куляшова, насуперак вядомай прыказцы, на ўвесь голас прамовіла толькі ў вайну. Другі раз яна загаворыць у

гады “адлігі”. А Максіма Танка, калі Заходняя Беларусь была далучаная да СССР, Якуб Колас таксама заўважыў і вылучыў.

[29] Гл.: Сагановіч Г. Вайна з беларускай гісторыяй // ARCHE, 2001, №3.

Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: 06-10-2001
[image]

Амандзіна Рэгамэ

Аляксандр Лукашэнка і беларусы ў люстэрку анекдотаў

АМАНДЗІНА РЭГАМЭ дактарантка Інстытуту палітычных дасьледаваньняў у Парыжы. У 1994—1997 гадох выкладала ў Эўрапейскім гуманітарным унівэрсытэце ў Менску. Артыкул перакладзены зь нязначнымі скаротамі.

Ляцяць у самалёце расійскі прэзідэнт Барыс Ельцын і ўкраінскі Леанід Кучма і спрачаюцца, які народ — расійскі ці ўкраінскі — засмуціцца больш, калі самалёт разаб’ецца, і якога прэзідэнта будуць больш шкадаваць.
Ельцын кажа: “Расійцы без мяне нікуды. Я ім даў дэмакратыю. І калі мяне не стане…”
А Кучма пярэчыць: “Ды ну! Гэта без мяне ўкраінцы нікуды. Я ім даў стабільнасць…”
Самалёт падае. Назаўтра Бог ляпае Ельцына й Кучму па плячах: “А шкадуюць жа больш за ўсіх беларусы”.
— “Чаму ж гэта беларусы?”
— “Ды таму, што іхняга прэзідэнта ў самалёце не было.”

Ці вызначае гэты анекдот сапраўднае стаўленне беларусаў да

Аляксандра Лукашэнкі? Станоўчы адказ на гэтае пытанне надзвычай супярэчыў бы прэтэнзіям самога прэзідэнта на ягоную ўсенародна прызнаную легітымнасць і масавую падтрымку, якую насельніцтва нібыта выказала яму падчас рэферэндумаў у маі 1995 г. і лістападзе 1996 г. Але ў якой ступені анекдоты ўвогуле могуць разглядацца як праява грамадскай думкі? Перш чым пераходзіць да далейшага разгляду таго партрэту прэзідэнта, які з іх паўстае, стаўлення беларусаў да А. Лукашэнкі, якое з іх вынікае, а таксама тых рысаў нацыянальнага характару, якія яны падкрэсліваюць, трэба адказаць на вышэйпастаўленае пытанне.

У адрозненне ад даследаванняў грамадскай думкі, калі чалавек адказвае на пытанні, якія ў іншым выпадку й не стаў бы сабе задаваць, у анекдотах выяўленне думкі адбываецца спантанна: тут ні тэма, ні форма адказу не прадвызначаныя. Больш за тое, пры аўтарытарным палітычным рэжыме показкі якраз і ёсць той формай, калі думка выказваецца вольна: адказы ў афіцыйных сацыялагічных апытаннях заўжды аказваюцца не зусім праўдзівымі з-за страху перад наступствамі таго, што чалавек скажа. А анекдот, наадварот, апавядаецца ў выключна спрыяльных умовах, калі апавядальнік, выказваючыся, адчувае сябе нязмушана. Гэта і ёсць адзін з тых фактараў, якія тлумачаць, чаму за савецкім часам анекдоты былі найбольш пашыранай формай выяўлення грамадскай думкі: яны распавядаліся ў прыватных абставінах і таму на іх не магла распаўсюджвацца цэнзура; паколькі ж яны перадаваліся з вуснаў у вусны, іх аўтар заставаўся невядомы і гэта ратавала ад пакарання (хоць за Брэжневым ужо нават сам факт апавядання анекдоту мог цягнуць за сабой сур'ёзныя непрыемнасці для апавядальніка).

Аналіз показак як праявы грамадскай думкі сутыкаецца, аднак, са шматлікімі праблемамі метадалагічнага характару. У самой іх кваліфікацыі як праявы грамадскай думкі існуе пэўная парадаксальнасць (бо апавядаюцца яны, галоўным чынам, у прыватных абставінах). Апроч таго, і ўзнікаюць яны не ў шырокіх "слаях народу", а хутчэй — у пэўных грамадскіх груп. У Савецкім Саюзе палітычныя анекдоты былі пашыраныя ў збольшага сярод гарадскога насельніцтва, іх расказвалі на чэргах, на сяброўскіх вечарынах, падчас сходак "дарэчы".

[1] Аніскавец, Ю. Указ. соч. С. 3.

Найчасцей гэта, вядома, жарты аб праблемах дэспатычнай сацсістэмы ды асобе Брэжнева. Што да іншых сюжэтаў, як культ Леніна, змест ідэалогіі ці гераічны чырвоны Чапаеў, — дык яны былі аб'ектам кпінаў, бадай, толькі ў пэўных колах. Сабраныя ў гэтым артыкуле анекдоты пра А. Лукашэнку і беларусаў былі запісаныя падчас нашых паездак у Беларусь паміж 1996 і 1999 гг. У параўнанні з жартамі пра былых савецкіх кіраўнікоў яны не такія папулярныя. Чуць іх даводзілася ў студэнцкіх колах, ва ўніверсітэцкім асяроддзі інтэлігенцыі, а таксама ў колах беларускай апазіцыі. Цікавы, верагодна, што сярод тых, хто падтрымлівае А. Лукашэнку, з'яўляецца ягоным прыхільнікам, яны не апавядаюць анекдоты пра Брэжнева і пашыраныя яны, верагодна, і ў іншых колах — сярод вайскоўцаў, рабочых, сялянаў.

З іншага боку, ці можна сказаць, што анекдот адлюстроўвае пэўнае меркаванне? Дапусцім, што нават калі анекдоты й не з'яўляюцца вынікам пэўным чынам збудаванага палітычнага дыскурсу, але ўсё ж яны — плён тых ці іншых развагаў і спосабу мыслення на пэўную тэму. Аналіз усякага выказанага меркавання вымагае ведання таго, каму і кім апавядаецца гісторыя, а таксама абазнанасці ў культуры і ў культурных алюзіях, у якія гэтая гісторыя ўпісваецца. Прычыны, з якіх анекдот выклікае смех, аналізаваліся шматлікімі аўтарамі. Паводле Фройда, анекдот дазваляе чалавеку здаволіць свае памкненні (у выпадку палітычнага анекдоту — агрэсіўнасць): псіхічнае напружанне, неабходнае для гамавання гэтых памкненняў, знікае, і распружанне адбываецца праз смех. На думку іншых, смех выклікаецца за кошт прыніжэння таго, што высмейваецца, ці выкрыцця пустапарожнасці або механічнасці таго, што здаецца з выгляду важным. Анекдот выклікае смех і таму, што слухач раптам адкрывае для сябе ягоны падтэкст — тэкст, што "схаваны" за тэкстам самой гісторыі. "Дэтанатарам" тут служыць пэўнае слова ці выраз, якія дазваляюць выкрыць гэты падтэкст за тэкстам "вонкавым". Менавіта падтэкст і можа разглядацца як меркаванне, што выказваецца апавядальнікам жарту і падзяляецца тым, хто смяецца. Смех, у сваю чаргу, дазваляе правесці аналіз "вонкавага" тэксту ўжо на другім узроўні, і гэты аналіз часцяком яшчэ больш падкрэслівае меркаванне, выказанае ў тэксце "схаваным".

Так, калі мы вернемся да працытаванага вышэй жарту, то

заўважым, што яго “вонкавы” тэкст палягае ў высвятленні, каго з двух прэзідэнтаў — расійскага ці ўкраінскага — будуць шкадаваць больш. Але тут адразу бачыцца іронія, і мы разумеем, што, калі самалёт разаб’ецца, ніводнага з двух прэзідэнтаў іх народы шкадаваць не будуць. А дэтанатар — “*таму, што іхняга прэзідэнта ў самалёце не было*” — адкрывае падтэкст: беларусы любяць свайго прэзідэнта яшчэ менш, чым першыя два народы — сваіх прэзідэнтаў.

Выказванне грамадскай думкі аб прэзідэнту адбываецца й праз апісанне яго партрэту: памяшчэнне Аляксандра Лукашэнкі ў разнастайныя абставіны дазваляе выявіць пэўныя рысы яго асобы, якія лічацца за найбольш характэрныя[1]. Выява прэзідэнта, якая паўстае з анекдотаў, з’яўляецца пэўным адказам на той імідж, які стварае яму афіцыйная ўлада. З анекдотаў вымалёўваецца і карціна таго, як ставяцца беларусы да свайго прэзідэнта, і партрэт саміх беларусаў.

А. Лукашэнка — уладарны невук-мегаламан

Паклікаў Бог да сябе Клінтана, Ельцына і Лукашэнку і кажа ім: так і так, праз два дні адбудзецца канец свету. І выправіліся тры прэзідэнты назад, каб паведаміць пра пачутае сваім народам.

Выступае перад амерыканцамі Клінтан, кажа: “Маю для вас дзве навіны: адну добрую і адну кепскую. Кепская навіна ў тым, што праз два дні адбудзецца канец свету. А добрая ў тым, што Бог усё-ткі існуе, бо ён сам мне пра гэта паведаміў”.

Выступае перад расійцамі Ельцын, кажа: “Маю для вас дзве навіны: адну добрую і адну кепскую. Кепская навіна ў тым, што за два дні адбудзецца канец свету. А добрая ў тым, што запасаў гарэлкі да таго часу ўсім хопіць удосталь”.

Выступае Лукашэнка: “Дарагія маі ізбірацелі! Маю для вас добрую навіну: я буду вашым прэзідэнтам да канца свету”.

Гэты жарт, пачуты неўзабаве пасля лістападаўскага рэферэндуму 1996 г., кідае святло на тое, як ён сам ставіцца да свайго прэзідэнцтва: ён часта гаворыць пра сябе ў траццяй асобе (“прэзідэнт”) і выстаўляе сябе за адзінага на што-колечек здольнага палітыка ў Беларусі, які, нягледзячы на бяздарнае атачэнне, сам змагаецца супраць змоваў, што нясуць краіне

[2] П’еса была пастаўленая пасля адкрыцця ў Мінску рэстарану “Макдональдз”. Гэтая падзея выклікала такі

пагрозу. Ён уяўляе дэмакратыю як палітычна цэнтралізаваную сістэму, у якой “блізкі” да народу прэзідэнт, што “ведае” народ й “паходзіць”, упаўнаважаны вырашаць усё, бо ядро ведае, што для народу добра, а што не. Месца для якой бы там ні было апазіцыі ў такой сістэме няма.

нажыліся, што міліцыянтаў даводзіцца пастаянна натоўп тэатральнымі прыёмамі.[2]

У парадыйнай форме гэтую канцэпцыю ўлады ілюструе камедыя “Смерць тырана, або МакДональдз зачыняецца”, напісаная групкай менскіх анархістаў. Гэтая п’еса была пастаўленая 1 сакавіка 1997 г. на плошчы Волі, каб адзначыць угодкі забойства эсэрамі цара Аляксандра II ў Санкт-Пецярбургу 1 сакавіка 1881 г. Намёк на “цара Аляксандра” — вельмі празрысты, і ўрачыстая прамова, якую ён трымае перад “беларускім народам”, што сабраўся яго паслухаць, уяўляе сабой пародыю на лукашэнкаўскае разуменне дэмакратыі:

“*Как не выпалніць все пажэланья людзей? Я такіх пажэланій вам спісак саставіл. Чэм вам думаць самім, дык так будзе.*” — *скарэй.*

…Із-за всех эціх труднасцей прошлай весной, із-за ващих валненій? Зачэм валнавацца? Пусць валнуецца цар, у него долг такой. С нім не скора, я думаю, мне расставацца.

…Важна быць заадно, зра не нада галдзець, вы пайміне, цару эта толька мешает. Ведзь за блага людзей он гатоў умерэць да здоровье пака ешчо не пазваляет”.

Навінкі — беларускамоўная сатырычная газета, якая нібыта дэкларуе абсалютную падтрымку прэзідэнту, але робіць гэта ў такой гратэскнай і гіпербалічнай форме, што ўспрымаць іх усур'ез немагчыма.

У той непасрэднай сувязі паміж прэзідэнтам і народам, на якую прэтэндуе А. Лукашэнка, месца для якіх-кольвек прамежкавых уладных структураў проста няма. Гэта праяўляецца і ў рэформах інстытуту ўлады (змяншэнне ролі парламенту, увядзенне “прэзідэнцкай вертыкалі” ў рэгіёнах), і ў некаторых сымбалічных актах: маланкавых рэйдах прэзідэнта па раёнах, дзе “нешта ідзе не так”, разносных заявах на адрас “бязлярных бюракратаў”. Такое стаўленне да прамежкавых эшалонаў улады яўна нагадвае палітыку Сталіна, што не ўнікла ўвагі сатырычнай газеты “Навінкі”[3], якая ў нумары за чэрвень 1999 г. змясціла артыкул пад назваю “Кланіраваць прэзыдэнта”:

“Вынікі апошняй сэлектарнай нарады па аграрных пытаньнях у чарговы раз засьведчылі бесьсьмяротнасьць сталінскай формулёўкі “кадры вырашаюць усё”. […] Кожная клетачка краіны жыве ў напружаным працоўным графіку: своечасова

выходзіць на пасяўныя, галасуе на рэфэрэндумах, кляйміць дэмакратычных вырадкаў”.

Прэтэндуючы на цэнтральную ролю ў краіне, адсланяючы на задні план розныя міністэрствы, А. Лукашэнка можа рабіць гэта, толькі падкрэсліваючы свае кіраўнічыя здольнасці і дасведчанасць ва ўсіх галінах. Менавіта на гэтым факце пабудаваны наступны жарт:

Некалькі журналістаў маюць гонар узяць інтэрвію ў прэзідэнта Лукашэнкі.

“Аляксандр Рыгоравіч, скажыце, вось вы ж спецыяліст у эканоміцы…”

“Ешчо бы, я і ў эканоміке разбіраюсь, і ў банкаўскам дзеле, і ў фінансах…”

“І ў сельскай гаспадарцы!”

“А ў сельскам хазяйстве лучшэ всево! Ты ж знаешь, я лічна вазглавлял бітву за ўражай эцім летам.”

“А скажыце, Аляксандр Рыгоравіч, ці праўда, што вы некалькімі мовамі валодаеце?”

“Ешчо бы! Пяцью!”

“Пяццю? А не маглі б вы пералічыць, якімі?”

“Пажалуста: беларускай уснай, беларускай пісьменнай, рускай уснай, рускай пісьменнай і англійскай.”

“Англійскай! Аляксандр Рыгоравіч, а не маглі б вы сказаць што-небудзь па-ангельску для слухачоў нашага радыё?”

“Да сколька угодна: хэндэ хох!”

“Так, але ж, Аляксандр Рыгоравіч, э-э, але ж… гэта па-нямецку.”

“А, па-нямецку? Ну, значіт, шэсцью.”

Гэты жарт, пачуты ў 1998 г., перадусім паказвае, як А. Лукашэнка паводзіць сябе з журналістамі: ён абыходзіцца з імі за панібрата, кожнаму тыкае, імкнецца ператварыць усіх у рупар сваіх ідэяў і не церпіць пытанняў, у якіх ёсць хоць бы намёк на крытыку. Выкрываны ў жарце факт, што прэзідэнт не валодае ніводнай замежнай мовай, ставіць пад сумненне і ўсе астатнія ягоныя нібыта здольнасці: няма сумнення, што ў эканоміцы ці фінансах ён разумее не больш, чым у нямецкай ці ангельскай мовах. Аднак і выбар замежных моваў “скідае з прэзідэнта маску”, ён не выпадковы. Сама Лукашэнкава манера гаварыць часта з’яўляецца аб’ектам кпінаў: ён гаворыць па-

4 У п’есе “Смерць тырана, або МакДональдз зачыняецца цар гаворыць па-расійску з тыповым беларускім вымаўленнем (*дз*, *ч*, *а* замест *о*, *ы* замест *і* і да т. п.) і заяўляе: “Язык ваш можна выучыць за ноч, хоць гаварат, што опцяжольні. Лож.” Гэта ўжо нават не трасянка, бо тут няма ніводнага беларускага слова.

расійску з моцным беларускім акцэнтам і часам пераходзіць на трасянку[4]. З іншага боку, уменне гаварыць на заходнім дыялекце ёсць зарокам адкрытасці да Захаду: такім чынам тонка намякаецца й на Лукашэнкаву палітыку збліжэння з Еўропай. Прэзідэнт у анекдоце не толькі вызначаецца невялікімі памерамі, амбіцыямі, але й паказаны як чалавек вельмі недалёкі. Аналіз жартаў пра “дурняў” ці “дурныя” нацыянальныя групы праведзены К. Дэвіс[6]. Жарты на гэтую тэму разглядае як праяву пачуцця трывогі ў ўмовах рацыяналізаванага свету, у якім увесь час трэба паказваць дзеяздольнасць і карыснасць, і як спосаб сцвярджэння сваіх здольнасцяў за кошт высмейвання іншых. Кпіны савецкіх кіраўнікоў у такім выпадку могуць разглядацца як спосаб выказаць гэтую занепакоенасць і як усведамленне “савецкай” у кіраўніках, якія “адпавядалі б узроўню” сучаснай рацыяналізаванай сістэмы грамадства. Аналіз жартаў савецкіх кіраўнікоў, праведзены згаданаю аўтаркай, можа быць перанесены й на А. Лукашэнку, і той факт, што беларускі прэзідэнт не гаворыць ні на воднай замежнай мове, можа інтэрпрэтавацца як занепакоенасць апавядальніка будучыню краіны.

Анекдот паказвае, што ў адрозненне ад вобразу, які Лукашэнка спрабуе стварыць пра сябе ў прамовах і шматлікіх тэлевізійных выступленнях, анекдоты малююць цалкам адвароткі, перагорнутую карціну. Калі А. Лукашэнка напірае на сваю блізкасць да народу і сваё народнае паходжанне, дык анекдоты гэтую блізкасць як нешта станоўчае, дык анекдоты ствараючы яўна адмоўны партрэт селяніна-невука, ствараючы яўна адмоўны партрэт

60-ыя гады. “Вы слухаеце канцэрт па заяўках “Жадаю Вам”. Юны піянер Саша просіць уключыць у нашу праграму яго ўлюбёную песню “Валенкі”. Што ж, дарагі Саша, калі ласка, слухай сваю ўлюбёную песню.

70-ыя гады. “Вы слухаеце канцэрт па заяўках “Жадаю Вам”. Намеснік камандзіра Н-скай заставы па палітчастцы Аляксандр Лукашэнка просіць уключыць у нашу праграму яго ўлюбёную песню “Валенкі”. Што ж, дарагі Аляксандр, калі ласка, слухайце сваю ўлюбёную песню.

80-ыя гады. “Вы слухаеце канцэрт па заяўках “Жадаю Вам”. Дырэктар саўгасу “Гарадзец” Аляксандр Рыгоравіч просіць, каб

[5] Выраз “Хто не хоча ведаць мову ўсіх тонка намякаецца й на Лукашэнкаву палітыку збліжэння з Еўропай. Прэзідэнт у анекдоце не толькі вызначаецца невялікімі памерамі, амбіцыямі, але й паказаны як чалавек вельмі недалёкі. Аналіз жартаў пра “дурняў” ці “дурныя” нацыянальныя групы праведзены К. Дэвіс[6]. Жарты на гэтую тэму разглядае як праяву пачуцця трывогі ў ўмовах рацыяналізаванага свету, у якім увесь час трэба паказваць дзеяздольнасць і карыснасць, і як спосаб сцвярджэння сваіх здольнасцяў за кошт высмейвання іншых. Кпіны савецкіх кіраўнікоў у такім выпадку могуць разглядацца як спосаб выказаць гэтую занепакоенасць і як усведамленне “савецкай” у кіраўніках, якія “адпавядалі б узроўню” сучаснай рацыяналізаванай сістэмы грамадства. Аналіз жартаў савецкіх кіраўнікоў, праведзены згаданаю аўтаркай, можа быць перанесены й на А. Лукашэнку, і той факт, што беларускі прэзідэнт не гаворыць ні на воднай замежнай мове, можа інтэрпрэтавацца як занепакоенасць апавядальніка будучыню краіны.

Анекдот паказвае, што ў адрозненне ад вобразу, які Лукашэнка спрабуе стварыць пра сябе ў прамовах і шматлікіх тэлевізійных выступленнях, анекдоты малююць цалкам адвароткі, перагорнутую карціну. Калі А. Лукашэнка напірае на сваю блізкасць да народу і сваё народнае паходжанне, дык анекдоты гэтую блізкасць як нешта станоўчае, дык анекдоты ствараючы яўна адмоўны партрэт селяніна-невука, ствараючы яўна адмоўны партрэт

60-ыя гады. “Вы слухаеце канцэрт па заяўках “Жадаю Вам”. Юны піянер Саша просіць уключыць у нашу праграму яго ўлюбёную песню “Валенкі”. Што ж, дарагі Саша, калі ласка, слухай сваю ўлюбёную песню.

70-ыя гады. “Вы слухаеце канцэрт па заяўках “Жадаю Вам”. Намеснік камандзіра Н-скай заставы па палітчастцы Аляксандр Лукашэнка просіць уключыць у нашу праграму яго ўлюбёную песню “Валенкі”. Што ж, дарагі Аляксандр, калі ласка, слухайце сваю ўлюбёную песню.

80-ыя гады. “Вы слухаеце канцэрт па заяўках “Жадаю Вам”. Дырэктар саўгасу “Гарадзец” Аляксандр Рыгоравіч просіць, каб

[6] Davies, Christie. **Stupidity and Rationality: Jokes from the Iron Cage // Powell, C., Patton, G. E. *Humor in Society: Resistance and Control, Op. cit.***

для яго прагучала яго ўлюбёная песня “Валенкі”. Што ж, дарагі Аляксандр Рыгоравіч, калі ласка, слухайце сваю ўлюбёную песню.
90-ыя гады. “Вы слухаеце канцэрт па заяўках “Жадаю Вам”. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусі Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка просіць, каб для яго прагучала песня Beatles *“Yesterday”. Дарагі Аляксандр Рыгоравіч, з задавальненнем уключаем для вас запіс Вашай улюбёнай песні “Валенкі”.*

Храналагічныя этапы ў гэтым жарце, які, пачынаючы з 1997 г., мне даводзілася чуць шмат разоў, не абавязкова супадаюць з рэальнай біяграфіяй А. Лукашэнкі, але ў ім падкрэсліваюцца два факты: Лукашэнкава прывязанасць да савецкага мінулага (“піянер”, “намеснік камандзіра па палітчастцы”, а таксама назва песні — *“Yesterday”*) і ягоная прыналежнасць да сялянскага асяроддзя. Ён быў дырэктарам саўгасу, а яго ўлюбёная песня — народная...

Можна сказаць, што анекдоты — гэта “фальклёр інтэлігенцыі”. І сапраўды з анекдотаў паўстае даволі пагардлівае стаўленне сялянства. Зрэшты, згаданы вышэй жарт пераправакацыя, мяркуючы па ўсім, з анекдоту савецкіх часоў, у якім Іван Пархомавіч просіць у Разанскага радыё (а Рэвенькіі — “расійскай глыбінкі”), каб для яго прагучала “Барыня”. Але яго адразу абсякаюць:

— Няма чаго выдурвацца. Слухай свае “Валенкі”!

Гэтаму вобразу “А. Лукашэнкі — невука, хворага на комплекс велічы, селяніна і тыповага саўка” — нібыта супрацьпастаўлены вобраз “А. Лукашэнкі — новага рускага”. Сёння анекдоты пра новых рускіх распавядаюць у Расіі і іншых краінах СНД, тэрмін[7], часцей за іншыя. Новы рускі — гэта нуварыш, ты*пова*я характарызуецца сваім глупствам, безгустоўнасцю, нявым пінжаком, мабільнікам і абмежаванасцю лексічнага запасу, які збольшага зводзіцца да турэмнага арго. Большасць анекдотаў паказваюць яго як чалавека, надзеленага сапраўдным Новыя рускія часта фігуруюць у анекдотах разам з прадстаўнікамі палітычнай улады ці міліцыянтам, якім удаецца падкупіць[8]. Найлепшай ілюстрацыяй іх адносін служыць жарт, у якім новы рускі выступае побач традыцыйным персанажам расійскіх казак *залатая рыбка*, што

**[7] Новы рускі — не толькі нацыянальнасць, а сацыяльная група, прыналежнасць да якой (як і наяўнасць пэўнага жарт (які паралельна з анекдотамі пра новых рускіх, існуюць і анекдоты пра нашых рускіх, тэрмін). Тут і ты *(грузін?”* *“Так, сыну, грузін.” “А дачка? грузінка?” — “Так, сыну, грузінка.” “А я — пайсаба*

здольная выканаць жаданні ўсякага, хто яе злавіў.

Выправіўся новы рускі на рыбалку. І злавіў ён залатую рыбку. Зняў ён яе з зазубня, узяў двума пальцамі дый кажа: “Ну што, залатая рыбка, кажы, што табе трэба”.

Ніжэй змешчаны жарт, пачуты ўвосень 1998 г., які прыраўноўвае да новага рускага А. Лукашэнку:

Маладзенькі даішнік стаіць на ўзбочыне і пільнуе якую-небудзь машыну, каб здзерці штраф. Вечарэе, мароз, снег ідзе. Раптам бачыць: на поўнай хуткасці ляціць навюткі “мэрс”. Ён адразу хапаецца за жазло. “Мэрсэдэс” спыняецца, і з яго выходзіць чароўная дзяўчына, голая, у адным толькі шыкоўным футры.

Малады міліцыянт кажа: “Вашыя дакументы, тэхнашпарт”. Дзяўчына падае яму паперы — там усё ў парадку. “А адкуль у вас такая машына?” — “Дайце, я патэлефаную?” Набірае нумар па сотавым: “Алё, Саша? Саша, скажы, адкуль у нас гэтая машына? Нам падарылі?.. Нам падарылі”, — адказвае яна міліцыянту. Той неахвотна яе адпускае.

Назаўтра той самы міліцыянт зноў пільнуе на ўзбочыне. Халодна… І раптам ён зноў бачыць, як да яго на вялікай хуткасці ляціць навюткая “Таёта”. Ён яе спыняе. З машыны выходзіць тая самая дзяўчына, што ўчора, на ёй зноў амаль нічога няма, апроч ужо іншага вельмі дарагога футра. Паўтараецца ўчорашняя сцэна. З паперамі ўсё ў парадку, дзяўчына тэлефануе Сашу, пытаецца, адкуль машына, і зноў адказвае: “Нам яе падарылі”. Міліцыянт зноў ня хоча, але мусіць яе адпусціць.

На трэці дзень той самы міліцыянт ізноў пільнуе на ўзбочыне. Ляціць навюткая “Альфа-Рамэо”. З яе выходзіць тая самая чароўная дзяўчына. Яна зноў вымае свой сотавы: “Алё, Саша…” Міліцыянт не вытрымлівае, выдзірае ў яе з рук тэлефон і крычыць: “Саша, ты вось мне скажы, як гэта ў цябе выходзіць…” І тут голас на другім канцы дрота яго абсякае: “Для каво Саша, а для каво — Александр Грыгор'эевіч!”

“Аляксандр Рыгоравіч” атаясамліваецца з А. Лукашэнкам з такой самаю пэўнасцю, як і ягонае прозвішча. У згаданым жарце імя і імя па бацьку служаць “дэтанатарам” і дазваляюць нанава перачытаць яго змест ужо не як эпізод узаемадачыненняў новых рускіх з міліцыяй, а як вызначэнне

грузін?” — “І ты грузін, сынку.” — “І мой брат Гогі — грузін?” — “Не, сынку, твой брат — новы рускі”.

Гэта паказана у наступным жарце:

На даразе ляціць “Мэрсэдэс”. Даішнік яго спыняе, машына тармозіць, але з яе ніхто не выходзіць. Афіцэр чакае. Па-ранейшаму — нікога. Тады ён падыходзіць да “Мэрсу”, а новы рускі крычыць яму з акна: “Ну, я не паняў, каму тут патрэбныя грошы?”

ладу жыцця А. Лукашэнкі.
І ў гэтым выпадку анекдот працуе як перагорнуты люстраны адбітак: у сваіх прамовах А. Лукашэнка выстаўляе сябе за чалавека простага і сціплага. А жарт робіць з яго нуварыша. Адначасова ў ім адчуваецца намёк на зробленыя яму падарункі (Ельцын, напрыклад, падараваў яму верталёт), а таксама на тыя велізарныя сумы грошай, якімі ён завалодаў пасля свайго прыходу да ўлады, узяўшы пад кантроль значную частку дзяржаўных рэсурсаў. Але і тут галоўнае значэнне мае не так рэальнасць яго багацця, як народнае ўяўленне аб тым, што палітыкі “думаюць перадусім, як набіць уласныя кішэні”, што й схіляе часам выбаршчыкаў галасаваць за тых, хто ўжо стаіць пры ўладзе, бо “гэтыя, прынамсі, ужо накраліся”. Трэба адзначыць, што прэзідэнт у згаданым анекдоце па-сапраўднаму на сцэне не з’яўляецца, ён толькі згадваецца. Можа быць, гэта тлумачыцца тым, што яго вонкавы выгляд і вобраз, які ён стварае, надта далёкія ад выгляду і вобразу новых рускіх, каб яго можна было ўявіць у такой ролі. Аднак параўнанне дазваляе выкрыць яго багацце і галоўнае — паказаць тую вялікую ўладу, якую ён мае ў сваіх руках.
Сексуальная прыгажуня ў жарце — ніхто іншы, як прэзідэнтава каханка, бо “ўсе ж ведаюць”, што жонка Лукашэнкі засталася жыць у вёсцы са сваёй кароваю Мілкай. Распаўсюджаныя ў Беларусі чуткі пра дачыненні прэзідэнта з жанчынамі пакідаюць дваістае ўражанне. Кажуць, што пасля ўжо таго, як ён стаў прэзідэнтам, яго жонка нібыта забараніла яму пераступаць парог свайго дому і “паслала яго” (інфармацыя, паведамленая быццам бы адным з Лукашэнкавых целаахоўнікаў). Гэтаму вобразу ўсёмагутнага палітыка, але ні на што не здольнага мужа, слабейшага за ўласную жонку, процістаяць шматлікія чуткі пра яго перамогі над жанчынамі, у якіх ён прадстае “сексуальным гігантам”. Шмат хто забаўляецца тым, што збірае яго выслоўі з сексуальным ухілам. Аднойчы А. Лукашэнка заявіў (гаворачы пра сябе ў трэцяй асобе): “Прэзідзент не п’ёт, прэзідзент в рот не берот”. Іншы раз ён заявіў, што будзе ператрахіваць увесь Савет Міністраў. Цалкам верагодна — гэтак, прынамсі, мяркуюць некаторыя, — што гэтыя “перлы” ён выдае знарок: яны ўмацоўваюць яго пануючае сексуальнае становішча, сцвярджаючы, няхай і ў грубай, але недвухсэнсоўнай форме, тую ўладу, якой ён

валодае. Так, у час сваіх сутычак з парламентам у 1996 г. ён нібыта аднойчы выдаў: “Я ў парламент не пайду, там адні петухі”. Слова “пятух ” з’яўляецца ў лагерным і турэмным арго моцнай абразай, азначаючы пасіўнага гомасексуаліста. Такім чынам, тут зноў-такі ўладнае палітычнае становішча сцвярджаецца праз намёк на панаванне ў сексе.

Стаўленне да прэзідэнта: непрыманне, страх і ліслівасць

Сексуальныя намёкі сустракаюцца і ў жартах, дзе гаворка вядзецца пра дачыненні прэзідэнта з яго атачэннем і ў гутарках з беларусамі. Вось адзін такі жарт, пачуты ў студзені 2000 г.:

Прэзідэнт Лукашэнка на аглядзе ў медкамісіі. Пасля агляду ў лекараў разгублены выгляд, яны чухаюць патыліцы, пераглядаюцца… Лукашэнка не вытрымлівае:
“Ну давайце уж, гаварыце праўду, што у меня?”
“Разумееце, Аляксандр Рыгоравіч, у вас… у вас няма анальнай адтуліны.”
“Вот блін, залізалі, гады!
Думка пра тое, што ў лукашэнкавым асяроддзі — адны “задалізы”, падаецца тут у літаральным сэнсе; і ў гэтым можна бачыць асучаснены варыянт некаторых жартаў савецкага часу, дзе гаворка вядзецца, у прыватнасці, пра Брэжнева:

Брэжнеў ляжыць на пляжы дому адпачынку Палітбюро, накрыўшы твар панамай. Раптам падбягае сабака, абнюхвае яго і пачынае лізаць яму яйцы. Брэжнеў, не зварухнуўшыся, ленавата пратэстуе: “Ну, таварышы, я вас прашу, гэта ўжо занадта!
Ці яшчэ:

Таварыш Жыўкаў неўзабаве мае перанесці цяжкую хірургічную аперацыю: аддзяленне свайго языка ад задніцы Брэжнева.
Часта ліслівасці спадарожнічае страх, і калі вышэй згаданыя жарты ўзыходзяць да часоў Брэжнева, дык тыя, у якіх згадваецца страх, з’яўляюцца асучасненым варыянтам анекдотаў сталінскага перыяду.

Амерыканец, новы рускі і беларус спрачаюцца: што такое шчасце.
Амерыканец кажа: “Шчасце — гэта калі ты купляеш білет на самалёт, ляціш да мора, здымаеш вялікі нумар у 5-зоркавым

9 ліслівасць падобны жарт і пра трох расійцаў, у якім шчасце — гэта *калі ў твае дзверы звоніць граміла з аўтаматам, што прыйшоў парахавацца, але высвятляецца, што яму патрэбен твой сусед зверху.*

гатэлі і табе прыносяць бутэльку шампанскага. Вось гэта шчасце”.
Новы рускі не пагаджаецца: “Не. Шчасце — гэта калі ты вырашаеш паляцець да мора, купляеш самалёт, прылятаеш, купляеш 5-зоркавы гатэль і скрыню шампанскага. Вось гэта шчасце”.
“Нічагусенькі вы не разумееце, — кажа беларус. — Шчасце — гэта калі ты на сваім лецішчы абганяеш у агародзе бульбу і бачыш, як пад’язджае варанок. З яго выходзяць трое ў плашчах і пытаюцца ў цябе: “Гэта Садовая, 8?” — А ты ім адказваеш: “Не, гэта Садовая, 7”. Вось гэта — шчасце.”
У даўнейшым варыянце гэтага анекдоту падобная гісторыя адбываецца ў часы вялікага тэрору ў канцы 1930-х. Людзі тады бялелі, пачуўшы на лесвіцы чужую хаду, бо гэта маглі ісці па іх. Яны баяліся быць наступнымі ў спісе арыштаваных. І шчасцем было, калі чалавек, якога шукалі, аказвалася, жыў паверхам вышэй[9].
Урэшце, ёсць жарты, якія проста сведчаць пра поўнае непрыманне прэзідэнта. Гэта ілюструе і першы з цытаваных анекдотаў пра двух прэзідэнтаў, што ляцяць у самалёце. Гэта паказвае і наступны жарт:

Гарбачоў, Рэйган і Лукашэнка апынаюцца на тым свеце і спадзяюцца патрапіць у рай. І каб высветліць, якія ў іх шанцы патрапіць у кампанію абраных, яны пытаюцца ў Хрыста, у чым іхняе шчасце.
“Госпадзе, скажы, у чым маё шчасце?” — пытаецца Гарбачоў.
“Тваё шчасце ў тым, — адказвае Хрыстос, — што, хоць ты й нарабіў памылак, але ж ты хацеў дабра і стараўся даць людзям большую свабоду”.
Тады Рэйган задае такое самае пытанне.
“Тваё шчасце ў тым, — адказвае Хрыстос, — што хоць ты й зрабіў шмат кепскага, калі хацеў павялічыць узбраенні, але ж ты не распачаў вайны”.
Нарэшце задаць пытанне настае чарга ў Лукашэнкі.
І Хрыстос адказвае яму: “А тваё шчасце, што ў мяне рукі да крыжа прыбітыя!”
Калі ўжо Лукашэнка нарабіў столькі глупства, што цярпенне скончылася нават у Хрыста, які, дараваўшы грахі прынамсі двум іншым прэзідэнтам, у гэтым выпадку больш не

вытрымлівае, дык ясна, што беларусаў ён увогуле давёў да шаленства, хоць у жартах пра саміх сябе яны якраз падкрэсліваюць сваю лагоднасць і вялікую цярплівасць.

Беларусы пра сябе

У жартах фігуруюць не толькі кіраўнікі, але й народ, якім яны кіруюць. Распавядаюць такія жарты і беларусы, пакепліваючы ў іх з сябе і свайго “нацыянальнага характару”.

Расіец, беларус і ўкраінец едуць у цягніку. З адной лавы ў вагоне тырчыць цвік. Расіец сядае на яго, адразу ўскоквае, страшна мацюкаецца, выдзірае цвік і, гэтак сама мацюкаючыся, выкідае яго ў акно.

Украінец, сеўшы на цвік, устае, акуратна дастае цвік з лавы і кладзе яго ў кішэню: “Яшчэ прыдасца”.

Беларус сядае на цвік, крыху ўздрыгвае і застаецца сядзець: “Ну што, а мо яно так і трэба”.

Як мы бачым, расіец паказаны ў гэтым жарце як чалавек вельмі эмацыйны, гатовы выбухнуць пры найменшай нагодзе, калі нешта не так, украінец — наадварот, як ашчадны і запаслівы, нават скнарлівы; што да беларуса, дык гэты здольны сцярпець усё. Лагоднасць і цярплівасць вельмі часта вызначаюцца як характэрныя рысы беларусаў. Гэты вобраз, што паўстае з анекдоту, супадае з тым, які імкнуцца стварыць свайму народу кіруючыя ўлады: ва ўсіх прамовах, што гучалі падчас першага святкавання Дня Рэспублікі 3 ліпеня 1997 г., беларускі народ характарызаваўся як “працавіты” і “цярплівы”. Уладамі гэтыя рысы ацэньваюцца як пазітыўныя. На думку ж беларускіх апазіцыянераў, “памяркоўнасць” беларусаў — гэта праблема грамадства. Прынамсі, думка, што праводзіцца ў анекдотах,— ясная, паколькі гаворка тут вядзецца пра самавысмейванне. Народ смяецца з тых рысаў характару, якія прыпісвае сабе сам або пагаджаецца, калі яму іх прыпісваюць іншыя, але цяжка сказаць, наколькі гэтыя рысы сапраўды ўспрымаюцца ўсур’ёз і ці ацэньваюцца яны як адмоўныя ці як станоўчыя.

Чэрвень, 1941 г. Нямецкія войскі акупуюць савецкую Беларусь, чырвоная армія адступае. Каб задушыць усякія спробы супраціву, фашыстоўцы вешаюць у невялічкай вёсцы некалькі чалавек на

навуку іншым.
Чэрвень 1944 г. Памацнелая савецкая армія вызваляе тэрыторыю савецкай Беларусі. Дабраўшыся да маленькай вёскі, вайскоўцы здымаюць целы шыбенікаў, якія ўсё яшчэ вісяць. Першы ж зняты беларус крыху пракашліваецца і сцягвае з шыі вяроўку.
“Як жа ты вытрымаў?” — здзіўляюцца вайскоўцы.
“Ну, як — спярша муляла, а пасля прывык,” — адказвае беларус.
Безумоўна, вобраз Беларусі, што паўстае з жартаў, апавяданых беларусамі, — гэта вобраз крытычны: з аднаго боку — пасіўны народ, здольны ўсё сцярпець, з другога — аўтарытарны прэзідэнт-невук, хворы на манію велічы. Беларусы, што распавядаюць гэтыя анекдоты, разумеюць, як працуе сістэма прэзідэнцкай улады і малююць у сваіх жартах яе перагорнутую выяву. Яны кпяць з уласных “рысаў нацыянальнага характару”. Але ці можна з гэтага напраўду зрабіць выснову, што гэтыя жарты ва ўмовах сучаснай беларускай дыктатуры маюць пэўны падрыўны патэнцыял?
Яны, бясспрэчна, з’яўляюцца праявай крытычнага мыслення і адначасова сведчаць пра тое, што такое мысленне шмат каму ўласцівае. Тыя, хто чуе гэтыя жарты і з іх смяецца, гэтаксама разумеюць іхні “падтэкст”, што хаваецца за “вонкавым” тэкстам. Смех аб’ядноўвае, у той час як любы аўтарытарны рэжым імкнецца, наадварот, раз’яднаць людзей, каб яны адзінцом не маглі супрацьстаяць уладзе. З іншага боку, анекдот — гэта не выбудаваны палітычны дыскурс. Ён выказвае думку, меркаванне, але яно не аргументаванае. Часцяком змагацца з тым, што высмейваецца, ужо цяжка, бо смех — гэта ж і своеасаблівы “клапан для выпуску па́ры”, які дазваляе трываць цяжкасці, не змяняючы ўмоваў жыцця, пра што сведчыць і наступны жарт:

“Тата, а чаму ў Беларусі ўвесь час такая хлюпота? Чаму тут увесь час так халодна і ўвесь час лье дождж?” — “Ну, разумееш, сынку, усё гэта тлумачыцца складанымі атмасфернымі працэсамі, зменамі ў паветраных масах, непрадказальнымі ваганнямі тэмпературы. Карацей, сынку, якая краіна — такі й клімат!”

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 4 (18) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя:
analityka@yahoo.com
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: **06-10-2001**
[image]

Амандзіна Рэгамэ

Аляксандр Лукашэнка і беларусы ў люстэрку анекдотаў

АМАНДЗІНА РЭГАМЭ дактарантка Інстытуту палітычных дасьледаваньняў у Парыжы. У 1994—1997 гадох выкладала ў Эўрапейскім гуманітарным унівэрсытэце ў Менску. Артыкул перакладзены зь нязначнымі скаротамі.

Ляцяць у самалёце расійскі прэзідэнт Барыс Ельцын і ўкраінскі Леанід Кучма і спрачаюцца, які народ — расійскі ці ўкраінскі — засмуціцца больш, калі самалёт разаб’ецца, і якога прэзідэнта будуць больш шкадаваць.
Ельцын кажа: “Расійцы без мяне нікуды. Я ім даў дэмакратыю. І калі мяне не стане…”
А Кучма пярэчыць: “Ды ну! Гэта без мяне ўкраінцы нікуды. Я ім даў стабільнасць…”
Самалёт падае. Назаўтра Бог ляпае Ельцына й Кучму па плячах: “А шкадуюць жа больш за ўсіх беларусы”.
— “Чаму ж гэта беларусы?”
— “Ды таму, што іхняга прэзідэнта ў самалёце не было.”

Ці вызначае гэты анекдот сапраўднае стаўленне беларусаў да

Аляксандра Лукашэнкі? Станоўчы адказ на гэтае пытанне надзвычай супярэчыў бы прэтэнзіям самога прэзідэнта на ягоную ўсенародна прызнаную легітымнасць і масавую падтрымку, якую насельніцтва нібыта выказала яму падчас рэферэндумаў у маі 1995 г. і лістападзе 1996 г. Але ў якой ступені анекдоты ўвогуле могуць разглядацца як праява грамадскай думкі? Перш чым пераходзіць да далейшага разгляду таго партрэту прэзідэнта, які з іх паўстае, стаўлення беларусаў да А. Лукашэнкі, якое з іх вынікае, а таксама тых рысаў нацыянальнага характару, якія яны падкрэсліваюць, трэба адказаць на вышэйпастаўленае пытанне.

У адрозненне ад даследаванняў грамадскай думкі, калі чалавек адказвае на пытанні, якія ў іншым выпадку й не стаў бы сабе задаваць, у анекдотах выяўленне думкі адбываецца спантанна: тут ні тэма, ні форма адказу не прадвызначаныя. Больш за тое, пры аўтарытарным палітычным рэжыме показкі якраз і ёсць той формай, калі думка выказваецца вольна: адказы ў афіцыйных сацыялагічных апытаннях заўжды аказваюцца не зусім праўдзівымі з-за страху перад наступствамі таго, што чалавек скажа. А анекдот, наадварот, апавядаецца ў выключна спрыяльных умовах, калі апавядальнік, выказваючыся, адчувае сябе нязмушана. Гэта і ёсць адзін з тых фактараў, якія тлумачаць, чаму за савецкім часам анекдоты былі найбольш пашыранай формай выяўлення грамадскай думкі: яны распавядаліся ў прыватных абставінах і таму на іх не магла распаўсюджвацца цэнзура; паколькі ж яны перадаваліся з вуснаў у вусны, іх аўтар заставаўся невядомы і гэта ратавала ад пакарання (хоць за Брэжневым ужо нават сам факт апавядання анекдоту мог цягнуць за сабой сур'ёзныя непрыемнасці для апавядальніка).

Аналіз показак як праявы грамадскай думкі сутыкаецца, аднак, са шматлікімі праблемамі метадалагічнага характару. У самой іх кваліфікацыі як праявы грамадскай думкі існуе пэўная парадаксальнасць (бо апавядаюцца яны, галоўным чынам, у прыватных абставінах). Апроч таго, і ўзнікаюць яны не ў шырокіх "слаях народу", а хутчэй — у пэўных грамадскіх груп. У Савецкім Саюзе палітычныя анекдоты былі пашыраныя ў збольшага сярод гарадскога насельніцтва, іх расказвалі на чэргах, на сяброўскіх вечарынах, падчас сходак "дарэчы".

[1] Аніскавец, Ю. Указ. соч. С. 3.

Найчасцей гэта, вядома, жарты аб праблемах дэспатычнай сацсістэмы ды асобе Брэжнева. Што да іншых сюжэтаў, як культ Леніна, змест ідэалогіі ці гераічны чырвоны Чапаеў, — дык яны былі аб'ектам кпінаў, бадай, толькі ў пэўных колах. Сабраныя ў гэтым артыкуле анекдоты пра А. Лукашэнку і беларусаў былі запісаныя падчас нашых паездак у Беларусь паміж 1996 і 1999 гг. У параўнанні з жартамі пра былых савецкіх кіраўнікоў яны не такія папулярныя. Чуць іх даводзілася ў студэнцкіх колах, ва ўніверсітэцкім асяроддзі інтэлігенцыі, а таксама ў колах беларускай апазіцыі. Цікавы, верагодна, што сярод тых, хто падтрымлівае А. Лукашэнку, з'яўляецца ягоным прыхільнікам, яны не апавядаюць анекдоты пра Брэжнева і пашыраныя яны, верагодна, і ў іншых колах — сярод вайскоўцаў, рабочых, сялянаў.

З іншага боку, ці можна сказаць, што анекдот адлюстроўвае пэўнае меркаванне? Дапусцім, што нават калі анекдоты й не з'яўляюцца вынікам пэўным чынам збудаванага палітычнага дыскурсу, але ўсё ж яны — плён тых ці іншых развагаў і спосабу мыслення на пэўную тэму. Аналіз усякага выказанага меркавання вымагае ведання таго, каму і кім апавядаецца гісторыя, а таксама абазнанасці ў культуры і ў культурных алюзіях, у якія гэтая гісторыя ўпісваецца. Прычыны, з якіх анекдот выклікае смех, аналізаваліся шматлікімі аўтарамі. Паводле Фройда, анекдот дазваляе чалавеку здаволіць свае памкненні (у выпадку палітычнага анекдоту — агрэсіўнасць): псіхічнае напружанне, неабходнае для гамавання гэтых памкненняў, знікае, і распружанне адбываецца праз смех. На думку іншых, смех выклікаецца за кошт прыніжэння таго, што высмейваецца, ці выкрыцця пустапарожнасці або механічнасці таго, што здаецца з выгляду важным. Анекдот выклікае смех і таму, што слухач раптам адкрывае для сябе ягоны падтэкст — тэкст, што "схаваны" за тэкстам самой гісторыі. "Дэтанатарам" тут служыць пэўнае слова ці выраз, якія дазваляюць выкрыць гэты падтэкст за тэкстам "вонкавым". Менавіта падтэкст і можа разглядацца як меркаванне, што выказваецца апавядальнікам жарту і падзяляецца тым, хто смяецца. Смех, у сваю чаргу, дазваляе правесці аналіз "вонкавага" тэксту ўжо на другім узроўні, і гэты аналіз часцяком яшчэ больш падкрэслівае меркаванне, выказанае ў тэксце "схаваным".

Так, калі мы вернемся да працытаванага вышэй жарту, то

заўважым, што яго “вонкавы” тэкст палягае ў высвятленні, каго з двух прэзідэнтаў — расійскага ці ўкраінскага — будуць шкадаваць больш. Але тут адразу бачыцца іронія, і мы разумеем, што, калі самалёт разаб’ецца, ніводнага з двух прэзідэнтаў іх народы шкадаваць не будуць. А дэтанатар — “*таму, што іхняга прэзідэнта ў самалёце не было*” — адкрывае падтэкст: беларусы любяць свайго прэзідэнта яшчэ менш, чым першыя два народы — сваіх прэзідэнтаў.

Выказванне грамадскай думкі аб прэзідэнту адбываецца й праз апісанне яго партрэту: памяшчэнне Аляксандра Лукашэнкі ў разнастайныя абставіны дазваляе выявіць пэўныя рысы яго асобы, якія лічацца за найбольш характэрныя[1]. Выява прэзідэнта, якая паўстае з анекдотаў, з’яўляецца пэўным адказам на той імідж, які стварае яму афіцыйная ўлада. З анекдотаў вымалёўваецца і карціна таго, як ставяцца беларусы да свайго прэзідэнта, і партрэт саміх беларусаў.

А. Лукашэнка — уладарны невук-мегаламан

Паклікаў Бог да сябе Клінтана, Ельцына і Лукашэнку і кажа ім: так і так, праз два дні адбудзецца канец свету. І выправіліся тры прэзідэнты назад, каб паведаміць пра пачутае сваім народам.

Выступае перад амерыканцамі Клінтан, кажа: “Маю для вас дзве навіны: адну добрую і адну кепскую. Кепская навіна ў тым, што праз два дні адбудзецца канец свету. А добрая ў тым, што Бог усё-ткі існуе, бо ён сам мне пра гэта паведаміў”.

Выступае перад расійцамі Ельцын, кажа: “Маю для вас дзве навіны: адну добрую і адну кепскую. Кепская навіна ў тым, што за два дні адбудзецца канец свету. А добрая ў тым, што запасаў гарэлкі да таго часу ўсім хопіць удосталь”.

Выступае Лукашэнка: “Дарагія маі ізбірацелі! Маю для вас добрую навіну: я буду вашым прэзідэнтам да канца свету”.

Гэты жарт, пачуты неўзабаве пасля лістападаўскага рэферэндуму 1996 г., кідае святло на тое, як ён сам ставіцца да свайго прэзідэнцтва: ён часта гаворыць пра сябе ў траццяй асобе (“прэзідэнт”) і выстаўляе сябе за адзінага на што-колечек здольнага палітыка ў Беларусі, які, нягледзячы на бяздарнае атачэнне, сам змагаецца супраць змоваў, што нясуць краіне

[2] П’еса была пастаўленая пасля адкрыцця ў Мінску рэстарану “Макдональдз”. Гэтая падзея выклікала такі

пагрозу. Ён уяўляе дэмакратыю як палітычна цэнтралізаваную сістэму, у якой “блізкі” да народу прэзідэнт, што “ведае” народ й “паходзіць”, упаўнаважаны вырашаць усё, бо ядро ведае, што для народу добра, а што не. Месца для якой бы там ні было апазіцыі ў такой сістэме няма.

нажыліся, што міліцыянтаў даводзіцца пастаянна натоўп тэатральнымі прыёмамі.[2]

У парадыйнай форме гэтую канцэпцыю ўлады ілюструе камедыя “Смерць тырана, або МакДональдз зачыняецца”, напісаная групкай менскіх анархістаў. Гэтая п’еса была пастаўленая 1 сакавіка 1997 г. на плошчы Волі, каб адзначыць угодкі забойства эсэрамі цара Аляксандра II ў Санкт-Пецярбургу 1 сакавіка 1881 г. Намёк на “цара Аляксандра” — вельмі празрысты, і ўрачыстая прамова, якую ён трымае перад “беларускім народам”, што сабраўся яго паслухаць, уяўляе сабой пародыю на лукашэнкаўскае разуменне дэмакратыі:

“*Как не выпалніць все пажэланья людзей? Я такіх пажэланій вам спісак саставіл. Чэм вам думаць самім, дык так будзе.*” — *скарэй.*

…Із-за всех эціх труднасцей прошлай весной, із-за ващих валненій? Зачэм валнавацца? Пусць валнуецца цар, у него долг такой. С нім не скора, я думаю, мне расставацца.

…Важна быць заадно, зра не нада галдзець, вы пайміне, цару эта толька мешает. Ведзь за блага людзей он гатоў умерэць да здоровье пака ешчо не пазваляет”.

Навінкі — беларускамоўная сатырычная газета, якая нібыта дэкларуе абсалютную падтрымку прэзідэнту, але робіць гэта ў такой гратэскнай і гіпербалічнай форме, што ўспрымаць іх усур'ез немагчыма.

У той непасрэднай сувязі паміж прэзідэнтам і народам, на якую прэтэндуе А. Лукашэнка, месца для якіх-кольвек прамежкавых уладных структураў проста няма. Гэта праяўляецца і ў рэформах інстытуту ўлады (змяншэнне ролі парламенту, увядзенне “прэзідэнцкай вертыкалі” ў рэгіёнах), і ў некаторых сымбалічных актах: маланкавых рэйдах прэзідэнта па раёнах, дзе “нешта ідзе не так”, разносных заявах на адрас “бязлярных бюракратаў”. Такое стаўленне да прамежкавых эшалонаў улады яўна нагадвае палітыку Сталіна, што не ўнікла ўвагі сатырычнай газеты “Навінкі”[3], якая ў нумары за чэрвень 1999 г. змясціла артыкул пад назваю “Кланіраваць прэзыдэнта”:

“Вынікі апошняй сэлектарнай нарады па аграрных пытаньнях у чарговы раз засьведчылі бесьсьмяротнасьць сталінскай формулёўкі “кадры вырашаюць усё”. […] Кожная клетачка краіны жыве ў напружаным працоўным графіку: своечасова

выходзіць на пасяўныя, галасуе на рэфэрэндумах, кляйміць дэмакратычных вырадкаў”.

Прэтэндуючы на цэнтральную ролю ў краіне, адсланяючы на задні план розныя міністэрствы, А. Лукашэнка можа рабіць гэта, толькі падкрэсліваючы свае кіраўнічыя здольнасці і дасведчанасць ва ўсіх галінах. Менавіта на гэтым факце пабудаваны наступны жарт:

Некалькі журналістаў маюць гонар узяць інтэрвію ў прэзідэнта Лукашэнкі.

“Аляксандр Рыгоравіч, скажыце, вось вы ж спецыяліст у эканоміцы…”

“Ешчо бы, я і ў эканоміке разбіраюсь, і ў банкаўскам дзеле, і ў фінансах…”

“І ў сельскай гаспадарцы!”

“А ў сельскам хазяйстве лучшэ всево! Ты ж знаешь, я лічна вазглавлял бітву за ўражай эцім летам.”

“А скажыце, Аляксандр Рыгоравіч, ці праўда, што вы некалькімі мовамі валодаеце?”

“Ешчо бы! Пяцью!”

“Пяццю? А не маглі б вы пералічыць, якімі?”

“Пажалуста: беларускай уснай, беларускай пісьменнай, рускай уснай, рускай пісьменнай і англійскай.”

“Англійскай! Аляксандр Рыгоравіч, а не маглі б вы сказаць што-небудзь па-ангельску для слухачоў нашага радыё?”

“Да сколька угодна: хэндэ хох!”

“Так, але ж, Аляксандр Рыгоравіч, э-э, але ж… гэта па-нямецку.”

“А, па-нямецку? Ну, значіт, шэсцью.”

Гэты жарт, пачуты ў 1998 г., перадусім паказвае, як А. Лукашэнка паводзіць сябе з журналістамі: ён абыходзіцца з імі за панібрата, кожнаму тыкае, імкнецца ператварыць усіх у рупар сваіх ідэяў і не церпіць пытанняў, у якіх ёсць хоць бы намёк на крытыку. Выкрываны ў жарце факт, што прэзідэнт не валодае ніводнай замежнай мовай, ставіць пад сумненне і ўсе астатнія ягоныя нібыта здольнасці: няма сумнення, што ў эканоміцы ці фінансах ён разумее не больш, чым у нямецкай ці ангельскай мовах. Аднак і выбар замежных моваў “скідае з прэзідэнта маску”, ён не выпадковы. Сама Лукашэнкава манера гаварыць часта з’яўляецца аб’ектам кпінаў: ён гаворыць па-

4 У п’есе “Смерць тырана, або МакДональдз зачыняецца цар гаворыць па-расійску з тыповым беларускім вымаўленнем (*дз*, *ч*, *а* замест *о*, *ы* замест *і* і да т. п.) і заяўляе: “Язык ваш можна выучыць за ноч, хоць гаварат, што опцяжольні. Лож.” Гэта ўжо нават не трасянка, бо тут няма ніводнага беларускага слова.

расійску з моцным беларускім акцэнтам і часам пераходзіць на трасянку[4]. З іншага боку, уменне гаварыць на заходнім дыялекце ёсць зарокам адкрытасці да Захаду: такім чынам тонка намякаецца й на Лукашэнкаву палітыку збліжэння з Еўропай. Прэзідэнт у анекдоце не толькі вызначаецца невялікімі памерамі, амбіцыямі, але й паказаны як чалавек вельмі недалёкі. Аналіз жартаў пра “дурняў” ці “дурныя” нацыянальныя групы праведзены К. Дэвіс[6]. Жарты на гэтую тэму разглядае як праяву пачуцця трывогі ў ўмовах рацыяналізаванага свету, у якім увесь час трэба паказваць дзеяздольнасць і карыснасць, і як спосаб сцвярджэння сваіх здольнасцяў за кошт высмейвання іншых. Кпіны савецкіх кіраўнікоў у такім выпадку могуць разглядацца як спосаб выказаць гэтую занепакоенасць і як усведамленне “савецкай” у кіраўніках, якія “адпавядалі б узроўню” сучаснай рацыяналізаванай сістэмы грамадства. Аналіз жартаў савецкіх кіраўнікоў, праведзены згаданаю аўтаркай, можа быць перанесены й на А. Лукашэнку, і той факт, што беларускі прэзідэнт не гаворыць ні на воднай замежнай мове, можа інтэрпрэтавацца як занепакоенасць апавядальніка будучыню краіны.

Анекдот паказвае, што ў адрозненне ад вобразу, які Лукашэнка спрабуе стварыць пра сябе ў прамовах і шматлікіх тэлевізійных выступленнях, анекдоты малююць цалкам адвароткі, перагорнутую карціну. Калі А. Лукашэнка напірае на сваю блізкасць да народу і сваё народнае паходжанне, дык анекдоты гэтую блізкасць як нешта станоўчае, дык анекдоты ствараючы яўна адмоўны партрэт селяніна-невука, ствараючы яўна адмоўны партрэт

60-ыя гады. “Вы слухаеце канцэрт па заяўках “Жадаю Вам”. Юны піянер Саша просіць уключыць у нашу праграму яго ўлюбёную песню “Валенкі”. Што ж, дарагі Саша, калі ласка, слухай сваю ўлюбёную песню.

70-ыя гады. “Вы слухаеце канцэрт па заяўках “Жадаю Вам”. Намеснік камандзіра Н-скай заставы па палітчастцы Аляксандр Лукашэнка просіць уключыць у нашу праграму яго ўлюбёную песню “Валенкі”. Што ж, дарагі Аляксандр, калі ласка, слухайце сваю ўлюбёную песню.

80-ыя гады. “Вы слухаеце канцэрт па заяўках “Жадаю Вам”. Дырэктар саўгасу “Гарадзец” Аляксандр Рыгоравіч просіць, каб

[5] Выраз “Хто не хоча ведаць мову ўсіх тонка намякаецца й на Лукашэнкаву палітыку збліжэння з Еўропай. Прэзідэнт у анекдоце не толькі вызначаецца невялікімі памерамі, амбіцыямі, але й паказаны як чалавек вельмі недалёкі. Аналіз жартаў пра “дурняў” ці “дурныя” нацыянальныя групы праведзены К. Дэвіс[6]. Жарты на гэтую тэму разглядае як праяву пачуцця трывогі ў ўмовах рацыяналізаванага свету, у якім увесь час трэба паказваць дзеяздольнасць і карыснасць, і як спосаб сцвярджэння сваіх здольнасцяў за кошт высмейвання іншых. Кпіны савецкіх кіраўнікоў у такім выпадку могуць разглядацца як спосаб выказаць гэтую занепакоенасць і як усведамленне “савецкай” у кіраўніках, якія “адпавядалі б узроўню” сучаснай рацыяналізаванай сістэмы грамадства. Аналіз жартаў савецкіх кіраўнікоў, праведзены згаданаю аўтаркай, можа быць перанесены й на А. Лукашэнку, і той факт, што беларускі прэзідэнт не гаворыць ні на воднай замежнай мове, можа інтэрпрэтавацца як занепакоенасць апавядальніка будучыню краіны.

Анекдот паказвае, што ў адрозненне ад вобразу, які Лукашэнка спрабуе стварыць пра сябе ў прамовах і шматлікіх тэлевізійных выступленнях, анекдоты малююць цалкам адвароткі, перагорнутую карціну. Калі А. Лукашэнка напірае на сваю блізкасць да народу і сваё народнае паходжанне, дык анекдоты гэтую блізкасць як нешта станоўчае, дык анекдоты ствараючы яўна адмоўны партрэт селяніна-невука, ствараючы яўна адмоўны партрэт

60-ыя гады. “Вы слухаеце канцэрт па заяўках “Жадаю Вам”. Юны піянер Саша просіць уключыць у нашу праграму яго ўлюбёную песню “Валенкі”. Што ж, дарагі Саша, калі ласка, слухай сваю ўлюбёную песню.

70-ыя гады. “Вы слухаеце канцэрт па заяўках “Жадаю Вам”. Намеснік камандзіра Н-скай заставы па палітчастцы Аляксандр Лукашэнка просіць уключыць у нашу праграму яго ўлюбёную песню “Валенкі”. Што ж, дарагі Аляксандр, калі ласка, слухайце сваю ўлюбёную песню.

80-ыя гады. “Вы слухаеце канцэрт па заяўках “Жадаю Вам”. Дырэктар саўгасу “Гарадзец” Аляксандр Рыгоравіч просіць, каб

[6] Davies, Christie. **Stupidity and Rationality: Jokes from the Iron Cage // Powell, C., Patton, G. E. *Humor in Society: Resistance and Control, Op. cit.***

для яго прагучала яго ўлюбёная песня “Валенкі”. Што ж, дарагі Аляксандр Рыгоравіч, калі ласка, слухайце сваю ўлюбёную песню.
90-ыя гады. “Вы слухаеце канцэрт па заяўках “Жадаю Вам”. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусі Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка просіць, каб для яго прагучала песня Beatles *“Yesterday”. Дарагі Аляксандр Рыгоравіч, з задавальненнем уключаем для вас запіс Вашай улюбёнай песні “Валенкі”.*

Храналагічныя этапы ў гэтым жарце, які, пачынаючы з 1997 г., мне даводзілася чуць шмат разоў, не абавязкова супадаюць з рэальнай біяграфіяй А. Лукашэнкі, але ў ім падкрэсліваюцца два факты: Лукашэнкава прывязанасць да савецкага мінулага (“піянер”, “намеснік камандзіра па палітчастцы”, а таксама назва песні — *“Yesterday”*) і ягоная прыналежнасць да сялянскага асяроддзя. Ён быў дырэктарам саўгасу, а яго ўлюбёная песня — народная...

Можна сказаць, што анекдоты — гэта “фальклёр інтэлігенцыі”. І сапраўды з анекдотаў паўстае даволі пагардлівае стаўленне сялянства. Зрэшты, згаданы вышэй жарт пераправакацыя, мяркуючы па ўсім, з анекдоту савецкіх часоў, у якім Іван Пархомавіч просіць у Разанскага радыё (а Рэвенькіі — “расійскай глыбінкі”), каб для яго прагучала “Барыня”. Але яго адразу абсякаюць:

— Няма чаго выдурвацца. Слухай свае “Валенкі”!

Гэтаму вобразу “А. Лукашэнкі — невука, хворага на комплекс велічы, селяніна і тыповага саўка” — нібыта супрацьпастаўлены вобраз “А. Лукашэнкі — новага рускага”. Сёння анекдоты пра новых рускіх распавядаюць у Расіі і іншых краінах СНД, тэрмін[7], часцей за іншыя. Новы рускі — гэта нуварыш, ты*пова*я характарызуецца сваім глупствам, безгустоўнасцю, нявым пінжаком, мабільнікам і абмежаванасцю лексічнага запасу, які збольшага зводзіцца да турэмнага арго. Большасць анекдотаў паказваюць яго як чалавека, надзеленага сапраўдным Новыя рускія часта фігуруюць у анекдотах разам з прадстаўнікамі палітычнай улады ці міліцыянтам, якім удаецца падкупіць[8]. Найлепшай ілюстрацыяй іх адносін служыць жарт, у якім новы рускі выступае побач традыцыйным персанажам расійскіх казак *залатая рыбка*, што

**[7] Новы рускі — не толькі нацыянальнасць, а сацыяльная група, прыналежнасць да якой (як і наяўнасць пэўнага жарт (які паралельна з анекдотамі пра новых рускіх, існуюць і анекдоты пра нашых рускіх, тэрмін). Тут і ты *(грузін?”* *“Так, сыну, грузін.” “А дачка? грузінка?” — “Так, сыну, грузінка.” “А я — пайсаба*

здольная выканаць жаданні ўсякага, хто яе злавіў.

Выправіўся новы рускі на рыбалку. І злавіў ён залатую рыбку. Зняў ён яе з зазубня, узяў двума пальцамі дый кажа: “Ну што, залатая рыбка, кажы, што табе трэба”.

Ніжэй змешчаны жарт, пачуты ўвосень 1998 г., які прыраўноўвае да новага рускага А. Лукашэнку:

Маладзенькі даішнік стаіць на ўзбочыне і пільнуе якую-небудзь машыну, каб здзерці штраф. Вечарэе, мароз, снег ідзе. Раптам бачыць: на поўнай хуткасці ляціць навюткі “мэрс”. Ён адразу хапаецца за жазло. “Мэрсэдэс” спыняецца, і з яго выходзіць чароўная дзяўчына, голая, у адным толькі шыкоўным футры.

Малады міліцыянт кажа: “Вашыя дакументы, тэхнашпарт”. Дзяўчына падае яму паперы — там усё ў парадку. “А адкуль у вас такая машына?” — “Дайце, я патэлефаную?” Набірае нумар па сотавым: “Алё, Саша? Саша, скажы, адкуль у нас гэтая машына? Нам падарылі?.. Нам падарылі”, — адказвае яна міліцыянту. Той неахвотна яе адпускае.

Назаўтра той самы міліцыянт зноў пільнуе на ўзбочыне. Халодна… І раптам ён зноў бачыць, як да яго на вялікай хуткасці ляціць навюткая “Таёта”. Ён яе спыняе. З машыны выходзіць тая самая дзяўчына, што ўчора, на ёй зноў амаль нічога няма, апроч ужо іншага вельмі дарагога футра. Паўтараецца ўчорашняя сцэна. З паперамі ўсё ў парадку, дзяўчына тэлефануе Сашу, пытаецца, адкуль машына, і зноў адказвае: “Нам яе падарылі”. Міліцыянт зноў ня хоча, але мусіць яе адпусціць.

На трэці дзень той самы міліцыянт ізноў пільнуе на ўзбочыне. Ляціць навюткая “Альфа-Рамэо”. З яе выходзіць тая самая чароўная дзяўчына. Яна зноў вымае свой сотавы: “Алё, Саша…” Міліцыянт не вытрымлівае, выдзірае ў яе з рук тэлефон і крычыць: “Саша, ты вось мне скажы, як гэта ў цябе выходзіць…” І тут голас на другім канцы дрота яго абсякае: “Для каво Саша, а для каво — Александр Грыгор'эевіч!”

“Аляксандр Рыгоравіч” атаясамліваецца з А. Лукашэнкам з такой самаю пэўнасцю, як і ягонае прозвішча. У згаданым жарце імя і імя па бацьку служаць “дэтанатарам” і дазваляюць нанава перачытаць яго змест ужо не як эпізод узаемадачыненняў новых рускіх з міліцыяй, а як вызначэнне

грузін?” — “І ты грузін, сынку.” — “І мой брат Гогі — грузін?” — “Не, сынку, твой брат — новы рускі”.

Гэта паказана у наступным жарце:

На даразе ляціць “Мэрсэдэс”. Даішнік яго спыняе, машына тармозіць, але з яе ніхто не выходзіць. Афіцэр чакае. Па-ранейшаму — нікога. Тады ён падыходзіць да “Мэрсу”, а новы рускі крычыць яму з акна: “Ну, я не паняў, каму тут патрэбныя грошы?”

ладу жыцця А. Лукашэнкі.
І ў гэтым выпадку анекдот працуе як перагорнуты люстраны адбітак: у сваіх прамовах А. Лукашэнка выстаўляе сябе за чалавека простага і сціплага. А жарт робіць з яго нуварыша. Адначасова ў ім адчуваецца намёк на зробленыя яму падарункі (Ельцын, напрыклад, падараваў яму верталёт), а таксама на тыя велізарныя сумы грошай, якімі ён завалодаў пасля свайго прыходу да ўлады, узяўшы пад кантроль значную частку дзяржаўных рэсурсаў. Але і тут галоўнае значэнне мае не так рэальнасць яго багацця, як народнае ўяўленне аб тым, што палітыкі “думаюць перадусім, як набіць уласныя кішэні”, што й схіляе часам выбаршчыкаў галасаваць за тых, хто ўжо стаіць пры ўладзе, бо “гэтыя, прынамсі, ужо накраліся”. Трэба адзначыць, што прэзідэнт у згаданым анекдоце па-сапраўднаму на сцэне не з’яўляецца, ён толькі згадваецца. Можа быць, гэта тлумачыцца тым, што яго вонкавы выгляд і вобраз, які ён стварае, надта далёкія ад выгляду і вобразу новых рускіх, каб яго можна было ўявіць у такой ролі. Аднак параўнанне дазваляе выкрыць яго багацце і галоўнае — паказаць тую вялікую ўладу, якую ён мае ў сваіх руках.
Сексуальная прыгажуня ў жарце — ніхто іншы, як прэзідэнтава каханка, бо “ўсе ж ведаюць”, што жонка Лукашэнкі засталася жыць у вёсцы са сваёй кароваю Мілкай. Распаўсюджаныя ў Беларусі чуткі пра дачыненні прэзідэнта з жанчынамі пакідаюць дваістае ўражанне. Кажуць, што пасля ўжо таго, як ён стаў прэзідэнтам, яго жонка нібыта забараніла яму пераступаць парог свайго дому і “паслала яго” (інфармацыя, паведамленая быццам бы адным з Лукашэнкавых целаахоўнікаў). Гэтаму вобразу ўсёмагутнага палітыка, але ні на што не здольнага мужа, слабейшага за ўласную жонку, процістаяць шматлікія чуткі пра яго перамогі над жанчынамі, у якіх ён прадстае “сексуальным гігантам”. Шмат хто забаўляецца тым, што збірае яго выслоўі з сексуальным ухілам. Аднойчы А. Лукашэнка заявіў (гаворачы пра сябе ў трэцяй асобе): “Прэзідзент не п’ёт, прэзідзент в рот не берот”. Іншы раз ён заявіў, што будзе ператрахіваць увесь Савет Міністраў. Цалкам верагодна — гэтак, прынамсі, мяркуюць некаторыя, — што гэтыя “перлы” ён выдае знарок: яны ўмацоўваюць яго пануючае сексуальнае становішча, сцвярджаючы, няхай і ў грубай, але недвухсэнсоўнай форме, тую ўладу, якой ён

валодае. Так, у час сваіх сутычак з парламентам у 1996 г. ён нібыта аднойчы выдаў: “Я ў парламент не пайду, там адні петухі”. Слова “пятух ” з’яўляецца ў лагерным і турэмным арго моцнай абразай, азначаючы пасіўнага гомасексуаліста. Такім чынам, тут зноў-такі ўладнае палітычнае становішча сцвярджаецца праз намёк на панаванне ў сексе.

Стаўленне да прэзідэнта: непрыманне, страх і ліслівасць

Сексуальныя намёкі сустракаюцца і ў жартах, дзе гаворка вядзецца пра дачыненні прэзідэнта з яго атачэннем і ў ўрокуле з беларусамі. Вось адзін такі жарт, пачуты ў студзені 2000 г.:

Прэзідэнт Лукашэнка на аглядзе ў медкамісіі. Пасля агляду ў лекараў разгублены выгляд, яны чухаюць патыліцы, пераглядаюцца… Лукашэнка не вытрымлівае:
“Ну давайце уж, гаварыце праўду, што у меня?”
“Разумееце, Аляксандр Рыгоравіч, у вас… у вас няма анальнай адтуліны.”
“Вот блін, залізалі, гады!
Думка пра тое, што ў лукашэнкавым асяроддзі — адны “задалізы”, падаецца тут у літаральным сэнсе; і ў гэтым можна бачыць асучаснены варыянт некаторых жартаў савецкага часу, дзе гаворка вядзецца, у прыватнасці, пра Брэжнева:

Брэжнеў ляжыць на пляжы дому адпачынку Палітбюро, накрыўшы твар панамай. Раптам падбягае сабака, абнюхвае яго і пачынае лізаць яму яйцы. Брэжнеў, не зварухнуўшыся, ленавата пратэстуе: “Ну, таварышы, я вас прашу, гэта ўжо занадта!
Ці яшчэ:

Таварыш Жыўкаў неўзабаве мае перанесці цяжкую хірургічную аперацыю: аддзяленне свайго языка ад задніцы Брэжнева.
Часта ліслівасці спадарожнічае страх, і калі вышэй згаданыя жарты ўзыходзяць да часоў Брэжнева, дык тыя, у якіх згадваецца страх, з’яўляюцца асучасненым варыянтам анекдотаў сталінскага перыяду.

Амерыканец, новы рускі і беларус спрачаюцца: што такое шчасце.
Амерыканец кажа: “Шчасце — гэта калі ты купляеш білет на самалёт, ляціш да мора, здымаеш вялікі нумар у 5-зоркавым

9 ліслівасць падобны жарт і пра трох расійцаў, у якім шчасце — гэта *калі ў твае дзверы звоніць граміла з аўтаматам, што прыйшоў парахавацца, але высвятляецца, што яму патрэбен твой сусед зверху.*

гатэлі і табе прыносяць бутэльку шампанскага. Вось гэта шчасце”.
Новы рускі не пагаджаецца: “Не. Шчасце — гэта калі ты вырашаеш паляцець да мора, купляеш самалёт, прылятаеш, купляеш 5-зоркавы гатэль і скрыню шампанскага. Вось гэта шчасце”.
“Нічагусенькі вы не разумееце, — кажа беларус. — Шчасце — гэта калі ты на сваім лецішчы абганяеш у агародзе бульбу і бачыш, як пад’язджае варанок. З яго выходзяць трое ў плашчах і пытаюцца ў цябе: “Гэта Садовая, 8?” — А ты ім адказваеш: “Не, гэта Садовая, 7”. Вось гэта — шчасце.”
У даўнейшым варыянце гэтага анекдоту падобная гісторыя адбываецца ў часы вялікага тэрору ў канцы 1930-х. Людзі тады бялелі, пачуўшы на лесвіцы чужую хаду, бо гэта маглі ісці па іх. Яны баяліся быць наступнымі ў спісе арыштаваных. І шчасцем было, калі чалавек, якога шукалі, аказвалася, жыў паверхам вышэй[9].
Урэшце, ёсць жарты, якія проста сведчаць пра поўнае непрыманне прэзідэнта. Гэта ілюструе і першы з цытаваных анекдотаў пра двух прэзідэнтаў, што ляцяць у самалёце. Гэта паказвае і наступны жарт:

Гарбачоў, Рэйган і Лукашэнка апынаюцца на тым свеце і спадзяюцца патрапіць у рай. І каб высветліць, якія ў іх шанцы патрапіць у кампанію абраных, яны пытаюцца ў Хрыста, у чым іхняе шчасце.
“Госпадзе, скажы, у чым маё шчасце?” — пытаецца Гарбачоў.
“Тваё шчасце ў тым, — адказвае Хрыстос, — што, хоць ты й нарабіў памылак, але ж ты хацеў дабра і стараўся даць людзям большую свабоду”.
Тады Рэйган задае такое самае пытанне.
“Тваё шчасце ў тым, — адказвае Хрыстос, — што хоць ты й зрабіў шмат кепскага, калі хацеў павялічыць узбраенні, але ж ты не распачаў вайны”.
Нарэшце задаць пытанне настае чарга ў Лукашэнкі.
І Хрыстос адказвае яму: “А тваё шчасце, што ў мяне рукі да крыжа прыбітыя!”
Калі ўжо Лукашэнка нарабіў столькі глупства, што цярпенне скончылася нават у Хрыста, які, дараваўшы грахі прынамсі двум іншым прэзідэнтам, у гэтым выпадку больш не

вытрымлівае, дык ясна, што беларусаў ён увогуле давёў да шаленства, хоць у жартах пра саміх сябе яны якраз падкрэсліваюць сваю лагоднасць і вялікую цярплівасць.

Беларусы пра сябе

У жартах фігуруюць не толькі кіраўнікі, але й народ, якім яны кіруюць. Распавядаюць такія жарты і беларусы, пакепліваючы ў іх з сябе і свайго “нацыянальнага характару”.

Расіец, беларус і ўкраінец едуць у цягніку. З адной лавы ў вагоне тырчыць цвік. Расіец сядае на яго, адразу ўскоквае, страшна мацюкаецца, выдзірае цвік і, гэтак сама мацюкаючыся, выкідае яго ў акно.

Украінец, сеўшы на цвік, устае, акуратна дастае цвік з лавы і кладзе яго ў кішэню: “Яшчэ прыдасца”.

Беларус сядае на цвік, крыху ўздрыгвае і застаецца сядзець: “Ну што, а мо яно так і трэба”.

Як мы бачым, расіец паказаны ў гэтым жарце як чалавек вельмі эмацыйны, гатовы выбухнуць пры найменшай нагодзе, калі нешта не так, украінец — наадварот, як ашчадны і запаслівы, нават скнарлівы; што да беларуса, дык гэты здольны сцярпець усё. Лагоднасць і цярплівасць вельмі часта вызначаюцца як характэрныя рысы беларусаў. Гэты вобраз, што паўстае з анекдоту, супадае з тым, які імкнуцца стварыць свайму народу кіруючыя ўлады: ва ўсіх прамовах, што гучалі падчас першага святкавання Дня Рэспублікі 3 ліпеня 1997 г., беларускі народ характарызаваўся як “працавіты” і “цярплівы”. Уладамі гэтыя рысы ацэньваюцца як пазітыўныя. На думку ж беларускіх апазіцыянераў, “памяркоўнасць” беларусаў — гэта праблема грамадства. Прынамсі, думка, што праводзіцца ў анекдотах,— ясная, паколькі гаворка тут вядзецца пра самавысмейванне. Народ смяецца з тых рысаў характару, якія прыпісвае сабе сам або пагаджаецца, калі яму іх прыпісваюць іншыя, але цяжка сказаць, наколькі гэтыя рысы сапраўды ўспрымаюцца ўсур’ёз і ці ацэньваюцца яны як адмоўныя ці як станоўчыя.

Чэрвень, 1941 г. Нямецкія войскі акупуюць савецкую Беларусь, чырвоная армія адступае. Каб задушыць усякія спробы супраціву, фашыстоўцы вешаюць у невялічкай вёсцы некалькі чалавек на

навуку іншым.
Чэрвень 1944 г. Памацнелая савецкая армія вызваляе тэрыторыю савецкай Беларусі. Дабраўшыся да маленькай вёскі, вайскоўцы здымаюць целы шыбенікаў, якія ўсё яшчэ вісяць. Першы ж зняты беларус крыху пракашліваецца і сцягвае з шыі вяроўку.
“Як жа ты вытрымаў?” — здзіўляюцца вайскоўцы.
“Ну, як — спярша муляла, а пасля прывык,” — адказвае беларус.
Безумоўна, вобраз Беларусі, што паўстае з жартаў, апавяданых беларусамі, — гэта вобраз крытычны: з аднаго боку — пасіўны народ, здольны ўсё сцярпець, з другога — аўтарытарны прэзідэнт-невук, хворы на манію велічы. Беларусы, што распавядаюць гэтыя анекдоты, разумеюць, як працуе сістэма прэзідэнцкай улады і малююць у сваіх жартах яе перагорнутую выяву. Яны кпяць з уласных “рысаў нацыянальнага характару”. Але ці можна з гэтага напраўду зрабіць выснову, што гэтыя жарты ва ўмовах сучаснай беларускай дыктатуры маюць пэўны падрыўны патэнцыял?
Яны, бясспрэчна, з’яўляюцца праявай крытычнага мыслення і адначасова сведчаць пра тое, што такое мысленне шмат каму ўласцівае. Тыя, хто чуе гэтыя жарты і з іх смяецца, гэтаксама разумеюць іхні “падтэкст”, што хаваецца за “вонкавым” тэкстам. Смех аб’ядноўвае, у той час як любы аўтарытарны рэжым імкнецца, наадварот, раз’яднаць людзей, каб яны адзінцом не маглі супрацьстаяць уладзе. З іншага боку, анекдот — гэта не выбудаваны палітычны дыскурс. Ён выказвае думку, меркаванне, але яно не аргументаванае. Часцяком змагацца з тым, што высмейваецца, ужо цяжка, бо смех — гэта ж і своеасаблівы “клапан для выпуску па́ры”, які дазваляе трываць цяжкасці, не змяняючы ўмоваў жыцця, пра што сведчыць і наступны жарт:

“Тата, а чаму ў Беларусі ўвесь час такая хлюпота? Чаму тут увесь час так халодна і ўвесь час лье дождж?” — “Ну, разумееш, сынку, усё гэта тлумачыцца складанымі атмасфернымі працэсамі, зменамі ў паветраных масах, непрадказальнымі ваганнямі тэмпературы. Карацей, сынку, якая краіна — такі й клімат!”

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 4 (18) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя:
analityka@yahoo.com
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: **06-10-2001**
[image]

Ален Бэзансон

Ці належыць Расія да Эўропы? Палеміка з Марціном Малем

АЛЕН БЭЗАНСОН французскі палітоляг, гісторык і філёзаф. Прафэсар, дырэктар Вышэйшай Школы Грамадзкіх Навук у Парыжы. Спэцыяліст у гісторыі Расіі XIX ст. і камуністычнай сыстэмы. Эсэ **„Ці належыць Расія да Эўропы"** перакладзенае зь нязначным скаротам.

Гэтую вялікую кнігу[1] мы чакалі ўжо так даўно, што амаль перасталі верыць у яе зьяўленьне. Ідэя напісаць яе прыйшла да Марціна Малі яшчэ ў 1962 годзе, пасьля чаго ён нават стварыў першую вэрсію кнігі. Гадоў 25 выдаўцы абяцалі будучым рэцэнзэнтам: "Рыхтуйцеся, за пару дзён кніга зьявіцца", — і тыя мачалі пёры ў атрамант. І ўвесь гэты час пра кнігу ні чуткі. Разам з параю шчасьліўцаў у гадох гэтак у семдзясятых я прысутнічаў на лекцыях Малі ў Калеж дэ Франс і *École des Hautes Études*. Ён прыходзіў з аркушыкам канспэкту — ну во хіба такога памеру, як візытоўка, і прамаўляў дзьве гадзіны безь пярэдыху. Надзвычайнае інтэлектуальнае відовішча! Калі хтосьці тчэ перад намі нітку гістарычных разваг аў, нармальная рэакцыя — пошук такога аргумэнту, які супярэчыў бы тэорыі й абвяргаў яе. У выпадку з Малем знайсьці такі аргумэнт не

1. **Martin Malia.** ***Russia under Western Eyes. From the Bronze***

ўдавалася, бо яго інтэлектуальныя канструкцыі былі такія закончаныя, тэорыя настолькі дасканалая й салідная, што любы аргумэнт супраць яе ня толькі знаходзіў у ёй месца, але й падмацоўваў саліднасьць усяе пабудовы.
Чаму, аднак, Маля так доўга длякаў з публікацыяй сваёй кнігі? Ці не шкада, што кніга не зьявілася тады, даўно ўжо, дзякуючы таму, што ён меў шмат часу на абмеркаваньне сваіх ідэяў падчас заняткаў з студэнтамі й на іх дапрацоўку разам з калегамі, кніга Малі сталася прадуктам канчатковых дыстыляцыі, плёнам усяго жыцьця гісторыка. Урэшце, яе яшчэ палепшыла тое, што аўтар меў шчасьце ўбачыць заканчэньне гісторыі й найзвычайнейшае завяршэньне аповесьці, то бок канец камунізму, ці, іначай кажучы, — вяртаньне Расіі ў агульную гісторыю чалавецтва.
Дазволю сабе пэўны водступ ад тэмы. Не бракуе дасьледчыкаў, якія хваляцца, што “прадбачылі крах камунізму”. Быў сярод іх адзін выдатны чалавек, палкоўнік, які цягам дваццацёх гадоў рэгулярна казаў, што заняпад гэты наступіць ужо пад канец бягучага году. Урэшце ягонае прадказаньне споўнілася, аднак, наколькі я ведаю, ніводзін сур’ёзны гісторык не спрабаваў браць зь яго прыклад; з факту, што пэўныя рэчы не павінны былі б існаваць, не вынікае, што гэтыя самыя рэчы не праіснуюць яшчэ бясконца доўга. Камуністычны рэжым — гэта ўтопія, якая адшуквала ўнутраныя рэзэрвы для бясконца доўгага існаваньня.

Рэчаіснасьці цяжка абвергнуць нерэчаіснасьць, таксама як лёгіцы няпроста зразумець абсурд. Тыя, хто сачыў за СССР, ясна бачылі, што там усё гніе, але працэс гніцьця можа ісьці вельмі марудна. Усё магло гнісьці яшчэ даўжэй і прагнісьці яшчэ больш. Гэтая заўвага таксама датычыць апошняга чыста камуністычнага рэжыму, то бок Паўночнай Карэі. Я гатовы пабіцца аб заклад, што рэжым гэты будзе зрынуты. Не скажу калі, бо акалічнасьці, якія падтрымліваюць яго на плаву, здольныя пратрымацца яшчэ доўга, і ніводзін сур’ёзны гісторык ня ў стане акрэсьліць, якія зь іх і як хутка зьнікнуць.
Камуністычны рэжым мог і мусіў упасьці й пасьля сьмерці Леніна, і пасьля гітлераўскага нападу, і пасьля сьмерці Сталіна. Ён мог бы — з блаславеньня Захаду — праіснаваць яшчэ шмат гадоў пасьля сьмерці Брэжнева. Аднак так ня здарылася, і

Horseman to the Lenin Mausoleum. **Cambridge—London: Belknap Press of Harvard University Press, 1999.**

гісторыкі могуць сказаць, чаму. Аднак, сказаць гэта яны могуць толькі *post factum*, іначай яны перастануць быць гісторыкамі. Абставіны склаліся так, што Марцін Маля змог давесьці сваё гістарычнае апавяданьне ажно да даты, надзвычай значнай як для Расіі, так і для сьвету: да 1991 году. Ён змог таксама надаць гэтаму апавяданьню клясычную форму: *decline and fall*. Яму пашанцавала: гісторыя пацьвердзіла самаразбуральную лёгіку камуністычнага рэжыму.

Аднак у задуме кнігі камуністычны эпізод не займае цэнтральнага месца. Наадварот, у шматвекавой гісторыі Расіі ён акрэсьлены як асобны выпадак, які падлягае тлумачэньню. Галоўны матыў кнігі Малі — гэта крытычны агляд розных канцэпцыяў, паглядаў і праекцыяў заходняга чалавека на краіну, якая зрабіла крок у гісторыю адно ў XVIII стагодзьдзі. На расійскую гістарычную рэчаіснасьць мы паглядаем звонку. Але, паколькі вышэйзгаданыя канцэпцыі зьвязаныя з гісторыяй Заходняй Эўропы (яны там паўсталі), крытычны аналіз Малі датычыць ня толькі гісторыі Расіі, але й усяго заходняга сьвету. Амбіцыі аўтара шырэюць, як рака, якую шматлікія прытокі робяць усё больш паўнаводнай. Нешматслоўны на пачатку кнігі гісторык пераходзіць пасьля да развагаў над сучаснай гісторыяй усяго сьвету. Дакладна такім чынам разьвівалася й інтэлектуальная кар'ера Малі. Ён пачаў як спэцыяліст у вузкай галіне, але потым, перастаўшы быць толькі выкладчыкам, зьвярнуўся да *сусьветнай* гісторыі. Марцін Маля адважыўся пайсьці сваім шляхам і падараваў нам адну з самых незвычайных кніг, якія толькі былі напісаныя. Прыкладам для яго (хоць ён гэтага нідзе ня піша) стаўся Таквіль. Маля знайшоў той самы спакойны тон, чысты й немудрагелісты стыль, дабіўся выключнай яснасьці высноваў. Ён дасягнуў таксама такой насычанасьці тэксту, што кожную старонку ягонай кнігі чытаеш паволі: кожная старонка ўяўляе сабой выклік розуму чытача й прымушае разважаць.

Разгорнем жа кнігу й прасочым яе аргумэнты.

Асноўны тэзыс гучыць так: не існуе нічога, што можна назваць існасьцю Расіі, альбо, як кажуць, "Вечнай Русьсю". Нельга гаварыць таксама пра канчальны й анталягічны саюз Расіі з Захадам альбо Расіі з Эўропай. Цягам трох стагодзьдзяў Расія шмат разоў зьмяняла сваё аблічча. Не існуе таксама стабільнай цэласьці, якая была б Эўропаю альбо Захадам. Захад таксама

мае шмат вымераў, ягоны пагляд на Расію неаднародны. Адзін і той самы край — Расія — у адну й тую самую хвіліну выклікае розныя рэакцыі ў Англіі, Нямеччыне альбо Польшчы. Дзякуючы гэтаму тэзысу магчымая глябальная ацэнка камуністычнага эпізоду. Ці варта яго інтэрпрэтаваць як чарговае ўвасабленьне “Вечнай Расіі”, ці — як прапануе Маля — як выпадак, які выбіў Расію зь сядла й пагнаў яе на нядобры шлях? Зразумела, што тут Маля палемізуе са сваім адвечным інтэлектуальным працiўнікам, таксама вядомым знаўцам гісторыі Расіі, Рычардам Пайпсам, які, на думку Малі, падкрэсьліваючы значэньне нацыянальна-гістарычнай пераемнасьці, недаацэньвае дэструкцыйную ролю камуністычнай ідэалёгіі.
Да пытаньня гісторыі Расіі трэба падысьці гістарычна, то бок згодна з храналёгіяй. Падзел на чатыры вялікія пэрыяды спрэчак не выклікае: ад Пятра Вялікага да Венскага кангрэсу; ад 1815 году да вялікіх рэформаў Аляксандра II; ад 1856 году да кастрычніцкага путчу; ад 1917 году да заняпаду камунізму ў 1991 годзе. Шматаблічнай Эўропе Расія кожнага разу паказвала іншы твар.

Гром над Палтавай

Гром над Палтавай абвесьціў, што Расія зьявілася на эўрапейскай сцэне. Падкрэсьлім, што прыблізна ў гэты час у Эўропе паўсюль пачынаецца выцясьненьне панятку хрысьціянства, які выходзіць з ужытку й зьнікае з трактатаў. Пасьля няўдалай спробы ўсталяваньня французскай гегемоніі паўстае новая міжнародная структура — сучасны ансамбль эўрапейскіх народаў, які праіснуе аж да першай сусьветнай вайны. У гэты час Расія — на роўных з Францыяй, Англіяй альбо Аўстрыяй — робіцца адным з бацькоў-заснавальнікаў новага парадку, прычым займае ў ім месца больш значнае, чым Гішпанія ці Галяндыя. Чаму гэты край, які цешыўся ліхой славаю й быў дасьледаваны горш за Асманскую імпэрыю, край, пра поўнае барбарства якога апавядалі глыбока ўражаныя падарожнікі XVII стагодзьдзя, — чаму гэты край так хутка быў прызнаны эўрапейскімі супэрдзяржавамі? Па-першае, таму, што прынамсі тры з гэтых супэрдзяржаваў ня бачылі ніякай пагрозы ва ўзмацненьні Расіі, дзякуючы якому самі маглі з чыстым

сумленьнем ажыцьцяўляць анэксіі. Калі Расія “сама разьбіралася са сваімі праблемамі”, дык і Прусія, Аўстрыя й Англія таксама лічылі сябе ў праве вырашаць свае задачы. Прайграла толькі Францыя, якой заставалася адно сачыць за аслабленьнем яе традыцыйных хаўрусьніц — Польшчы й Швэцыі.

Па-другое, Расія пачала з запалам будаваць блізкі цывілізаванай Эўропе *ancien régime*. Расія Івана Жахлівага была вайсковай аўтакратыяй з выразна татарскім абліччам, у якой манарху падпарадкоўвалася ўсё грамадзтва. Пётра Вялікі зацугляў грамадзтва яшчэ мацней і эфэктыўней, толькі зрабіў гэта ўжо на эўрапейскі капыл. Каб утрымліваць дзьвюхсоттысячнае рэгулярнае войска (большае за французскае), ён мусіў рацыянальным чынам упарадкаваць бюракратыю й гаспадарку. Ён таксама мусіў узмацніць прыгон. Гэтая сыстэма ня мела аналягаў у Эўропе, але гэтая сыстэма нагадвала Эўропе вядомыя ёй прататыпы. Швэцыя ды Прусія дзейнічалі падобным чынам, толькі слабіню патэнцыялу кампэнсавалі мабілізацыяй усіх даступных сродкаў. Суворасьць расійскага *ancien régime* тлумачыцца папросту *спазьненьнем у разьвіцьці*. У гэтым месцы Маля ўводзіць аснову свайго паняткавага інструмэнтару, а менавіта паняцце *градыенту* — крывой, якая паступова апускаецца з захаду на ўсход. Найвышэйшую (“найсучасьнейшую”) ступень займаюць Англія й Францыя, на ступень ніжэй стаяць германскія краіны, пасьля ідуць Польшча й Вугоршчына, нарэшце, апошнюю ступень на гэтай крывой займае Расія. Гэтыя “сходы” — эўрапейскія, і Расія з сваёй прыступкі рушыць за эўрапейскім прыкладам, які, бясспрэчна, адрозьніваецца ад турэцкай, пэрсідзкай ці кітайскай мадэлі. Паколькі Кацярына здолела прышчапіць 100 тысячам сем’яў звычаі і манеры эўрапейскай арыстакратыі і адзець іх у эўрапейскія строі, а Эўропа кантактавала выключна з гэтымі людзьмі (дыпляматамі й афіцэрамі), дык старая расійская арыстакратыя стала разглядацца як тыповая праява *ancien régime*.

Аднак жа частка Эўропы — асьвечанай Эўропы — пайшла далей: маўляў, Расія ня толькі “падобная” да нас, але й нашмат “лепшая” за нас. Гэткія думкі можна знайсьці ў “Гісторыі Карла VII”, дзе Вальтэр параўноўвае пыхлівага й марнатраўнага заваёўніка з заканадаўцам, які накладае на грамадзтва

намызнік “паліцыі”, каб загнаць яго ў “цывілізацыю”. Кацярына ўмацоўвае Акадэмію й Універсытэт, наймаючы на працу немцаў: яны “таньнейшыя”, дый іх больш за французаў; французы ж, у сваю чаргу, навучаюць у школах, арганізаваных Фрыдрыхам II. Хвалу Паўночнай Сэмірамідзе пяюць Дыдро, д’Алямбэр і нават мудры Блэкстоўн, які прыняў заканадаўчыя ініцыятывы Кацярыны ўсур’ёз. Гэтую экзальтацыю можна растлумачыць ня столькі знаёмствам з Расіяй, колькі пратэстам супраць нерацыянальных рашэньняў, якія прымаліся *ancien régime’*амі Захаду. Гэтак Расія ўпершыню (другі раз наступіць пасьля 1917 году) была ўспрынятая як ідэал гармоніі ўлады й розуму. Кацярына добра ведае, як падтрымаць гэты энтузіязм. Рыхтуючыся да заваяваньня Польшчы, яна атакуе тамтэйшы каталіцызм і падбухторвае супраць яго праваслаўных і пратэстантаў, яна дбае пра тое, каб яе пачынаньні трактаваліся як абарона свабоды сумленьня. Французскія асьветнікі ахвотна так іх і трактуюць. Адзін Русо пратэстуе. Так зьмяняецца клімат. Для філёзафаў-асьветнікаў адзіны шлях да ўсталяваньня ўлады розуму — гэта асьвечаны манарх (альбо дэспат). Тым часам Польшча роспачна спрабуе рэфармаваць шляхецкую анархію ў нейкае падабенства сучаснай рэспублікі. Усходняя вэрсія якабінства выклікае жах на Захадзе. Гэта тым больш схіляе яго да Расіі. Старыя рэжымы салідарызуюцца ў злачынстве падзелаў. Кацярына канчае сваё цараваньне контрарэвалюцыйнай “рэакцыяй”. Досыць было, аднак, заняць трон Аляксандру, і ўжо Эўропа зноў уздыхае, закаханая ў найвыбітнейшага прадстаўніка чалавецтва. Ах, ён ваюе з тыранам Банапартам, ах, ён падараваў Польшчы Канстытуцыю!.. Ім зачараваны Бэнтам, ягоны бюст трымае ў сябе на стале Джэфэрсан, а мадам дэ Сталь едзе ў Расію падыхаць “паветрам свабоды”.

Усходняя дэспатыя

Другі пэрыяд пачынаецца ў 1815 годзе. Усяго за пару год статус Расіі мяняецца. Яе перастаюць называць “асьвечанай дэспатыяй”, цяпер гэта “ўсходняя дэспатыя”. Захад усьведамляе, што пад кантролем Расіі знаходзіцца саракамільённае насельніцтва, і гэта робіць з Расіі першую кантынэнтальную супэрдзяржаву сьвету. У адказ Расія, якая

падчас венскага перадзелу імкнулася выглядаць меншаю, чым была насамрэч, дэкляравала, што яе ўсходняя мяжа праходзіць па Ўрале, тым самым павышаючы сваю стаўку на перамовах. Такім штучным чынам нарадзілася так званая “Эўрапейская Расія” — першага разу як адзін з бакоў у міжнародным трактаце. Англію, Францыю й Аўстрыю ахоплівае дружны непакой. Але вобраз Расіі зьмяняецца яшчэ мацней, калі яна, дыскрэдытуючы Старыя Рэжымы, пнецца навязваць ім уласную волю. Сьвет, які сумняваўся ў справядлівасьці расійскага дзяржаўнага ладу, раптам спасьцігае таксама, што Расія належыць да іншай цывілізацыі. Канчатковая пераацэнка вартасьцяў адбываецца дзякуючы трыюмфу лібэральных ідэяў, рэвалюцыі 1830 году, зьяўленьню *Reform Bill*. Адначасова, рэагуючы на жорсткае прыдушэньне польскага паўстаньня 1830 году, Кюстын, Мішле, Уркхарт і Маркс малююць Расію ў выключна чорных танах. У гэты час Гізо фармулюе сваю ідэю аб гісторыі як працэсе, што праз фармаваньне сярэдняй клясы вядзе да ажыцьцяўленьня канстытуцыйных свабод. Гэты працэс называецца ні больш, ні менш як цывілізацыяй. Гэта значыць, што Расіі гэты працэс не закрануў. Выбітны расійскі розум Пётра Чаадаеў пацьвердзіў дыягназ.

Аднак жа лібэральнае гледзішча на Расію не было адзіным. У рамантычнай Нямеччыне, гэтай вялікай лябараторыі думкі, выпрацоўваецца складанейшы панятак *Sonderweg* — “асаблівага шляху”, — панятак тым гучнейшы, што, спускаючыся па сходах долу, ён трапляе ўрэшце ў Расію. У гэтым панятку цывілізацыя супрацьпастаўляецца культуры, то бок таму, што апісвае неабсяжную імпэрыю духу. Пры гэтым Маля — як і сьлед выдатнаму прафэсару — з рэдкім майстэрствам сынтэзу дабіраецца да чарговых сэмантычных пластоў словаў “культура” й “рамантызм”, якія няспынна ўзбагачаліся новымі сэнсамі — ад Гердэра да Канта, ад Канта да Гегеля й урэшце Маркса. У разуменьні Малі, рамантызм да 1848 году — мешаніна схільнага да гнастыцызму розуму, новага прачытаньня гісторыі й фаўстаўскага бунту. У такім выглядзе ён суадносіцца з палітычнай актыўнасьцю Асьветнікаў. Гістарычны канон Гізо ўскладняецца. Цывілізацыя — ці Эўропа — складаецца з паяднаньня хрысьціянскай, рымскай і германскай спадчыны. Вось Эўропы вандруе: яна ўжо не абмяжоўваецца выключна Францыяй і Англіяй, а ахоплівае ўсю

Сьвятарную рымска-германскую імпэрыю. Сутнасьць эўрапейскасьці паўстала з унікальнага гістарычнага досьведу. Ці належыць, такім чынам, Расія да Эўропы? Гляньма на сьпіс атрыбутаў: сярэднявечны Касьцёл і Імпэрыя? На Расію яны не распаўсюджваліся. Фэўдалізм і рыцарства? Таксама не. Рэнэсанс і Рэфармацыя? Не. Што й трэ было давесьці: Расія — не Эўропа. Хто быў "за" Расію ў той час? Зь відавочных прычынаў, пэрсанал прускіх і аўстрыяцкіх дыпляматычных місій, жменька крайніх кансэрватараў, шчасьлівых, што адкрылі краіну, не кранутую Асьветніцтвам, а таксама купка "славянскіх" нацыяналістаў, якія з боязі перад нямецкім націскам зьвяртаюцца да Расіі. Як "дзьвюх сясьцёр" апісваў некалі Міцкевіч Польшчу й Расію.

Мікалай I уладарыць з упэўненасьцю, што ён — эўрапейскі ўладар. Эўропа, якую ён ведае, — гэта Эўропа ягонай бабкі. Гэта ня ён здрадзіў Эўропе, а ветраная Эўропа здрадзіла яму. Калі мерыць былымі катэгорыямі, Расія Мікалая I мяняецца з "паліцэйскай" дзяржавы ў "цывілізаваную". Праводзіцца "грамадзянская рэвалюцыя", дзякуючы якой канчаткова фармуецца расійская мова, у будучыні мова вялікай літаратуры. Уласна кажучы, гэтая вялікая літаратура, наскрозь эўрапейская й сучасная паводле духу, станецца пажыўным асяродзьдзем для скептычна настроенай інтэлігенцыі, якая таксама нараджалася якраз у той час. Крызыс *ancien régime'*у ў Расіі праходзіць у найгоршых умовах. Зьмены, якія адбываюцца ў Эўропе, агаляюць агульнае спазьненьне Расіі, а даганяць у гэтай сытуацыі значна цяжэй, чым за часоў Пятра Вялікага, бо цяпер адставаньне датычыць ня толькі дзяржаўнага ладу, але й усяго грамадзтва на ўсіх узроўнях яго функцыянаваньня. Тым часам "грамадзтва" гэтага нават не існуе, бо не існуе, так бы мовіць, грамадзянскай супольнасьці. Большая частка людзей знаходзіцца пад прыгонам, ці, дакладней кажучы, у рабстве. І тады бясьсільная інтэлігенцыя прыходзіць да думкі, што спазьненьне Расіі — гэта, на самой справе, яе перавага, бо структурна яна лепш падрыхтаваная да будучай (сацыялістычнай) Эўропы. Герцэн знаходзіць у гегельянцаў "альгебру рэвалюцыі"; Бакунін вынаходзіць формулу, якая прыцягвае бальшавікоў: "Дух разбурэньня — гэта таксама дух стварэньня".

Пасьля 1848 году Расія ўсё яшчэ абурае Эўропу. Маля гатовы

бачыць у Крымскай вайне штосьці падобнае да ідэалягічнай агрэсіі, якую зьдзіўлены Мікалай ня ў стане зразумець. Ягоная параза дае пачатак трэцяму акту: Расія як краіна, падобная да іншых.

Такая самая краіна, як усе іншыя

У Расіі няма выбару. Калі яна жадае існаваць, дык павінна правесьці рэформы. У 60-х гадох Аляксандар II арганізуе другую "рэвалюцыю зьверху". Ліквідуецца прыгон, паўстаюць новыя судовыя інстытуты, уводзіцца ўсеагульная вайсковая павіннасьць. Гэтыя зьмены — дакладнае паўтарэньне рэформаў у Прусіі напалеонаўскіх часоў. Толькі праз паўстагодзьдзя. Яшчэ раз пацьвярджаецца вывад Таквіля пра небясьпекі рэфармаваньня аўтарытарнага рэжыму. Левае крыло грамадзтва выступае за рэвалюцыю, а гэта прыводзіць да таго, што рэформа — нават памяркоўная — не прыжываецца, як гэтага хацелася б, на яе шляху ўстаюць перашкоды, пра якія казаў Таквіль. Аднак паволі, лепш, горш, але яе праводзяць у жыцьцё. За Аляксандра III, нягледзячы на адсутнасьць канстытуцыйнае базы, узрастае ўзровень масавай адукацыі, пачынае разьвівацца гаспадарка. Эўропа прызвычваецца да думкі, што Расія — гэта атожылак яе ўласнай цывілізацыі й патэнцыйны рынак збыту. Банкі пачынаюць масава інвэставаць у Расію.

У Эўропе тым часам адбываюцца чарговыя зьмены. Яна раскалваецца на дзьве своеасаблівыя часткі: франка-ангельскую, у якой даўно прыжыўся прынцып выбарнасьці ўлады, і сярэднеэўрапейскую — Аўстрыю й Нямецкую імпэрыю. Бісмарк — гэта русафіл, які зрабіў свае высновы зь лібэральна-кансэрватыўных новаўвядзеньняў Напалеона III, такіх, як усеагульнае выбарчае права, падтрымка нацыяналізму альбо разьвіцьцё сыстэмы сацыяльнага забесьпячэньня. Карыстаючыся расійскім і французскім досьведам, ён стварае грамадзкі лад, які Маля называе "ўзаконеным банапартызмам". Дзьве Эўропы па-рознаму ўспрымаюць Расію. Для лібэральнай Эўропы Расія — адно прадмет вывучэньня. Уолес у Англіі, Лёруа-Бальё й Рамбо ў Францыі апісваюць яе спакойна, падрабязна, выкарыстоўваючы першакрыніцы, адным словам — "аб'ектыўна". Калі хочаце маю асабістую думку, дык я дзіўлюся

ў першую чаргу Лёруа-Бальё, які жадаў быць для французаў Тэнам і Таквілем у адной асобе. Аднак нельга забывацца, што пісаў ён у эпоху французска-нямецкага замірэньня й ягоная кніга вызначала інтэлектуальны клімат гэтага замірэньня. Чытаючы яго ўважліва, мы заўважаем, што, нягледзячы на гладкасьць фармулёвак, вялікіх спадзяваньняў за ягонымі словамі не адчуваецца. Сярэдняя Эўропа, у сваю чаргу, ставіцца да Расіі дваіста: з аднаго боку, яна ня зносіць расійскага самадзяржаўя, з другога, успрымае гэтую краіну як месца, у якім некалі разгарыцца зара альбо, прынамсі, вялікі пажар. З эсхаталёгіяй расійскага папулізму часткова пагаджаецца сам Маркс. Па меры таго, як нацыяналістычны імпэт заражае ўсю Эўропу, на Расію пачынаюць глядзець як на яшчэ адну "нацыю" на кантынэнце, што дзеліцца на блёкі й хаўрусы. Эўрапейскі сьвятарны саюз народаў дажывае апошнія дні.
У эпоху *fin de siécle* Расія ўсяляк вызначаецца ў галіне культуры. Узьнікае, гаворачы сучаснай мовай, "культурная супэрдзяржава" сусьветнага ўзроўню. Вялікія пісьменьнікі, музыка, балет і жывапіс ня толькі наганяюць эўрапейскія, але ўпершыню пачынаюць уплываць на заходнюю культуру. Эўрапейскі *gradient* зазнае рэдукцыю: уплывы ідуць у розныя бакі. Пачынаецца *belle epoque* "расійскай душы" й таго "духоўнага пачатку", якога шукала ў Расіі перасычаная сваім рацыяналізмам і пазытывізмам Эўропа. Гэта гучным рэхам адгукнулася ў Нямеччыне, бо ж расійскі *особенный путь* гучаў ва ўнісон зь нямецкім *Sonderweg*. Рыльке мроіцца "чалавек-анёл", а Ніцшэ рашуча хваліць Расію й крытыкуе "ангельскія ідэі" ды амэрыканскае гандлярства. Мёлер ван дэр Брук сягае ў сваім русафільстве кропкі, ад якой пазьней, разьвіваючы ягоную думку, будуць адштурхоўвацца некаторыя з тэарэтыкаў нацызму. З духу ірацыяналізму й антымадэрнізму паўстае Інтэрнацыянал. Тут Маля мог бы больш увагі зьвярнуць на ідэалягічныя "выбрыкі" правіцы, якая бунтавала расійскі народ наконадні першай сусьветнай вайны. Яе пагроза была настолькі страшнаю, што я нават цешуся, што ўрэшце перамаглі бальшавікі, а не яна. Калі б першая сусьветная вайна скончылася трыюмфам Расіі і яна запанавала над паловай Эўропы, усёй Польшчай, Балканамі й Канстантынопалем, як гэта абяцалі ёй хаўрусьнікі, мы, можа, мелі б справу з сумесьсю нігілізму, разьдзьмутага нацыяналізму, расізму й

антысэмітызму, якую явіла сьвету нацысцкая Нямеччына, толькі ў кантынэнтальным маштабе — нашмат больш грандыёзнай і да таго ж з рэлігійным грунтам пад сабой. Уразіўшы падзеленую на дзіўныя кааліцыі Эўропу, пачынаецца вайна. З ідэалягічнымі й палітычнымі крытэрамі перастаюць лічыцца, хаўрус усходніх і заходніх ускраінаў Эўропы мае прычынай адно клопат пра бясьпеку й захаваньне ўлады. Вайна цягне за сабою падзеньне апошніх *ancien régime'*аў: яны ўжо ня ў стане змагацца з бурным выбухам дзікай дэмакратыі, што адбываецца ва ўмовах усеагульнае мабілізацыі мужчынскае часткі насельніцтва і стварэньня добраахвотніцкіх войскаў. Крохкая канструкцыя нядоўга вытрымлівае такі напор. На спустошаную палітычную сцэну Расіі вырываецца ідэалягічная сэкта, якую называюць партыяй бальшавікоў.

У люстры камунізму?

Нарэшце, чацьверты пэрыяд: Расія ў люстры камунізму. Я пастараюся быць тут сьціслым, бо гэта пэрыяд, найвядомейшы з усіх, а пазыцыі аўтара не такія ўжо арыгінальныя й бясспрэчныя. Маля пачынае гэтую частку доўгім выкладам аб прыродзе сацыялізму. Сацыялізм нараджаецца ў XIX стагодзьдзі з шэрагу адмаўленьняў: зь непрыманьня дэмакратыі й індустрыялізацыі. Ён разьвіваецца ў шматлікіх напрамках, але заўсёды як утопія: утопія дэмакратыі, якая адмаўляецца ад дэмакратыі, утопія прамысловай сыстэмы, якая адмаўляецца ад прамысловай сыстэмы, што існавала раней. Геній Маркса праявіўся ў тым, што адвечную эсхаталёгію ён прыбраў у шаты пазытывісцкай навуковай тэорыі. Маля пастулюе тэзу, што ў творах Маркса можна напраўду знайсьці ўсё тое, што ў іх вычыталі пасьлядоўнікі: інтэрпрэтацыі нямецкіх сацыял-дэмакратаў, інтэрпрэтацыі Каўцкага і Бэрнштайна ў роўнай ступені маюць права на існаваньне, мае права на існаваньне й ленінская інтэрпрэтацыя марксізму. Таталітарная партыя, тэорыятворчая роля інтэлігенцыі, рэвалюцыйны патэнцыял сялянства — усё гэтае можна знайсьці ў "Камуністычным Маніфэсьце" 1848 году. Таму немагчыма сьцьвярджаць, — кажа Маля, — што ленінізм ёсьць праяваю неэўрапейскай сутнасьці Расіі: ленінізм эўрапейскі родам. Не існуе "праўдзівага сацыялізму": ён

асуджаны на ўтапічнасьць, нават калі застаецца пры ўладзе. Існуе адно *прывід, які блукае па сьвеце*.
З тае пары ў Эўропе перастае функцыянаваць адзіны агульны вобраз Расіі. У залежнасьці ад акалічнасьцяў і ідэалягічнай прыналежнасьці, Расія для адных стала носьбітам усялякіх надзеяў, а для другіх — усялякіх пагрозаў. Што там адбываецца? Увасабляецца ў жыцьцё лёгіка Леніна-Сталіна. Сталін даводзіць да канца справу пабудовы ня столькі сацыялізму (што гэта такое, ніхто як ня ведаў, так і ня ведае), колькі “анты-капіталізму”. Эўропа — альбо, хутчэй, тыя бакі, што дужаюцца за права называцца Эўропай, — захапляецца Расіяй альбо абураецца ёй, у залежнасьці ад сваіх ідэалягічных прэфэрэнцый. Узмацненьне нацысцкіх уплываў ускладняе гэты стан рэчаў, бо грамадзкая думка цяпер мусіць выбіраць, якая з сыстэмаў горшая. Хаўрус нацызму й камунізму — нібы хаўрус сіямскіх блізьнятаў. Маля сьцьвярджае, што абедзьве сыстэмы ёсьць атожылкамі дэмакратыі, альбо, хутчэй, блізьнюкамі-дыяскурамі, што вырасьлі зь яйка французскай рэвалюцыі, то бок з нацыяналізму й сацыялізму. Вялізныя нацыянальныя войскі, створаныя падчас першай сусьветнай вайны, твораць ядро гіпэртрафаванай дэмакратыі, зь якой разьвіваюцца, з аднаго боку, крайні нацыяналізм і нацызм, з другога ж — сацыялізм і бальшавізм. Маля вядзе нас лябірынтам ня вельмі суладных між сабою тэарэмаў, якія нібыта тлумачаць новыя, пасьля прагрэсізму, нацыянал-бальшавізму альбо трацкізму, падзелы. Калі ацалелыя заходнія дэмакратыі ня могуць выбраць, які ж з ворагаў галоўны, Сталін падпісвае пакт з Гітлерам. Адбываецца вайна, нібыта замірэньне, падзел Эўропы, сапраўдная халодная вайна, нібыта разрадка, камуністычная сыстэма вычэрпвае свой патэнцыял і канчаткова занепадае… Мы ня маем магчымасьці падрабязна пераказаць зьмест гэтых бязьмерна цікавых і глыбокіх разьдзелаў. Бо яны аддаляюць нас ад галоўнай тэмы твору — хаўрусу Расіі й Эўропы, ператвараючыся ў доўгія развагі на тэму сучаснай сусьветнай гісторыі, поўныя, зрэшты, цікавых назіраньняў і арыгінальных высноваў. Маля гэтым разам пастулюе тэзу, што 60 зь нечым гадоў камунізму — гэта зьява з агульнаэўрапейскімі каранямі й адно празь зьбег акалічнасьцяў яна мела месца менавіта ў Расіі. А сёньня ад камунізму быццам бы засталіся толькі згадкі. Улада хлусьні ўпала, і камунізму

знаку не засталося. Расія ж засталася, толькі зьбяднелая матэрыяльна, інтэлектуальна й духоўна. Эўрапейскі *gradient* вярнуўся да свайго ранейшага палажэньня, адно яго крывая стала больш рэзка нахіленаю. Расія ж, калі яна хоча існаваць, ня мае іншага выбару, чым той, перад якім стаялі Пётра Вялікі й Аляксандар II: узмацненьне сувязяў з Захадам. Расійскі імпэрыялізм, які сваёй прыродаю збольшага не адрозьніваўся ад імпэрыялізму ангельскага ці французскага й ня быў агрэсіўнейшым за іх, будзе слабець такім самым чынам, як заходні, адно што пазьней, зь пяцідзесяцігадовым спазьненьнем — такім характэрным для Расіі ў параўнаньні з Эўропай. Што ж да "прывіду" сацыялізму ці камунізму, дык здаецца, што ён сьмяротна паранены, аднак няма пэўнасьці, што недзе ў іншым месцы ня будзе чарговага разу высунуты лёзунг "вялікага адмаўленьня", а "здані" нейкай новай рацыяналістычнай містыкі не закарціць яшчэ раз пакласьці канец сучаснаму сьвету, таму самаму сьвету, які гэтую здань усё яшчэ корміць уласнай цыцкай.

У іншым месцы?

Як я сказаў, кожная бачына кнігі Малі старанна прадуманая й правакуе роздум. Мы ня будзем тут дыскутаваць з доўгімі высновамі на тэмы рамантызму, сацыялізму альбо расійскай замежнай палітыкі. Засяродзімся на прынцыповай тэме, то бок на тым, якім чынам ацэньваюць альбо мусяць ацэньваць Расію. Меркаваньні Марціна Малі мяне пераконваюць цалкам. Мае заўвагі датычаць адно фактаў, якіх ён не захацеў узяць пад увагу, тых рэчаў, якія ён абмінуў. Яны не разбураюць ягонай тэорыі, а паглыбляюць яе. Вось жа, трэба цалкам пагадзіцца з Малем, што не існуе чагосьці такога, як адзіная і таямнічая "расійская душа". Трэба ці то быць расістам, ці то верыць у адмысловую волю нябёсаў (абодва падобныя падыходы, зрэшты, былі надзвычай папулярнымі), каб адмовіцца ад дасьледаваньня расійскай гісторыі з дапамогаю інструмэнтару, даступнага кампаратывістыцы. Дарэчы, заўважым, што шэраг спрэчных праекцыяў, якія датычаць Расіі, нагадвае тыя, што рабіліся ў той самы час адносна Кітаю. Мы мелі Кітай асьвечаны ў часах Вальтэра, Кітай, што выклікаў непакой падчас опіюмных войнаў, Кітай — "краіну, як усякая іншая" ў

эпоху вялікіх сынолягаў канца XIX стагодзьдзя, і нават Кітай, што быў крыніцаю натхненьня для вялікага мастацтва й літаратуры (Клядэль, Сэгален ды іншыя). Быў, нарэшце, Кітай XX ст., што выклікаў то надзеі, то страх. Гэтыя зьмены й супадзеньні ў паглядах прыцягваюць нашую ўвагу тым больш, што ў XVIII і XIX стагодзьдзях Кітай не зьмяняўся так, як Расія. Усё гэтае пацьвярджае, што згаданыя праекцыі залежалі больш ад рытму пераменаў у Эўропе, чым у Расіі альбо ў Кітаі.
Гэта таксама аргумэнт на карысьць думкі пра гістарычную пераемнасьць расійскіх рэжымаў. Маля не прымае таго, што мог бы назваць “польскаю інтэрпрэтацыяй” Расіі. Але факту, што такія бясспрэчна эўрапейскія народы, як палякі, балты й вугорцы, маюць досьвед расійскага панаваньня, нельга недаацэньваць. Гэтыя народы сьведчаць нам, што на ўласнай скуры адчулі нешта настолькі спэцыфічнае, чаго нельга пераказаць у простых словах менавіта таму, што мы эўрапейцы й “ня ў стане гэтага зразумець”. Досыць пачытаць Густава Герлінга-Грудзіньскага (“Іншы сьвет”), Чэслава Мілаша й Юзафа Чапскага. Яны ня цалкам вольныя ад ідэалёгіі, але істотнае іншае: яны ня маюць нянавісьці да Расіі, якую ведаюць, і часта выказваюць ёй сваю сымпатыю. Але каб во гэтак, адразу ўлучаць Расію ў Эўропу? Яны б бязьмежна зьдзівіліся. Цікава, што Марцін Маля назваў свой *opus magnum* назовам слыннага раману Джозафа Конрада: *Under Western Eyes*. Мэтаю Конрада было адрэагаваць на “моду на Расію”, якая нарадзілася з чытаньня расійскіх раманаў. Конрад выварочвае Дастаеўскага, нібы пальчатку. Ён хоча дакрануцца рукою да чагосьці спэцыфічна чужога й фатальнага, таго, што прымушае кожнага паляка казаць: калі мы ў Расіі, мы ў зусім “іншым сьвеце”.

Спазьненьне

Аднак застанемся гісторыкамі. Ключавы панятак інтэрпрэтацыі Малі, як мы бачылі, — гэта панятак спазьненьня. Маля ў акрэсьліць шэраг крытэраў, якімі вымяраецца гэта спазьненьне. Маля занадта добры гісторык, каб **[illegible]**, што гэты шэраг вялікі. Яго высновы, аднак, датычаць **[illegible]** разьвіцьця думкі й грамадзкіх інстытутаў. Калі б **[illegible]** расійцам, яго б залічылі да так званай “дзяржаўнай [illegible]

[2] Я разглядаў гэтае інтэрпрэтацыі Малі ў артыкуле “La Russie et la Révolution” у “Contumentaire”, № 46, 1989.

гістарычнай школы, калі б ён быў немцам, ён упісаўся б у напрамак *Geistesgeschichte*. Зьвяртаючы ўвагу перадусім на дзяржаву (адміністрацыю, кадры, інстытуты й г. д.), а таксама на пісьменьнікаў, ён падкрэсьлівае тэзу аб прынцыповай прыналежнасьці Расіі да Эўропы з дапамогаю архаізму больш чым паўвекавой даўніны. Ці не падганяе ён тут рэчаіснасьць пад сваю ўласную канцэпцыю? Ад XVII да XIX стагодзьдзя ўсе цары (улучна зь Мікалаем I і нават Аляксандрам III) былі рэфарматарамі. Адносна лёгка можна рацыянальна перабудаваць адміністрацыю, стварыць сярэднюю й вышэйшую школу, каб зь іх штогод выходзіла пара тысяч чыноўнікаў, сфармаваць на эўрапейскі капыл вузкае кола эліты, якая станецца пачаткам калі ня мысьленьня, дык прынамсі літаратуры й мастацтва, бо паэты й музыкі родзяцца часьцей за эрудытаў, гісторыкаў і філёзафаў. Такая рэформа абыходзіцца нядорага, закранае невялікую колькасьць людзей, а атрыманую форму заўсёды можна адціснуць на “недааформленай” — у гэтым драма — *prima materia*. Гісторыя ідэяў, якая разглядаецца ў кантэксьце сусьветнай гісторыі, мае ў сабе нешта мімалётнае й няпэўнае, бо ня вельмі вядома, якім чынам уплываюць на сьвет ідэі выбітных асобаў, хоць вядома, што неяк уплываюць. Аднак тыя з расійцаў, што ўяўлялі сабе вобраз і прызначэньне сваёй айчыны, добра ўсьведамлялі, якая бездань расчыняецца ў іх пад нагамі й якое крохкае апірышча іх трымае. “*Дзяржава*, — казаў Пушкін са стомленай безнадзейнасьцю, бо ведаў гэтую дзяржаву занадта добра, — *гэта адзінае, што ёсьць эўрапейскага ў Расіі*”.

Вернемся да сьпісу крытэраў прыналежнасьці да Эўропы, складзенага Гізо, а таксама Ранке. Калі браць пад увагу крытэры, якімі карыстаецца Маля, Расія напраўду адстае ад Нямеччыны толькі на паўстагодзьдзя. Але факт, што ўжо ў XVI стагодзьдзі Нямеччына поўнілася цудоўнымі гарадамі. У тамтэйшых унівэрсытэтах, кляштарах і пры дварах знаходзілі сабе прытулак шматлікія навукоўцы, тэолягі й паэты. Яны карысталіся паслугамі прыўкрасных рамесьнікаў, залатароў, ткачоў, сялянаў (якія былі збольшага вольнымі й ня ведалі, што такое прыгон). Расіі гэта ня сьнілася нават пры канцы XIX стагодзьдзя. У 1913 годзе ў Пецярбургу ступень пісьменнасьці была не ніжэйшаю, а інтэлектуальны рух ня менш актыўны, чым у Мадрыдзе. Аднак памятайма, што гішпанская літаратура

пачалася з Сэнэкі, а Андалюзія на пачатку стагодзьдзя ўжо была “разьвітая”. Дзе ў Расіі XIX ст. знойдзеш Сэвілью, Таледа, Валенсію альбо Саляманку? Дзе знойдзеш аналяг гішпанскіх грамадзянскіх свабодаў? — Гішпанія ведала толькі свабодных людзей, *fueros*, і разьвітую судовую сыстэму (у тым ліку й суды інквізыцыі).

Маля сьцісла пераказвае нататкі іншаземцаў, што падарожнічалі па даўнейшай, дапятроўскай Расіі: Алеарыюса, Гербэрштайна й Флетчэра. Ён зьвяртае ўвагу, што ўсе яны апісваюць найдзічэйшае барбарства. Як яны адрозьніваюцца ад запісаў тых падарожнікаў, што ў той самы час наведваюць Кітай, Індыю, Пэрсію альбо Асманскую імпэрыю. Трэба памятаць, што ў параўнаньні з пасам “цывілізаваных” альбо “напаўцывілізаваных” краін, што атачаюць царскую імпэрыю, расійская прастора зеўрыць пусткамі. Не віна, а бяда Расіі, што цэнтры цывілізацыі так ад яе аддаленыя. З гэтага ўсяго вынікае, што Расія — гэта вялізарная тэрыторыя без гарадоў і рамёстваў (фактычна адзіным інструмэнтам расійскага селяніна доўга заставалася матыка), зь сельскаю гаспадаркай, што, як сьведчаць спэцыялісты, у 1913 годзе сягнула роўню ангельскай часоў Вайны Белай і Чырвонай Ружаў.

Усе гэтыя засьцярогі, добра вядомыя Малю, азначаюць ня тое, што Расія ў сутнасьці сваёй адрозьніваецца ад Эўропы, але тое, што яе “спазьненьне” трэба вымяраць кавалкамі часу, якія вагаюцца ад пяцьдзясяці да тысячы гадоў, а можа й больш. Дасьледнікі дагістарычных часоў з пэўнасьцю маглі б тут сказаць сваё слова. Мы памятаем вялікую кнігу П’ера Паскаля пра раскольніка пратапопа Авакума. Яна чытаецца, нібы тэкст пра эпоху Мэравінгаў. Паскаль, аднак, параўноўвае стараверскі раскол з рухам янсэністаў і, не вагаючыся, параўноўвае вялікага барбара Авакума й матухну Анжаліку Арно. Такое параўнаньне хібнае, і Маля ведае гэта лепш за каго-кольвек. Аднак часам ствараецца ўражаньне, што свае тэзы ён ілюструе такім самым чынам, як Паскаль.

Маля ведае, што ў гэтым слабіна ягонай працы, ён у пэўнай ступені прадбачыў яе. Я сумняюся, што спэцыфіка й асаблівае становішча Расіі тлумачыцца проста “спазьненьнем”. Мне карціць удакладніць гэтую думку. Адчужанасьць Расіі ад Эўропы вынікае ня столькі з “спазьненьня”, колькі з “спробаў здагнаць” і “згубных наступстваў” гэтага.

Зьвернемся да вядомага ў гістарыяграфіі расійскага топасу, а менавіта ацэнкі ўладараньня Пятра Вялікага. Таксама як і Малю, мне хацелася б думаць, што яго дзеяньні заключаліся ў паўтарэньні рашэньняў Вялікага Курфюрста альбо швэдзкіх каралёў. Але ж тым каралём не прыйшла да галавы думка самастойна выконваць абавязкі ката й ператварыць свой палац у месца катаваньняў. Апрача таго, адна справа будаваць сучасную (то бок мэркантылісцкую) адміністрацыю, абапіраючыся на людзей вольных, а другая — абапіраючыся на рабоў. Варта ў гэтай сувязі прывесьці слынную формулу Ключэўскага: *“Пётар хацеў, каб раб дзейнічаў адважна й свабодна, і надалей застаючыся рабом”*. Такі сабе спосаб здаганяньня, пры якім мэта скажаецца і дэфармуецца да недасяжнасьці. Менавіта таму Русо меў права сказаць пра Расію, што *“яна перасьпела, не дасьпеўшы”*. Кацярына дзейнічала разважлівей і ў пэўнай меры “загаіла” раны, што засталіся па пятроўскай рэвалюцыі. Яна мэтадычна будавала праўдзівы *ancien régime*. Але рэжым гэты адно спрабаваў рабіць першыя крокі і, у адрозьненьне ад таго, што імкнецца давесьці Маля, быў вельмі далёкі ад дасканаласьці, — і яго адным махам дыскрэдытавалі французская рэвалюцыя й лібэральныя перамены[2]. Пабудаваць новы сацыяльны лад у той сытуацыі, якую засьпявае Мікалай I, ужо немагчыма. Што рабіць?

Рэлігійнае самаўзьвелічэньне

Што рабіць? Дамагацца самаўзьвелічэньня й нерэалістычныя спробы нагнаць Эўропу замяніць уяўнымі.

Першае самаўзьвелічэньне — рэлігійнага характару. Цікава, што Маля цалкам абмінае рэлігійны аспэкт расійскай праблематыкі. Між тым ён двойчы адыграў вырашальную ролю. Першага разу яшчэ ў дапятроўскія часы, у момант будовы маскоўскага самаўладзтва. Таямніча гучыць пасланьне, зь якім на пачатку XVI ст. зьвяртаецца да Васіля III манах Філафей: “*Вялікі Княжа Сьвятлейшы, цару хрысьціянскага праваслаўя, валадару над валадарамі, што сядзіш на вялікім пасадзе, о ты, паноўны над боскімі пасадамі ўсясьветнае й апостальскае Сьвятое Царквы, Царквы Сьвятое Божае Маці, яе слаўнага Ўшэсьця, Царквы, што выпраменьвае бляск, роўны Цэрквам Рыму й Канстантынопалю (…). Ведай жа, о спадару, цару вельмі*

багабойны, што ўсе дзяржавы, якія вызнаюць хрысьціянскую веру праваслаўную, паядналіся ў тваім царстве: толькі ты хрысьціянскі цар тут, на зямлі". Цар, пра якога тут мова, панаваў над бязьмежнымі лясамі й палямі, што ўраблялiся лядным спосабам. Мэгаляманія гэтага царства проста агаломшвае. Ці ж яе крыніцаю можа быць нешта іншае, чымся найдзіўнейшы лякальны канглямэрат рэлігійных ідэяў? Усім, хто падарожнічаў па Расіі, кідалася ў вочы агульная панічная боязь лацінскай культуры. Праваслаўная Расія атачае сябе рэлігійным мурам, нагадваючы гэтым мусульманскую Умму. Рэвалюцыя Пятра I зруйнавала гэты мур, гвалтоўным чынам — на нямецкі ўзор — "пратэстантызавала" й сэкулярызавала царкву. Колькасьць манахаў, а таксама іх багацьце й прэстыж істотна паменшылася.

Расійская праваслаўная царква, аднак, пераадольвае крызыс, і ў XIX ст. у другі раз "рэлігійны" спосаб самаўзьвелічэньня набірае сілу. Ён ляжыць у падмурку вялікай славянафільскай аргумэнтацыі: мы ня горшыя, але ж іншыя, а паколькі сам Захад у сваіх кнігах і газэтах прызнаецца, што ён сапсаваны, дык мы лепшыя. Мы лепшыя таму, што маем веру — адзіную праўдзівую веру. Усе расійскія паскудзтвы — так лічаць Гогаль і Дастаеўскі — ужо таму добрыя, што яны нацыянальныя, а раз яны нацыянальныя, дык таксама рэлігійныя, і такім чынам яны добрыя ўдубальт. Расія поўная грэшнікаў, аднак сама яна — як і яе царква — сьвятая й бязгрэшная. Гэтае найдзіўнейшае перапляценьне рэлігійных і нацыянальных элемэнтаў (у больш вытанчаным і менш фанатычным выглядзе мы, што праўда, назіраем яго таксама ў Англіі) прывяло да таго, што расійскі нацыяналізм стаўся заразьлівым для іншаземцаў. І вялікая група дасьледчыкаў Расіі пранікаецца ім. У XVII ст. харвацкі сьвятар Крыжаніч захацеў навярнуць Расію на каталіцтва. У хуткім часе яго арыштавалі й выслалі ў Сібір, ён прабыў там 15 гадоў. І што ж? Пасьля вяртаньня ён палае яшчэ большай, чым перад высылкаю, любоўю да Расіі і гарыць яшчэ большым энтузіязмам. Спалучэньне рэлігійных і нацыянальных элемэнтаў назіраецца і ў пазьнейшы час: сярод расійскай эміграцыі ў Францыі яно ператрывала тры пакаленьні і ў 1991 годзе дасягнула свайго, лічы, піку, гатовае зноў апладніць посткамуністычную Расію. Глеба была амаль падрыхтаваная: у 1998 годзе япіскап Екацерынбургу загадвае публічна спаліць

кнігі — нават не каталіцкія, не пратэстанцкія, а праваслаўныя, але выдадзеныя за межамі “сьвятой Русі”, эмігрантамі, а значыць — зь пячаткаю граху.
Дагэтуль цяжка сабе ўявіць расійца-пратэстанта ці расійца-каталіка: гэта разглядаецца ня проста як вераадступніцтва, а як здрада. Салжаніцын напісаў, што Польшча ўяўляла сабою для Расіі небясьпеку большую за манголаў, бо магла схіліць яе да вырачэньня ўласнай веры. Перажыўшы росквіт у XVIII ст. і будучы амаль зьнішчанаю за часоў бальшавізму, рэлігія ў чарговы раз адраджаецца, ізноў аддаляючы Расію ад Эўропы й кампэнсуючы сабою гэтае аддаленьне. У чарговы раз усё, што рэлігійнае, стаецца ў Расіі нацыянальным, а ўсё, што нацыянальнае, — рэлігійным.

Імпэрская манія велічы
Другі элемэнт самаўзьвелічэньня — імпэрская манія велічы. Яна выяўляецца ў розным.
За XVI і XVII стагодзьдзі Расія сягнула ажно да Ціхага акіяну. Ужо Вальтэр заўважыў, што яна, такім чынам, заняла прастору, у некалькі разоў большую за Рымскую імпэрыю. Гэтыя пустыя тэрыторыі, якія так да канца й не ўдалося засяліць і выкарыстаць, перапаўняюць расійцаў праўдзіваю пыхай. Фантазіі ёсьць дзе разгуляцца. *Мы* — гэта людзі, якія насяляюць шостую частку ўсёй зямной сушы. Быццам бы гісторыя залежыць ад колькасьці квадратных кілямэтраў. Тут крыніца *эўразійскіх* мрояў. Сёньня расійская думка ня можа прымірыцца з “стратаю” некалькіх мільёнаў квадратных кілямэтраў. Яна зацята бароніць два востравы, якія Сталін у 1945 годзе скраў у Японіі. Страціць кавалак тэрыторыі для шмат каго з расійцаў азначае “страціць аблічча”.
Другая праява імпэрскай маніі велічы больш дасьледаваная: гэта панаваньне на Каўказе і ў Сярэдняй Азіі. Яе пачаткам сталіся заваёвы XIX стагодзьдзя, падобныя да тых, якія ў той самы час праводзіла Францыя. Для іх апраўданьня вылучаліся тыя самыя аргумэнты, што і ў Францыі: жаданьне прынесьці цывілізацыю, падтрымаць хрысьціян і абараніцца ад ісламу. Гэтай часткі імпэрыі можна адрачыся безь вялікага болю. Тым горш для тубыльцаў, — лічыць расійская думка, — дзеля якіх “мы ахвяравалі сабою” і якія дорага заплацяць за сваю

“няўдзячнасьць”.
Трэці від маніі велічы больш арыгінальны. У XVIII ст. Расія заняла Ўкраіну, Польшчу, балтыйскія краіны, то бок землі, цывілізацыйна разьвітыя нашмат больш за яе й бясспрэчна эўрапейскія. Мэтады заваёваў былі тыповымі для XVIII ст.: угоды зь мясцоваю арыстакратыяй, якая пасьля пастаўляла імпэрыі кадравых афіцэраў, альбо таксама — у выпадку патрэбы — ваеннае вырашэньне праблемы. Трэба адзначыць, што гэтыя заваёвы прадстаўляліся расійскай публічнай думцы як “узьяднаньне”, далучэньне земляў спрадвеку расійскіх, якія Расія прыняла так сама ласкава, як бацька прымае блуднага сына. Такімі самымі словамі Салжаніцын заклікае “заблуканак” Украіну й Беларусь, каб яны вярнуліся ў родную аўчарню. Пазыцыя Расіі — насуперак таму, што сьцьвярджае Маля, — адрозьніваецца ад пазыцыі Аўстрыі й Прусіі. Аўстрыя й Прусія лічылі, што яны — прывядзем вядомае выказваньне аўстрыйскага міністра — *“варта, якая стрымлівае арду”*. Тут жа арда стаяла на варце, і палякі з балтамі вельмі балюча адчулі гэта на ўласнай скуры. Расійцы таксама гэта ведалі, але ўлада, якую яны мелі, здымала зь іх усякую адказнасьць. Словы дэ Кюстына: *“Раб, які стаіць на каленях, марыць пра ўсясьветную імпэрыю”*, — тут вельмі дарэчныя.
Я лічу, што Маля недастаткова выразна падкрэсьлівае, да якой ступені захоп гэтай “эўрапейскай” часткі імпэрыі перашкаджаў Расіі стаць на шлях эўрапейскага разьвіцьця. Па сутнасьці, *gradient* функцыянаваў ужо ўнутры імпэрыі, і яго значэньне расло цягам усяго XIX ст., бо працэс індустрыялізацыі пачаўся найперш у Польшчы й Балтыі. Але ж ён ня мог стацца імпульсам да разьвіцьця прамысловасьці ў Расіі — акурат наадварот. Немагчыма было зьдзейсьніць палітычную рэформу, настолькі жаданую пачынаючы з 1860 году, без адмаўленьня ад самаўзьвелічэньня. Расійскае панаваньне на гэтых тэрыторыях стрымлівала рэформы: кампэнсаваць іх адсутнасьць магла адно лібэральная ці наагул дэмакратычная рэвалюцыя, якую суправаджаў бы пад’ём гаспадаркі. Аднак, гэта была б занадта цяжкая і доўгая справа. Прасьцей было застацца імпэрыяй у сваім ранейшым стане. Калі ў 1945 годзе камуністычная Расія заняла гэтыя самыя землі й нават пашырыла свае межы, яна сутыкнулася з аналягічнай дылемай, што выракла расійска-савецкую дзяржаву на поўную стагнацыю.

Усьведамленьне аддаленасьці ад Эўропы знаходзіць адбітак у расійскай літаратуры. Яна нарадзілася на пачатку XIX стагодзьдзя, а яе клясыкі былі рамантыкамі. Яе мучыла праблема *Sonderweg*. Яна ставіць сабе вялікае пытаньне: “Што значыць быць расійцам?”. Яна не пытаецца, як клясыцысты: “Што значыць быць чалавекам?”. *“Паводле сваёй прыроды я чалавек, а француз я толькі выпадкова”,* — пісаў Мантэск’ё. Гогаль, Дастаеўскі й асабліва расійскія пісьменьнікі пачатку XX ст. заўзята адпрэчвалі гэтую думку. Бальшыня гэтых пісьменьнікаў (з вартым увагі выняткам анархіста Талстоя ды індыфэрэнтнага Чэхава), таксама як амаль усе гісторыкі, падтрымлівалі імпэрскую ідэю й захоп Украіны й Польшчы. Пушкін нават напісаў оду з нагоды здушэньня лістападаўскага паўстаньня ў Польшчы. Гэтае не перашкаджала літаратарам зноў і зноў усё вынаходлівей падымаць пытаньні ніжэйшасьці альбо вышэйшасьці Расіі й подласьці альбо сьвятасьці расійца.

Хлусьня

Найпрасьцейшым, найштодзёньнейшым спосабам самаўзьвелічэньня аказвалася, урэшце, хлусьня, альбо ігнараваньне — насуперак усякай відавочнасьці — згаданых адставаньняў і спазьненьняў. Гэта не азначае, што расійцы больш схільныя да маны, чым усе іншыя людзі, а ідэалёгічным становішчы празьмерны кантраст паміж рэчаіснасьцю жаданьнямі, ідэямі, праектамі вымушаў іх загойваць раны закранутага самалюбства акурат хлусьнёю. Гэтая традыцыя, як і вякавая традыцыя наганяньня: яна ўкаранілася ўжо ў XVIII ст. Мы добра памятаем, як адкрываюць яе Кюстын, Маркс і Мішле[3]. Разумныя й аб’ектыўныя французскія й ангельскія назіральнікі канца XIX ст. прызнаць, што напісаныя на паперы законы, пастановы, новаўвядзеньні ў Расіі “прабуксоўваюць” і гінуць, ўвасобіўшыся ў жыцьцё, што, нягледзячы на правядзеньне, усё нялёгка асушыць бяздонную багну. Маля вызначаюць пэрыяды ў гісторыі вывучэньня Эўропаю Расіі. Зразумела ж трэба памятаць, што і захапленьню таксама ўвесь час спадарожнічаў сумнеў — пачынаючы ад Вальтэра і Дэні ў XVIII ст. і ажно да нашых дзён. Славянафілы, песьняры Расіі маюць ісьце сваёй, сьвятой і адрознай ад усіх Расіі, ня

[3] **Маркс:** *“Тыпую імпэрыю, якая хоць і выйшла з вайны, але ўсё яшчэ ўвасабляе ідэю заваёвы, дзівіць сьвет сваім ростам, але ў сутнасьці ўяўляе сабой фактор”.* **Кюстын** **сьцьвярджае, што Расія маюць** **Пятраз**

Вялікага за тое, што ён сіламоц піхаў Расію ў Эўропу, зьмяняючы напрамак яе павольнага й “арганічнага” разьвіцьця, дзякуючы якому яна ўласнаю дарогай магла сягнуць *заходняга* ладу. Цары, хоць і былі настроеныя па-праэўрапейску, *старанна* дбалі пра славянафільскіх гістарычных фікцыяў з усё большым *пачуцьцём* сымпатыяй, бо яны стваралі добры паняткавы падмурак *замежнікам*. хлусьні й рабілі магчымаю карпатлівую, штодзённую *працу* “падфарбоўваньня” сумнай рэчаіснасьці.

Маля цалкам мае рацыю, калі кажа, што камунізм *ашуканства* ня мае нічога супольнага зь “вечнаю Расіяй”. Я *бясконцасьці й* змагаўся супраць канцэпцыі, якую падзяляў дэ Гі*глёбіні* яшчэ, — канцэпцыі, якая не зьвяртала ўвагі на са*Расіі* харктар гэтай ідэалёгіі, яе агульнаэўрапейскія ка*ды*, адмысловую падступнасьць і сусьветнае мэтафіз*хранікі* вымярэньне. Камуністычныя рэжымы, аднак, ха*ашуканства*, тым, што выцягваюць з нацыянальнай сьвядома*што* усё, што ў ёй ёсьць найгоршага, выразам чаго, у прыватнас*і* способ ажыцьцяўленьня ўлады. Камунізм ня толькі з*і* разьвіцьцё Расіі, але й жудасна разьвіў тыя яе рысы, якія ўжо раней Эўропу жахалі. Замест некалькіх сотняў агентаў *ахранкі* — 200 тысяч агентаў КГБ. Замест некалькіх тысяч вязьняў — некалькі мільёнаў. Замест звычайнай хлусьні — унівэрсальнае, мэтафізычнае, шызафрэнічнае ашуканства, якое зьмяняе сэнс ня толькі словаў, але й рэчаіснасьці. Імпэрыя фальшу, краіна “ашаламляльнае хлусьні”. Ніколі Расія, — заўважае Маля, — не была так блізкая ад Эўропы, як у 1913 годзе. А пяцьма гадамі пазьней стала як ніколі далёкай. І прорва паміж іх гэтага разу мела расійскія, але павялічаныя да пачварнасьці рысы. Во як Кітай у эпоху Мао быў да пачварнага кітайскі. Мэта “даганяньня”, якая цягам семдзясяці гадоў была маніяй рэжыму, прывяла да зьяўленьня “не-капіталізму”, сыстэмы, адначасова “не-эўрапейскай” і “гіпэррасійскай”.

Ацэньваць па справах, а не па словах

На гэтым хачу спыніць дыскусію з гэтай каштоўнай — паўтаруся — і надзвычай багатай кнігай. Напэўна, Маля шчэ выкажа сваю думку наконт маіх заўваг, несумненна выявіўшы пры гэтым увесь свой талент, тонкасьць розуму і інтэлектуальны багаж. Па сутнасьці, мы проста працягваем тую

ты, што
па”
найлепш
старанна
пачуцьцём
замежнікам.
Міхалкоў
“Crescendo
ашуканства
бясконцасьці й
глёбіні
Расіі
ды
што яна
хранікі,
ашуканства,
што
сацыялістычная”
і

disputatio, якая мае месца ў расійскай гістарыяграфіі апошніх трох стагодзьдзяў. Калі казаць простымі словамі, вырашэньне пытаньня, ці належыць Расія да Эўропы, залежыць ад таго, які сэнс мы ўкладаем у словы “спазьненьне” (цяпер Расія належыць ужо да Эўропы “правай”, а ня “левай”) — альбо “дэфармацыі”, якія вынікаюць з гэтага “спазьненьня”, мэтадаў яго пераадоленьня, згубных наступстваў “даганяньня”. Таму нам трэба асьцярожна чакаць і назіраць. Гэта мае практычнае дачыненьне да палітыкі, якую эўрапейскі й амэрыканскі Захад павінен праводзіць адносна Расіі.

Маля абсалютна слушна падкрэсьлівае заходнія крыніцы сацыялізму й “філялягічную” правамоцнасьць ленінскай інтэрпрэтацыі Маркса. Не зважаючы на тое, што гэтая інтэрпрэтацыя сьвяткавала сваю перамогу менавіта ў Расіі і перамога гэтая цягнулася ненармальна, ненатуральна доўга. Яе яд атруціў душы. Расія вызвалілася ад камунізму (згаджуся з Малем, што камунізм там ужо не адродзіцца), аднак не ачысьцілася ад гэтай атруты. Яна ня выкінула з памяці й ня вынесла абвінаваўчага прысуду. Помнікі Леніну дагэтуль красуюць на ўсіх плошчах. Камунізм трактуецца не як паталягічны й злачынны эпізод, які належала б з сорамам выкінуць зь сьвядомасьці, а як паўнапраўны фрагмэнт гісторыі Расіі з усімі добрымі й злымі бакамі. Камунізму абвешчана амністыя, і вінаватыя могуць спаць спакойна. Яны застаюцца ў кіраўнічым апараце й бяруць удзел у палітычных гульнях. Захад, ратыфікуючы гэтую амністыю й дапаўняючы яе амнэзіяй, бярэ й на сябе долю адказнасьці за такі стан рэчаў. Часьцяком у Расіі можна пачуць, што камунізм — гэта ўрэшце чужая для яе зьява, імпартаваны прадукт, што Расія ў чарговы раз стала ахвяраю Эўропы. Такое гледзішча знойдзе ў вывадах Малі аргумэнты ў сваю падтрымку, хаця Маля будзе першы, хто гэтаму запярэчыць.

Камуністычны эпізод гісторыі нельга пакідаць у народнай памяці так, як французы ўключылі ў яе сваю рэвалюцыю. Апошняя пакінула па сабе ня толькі ўспаміны пра свае злачынствы, але й новае жаданае “народам” грамадзтва, якое не парывала з ранейшым грамадзтвам канчаткова. Камуністычны эпізод — гэта не-грамадзтва, альбо грамадзтва разьбітае, раздробненае, дэмаралізаванае, затрыманае ў разьвіцьці. Ізноў, як у 1815 годзе, паўстае пытаньне: што

рабіць?
Ёсьць толькі адно разумнае выйсьце, якое падказваюць як Маля, так і сур'ёзныя расійскія дасьледнікі: акцыдэнталізацыя. Але гэта амаль невырашальная задача. Калі ўсіх грошай Заходняй Нямеччыны не стае, каб узьняць з руінаў лапік тае Ўсходняй Нямеччыны, дык на ўзьняцьцё Расіі ня хопіць грошай усяго сьвету. У Расіі камунізм трымаўся так доўга толькі таму, што чэрпаў зь некамуністычных духоўных сілаў: найбольш коснага з нацыяналізмаў і найбольш фанатычнай з рэлігіяў. Гэты стан рэчаў і дагэтуль не пераадолены, і ідэалёгія цяперашняй Расійскай камуністычнай партыі — гэта менавіта сумесь камунізму, нацыяналізму і фанатызму. Існуе небясьпека, што за доўгі час, неабходны для пабудовы сапраўды эўрапейскай Расіі, можа адбыцца рэцэдыў клясычных мэтадаў "кампэнсацыі" спазьненьня. Наіўна спадзявацца на "адраджэньне хрысьціянства" ў Расіі. Замест гэтага на нашых вачах паўстае яшчэ больш карумпаваная і цемрашальская царкоўная гіерархія, чым у царскія часы.
Імпэрыя распадаецца, і гэта вялікі шанец для Расіі, які можа прынесьці ёй шмат пазытыўнага. Аднак і сёньня Расія мроіць імпэрыяй, і ўмелыя расійскія дыпляматы разам з спэцслужбамі патаемна працуюць над яе адбудовай. Незалежнасьць Украіны для бальшыні расійцаў — страшны кашмар, нешта ненатуральнае, што мусіць неўзабаве мінуцца. І, урэшце, хлусьня гатовая зноў заняць сваё месца. Ператварэньне *апаратчыкаў* у *дэмакратаў*, практыкаў плянавай эканомікі — у зацятых песьняроў свабоднага рынку, спрытнасьць, зь якой яны ахрысьцілі крадзеж прыватызацыяй, зь якой *облапошили* МВФ і нямецкія банкі — усё гэта паказвае, што *втирание очков* іншаземцам мае будучыню.
***
Згаджуся зь вялікай кнігай Малі ў тым, што належыць паважна ставіцца да адвечнага, глыбокага й трывалага жаданьня Расіі наблізіцца да Эўропы й зьяднацца зь ёй. Форма й роля расійскае дзяржавы, форма й дух расійскага рэлігійнага пачуцьця дагэтуль перашкаджалі гэтаму хаўрусу. Аднак розум, што павінен ісьці побач з сымпатыяй і нават міласэрнасьцю, да якой заклікае вышэйзгаданае жаданьне, мусіць праяўляцца ў адрозьненьні словаў ад справаў, заяваў ад учынкаў. Не гісторыкам вырашаць, належыць Расія да Эўропы ці не (хаця

яны дыскутуюць на гэтую тэму ўжо цягам трох стагодзьдзяў). Урэшце, гэтае пытаньне вырашыць сама Расія. Гісторыя вучыць нас, што мы не павінны верыць ёй на слова, але павінны судзіць яе па яе ўчынках.

Пераклаў зь нязначнымі скарачэньнямі Андрэй Хадановіч паводле часопісу Commentaire *(№89), 1999.*

Адказ М. Малі на эсэ А. Бэзансона

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 4 (18) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: 06-10-2001
[image]

Ален Бэзансон

Ці належыць Расія да Эўропы? Палеміка з Марціном Малем

АЛЕН БЭЗАНСОН французскі палітоляг, гісторык і філёзаф. Прафэсар, дырэктар Вышэйшай Школы Грамадзкіх Навук у Парыжы. Спэцыяліст у гісторыі Расіі XIX ст. і камуністычнай сыстэмы. Эсэ **„Ці належыць Расія да Эўропы"** перакладзенае зь нязначным скаротам.

Гэтую вялікую кнігу[1] мы чакалі ўжо так даўно, што амаль перасталі верыць у яе зьяўленьне. Ідэя напісаць яе прыйшла да Марціна Малі яшчэ ў 1962 годзе, пасьля чаго ён нават стварыў першую вэрсію кнігі. Гадоў 25 выдаўцы абяцалі будучым рэцэнзэнтам: "Рыхтуйцеся, за пару дзён кніга зьявіцца", — і тыя мачалі пёры ў атрамант. І ўвесь гэты час пра кнігу ні чуткі. Разам з параю шчасьліўцаў у гадох гэтак у семдзясятых я прысутнічаў на лекцыях Малі ў Калеж дэ Франс і *École des Hautes Études*. Ён прыходзіў з аркушыкам канспэкту — ну во хіба такога памеру, як візытоўка, і прамаўляў дзьве гадзіны безь пярэдыху. Надзвычайнае інтэлектуальнае відовішча! Калі хтосьці тчэ перад намі нітку гістарычных разваг аў, нармальная рэакцыя — пошук такога аргумэнту, які супярэчыў бы тэорыі й абвяргаў яе. У выпадку з Малем знайсьці такі аргумэнт не

1. **Martin Malia.** ***Russia under Western Eyes. From the Bronze***

ўдавалася, бо яго інтэлектуальныя канструкцыі былі такія закончаныя, тэорыя настолькі дасканалая й салідная, што любы аргумэнт супраць яе ня толькі знаходзіў у ёй месца, але й падмацоўваў саліднасьць усяе пабудовы.
Чаму, аднак, Маля так доўга длякаў з публікацыяй сваёй кнігі? Ці не шкада, што кніга не зьявілася тады, даўно ўжо, дзякуючы таму, што ён меў шмат часу на абмеркаваньне сваіх ідэяў падчас заняткаў з студэнтамі й на іх дапрацоўку разам з калегамі, кніга Малі сталася прадуктам канчатковых дыстыляцыі, плёнам усяго жыцьця гісторыка. Урэшце, яе яшчэ палепшыла тое, што аўтар меў шчасьце ўбачыць заканчэньне гісторыі й найзвычайнейшае завяршэньне аповесьці, то бок канец камунізму, ці, іначай кажучы, — вяртаньне Расіі ў агульную гісторыю чалавецтва.
Дазволю сабе пэўны водступ ад тэмы. Не бракуе дасьледчыкаў, якія хваляцца, што “прадбачылі крах камунізму”. Быў сярод іх адзін выдатны чалавек, палкоўнік, які цягам дваццацёх гадоў рэгулярна казаў, што заняпад гэты наступіць ужо пад канец бягучага году. Урэшце ягонае прадказаньне споўнілася, аднак, наколькі я ведаю, ніводзін сур’ёзны гісторык не спрабаваў браць зь яго прыклад; з факту, што пэўныя рэчы не павінны былі б існаваць, не вынікае, што гэтыя самыя рэчы не праіснуюць яшчэ бясконца доўга. Камуністычны рэжым — гэта ўтопія, якая адшуквала ўнутраныя рэзэрвы для бясконца доўгага існаваньня.

Рэчаіснасьці цяжка абвергнуць нерэчаіснасьць, таксама як лёгіцы няпроста зразумець абсурд. Тыя, хто сачыў за СССР, ясна бачылі, што там усё гніе, але працэс гніцьця можа ісьці вельмі марудна. Усё магло гнісьці яшчэ даўжэй і прагнісьці яшчэ больш. Гэтая заўвага таксама датычыць апошняга чыста камуністычнага рэжыму, то бок Паўночнай Карэі. Я гатовы пабіцца аб заклад, што рэжым гэты будзе зрынуты. Не скажу калі, бо акалічнасьці, якія падтрымліваюць яго на плаву, здольныя пратрымацца яшчэ доўга, і ніводзін сур’ёзны гісторык ня ў стане акрэсьліць, якія зь іх і як хутка зьнікнуць.
Камуністычны рэжым мог і мусіў упасьці й пасьля сьмерці Леніна, і пасьля гітлераўскага нападу, і пасьля сьмерці Сталіна. Ён мог бы — з блаславеньня Захаду — праіснаваць яшчэ шмат гадоў пасьля сьмерці Брэжнева. Аднак так ня здарылася, і

Horseman to the Lenin Mausoleum. **Cambridge—London: Belknap Press of Harvard University Press, 1999.**

гісторыкі могуць сказаць, чаму. Аднак, сказаць гэта яны могуць толькі *post factum*, іначай яны перастануць быць гісторыкамі. Абставіны склаліся так, што Марцін Маля змог давесьці сваё гістарычнае апавяданьне ажно да даты, надзвычай значнай як для Расіі, так і для сьвету: да 1991 году. Ён змог таксама надаць гэтаму апавяданьню клясычную форму: *decline and fall*. Яму пашанцавала: гісторыя пацьвердзіла самаразбуральную лёгіку камуністычнага рэжыму.

Аднак у задуме кнігі камуністычны эпізод не займае цэнтральнага месца. Наадварот, у шматвекавой гісторыі Расіі ён акрэсьлены як асобны выпадак, які падлягае тлумачэньню. Галоўны матыў кнігі Малі — гэта крытычны агляд розных канцэпцыяў, паглядаў і праекцыяў заходняга чалавека на краіну, якая зрабіла крок у гісторыю адно ў XVIII стагодзьдзі. На расійскую гістарычную рэчаіснасьць мы паглядаем звонку. Але, паколькі вышэйзгаданыя канцэпцыі зьвязаныя з гісторыяй Заходняй Эўропы (яны там паўсталі), крытычны аналіз Малі датычыць ня толькі гісторыі Расіі, але й усяго заходняга сьвету. Амбіцыі аўтара шырэюць, як рака, якую шматлікія прытокі робяць усё больш паўнаводнай. Нешматслоўны на пачатку кнігі гісторык пераходзіць пасьля да развагаў над сучаснай гісторыяй усяго сьвету. Дакладна такім чынам разьвівалася й інтэлектуальная кар'ера Малі. Ён пачаў як спэцыяліст у вузкай галіне, але потым, перастаўшы быць толькі выкладчыкам, зьвярнуўся да *сусьветнай* гісторыі. Марцін Маля адважыўся пайсьці сваім шляхам і падараваў нам адну з самых незвычайных кніг, якія толькі былі напісаныя. Прыкладам для яго (хоць ён гэтага нідзе ня піша) стаўся Таквіль. Маля знайшоў той самы спакойны тон, чысты й немудрагелісты стыль, дабіўся выключнай яснасьці высноваў. Ён дасягнуў таксама такой насычанасьці тэксту, што кожную старонку ягонай кнігі чытаеш паволі: кожная старонка ўяўляе сабой выклік розуму чытача й прымушае разважаць.

Разгорнем жа кнігу й прасочым яе аргумэнты.

Асноўны тэзыс гучыць так: не існуе нічога, што можна назваць існасьцю Расіі, альбо, як кажуць, "Вечнай Русьсю". Нельга гаварыць таксама пра канчальны й анталягічны саюз Расіі з Захадам альбо Расіі з Эўропай. Цягам трох стагодзьдзяў Расія шмат разоў зьмяняла сваё аблічча. Не існуе таксама стабільнай цэласьці, якая была б Эўропаю альбо Захадам. Захад таксама

мае шмат вымераў, ягоны пагляд на Расію неаднародны. Адзін і той самы край — Расія — у адну й тую самую хвіліну выклікае розныя рэакцыі ў Англіі, Нямеччыне альбо Польшчы. Дзякуючы гэтаму тэзысу магчымая глябальная ацэнка камуністычнага эпізоду. Ці варта яго інтэрпрэтаваць як чарговае ўвасабленьне “Вечнай Расіі”, ці — як прапануе Маля — як выпадак, які выбіў Расію зь сядла й пагнаў яе на нядобры шлях? Зразумела, што тут Маля палемізуе са сваім адвечным інтэлектуальным працiўнікам, таксама вядомым знаўцам гісторыі Расіі, Рычардам Пайпсам, які, на думку Малі, падкрэсьліваючы значэньне нацыянальна-гістарычнай пераемнасьці, недаацэньвае дэструкцыйную ролю камуністычнай ідэалёгіі.
Да пытаньня гісторыі Расіі трэба падысьці гістарычна, то бок згодна з храналёгіяй. Падзел на чатыры вялікія пэрыяды спрэчак не выклікае: ад Пятра Вялікага да Венскага кангрэсу; ад 1815 году да вялікіх рэформаў Аляксандра II; ад 1856 году да кастрычніцкага путчу; ад 1917 году да заняпаду камунізму ў 1991 годзе. Шматаблічнай Эўропе Расія кожнага разу паказвала іншы твар.

Гром над Палтавай

Гром над Палтавай абвесьціў, што Расія зьявілася на эўрапейскай сцэне. Падкрэсьлім, што прыблізна ў гэты час у Эўропе паўсюль пачынаецца выцясьненьне панятку хрысьціянства, які выходзіць з ужытку й зьнікае з трактатаў. Пасьля няўдалай спробы ўсталяваньня французскай гегемоніі паўстае новая міжнародная структура — сучасны ансамбль эўрапейскіх народаў, які праіснуе аж да першай сусьветнай вайны. У гэты час Расія — на роўных з Францыяй, Англіяй альбо Аўстрыяй — робіцца адным з бацькоў-заснавальнікаў новага парадку, прычым займае ў ім месца больш значнае, чым Гішпанія ці Галяндыя. Чаму гэты край, які цешыўся ліхой славаю й быў дасьледаваны горш за Асманскую імпэрыю, край, пра поўнае барбарства якога апавядалі глыбока ўражаныя падарожнікі XVII стагодзьдзя, — чаму гэты край так хутка быў прызнаны эўрапейскімі супэрдзяржавамі? Па-першае, таму, што прынамсі тры з гэтых супэрдзяржаваў ня бачылі ніякай пагрозы ва ўзмацненьні Расіі, дзякуючы якому самі маглі з чыстым

сумленьнем ажыцьцяўляць анэксіі. Калі Расія “сама разьбіралася са сваімі праблемамі”, дык і Прусія, Аўстрыя й Англія таксама лічылі сябе ў праве вырашаць свае задачы. Прайграла толькі Францыя, якой заставалася адно сачыць за аслабленьнем яе традыцыйных хаўрусьніц — Польшчы й Швэцыі.

Па-другое, Расія пачала з запалам будаваць блізкі цывілізаванай Эўропе *ancien régime*. Расія Івана Жахлівага была вайсковай аўтакратыяй з выразна татарскім абліччам, у якой манарху падпарадкоўвалася ўсё грамадзтва. Пётра Вялікі зацугляў грамадзтва яшчэ мацней і эфэктыўней, толькі зрабіў гэта ўжо на эўрапейскі капыл. Каб утрымліваць дзьвюхсоттысячнае рэгулярнае войска (большае за французскае), ён мусіў рацыянальным чынам упарадкаваць бюракратыю й гаспадарку. Ён таксама мусіў узмацніць прыгон. Гэтая сыстэма ня мела аналягаў у Эўропе, але гэтая сыстэма нагадвала Эўропе вядомыя ёй прататыпы. Швэцыя ды Прусія дзейнічалі падобным чынам, толькі слабіню патэнцыялу кампэнсавалі мабілізацыяй усіх даступных сродкаў. Суворасьць расійскага *ancien régime* тлумачыцца папросту *спазьненьнем у разьвіцьці*. У гэтым месцы Маля ўводзіць аснову свайго паняткавага інструмэнтару, а менавіта паняцце *градыенту* — крывой, якая паступова апускаецца з захаду на ўсход. Найвышэйшую (“найсучасьнейшую”) ступень займаюць Англія й Францыя, на ступень ніжэй стаяць германскія краіны, пасьля ідуць Польшча й Вугоршчына, нарэшце, апошнюю ступень на гэтай крывой займае Расія. Гэтыя “сходы” — эўрапейскія, і Расія з сваёй прыступкі рушыць за эўрапейскім прыкладам, які, бясспрэчна, адрозьніваецца ад турэцкай, пэрсідзкай ці кітайскай мадэлі. Паколькі Кацярына здолела прышчапіць 100 тысячам сем’яў звычаі і манеры эўрапейскай арыстакратыі і адзець іх у эўрапейскія строі, а Эўропа кантактавала выключна з гэтымі людзьмі (дыпляматамі й афіцэрамі), дык старая расійская арыстакратыя стала разглядацца як тыповая праява *ancien régime*.

Аднак жа частка Эўропы — асьвечанай Эўропы — пайшла далей: маўляў, Расія ня толькі “падобная” да нас, але й нашмат “лепшая” за нас. Гэткія думкі можна знайсьці ў “Гісторыі Карла VII”, дзе Вальтэр параўноўвае пыхлівага й марнатраўнага заваёўніка з заканадаўцам, які накладае на грамадзтва

намызнік “паліцыі”, каб загнаць яго ў “цывілізацыю”. Кацярына ўмацоўвае Акадэмію й Універсытэт, наймаючы на працу немцаў: яны “таньнейшыя”, дый іх больш за французаў; французы ж, у сваю чаргу, навучаюць у школах, арганізаваных Фрыдрыхам II. Хвалу Паўночнай Сэмірамідзе пяюць Дыдро, д’Алямбэр і нават мудры Блэкстоўн, які прыняў заканадаўчыя ініцыятывы Кацярыны ўсур’ёз. Гэтую экзальтацыю можна растлумачыць ня столькі знаёмствам з Расіяй, колькі пратэстам супраць нерацыянальных рашэньняў, якія прымаліся *ancien régime’*амі Захаду. Гэтак Расія ўпершыню (другі раз наступіць пасьля 1917 году) была ўспрынятая як ідэал гармоніі ўлады й розуму. Кацярына добра ведае, як падтрымаць гэты энтузіязм. Рыхтуючыся да заваяваньня Польшчы, яна атакуе тамтэйшы каталіцызм і падбухторвае супраць яго праваслаўных і пратэстантаў, яна дбае пра тое, каб яе пачынаньні трактаваліся як абарона свабоды сумленьня. Французскія асьветнікі ахвотна так іх і трактуюць. Адзін Русо пратэстуе. Так зьмяняецца клімат. Для філёзафаў-асьветнікаў адзіны шлях да ўсталяваньня ўлады розуму — гэта асьвечаны манарх (альбо дэспат). Тым часам Польшча роспачна спрабуе рэфармаваць шляхецкую анархію ў нейкае падабенства сучаснай рэспублікі. Усходняя вэрсія якабінства выклікае жах на Захадзе. Гэта тым больш схіляе яго да Расіі. Старыя рэжымы салідарызуюцца ў злачынстве падзелаў. Кацярына канчае сваё цараваньне контрарэвалюцыйнай “рэакцыяй”. Досыць было, аднак, заняць трон Аляксандру, і ўжо Эўропа зноў уздыхае, закаханая ў найвыбітнейшага прадстаўніка чалавецтва. Ах, ён ваюе з тыранам Банапартам, ах, ён падараваў Польшчы Канстытуцыю!.. Ім зачараваны Бэнтам, ягоны бюст трымае ў сябе на стале Джэфэрсан, а мадам дэ Сталь едзе ў Расію падыхаць “паветрам свабоды”.

Усходняя дэспатыя

Другі пэрыяд пачынаецца ў 1815 годзе. Усяго за пару год статус Расіі мяняецца. Яе перастаюць называць “асьвечанай дэспатыяй”, цяпер гэта “ўсходняя дэспатыя”. Захад усьведамляе, што пад кантролем Расіі знаходзіцца саракамільённае насельніцтва, і гэта робіць з Расіі першую кантынэнтальную супэрдзяржаву сьвету. У адказ Расія, якая

падчас венскага перадзелу імкнулася выглядаць меншаю, чым была насамрэч, дэкляравала, што яе ўсходняя мяжа праходзіць па Ўрале, тым самым павышаючы сваю стаўку на перамовах. Такім штучным чынам нарадзілася так званая “Эўрапейская Расія” — першага разу як адзін з бакоў у міжнародным трактаце. Англію, Францыю й Аўстрыю ахоплівае дружны непакой. Але вобраз Расіі зьмяняецца яшчэ мацней, калі яна, дыскрэдытуючы Старыя Рэжымы, пнецца навязваць ім уласную волю. Сьвет, які сумняваўся ў справядлівасьці расійскага дзяржаўнага ладу, раптам спасьцігае таксама, што Расія належыць да іншай цывілізацыі. Канчатковая пераацэнка вартасьцяў адбываецца дзякуючы трыюмфу лібэральных ідэяў, рэвалюцыі 1830 году, зьяўленьню *Reform Bill*. Адначасова, рэагуючы на жорсткае прыдушэньне польскага паўстаньня 1830 году, Кюстын, Мішле, Уркхарт і Маркс малююць Расію ў выключна чорных танах. У гэты час Гізо фармулюе сваю ідэю аб гісторыі як працэсе, што праз фармаваньне сярэдняй клясы вядзе да ажыцьцяўленьня канстытуцыйных свабод. Гэты працэс называецца ні больш, ні менш як цывілізацыяй. Гэта значыць, што Расіі гэты працэс не закрануў. Выбітны расійскі розум Пётра Чаадаеў пацьвердзіў дыягназ.

Аднак жа лібэральнае гледзішча на Расію не было адзіным. У рамантычнай Нямеччыне, гэтай вялікай лябараторыі думкі, выпрацоўваецца складанейшы панятак *Sonderweg* — “асаблівага шляху”, — панятак тым гучнейшы, што, спускаючыся па сходах долу, ён трапляе ўрэшце ў Расію. У гэтым панятку цывілізацыя супрацьпастаўляецца культуры, то бок таму, што апісвае неабсяжную імпэрыю духу. Пры гэтым Маля — як і сьлед выдатнаму прафэсару — з рэдкім майстэрствам сынтэзу дабіраецца да чарговых сэмантычных пластоў словаў “культура” й “рамантызм”, якія няспынна ўзбагачаліся новымі сэнсамі — ад Гердэра да Канта, ад Канта да Гегеля й урэшце Маркса. У разуменьні Малі, рамантызм да 1848 году — мешаніна схільнага да гнастыцызму розуму, новага прачытаньня гісторыі й фаўстаўскага бунту. У такім выглядзе ён суадносіцца з палітычнай актыўнасьцю Асьветнікаў. Гістарычны канон Гізо ўскладняецца. Цывілізацыя — ці Эўропа — складаецца з паяднаньня хрысьціянскай, рымскай і германскай спадчыны. Вось Эўропы вандруе: яна ўжо не абмяжоўваецца выключна Францыяй і Англіяй, а ахоплівае ўсю

Сьвятарную рымска-германскую імпэрыю. Сутнасьць эўрапейскасьці паўстала з унікальнага гістарычнага досьведу. Ці належыць, такім чынам, Расія да Эўропы? Гляньма на сьпіс атрыбутаў: сярэднявечны Касьцёл і Імпэрыя? На Расію яны не распаўсюджваліся. Фэўдалізм і рыцарства? Таксама не. Рэнэсанс і Рэфармацыя? Не. Што й трэ было давесьці: Расія — не Эўропа. Хто быў "за" Расію ў той час? Зь відавочных прычынаў, пэрсанал прускіх і аўстрыяцкіх дыпляматычных місій, жменька крайніх кансэрватараў, шчасьлівых, што адкрылі краіну, не кранутую Асьветніцтвам, а таксама купка "славянскіх" нацыяналістаў, якія з боязі перад нямецкім націскам зьвяртаюцца да Расіі. Як "дзьвюх сясьцёр" апісваў некалі Міцкевіч Польшчу й Расію.

Мікалай I уладарыць з упэўненасьцю, што ён — эўрапейскі ўладар. Эўропа, якую ён ведае, — гэта Эўропа ягонай бабкі. Гэта ня ён здрадзіў Эўропе, а ветраная Эўропа здрадзіла яму. Калі мерыць былымі катэгорыямі, Расія Мікалая I мяняецца з "паліцэйскай" дзяржавы ў "цывілізаваную". Праводзіцца "грамадзянская рэвалюцыя", дзякуючы якой канчаткова фармуецца расійская мова, у будучыні мова вялікай літаратуры. Уласна кажучы, гэтая вялікая літаратура, наскрозь эўрапейская й сучасная паводле духу, станецца пажыўным асяродзьдзем для скептычна настроенай інтэлігенцыі, якая таксама нараджалася якраз у той час. Крызыс *ancien régime'*у ў Расіі праходзіць у найгоршых умовах. Зьмены, якія адбываюцца ў Эўропе, агаляюць агульнае спазьненьне Расіі, а даганяць у гэтай сытуацыі значна цяжэй, чым за часоў Пятра Вялікага, бо цяпер адставаньне датычыць ня толькі дзяржаўнага ладу, але й усяго грамадзтва на ўсіх узроўнях яго функцыянаваньня. Тым часам "грамадзтва" гэтага нават не існуе, бо не існуе, так бы мовіць, грамадзянскай супольнасьці. Большая частка людзей знаходзіцца пад прыгонам, ці, дакладней кажучы, у рабстве. І тады бясьсільная інтэлігенцыя прыходзіць да думкі, што спазьненьне Расіі — гэта, на самой справе, яе перавага, бо структурна яна лепш падрыхтаваная да будучай (сацыялістычнай) Эўропы. Герцэн знаходзіць у гегельянцаў "альгебру рэвалюцыі"; Бакунін вынаходзіць формулу, якая прыцягвае бальшавікоў: "Дух разбурэньня — гэта таксама дух стварэньня".

Пасьля 1848 году Расія ўсё яшчэ абурае Эўропу. Маля гатовы

бачыць у Крымскай вайне штосьці падобнае да ідэалягічнай агрэсіі, якую зьдзіўлены Мікалай ня ў стане зразумець. Ягоная параза дае пачатак трэцяму акту: Расія як краіна, падобная да іншых.

Такая самая краіна, як усе іншыя

У Расіі няма выбару. Калі яна жадае існаваць, дык павінна правесьці рэформы. У 60-х гадох Аляксандар II арганізуе другую "рэвалюцыю зьверху". Ліквідуецца прыгон, паўстаюць новыя судовыя інстытуты, уводзіцца ўсеагульная вайсковая павіннасьць. Гэтыя зьмены — дакладнае паўтарэньне рэформаў у Прусіі напалеонаўскіх часоў. Толькі праз паўстагодзьдзя. Яшчэ раз пацьвярджаецца вывад Таквіля пра небясьпекі рэфармаваньня аўтарытарнага рэжыму. Левае крыло грамадзтва выступае за рэвалюцыю, а гэта прыводзіць да таго, што рэформа — нават памяркоўная — не прыжываецца, як гэтага хацелася б, на яе шляху ўстаюць перашкоды, пра якія казаў Таквіль. Аднак паволі, лепш, горш, але яе праводзяць у жыцьцё. За Аляксандра III, нягледзячы на адсутнасьць канстытуцыйнае базы, узрастае ўзровень масавай адукацыі, пачынае разьвівацца гаспадарка. Эўропа прызвычваецца да думкі, што Расія — гэта атожылак яе ўласнай цывілізацыі й патэнцыйны рынак збыту. Банкі пачынаюць масава інвэставаць у Расію.

У Эўропе тым часам адбываюцца чарговыя зьмены. Яна раскалваецца на дзьве своеасаблівыя часткі: франка-ангельскую, у якой даўно прыжыўся прынцып выбарнасьці ўлады, і сярэднеэўрапейскую — Аўстрыю й Нямецкую імпэрыю. Бісмарк — гэта русафіл, які зрабіў свае высновы зь лібэральна-кансэрватыўных новаўвядзеньняў Напалеона III, такіх, як усеагульнае выбарчае права, падтрымка нацыяналізму альбо разьвіцьцё сыстэмы сацыяльнага забесьпячэньня. Карыстаючыся расійскім і французскім досьведам, ён стварае грамадзкі лад, які Маля называе "ўзаконеным банапартызмам". Дзьве Эўропы па-рознаму ўспрымаюць Расію. Для лібэральнай Эўропы Расія — адно прадмет вывучэньня. Уолес у Англіі, Лёруа-Бальё й Рамбо ў Францыі апісваюць яе спакойна, падрабязна, выкарыстоўваючы першакрыніцы, адным словам — "аб'ектыўна". Калі хочаце маю асабістую думку, дык я дзіўлюся

ў першую чаргу Лёруа-Бальё, які жадаў быць для французаў Тэнам і Таквілем у адной асобе. Аднак нельга забывацца, што пісаў ён у эпоху французска-нямецкага замірэньня й ягоная кніга вызначала інтэлектуальны клімат гэтага замірэньня. Чытаючы яго ўважліва, мы заўважаем, што, нягледзячы на гладкасьць фармулёвак, вялікіх спадзяваньняў за ягонымі словамі не адчуваецца. Сярэдняя Эўропа, у сваю чаргу, ставіцца да Расіі дваіста: з аднаго боку, яна ня зносіць расійскага самадзяржаўя, з другога, успрымае гэтую краіну як месца, у якім некалі разгарыцца зара альбо, прынамсі, вялікі пажар. З эсхаталёгіяй расійскага папулізму часткова пагаджаецца сам Маркс. Па меры таго, як нацыяналістычны імпэт заражае ўсю Эўропу, на Расію пачынаюць глядзець як на яшчэ адну "нацыю" на кантынэнце, што дзеліцца на блёкі й хаўрусы. Эўрапейскі сьвятарны саюз народаў дажывае апошнія дні.
У эпоху *fin de siécle* Расія ўсяляк вызначаецца ў галіне культуры. Узьнікае, гаворачы сучаснай мовай, "культурная супэрдзяржава" сусьветнага ўзроўню. Вялікія пісьменьнікі, музыка, балет і жывапіс ня толькі наганяюць эўрапейскія, але ўпершыню пачынаюць уплываць на заходнюю культуру. Эўрапейскі *gradient* зазнае рэдукцыю: уплывы ідуць у розныя бакі. Пачынаецца *belle epoque* "расійскай душы" й таго "духоўнага пачатку", якога шукала ў Расіі перасычаная сваім рацыяналізмам і пазытывізмам Эўропа. Гэта гучным рэхам адгукнулася ў Нямеччыне, бо ж расійскі *особенный путь* гучаў ва ўнісон зь нямецкім *Sonderweg*. Рыльке мроіцца "чалавек-анёл", а Ніцшэ рашуча хваліць Расію й крытыкуе "ангельскія ідэі" ды амэрыканскае гандлярства. Мёлер ван дэр Брук сягае ў сваім русафільстве кропкі, ад якой пазьней, разьвіваючы ягоную думку, будуць адштурхоўвацца некаторыя з тэарэтыкаў нацызму. З духу ірацыяналізму й антымадэрнізму паўстае Інтэрнацыянал. Тут Маля мог бы больш увагі зьвярнуць на ідэалягічныя "выбрыкі" правіцы, якая бунтавала расійскі народ наконадні першай сусьветнай вайны. Яе пагроза была настолькі страшнаю, што я нават цешуся, што ўрэшце перамаглі бальшавікі, а не яна. Калі б першая сусьветная вайна скончылася трыюмфам Расіі і яна запанавала над паловай Эўропы, усёй Польшчай, Балканамі й Канстантынопалем, як гэта абяцалі ёй хаўрусьнікі, мы, можа, мелі б справу з сумесьсю нігілізму, разьдзьмутага нацыяналізму, расізму й

антысэмітызму, якую явіла сьвету нацысцкая Нямеччына, толькі ў кантынэнтальным маштабе — нашмат больш грандыёзнай і да таго ж з рэлігійным грунтам пад сабой. Уразіўшы падзеленую на дзіўныя кааліцыі Эўропу, пачынаецца вайна. З ідэалягічнымі й палітычнымі крытэрамі перастаюць лічыцца, хаўрус усходніх і заходніх ускраінаў Эўропы мае прычынай адно клопат пра бясьпеку й захаваньне ўлады. Вайна цягне за сабою падзеньне апошніх *ancien régime'*аў: яны ўжо ня ў стане змагацца з бурным выбухам дзікай дэмакратыі, што адбываецца ва ўмовах усеагульнае мабілізацыі мужчынскае часткі насельніцтва і стварэньня добраахвотніцкіх войскаў. Крохкая канструкцыя нядоўга вытрымлівае такі напор. На спустошаную палітычную сцэну Расіі вырываецца ідэалягічная сэкта, якую называюць партыяй бальшавікоў.

У люстры камунізму?

Нарэшце, чацьверты пэрыяд: Расія ў люстры камунізму. Я пастараюся быць тут сьціслым, бо гэта пэрыяд, найвядомейшы з усіх, а пазыцыі аўтара не такія ўжо арыгінальныя й бясспрэчныя. Маля пачынае гэтую частку доўгім выкладам аб прыродзе сацыялізму. Сацыялізм нараджаецца ў XIX стагодзьдзі з шэрагу адмаўленьняў: зь непрыманьня дэмакратыі й індустрыялізацыі. Ён разьвіваецца ў шматлікіх напрамках, але заўсёды як утопія: утопія дэмакратыі, якая адмаўляецца ад дэмакратыі, утопія прамысловай сыстэмы, якая адмаўляецца ад прамысловай сыстэмы, што існавала раней. Геній Маркса праявіўся ў тым, што адвечную эсхаталёгію ён прыбраў у шаты пазытывісцкай навуковай тэорыі. Маля пастулюе тэзу, што ў творах Маркса можна напраўду знайсьці ўсё тое, што ў іх вычыталі пасьлядоўнікі: інтэрпрэтацыі нямецкіх сацыял-дэмакратаў, інтэрпрэтацыі Каўцкага і Бэрнштайна ў роўнай ступені маюць права на існаваньне, мае права на існаваньне й ленінская інтэрпрэтацыя марксізму. Таталітарная партыя, тэорыятворчая роля інтэлігенцыі, рэвалюцыйны патэнцыял сялянства — усё гэтае можна знайсьці ў "Камуністычным Маніфэсьце" 1848 году. Таму немагчыма сьцьвярджаць, — кажа Маля, — што ленінізм ёсьць праяваю неэўрапейскай сутнасьці Расіі: ленінізм эўрапейскі родам. Не існуе "праўдзівага сацыялізму": ён

асуджаны на ўтапічнасьць, нават калі застаецца пры ўладзе. Існуе адно *прывід, які блукае па сьвеце*.
З тае пары ў Эўропе перастае функцыянаваць адзіны агульны вобраз Расіі. У залежнасьці ад акалічнасьцяў і ідэалягічнай прыналежнасьці, Расія для адных стала носьбітам усялякіх надзеяў, а для другіх — усялякіх пагрозаў. Што там адбываецца? Увасабляецца ў жыцьцё лёгіка Леніна-Сталіна. Сталін даводзіць да канца справу пабудовы ня столькі сацыялізму (што гэта такое, ніхто як ня ведаў, так і ня ведае), колькі “анты-капіталізму”. Эўропа — альбо, хутчэй, тыя бакі, што дужаюцца за права называцца Эўропай, — захапляецца Расіяй альбо абураецца ёй, у залежнасьці ад сваіх ідэалягічных прэфэрэнцый. Узмацненьне нацысцкіх уплываў ускладняе гэты стан рэчаў, бо грамадзкая думка цяпер мусіць выбіраць, якая з сыстэмаў горшая. Хаўрус нацызму й камунізму — нібы хаўрус сіямскіх блізьнятаў. Маля сьцьвярджае, што абедзьве сыстэмы ёсьць атожылкамі дэмакратыі, альбо, хутчэй, блізьнюкамі-дыяскурамі, што вырасьлі зь яйка французскай рэвалюцыі, то бок з нацыяналізму й сацыялізму. Вялізныя нацыянальныя войскі, створаныя падчас першай сусьветнай вайны, твораць ядро гіпэртрафаванай дэмакратыі, зь якой разьвіваюцца, з аднаго боку, крайні нацыяналізм і нацызм, з другога ж — сацыялізм і бальшавізм. Маля вядзе нас лябірынтам ня вельмі суладных між сабою тэарэмаў, якія нібыта тлумачаць новыя, пасьля прагрэсізму, нацыянал-бальшавізму альбо трацкізму, падзелы. Калі ацалелыя заходнія дэмакратыі ня могуць выбраць, які ж з ворагаў галоўны, Сталін падпісвае пакт з Гітлерам. Адбываецца вайна, нібыта замірэньне, падзел Эўропы, сапраўдная халодная вайна, нібыта разрадка, камуністычная сыстэма вычэрпвае свой патэнцыял і канчаткова занепадае… Мы ня маем магчымасьці падрабязна пераказаць зьмест гэтых бязьмерна цікавых і глыбокіх разьдзелаў. Бо яны аддаляюць нас ад галоўнай тэмы твору — хаўрусу Расіі й Эўропы, ператвараючыся ў доўгія развагі на тэму сучаснай сусьветнай гісторыі, поўныя, зрэшты, цікавых назіраньняў і арыгінальных высноваў. Маля гэтым разам пастулюе тэзу, што 60 зь нечым гадоў камунізму — гэта зьява з агульнаэўрапейскімі каранямі й адно празь зьбег акалічнасьцяў яна мела месца менавіта ў Расіі. А сёньня ад камунізму быццам бы засталіся толькі згадкі. Улада хлусьні ўпала, і камунізму

знаку не засталося. Расія ж засталася, толькі зьбяднелая матэрыяльна, інтэлектуальна й духоўна. Эўрапейскі *gradient* вярнуўся да свайго ранейшага палажэньня, адно яго крывая стала больш рэзка нахіленаю. Расія ж, калі яна хоча існаваць, ня мае іншага выбару, чым той, перад якім стаялі Пётра Вялікі й Аляксандар II: узмацненьне сувязяў з Захадам. Расійскі імпэрыялізм, які сваёй прыродаю збольшага не адрозьніваўся ад імпэрыялізму ангельскага ці французскага й ня быў агрэсіўнейшым за іх, будзе слабець такім самым чынам, як заходні, адно што пазьней, зь пяцідзесяцігадовым спазьненьнем — такім характэрным для Расіі ў параўнаньні з Эўропай. Што ж да "прывіду" сацыялізму ці камунізму, дык здаецца, што ён сьмяротна паранены, аднак няма пэўнасьці, што недзе ў іншым месцы ня будзе чарговага разу высунуты лёзунг "вялікага адмаўленьня", а "здані" нейкай новай рацыяналістычнай містыкі не закарціць яшчэ раз пакласьці канец сучаснаму сьвету, таму самаму сьвету, які гэтую здань усё яшчэ корміць уласнай цыцкай.

У іншым месцы?

Як я сказаў, кожная бачына кнігі Малі старанна прадуманая й правакуе роздум. Мы ня будзем тут дыскутаваць з доўгімі высновамі на тэмы рамантызму, сацыялізму альбо расійскай замежнай палітыкі. Засяродзімся на прынцыповай тэме, то бок на тым, якім чынам ацэньваюць альбо мусяць ацэньваць Расію. Меркаваньні Марціна Малі мяне пераконваюць цалкам. Мае заўвагі датычаць адно фактаў, якіх ён не захацеў узяць пад увагу, тых рэчаў, якія ён абмінуў. Яны не разбураюць ягонай тэорыі, а паглыбляюць яе. Вось жа, трэба цалкам пагадзіцца з Малем, што не існуе чагосьці такога, як адзіная і таямнічая "расійская душа". Трэба ці то быць расістам, ці то верыць у адмысловую волю нябёсаў (абодва падобныя падыходы, зрэшты, былі надзвычай папулярнымі), каб адмовіцца ад дасьледаваньня расійскай гісторыі з дапамогаю інструмэнтару, даступнага кампаратывістыцы. Дарэчы, заўважым, што шэраг спрэчных праекцыяў, якія датычаць Расіі, нагадвае тыя, што рабіліся ў той самы час адносна Кітаю. Мы мелі Кітай асьвечаны ў часах Вальтэра, Кітай, што выклікаў непакой падчас опіюмных войнаў, Кітай — "краіну, як усякая іншая" ў

эпоху вялікіх сынолягаў канца XIX стагодзьдзя, і нават Кітай, што быў крыніцаю натхненьня для вялікага мастацтва й літаратуры (Клядэль, Сэгален ды іншыя). Быў, нарэшце, Кітай XX ст., што выклікаў то надзеі, то страх. Гэтыя зьмены й супадзеньні ў паглядах прыцягваюць нашую ўвагу тым больш, што ў XVIII і XIX стагодзьдзях Кітай не зьмяняўся так, як Расія. Усё гэтае пацьвярджае, што згаданыя праекцыі залежалі больш ад рытму пераменаў у Эўропе, чым у Расіі альбо ў Кітаі.
Гэта таксама аргумэнт на карысьць думкі пра гістарычную пераемнасьць расійскіх рэжымаў. Маля не прымае таго, што мог бы назваць “польскаю інтэрпрэтацыяй” Расіі. Але факту, што такія бясспрэчна эўрапейскія народы, як палякі, балты й вугорцы, маюць досьвед расійскага панаваньня, нельга недаацэньваць. Гэтыя народы сьведчаць нам, што на ўласнай скуры адчулі нешта настолькі спэцыфічнае, чаго нельга пераказаць у простых словах менавіта таму, што мы эўрапейцы й “ня ў стане гэтага зразумець”. Досыць пачытаць Густава Герлінга-Грудзіньскага (“Іншы сьвет”), Чэслава Мілаша й Юзафа Чапскага. Яны ня цалкам вольныя ад ідэалёгіі, але істотнае іншае: яны ня маюць нянавісьці да Расіі, якую ведаюць, і часта выказваюць ёй сваю сымпатыю. Але каб во гэтак, адразу ўлучаць Расію ў Эўропу? Яны б бязьмежна зьдзівіліся. Цікава, што Марцін Маля назваў свой *opus magnum* назовам слыннага раману Джозафа Конрада: *Under Western Eyes*. Мэтаю Конрада было адрэагаваць на “моду на Расію”, якая нарадзілася з чытаньня расійскіх раманаў. Конрад выварочвае Дастаеўскага, нібы пальчатку. Ён хоча дакрануцца рукою да чагосьці спэцыфічна чужога й фатальнага, таго, што прымушае кожнага паляка казаць: калі мы ў Расіі, мы ў зусім “іншым сьвеце”.

Спазьненьне

Аднак застанемся гісторыкамі. Ключавы панятак інтэрпрэтацыі Малі, як мы бачылі, — гэта панятак спазьненьня. Маля ў акрэсьліць шэраг крытэраў, якімі вымяраецца гэта спазьненьне. Маля занадта добры гісторык, каб **[illegible]**, што гэты шэраг вялікі. Яго высновы, аднак, датычаць **[illegible]** разьвіцьця думкі й грамадзкіх інстытутаў. Калі б **[illegible]** расійцам, яго б залічылі да так званай “дзяржаўнай [illegible]

[2] Я разглядаў гэтае інтэрпрэтацыі Малі ў артыкуле “La Russie et la Révolution” у “Contumentaire”, № 46, 1989.

гістарычнай школы, калі б ён быў немцам, ён упісаўся б у напрамак *Geistesgeschichte*. Зьвяртаючы ўвагу перадусім на дзяржаву (адміністрацыю, кадры, інстытуты й г. д.), а таксама на пісьменьнікаў, ён падкрэсьлівае тэзу аб прынцыповай прыналежнасьці Расіі да Эўропы з дапамогаю архаізму больш чым паўвекавой даўніны. Ці не падганяе ён тут рэчаіснасьць пад сваю ўласную канцэпцыю? Ад XVII да XIX стагодзьдзя ўсе цары (улучна зь Мікалаем I і нават Аляксандрам III) былі рэфарматарамі. Адносна лёгка можна рацыянальна перабудаваць адміністрацыю, стварыць сярэднюю й вышэйшую школу, каб зь іх штогод выходзіла пара тысяч чыноўнікаў, сфармаваць на эўрапейскі капыл вузкае кола эліты, якая станецца пачаткам калі ня мысьленьня, дык прынамсі літаратуры й мастацтва, бо паэты й музыкі родзяцца часьцей за эрудытаў, гісторыкаў і філёзафаў. Такая рэформа абыходзіцца нядорага, закранае невялікую колькасьць людзей, а атрыманую форму заўсёды можна адціснуць на “недааформленай” — у гэтым драма — *prima materia*. Гісторыя ідэяў, якая разглядаецца ў кантэксьце сусьветнай гісторыі, мае ў сабе нешта мімалётнае й няпэўнае, бо ня вельмі вядома, якім чынам уплываюць на сьвет ідэі выбітных асобаў, хоць вядома, што неяк уплываюць. Аднак тыя з расійцаў, што ўяўлялі сабе вобраз і прызначэньне сваёй айчыны, добра ўсьведамлялі, якая бездань расчыняецца ў іх пад нагамі й якое крохкае апірышча іх трымае. “*Дзяржава*, — казаў Пушкін са стомленай безнадзейнасьцю, бо ведаў гэтую дзяржаву занадта добра, — *гэта адзінае, што ёсьць эўрапейскага ў Расіі*”.

Вернемся да сьпісу крытэраў прыналежнасьці да Эўропы, складзенага Гізо, а таксама Ранке. Калі браць пад увагу крытэры, якімі карыстаецца Маля, Расія напраўду адстае ад Нямеччыны толькі на паўстагодзьдзя. Але факт, што ўжо ў XVI стагодзьдзі Нямеччына поўнілася цудоўнымі гарадамі. У тамтэйшых унівэрсытэтах, кляштарах і пры дварах знаходзілі сабе прытулак шматлікія навукоўцы, тэолягі й паэты. Яны карысталіся паслугамі прыўкрасных рамесьнікаў, залатароў, ткачоў, сялянаў (якія былі збольшага вольнымі й ня ведалі, што такое прыгон). Расіі гэта ня сьнілася нават пры канцы XIX стагодзьдзя. У 1913 годзе ў Пецярбургу ступень пісьменнасьці была не ніжэйшаю, а інтэлектуальны рух ня менш актыўны, чым у Мадрыдзе. Аднак памятайма, што гішпанская літаратура

пачалася з Сэнэкі, а Андалюзія на пачатку стагодзьдзя ўжо была “разьвітая”. Дзе ў Расіі XIX ст. знойдзеш Сэвілью, Таледа, Валенсію альбо Саляманку? Дзе знойдзеш аналяг гішпанскіх грамадзянскіх свабодаў? — Гішпанія ведала толькі свабодных людзей, *fueros*, і разьвітую судовую сыстэму (у тым ліку й суды інквізыцыі).

Маля сьцісла пераказвае нататкі іншаземцаў, што падарожнічалі па даўнейшай, дапятроўскай Расіі: Алеарыюса, Гербэрштайна й Флетчэра. Ён зьвяртае ўвагу, што ўсе яны апісваюць найдзічэйшае барбарства. Як яны адрозьніваюцца ад запісаў тых падарожнікаў, што ў той самы час наведваюць Кітай, Індыю, Пэрсію альбо Асманскую імпэрыю. Трэба памятаць, што ў параўнаньні з пасам “цывілізаваных” альбо “напаўцывілізаваных” краін, што атачаюць царскую імпэрыю, расійская прастора зеўрыць пусткамі. Не віна, а бяда Расіі, што цэнтры цывілізацыі так ад яе аддаленыя. З гэтага ўсяго вынікае, што Расія — гэта вялізарная тэрыторыя без гарадоў і рамёстваў (фактычна адзіным інструмэнтам расійскага селяніна доўга заставалася матыка), зь сельскаю гаспадаркай, што, як сьведчаць спэцыялісты, у 1913 годзе сягнула роўню ангельскай часоў Вайны Белай і Чырвонай Ружаў.

Усе гэтыя засьцярогі, добра вядомыя Малю, азначаюць ня тое, што Расія ў сутнасьці сваёй адрозьніваецца ад Эўропы, але тое, што яе “спазьненьне” трэба вымяраць кавалкамі часу, якія вагаюцца ад пяцьдзясяці да тысячы гадоў, а можа й больш. Дасьледнікі дагістарычных часоў з пэўнасьцю маглі б тут сказаць сваё слова. Мы памятаем вялікую кнігу П’ера Паскаля пра раскольніка пратапопа Авакума. Яна чытаецца, нібы тэкст пра эпоху Мэравінгаў. Паскаль, аднак, параўноўвае стараверскі раскол з рухам янсэністаў і, не вагаючыся, параўноўвае вялікага барбара Авакума й матухну Анжаліку Арно. Такое параўнаньне хібнае, і Маля ведае гэта лепш за каго-кольвек. Аднак часам ствараецца ўражаньне, што свае тэзы ён ілюструе такім самым чынам, як Паскаль.

Маля ведае, што ў гэтым слабіна ягонай працы, ён у пэўнай ступені прадбачыў яе. Я сумняюся, што спэцыфіка й асаблівае становішча Расіі тлумачыцца проста “спазьненьнем”. Мне карціць удакладніць гэтую думку. Адчужанасьць Расіі ад Эўропы вынікае ня столькі з “спазьненьня”, колькі з “спробаў здагнаць” і “згубных наступстваў” гэтага.

Зьвернемся да вядомага ў гістарыяграфіі расійскага топасу, а менавіта ацэнкі ўладараньня Пятра Вялікага. Таксама як і Малю, мне хацелася б думаць, што яго дзеяньні заключаліся ў паўтарэньні рашэньняў Вялікага Курфюрста альбо швэдзкіх каралёў. Але ж тым каралём не прыйшла да галавы думка самастойна выконваць абавязкі ката й ператварыць свой палац у месца катаваньняў. Апрача таго, адна справа будаваць сучасную (то бок мэркантылісцкую) адміністрацыю, абапіраючыся на людзей вольных, а другая — абапіраючыся на рабоў. Варта ў гэтай сувязі прывесьці слынную формулу Ключэўскага: *“Пётар хацеў, каб раб дзейнічаў адважна й свабодна, і надалей застаючыся рабом”*. Такі сабе спосаб здаганяньня, пры якім мэта скажаецца і дэфармуецца да недасяжнасьці. Менавіта таму Русо меў права сказаць пра Расію, што *“яна перасьпела, не дасьпеўшы”*. Кацярына дзейнічала разважлівей і ў пэўнай меры “загаіла” раны, што засталіся па пятроўскай рэвалюцыі. Яна мэтадычна будавала праўдзівы *ancien régime*. Але рэжым гэты адно спрабаваў рабіць першыя крокі і, у адрозьненьне ад таго, што імкнецца давесьці Маля, быў вельмі далёкі ад дасканаласьці, — і яго адным махам дыскрэдытавалі французская рэвалюцыя й лібэральныя перамены[2]. Пабудаваць новы сацыяльны лад у той сытуацыі, якую засьпявае Мікалай I, ужо немагчыма. Што рабіць?

Рэлігійнае самаўзьвелічэньне

Што рабіць? Дамагацца самаўзьвелічэньня й нерэалістычныя спробы нагнаць Эўропу замяніць уяўнымі.

Першае самаўзьвелічэньне — рэлігійнага характару. Цікава, што Маля цалкам абмінае рэлігійны аспэкт расійскай праблематыкі. Між тым ён двойчы адыграў вырашальную ролю. Першага разу яшчэ ў дапятроўскія часы, у момант будовы маскоўскага самаўладзтва. Таямніча гучыць пасланьне, зь якім на пачатку XVI ст. зьвяртаецца да Васіля III манах Філафей: “*Вялікі Княжа Сьвятлейшы, цару хрысьціянскага праваслаўя, валадару над валадарамі, што сядзіш на вялікім пасадзе, о ты, паноўны над боскімі пасадамі ўсясьветнае й апостальскае Сьвятое Царквы, Царквы Сьвятое Божае Маці, яе слаўнага Ўшэсьця, Царквы, што выпраменьвае бляск, роўны Цэрквам Рыму й Канстантынопалю (…). Ведай жа, о спадару, цару вельмі*

багабойны, што ўсе дзяржавы, якія вызнаюць хрысьціянскую веру праваслаўную, паядналіся ў тваім царстве: толькі ты хрысьціянскі цар тут, на зямлі". Цар, пра якога тут мова, панаваў над бязьмежнымі лясамі й палямі, што ўраблялiся лядным спосабам. Мэгаляманія гэтага царства проста агаломшвае. Ці ж яе крыніцаю можа быць нешта іншае, чымся найдзіўнейшы лякальны канглямэрат рэлігійных ідэяў? Усім, хто падарожнічаў па Расіі, кідалася ў вочы агульная панічная боязь лацінскай культуры. Праваслаўная Расія атачае сябе рэлігійным мурам, нагадваючы гэтым мусульманскую Умму. Рэвалюцыя Пятра I зруйнавала гэты мур, гвалтоўным чынам — на нямецкі ўзор — "пратэстантызавала" й сэкулярызавала царкву. Колькасьць манахаў, а таксама іх багацьце й прэстыж істотна паменшылася.

Расійская праваслаўная царква, аднак, пераадольвае крызыс, і ў XIX ст. у другі раз "рэлігійны" спосаб самаўзьвелічэньня набірае сілу. Ён ляжыць у падмурку вялікай славянафільскай аргумэнтацыі: мы ня горшыя, але ж іншыя, а паколькі сам Захад у сваіх кнігах і газэтах прызнаецца, што ён сапсаваны, дык мы лепшыя. Мы лепшыя таму, што маем веру — адзіную праўдзівую веру. Усе расійскія паскудзтвы — так лічаць Гогаль і Дастаеўскі — ужо таму добрыя, што яны нацыянальныя, а раз яны нацыянальныя, дык таксама рэлігійныя, і такім чынам яны добрыя ўдубальт. Расія поўная грэшнікаў, аднак сама яна — як і яе царква — сьвятая й бязгрэшная. Гэтае найдзіўнейшае перапляценьне рэлігійных і нацыянальных элемэнтаў (у больш вытанчаным і менш фанатычным выглядзе мы, што праўда, назіраем яго таксама ў Англіі) прывяло да таго, што расійскі нацыяналізм стаўся заразьлівым для іншаземцаў. І вялікая група дасьледчыкаў Расіі пранікаецца ім. У XVII ст. харвацкі сьвятар Крыжаніч захацеў навярнуць Расію на каталіцтва. У хуткім часе яго арыштавалі й выслалі ў Сібір, ён прабыў там 15 гадоў. І што ж? Пасьля вяртаньня ён палае яшчэ большай, чым перад высылкаю, любоўю да Расіі і гарыць яшчэ большым энтузіязмам. Спалучэньне рэлігійных і нацыянальных элемэнтаў назіраецца і ў пазьнейшы час: сярод расійскай эміграцыі ў Францыі яно ператрывала тры пакаленьні і ў 1991 годзе дасягнула свайго, лічы, піку, гатовае зноў апладніць посткамуністычную Расію. Глеба была амаль падрыхтаваная: у 1998 годзе япіскап Екацерынбургу загадвае публічна спаліць

кнігі — нават не каталіцкія, не пратэстанцкія, а праваслаўныя, але выдадзеныя за межамі “сьвятой Русі”, эмігрантамі, а значыць — зь пячаткаю граху.
Дагэтуль цяжка сабе ўявіць расійца-пратэстанта ці расійца-каталіка: гэта разглядаецца ня проста як вераадступніцтва, а як здрада. Салжаніцын напісаў, што Польшча ўяўляла сабою для Расіі небясьпеку большую за манголаў, бо магла схіліць яе да вырачэньня ўласнай веры. Перажыўшы росквіт у XVIII ст. і будучы амаль зьнішчанаю за часоў бальшавізму, рэлігія ў чарговы раз адраджаецца, ізноў аддаляючы Расію ад Эўропы й кампэнсуючы сабою гэтае аддаленьне. У чарговы раз усё, што рэлігійнае, стаецца ў Расіі нацыянальным, а ўсё, што нацыянальнае, — рэлігійным.

Імпэрская манія велічы
Другі элемэнт самаўзьвелічэньня — імпэрская манія велічы. Яна выяўляецца ў розным.
За XVI і XVII стагодзьдзі Расія сягнула ажно да Ціхага акіяну. Ужо Вальтэр заўважыў, што яна, такім чынам, заняла прастору, у некалькі разоў большую за Рымскую імпэрыю. Гэтыя пустыя тэрыторыі, якія так да канца й не ўдалося засяліць і выкарыстаць, перапаўняюць расійцаў праўдзіваю пыхай. Фантазіі ёсьць дзе разгуляцца. *Мы* — гэта людзі, якія насяляюць шостую частку ўсёй зямной сушы. Быццам бы гісторыя залежыць ад колькасьці квадратных кілямэтраў. Тут крыніца *эўразійскіх* мрояў. Сёньня расійская думка ня можа прымірыцца з “стратаю” некалькіх мільёнаў квадратных кілямэтраў. Яна зацята бароніць два востравы, якія Сталін у 1945 годзе скраў у Японіі. Страціць кавалак тэрыторыі для шмат каго з расійцаў азначае “страціць аблічча”.
Другая праява імпэрскай маніі велічы больш дасьледаваная: гэта панаваньне на Каўказе і ў Сярэдняй Азіі. Яе пачаткам сталіся заваёвы XIX стагодзьдзя, падобныя да тых, якія ў той самы час праводзіла Францыя. Для іх апраўданьня вылучаліся тыя самыя аргумэнты, што і ў Францыі: жаданьне прынесьці цывілізацыю, падтрымаць хрысьціян і абараніцца ад ісламу. Гэтай часткі імпэрыі можна адрачыся безь вялікага болю. Тым горш для тубыльцаў, — лічыць расійская думка, — дзеля якіх “мы ахвяравалі сабою” і якія дорага заплацяць за сваю

“няўдзячнасьць”.
Трэці від маніі велічы больш арыгінальны. У XVIII ст. Расія заняла Ўкраіну, Польшчу, балтыйскія краіны, то бок землі, цывілізацыйна разьвітыя нашмат больш за яе й бясспрэчна эўрапейскія. Мэтады заваёваў былі тыповымі для XVIII ст.: угоды зь мясцоваю арыстакратыяй, якая пасьля пастаўляла імпэрыі кадравых афіцэраў, альбо таксама — у выпадку патрэбы — ваеннае вырашэньне праблемы. Трэба адзначыць, што гэтыя заваёвы прадстаўляліся расійскай публічнай думцы як “узьяднаньне”, далучэньне земляў спрадвеку расійскіх, якія Расія прыняла так сама ласкава, як бацька прымае блуднага сына. Такімі самымі словамі Салжаніцын заклікае “заблуканак” Украіну й Беларусь, каб яны вярнуліся ў родную аўчарню. Пазыцыя Расіі — насуперак таму, што сьцьвярджае Маля, — адрозьніваецца ад пазыцыі Аўстрыі й Прусіі. Аўстрыя й Прусія лічылі, што яны — прывядзем вядомае выказваньне аўстрыйскага міністра — *“варта, якая стрымлівае арду”*. Тут жа арда стаяла на варце, і палякі з балтамі вельмі балюча адчулі гэта на ўласнай скуры. Расійцы таксама гэта ведалі, але ўлада, якую яны мелі, здымала зь іх усякую адказнасьць. Словы дэ Кюстына: *“Раб, які стаіць на каленях, марыць пра ўсясьветную імпэрыю”*, — тут вельмі дарэчныя.
Я лічу, што Маля недастаткова выразна падкрэсьлівае, да якой ступені захоп гэтай “эўрапейскай” часткі імпэрыі перашкаджаў Расіі стаць на шлях эўрапейскага разьвіцьця. Па сутнасьці, *gradient* функцыянаваў ужо ўнутры імпэрыі, і яго значэньне расло цягам усяго XIX ст., бо працэс індустрыялізацыі пачаўся найперш у Польшчы й Балтыі. Але ж ён ня мог стацца імпульсам да разьвіцьця прамысловасьці ў Расіі — акурат наадварот. Немагчыма было зьдзейсьніць палітычную рэформу, настолькі жаданую пачынаючы з 1860 году, без адмаўленьня ад самаўзьвелічэньня. Расійскае панаваньне на гэтых тэрыторыях стрымлівала рэформы: кампэнсаваць іх адсутнасьць магла адно лібэральная ці наагул дэмакратычная рэвалюцыя, якую суправаджаў бы пад’ём гаспадаркі. Аднак, гэта была б занадта цяжкая і доўгая справа. Прасьцей было застацца імпэрыяй у сваім ранейшым стане. Калі ў 1945 годзе камуністычная Расія заняла гэтыя самыя землі й нават пашырыла свае межы, яна сутыкнулася з аналягічнай дылемай, што выракла расійска-савецкую дзяржаву на поўную стагнацыю.

Усьведамленьне аддаленасьці ад Эўропы знаходзіць адбітак у расійскай літаратуры. Яна нарадзілася на пачатку XIX стагодзьдзя, а яе клясыкі былі рамантыкамі. Яе мучыла праблема *Sonderweg*. Яна ставіць сабе вялікае пытаньне: “Што значыць быць расійцам?”. Яна не пытаецца, як клясыцысты: “Што значыць быць чалавекам?”. *“Паводле сваёй прыроды я чалавек, а француз я толькі выпадкова”,* — пісаў Мантэск’ё. Гогаль, Дастаеўскі й асабліва расійскія пісьменьнікі пачатку XX ст. заўзята адпрэчвалі гэтую думку. Бальшыня гэтых пісьменьнікаў (з вартым увагі выняткам анархіста Талстоя ды індыфэрэнтнага Чэхава), таксама як амаль усе гісторыкі, падтрымлівалі імпэрскую ідэю й захоп Украіны й Польшчы. Пушкін нават напісаў оду з нагоды здушэньня лістападаўскага паўстаньня ў Польшчы. Гэтае не перашкаджала літаратарам зноў і зноў усё вынаходлівей падымаць пытаньні ніжэйшасьці альбо вышэйшасьці Расіі й подласьці альбо сьвятасьці расійца.

Хлусьня

Найпрасьцейшым, найштодзёньнейшым спосабам самаўзьвелічэньня аказвалася, урэшце, хлусьня, альбо ігнараваньне — насуперак усякай відавочнасьці — згаданых адставаньняў і спазьненьняў. Гэта не азначае, што расійцы больш схільныя да маны, чым усе іншыя людзі, а ідэалёгічным становішчы празьмерны кантраст паміж рэчаіснасьцю жаданьнямі, ідэямі, праектамі вымушаў іх загойваць раны закранутага самалюбства акурат хлусьнёю. Гэтая традыцыя, як і вякавая традыцыя наганяньня: яна ўкаранілася ўжо ў XVIII ст. Мы добра памятаем, як адкрываюць яе Кюстын, Маркс і Мішле[3]. Разумныя й аб’ектыўныя французскія й ангельскія назіральнікі канца XIX ст. прызнаць, што напісаныя на паперы законы, пастановы, новаўвядзеньні ў Расіі “прабуксоўваюць” і гінуць, ўвасобіўшыся ў жыцьцё, што, нягледзячы на правядзеньне, усё нялёгка асушыць бяздонную багну. Маля вызначаюць пэрыяды ў гісторыі вывучэньня Эўропаю Расіі. Зразумела ж трэба памятаць, што і захапленьню таксама ўвесь час спадарожнічаў сумнеў — пачынаючы ад Вальтэра і Дэні ў XVIII ст. і ажно да нашых дзён. Славянафілы, песьняры Расіі маюць ісьце сваёй, сьвятой і адрознай ад усіх Расіі, ня

[3] **Маркс:** *“Тыпую імпэрыю, якая хоць і выйшла з вайны, але ўсё яшчэ ўвасабляе ідэю заваёвы, дзівіць сьвет сваім ростам, але ў сутнасьці ўяўляе сабой фактор”.* **Кюстын** **сьцьвярджае, што Расія маюць** **Пятраз**

Вялікага за тое, што ён сіламоц піхаў Расію ў Эўропу, зьмяняючы напрамак яе павольнага й “арганічнага” разьвіцьця, дзякуючы якому яна ўласнаю дарогай магла сягнуць *заходняга* ладу. Цары, хоць і былі настроеныя па-праэўрапейску, *старанна* дбалі пра славянафільскіх гістарычных фікцыяў з усё большым *пачуцьцём* сымпатыяй, бо яны стваралі добры паняткавы падмурак *замежнікам*. хлусьні й рабілі магчымаю карпатлівую, штодзённую *працу* “падфарбоўваньня” сумнай рэчаіснасьці.

Маля цалкам мае рацыю, калі кажа, што камунізм *ашуканства* ня мае нічога супольнага зь “вечнаю Расіяй”. Я *бясконцасьці й* змагаўся супраць канцэпцыі, якую падзяляў дэ Гі*глёбіні* яшчэ, — канцэпцыі, якая не зьвяртала ўвагі на са*Расіі* харктар гэтай ідэалёгіі, яе агульнаэўрапейскія ка*ды*, адмысловую падступнасьць і сусьветнае мэтафіз*хранікі* вымярэньне. Камуністычныя рэжымы, аднак, ха*ашуканства*, тым, што выцягваюць з нацыянальнай сьвядома*што* усё, што ў ёй ёсьць найгоршага, выразам чаго, у прыватнас*і* способ ажыцьцяўленьня ўлады. Камунізм ня толькі з*і* разьвіцьцё Расіі, але й жудасна разьвіў тыя яе рысы, якія ўжо раней Эўропу жахалі. Замест некалькіх сотняў агентаў *ахранкі* — 200 тысяч агентаў КГБ. Замест некалькіх тысяч вязьняў — некалькі мільёнаў. Замест звычайнай хлусьні — унівэрсальнае, мэтафізычнае, шызафрэнічнае ашуканства, якое зьмяняе сэнс ня толькі словаў, але й рэчаіснасьці. Імпэрыя фальшу, краіна “ашаламляльнае хлусьні”. Ніколі Расія, — заўважае Маля, — не была так блізкая ад Эўропы, як у 1913 годзе. А пяцьма гадамі пазьней стала як ніколі далёкай. І прорва паміж іх гэтага разу мела расійскія, але павялічаныя да пачварнасьці рысы. Во як Кітай у эпоху Мао быў да пачварнага кітайскі. Мэта “даганяньня”, якая цягам семдзясяці гадоў была маніяй рэжыму, прывяла да зьяўленьня “не-капіталізму”, сыстэмы, адначасова “не-эўрапейскай” і “гіпэррасійскай”.

Ацэньваць па справах, а не па словах

На гэтым хачу спыніць дыскусію з гэтай каштоўнай — паўтаруся — і надзвычай багатай кнігай. Напэўна, Маля шчэ выкажа сваю думку наконт маіх заўваг, несумненна выявіўшы пры гэтым увесь свой талент, тонкасьць розуму і інтэлектуальны багаж. Па сутнасьці, мы проста працягваем тую

ты, што
па”
найлепш
старанна
пачуцьцём
замежнікам.
Міхалкоў
“Crescendo
ашуканства
бясконцасьці й
глёбіні
Расіі
ды
што яна
хранікі,
ашуканства,
што
сацыялістычная”
і

disputatio, якая мае месца ў расійскай гістарыяграфіі апошніх трох стагодзьдзяў. Калі казаць простымі словамі, вырашэньне пытаньня, ці належыць Расія да Эўропы, залежыць ад таго, які сэнс мы ўкладаем у словы “спазьненьне” (цяпер Расія належыць ужо да Эўропы “правай”, а ня “левай”) — альбо “дэфармацыі”, якія вынікаюць з гэтага “спазьненьня”, мэтадаў яго пераадоленьня, згубных наступстваў “даганяньня”. Таму нам трэба асьцярожна чакаць і назіраць. Гэта мае практычнае дачыненьне да палітыкі, якую эўрапейскі й амэрыканскі Захад павінен праводзіць адносна Расіі.

Маля абсалютна слушна падкрэсьлівае заходнія крыніцы сацыялізму й “філялягічную” правамоцнасьць ленінскай інтэрпрэтацыі Маркса. Не зважаючы на тое, што гэтая інтэрпрэтацыя сьвяткавала сваю перамогу менавіта ў Расіі і перамога гэтая цягнулася ненармальна, ненатуральна доўга. Яе яд атруціў душы. Расія вызвалілася ад камунізму (згаджуся з Малем, што камунізм там ужо не адродзіцца), аднак не ачысьцілася ад гэтай атруты. Яна ня выкінула з памяці й ня вынесла абвінаваўчага прысуду. Помнікі Леніну дагэтуль красуюць на ўсіх плошчах. Камунізм трактуецца не як паталягічны й злачынны эпізод, які належала б з сорамам выкінуць зь сьвядомасьці, а як паўнапраўны фрагмэнт гісторыі Расіі з усімі добрымі й злымі бакамі. Камунізму абвешчана амністыя, і вінаватыя могуць спаць спакойна. Яны застаюцца ў кіраўнічым апараце й бяруць удзел у палітычных гульнях. Захад, ратыфікуючы гэтую амністыю й дапаўняючы яе амнэзіяй, бярэ й на сябе долю адказнасьці за такі стан рэчаў. Часьцяком у Расіі можна пачуць, што камунізм — гэта ўрэшце чужая для яе зьява, імпартаваны прадукт, што Расія ў чарговы раз стала ахвяраю Эўропы. Такое гледзішча знойдзе ў вывадах Малі аргумэнты ў сваю падтрымку, хаця Маля будзе першы, хто гэтаму запярэчыць.

Камуністычны эпізод гісторыі нельга пакідаць у народнай памяці так, як французы ўключылі ў яе сваю рэвалюцыю. Апошняя пакінула па сабе ня толькі ўспаміны пра свае злачынствы, але й новае жаданае “народам” грамадзтва, якое не парывала з ранейшым грамадзтвам канчаткова. Камуністычны эпізод — гэта не-грамадзтва, альбо грамадзтва разьбітае, раздробненае, дэмаралізаванае, затрыманае ў разьвіцьці. Ізноў, як у 1815 годзе, паўстае пытаньне: што

рабіць?
Ёсьць толькі адно разумнае выйсьце, якое падказваюць як Маля, так і сур'ёзныя расійскія дасьледнікі: акцыдэнталізацыя. Але гэта амаль невырашальная задача. Калі ўсіх грошай Заходняй Нямеччыны не стае, каб узьняць з руінаў лапік тае Ўсходняй Нямеччыны, дык на ўзьняцьцё Расіі ня хопіць грошай усяго сьвету. У Расіі камунізм трымаўся так доўга толькі таму, што чэрпаў зь некамуністычных духоўных сілаў: найбольш коснага з нацыяналізмаў і найбольш фанатычнай з рэлігіяў. Гэты стан рэчаў і дагэтуль не пераадолены, і ідэалёгія цяперашняй Расійскай камуністычнай партыі — гэта менавіта сумесь камунізму, нацыяналізму і фанатызму. Існуе небясьпека, што за доўгі час, неабходны для пабудовы сапраўды эўрапейскай Расіі, можа адбыцца рэцэдыў клясычных мэтадаў "кампэнсацыі" спазьненьня. Наіўна спадзявацца на "адраджэньне хрысьціянства" ў Расіі. Замест гэтага на нашых вачах паўстае яшчэ больш карумпаваная і цемрашальская царкоўная гіерархія, чым у царскія часы.
Імпэрыя распадаецца, і гэта вялікі шанец для Расіі, які можа прынесьці ёй шмат пазытыўнага. Аднак і сёньня Расія мроіць імпэрыяй, і ўмелыя расійскія дыпляматы разам з спэцслужбамі патаемна працуюць над яе адбудовай. Незалежнасьць Украіны для бальшыні расійцаў — страшны кашмар, нешта ненатуральнае, што мусіць неўзабаве мінуцца. І, урэшце, хлусьня гатовая зноў заняць сваё месца. Ператварэньне *апаратчыкаў* у *дэмакратаў*, практыкаў плянавай эканомікі — у зацятых песьняроў свабоднага рынку, спрытнасьць, зь якой яны ахрысьцілі крадзеж прыватызацыяй, зь якой *облапошили* МВФ і нямецкія банкі — усё гэта паказвае, што *втирание очков* іншаземцам мае будучыню.
***
Згаджуся зь вялікай кнігай Малі ў тым, што належыць паважна ставіцца да адвечнага, глыбокага й трывалага жаданьня Расіі наблізіцца да Эўропы й зьяднацца зь ёй. Форма й роля расійскае дзяржавы, форма й дух расійскага рэлігійнага пачуцьця дагэтуль перашкаджалі гэтаму хаўрусу. Аднак розум, што павінен ісьці побач з сымпатыяй і нават міласэрнасьцю, да якой заклікае вышэйзгаданае жаданьне, мусіць праяўляцца ў адрозьненьні словаў ад справаў, заяваў ад учынкаў. Не гісторыкам вырашаць, належыць Расія да Эўропы ці не (хаця

яны дыскутуюць на гэтую тэму ўжо цягам трох стагодзьдзяў). Урэшце, гэтае пытаньне вырашыць сама Расія. Гісторыя вучыць нас, што мы не павінны верыць ёй на слова, але павінны судзіць яе па яе ўчынках.

Пераклаў зь нязначнымі скарачэньнямі Андрэй Хадановіч паводле часопісу Commentaire *(№89), 1999.*

Адказ М. Малі на эсэ А. Бэзансона

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 4 (18) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: 06-10-2001
[image]

Марцін Маля

Адказ на эсэ А. Бэзансона

МАРЦІН МАЛЯ прафэсар гісторыі каліфарнійскага ўнівэрсытэту Бэрклі.

Апошнімі часамі выйшлі яго кнігі “*The Soviet Tragedy: A History of Socialism in Russia” (1995), “Russia Under Western Eyes: From the Bronze Horseman to the Lenin Mausoleum” (1999). Апошні твор ён прысьвяціў *Польшчы, якая ў 1980 годзе распачала дэмантаж камунізму і Дэмакратычнай Расіі, якая ў*

Эсэ, якое прысьвяціў маёй кнізе Ален Бэзансон, натуральна ж, прынесла мне шмат прыемнасьці: ніводны з чытачоў дагэтуль не патрапіў даць такі глыбокі й грунтоўны камэнтар да маіх развагаў. Ален Бэзансон падрыхтаваў ідэальнае рэзюмэ — такое, пасьля якога карціць прачытаць саму кнігу. Увадначас аналіз майго сябра нямала зьбянтэжыў мяне, бо я не да канца разумею, у якім кірунку разьвіваецца ягоная думка.
Яго эсэ разьвіваецца ў двух часавых вымярэньнях. У першай, частцы, скажам так — у рэфэраце, прыгадваюцца й камэнтуюцца прынцыповыя моманты маіх уласных развагаў. Нагадаю, што Эўропа выступае ў іх не як аднародны адносна Расіі культурны блёк, а як шэраг *Sonderwege*, асобных шляхоў, у тым ліку й расійскага, што ствараюць *gradient*, альбо культурны схіл, што паніжаецца ад Атлянтыкі да Ўралу. Відавочна, што гэты “Захад” у шырокім разуменьні слова фармаваў стабільную рэчаіснасьць усёй Эўропы, ад заснаваньня імпэрыі Пятра Вялікага да будовы “рэальнага сацыялізму” Леніным ды Сталіным. Ален Бэзансон прымае сутнасьць маёй парадыгмы і рэлятывізуючай гіпотэзы, таму я ня буду камэнтаваць ягоных

заўвагаў.
У другой частцы свайго эсэ аўтар пераходзіць да “сумыкаў”, што вынікаюць з таго, што я нібыта “не пажадаў узяць пад увагу пэўныя рэчы”, якія Бэзансон спрабуе разьвіваць як “гісторык-кампаратывіст”. Аднак жа, хоць гэтыя “ня ўзятыя пад увагу рэчы” ён прыводзіць як звычайныя “дапаўненьні” да маёй аргумэнтацыі, яго ўсё гучнейшыя развагі нарэшце ператвараюцца ў праўдзівую антытэзу першай часткі эсэ.
У заканчэньні ён сьцьвярджае, што “эўрапейскасьць” Расіі, то бок яе здольнасьць да цывілізаванага жыцьця, вісіць на валаску. Ён нават урачыста заклікае бяспутную Расію сваімі добрымі паводзінамі заслужыць сабе ў будучыні ўваходны білет у праўдзівую Эўропу. Цяпер зірнем, ці магчыма, каб на падставе двухвымернага эсэ Алена Бэзансона нашыя пазыцыі сышліся.

1991 годзе скончыла ўго”.

Тэорыя Рычарда Пайпса

Найперш, аднак, я мушу высьветліць адно непаразуменьне.
У адрозьненьне ад таго, што хоча сьцьвердзіць Ален Бэзансон, я не пісаў сваёй кнігі ў піку Рычарду Пайпсу. Як заўважае наш аўтар, першыя яе накіды зьявіліся ў 1962 годзе. Дадайма, што я прагнуў аспрэчыць модны тады даўні стэрэатып Расіі як краіны, у якой пануе адвечны “ўсходні дэспатызм”. Тады як Рычард Пайпс прадставіў сваю пазыцыю адно ў 1974 годзе (у кнізе пад назовам *Russia under the Old Regime*), пасьля чаго выявілася, што пазыцыя гэтая ёсьць у сутнасьці сваёй мадэрнізаванаю вэрсіяй таго слаўназнанага стэрэатыпу. Паводле новай трактоўкі Пайпса, Расія, ад Маскоўскага княства пачынаючы, акрэсьліваецца як “патрымоніюм”. Гэты панятак аўтар запазычыў у Макса Вэбэра, а азначае ён, што манарх ёсьць уладальнікам зямлі й ейных жыхароў (такі, зрэшты, і традыцыйны сэнс выразу “ўсходні дэспатызм”).
“Арыгінальнейшым” было тое, што для Рычарда Пайпса камунізм быў папросту чырвонай іпастасьсю “маскоўскага патрымоніюму”, у якім марксісцкая ідэалёгія не адыгрывала значнай ролі. У 1974 годзе Пайпс сьцьвердзіў, што “надзвычайныя законы”, уведзеныя Аляксандрам III пасьля забойства свайго бацькі ў 1881 г., з таго часу ўяўлялі сабою — у тым ліку і ў савецкую эпоху — “сапраўдную канстытуцыю

Расіі”. Ён дадаваў, што “расійскі Крымінальны кодэкс быў для таталітарызму” ў Расіі і ўва ўсёй Эўропе тым, чым “была для ідэі свабоды *Magna Charta*”. Дзіўная тэорыя. Калі камунізм — гэта ўсяго толькі чарговая іпастась вечнай Расіі, дык тады немагчыма зразумець расійскую гісторыю XX стагодзьдзя. Твор Рычарда Пайпса як галоўны на сёньня прыклад тэзы пра “азіяцкую” Расію стаецца *ipso facto* найдасканалейшаю антытэзаю маёй уласнай кнігі.

Вяртаючыся да Алена Бэзансона, можна сказаць, што ўсе яго сумневы датычаць стратэгіі “даганяньня Эўропы”, якую Расіі прадыктавала яе адставаньне на крывой, што паніжаецца ад Захаду да Ўсходу Эўропы. Гэтае спазьненьне спарадзіла патрэбу “самаўзьвелічэньня” ў форме “ўяўнага наганяньня”. Першы спосаб самаўзьвелічэньня — рэлігійны, мэсіянскі, фанатычны нацыяналізм, які можна было назіраць ад XVI стагодзьдзя да славянафілаў стагодзьдзя XIX і ажно да посткамуністычнага праваслаўя. На што, аднак, абапіраецца Бэзансон, даводзячы існаваньне гэтай шматвекавой рэлігійнай традыцыі (якую ён, шчыра кажучы, д’ябалізуе)? Калі прыгледзецца да яго пазыцыі, выяўляецца, што яна грунтуецца на старанна падабраных фрагмэнтах гісторыі, якія беспасярэдне ўпісваюцца ў клясычны антырасійскі стэрэатып.

Антырасійскі пагляд

Падбор пачынаецца з манаха Філафея, аўтара дактрыны пра “Маскву — Трэці Рым” (яна датычыла выключна цэркваў і ніколі не вызначала кірунку расійскай дзяржаўнай палітыкі). Далей ён прыводзіць прыклад славянафілаў і некарэктным чынам рэдукуе яго да крайняй пазыцыі Дастаеўскага (ані словам ня згадваючы пра асноўную групу славянафілаў, якая складалася з дробнага дваранства кансэрватыўна-“арганічных” пераканаьняў у стылі Эдмунда Бёрка, прыкладам, Хамякова альбо Аксакава). Выкарыстоўваецца таксама антыпольская цытата з Салжаніцына (які наагул да афіцыйнай царквы ставіцца досыць крытычна). Пры канцы аўтар урэшце згадвае сапраўды неадназначную постаць япіскапа Екацерынбурскага. Робячы гэтую выбарку, Ален Бэзансон дзе-нідзе супярэчыць сваёй місіі гісторыка-кампаратывіста: як прыклад узаемасувязі элемэнтаў рэлігійных і нацыянальных ён прыводзіць адносна

нязначны выпадак Англіі, у той час як гэтая тэндэнцыя праяўлялася паўсюль у Эўропе, ад ультракаталіцкай Ірляндыі да Польшчы, якая сама называла сябе “Хрыстом Народаў”, ня кажучы ўжо пра *gesta dei per francos*.
Зразумела, стасункі паміж усходнімі й заходнімі цэрквамі часьцяком былі й дагэтуль застаюцца складанымі, і нават адкрыта варожымі. Трэба, аднак, мець багатае ўяўленьне, каб казаць пра *“ідэалягічныя “выбрыкі” правіцы, што бунтавалі ў Расіі народ наканадні першай сусьветнай вайны. Яе пагроза была настолькі страшнаю, што я нават цешуся, што ўрэшце перамаглі бальшавікі, а не яна”*. І далей, у высновах: *“Калі б першая сусьветная вайна скончылася трыюмфам Расіі і яна запанавала над паловай Эўропы, усёй Польшчай, Балканамі й Канстантынопалем, як гэта абяцалі ёй хаўрусьнікі, мы, можа, мелі б справу з сумесьсю нігілізму, разьдзьмутага нацыяналізму, расізму й антысэмітызму, які явіла сьвету нацысцкая Нямеччына, толькі ў кантынэнтальным маштабе — нашмат больш грандыёзнай і да таго ж з рэлігійным грунтам пад сабой”*.
Няўжо Ален Бэзансон напраўду хоча нам сказаць, што традыцыйная Расія, выхаваная на сваёй адзінай ідэалёгіі, то бок праваслаўі, рыхтавала нам жудасьці, роўныя тым, якія ўчынілі камунізм і нацызм, разам узятыя?

Імпэрыя?
Гэтаксама суб’ектыўна гучаць заўвагі пра яшчэ адно самаўзьвелічэньне, г. зн. пра “імпэрскую манію велічы”. Пакіньма ўбаку нават тую “пыху”, якую нібыта выклікае вялізарная тэрыторыя краіны. Мы бачым у гэтым адно нацыянальна-патрыятычныя настроі, ня вельмі адрозныя ад тых, якімі кіраваліся некаторыя французскія традыцыяналісты, што, адмоўна ставячыся да прамыслова больш разьвітай Англіі, ухвалялі Францыю як “краіну двухсот гатункаў сыру”.
Сур’ёзьней кажучы, Расійская імпэрыя паўстала такім самым чынам, як і іншыя эўрапейскія імпэрыі, — дзякуючы як геастратэгічным рашэньням, так і нацыянальнай пысе. Сёньня, аднак, гэтая эпоха відавочна мінула. Падзеі апошняга дзесяцігодзьдзя адназначна пераконваюць нас, што небясьпекі расійскага імпэрыялізму ўжо не існуе. У 1991 годзе Расія якга “пазбавілася” ўсіх набыткаў Пятра Вялікага, Кацярыны Вялікай

і Аляксандра II разам узятых. Мы памятаем, зь якою цяжкасьцю Францыя разьвіталася з сваёю імпэрыяй, як галяндцы трымаліся за Ост-Індыю. Натуральна, у Расіі й цяпер ёсьць туга па мінулых днёх велічы на міжнароднай арэне, аднак усе апытаньні грамадзкае думкі сьведчаць пра тое, што яе насельніцтва нязгоднае ахвяраваць нават мінімальныя намаганьні для адбудовы імпэрыі альбо здабыцьця рангу супэрдзяржавы. А нават калі б народ нечага такога захацеў, у Расіі не знайшлося б ані людзкіх, ані матэрыяльных рэсурсаў для дасягненьня згаданай мэты: сьмяротнасьць перавышае нараджальнасьць на 700 000 чалавек у год, гаспадарка разбураная, а войска аслабленае настолькі, што ніяк ня дасьць рады Чачэніі, якая ўваходзіць у склад Расіі. Вартыя жалю жэсты, накшталт дэсанту на аэрадром Прышціны, зробленыя, каб насаліць Захаду, ніяк гэтай сытуацыі не мяняюць.
Што да трэцяга спосабу самаўзьвелічэньня, то бок непапраўнай хлусьні, дык гэты аргумэнт выглядае настолькі надуманым, што мне не застаецца нічога, як толькі запярэчыць. Ці знойдзецца ў сьвеце краіна, якая, дайшоўшы да жабрацтва, ня будзе хлусіць, каб утаіць сваю галечу?

Камунізм

Але, што цікава, у вопісе спосабаў таго, якім чынам расійцы спрабуюць узьвялічыць сябе, складзеным маім сябрам Аленам Бэзансонам, нічога не гаворыцца пра рэальны, вялікі спосаб, апісаньне якога складае кульмінацыйны пункт маёй кнігі, — марксісцка-ленінскую ідэалёгію, якая мусіла дапамагчы дагнаць і перагнаць “капіталістычную” Эўропу й спраўдзіць першую вялікую эўрапейскую ўтопію. Пра мой досьлед гэтага “павароту гісторыі наўпопяць”, зь якога вырасла несапраўднае антыграмадзтва, Ален Бэзансон піша адно тое, што ён “найвядомейшы” і таму “ня вельмі арыгінальны”. Ад аўтара “Інтэлектуальных крыніц ленінізму” можна было чакаць і большага. Мудры пагляд Бэзансона на ідэалёгію калісьці пераконваў значна болей, чымся яго сёньняшнія спэкуляцыі на тэму “расійскасьці” й “праваслаўнай Уммы”. Тым больш шкада таму, што я ў сваёй кнізе скарыстаўся яго досьледамі, якія датычылі гэтай ідэалёгіі “несапраўднасьці”.
Згадайма, нарэшце, некалькі істотнейшых момантаў. Ален

Бэзансон падкрэсьлівае, што культурная крывая праходзіць унутры Расійскай імпэрыі, у якой занядбаны маскоўскі цэнтар панаваў над больш разьвітай Польшчаю й балтыйскімі краінамі. Гэтая акалічнасьць нібыта мусіла — іначай, чымся ў выпадку з Прусіяй — “стрымліваць рэформы”. Тым часам *gradient* унутры абедзьвюх краін паніжаўся акурат у адваротным кірунку. У Расіі ў 1905 г. адукаваныя празаходнія асяродкі ўсё актыўней дамагаліся рэформаў, тады як у бісмаркаўскай Прусіі юнкерска-арыстакратычная канстытуцыя стварала сур’ёзныя перашкоды на шляху да дэмакратыі, за якую змагаліся больш разьвітыя захад і поўдзень Нямеччыны. Не забывайма таксама, што ў той самай Усходняй Нямеччыне колькасьць агентаў “Штазі” на душу насельніцтва значна перавышала долю тых 200 тысяч расійскіх КГБістаў, на якіх наракае Ален Бэзансон.

Быць альбо ня быць расійцам?

Наш аўтар зьвяртае таксама ўвагу на той факт, што расійская літаратура, у адрозьненьне ад заходняй, упарта вяртаецца да пытаньня нацыянальнай тоеснасьці. Але тут гісторык-кампаратывіст не павінен забывацца, што й амэрыканская літаратура — ад Вашынгтона Ірвінга й Лангфэла да Ўолта Ўітмэна, Генры Джэймса й Марка Твэна — таксама “дзяўбе” праблему маладзенькай нацыянальнай ідэнтычнасьці, параўноўваючы яе з старою эўрапейскай, культурна багатаю, але ж сапсаванаю з прычыны адсутнасьці дэмакратыі. Ня кажучы ўжо пра нямецкія спробы вызваленьня з-пад французскай культурнай “апекі”, што назіраліся з часоў Гётэ. У заканчэньні Ален Бэзансон слушна піша пра шматвекавую працу як неабходны чыньнік у працэсе стварэньня цывілізацыйных умоваў у Эўропе — чыньнік, які працуе не на карысьць Расіі. Ён супастаўляе тут прыўкрасныя нямецкія гарады XVI ст. зь вясковаю Масквой тых часоў. Аднак, багатае мінулае ніякім чынам не гарантуе будучыні: і старая Нямеччына, маючы ў багажы Рэнэсанс і Рэфармацыю, і маладая Расія, перажыўшы эпоху Івана Жахлівага й пратапопа-раскольніка Авакума, у 30-я гады XX ст. дайшлі да той самай ступені барбарства. І тысяча гадоў цывілізацыі не ўберагла Эўропы ў першай палове XX ст. ад найкрывавейшай у гісторыі трагедыі.

Так ці іначай, спроба аб'яднаць агульнаэўрапейскія пэрспэктывы маёй кнігі з "дапаўненьнямі" Алена Бэзансона выявілася няўдалаю. Бо, калі верыць Бэзансону, усе тры спосабы самаўзьвелічэньня — рэлігія, імпэрыялізм і хлусьня — і зьяўляюцца той "сутнасьцю" вечнай Расіі, якую ён не прымае і супраць якой скіраваная мая кніга. Ален Бэзансон нават даходзіць да крайняга стэрэатыпу "раба на каленях", які марыць "пра сусьветную імпэрыю" (дэ Кюстын).
Вось жа, з гэтага гледзішча паразуменьне падаецца мне немагчымым, і нам не застаецца нічога іншага, як шчыра прызнаць розьніцу ў нашых паглядах на сутнасьць расійскай гісторыі. Я, прынамсі, ня веру ў тое, што *"форма й роля расійскай дзяржавы, форма й дух расійскага рэлігійнага пачуцьця сталіся (…) перашкодаю"* на шляху збліжэньня Расіі з рэштай Эўропы, ані ў тое, што гэтая краіна застанецца ў няпэўнасьці на скраі бездані, запоўненай сумесьсю камунізму, "коснага" нацыяналізму й "фанатычнай" рэлігіі, якая робіць акцыдэнталізацыю Расіі *амаль невырашальнаю задачай*.
Але, як мудра дадае Ален Бэзансон, *трэба асьцярожна чакаць і назіраць*. Бо культурны *gradient*, што сёньня расьцягваецца па ўсёй Эўропе й фармуецца глябалізацыяю і Інтэрнэт-рэвалюцыяй, тоіць у сабе шмат неспадзяванак. Расія таксама шчэ можа нас зьдзівіць.

Пераклаў зь нязначнымі скарачэньнямі Андрэй Хадановіч паводле часопісу Commentaire *(№89), 1999.*

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 4 (18) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя:
analityka@yahoo.com
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса

Апошняе абнаўленьне: 06-10-2001
[image]

Марцін Маля

Адказ на эсэ А. Бэзансона

МАРЦІН МАЛЯ прафэсар гісторыі каліфарнійскага ўнівэрсытэту Бэрклі.

Апошнімі часамі выйшлі яго кнігі “*The Soviet Tragedy: A History of Socialism in Russia” (1995), “Russia Under Western Eyes: From the Bronze Horseman to the Lenin Mausoleum” (1999). Апошні твор ён прысьвяціў *Польшчы, якая ў 1980 годзе распачала дэмантаж камунізму і Дэмакратычнай Расіі, якая ў*

Эсэ, якое прысьвяціў маёй кнізе Ален Бэзансон, натуральна ж, прынесла мне шмат прыемнасьці: ніводны з чытачоў дагэтуль не патрапіў даць такі глыбокі й грунтоўны камэнтар да маіх развагаў. Ален Бэзансон падрыхтаваў ідэальнае рэзюмэ — такое, пасьля якога карціць прачытаць саму кнігу. Увадначас аналіз майго сябра нямала зьбянтэжыў мяне, бо я не да канца разумею, у якім кірунку разьвіваецца ягоная думка.
Яго эсэ разьвіваецца ў двух часавых вымярэньнях. У першай, частцы, скажам так — у рэфэраце, прыгадваюцца й камэнтуюцца прынцыповыя моманты маіх уласных развагаў. Нагадаю, што Эўропа выступае ў іх не як аднародны адносна Расіі культурны блёк, а як шэраг *Sonderwege*, асобных шляхоў, у тым ліку й расійскага, што ствараюць *gradient*, альбо культурны схіл, што паніжаецца ад Атлянтыкі да Ўралу. Відавочна, што гэты “Захад” у шырокім разуменьні слова фармаваў стабільную рэчаіснасьць усёй Эўропы, ад заснаваньня імпэрыі Пятра Вялікага да будовы “рэальнага сацыялізму” Леніным ды Сталіным. Ален Бэзансон прымае сутнасьць маёй парадыгмы і рэлятывізуючай гіпотэзы, таму я ня буду камэнтаваць ягоных

заўвагаў.
У другой частцы свайго эсэ аўтар пераходзіць да “сумыкаў”, што вынікаюць з таго, што я нібыта “не пажадаў узяць пад увагу пэўныя рэчы”, якія Бэзансон спрабуе разьвіваць як “гісторык-кампаратывіст”. Аднак жа, хоць гэтыя “ня ўзятыя пад увагу рэчы” ён прыводзіць як звычайныя “дапаўненьні” да маёй аргумэнтацыі, яго ўсё гучнейшыя развагі нарэшце ператвараюцца ў праўдзівую антытэзу першай часткі эсэ.
У заканчэньні ён сьцьвярджае, што “эўрапейскасьць” Расіі, то бок яе здольнасьць да цывілізаванага жыцьця, вісіць на валаску. Ён нават урачыста заклікае бяспутную Расію сваімі добрымі паводзінамі заслужыць сабе ў будучыні ўваходны білет у праўдзівую Эўропу. Цяпер зірнем, ці магчыма, каб на падставе двухвымернага эсэ Алена Бэзансона нашыя пазыцыі сышліся.

1991 годзе скончыла ўго”.

Тэорыя Рычарда Пайпса

Найперш, аднак, я мушу высьветліць адно непаразуменьне.
У адрозьненьне ад таго, што хоча сьцьвердзіць Ален Бэзансон, я не пісаў сваёй кнігі ў піку Рычарду Пайпсу. Як заўважае наш аўтар, першыя яе накіды зьявіліся ў 1962 годзе. Дадайма, што я прагнуў аспрэчыць модны тады даўні стэрэатып Расіі як краіны, у якой пануе адвечны “ўсходні дэспатызм”. Тады як Рычард Пайпс прадставіў сваю пазыцыю адно ў 1974 годзе (у кнізе пад назовам *Russia under the Old Regime*), пасьля чаго выявілася, што пазыцыя гэтая ёсьць у сутнасьці сваёй мадэрнізаванаю вэрсіяй таго слаўназнанага стэрэатыпу. Паводле новай трактоўкі Пайпса, Расія, ад Маскоўскага княства пачынаючы, акрэсьліваецца як “патрымоніюм”. Гэты панятак аўтар запазычыў у Макса Вэбэра, а азначае ён, што манарх ёсьць уладальнікам зямлі й ейных жыхароў (такі, зрэшты, і традыцыйны сэнс выразу “ўсходні дэспатызм”).
“Арыгінальнейшым” было тое, што для Рычарда Пайпса камунізм быў папросту чырвонай іпастасьсю “маскоўскага патрымоніюму”, у якім марксісцкая ідэалёгія не адыгрывала значнай ролі. У 1974 годзе Пайпс сьцьвердзіў, што “надзвычайныя законы”, уведзеныя Аляксандрам III пасьля забойства свайго бацькі ў 1881 г., з таго часу ўяўлялі сабою — у тым ліку і ў савецкую эпоху — “сапраўдную канстытуцыю

Расіі”. Ён дадаваў, што “расійскі Крымінальны кодэкс быў для таталітарызму” ў Расіі і ўва ўсёй Эўропе тым, чым “была для ідэі свабоды *Magna Charta*”. Дзіўная тэорыя. Калі камунізм — гэта ўсяго толькі чарговая іпастась вечнай Расіі, дык тады немагчыма зразумець расійскую гісторыю XX стагодзьдзя. Твор Рычарда Пайпса як галоўны на сёньня прыклад тэзы пра “азіяцкую” Расію стаецца *ipso facto* найдасканалейшаю антытэзаю маёй уласнай кнігі.

Вяртаючыся да Алена Бэзансона, можна сказаць, што ўсе яго сумневы датычаць стратэгіі “даганяньня Эўропы”, якую Расіі прадыктавала яе адставаньне на крывой, што паніжаецца ад Захаду да Ўсходу Эўропы. Гэтае спазьненьне спарадзіла патрэбу “самаўзьвелічэньня” ў форме “ўяўнага наганяньня”. Першы спосаб самаўзьвелічэньня — рэлігійны, мэсіянскі, фанатычны нацыяналізм, які можна было назіраць ад XVI стагодзьдзя да славянафілаў стагодзьдзя XIX і ажно да посткамуністычнага праваслаўя. На што, аднак, абапіраецца Бэзансон, даводзячы існаваньне гэтай шматвекавой рэлігійнай традыцыі (якую ён, шчыра кажучы, д’ябалізуе)? Калі прыгледзецца да яго пазыцыі, выяўляецца, што яна грунтуецца на старанна падабраных фрагмэнтах гісторыі, якія беспасярэдне ўпісваюцца ў клясычны антырасійскі стэрэатып.

Антырасійскі пагляд

Падбор пачынаецца з манаха Філафея, аўтара дактрыны пра “Маскву — Трэці Рым” (яна датычыла выключна цэркваў і ніколі не вызначала кірунку расійскай дзяржаўнай палітыкі). Далей ён прыводзіць прыклад славянафілаў і некарэктным чынам рэдукуе яго да крайняй пазыцыі Дастаеўскага (ані словам ня згадваючы пра асноўную групу славянафілаў, якая складалася з дробнага дваранства кансэрватыўна-“арганічных” пераканаьняў у стылі Эдмунда Бёрка, прыкладам, Хамякова альбо Аксакава). Выкарыстоўваецца таксама антыпольская цытата з Салжаніцына (які наагул да афіцыйнай царквы ставіцца досыць крытычна). Пры канцы аўтар урэшце згадвае сапраўды неадназначную постаць япіскапа Екацерынбурскага. Робячы гэтую выбарку, Ален Бэзансон дзе-нідзе супярэчыць сваёй місіі гісторыка-кампаратывіста: як прыклад узаемасувязі элемэнтаў рэлігійных і нацыянальных ён прыводзіць адносна

нязначны выпадак Англіі, у той час як гэтая тэндэнцыя праяўлялася паўсюль у Эўропе, ад ультракаталіцкай Ірляндыі да Польшчы, якая сама называла сябе “Хрыстом Народаў”, ня кажучы ўжо пра *gesta dei per francos*.
Зразумела, стасункі паміж усходнімі й заходнімі цэрквамі часьцяком былі й дагэтуль застаюцца складанымі, і нават адкрыта варожымі. Трэба, аднак, мець багатае ўяўленьне, каб казаць пра *“ідэалягічныя “выбрыкі” правіцы, што бунтавалі ў Расіі народ наканадні першай сусьветнай вайны. Яе пагроза была настолькі страшнаю, што я нават цешуся, што ўрэшце перамаглі бальшавікі, а не яна”*. І далей, у высновах: *“Калі б першая сусьветная вайна скончылася трыюмфам Расіі і яна запанавала над паловай Эўропы, усёй Польшчай, Балканамі й Канстантынопалем, як гэта абяцалі ёй хаўрусьнікі, мы, можа, мелі б справу з сумесьсю нігілізму, разьдзьмутага нацыяналізму, расізму й антысэмітызму, які явіла сьвету нацысцкая Нямеччына, толькі ў кантынэнтальным маштабе — нашмат больш грандыёзнай і да таго ж з рэлігійным грунтам пад сабой”*.
Няўжо Ален Бэзансон напраўду хоча нам сказаць, што традыцыйная Расія, выхаваная на сваёй адзінай ідэалёгіі, то бок праваслаўі, рыхтавала нам жудасьці, роўныя тым, якія ўчынілі камунізм і нацызм, разам узятыя?

Імпэрыя?
Гэтаксама суб’ектыўна гучаць заўвагі пра яшчэ адно самаўзьвелічэньне, г. зн. пра “імпэрскую манію велічы”. Пакіньма ўбаку нават тую “пыху”, якую нібыта выклікае вялізарная тэрыторыя краіны. Мы бачым у гэтым адно нацыянальна-патрыятычныя настроі, ня вельмі адрозныя ад тых, якімі кіраваліся некаторыя французскія традыцыяналісты, што, адмоўна ставячыся да прамыслова больш разьвітай Англіі, ухвалялі Францыю як “краіну двухсот гатункаў сыру”.
Сур’ёзьней кажучы, Расійская імпэрыя паўстала такім самым чынам, як і іншыя эўрапейскія імпэрыі, — дзякуючы як геастратэгічным рашэньням, так і нацыянальнай пысе. Сёньня, аднак, гэтая эпоха відавочна мінула. Падзеі апошняга дзесяцігодзьдзя адназначна пераконваюць нас, што небясьпекі расійскага імпэрыялізму ўжо не існуе. У 1991 годзе Расія якга “пазбавілася” ўсіх набыткаў Пятра Вялікага, Кацярыны Вялікай

і Аляксандра II разам узятых. Мы памятаем, зь якою цяжкасьцю Францыя разьвіталася з сваёю імпэрыяй, як галяндцы трымаліся за Ост-Індыю. Натуральна, у Расіі й цяпер ёсьць туга па мінулых днёх велічы на міжнароднай арэне, аднак усе апытаньні грамадзкае думкі сьведчаць пра тое, што яе насельніцтва нязгоднае ахвяраваць нават мінімальныя намаганьні для адбудовы імпэрыі альбо здабыцьця рангу супэрдзяржавы. А нават калі б народ нечага такога захацеў, у Расіі не знайшлося б ані людзкіх, ані матэрыяльных рэсурсаў для дасягненьня згаданай мэты: сьмяротнасьць перавышае нараджальнасьць на 700 000 чалавек у год, гаспадарка разбураная, а войска аслабленае настолькі, што ніяк ня дасьць рады Чачэніі, якая ўваходзіць у склад Расіі. Вартыя жалю жэсты, накшталт дэсанту на аэрадром Прышціны, зробленыя, каб насаліць Захаду, ніяк гэтай сытуацыі не мяняюць.
Што да трэцяга спосабу самаўзьвелічэньня, то бок непапраўнай хлусьні, дык гэты аргумэнт выглядае настолькі надуманым, што мне не застаецца нічога, як толькі запярэчыць. Ці знойдзецца ў сьвеце краіна, якая, дайшоўшы да жабрацтва, ня будзе хлусіць, каб утаіць сваю галечу?

Камунізм

Але, што цікава, у вопісе спосабаў таго, якім чынам расійцы спрабуюць узьвялічыць сябе, складзеным маім сябрам Аленам Бэзансонам, нічога не гаворыцца пра рэальны, вялікі спосаб, апісаньне якога складае кульмінацыйны пункт маёй кнігі, — марксісцка-ленінскую ідэалёгію, якая мусіла дапамагчы дагнаць і перагнаць “капіталістычную” Эўропу й спраўдзіць першую вялікую эўрапейскую ўтопію. Пра мой досьлед гэтага “павароту гісторыі наўпопяць”, зь якога вырасла несапраўднае антыграмадзтва, Ален Бэзансон піша адно тое, што ён “найвядомейшы” і таму “ня вельмі арыгінальны”. Ад аўтара “Інтэлектуальных крыніц ленінізму” можна было чакаць і большага. Мудры пагляд Бэзансона на ідэалёгію калісьці пераконваў значна болей, чымся яго сёньняшнія спэкуляцыі на тэму “расійскасьці” й “праваслаўнай Уммы”. Тым больш шкада таму, што я ў сваёй кнізе скарыстаўся яго досьледамі, якія датычылі гэтай ідэалёгіі “несапраўднасьці”.
Згадайма, нарэшце, некалькі істотнейшых момантаў. Ален

Бэзансон падкрэсьлівае, што культурная крывая праходзіць унутры Расійскай імпэрыі, у якой занядбаны маскоўскі цэнтар панаваў над больш разьвітай Польшчаю й балтыйскімі краінамі. Гэтая акалічнасьць нібыта мусіла — іначай, чымся ў выпадку з Прусіяй — “стрымліваць рэформы”. Тым часам *gradient* унутры абедзьвюх краін паніжаўся акурат у адваротным кірунку. У Расіі ў 1905 г. адукаваныя празаходнія асяродкі ўсё актыўней дамагаліся рэформаў, тады як у бісмаркаўскай Прусіі юнкерска-арыстакратычная канстытуцыя стварала сур’ёзныя перашкоды на шляху да дэмакратыі, за якую змагаліся больш разьвітыя захад і поўдзень Нямеччыны. Не забывайма таксама, што ў той самай Усходняй Нямеччыне колькасьць агентаў “Штазі” на душу насельніцтва значна перавышала долю тых 200 тысяч расійскіх КГБістаў, на якіх наракае Ален Бэзансон.

Быць альбо ня быць расійцам?

Наш аўтар зьвяртае таксама ўвагу на той факт, што расійская літаратура, у адрозьненьне ад заходняй, упарта вяртаецца да пытаньня нацыянальнай тоеснасьці. Але тут гісторык-кампаратывіст не павінен забывацца, што й амэрыканская літаратура — ад Вашынгтона Ірвінга й Лангфэла да Ўолта Ўітмэна, Генры Джэймса й Марка Твэна — таксама “дзяўбе” праблему маладзенькай нацыянальнай ідэнтычнасьці, параўноўваючы яе з старою эўрапейскай, культурна багатаю, але ж сапсаванаю з прычыны адсутнасьці дэмакратыі. Ня кажучы ўжо пра нямецкія спробы вызваленьня з-пад французскай культурнай “апекі”, што назіраліся з часоў Гётэ. У заканчэньні Ален Бэзансон слушна піша пра шматвекавую працу як неабходны чыньнік у працэсе стварэньня цывілізацыйных умоваў у Эўропе — чыньнік, які працуе не на карысьць Расіі. Ён супастаўляе тут прыўкрасныя нямецкія гарады XVI ст. зь вясковаю Масквой тых часоў. Аднак, багатае мінулае ніякім чынам не гарантуе будучыні: і старая Нямеччына, маючы ў багажы Рэнэсанс і Рэфармацыю, і маладая Расія, перажыўшы эпоху Івана Жахлівага й пратапопа-раскольніка Авакума, у 30-я гады XX ст. дайшлі да той самай ступені барбарства. І тысяча гадоў цывілізацыі не ўберагла Эўропы ў першай палове XX ст. ад найкрывавейшай у гісторыі трагедыі.

Так ці іначай, спроба аб'яднаць агульнаэўрапейскія пэрспэктывы маёй кнігі з "дапаўненьнямі" Алена Бэзансона выявілася няўдалаю. Бо, калі верыць Бэзансону, усе тры спосабы самаўзьвелічэньня — рэлігія, імпэрыялізм і хлусьня — і зьяўляюцца той "сутнасьцю" вечнай Расіі, якую ён не прымае і супраць якой скіраваная мая кніга. Ален Бэзансон нават даходзіць да крайняга стэрэатыпу "раба на каленях", які марыць "пра сусьветную імпэрыю" (дэ Кюстын).
Вось жа, з гэтага гледзішча паразуменьне падаецца мне немагчымым, і нам не застаецца нічога іншага, як шчыра прызнаць розьніцу ў нашых паглядах на сутнасьць расійскай гісторыі. Я, прынамсі, ня веру ў тое, што *"форма й роля расійскай дзяржавы, форма й дух расійскага рэлігійнага пачуцьця сталіся (…) перашкодаю"* на шляху збліжэньня Расіі з рэштай Эўропы, ані ў тое, што гэтая краіна застанецца ў няпэўнасьці на скраі бездані, запоўненай сумесьсю камунізму, "коснага" нацыяналізму й "фанатычнай" рэлігіі, якая робіць акцыдэнталізацыю Расіі *амаль невырашальнаю задачай*.
Але, як мудра дадае Ален Бэзансон, *трэба асьцярожна чакаць і назіраць*. Бо культурны *gradient*, што сёньня расьцягваецца па ўсёй Эўропе й фармуецца глябалізацыяю і Інтэрнэт-рэвалюцыяй, тоіць у сабе шмат неспадзяванак. Расія таксама шчэ можа нас зьдзівіць.

Пераклаў зь нязначнымі скарачэньнямі Андрэй Хадановіч паводле часопісу Commentaire *(№89), 1999.*

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 4 (18) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя:
analityka@yahoo.com
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса

Апошняе абнаўленьне: 06-10-2001
[image]

ДАНІЭЛЬ БАВУА
дасьледчык гісторыі Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропы, прафэсар унівэрсытэту Пантэон-Сарбона. Аўтар кніг “Барацьба за зямлю ў Ўкраіне” (1993) і “Гісторыя польшчы” (1995).

Даніэль Бавуа

Палітыка vs Гісторыя між Усходам і Захадам

1.

Для гісторыка Цэнтральна-Ўсходняе Эўропы пытаньне “чаго ня ведае гістарычная навука?” у сэнсе “што там ад нас хаваюць?” гучыць амаль камічна. Фальсыфікацыі і маніпуляцыі на працягу дзесяцігодзьдзяў, ці нават стагодзьдзяў, у гатай частцы сьвету трыюмфавалі настолькі відавочна, што размова пра ману й замоўчваньні ператвараецца ў пералічэньне прыкладаў. Для пачатку на падставе некалькіх зь безьлічы аргумэнтаў можна лёгка давесьці, што фальшаваньне гістарычнае веды пасьпяхова адбывалася тут нават у XX стагодзьдзі. “Іншая Эўропа” падае багата карыкатурных прыкладаў таго, што ўлада заўсёды схільная абапірацца на нібыта аб’ектыўныя й нязьменныя веды. Расейцы, палякі, украінцы ды іншыя народы выпрацавалі такія варыянты даўнейшага й бліжэйшага мінулага, на якія ўплывалі толькі час, месца і палітычная ўлада. Прагнучы падагнаць факты пад тэлеалягічныя візіі, яны

не спыняліся ні перад чым. “Ярмо гісторыі” ў гэтых краінах настолькі цяжкое, што тут упару гаварыць пра “таталітарную гісторыю”, як звычайна гавораць пра “таталітарную дзяржаву”. Бо, прагнучы легітымізаваць гісторыю, палітыка стварыла розныя “каноны”, якімі пасьлядоўна, часта дэманстратыўна, выцясьняла, нат забараняла й табуявала ранейшыя падыходы. Можна было б чакаць, што з падзеньнем савецкага таталітарызму адыдуць у нябыт і створаныя ім мэтады. Здавалася бясспрэчным, што асобны навуковец здольны выступаць з наватарскімі ініцыятывамі, ірвучы любыя путы, ускрываючы “праўды”, пра якія ўсе забыліся ці якіх дагэтуль не ўяўлялі. Але якраз тут і хаваецца ілюзія, якая паўтараецца на кожным з крутых віражоў гісторыі. Бо сёньня сьлед задумацца, ці няма пад гэтымі “новымі праўдамі” палітычнае асновы і ці ня будуць яны непажаданыя для таго ці іншага рэжыму або небясьпечныя для грамадзянскага міру, то бок для палітыкі. Напэўна, французы, якія і праз паўстагодзьдзя адчуваюць небясьпеку высьвятленьня пэўных цёмных старонак пэрыяду Вішы, у стане поўнасьцю зразумець, наколькі невыканальнае патрабаваньне “чыстай праўды”.

2.

Гісторыя чэхаў і палякаў, якую захопнікі ці прыбышы перакульвалі дагары нагамі, перапісваючы або папросту адмаўляючы на карысьць гісторыі “народу-пераможцы”, палітызавалася ўжо на пачатку XX стагодзьдзя. Нямецкая й расейская гістарыяграфіі не адзначаліся схільнасьцю прызнаваць мінулае “негістарычных” народаў. *Kulturkampf* з аднаго боку й русіфікацыя — зь іншага, наступствы векавога ўсебаковага зьнішчэньня культуры, у прыватнасьці, поўнай ліквідацыі вышэйшае асьветы на польскай і чэскай мовах, выявіліся вельмі эфэктыўнымі мэханізмамі асыміляцыі, зьмякчонай хіба што дазволам Аўстрыі вучыцца па-польску ў Кракаўскім унівэрсытэце ды мажлівасьцю атрымаць асьвету прыватна або за мяжой. Гэтым карысталіся непахісныя абаронцы нацыянальнай гісторыі, якая, як і належыць контракультуры, цалкам супярэчыла гісторыі афіцыйнай. У выніку чаго ў назіральніка, што прагне захаваць нэўтра-літэт або знайсьці “ісьціну” *non varietur*, такія радыкальна адрозныя

пастуляты ня могуць не выклікаць сумневаў. Польскай гістарыяграфіі, спароджанай фрустрацыяй, цяжка было пазьбегчы нацыянальнага мазахізму ці, наадварот, услаўленьня пакутніцтва з абавязковым прамэтэізмам і мэсіянствам. Прыклад, узяты з падруч-ніка Сяргея Платонава па расейскай гісторыі (1898), самага папулярнага ў царскай імпэрыі, паказвае, як вялікарасейская ідэалёгія трактавала падзелы Польшчы канца XVIII стагодзьдзя, абгрунтоўваючы расейскую анэксію. Маладых расейцаў вучылі гэтак (і на працягу XX стагодзьдзя гэтыя аргумэнты яшчэ ня раз прыдаліся): *“разбэшчаная”* шляхта парушала правы чалавека, у прыватнасьці, праваслаўных, якія скрозь сутыкаліся толькі з “*праявамі самаўладзтва й жорсткасьці*”, “*нідзе не знаходзячы абароны ад несправядлівага прыгнёту й перасьледу*”, вось Кацярына II і мусіла ўмяшацца ў справы сваіх суседзяў-палякаў, каб пакласьці край “*анархіі*” ў іхнай краіне. За 125 год пасьля Вальтэра, які за пэўны ганарар апеў Кацярыніны *“арміі міру”*, Платонаў без аніякага аналізу палітычных абставінаў апраўдвае арышт *“бунтаўнікоў”* з Барскай канфэдэрацыі, што выступілі супраць Расеі, і вайсковую акупацыю дзеля задушэньня паўстаньня. Пяцістаронкавае апісаньне аднае з самых скандальных анэксій найноўшых часоў расейскі гісторык завяршае фальшыва-наіўным тлумачэньнем: усталяваньне міру заслугоўвала, маўляў, *“кампэнсацыі за страты й стараньні”*, вось частка Рэчы Паспалітай і была анэксаваная; адно шкада, што гэтай нагодай скарысталася Прусія, а Аўстрыя нават захапіла *“расейскую”* Галічыну.

Толькі адышло ў нябыт гэтае прадыктаванае палітычнай гегемоніяй Расеі тлумачэньне, як гістарыяграфія адноўленай у 1918 годзе Польшчы распадаецца, адпаведна, на дзьве асноўныя палітычныя тэндэнцыі. Крыніцы падганяюцца або пад “легітымную” ад XVI стагодзьдзя, нібыта талерантную і адкрытую ягайлаўскую візію полікультурнай Польшчы, куды ўваходзяць розныя, добраахвотна ўзьяднаныя меншасьці, або пад “легітымную” цэлае тысячагодзьдзе візію “пястаўскаю”: дзяржаўнае адзінства й польскае дамінаваньне ў апошняй цэмэнтуе яе, нівэлюючы любыя адметнасьці. Гісторыя часоў Пілсудзкага жывілася першай канцэпцыяй, выкарыстоўваючы спароджаны Рэнэсансам міт фэдэратыўнасьці, і была такой сама спрэчнай, як і гісторыя *à la* Дмоўскі, якая апэлявала да

нібыта гамагеннае нацыі, створанай дынастыяй Пястаў, эпохі Позьняга Сярэднявечча. Зрэшты, абодва падыходы, кожны зь якіх прадугледжваў выразна тэндэнцыйнае выкарыстаньне крыніцаў і мітаў, пратрымаліся толькі два дзесяцігодзьдзі. Падзел краіны паміж Нямеччынай і СССР у 1939—1941 гадох, а пасьля й нямецкае панаваньне да 1945 году выклікалі новае руйнаваньне гісторыі, запраграмаванае палітычнымі рэжымамі, што адмаўлялі палякам нават у захаваньні знакаў іхнае калектыўнае памяці. Зачыняліся ўнівэрсытэты ды школы, што там — нават музэі ды бібліятэкі, зьнішчаліся й замяняліся на сымбалі таталітарнае ўлады мэмарыяльныя знакі. Знайшоўшы прытулак у падпольных школках, гераічна культываваная гісторыя магла карыстацца толькі спрошчанымі, часта маніхейскімі схемамі, што адмаўлялі саму магчымасьць якіх бы там ні было плённых нямецка-польскіх ці расейска-польскіх стасункаў.

3.

Тым часам, пачынаючы з 20-х гадоў, пад кіраўніцтвам палітызаваных дазваньня ідэолягаў Пралеткульту, Расея распрацавала марксісцкую вульгату ўласнае гісторыі, згодна зь якой уся мінуўшчына ўяўлялася толькі доўгім, зь безьліччу пастак, шляхам расейцаў да выратавальнага сьвятла пралетарскае рэвалюцыі. Народ, пераважна пасыўныя сяляне, даведаўся, што ягоныя продкі-прыгонныя яшчэ паўстагодзьдзя таму толькі й марылі, што пра барацьбу на барыкадах пад кіраўніцтвам рабочае эліты. Усё, што яны шанавалі стагодзьдзямі — цар, пан, поп, — тут жа адпрэчвалася. Не марнуйма часу на агульнасьці: савецкая гістарычная навука прагнула стаць вянцом гісторыі. Марксізм раскрываў “сэнс гісторыі”, а кожнага, хто гэта аспрэчваў, зьмятаў са шляху ейны “лякаматыў”.

Аднак суперніцтва, а пасьля й канфлікт гэтага таталітарызму з нацызмам адрадзілі патрыятычныя й імпэрыялістычныя матывы, што даказалі выразную пераемнасьць савецкае і колішняе вялікарасейскае ідэалёгіі. “Культ асобы” (фактычна — абагаўленьне) Сталіна мог даць фору культу цара. Шэраг мітаў і стэрэатыпаў паходжаньнем з царскіх часоў і надалей рабілі гісторыю дапаможным сродкам замежнай і

нацыянальнай палітыкі Крамля. Галоўным лёзунгам, як і за царскіх часоў, было яднаньне вакол Масквы ў “*адзінае цела й душу*” захопленых нерасейскіх тэрыторыяў; у падручніках па гісторыі савецкая імпэрыя вярнулася да падставовых мітаў царскага “единонеделимства”: пра так званую Кіеўскую Русь, пра “Маскву — трэці Рым” ды пра “зьбіраньне” земляў сібірскіх, “вяртаньне” земляў “літоўска-рускіх”, “добраахвотнае” далучэньне Грузіі й г. д. З таго часу даўнейшая асымілятарская роля праваслаўя перайшла да марксізму — новае дзяржаўнае рэлігіі, што цэмэнтавала савецкую радзіму.

4.

Пасьля 1945 году незьлічоная армія гісторыкаў Цэнтральна-Ўсходняе Эўропы, вымушаных падкрэсьліваць сувязі сваіх краінаў з колішняй Расеяй ці сёньняшнім СССР, распачала легітымізацыю беспрэцэдэнтнай савецкай экспансіі на Захад. Намаганьнямі польскіх гісторыкаў, згуртаваных у пэўных інстытутах (Уроцлаў, Катавіцэ), Сылезія і Ўсходняя Прусія згадалі сваё славянскае мінулае, пра якое анігадкі не было восем стагодзьдзяў; сталінскія анэксіі абгрунтоўваліся й ідэямі расейскіх панславістаў XIX стагодзьдзя, хоць у царскія часы нельга было ўявіць большых рэтраградаў і нацыяналістаў, чым гэныя. Канцэпцыі славянізму, навязаныя пасьля далучэньня “зямель адзысканых”, дазволілі “аднавіць” адчуваньне “відавочнай” прыналежнасьці да польскага (а праз гэта й славянска-савецкага) сьвету тэрыторыяў, афіцыйна выкрасьленых з памяці ў цяжкія для Польшчы часы.
Імпэрская ідэя, гэты стрыжань расейскае палітыкі — царскай, камуністычнай і, як штодня пераконваемся, посткамуністычнай, — абапіралася й надалей здольная абапірацца толькі на адмаўленьне й скрыўленьне гісторыі земляў, якіх Расея прагне “ўзьяднаць”, то бок паглынуць і асымільваць.
Гісторыя Ўкраіны асабліва паказальная з пункту гледжаньня такой гістарычнай апрацоўкі (тут слова “апрацоўка” набывае вузкамэдыцынскі сэнс ампутацыі памяці, лабатаміі). З-за забароны ўкраінскае мовы ў часы Кацярыны II, калі гэты край толькі перайшоў пад расейскі ўплыў, напісаць гісторыю

ўласнай краіны ўкраінцы змаглі толькі пры канцы XIX стагодзьдзя, і то на аўстрыйскай тэрыторыі (Антановіч, Грушэўскі). На землях, далучаных да Расейскае імпэрыі, улада і ейныя падбрэхічы-гісторыкі насаджалі ўяўленьне, нібыта тутэйшы люд складаўся з адных сялянаў і, пазбаўлены эліты, ня меў уласнае гісторыі. Дзякуючы ўмела закручанай блытаніне, што была выкліканая перш за ўсё лексычным і фанэтычным падабенствам ува ўкраінскай і расейскай мовах словаў *“руський”* і *“русский”*, гісторыкі-панславісты да 1917 году лічылі ўкраінцаў часткай “русского народа”, а Пераяслаўская дамова 1654 году, якая нібыта містычна змацавала ўзьяднаньне (усё яшчэ нетрывалае) Кіева з Масквою, а адсюль і Санкт-Пецярбургам, разглядалася як падзея непрапарцыйна вялікага, амаль тэлеалягічнага значэньня.

5.

Міжнародная палітыка таксама істотна ўплывала на замежнае (у прыватнасьці, заходняе) бачаньне славянскае гісторыі. Скажам, калі ў 1892 годзе Францыя шукала, куды б інвэставаць капіталы і з кім бы ўтварыць моцны саюз супраць Нямеччыны, яе зусім не зьбянтэжыла, што Расея — аўтакратычная й ксэнафобская дзяржава антысэмітаў і рэтраградаў. Абклаўшыся належнымі дакумэнтамі, падсунутымі Пецярбургам, французскі гісторык пачынае ляпіць гэтаму калёсу на гліняных нагах вобраз спакойнага волата. “Імпэрыя цароў і расейцы” Анатоля Лёруа-Бальё (A. Leroy-Beaulieu. *L’Empire des tsars et les Russes*, 1894) — люстэрка, у якім расейцы выглядаюць так, як ім даспадобы, — сьцьвярджае, што інкарпараваная Польшча раскашуе, а праглынутая Ўкраіна цалкам скарылася. Якраз гэтая кніжка (перавыдадзеная й напрыканцы XX стагодзьдзя) стварыла ў Францыі вобраз Украіны, які расейская ўлада падтрымлівае дасёньня:

“Калі нават уявіць сабе, што хтосьці, скажам, паэт Шаўчэнка альбо ўкраінафілы, захацеў бы, вяртаючыся да плянаў Мазэпы й Хмяльніцкага, зрабіць Маларосію незалежнай як ад Расеі, так і ад Польшчы, гэтыя мроі знайшлі б сярод маларосаў гэткі ж нязначны водгук, як і праекты Паўднёвай лігі на поўдні Францыі ў 1870—1871 гадох... Украінафільства й маларасійскія паэты пагражаюць Расеі ня больш, чым

адраджэньне правансальскае літаратуры — адзінству Францыі...”

6.

Інтэлектуальная млявасьць Захаду й нежаданьне ўскладняць зручныя дыпляматычныя зносіны з маналітнай дзяржавай выклікалі наўмысную абыякавасьць да ўкраінскага пытаньня (Францыя ненадоўга зацікавілася ім хіба што ў 1919 годзе, калі маладой савецкай уладзе было не да таго). Такі падыход толькі ўзмацніўся ў сталінскую й пасьлясталінскую эпохі. Аднак уражвае й унутраная цэнзура ўкраінскага гісторыка, які, напісаўшы ў 1960 годзе найбольшае расейскамоўнае дасьледаваньне пра сялянства Правабярэжнай Украіны ў XIX стагодзьдзі, не згадаў нацыянальных украінскіх рэалій (гл. Пойда В. *Крестьянское движение на Правобережной Украине в пореформенный период, 1860—1900*. — Днепрапятроўск, 1960). На той час савецкая палітыка выпрацавала догму “сусьветнага” адзінства ўсіх працоўных. То бок можна было вывучаць толькі недыфэрэнцыяваны сялянскі сьвет, не падкрэсьліваючы культурных адметнасьцяў украінцаў, расейцаў, палякаў, жыдоў і немцаў, якія жылі на гэтых землях разам. Вылучалася толькі — вядома, у паяднаньні з рабочым рухам — сялянства, якое празь незьлічоныя стыхійныя паўстаньні праставала (нас запэўнівалі, што цалкам сьвядома) да рэвалюцыйнага апатэозу лістапада 1917 году. Гэтая маніхейская “лёгіка гісторыі”, што не дапускае аніводнага плюралістычнага падыходу, ня так даўно займела пасьлядоўнікаў на Захадзе. Як Лёруа-Бальё, што апяваў французам, прагным да прыбытковых інвэстыцыяў, магутнасьць царызму, гэтак і амэрыканскія гісторыкі-марксісты нават у 1987 годзе не ўяўлялі сабе Ўкраіны іначай, як “Паўднёва-Заходняй Расеі”. Паслужліва перапісваючы працу згаданага Пойды (ці іншых савецкіх спэцыялістаў у сялянскім пытаньні), гэныя гісторыкі й за тры гады да абвяшчэньня незалежнасьці Ўкраіны маглі прапанаваць амэрыканцам толькі карыкатурны савецка-імпэрскі мэтад мэханічнага падліку сялянскіх паўстаньняў (гл., напрыклад Edelman R. *Proletarian Peasants: the Revolution of 1905 in Russian South-West*, 1987). Дык ці варта зьдзіўляцца, што, ня ведаючы — а хутчэй не жадаючы ведаць — гісторыі, нашыя дыпляматы ў Дамове 1992 году пра

дружбу між Францыяй і Расейскай Фэдэрацыяй афіцыйна пагадзіліся прызнаць “дзяржавай-праваперaемніцай” СССР тую самую Расею, якая ў хуткім часе засьведчыла ў Чачэніі поўнае нежаданьне дэкалянізавацца?

Тое, што цытаваная вышэй кніжка, у якой паслухмяна паўтараецца прадыктаваная Масквой лекцыя, належыць амэрыканцу, не азначае, што французская гістарыяграфія здолела пазьбегчы небясьпекі мімэтычнае гісторыі, якой кіруюць з дапамогай палітычнага пульту. У сталінскую й пасьлясталінскую эпоху расейскую гісторыю ў Францыі выкладалі так, як гэтага жадаў СССР. Ж.-Ф. Сырынэлі, П. Ары, Ф. Фюрэ й іншыя слушна пісалі пра савецкія ўплывы на французскую думку ў 1950—1970 гадох. Гэты ўплыў *a fortiori* можна знайсьці ў дасьледчыкаў Усходняй Эўропы. Ён прысутны і ў выдаваным Вышэйшай школай дасьледаваньняў з грамадзкіх навукаў часопісе “Cahiers du Monde russe et *sovéitique*”, які толькі нядаўна пачаў ацэньваць аб’ект свайго дасьледаваньня больш аб’ектыўна і многія рэдактары якога ўваходзілі ў таварыства “Францыя—СССР”. Калі на чале катэдры гісторыі славянаў, створанай у Сарбоне ў 1960 годзе, стаў Ражэ Парталь, яна амаль цалкам ператварылася ў асяродак расейскай і савецкай гісторыі. Прыкра, але такія асацыяцыі гэты цэнтар, які я маю гонар узначальваць, шмат у каго выклікае дагэтуль. Надзвычай выразным прыкладам уплыву палітыкі на гістарычнае дасьледаваньне зьяўляецца апошні разьдзел Парталевай кніжкі “Славяне” (Portal R. *Les Slaves, peuples et nations*, 1965). У гэтым аб’ёмным дасьледаваньні, якое мае падзагаловак “Да зьбіраньня славянскіх народаў у 1917—1960 гадох”, гучна заяўляе пра сябе “лёгіка інтарэсу”, якая мелася прывесьці да стварэньня “сымбіёзу” народаў, кіраваных “аўтарытэтнай савецкай мадэллю”. Пасьля зьненавіднай эпохі нацыяналізмаў XIX стагодзьдзя, што спарадзілі комплексы вышэйшасьці ў пэўных членаў славянскае сям’і, зьявіўся “чалавек-камуніст”, пазбаўлены гэтых забабонаў. Пасьля гэтага сталася магчымым ажыцьцяўленьне “сацыялістычнай мары братніх народаў”, і пачалося гэта з “народнага саюзу” з Украінай і Беларусяй. Вайна, лічыць Парталь, “*засьведчыла сілу сувязяў, што зьядналі расейцаў і ўкраінцаў у адзіным патрыятычным пачуцьці*” — насуперак украінскаму незалежніцкаму руху й супрацоўніцтву

з нацыстамі; дзякуючы вайне, “*апазыцыя засталася ў мінулым*”. Ня згадваючы пра жахлівыя наступствы выкліканага прымусовай калектывізацыяй галадамору, Парталь сьцьвярджае, што дзякуючы рэвалюцыі 1917 году ўкраінская культура “*ўсё ж у цэлым выйграла*”.

І хоць згаданае дасьледаваньне Парталя, што доўга заставалася адзіным на гэтую тэму, было напісанае ў 60-х, аўтар знаходзіў у Сталіна толькі “старэчыя выбрыкі” і зь відавочнай паслужлівасьцю апяваў дух савецкай культуры, якая нібыта выкарыстоўвае лепшыя славянскія рысы для дасягненьня высокіх ідэалаў. Іншыя славянскія народы Парталь апісвае таксама ў поўнай адпаведнасьці з накінутым маскоўскай палітыкай канонам, і зноў ягоная хлусьлівая паблажлівасьць ператварае гісторыю ў гімн савецкай “пратэкцыі”. Вочы на лоб лезуць, калі чытаеш сёньня, што польская культура ў 1945—1949 гадох раскашавала “ў атмасфэры свабоды слова” — дастаткова згадаць насаджваньне аднапартыйнасьці якраз у той час. Здаецца, што трызьніш, калі чытаеш во гэткае: пасьля 1949 году ў Польшчы *“не прыціскалі вольнай думкі”*, а пабудова мэталюргічнага комплексу ў Новай Гуце, за два крокі ад Кракава, сівое сталіцы Кароны, была, уласна, удалым спосабам *“надаць дынаміку”* гэтаму *“месту пэнсіянэраў”*. Тут бачым поўную адпаведнасьць зь лёзунгамі камуністычнай прапаганды. Адначасова ў гэтага французскага гісторыка, што ня грэбуе стэрэатыпамі, міжволі праглядаецца атавістычны недавер расейцаў да палякаў: гэтыя заходнія славяне, піша ён, “*занадта зацятыя і няўрымсьлівыя*”. Гісторыю славакаў падсумоўвае карыкатура з славацкай камуністычнай газэты: трыюмф працаўніка над капіталістамі, завадатарамі гонкі ўзбраеньняў. Гісторыя баўгараў і югаславаў перакручаная не настолькі, але таксама адлюстроўвае “*набліжэньне да сацыялізму*”. Агульная выснова Парталя надзвычай дакладна дэманструе, якую палітычную лінію навязваў гэты тып гістарыяграфіі: “*Тое, што новы (мар-ксісцкі) досьвед чалавецтва паўстае акурат у Эўропе, перадусім сярод славянскіх народаў, схіляе да думкі, што, хоць бацькам марксізму й быў немец, само вучэньне ўпершыню было ажыцьцёўленае ў расейскіх рэаліях…*”

7.

Мінулі тры дзесяцігодзьдзі. Цяпер такому погляду на гісторыю замінае крах савецкага міту, але жывучасьць расейскага імпэрыялізму не кранае толькі французскіх дыпляматаў. Сёньня, як і раней, Вялікая Расея выклікае захапленьне; поруч з працамі, цалкам вольнымі ад гэткай залежнасьці, зноў выходзяць кніжкі, дзе ці то з прычыны інэрцыі, ці то з прычыны нежаданьня зьвяртацца да арыгінальных дакумэнтаў, у галовы французскіх студэнтаў убіваюць імпэрскае бачаньне разь-віцьця Расеі, такое любае шмат якім расейскім палітыкам. (Гл. напрыклад: M.-P. Rey. *De la Russie A l'Union Soviétique: la construction de l'empire 1462—1953.* — Paris, 1994.) Аўтарка сабрала тут усе клішэ панславісцкае й савецкае гістарыяграфіі: яна цьвердзіць пра існаваньне Кіеўскай Русі, разглядае падзел Польшчы як справядлівае вяртаньне тэрыторыяў, а экспансію на Ўсход ня лічыць калянізацыяй, ігнаруе рэлігійныя й міталягічныя чыньнікі ў разуменьні імпэрыі, заяўляючы, што "*імпэрыя... зважала на нацыянальную спэцыфіку*", і робіць шэраг памылковых ацэнак, самая прыкметная сярод якіх — ацэнка савецкай інтэрвэнцыі ў Польшчу ў 1939 годзе).
Вядома, дзіўная жывучасьць поглядаў адпавядае млявай талерантнасьці нашых палітыкаў да злачынстваў расейскага імпэрыялізму. Мажліва, усё памяняецца з адбываньнай на Захадзе зьменай інтэлектуальнага шаблёну? Шанцаў на такі варыянт меней у саміх славянскіх краінах, дзе палітыка па-ранейшаму нашмат больш уплывае на навуку, чым нам гэта звычайна здаецца.

8.

Разгром гістарычнай навукі ў былых савецкіх рэспубліках, несумненна, дагэтуль належна не апісаны. Беларускі навуковец Валянцін Грыцкевіч кажа, што мэта выкладаньня гісторыі ў Менску, як і ў Маскве палягала найперш у перадачы тых надзвычай абмежаваных ведаў, якія замкнулі б студэнтаў у глухім ідэалягічным коле легітымізацыі дзейнага ладу й апалягетызацыі пралетарскага руху й клясавае барацьбы. Якраз дзеля гэтага й марнавалі час на вывучэньне нідзе больш не вядомых дысцыплінаў — гісторыі КПСС, "марксісцка-ленінскай філязофіі", палітэканоміі сацыялізму, а пасьля нэасталінісцкай рэформы Суслава — навуковага камунізму, марксісцкай

эстэтыкі, прынцыпаў навуковага атэізму. І, як вынік — закасьцянелы дагматызм, а для некаторых з часам шызафрэнія. У такіх абставінах выкладчыкі ператвараліся ў такую сабе ідэалягічную паліцыю. Таму, паглынуты ўсяладнай палітыкай гісторык не патрабаваў ужо ні архіваў, ні бібліятэкаў, а па пераліку ягоных працаў цалкам зразумела, якія “спэцыялізацыі” яшчэ нядаўна шанаваліся ўладай.
У 1991 годзе ў Беларусі налічвалася 1200 гісторыкаў з унівэрсытэцкай асьветай, зь іх 600 кандыдатаў навук і 80 дактароў. 90 % дысэртацыяў было прысьвечана Савецкай Беларусі, 58 % — гісторыі партыі. Яшчэ дасьледавалі розныя аспэкты выкананьня пляну бягучай пяцігодкі. У 1985—1986 гадах Беларускі дзяржаўны ўнівэрсытэт меў дзьве катэдры гісторыі партыі, дзе працавалі 48 асобаў, зь іх 6 дактароў і 33 кандыдаты навук. Акрамя таго, на трох катэдрах гісторыі Савецкай Беларусі й СССР былі сабраныя 33 “навукоўцы” (сярод іх 4 дактары й 26 кандыдатаў). У 1989 годзе, напалоханыя дэмантажам старых структураў, гэтыя спэцыфічнага кшталту навукоўцы стварылі таварыства гісторыкаў, якія паставілі сабе за мэту “крытыку рэакцыйных і нацыяналістычных тлумачэньняў гісторыі”. Насуперак эфэмэрным посьпехам нешматлікіх удзельнікаў шматдысцыплінарнай Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, узначаленай высокапаважаным прафэсарам Мальдзісам, старыя кадры ўзялі верх пасьля вяртаньня Беларусі пад расейскі ўплыў. Вядома, малаверагодна, што ў новыя часы могуць стаць зноў запатрабаваныя тэмы-лёзунгі “Гістарычная праўда супраць фальсыфікатараў”, “Пад кіраўніцтвам Ленінскай партыі”, “Разьвіцьцё дэмакратычных прынцыпаў у кіраваньні калгасамі” ці “Навуковы падыход у партыйнай працы”, але брак належнай адукацыі, мэтадаў ды ініцыятывы, відаць, выкліча значнае зьніжэньне інтэлектуальнага патэнцыялу, узмоцненае адарванасьцю ад сьвету й няведаньнем заходніх моваў. Вельмі мала ў Беларусі гісторыкаў, здольных працаваць у расейскіх, чэскіх, польскіх ці ўкраінскіх архівах, а дапасьці да заходняга часопісу сёньняшнія фінансавыя абмежаваньні перашкаджаюць ня менш, чым колішнія ідэалягічныя. Прыкрая звычка перапісваць папярэднікаў можа трываць і далей, таму нялішне будзе ў сябе запытацца, ці ня зробіць вяртаньне пад засень расейскага гіганта старую мэтодыку вечнай.

9.

Спробы пранікнуць у гісторыю Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропы звонку, пераадолеўшы заслону сакрэтнасьці й расейскіх фальсыфікацыяў, заўжды былі надзвычай рызыкоўнымі, хоць і не безнадзейнымі. Ад часоў “Расеі ў 1839 годзе” маркіза дэ Кюстына вядома, што засакрэчанасьць і хаваньне крыніцаў зьяўляюцца складнікамі мясцовага спосабу кіраваньня: улада тым страшнейшая, чым менш вядома, на што яна здольная. Жалезная заслона мела адно-аднюсенькае прызначэньне: дэманізуючы сьвет за ёй, ня даць усьвядоміць, “што дзеецца ў нас”. ...Шматлікія фонды расейскіх архіваў, зачыненыя за царскім часам, засталіся закрытымі і ў савецкія часы: напрыклад, ні габрэйскія справы, ні матэрыялы, зьвязаныя з экспансіяй на Каўказе, у Казахстане й на Далёкім Усходзе так і ня трапілі ў рукі замежных дасьледчыкаў. Дый Сібір, калі б не дысэртацыя Ф.-К. Какена 1969 г. (F.-X. Coquin. *La Sibérie: peuplement et immigration paysanne au XXe siécle*), так і засталася б заімглёным і мітычным абсягам катаргі й ссылкі, а неўзабаве й злавеснай туманнасьцю Архіпэлягу Гулаг. Да незьлічоных сацыяльных маніпуляцыяў часоў Мікалая I дадаліся сталінскія дэпартацыі, якія мелі на мэце “канчатковае вырашэньне” некаторых нацыянальных праблемаў. Увогуле, такія рэчы здараліся й раней, але да канца XX стагодзьдзя заставаліся малавядомымі. Напрыклад, гісторыя дэклясацыі й драматычнай барацьбы 450 тысячаў украінскіх палякаў, якіх у 1831—1850 гадох поўнасьцю пазбавілі свабоды, прыпісаўшы да сялянаў, заставалася ахутанай заслонай маўчаньня, і гэта пры тым, што ў 1870—1900 гадох іх *manu militari* выгналі са сваіх дамоў. А што казаць пра “навяртаньне” ў праваслаўе адным росчыркам пяра двух з паловай мільёнаў літоўскіх, беларускіх і ўкраінскіх сялянаў-уніятаў у 1839 годзе? Абрысы гэтай вялізнай калектыўнай драмы, схаванай дзякуючы непранікальнасьці расейскай мяжы й абыякавасьці Захаду (які заўжды лічыў гэтую частку Эўропы іншым сьветам, дзе можна ігнараваць уласныя ж прынцыпы), пачынаюць вымалёўвацца толькі цяпер, калі палітычны кантроль за доступам да расейскіх архіваў саслабнуў.

Дваццаць год таму, калі, пачаўшы вывучаць невядомы тады

пагром польскай культуры ў XIX стагодзьдзі на літоўска-беларускіх землях, анэксаваных Расейскай імпэрыяй, я намагаўся высьветліць, як галоўны асяродак гэтай культуры, Віленскі ўнівэрсытэт, і сотні пачатковых і сярэдніх школаў былі поўнасьцю “стэрылізаваныя” ў 1831—1832 гадох, перада мной паўстала безьліч палітычных перашкодаў. Патрэбныя архіўныя матэрыялы дагэтуль не вывучаліся, бо сьведчылі пра страшнае вынішчэньне культуры пасьля паўстаньня 1831 году. Акрамя замоўчваньня з-за салідарнасьці савецкай улады з царскім рэжымам, дадалося яшчэ й табу, зьвязанае з паўторнымі сталінскімі анэксіямі Вільні й Літвы ў 1940 і 1944 гадох. Чалавек з Захаду, хай сабе яму трэ былі толькі гістарычныя зьвесткі (а можа якраз таму, што трэ былі гістарычныя зьвесткі), выклікаў найгоршыя падазрэньні.

У тыя часы палітычныя перашкоды на шляху гістарычнае веды ставілі адкрыта і ўпэўнена. Гісторыкам вядомы цэлы арсэнал перашкодаў, вынайдзеных уладамі. Найпрасьцей было прыдушыць ініцыятыву, не адказваючы на просьбы падаць інфармацыю паводле каталёгаў, абагульненых і заблытаных настолькі, што ніхто ня мог знайсьці справы без дапамогі. Часам пасьля доўгіх пісьмовых просьбаў прыходзіў адказ з пазнакай нерэальнага тэрміну. Звычайна расчараваньне прымушала пакідаць спробы, хоць самыя ўпартыя нястомна зьвязвалі разарваную нітку й дабіваліся-ткі паездкі на месца як, скажам, прадстаўнікі Нацыянальнага цэнтру навуковых дасьледаваньняў або іншых інстытуцыяў (варта адзначыць, што англасаксы тут былі заўжды больш упартымі, чым французы). Для перамоваў з пэрсаналам архіву аднаго толькі веданьня мовы было замала. Дасьледчык мусіў навучыцца падкупаць супрацоўнікаў ніжэйшага зьвяна, якім інструкцыя загадвала выдумляць безьліч ускладненьняў, каб нададзены заходняму навукоўцу час марна сплываў у хлусьлівых абяцаньнях і бясконцым чаканьні. Калі ж “навуковы кіраўнік”, які нібыта лепей ведаў, што трэба дасьледаваць, раз у год і выдаваў табе стос справаў, аказвалася, што яны зусім не па тэме. Час мінаў і паступова аддалялася небясьпека, што прыхадзень нешта знойдзе. А калі ён патрабаваў нейкую канкрэтную справу, яму адказвалі, што яна зьнішчаная падчас вайны, перададзеная на рэстаўрацыю або выдадзеная камусьці з савецкіх калегаў.

Ці ня самай паказальнай палітычная залежнасьць была ў Кіеве.

Неяк, заўважыўшы маю роспач, дырэктарка архіву з кранальнай адкрытасьцю патлумачыла, што якраз зьдзяйсьненьне такой абструкцыі й ёсьць заданьнем архівістаў, бо “гісторык-замежнік можа апублікаваць факты насуперак інтарэсам нашага ўраду”. Ведаючы, што замежныя навукоўцы часта ідуць на хітрыкі, зьмяняючы тэму сваёй працы, каб яна стасавалася з марксісцка-ленінскім пустаслоўем (маё дасьледаваньне польскай шляхты ва Ўкраіне афіцыйна было прысьвечана капіталістычнай эксплюатацыі сялянаў панамі), дырэктарка адразу ж падала прыклад абсалютнага зла: амэрыканскі дасьледчык, які нібыта вывучаў жыцьцё ўкраінскай жанчыны ў XIX стагодзьдзі, меў нахабства напісаць, што ў XX стагодзьдзі яе лёс істотна не зьмяніўся. Таму, цалкам у нацыянал-бальшавіцкім духу падвяла рысу начальніца, *“ня варта гаварыць пра тое, што перашкаджала разьвіцьцю Ўкраіны ў мінулым”*.

Аднак хаваньне інфармацыі не было ўсёахопным. Немажліва было пераканаць усіх архівістаў у тым, што хлусьня й хітрыкі зьяўляюцца выкананьнем важнай палітычнай і патрыятычнай місіі: падазронасьць і замоўчваньні ўрэшце надакучвалі. Кожны дасьледчык, хай нават і патэнцыйны “вораг”, мусіў памятаць, што ў краіне Гогаля яму заўжды прыдасца эфэкт “рэвізора”: дастаткова прыпісаць сабе таямнічую і значную ролю ў гіерархіі, каб заўважыць боязь у вачах суразмоўцы й атрымаць раней недасяжныя скарбы. Нарэшце, дапамагала й своечасова падсунутая банкнота — хабары, распаўсюджаныя ў царскай Расеі, заставаліся рухавіком грамадзкага жыцьця і ў камуністычныя, і ў посткамуністычныя часы.

10.

Можна шмат чаго напісаць пра расейскую схільнасьць да сакрэтнасьці, гэтую сапраўдную нацыянальную манію. Маем ужо дастаткова дасьледаваньняў пра жахлівыя фальсыфікацыі й замоўчваньні ў савецкай гістарыяграфіі, як у выпадку з таямнічымі пратаколамі да пакту Рыбэнтропа-Молатава, існаваньне якіх адмаўлялася да 1989 году, або з адмовай СССР прызнаваць сваю адказнасьць за масавыя забойствы ў Катыні, ці са зьнікненьнем і зьяўленьнем на групавых фатаздымках выяваў рэпрэсаваных, а пасьля рэабілітаваных палітыкаў і г. д.

Апісанае й тое, як ствараласа ў літаратуры, кіно, выяўленчым мастацтве й музыцы іканаграфія “пазытыўных герояў”. Такім чынам, зьяўляецца вельмі спакусьлівая думка, што ўсё ўжо сказанае альбо будзе сказанае, бо няма больш ні абмежаваньняў, ні перашкодаў.

Першымі на Ўсходзе гэтай эўфарыі паддаліся палякі. Яшчэ ў 1956 годзе камуністы-рэвізіяністы адчынілі шафу гісторыі, дзе на працягу двух дзесяцігодзьдзяў пыліліся невядомыя шкілеты: якраз тады Польшча пачула імёны партыйных дзеячаў, зьнішчаных Сталіным у 1937—1938 гадох; пазьней надышоў час рэабілітацыяў, вяртаньняў зь лягераў, ушанаваньня Арміі Краёвай і некамуністычнага Супраціву. Паступовае ўзмацненьне супярэчнасьцяў у часы Гамулкі й Герка засьведчыла, што гісторыя можа ўзяць рэванш над палітыкай: Курань, Мадзалеўскі, Міхнік, Герэмэк былі прафэсійнымі гісторыкамі. Стварыўшы ў 1976 годзе Камітэт абароны працоўных (KOR), інтэлектуалы справакавалі выбух грамадзянскага патрыятызму; першыя публікацыі ў самвыдаце выліліся хутка ў вялізную хвалю брашураў і часопісаў, якія ўрад вымушаны быў трываць: *“Zapis”, “Puls”, “Spotkania”, “Głos”, “Droga”, “Krytyka”* і г. д. Паступова адбываецца новае вяртаньне гісторыі й запаўненьне прагалінаў, пакінутых трыма дзесяцігодзьдзямі сьвядомай амнэзіі. Пасьля ўздыму “Салідарнасьці” ў 1980 годзе сьвядомыя гісторыкі адным са сваіх галоўных заданьняў бачылі арганізацыю дыскусіі пра перагляд навучальных праграмаў і падручнікаў гісторыі. Ува ўнівэрсытэтах прайшоў шэраг калёквіюмаў, прысьвечаных “белым плямам”. Трыццаць пяць год палітычнага маніпуляваньня гісторыяй аказаліся марнымі.

Нягледзячы на вайсковае становішча, за часоў генэрала Ярузэльскага праца памяці працягвалася. У 1982 годзе пад рэдакцыяй Пятра Міцнэра пачаў выходзіць ценкі часопіс *“Karta”*, які памнажаўся на рататоры. У ім, між іншага, друкаваліся літаратурныя нарысы пра савецкія лягеры. Сьведчаньняў пра перажытае шторазу большала, і ў 1987 годзе яны акрэсьлілі спэцыфіку часопісу, які адмыслова стварыў для гэткіх задачаў *“Archivum wschodni”*. Адзначым, што ў той самы час расейскія гісторыкі, цалкам незалежна, але з аналягічнай мэтай, заснавалі “Мэмарыял”. Яны таксама пачалі выдаваць часопіс і неўзабаве займелі вялізную сетку дапісчыкаў.

Абедзьве рэдакцыі цяпер актыўна супрацоўнічаюць, гэткая самая структура створаная ў Кіеве, і ў гэтым трыкутніку працягваецца плённы абмен інфармацыяй.
Ці азначае гэта, што палітыка ўжо не мяшаецца ў справы гісторыі? Зрабіўшыся не такім відавочным, палітычны ўплыў хіба толькі стаў больш далікатным. Дый хіба можна сабе ўявіць гісторыю па-за павевамі эпохі? Хіба можна было пазьбегчы гісторыі зьвядзеньня рахункаў, якая першай пачала стварацца пасьля вырашальнага пералому 1989—1990 гадоў? "Аўтэнтычная", "сапраўдная" гісторыя, абвешчаная новымі гісторыкамі (часьцяком, уласна, старымі — эманцыпаванымі або апартуністамі) адразу спавясьціла пра ганебны характар і злачынствы папярэдняга пэрыяду, і помсьлівы дух новае гістарычнае эпохі выклікаў ува ўрадавых і партыйных установах паніку, у выніку чаго апошнім злачынствам старога рэжыму стала зьнішчэньне дакумэнтаў (прынамсі, тых, што кампрамэтавалі адказных асобаў). Іх выводзілі са звароту, выкрадалі, зьнішчалі. Давялося ствараць адмысловую камісію для нагляду за рухам матэрыялаў у Міністэрстве ўнутраных справаў. Хутка зьнішчаць дакумэнты забаранілі заканадаўча. У 1991 годзе рэформу польскай архіўнай сыстэмы ўзначаліў вядомы гісторык, прафэсар Ежы Скаўронак. Партыйныя архівы перайшлі ў распараджэньне Акадэміі навук.
Аднак паўстаў цэлы шэраг праблемаў, якія досыць хутка паказалі, што стэрылізаваная гісторыя, пазбаўленая зацікаўленага дасьледаваньня бяз пэўных асноваў, непрымальная. Перш за ўсё, нягледзячы на паўсюдны трыюмф рынкавай эканомікі, адбылося агульнае зьбядненьне. Мала таго, што брак сродкаў адбіваўся на колькасьці архіўных працаўнікоў, гісторыі была нанесеная шкода і новымі нечаканымі падыходамі. Некаторыя несумленныя архівісты скарысталіся надыходам эры панаваньня грошай і "прыватызавалі" фонды, а потым прадалі на вагу золата каштоўныя дакумэнты, якія вельмі хацелі атрымаць суседнія краіны. Калі ў Польшчы да ўлады прыйшла кааліцыя сялянаў і сацыял-дэмакратаў (за ўраду Паўляка), сама польская дзяржава, якой бракавала цьвёрдай валюты, практыкавала "дараваньне архіваў", запачаткаванае ў часы флірту з гонэкераўскай Усходняй Нямеччынай. Пры канцы 1994 году атрымала розгалас таямніца яшчэ часоў другой сусьветнай

вайны: у Ягелёнскай бібліятэцы ў Кракаве апынуліся каштоўныя рукапісы Моцарта, Мэндэльсона, Гётэ, Гайнэ з бэрлінскай Прускай бібліятэкі, знойдзеныя ў Крэшыўскім кляштары, куды нацысты прывезьлі іх у 1945 годзе. Гэтыя скарбы сталіся прадметам даволі брыдкага гандлю зь Нямеччынай.

Спыненьне мэцэнацтва дзяржавы што да ўсіх гістарычных публікацыяў міжволі выклікала зьяўленьне вялізнай колькасьці нізкаякасных брашураў, зьвязаных з нацыяналістычнымі рухамі дакамуністычных часоў. Як і ўся выдавецкая справа, кніжка па гісторыі мусіла падпарадкоўвацца законам рынку, спусьціўшыся да ўзроўню сярэдняга малапатрабавальнага чытача, якому хацелася *гісторыкаў*. Непасрэдным вынікам новай палітыкі зьяўляюцца загалоўкі-заклікі й пасрэдны зьмест. Добрыя гісторыкі з прычыны малога заробку часьцяком кідаюць свой занятак і шукаюць іншай працы. У выніку расейскія бібліятэкі затапілі ідэалізаваныя аповеды пра імпэратарскую сям'ю ды генэалёгію дваранаў, якімі так захапляецца прыніжаны на працягу 70 гадоў народ. Калі мінула цяга да псыхадрамаў пакутаў і лягерных жахаў, людзям закарцела гісторыі падменаў, захацелася цешыцца прыдумкамі на тэму жыцьця цароў і агіяграфіяй. Самыя сур'ёзныя дасьледчыкі, якія і далей хочуць вывучаць сапраўдныя спружыны нядаўняга мінулага, мусяць шапкаваць перад фінансавымі інстытуцыямі, а тыя, зразумела, гнуць сваю палітыку. Скажам, праграму супрацоўніцтва *"Karty"* й расейскага *"Мэмарыялу"* фінансуе Фундацыя Сьцяпана Батуры разам з вашынгтонскім *National Endow-ment for Democracy*, які, хоць і ня ўмешваецца ў працу, але вызначае напрамак і характар дасьледаваньня.

11.

Застаецца фундамэнтальная праблема абмежаваньняў на раскрыцьцё гістарычных таямніцаў, якія ў новай сытуацыі можа накладаць палітыка, дбаючы пра сацыяльную стабільнасьць і грамадзянскі мір. З гэтай праблемай Францыя сутыкнулася, калі спрабавала вырашыць пытаньне сумленьня, зьвязанае з рэжымам Вішы. Ува ўсходнеэўрапейскіх краінах яно выглядае непараўнальна больш складаным. За семдзесят год камунізму ў

СССР (ці сорак у краінах-сатэлітах) літаральна кожны йшоў на нейкі кампраміс з рэжымам. Што варта казаць пра мінулае, а пра што лепей маўчаць? Акрамя таго, ці можна пагадзіцца з услаўленьнем дакамуністычнай эпохі, у якой таксама хаваецца дастаткова пагрозьлівых фантомаў?
Прадстаўнікі новай улады вагаюцца між двума патрабаваньнямі: празрыстасьці й згоды, — абмяжоўваючы гісторыкаў дасьледаваньнямі зусім нядаўняй гісторыі і заклікаючы іх даваць скідку на час і прастору. Чэхія, Расея, Польшча вырашылі не рабіць усіх высноваў з гісторыі, якая нібыта можа дазнацца адразу пра ўсё. На прыкладзе Польшчы добра відаць, як розныя ўрады ставіліся да магчымасьці абмяжоўваць ці не абмяжоўваць гістарычныя веды. Першы некамуністычны кіраўнік, асьцярожны Мазавецкі, інстынктыўна адчуў патрэбу пэўнага дазаваньня новых таямніцаў. Ягоная формула зрабілася знакамітай: ужо ў 1989 годзе ён сказаў, што мусова падвесьці “тоўстую рысу” пад некаторымі паскудствамі нядаўняга мінулага, іначай невядома, як доўга зацягнецца чыстка кадраў, а пасьля й саміх выканаўцаў гэтае чысткі. Добра ведаючы, што такое эпоха судовых працэсаў, ён не хацеў стаць арганізатарам яшчэ аднаго такога. Паляваньне на вядзьмарак магло дэстабілізаваць краіну, заблытаць гісторыю і судовую сыстэму, ператварыўшы гісторыкаў у пракурораў, ці, яшчэ горай, пракурораў у гісторыкаў.
Пры канцы 1991 году надышоў час першых цалкам вольных парлямэнцкіх выбараў. Альшэўскі, прэм’ер-міністар, якога тады падтрымаў Валэнса, запатрабаваў больш суровага стаўленьня да ўчорашніх прыгнятальнікаў. На ягоную думку, вызначаць ступень адказнасьці нескладана. Краіне прапаноўвалася заглыбіцца ў сваю нядаўнюю гісторыю. Адбылося тое, чаго баяўся Мазавецкі. Усе пачалі падазраваць адзін аднаго, падазрэньне ўпала й на самога прэзыдэнта. Пачвары сталі вылазіць са скрынкі Пандоры. Пагроза вяртаньня ў іншай форме нянавісьці сталінскіх часоў прымусіла адмовіцца (прынамсі, часова) ад імкненьня да празрыстасьці й абсалютнай памяці і зьмірыцца зь няпоўнай ведай. За паўгоду Альшэўскі пайшоў у адстаўку.
Ты палітыку за дзьверы, а яна праз акно. Заслона, наўмысна накінутая на ўчорашнія злоўжываньні, робіцца ўмовай існаваньня для ўсіх цывілізаваных краінаў. Адкладзены на

трыццаць год доступ да архіўных дакумэнтаў дыктуецца патрабаваньнем грамадзкага спакою. Пасьля пэрыяду абурэньня надыдзе час аналізу, які наўрад ці будзе суцяшальным. Гучны посьпех кніг генэрала Ярузэльскага й тэлеперадачы з панэгірыкамі яму падаюцца такімі сама недарэчнымі, як аналягічныя маніфэстацыі памяці Пэтэна, аднак Польшча абрала хутчэй такую па-блажлівасьць, чым надмерны маралізм і злосьць. Гэта ізноў цалкам рэальны ўплыў палітыкі на нашы веды, хоць і гэтай палітыцы, як і ранейшым, калісьці надыдзе канец, і тады нашы веды зьменяцца. Некаторыя даўнейшыя пэрыяды, якімі тэарэтычна нішто не перашкаджае займацца ў новых палітычных умовах, дагэтуль застаюцца недасьледаванымі з палітычна-нацыянальных прычынаў. Расея й Украіна так і не наважыліся цалкам высьветліць усе чорныя плямы сваёй гісторыі да 1950 году, у прыватнасьці, тое, што тычыцца антысэмітызму (тое самае, уласна, і ў Польшчы). У габрэйскім сьвеце гэта часьцяком выклікае несправядліва агульнае асуджэньне, якое ігнаруе шматлікія выпадкі дапамогі габрэям у гады вайны й багацьце палітры габрэйска-польскіх адносінаў. Насамрэч, палітычная асьцярожнасьць тут досыць часта замаруджвае пошук ісьціны. Ужо згаданая *“Karta”* не збаялася апублікаваць у рамках выдатнай сэрыі “Польскія габрэі” сьведчаньне пра забойства габрэяў Арміяй Краёвай падчас Варшаўскага паўстаньня 1944 году. Нядаўна рэдактар часопісу заявіў, што цяпер можна скласьці кнігу, памерам ня меншую за кнігу Барташэўскага пра ратаваньне габрэяў у Польшчы (W. Bartoszewski. *Zegota: Juifs et Polonais dans la résistance 1939—1944*. Paris, 1992), якая засьведчыць, колькі габрэяў палякі аддалі на сьмерць. “*Аднак*, — дадае Міцнэр, — *калі дойдзе да шырокай дыскусіі, бурныя эмоцыі зробяць немагчымым пошук ісьціны*”. Французам вельмі нялёгка даецца прызнаньне істотнага ўдзелу сваіх суайчыньнікаў у дэпартацыях габрэяў, а стрыманасьць некаторых знаных дасьледчыкаў у ацэнцы палітычных наступстваў публікацыі такіх фактаў таксама зьяўляецца цалкам відавочнай. Гэтая самацэнзура робіцца ўнутранай цэнзурай дзяржавы. Сытуацыя старая, як сьвет: *historia sacra* прызначаная для тых, для каго адкрытая таямніца, і вольных ад лішніх пачуцьцяў, а *historia profana* — для тых, хто падпадае пад уплыў эмоцыяў у палітыцы.

Вось тут і бачым, наколькі мужным павінен быць гісторык, каб дзейсна й настойліва несьці суайчыньнікам асьвету: пасьля публікацыі малацікавых згадак сьведкі з габрэйскай паліцыі варшаўскага гета Міхнікава *“Gazeta Wyborcza”* на пачатку 1994 году распачала вялікую дыскусію пра стаўленьне палякаў да габрэяў падчас зьнішчэньня гета, а таксама ў часе Варшаўскага паўстаньня. Допісы чытачоў засьведчылі ўсю жорсткасьць тае эпохі і, адначасова, сталасьць народу, які паступова наважваецца на нялёгкае прызнаньне як сваіх памылак, так і шчырых аблудаў.

12.

Хоць 1989—1990 гадамі пазначаны неверагодны паварот у гісторыі Ўсходняй Эўропы, палітыка заўжды будзе намагацца перашкодзіць гістарычнаму спазнаньню. Як пісаў пры канцы XVIII стагодзьдзя Ян Патоцкі, *“шасьцёх месяцаў дастаткова, каб ня толькі народная радасьць згасла, але й сам народ расчараваўся ў найпрывабнейшай рэвалюцыі, якая, зрэшты, ніколі не прынясе абяцанага шчасьця, а толькі спародзіць іншы спосаб жыцьця, дзе заўсёды ў той самай меры будуць спалучацца дабро і зло”*.

Праўдзівасьць такога рэлятывізму эпохі Асьветніцтва пацьвярджаецца, калі заўважыць, колькі трыюмфатараў сыходзіць са сцэны з чарговым паваротам кола фартуны. Нам цяжка прызнаць, што гістарычная веда не бывае статычнай: прымхлівая муза Кліё несупынна тлумачыць і ператлумачвае, а чалавек заўжды прагне канструяваць і дэканструяваць. З-за “гульняў памяці” гістарычнае спа-знаньне падаецца дастаткова ўразьлівым, а гісторык (хай сабе ён і завецца навукоўцам) толькі дэманструе маскі, з-пад якіх выглядае і пад якімі зьнікае заўжды зьменлівая і няўлоўная ісьціна.

Бо зьмяняюцца ня толькі перашкоды на шляху да гістарычных ведаў, але й самі веды могуць рабіцца больш рытарычнымі й узважанымі. “Аўтэнтычнасьць” або нават “ісьціна” для гісторыкаў недасяжныя на калектыўным узроўні, як для псыхолягаў — на індывідуальным. Арсэнал гісторыка заўжды складаецца на карысьць часовага кансэнсусу, дзе вялікую, хоць і не галоўную, ролю адыгрывае, несумненна, палітыка. Перагук між Вальтэравым скептычна-гульнёвым бачаньнем рамяства

гісторыка і постмадэрнісцкімі тэорыямі сапраўды ўражвае. Урэшце, усе верагодныя перашкоды, што замінаюць гістарычнаму спазнаньню, скіраваныя на тое, каб захаваць мэту, зманлівую ўжо саму па сабе. А калі веды ёсьць толькі адбіткам ці мэтафарай, дык гісторыя (як яе вызначае, напрыклад, Рыкёр у “Часах і аповедах”) — гэта апавяданьне, якое мае ўласную сэмантыку, гэта “творчая імітацыя”, якая прагне дэміюргічнай ролі, насуперак усялякім цяжкасьцям. Запамятаем, што марыянэтак, якіх мы прымушаем рухацца, торгаючы матузкі, можна перафарбаваць, зьмяніць ці патрушчыць, а тэатар Кліё, нязьменны й упарадкаваны на першы погляд, заўтра можа зрабіцца арэнай жорсткіх бітваў. Нават такі спустошаны і неспасьцігнуты, як у посткамуністычнай Усходняй Эўропе, ён будзе зьмяняцца і ў будучыні. Гэта ніякім чынам не здымае адказнасьці з гісторыка і не пазбаўляе ягонага рамяства права на існаваньне. Адсюль вынікае толькі — і гэта ўжо шмат!, — што прадмет нашых дасьледаваньняў заўжды хісткі, а *Splendor Veritatis* недасягальная, бо навукоўцу да твару сьціпласьць.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]

№ 4 (18) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя:
analityka@yahoo.com
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: **06-10-2001**
[image]

ДАНІЭЛЬ БАВУА
дасьледчык гісторыі Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропы, прафэсар унівэрсытэту Пантэон-Сарбона. Аўтар кніг “Барацьба за зямлю ў Ўкраіне” (1993) і “Гісторыя польшчы” (1995).

Даніэль Бавуа

Палітыка vs Гісторыя між Усходам і Захадам

1.

Для гісторыка Цэнтральна-Ўсходняе Эўропы пытаньне “чаго ня ведае гістарычная навука?” у сэнсе “што там ад нас хаваюць?” гучыць амаль камічна. Фальсыфікацыі і маніпуляцыі на працягу дзесяцігодзьдзяў, ці нават стагодзьдзяў, у гатай частцы сьвету трыюмфавалі настолькі відавочна, што размова пра ману й замоўчваньні ператвараецца ў пералічэньне прыкладаў. Для пачатку на падставе некалькіх зь безьлічы аргумэнтаў можна лёгка давесьці, што фальшаваньне гістарычнае веды пасьпяхова адбывалася тут нават у XX стагодзьдзі. “Іншая Эўропа” падае багата карыкатурных прыкладаў таго, што ўлада заўсёды схільная абапірацца на нібыта аб’ектыўныя й нязьменныя веды. Расейцы, палякі, украінцы ды іншыя народы выпрацавалі такія варыянты даўнейшага й бліжэйшага мінулага, на якія ўплывалі толькі час, месца і палітычная ўлада. Прагнучы падагнаць факты пад тэлеалягічныя візіі, яны

не спыняліся ні перад чым. “Ярмо гісторыі” ў гэтых краінах настолькі цяжкое, што тут упару гаварыць пра “таталітарную гісторыю”, як звычайна гавораць пра “таталітарную дзяржаву”. Бо, прагнучы легітымізаваць гісторыю, палітыка стварыла розныя “каноны”, якімі пасьлядоўна, часта дэманстратыўна, выцясьняла, нат забараняла й табуявала ранейшыя падыходы. Можна было б чакаць, што з падзеньнем савецкага таталітарызму адыдуць у нябыт і створаныя ім мэтады. Здавалася бясспрэчным, што асобны навуковец здольны выступаць з наватарскімі ініцыятывамі, ірвучы любыя путы, ускрываючы “праўды”, пра якія ўсе забыліся ці якіх дагэтуль не ўяўлялі. Але якраз тут і хаваецца ілюзія, якая паўтараецца на кожным з крутых віражоў гісторыі. Бо сёньня сьлед задумацца, ці няма пад гэтымі “новымі праўдамі” палітычнае асновы і ці ня будуць яны непажаданыя для таго ці іншага рэжыму або небясьпечныя для грамадзянскага міру, то бок для палітыкі. Напэўна, французы, якія і праз паўстагодзьдзя адчуваюць небясьпеку высьвятленьня пэўных цёмных старонак пэрыяду Вішы, у стане поўнасьцю зразумець, наколькі невыканальнае патрабаваньне “чыстай праўды”.

2.

Гісторыя чэхаў і палякаў, якую захопнікі ці прыбышы перакульвалі дагары нагамі, перапісваючы або папросту адмаўляючы на карысьць гісторыі “народу-пераможцы”, палітызавалася ўжо на пачатку XX стагодзьдзя. Нямецкая й расейская гістарыяграфіі не адзначаліся схільнасьцю прызнаваць мінулае “негістарычных” народаў. *Kulturkampf* з аднаго боку й русіфікацыя — зь іншага, наступствы векавога ўсебаковага зьнішчэньня культуры, у прыватнасьці, поўнай ліквідацыі вышэйшае асьветы на польскай і чэскай мовах, выявіліся вельмі эфэктыўнымі мэханізмамі асыміляцыі, зьмякчонай хіба што дазволам Аўстрыі вучыцца па-польску ў Кракаўскім унівэрсытэце ды мажлівасьцю атрымаць асьвету прыватна або за мяжой. Гэтым карысталіся непахісныя абаронцы нацыянальнай гісторыі, якая, як і належыць контракультуры, цалкам супярэчыла гісторыі афіцыйнай. У выніку чаго ў назіральніка, што прагне захаваць нэўтра-літэт або знайсьці “ісьціну” *non varietur*, такія радыкальна адрозныя

пастуляты ня могуць не выклікаць сумневаў. Польскай гістарыяграфіі, спароджанай фрустрацыяй, цяжка было пазьбегчы нацыянальнага мазахізму ці, наадварот, услаўленьня пакутніцтва з абавязковым прамэтэізмам і мэсіянствам. Прыклад, узяты з падруч-ніка Сяргея Платонава па расейскай гісторыі (1898), самага папулярнага ў царскай імпэрыі, паказвае, як вялікарасейская ідэалёгія трактавала падзелы Польшчы канца XVIII стагодзьдзя, абгрунтоўваючы расейскую анэксію. Маладых расейцаў вучылі гэтак (і на працягу XX стагодзьдзя гэтыя аргумэнты яшчэ ня раз прыдаліся): *“разбэшчаная”* шляхта парушала правы чалавека, у прыватнасьці, праваслаўных, якія скрозь сутыкаліся толькі з “*праявамі самаўладзтва й жорсткасьці*”, “*нідзе не знаходзячы абароны ад несправядлівага прыгнёту й перасьледу*”, вось Кацярына II і мусіла ўмяшацца ў справы сваіх суседзяў-палякаў, каб пакласьці край “*анархіі*” ў іхнай краіне. За 125 год пасьля Вальтэра, які за пэўны ганарар апеў Кацярыніны *“арміі міру”*, Платонаў без аніякага аналізу палітычных абставінаў апраўдвае арышт *“бунтаўнікоў”* з Барскай канфэдэрацыі, што выступілі супраць Расеі, і вайсковую акупацыю дзеля задушэньня паўстаньня. Пяцістаронкавае апісаньне аднае з самых скандальных анэксій найноўшых часоў расейскі гісторык завяршае фальшыва-наіўным тлумачэньнем: усталяваньне міру заслугоўвала, маўляў, *“кампэнсацыі за страты й стараньні”*, вось частка Рэчы Паспалітай і была анэксаваная; адно шкада, што гэтай нагодай скарысталася Прусія, а Аўстрыя нават захапіла *“расейскую”* Галічыну.

Толькі адышло ў нябыт гэтае прадыктаванае палітычнай гегемоніяй Расеі тлумачэньне, як гістарыяграфія адноўленай у 1918 годзе Польшчы распадаецца, адпаведна, на дзьве асноўныя палітычныя тэндэнцыі. Крыніцы падганяюцца або пад “легітымную” ад XVI стагодзьдзя, нібыта талерантную і адкрытую ягайлаўскую візію полікультурнай Польшчы, куды ўваходзяць розныя, добраахвотна ўзьяднаныя меншасьці, або пад “легітымную” цэлае тысячагодзьдзе візію “пястаўскаю”: дзяржаўнае адзінства й польскае дамінаваньне ў апошняй цэмэнтуе яе, нівэлюючы любыя адметнасьці. Гісторыя часоў Пілсудзкага жывілася першай канцэпцыяй, выкарыстоўваючы спароджаны Рэнэсансам міт фэдэратыўнасьці, і была такой сама спрэчнай, як і гісторыя *à la* Дмоўскі, якая апэлявала да

нібыта гамагеннае нацыі, створанай дынастыяй Пястаў, эпохі Позьняга Сярэднявечча. Зрэшты, абодва падыходы, кожны зь якіх прадугледжваў выразна тэндэнцыйнае выкарыстаньне крыніцаў і мітаў, пратрымаліся толькі два дзесяцігодзьдзі. Падзел краіны паміж Нямеччынай і СССР у 1939—1941 гадох, а пасьля й нямецкае панаваньне да 1945 году выклікалі новае руйнаваньне гісторыі, запраграмаванае палітычнымі рэжымамі, што адмаўлялі палякам нават у захаваньні знакаў іхнае калектыўнае памяці. Зачыняліся ўнівэрсытэты ды школы, што там — нават музэі ды бібліятэкі, зьнішчаліся й замяняліся на сымбалі таталітарнае ўлады мэмарыяльныя знакі. Знайшоўшы прытулак у падпольных школках, гераічна культываваная гісторыя магла карыстацца толькі спрошчанымі, часта маніхейскімі схемамі, што адмаўлялі саму магчымасьць якіх бы там ні было плённых нямецка-польскіх ці расейска-польскіх стасункаў.

3.

Тым часам, пачынаючы з 20-х гадоў, пад кіраўніцтвам палітызаваных дазваньня ідэолягаў Пралеткульту, Расея распрацавала марксісцкую вульгату ўласнае гісторыі, згодна зь якой уся мінуўшчына ўяўлялася толькі доўгім, зь безьліччу пастак, шляхам расейцаў да выратавальнага сьвятла пралетарскае рэвалюцыі. Народ, пераважна пасыўныя сяляне, даведаўся, што ягоныя продкі-прыгонныя яшчэ паўстагодзьдзя таму толькі й марылі, што пра барацьбу на барыкадах пад кіраўніцтвам рабочае эліты. Усё, што яны шанавалі стагодзьдзямі — цар, пан, поп, — тут жа адпрэчвалася. Не марнуйма часу на агульнасьці: савецкая гістарычная навука прагнула стаць вянцом гісторыі. Марксізм раскрываў “сэнс гісторыі”, а кожнага, хто гэта аспрэчваў, зьмятаў са шляху ейны “лякаматыў”.

Аднак суперніцтва, а пасьля й канфлікт гэтага таталітарызму з нацызмам адрадзілі патрыятычныя й імпэрыялістычныя матывы, што даказалі выразную пераемнасьць савецкае і колішняе вялікарасейскае ідэалёгіі. “Культ асобы” (фактычна — абагаўленьне) Сталіна мог даць фору культу цара. Шэраг мітаў і стэрэатыпаў паходжаньнем з царскіх часоў і надалей рабілі гісторыю дапаможным сродкам замежнай і

нацыянальнай палітыкі Крамля. Галоўным лёзунгам, як і за царскіх часоў, было яднаньне вакол Масквы ў “*адзінае цела й душу*” захопленых нерасейскіх тэрыторыяў; у падручніках па гісторыі савецкая імпэрыя вярнулася да падставовых мітаў царскага “единонеделимства”: пра так званую Кіеўскую Русь, пра “Маскву — трэці Рым” ды пра “зьбіраньне” земляў сібірскіх, “вяртаньне” земляў “літоўска-рускіх”, “добраахвотнае” далучэньне Грузіі й г. д. З таго часу даўнейшая асымілятарская роля праваслаўя перайшла да марксізму — новае дзяржаўнае рэлігіі, што цэмэнтавала савецкую радзіму.

4.

Пасьля 1945 году незьлічоная армія гісторыкаў Цэнтральна-Ўсходняе Эўропы, вымушаных падкрэсьліваць сувязі сваіх краінаў з колішняй Расеяй ці сёньняшнім СССР, распачала легітымізацыю беспрэцэдэнтнай савецкай экспансіі на Захад. Намаганьнямі польскіх гісторыкаў, згуртаваных у пэўных інстытутах (Уроцлаў, Катавіцэ), Сылезія і Ўсходняя Прусія згадалі сваё славянскае мінулае, пра якое анігадкі не было восем стагодзьдзяў; сталінскія анэксіі абгрунтоўваліся й ідэямі расейскіх панславістаў XIX стагодзьдзя, хоць у царскія часы нельга было ўявіць большых рэтраградаў і нацыяналістаў, чым гэныя. Канцэпцыі славянізму, навязаныя пасьля далучэньня “зямель адзысканых”, дазволілі “аднавіць” адчуваньне “відавочнай” прыналежнасьці да польскага (а праз гэта й славянска-савецкага) сьвету тэрыторыяў, афіцыйна выкрасьленых з памяці ў цяжкія для Польшчы часы.
Імпэрская ідэя, гэты стрыжань расейскае палітыкі — царскай, камуністычнай і, як штодня пераконваемся, посткамуністычнай, — абапіралася й надалей здольная абапірацца толькі на адмаўленьне й скрыўленьне гісторыі земляў, якіх Расея прагне “ўзьяднаць”, то бок паглынуць і асымільваць.
Гісторыя Ўкраіны асабліва паказальная з пункту гледжаньня такой гістарычнай апрацоўкі (тут слова “апрацоўка” набывае вузкамэдыцынскі сэнс ампутацыі памяці, лабатаміі). З-за забароны ўкраінскае мовы ў часы Кацярыны II, калі гэты край толькі перайшоў пад расейскі ўплыў, напісаць гісторыю

ўласнай краіны ўкраінцы змаглі толькі пры канцы XIX стагодзьдзя, і то на аўстрыйскай тэрыторыі (Антановіч, Грушэўскі). На землях, далучаных да Расейскае імпэрыі, улада і ейныя падбрэхічы-гісторыкі насаджалі ўяўленьне, нібыта тутэйшы люд складаўся з адных сялянаў і, пазбаўлены эліты, ня меў уласнае гісторыі. Дзякуючы ўмела закручанай блытаніне, што была выкліканая перш за ўсё лексычным і фанэтычным падабенствам ува ўкраінскай і расейскай мовах словаў *“руський”* і *“русский”*, гісторыкі-панславісты да 1917 году лічылі ўкраінцаў часткай “русского народа”, а Пераяслаўская дамова 1654 году, якая нібыта містычна змацавала ўзьяднаньне (усё яшчэ нетрывалае) Кіева з Масквою, а адсюль і Санкт-Пецярбургам, разглядалася як падзея непрапарцыйна вялікага, амаль тэлеалягічнага значэньня.

5.

Міжнародная палітыка таксама істотна ўплывала на замежнае (у прыватнасьці, заходняе) бачаньне славянскае гісторыі. Скажам, калі ў 1892 годзе Францыя шукала, куды б інвэставаць капіталы і з кім бы ўтварыць моцны саюз супраць Нямеччыны, яе зусім не зьбянтэжыла, што Расея — аўтакратычная й ксэнафобская дзяржава антысэмітаў і рэтраградаў. Абклаўшыся належнымі дакумэнтамі, падсунутымі Пецярбургам, французскі гісторык пачынае ляпіць гэтаму калёсу на гліняных нагах вобраз спакойнага волата. “Імпэрыя цароў і расейцы” Анатоля Лёруа-Бальё (A. Leroy-Beaulieu. *L’Empire des tsars et les Russes*, 1894) — люстэрка, у якім расейцы выглядаюць так, як ім даспадобы, — сьцьвярджае, што інкарпараваная Польшча раскашуе, а праглынутая Ўкраіна цалкам скарылася. Якраз гэтая кніжка (перавыдадзеная й напрыканцы XX стагодзьдзя) стварыла ў Францыі вобраз Украіны, які расейская ўлада падтрымлівае дасёньня:

“Калі нават уявіць сабе, што хтосьці, скажам, паэт Шаўчэнка альбо ўкраінафілы, захацеў бы, вяртаючыся да плянаў Мазэпы й Хмяльніцкага, зрабіць Маларосію незалежнай як ад Расеі, так і ад Польшчы, гэтыя мроі знайшлі б сярод маларосаў гэткі ж нязначны водгук, як і праекты Паўднёвай лігі на поўдні Францыі ў 1870—1871 гадох... Украінафільства й маларасійскія паэты пагражаюць Расеі ня больш, чым

адраджэньне правансальскае літаратуры — адзінству Францыі...”

6.

Інтэлектуальная млявасьць Захаду й нежаданьне ўскладняць зручныя дыпляматычныя зносіны з маналітнай дзяржавай выклікалі наўмысную абыякавасьць да ўкраінскага пытаньня (Францыя ненадоўга зацікавілася ім хіба што ў 1919 годзе, калі маладой савецкай уладзе было не да таго). Такі падыход толькі ўзмацніўся ў сталінскую й пасьлясталінскую эпохі. Аднак уражвае й унутраная цэнзура ўкраінскага гісторыка, які, напісаўшы ў 1960 годзе найбольшае расейскамоўнае дасьледаваньне пра сялянства Правабярэжнай Украіны ў XIX стагодзьдзі, не згадаў нацыянальных украінскіх рэалій (гл. Пойда В. *Крестьянское движение на Правобережной Украине в пореформенный период, 1860—1900*. — Днепрапятроўск, 1960). На той час савецкая палітыка выпрацавала догму “сусьветнага” адзінства ўсіх працоўных. То бок можна было вывучаць толькі недыфэрэнцыяваны сялянскі сьвет, не падкрэсьліваючы культурных адметнасьцяў украінцаў, расейцаў, палякаў, жыдоў і немцаў, якія жылі на гэтых землях разам. Вылучалася толькі — вядома, у паяднаньні з рабочым рухам — сялянства, якое празь незьлічоныя стыхійныя паўстаньні праставала (нас запэўнівалі, што цалкам сьвядома) да рэвалюцыйнага апатэозу лістапада 1917 году. Гэтая маніхейская “лёгіка гісторыі”, што не дапускае аніводнага плюралістычнага падыходу, ня так даўно займела пасьлядоўнікаў на Захадзе. Як Лёруа-Бальё, што апяваў французам, прагным да прыбытковых інвэстыцыяў, магутнасьць царызму, гэтак і амэрыканскія гісторыкі-марксісты нават у 1987 годзе не ўяўлялі сабе Ўкраіны іначай, як “Паўднёва-Заходняй Расеі”. Паслужліва перапісваючы працу згаданага Пойды (ці іншых савецкіх спэцыялістаў у сялянскім пытаньні), гэныя гісторыкі й за тры гады да абвяшчэньня незалежнасьці Ўкраіны маглі прапанаваць амэрыканцам толькі карыкатурны савецка-імпэрскі мэтад мэханічнага падліку сялянскіх паўстаньняў (гл., напрыклад Edelman R. *Proletarian Peasants: the Revolution of 1905 in Russian South-West*, 1987). Дык ці варта зьдзіўляцца, што, ня ведаючы — а хутчэй не жадаючы ведаць — гісторыі, нашыя дыпляматы ў Дамове 1992 году пра

дружбу між Францыяй і Расейскай Фэдэрацыяй афіцыйна пагадзіліся прызнаць “дзяржавай-праваперaемніцай” СССР тую самую Расею, якая ў хуткім часе засьведчыла ў Чачэніі поўнае нежаданьне дэкалянізавацца?

Тое, што цытаваная вышэй кніжка, у якой паслухмяна паўтараецца прадыктаваная Масквой лекцыя, належыць амэрыканцу, не азначае, што французская гістарыяграфія здолела пазьбегчы небясьпекі мімэтычнае гісторыі, якой кіруюць з дапамогай палітычнага пульту. У сталінскую й пасьлясталінскую эпоху расейскую гісторыю ў Францыі выкладалі так, як гэтага жадаў СССР. Ж.-Ф. Сырынэлі, П. Ары, Ф. Фюрэ й іншыя слушна пісалі пра савецкія ўплывы на французскую думку ў 1950—1970 гадох. Гэты ўплыў *a fortiori* можна знайсьці ў дасьледчыкаў Усходняй Эўропы. Ён прысутны і ў выдаваным Вышэйшай школай дасьледаваньняў з грамадзкіх навукаў часопісе “Cahiers du Monde russe et *sovéitique*”, які толькі нядаўна пачаў ацэньваць аб’ект свайго дасьледаваньня больш аб’ектыўна і многія рэдактары якога ўваходзілі ў таварыства “Францыя—СССР”. Калі на чале катэдры гісторыі славянаў, створанай у Сарбоне ў 1960 годзе, стаў Ражэ Парталь, яна амаль цалкам ператварылася ў асяродак расейскай і савецкай гісторыі. Прыкра, але такія асацыяцыі гэты цэнтар, які я маю гонар узначальваць, шмат у каго выклікае дагэтуль. Надзвычай выразным прыкладам уплыву палітыкі на гістарычнае дасьледаваньне зьяўляецца апошні разьдзел Парталевай кніжкі “Славяне” (Portal R. *Les Slaves, peuples et nations*, 1965). У гэтым аб’ёмным дасьледаваньні, якое мае падзагаловак “Да зьбіраньня славянскіх народаў у 1917—1960 гадох”, гучна заяўляе пра сябе “лёгіка інтарэсу”, якая мелася прывесьці да стварэньня “сымбіёзу” народаў, кіраваных “аўтарытэтнай савецкай мадэллю”. Пасьля зьненавіднай эпохі нацыяналізмаў XIX стагодзьдзя, што спарадзілі комплексы вышэйшасьці ў пэўных членаў славянскае сям’і, зьявіўся “чалавек-камуніст”, пазбаўлены гэтых забабонаў. Пасьля гэтага сталася магчымым ажыцьцяўленьне “сацыялістычнай мары братніх народаў”, і пачалося гэта з “народнага саюзу” з Украінай і Беларусяй. Вайна, лічыць Парталь, “*засьведчыла сілу сувязяў, што зьядналі расейцаў і ўкраінцаў у адзіным патрыятычным пачуцьці*” — насуперак украінскаму незалежніцкаму руху й супрацоўніцтву

з нацыстамі; дзякуючы вайне, “*апазыцыя засталася ў мінулым*”. Ня згадваючы пра жахлівыя наступствы выкліканага прымусовай калектывізацыяй галадамору, Парталь сьцьвярджае, што дзякуючы рэвалюцыі 1917 году ўкраінская культура “*ўсё ж у цэлым выйграла*”.

І хоць згаданае дасьледаваньне Парталя, што доўга заставалася адзіным на гэтую тэму, было напісанае ў 60-х, аўтар знаходзіў у Сталіна толькі “старэчыя выбрыкі” і зь відавочнай паслужлівасьцю апяваў дух савецкай культуры, якая нібыта выкарыстоўвае лепшыя славянскія рысы для дасягненьня высокіх ідэалаў. Іншыя славянскія народы Парталь апісвае таксама ў поўнай адпаведнасьці з накінутым маскоўскай палітыкай канонам, і зноў ягоная хлусьлівая паблажлівасьць ператварае гісторыю ў гімн савецкай “пратэкцыі”. Вочы на лоб лезуць, калі чытаеш сёньня, што польская культура ў 1945—1949 гадох раскашавала “ў атмасфэры свабоды слова” — дастаткова згадаць насаджваньне аднапартыйнасьці якраз у той час. Здаецца, што трызьніш, калі чытаеш во гэткае: пасьля 1949 году ў Польшчы *“не прыціскалі вольнай думкі”*, а пабудова мэталюргічнага комплексу ў Новай Гуце, за два крокі ад Кракава, сівое сталіцы Кароны, была, уласна, удалым спосабам *“надаць дынаміку”* гэтаму *“месту пэнсіянэраў”*. Тут бачым поўную адпаведнасьць зь лёзунгамі камуністычнай прапаганды. Адначасова ў гэтага французскага гісторыка, што ня грэбуе стэрэатыпамі, міжволі праглядаецца атавістычны недавер расейцаў да палякаў: гэтыя заходнія славяне, піша ён, “*занадта зацятыя і няўрымсьлівыя*”. Гісторыю славакаў падсумоўвае карыкатура з славацкай камуністычнай газэты: трыюмф працаўніка над капіталістамі, завадатарамі гонкі ўзбраеньняў. Гісторыя баўгараў і югаславаў перакручаная не настолькі, але таксама адлюстроўвае “*набліжэньне да сацыялізму*”. Агульная выснова Парталя надзвычай дакладна дэманструе, якую палітычную лінію навязваў гэты тып гістарыяграфіі: “*Тое, што новы (мар-ксісцкі) досьвед чалавецтва паўстае акурат у Эўропе, перадусім сярод славянскіх народаў, схіляе да думкі, што, хоць бацькам марксізму й быў немец, само вучэньне ўпершыню было ажыцьцёўленае ў расейскіх рэаліях…*”

7.

Мінулі тры дзесяцігодзьдзі. Цяпер такому погляду на гісторыю замінае крах савецкага міту, але жывучасьць расейскага імпэрыялізму не кранае толькі французскіх дыпляматаў. Сёньня, як і раней, Вялікая Расея выклікае захапленьне; поруч з працамі, цалкам вольнымі ад гэткай залежнасьці, зноў выходзяць кніжкі, дзе ці то з прычыны інэрцыі, ці то з прычыны нежаданьня зьвяртацца да арыгінальных дакумэнтаў, у галовы французскіх студэнтаў убіваюць імпэрскае бачаньне разь-віцьця Расеі, такое любае шмат якім расейскім палітыкам. (Гл. напрыклад: M.-P. Rey. *De la Russie A l'Union Soviétique: la construction de l'empire 1462—1953.* — Paris, 1994.) Аўтарка сабрала тут усе клішэ панславісцкае й савецкае гістарыяграфіі: яна цьвердзіць пра існаваньне Кіеўскай Русі, разглядае падзел Польшчы як справядлівае вяртаньне тэрыторыяў, а экспансію на Ўсход ня лічыць калянізацыяй, ігнаруе рэлігійныя й міталягічныя чыньнікі ў разуменьні імпэрыі, заяўляючы, што "*імпэрыя... зважала на нацыянальную спэцыфіку*", і робіць шэраг памылковых ацэнак, самая прыкметная сярод якіх — ацэнка савецкай інтэрвэнцыі ў Польшчу ў 1939 годзе).
Вядома, дзіўная жывучасьць поглядаў адпавядае млявай талерантнасьці нашых палітыкаў да злачынстваў расейскага імпэрыялізму. Мажліва, усё памяняецца з адбываньнай на Захадзе зьменай інтэлектуальнага шаблёну? Шанцаў на такі варыянт меней у саміх славянскіх краінах, дзе палітыка па-ранейшаму нашмат больш уплывае на навуку, чым нам гэта звычайна здаецца.

8.

Разгром гістарычнай навукі ў былых савецкіх рэспубліках, несумненна, дагэтуль належна не апісаны. Беларускі навуковец Валянцін Грыцкевіч кажа, што мэта выкладаньня гісторыі ў Менску, як і ў Маскве палягала найперш у перадачы тых надзвычай абмежаваных ведаў, якія замкнулі б студэнтаў у глухім ідэалягічным коле легітымізацыі дзейнага ладу й апалягетызацыі пралетарскага руху й клясавае барацьбы. Якраз дзеля гэтага й марнавалі час на вывучэньне нідзе больш не вядомых дысцыплінаў — гісторыі КПСС, "марксісцка-ленінскай філязофіі", палітэканоміі сацыялізму, а пасьля нэасталінісцкай рэформы Суслава — навуковага камунізму, марксісцкай

эстэтыкі, прынцыпаў навуковага атэізму. І, як вынік — закасьцянелы дагматызм, а для некаторых з часам шызафрэнія. У такіх абставінах выкладчыкі ператвараліся ў такую сабе ідэалягічную паліцыю. Таму, паглынуты ўсяладнай палітыкай гісторык не патрабаваў ужо ні архіваў, ні бібліятэкаў, а па пераліку ягоных працаў цалкам зразумела, якія “спэцыялізацыі” яшчэ нядаўна шанаваліся ўладай.
У 1991 годзе ў Беларусі налічвалася 1200 гісторыкаў з унівэрсытэцкай асьветай, зь іх 600 кандыдатаў навук і 80 дактароў. 90 % дысэртацыяў было прысьвечана Савецкай Беларусі, 58 % — гісторыі партыі. Яшчэ дасьледавалі розныя аспэкты выкананьня пляну бягучай пяцігодкі. У 1985—1986 гадах Беларускі дзяржаўны ўнівэрсытэт меў дзьве катэдры гісторыі партыі, дзе працавалі 48 асобаў, зь іх 6 дактароў і 33 кандыдаты навук. Акрамя таго, на трох катэдрах гісторыі Савецкай Беларусі й СССР былі сабраныя 33 “навукоўцы” (сярод іх 4 дактары й 26 кандыдатаў). У 1989 годзе, напалоханыя дэмантажам старых структураў, гэтыя спэцыфічнага кшталту навукоўцы стварылі таварыства гісторыкаў, якія паставілі сабе за мэту “крытыку рэакцыйных і нацыяналістычных тлумачэньняў гісторыі”. Насуперак эфэмэрным посьпехам нешматлікіх удзельнікаў шматдысцыплінарнай Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, узначаленай высокапаважаным прафэсарам Мальдзісам, старыя кадры ўзялі верх пасьля вяртаньня Беларусі пад расейскі ўплыў. Вядома, малаверагодна, што ў новыя часы могуць стаць зноў запатрабаваныя тэмы-лёзунгі “Гістарычная праўда супраць фальсыфікатараў”, “Пад кіраўніцтвам Ленінскай партыі”, “Разьвіцьцё дэмакратычных прынцыпаў у кіраваньні калгасамі” ці “Навуковы падыход у партыйнай працы”, але брак належнай адукацыі, мэтадаў ды ініцыятывы, відаць, выкліча значнае зьніжэньне інтэлектуальнага патэнцыялу, узмоцненае адарванасьцю ад сьвету й няведаньнем заходніх моваў. Вельмі мала ў Беларусі гісторыкаў, здольных працаваць у расейскіх, чэскіх, польскіх ці ўкраінскіх архівах, а дапасьці да заходняга часопісу сёньняшнія фінансавыя абмежаваньні перашкаджаюць ня менш, чым колішнія ідэалягічныя. Прыкрая звычка перапісваць папярэднікаў можа трываць і далей, таму нялішне будзе ў сябе запытацца, ці ня зробіць вяртаньне пад засень расейскага гіганта старую мэтодыку вечнай.

9.

Спробы пранікнуць у гісторыю Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропы звонку, пераадолеўшы заслону сакрэтнасьці й расейскіх фальсыфікацыяў, заўжды былі надзвычай рызыкоўнымі, хоць і не безнадзейнымі. Ад часоў “Расеі ў 1839 годзе” маркіза дэ Кюстына вядома, што засакрэчанасьць і хаваньне крыніцаў зьяўляюцца складнікамі мясцовага спосабу кіраваньня: улада тым страшнейшая, чым менш вядома, на што яна здольная. Жалезная заслона мела адно-аднюсенькае прызначэньне: дэманізуючы сьвет за ёй, ня даць усьвядоміць, “што дзеецца ў нас”. ...Шматлікія фонды расейскіх архіваў, зачыненыя за царскім часам, засталіся закрытымі і ў савецкія часы: напрыклад, ні габрэйскія справы, ні матэрыялы, зьвязаныя з экспансіяй на Каўказе, у Казахстане й на Далёкім Усходзе так і ня трапілі ў рукі замежных дасьледчыкаў. Дый Сібір, калі б не дысэртацыя Ф.-К. Какена 1969 г. (F.-X. Coquin. *La Sibérie: peuplement et immigration paysanne au XXe siécle*), так і засталася б заімглёным і мітычным абсягам катаргі й ссылкі, а неўзабаве й злавеснай туманнасьцю Архіпэлягу Гулаг. Да незьлічоных сацыяльных маніпуляцыяў часоў Мікалая I дадаліся сталінскія дэпартацыі, якія мелі на мэце “канчатковае вырашэньне” некаторых нацыянальных праблемаў. Увогуле, такія рэчы здараліся й раней, але да канца XX стагодзьдзя заставаліся малавядомымі. Напрыклад, гісторыя дэклясацыі й драматычнай барацьбы 450 тысячаў украінскіх палякаў, якіх у 1831—1850 гадох поўнасьцю пазбавілі свабоды, прыпісаўшы да сялянаў, заставалася ахутанай заслонай маўчаньня, і гэта пры тым, што ў 1870—1900 гадох іх *manu militari* выгналі са сваіх дамоў. А што казаць пра “навяртаньне” ў праваслаўе адным росчыркам пяра двух з паловай мільёнаў літоўскіх, беларускіх і ўкраінскіх сялянаў-уніятаў у 1839 годзе? Абрысы гэтай вялізнай калектыўнай драмы, схаванай дзякуючы непранікальнасьці расейскай мяжы й абыякавасьці Захаду (які заўжды лічыў гэтую частку Эўропы іншым сьветам, дзе можна ігнараваць уласныя ж прынцыпы), пачынаюць вымалёўвацца толькі цяпер, калі палітычны кантроль за доступам да расейскіх архіваў саслабнуў.

Дваццаць год таму, калі, пачаўшы вывучаць невядомы тады

пагром польскай культуры ў XIX стагодзьдзі на літоўска-беларускіх землях, анэксаваных Расейскай імпэрыяй, я намагаўся высьветліць, як галоўны асяродак гэтай культуры, Віленскі ўнівэрсытэт, і сотні пачатковых і сярэдніх школаў былі поўнасьцю “стэрылізаваныя” ў 1831—1832 гадох, перада мной паўстала безьліч палітычных перашкодаў. Патрэбныя архіўныя матэрыялы дагэтуль не вывучаліся, бо сьведчылі пра страшнае вынішчэньне культуры пасьля паўстаньня 1831 году. Акрамя замоўчваньня з-за салідарнасьці савецкай улады з царскім рэжымам, дадалося яшчэ й табу, зьвязанае з паўторнымі сталінскімі анэксіямі Вільні й Літвы ў 1940 і 1944 гадох. Чалавек з Захаду, хай сабе яму трэ былі толькі гістарычныя зьвесткі (а можа якраз таму, што трэ былі гістарычныя зьвесткі), выклікаў найгоршыя падазрэньні.

У тыя часы палітычныя перашкоды на шляху гістарычнае веды ставілі адкрыта і ўпэўнена. Гісторыкам вядомы цэлы арсэнал перашкодаў, вынайдзеных уладамі. Найпрасьцей было прыдушыць ініцыятыву, не адказваючы на просьбы падаць інфармацыю паводле каталёгаў, абагульненых і заблытаных настолькі, што ніхто ня мог знайсьці справы без дапамогі. Часам пасьля доўгіх пісьмовых просьбаў прыходзіў адказ з пазнакай нерэальнага тэрміну. Звычайна расчараваньне прымушала пакідаць спробы, хоць самыя ўпартыя нястомна зьвязвалі разарваную нітку й дабіваліся-ткі паездкі на месца як, скажам, прадстаўнікі Нацыянальнага цэнтру навуковых дасьледаваньняў або іншых інстытуцыяў (варта адзначыць, што англасаксы тут былі заўжды больш упартымі, чым французы). Для перамоваў з пэрсаналам архіву аднаго толькі веданьня мовы было замала. Дасьледчык мусіў навучыцца падкупаць супрацоўнікаў ніжэйшага зьвяна, якім інструкцыя загадвала выдумляць безьліч ускладненьняў, каб нададзены заходняму навукоўцу час марна сплываў у хлусьлівых абяцаньнях і бясконцым чаканьні. Калі ж “навуковы кіраўнік”, які нібыта лепей ведаў, што трэба дасьледаваць, раз у год і выдаваў табе стос справаў, аказвалася, што яны зусім не па тэме. Час мінаў і паступова аддалялася небясьпека, што прыхадзень нешта знойдзе. А калі ён патрабаваў нейкую канкрэтную справу, яму адказвалі, што яна зьнішчаная падчас вайны, перададзеная на рэстаўрацыю або выдадзеная камусьці з савецкіх калегаў.

Ці ня самай паказальнай палітычная залежнасьць была ў Кіеве.

Неяк, заўважыўшы маю роспач, дырэктарка архіву з кранальнай адкрытасьцю патлумачыла, што якраз зьдзяйсьненьне такой абструкцыі й ёсьць заданьнем архівістаў, бо “гісторык-замежнік можа апублікаваць факты насуперак інтарэсам нашага ўраду”. Ведаючы, што замежныя навукоўцы часта ідуць на хітрыкі, зьмяняючы тэму сваёй працы, каб яна стасавалася з марксісцка-ленінскім пустаслоўем (маё дасьледаваньне польскай шляхты ва Ўкраіне афіцыйна было прысьвечана капіталістычнай эксплюатацыі сялянаў панамі), дырэктарка адразу ж падала прыклад абсалютнага зла: амэрыканскі дасьледчык, які нібыта вывучаў жыцьцё ўкраінскай жанчыны ў XIX стагодзьдзі, меў нахабства напісаць, што ў XX стагодзьдзі яе лёс істотна не зьмяніўся. Таму, цалкам у нацыянал-бальшавіцкім духу падвяла рысу начальніца, *“ня варта гаварыць пра тое, што перашкаджала разьвіцьцю Ўкраіны ў мінулым”*.

Аднак хаваньне інфармацыі не было ўсёахопным. Немажліва было пераканаць усіх архівістаў у тым, што хлусьня й хітрыкі зьяўляюцца выкананьнем важнай палітычнай і патрыятычнай місіі: падазронасьць і замоўчваньні ўрэшце надакучвалі. Кожны дасьледчык, хай нават і патэнцыйны “вораг”, мусіў памятаць, што ў краіне Гогаля яму заўжды прыдасца эфэкт “рэвізора”: дастаткова прыпісаць сабе таямнічую і значную ролю ў гіерархіі, каб заўважыць боязь у вачах суразмоўцы й атрымаць раней недасяжныя скарбы. Нарэшце, дапамагала й своечасова падсунутая банкнота — хабары, распаўсюджаныя ў царскай Расеі, заставаліся рухавіком грамадзкага жыцьця і ў камуністычныя, і ў посткамуністычныя часы.

10.

Можна шмат чаго напісаць пра расейскую схільнасьць да сакрэтнасьці, гэтую сапраўдную нацыянальную манію. Маем ужо дастаткова дасьледаваньняў пра жахлівыя фальсыфікацыі й замоўчваньні ў савецкай гістарыяграфіі, як у выпадку з таямнічымі пратаколамі да пакту Рыбэнтропа-Молатава, існаваньне якіх адмаўлялася да 1989 году, або з адмовай СССР прызнаваць сваю адказнасьць за масавыя забойствы ў Катыні, ці са зьнікненьнем і зьяўленьнем на групавых фатаздымках выяваў рэпрэсаваных, а пасьля рэабілітаваных палітыкаў і г. д.

Апісанае й тое, як ствараласа ў літаратуры, кіно, выяўленчым мастацтве й музыцы іканаграфія “пазытыўных герояў”. Такім чынам, зьяўляецца вельмі спакусьлівая думка, што ўсё ўжо сказанае альбо будзе сказанае, бо няма больш ні абмежаваньняў, ні перашкодаў.

Першымі на Ўсходзе гэтай эўфарыі паддаліся палякі. Яшчэ ў 1956 годзе камуністы-рэвізіяністы адчынілі шафу гісторыі, дзе на працягу двух дзесяцігодзьдзяў пыліліся невядомыя шкілеты: якраз тады Польшча пачула імёны партыйных дзеячаў, зьнішчаных Сталіным у 1937—1938 гадох; пазьней надышоў час рэабілітацыяў, вяртаньняў зь лягераў, ушанаваньня Арміі Краёвай і некамуністычнага Супраціву. Паступовае ўзмацненьне супярэчнасьцяў у часы Гамулкі й Герка засьведчыла, што гісторыя можа ўзяць рэванш над палітыкай: Курань, Мадзалеўскі, Міхнік, Герэмэк былі прафэсійнымі гісторыкамі. Стварыўшы ў 1976 годзе Камітэт абароны працоўных (KOR), інтэлектуалы справакавалі выбух грамадзянскага патрыятызму; першыя публікацыі ў самвыдаце выліліся хутка ў вялізную хвалю брашураў і часопісаў, якія ўрад вымушаны быў трываць: *“Zapis”, “Puls”, “Spotkania”, “Głos”, “Droga”, “Krytyka”* і г. д. Паступова адбываецца новае вяртаньне гісторыі й запаўненьне прагалінаў, пакінутых трыма дзесяцігодзьдзямі сьвядомай амнэзіі. Пасьля ўздыму “Салідарнасьці” ў 1980 годзе сьвядомыя гісторыкі адным са сваіх галоўных заданьняў бачылі арганізацыю дыскусіі пра перагляд навучальных праграмаў і падручнікаў гісторыі. Ува ўнівэрсытэтах прайшоў шэраг калёквіюмаў, прысьвечаных “белым плямам”. Трыццаць пяць год палітычнага маніпуляваньня гісторыяй аказаліся марнымі.

Нягледзячы на вайсковае становішча, за часоў генэрала Ярузэльскага праца памяці працягвалася. У 1982 годзе пад рэдакцыяй Пятра Міцнэра пачаў выходзіць ценкі часопіс *“Karta”*, які памнажаўся на рататоры. У ім, між іншага, друкаваліся літаратурныя нарысы пра савецкія лягеры. Сьведчаньняў пра перажытае шторазу большала, і ў 1987 годзе яны акрэсьлілі спэцыфіку часопісу, які адмыслова стварыў для гэткіх задачаў *“Archivum wschodni”*. Адзначым, што ў той самы час расейскія гісторыкі, цалкам незалежна, але з аналягічнай мэтай, заснавалі “Мэмарыял”. Яны таксама пачалі выдаваць часопіс і неўзабаве займелі вялізную сетку дапісчыкаў.

Абедзьве рэдакцыі цяпер актыўна супрацоўнічаюць, гэткая самая структура створаная ў Кіеве, і ў гэтым трыкутніку працягваецца плённы абмен інфармацыяй.
Ці азначае гэта, што палітыка ўжо не мяшаецца ў справы гісторыі? Зрабіўшыся не такім відавочным, палітычны ўплыў хіба толькі стаў больш далікатным. Дый хіба можна сабе ўявіць гісторыю па-за павевамі эпохі? Хіба можна было пазьбегчы гісторыі зьвядзеньня рахункаў, якая першай пачала стварацца пасьля вырашальнага пералому 1989—1990 гадоў? "Аўтэнтычная", "сапраўдная" гісторыя, абвешчаная новымі гісторыкамі (часьцяком, уласна, старымі — эманцыпаванымі або апартуністамі) адразу спавясьціла пра ганебны характар і злачынствы папярэдняга пэрыяду, і помсьлівы дух новае гістарычнае эпохі выклікаў ува ўрадавых і партыйных установах паніку, у выніку чаго апошнім злачынствам старога рэжыму стала зьнішчэньне дакумэнтаў (прынамсі, тых, што кампрамэтавалі адказных асобаў). Іх выводзілі са звароту, выкрадалі, зьнішчалі. Давялося ствараць адмысловую камісію для нагляду за рухам матэрыялаў у Міністэрстве ўнутраных справаў. Хутка зьнішчаць дакумэнты забаранілі заканадаўча. У 1991 годзе рэформу польскай архіўнай сыстэмы ўзначаліў вядомы гісторык, прафэсар Ежы Скаўронак. Партыйныя архівы перайшлі ў распараджэньне Акадэміі навук.
Аднак паўстаў цэлы шэраг праблемаў, якія досыць хутка паказалі, што стэрылізаваная гісторыя, пазбаўленая зацікаўленага дасьледаваньня бяз пэўных асноваў, непрымальная. Перш за ўсё, нягледзячы на паўсюдны трыюмф рынкавай эканомікі, адбылося агульнае зьбядненьне. Мала таго, што брак сродкаў адбіваўся на колькасьці архіўных працаўнікоў, гісторыі была нанесеная шкода і новымі нечаканымі падыходамі. Некаторыя несумленныя архівісты скарысталіся надыходам эры панаваньня грошай і "прыватызавалі" фонды, а потым прадалі на вагу золата каштоўныя дакумэнты, якія вельмі хацелі атрымаць суседнія краіны. Калі ў Польшчы да ўлады прыйшла кааліцыя сялянаў і сацыял-дэмакратаў (за ўраду Паўляка), сама польская дзяржава, якой бракавала цьвёрдай валюты, практыкавала "дараваньне архіваў", запачаткаванае ў часы флірту з гонэкераўскай Усходняй Нямеччынай. Пры канцы 1994 году атрымала розгалас таямніца яшчэ часоў другой сусьветнай

вайны: у Ягелёнскай бібліятэцы ў Кракаве апынуліся каштоўныя рукапісы Моцарта, Мэндэльсона, Гётэ, Гайнэ з бэрлінскай Прускай бібліятэкі, знойдзеныя ў Крэшыўскім кляштары, куды нацысты прывезьлі іх у 1945 годзе. Гэтыя скарбы сталіся прадметам даволі брыдкага гандлю зь Нямеччынай.

Спыненьне мэцэнацтва дзяржавы што да ўсіх гістарычных публікацыяў міжволі выклікала зьяўленьне вялізнай колькасьці нізкаякасных брашураў, зьвязаных з нацыяналістычнымі рухамі дакамуністычных часоў. Як і ўся выдавецкая справа, кніжка па гісторыі мусіла падпарадкоўвацца законам рынку, спусьціўшыся да ўзроўню сярэдняга малапатрабавальнага чытача, якому хацелася *гісторыкаў*. Непасрэдным вынікам новай палітыкі зьяўляюцца загалоўкі-заклікі й пасрэдны зьмест. Добрыя гісторыкі з прычыны малога заробку часьцяком кідаюць свой занятак і шукаюць іншай працы. У выніку расейскія бібліятэкі затапілі ідэалізаваныя аповеды пра імпэратарскую сям'ю ды генэалёгію дваранаў, якімі так захапляецца прыніжаны на працягу 70 гадоў народ. Калі мінула цяга да псыхадрамаў пакутаў і лягерных жахаў, людзям закарцела гісторыі падменаў, захацелася цешыцца прыдумкамі на тэму жыцьця цароў і агіяграфіяй. Самыя сур'ёзныя дасьледчыкі, якія і далей хочуць вывучаць сапраўдныя спружыны нядаўняга мінулага, мусяць шапкаваць перад фінансавымі інстытуцыямі, а тыя, зразумела, гнуць сваю палітыку. Скажам, праграму супрацоўніцтва *"Karty"* й расейскага *"Мэмарыялу"* фінансуе Фундацыя Сьцяпана Батуры разам з вашынгтонскім *National Endow-ment for Democracy*, які, хоць і ня ўмешваецца ў працу, але вызначае напрамак і характар дасьледаваньня.

11.

Застаецца фундамэнтальная праблема абмежаваньняў на раскрыцьцё гістарычных таямніцаў, якія ў новай сытуацыі можа накладаць палітыка, дбаючы пра сацыяльную стабільнасьць і грамадзянскі мір. З гэтай праблемай Францыя сутыкнулася, калі спрабавала вырашыць пытаньне сумленьня, зьвязанае з рэжымам Вішы. Ува ўсходнеэўрапейскіх краінах яно выглядае непараўнальна больш складаным. За семдзесят год камунізму ў

СССР (ці сорак у краінах-сатэлітах) літаральна кожны йшоў на нейкі кампраміс з рэжымам. Што варта казаць пра мінулае, а пра што лепей маўчаць? Акрамя таго, ці можна пагадзіцца з услаўленьнем дакамуністычнай эпохі, у якой таксама хаваецца дастаткова пагрозьлівых фантомаў?
Прадстаўнікі новай улады вагаюцца між двума патрабаваньнямі: празрыстасьці й згоды, — абмяжоўваючы гісторыкаў дасьледаваньнямі зусім нядаўняй гісторыі і заклікаючы іх даваць скідку на час і прастору. Чэхія, Расея, Польшча вырашылі не рабіць усіх высноваў з гісторыі, якая нібыта можа дазнацца адразу пра ўсё. На прыкладзе Польшчы добра відаць, як розныя ўрады ставіліся да магчымасьці абмяжоўваць ці не абмяжоўваць гістарычныя веды. Першы некамуністычны кіраўнік, асьцярожны Мазавецкі, інстынктыўна адчуў патрэбу пэўнага дазаваньня новых таямніцаў. Ягоная формула зрабілася знакамітай: ужо ў 1989 годзе ён сказаў, што мусова падвесьці “тоўстую рысу” пад некаторымі паскудствамі нядаўняга мінулага, іначай невядома, як доўга зацягнецца чыстка кадраў, а пасьля й саміх выканаўцаў гэтае чысткі. Добра ведаючы, што такое эпоха судовых працэсаў, ён не хацеў стаць арганізатарам яшчэ аднаго такога. Паляваньне на вядзьмарак магло дэстабілізаваць краіну, заблытаць гісторыю і судовую сыстэму, ператварыўшы гісторыкаў у пракурораў, ці, яшчэ горай, пракурораў у гісторыкаў.
Пры канцы 1991 году надышоў час першых цалкам вольных парлямэнцкіх выбараў. Альшэўскі, прэм’ер-міністар, якога тады падтрымаў Валэнса, запатрабаваў больш суровага стаўленьня да ўчорашніх прыгнятальнікаў. На ягоную думку, вызначаць ступень адказнасьці нескладана. Краіне прапаноўвалася заглыбіцца ў сваю нядаўнюю гісторыю. Адбылося тое, чаго баяўся Мазавецкі. Усе пачалі падазраваць адзін аднаго, падазрэньне ўпала й на самога прэзыдэнта. Пачвары сталі вылазіць са скрынкі Пандоры. Пагроза вяртаньня ў іншай форме нянавісьці сталінскіх часоў прымусіла адмовіцца (прынамсі, часова) ад імкненьня да празрыстасьці й абсалютнай памяці і зьмірыцца зь няпоўнай ведай. За паўгоду Альшэўскі пайшоў у адстаўку.
Ты палітыку за дзьверы, а яна праз акно. Заслона, наўмысна накінутая на ўчорашнія злоўжываньні, робіцца ўмовай існаваньня для ўсіх цывілізаваных краінаў. Адкладзены на

трыццаць год доступ да архіўных дакумэнтаў дыктуецца патрабаваньнем грамадзкага спакою. Пасьля пэрыяду абурэньня надыдзе час аналізу, які наўрад ці будзе суцяшальным. Гучны посьпех кніг генэрала Ярузэльскага й тэлеперадачы з панэгірыкамі яму падаюцца такімі сама недарэчнымі, як аналягічныя маніфэстацыі памяці Пэтэна, аднак Польшча абрала хутчэй такую па-блажлівасьць, чым надмерны маралізм і злосьць. Гэта ізноў цалкам рэальны ўплыў палітыкі на нашы веды, хоць і гэтай палітыцы, як і ранейшым, калісьці надыдзе канец, і тады нашы веды зьменяцца. Некаторыя даўнейшыя пэрыяды, якімі тэарэтычна нішто не перашкаджае займацца ў новых палітычных умовах, дагэтуль застаюцца недасьледаванымі з палітычна-нацыянальных прычынаў. Расея й Украіна так і не наважыліся цалкам высьветліць усе чорныя плямы сваёй гісторыі да 1950 году, у прыватнасьці, тое, што тычыцца антысэмітызму (тое самае, уласна, і ў Польшчы). У габрэйскім сьвеце гэта часьцяком выклікае несправядліва агульнае асуджэньне, якое ігнаруе шматлікія выпадкі дапамогі габрэям у гады вайны й багацьце палітры габрэйска-польскіх адносінаў. Насамрэч, палітычная асьцярожнасьць тут досыць часта замаруджвае пошук ісьціны. Ужо згаданая *“Karta”* не збаялася апублікаваць у рамках выдатнай сэрыі “Польскія габрэі” сьведчаньне пра забойства габрэяў Арміяй Краёвай падчас Варшаўскага паўстаньня 1944 году. Нядаўна рэдактар часопісу заявіў, што цяпер можна скласьці кнігу, памерам ня меншую за кнігу Барташэўскага пра ратаваньне габрэяў у Польшчы (W. Bartoszewski. *Zegota: Juifs et Polonais dans la résistance 1939—1944*. Paris, 1992), якая засьведчыць, колькі габрэяў палякі аддалі на сьмерць. “*Аднак*, — дадае Міцнэр, — *калі дойдзе да шырокай дыскусіі, бурныя эмоцыі зробяць немагчымым пошук ісьціны*”. Французам вельмі нялёгка даецца прызнаньне істотнага ўдзелу сваіх суайчыньнікаў у дэпартацыях габрэяў, а стрыманасьць некаторых знаных дасьледчыкаў у ацэнцы палітычных наступстваў публікацыі такіх фактаў таксама зьяўляецца цалкам відавочнай. Гэтая самацэнзура робіцца ўнутранай цэнзурай дзяржавы. Сытуацыя старая, як сьвет: *historia sacra* прызначаная для тых, для каго адкрытая таямніца, і вольных ад лішніх пачуцьцяў, а *historia profana* — для тых, хто падпадае пад уплыў эмоцыяў у палітыцы.

Вось тут і бачым, наколькі мужным павінен быць гісторык, каб дзейсна й настойліва несьці суайчыньнікам асьвету: пасьля публікацыі малацікавых згадак сьведкі з габрэйскай паліцыі варшаўскага гета Міхнікава *“Gazeta Wyborcza”* на пачатку 1994 году распачала вялікую дыскусію пра стаўленьне палякаў да габрэяў падчас зьнішчэньня гета, а таксама ў часе Варшаўскага паўстаньня. Допісы чытачоў засьведчылі ўсю жорсткасьць тае эпохі і, адначасова, сталасьць народу, які паступова наважваецца на нялёгкае прызнаньне як сваіх памылак, так і шчырых аблудаў.

12.

Хоць 1989—1990 гадамі пазначаны неверагодны паварот у гісторыі Ўсходняй Эўропы, палітыка заўжды будзе намагацца перашкодзіць гістарычнаму спазнаньню. Як пісаў пры канцы XVIII стагодзьдзя Ян Патоцкі, *“шасьцёх месяцаў дастаткова, каб ня толькі народная радасьць згасла, але й сам народ расчараваўся ў найпрывабнейшай рэвалюцыі, якая, зрэшты, ніколі не прынясе абяцанага шчасьця, а толькі спародзіць іншы спосаб жыцьця, дзе заўсёды ў той самай меры будуць спалучацца дабро і зло”*.

Праўдзівасьць такога рэлятывізму эпохі Асьветніцтва пацьвярджаецца, калі заўважыць, колькі трыюмфатараў сыходзіць са сцэны з чарговым паваротам кола фартуны. Нам цяжка прызнаць, што гістарычная веда не бывае статычнай: прымхлівая муза Кліё несупынна тлумачыць і ператлумачвае, а чалавек заўжды прагне канструяваць і дэканструяваць. З-за “гульняў памяці” гістарычнае спа-знаньне падаецца дастаткова ўразьлівым, а гісторык (хай сабе ён і завецца навукоўцам) толькі дэманструе маскі, з-пад якіх выглядае і пад якімі зьнікае заўжды зьменлівая і няўлоўная ісьціна.

Бо зьмяняюцца ня толькі перашкоды на шляху да гістарычных ведаў, але й самі веды могуць рабіцца больш рытарычнымі й узважанымі. “Аўтэнтычнасьць” або нават “ісьціна” для гісторыкаў недасяжныя на калектыўным узроўні, як для псыхолягаў — на індывідуальным. Арсэнал гісторыка заўжды складаецца на карысьць часовага кансэнсусу, дзе вялікую, хоць і не галоўную, ролю адыгрывае, несумненна, палітыка. Перагук між Вальтэравым скептычна-гульнёвым бачаньнем рамяства

гісторыка і постмадэрнісцкімі тэорыямі сапраўды ўражвае. Урэшце, усе верагодныя перашкоды, што замінаюць гістарычнаму спазнаньню, скіраваныя на тое, каб захаваць мэту, зманлівую ўжо саму па сабе. А калі веды ёсьць толькі адбіткам ці мэтафарай, дык гісторыя (як яе вызначае, напрыклад, Рыкёр у “Часах і аповедах”) — гэта апавяданьне, якое мае ўласную сэмантыку, гэта “творчая імітацыя”, якая прагне дэміюргічнай ролі, насуперак усялякім цяжкасьцям. Запамятаем, што марыянэтак, якіх мы прымушаем рухацца, торгаючы матузкі, можна перафарбаваць, зьмяніць ці патрушчыць, а тэатар Кліё, нязьменны й упарадкаваны на першы погляд, заўтра можа зрабіцца арэнай жорсткіх бітваў. Нават такі спустошаны і неспасьцігнуты, як у посткамуністычнай Усходняй Эўропе, ён будзе зьмяняцца і ў будучыні. Гэта ніякім чынам не здымае адказнасьці з гісторыка і не пазбаўляе ягонага рамяства права на існаваньне. Адсюль вынікае толькі — і гэта ўжо шмат!, — што прадмет нашых дасьледаваньняў заўжды хісткі, а *Splendor Veritatis* недасягальная, бо навукоўцу да твару сьціпласьць.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]

№ 4 (18) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя:
analityka@yahoo.com
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: **06-10-2001**
[image]

Юлія Канцэвіч, Сяргей Сматрычэнка

Летаргія беларускай лінгвістыкі

Типология двуязычия и многоязычия в Беларуси. НАН РБ, Ин-т языкознания им. Якуба Коласа, Бел. респ. фонд фундамент. исслед. Под ред. А. Булыко, Л. Крысина. — Менск: Беларуская навука, 1999.

СЯРГЕЙ СМАТРЫЧЭНКА перакладчык, выкладчык БДУ, сталы супрацоўнік часопісу “ARCHE”.

ЮЛІЯ КАНЦЭВІЧ выпускніца філялягічнага факультэту БДУ.

Добра, калі ўсё робіцца ў час. Калі ў час выдаюцца людзям заробкі, пенсіі ды стыпендыі, своечасова гаворацца патрэбныя словы, прызначаюцца выбары, выдаюцца кнігі. Добра, але не ўсім і не заўжды ўдаецца трымацца гэтага правіла. Вось і гэтая рэцэнзія ўжо мо прыпазнілася, але кніга, на якую яна напісана, мусіла выйсці год 10 таму.

Кніжка называецца *“Типология двуязычия и многоязычия в Беларуси”*. Цана, як для 1999 году выдання, зусім не малая — 2 761 000 рублёў, яшчэ старымі грашыма. Гляньма ж бліжэй на гэты “шэдэўр” лінгвістычнае думкі, праца над якім доўжылася 5 год (з 1986 да 1991), перагорнем старонкі з шэрай газетнай паперы, сабраныя пад мяккай вокладкай.

Што адразу кідаецца ў вочы — манаграфія надзвычай няроўная і разнародная. Зрэшты, гэта заганная ўласцівасць многіх калектыўных працаў, напісаных людзьмі з рознымі навуковымі поглядамі і падыходамі. Загладзіць гэтую няроўнасць асобных частак — справа рэдактара. Горш, калі і рэдактараў адразу ажно пяць — ім бы між сабой разабрацца (на тытульным аркушы пазначаны навуковыя рэдактары А.М. Булыка і Л.П. Крысін, у выходных звестках кнігі як рэдактары значацца *В.Г. Колосовская* і *Г.В. Малахова*, а ва ўводзінах яшчэ чытаем: *“Всю работу, связанную с изданием монографии, а также ее окончательное редактирование осуществил кандидат филологических наук А.А. Лукашанец”*).

Манаграфія складаецца з дзвюх частак — *“Сопоставительная структурно-типологическая характеристика белорусского и русского языков”* і *“Функциональная характеристика языков, распространенных на территории Беларуси”*. Пачнем па парадку.

На самым пачатку кнігі знаходзім заяву рэдактараў аб прэтэнзіі на *“полноту и объективность исследования”* (с. 3), аднак ужо ў другім раздзеле, *“Сопоставительная характеристика морфологических систем”*, досыць падрабязна, на 12 старонках, супастаўляюцца марфалагічныя сістэмы расійскай і беларускай моваў, але… толькі на ўзроўні назоўнікаў, прыметнікаў ды дзеясловаў. А затым, на с. 30—31, чытаем наступны пасаж: *“Нами приведены далеко не все расхождения в морфологических*

системах сопоставляемых языков. Наречия, например, в целом отличаются или звуковым оформлением, или наречными суффиксами, которые отражают расхождения во флексиях изменяемых слов, от которых образованы наречия”. А дзе ж дэкларацыяваная паўната даследавання? Цікава, што ўвогуле ані слова не сказана пра супастаўленне, напрыклад, дзеепрыметнікаў і дзеепрыслоўяў, пра што ў першую чаргу гаворыцца студэнтам-філолагам ва ўсіх універсітэтах краіны на занятках стылістыкі, бо ўтварэнне, пашыранасць і ўжыванне гэтых дзеяслоўных катэгорый у расійскай і беларускай мовах значна адрозніваюцца. Ёсць у гэтым раздзеле і звычайныя недагляды, напрыклад: *“Значение высокой, предельной степени качества усиливается присоединением приставки* наи- *к форме на* -ейш-*:* наибольший, наилучший*”* (с. 27). Няўжо *лучший* і *больший* — гэта формы на *-ейш-*? Або вось яшчэ вясёленькі прыклад: *“Хлопчык жывейшы за дзяўчынку; хлопчык жывейшы, як (чым) дзяўчынка”*. Нават расійска-беларускі слоўнік пад рэдакцыяй Якуба Коласа, Кандрата Крапівы і Пятра Глебкі, які нярэдка справядліва крытыкуецца за мноства русізмаў, падае да расійскага слова *живой* у значэнні *проворный, быстрый* толькі адпаведнікі *жвавы, рухавы*, а ў значэнні *оживленный — жвавы, бойкі*. Так што прыклад атрымаўся з разраду *“Ленин — живее всех живых”*. Дарэчы, а дзе ж *“хлопчык жывейшы ад дзяўчынкі”*? Здаецца, спадарыня Г. Вештарт, аўтарка дадзенага раздзелу манаграфіі, забылася згадаць яшчэ і такі спосаб утварэння параўнальных канструкцый у беларускай мове, які ў дыялектнай мове нямала пашыраны.

Наступны раздзел — *“Сопоставительная характеристика лексики”*, выклікае яшчэ больш пытанняў. Атрымліваецца, што амаль уся лексіка для аўтаркі (гэтым разам спадарыні В. Нікалаевай) зводзіцца да стараславянізмаў. Безумоўна, ахапіць усю лексіку кожнай з дзвюх моваў — задача невыканальная ў межах адной манаграфіі, аднак навошта тады так прэтэнцыёзна называць раздзел і ўвогуле замахвацца на “паўнату і аб’ектыўнасць” даследавання. Нават студэнты пры пэўнай неадпаведнасці назвы дыпломнага даследавання яго зместу маюць вялікія непрыемнасці пры яго абароне, а тут — сур’ёзная праца, напісаная супрацоўнікамі беларускай Акадэміі навук. Таксама дзіўна, чаму аналіз лексікі (на прыкладзе пераважна стараславянізмаў) мае аднабаковую скіраванасць —

толькі ад расійскай мовы да беларускай. Зважаючы на ўсё гэта, нам падаецца залішне смелым цверджанне, што прыведзеная *“система корреляций русских и белорусских параллельных форм отразила своеобразную картину их взаимоотношений, а также более отчетливо выявила особенности каждого языка”* (с. 43). Няўжо пэўная колькасць стараславянізмаў, прысутных у расійскай мове і адсутных або не цалкам адэкватных (*“по известным причинам”* (с. 36)) у беларускай, можа выявіць асаблівасці ўсёй беларускай мовы? У недасведчанага чалавека гэта можа выклікаць хіба ўражанне яе непаўнавартаснасці. Цікава, дарэчы, якія ж такія асаблівасці выявіла згаданая сістэма карэляцый? Вось жа: *“…для русских старославянизмов характерна бóльшая способность образовывать многочисленные словообразовательные связи”* (с. 43). Слушна. Аднак нам даводзілася займацца супастаўляльным даследаваннем безэквівалентнай лексікі і словаўтваральных лакун у чэшскай, расійскай і беларускай мовах, і мы можам з упэўненасцю сказаць, што ў гэтым плане беларуская мова значна багацейшая за расійскую (пра чэшскую цяпер гаворкі няма, хаця і ў гэтым выпадку параўнанне было б не на карысць расійскай) і ў яе значна шырэйшыя словаўтваральныя магчымасці. У гэтым кожны можа пераканацца, пагартаўшы хаця б слоўнічак І. Шкрабы *“Самабытнае слова”*. Вось так: варта толькі абстрагавацца ад стараславянізмаў (а мо яны былі выбраныя наўмысна?), як усё можа паўстаць у цалкам іншым святле. Дарэчы, пра слоўнікі. Зусім незразумела, якімі слоўнікамі карысталася спадарыня Нікалаева, прыводзячы некаторыя пары расійска-беларускіх адпаведнікаў, напрыклад: *вожделение — хаценне* (а дзе *пажадлівасць*, *жаданне*, *жадоба*, *прагнасць*, якія мо лепш пасуюць у гэтым выпадку? (усе гэтыя прыклады ўзятыя намі толькі са слоўніка пад рэдакцыяй Якуба Коласа, Кандрата Крапівы і Пятра Глебкі, каб не наклікаць на сябе абвінавачанні ў карыстанні нацыяналістычнымі слоўнікамі кшталту Байкова–Некрашэвіча ці, барані Божа, В. Ластоўскага, або, урэшце, слоўнічкам біблійнае лексікі, складзеным некалі А. Разанавым і публікаваным у часопісе *“Крыніца”*, № 9, 1994)), *возопить — закрычаць* (*залямантаваць*, *загаласіць*?), *врата — дзверы* (*вароты*, *брама*?), *благодеяние — дабро* (*дабрадзейства*?), *враг — нячысты, нячысцік* (!?) (*вораг*?), *изречь — рэкнуць* (!?) (*вымавіць*, *сказаць*, *выказаць*?), *разверзаць*

— *разяўляць* (*раскрываць, расчыняць*?). Слова *варвар* у спадарыні Нікалаевай таксама называецца стараславянізмам (с. 37), хоць гэта, відавочна, запазычанне са старжытнагрэцкай, якое ў беларускую мову, дарэчы, трапіла напачатку праз польскую ў форме *барбар*. І яшчэ: як у гэтым раздзеле, так і ў некаторых іншых (гл., напрыклад, с. 43, 59), неаднаразова прыводзяцца звесткі вынікаў нейкіх таямнічых анкетаванняў і тэстаў, і пры гэтым у пераважнай бальшыні выпадкаў няма ніякіх тлумачэнняў, хто, дзе, калі і кім анкетаваўся (тэставаўся). Для навуковай працы гэта, мякка кажучы, некарэктна.

Каб скончыць з "паўнатой і аб'ектыўнасцю", згадаем, што ў раздзеле *"Формы и типы интерференции при других видах двуязычия и многоязычия"* поўна і аб'ектыўна разглядаецца польска-беларускі білінгвізм, менш поўна, але не менш аб'ектыўна — літоўска-беларускі, і гэтак сама поўна і аб'ектыўна ігнаруюцца ўсе астатнія (у тым ліку ўкраінска-беларускі). Згадваецца толькі, што *"кроме белорусско-литовской интерференции существуют также польско- и русско-литовская"* (с. 111), а таксама, што *"кроме двуязычия на территории республики существует и многоязычие. Трехъязычными бывают чаще всего польскоязычные жители, владеющие также белорусским и русским языками. К четырехъязычным в большинстве случаев относятся представители литовского населения: кроме своего родного языка они в той или иной степени (достаточной, однако, для общения в большинстве коммуникативных ситуаций) знают русский, белорусский, в меньшей мере польский"* (с. 111).

Дзеля цікавасці мы адмыслова знайшлі ў бібліятэцы вынікі перапісу насельніцтва 1999 г., каб прасачыць, як усё ж такі змяніўся ў параўнанні з 1979 і 1989 гадамі нацыянальны склад насельніцтва Беларусі і, адпаведна, моўная сітуацыя. У выніку да табліцы, прыведзенай на с. 113 манаграфіі, дадалася яшчэ адна калонка:

Як нам падаецца, прыведзеныя ў табліцы звесткі досыць паказальныя і не патрабуюць адмысловага каментару. Для цікавасці прывядзем яшчэ некалькі лічбаў са звестак перапісу насельніцтва 1999 г.:

беларусаў, што назвалі беларускую мову роднай — 85,6% (у 1979 г., адпаведна, — 83,5%, у 1989 г. — 80,2%);
расійцаў, што назвалі роднай мовай беларускую, — 9,1% (103 723 чалавекі) ад усіх расійцаў Беларусі (у 1989 г. — 1,52% (17 341 чалавек; у кнізе, дарэчы, памылкова пазначана 1 734));
украінцаў, што назвалі роднай мовай расійскую — 42,8% ад усіх украінцаў Беларусі (у 1989 г. — 51%); беларускую — адпаведна 14,3% (у 1989 г. — 6%);
габрэяў, што назвалі роднай мовай ідыш — 5,4% ад усіх габрэяў Беларусі; (у 1989 г. — 11,2%), расійскую — 77 % (у 1989 г. — 89%), беларускую — 17,1% (у 1989 г. — 2%; у кнізе памылкова пазначана лічба 20%);
жыхароў Беларусі, што маюць вышэйшую адукацыю, — 1 133 500 чалавек (134,5% ад 1989 г.).
Супярэчнасцяў не ўдалося пераадолець нават у межах аднаго раздзелу. Так, спадар І. Войніч на с. 235 піша, што *“польское население в Беларуси в большинстве своем выходцы из Польши”*, а праз 4 старонкі, як бы ў апраўданне, дадае: *“Тот примечательный факт, что подавляющее большинство поляков по национальности назвали своим родным языком белорусский, свидетельствует о зависимости национальной принадлежности от традиционного католического вероисповедания. Это находит свое подтверждение в устных высказываниях населения: “Ну какой я поляк? Записали поляком — вот я и поляк””*. Дык мо ўсё ж большасць польскага насельніцтва — тутэйшыя акаталічаныя беларусы?
Цікавая сітуацыя атрымалася з габрэямі. Агульная іх колькасць зменшылася ў цяперашні час да 27 800 чалавек (1999 г.) — г. зн. да 0,28 % ад агульнай колькасці насельніцтва Беларусі, або ў 4 разы ў параўнанні з перапісам 1989 г., звесткі якога ў дадзеным выпадку выкарыстоўваюцца ў манаграфіі. А ці здагадаюцца чытачы, куды пераважна мігруюць габрэі? Ахвотна працытуем: *“С конца XIX в. их численность уменьшилась в результате миграции в Америку, в советское время — в результате миграции в центральные районы бывшего СССР, в Крым и на Дальний Восток”* (с. 236). Вось жа — пра Ізраіль ані згадкі.
Другі раздзел другой часткі, *“Функционирование белорусского и русского языков в основных сферах общения”*, можна чытаць адно як гістарычную ілюстрацыю, гэтак, як мы чытаем

падручнік гісторыі, але не болей за тое. Таму дзіўна і няўцямна для нас гучаць асобныя месцы, дзе пра наяўную на мяжы 1980—1990 гадоў моўную сітуацыю гаворыцца ў цяперашнім часе. Напрыклад: *“Двуязычие в сфере массовой коммуникации представлено четырьмя подсферами — печатью, телевидением, радиовещанием и кино. В звукозаписи оно представлено в минимальной степени, так как лишь единичные пластинки с белорусскоязычными произведениями, литературными и песенными, выпущенные центральными предприятиями, изредка появляются в розничной торговле”* (с. 120); *“Теперь из 11 республиканских газет на белорусском языке издаются 6”* (с. 125); *“Местное телевидение ведет трансляцию по трем программам: двум общесоюзным и одной республиканской”* (с. 136); *“За последние 10 лет Госкомиздатом БССР выпущено 38 словарей на белорусском языке, но все они в основном являются узконаучными, для школ же выпущено только 5: русско-белорусский словарь для начальных классов (1985), орфографический словарь для начальных школ (1977), толковый словарь белорусского языка для средней школы (1979), орфографический словарь для средней школы (1978), словарь физических и астрономических терминов (1979)”* (с. 143; вельмі дзіўна, дарэчы, чаму напісана *“за последние 10 лет”*, тым часам як матэрыял відавочна пісаўся не ў 1987, а ў 1990 ці 1991 годзе, пра што сведчаць спасылкі на 1990 год у іншых месцах гэтага самага падраздзелу манаграфіі); *“В настоящее время в школах Минска, Новополоцка, Бреста, Барановичей, Витебска, Гродно, Лиды, Новогрудка, Бобруйска открыты 1-е классы с белорусским языком обучения, но эти классы еще очень малочисленны (в некоторых из них обучается всего лишь по 10—13 школьников)”* (с. 146). Вельмі дзіўнае пачуццё ахоплівае, калі чытаеш у сучаснай кнізе падобныя словы. Нібы трапляеш на пачатак апошняй беларусізацыі, калі ніхто яшчэ нават не ўяўляў, што міне колькі год і ў краіне запануе Лукашэнка. Некаторыя абзацы навейваюць лёгкую настальгію, часам з налётам гаркоты: *“С января 1988 г. на двух языках стал выходить журнал для юношества и молодежи* “Крыніца” *(*“Родник”*), издание современное по своей общей позиции, по поднимаемым проблемам. Белорусский язык* “Крыніцы” *отличается от других изданий общей тенденцией к большей дифференциации от русского языка. Тираж этого журнала*

достиг в 1990 г. 61 550 экземпляров” (с. 124*); “Двуязычными передачами часто являются* “Сельская раніца”*,* “Мікрафон перабудовы”*,* “Навука, тэхніка, вытворчасць”*,* “Мінскія навіны”*,* “Дзень нашага жыцця”*,* “Беларуская маладзёжная”*,* “Увайсці ў кожны дом” *и др.”* (с. 134). Дзе тыя наклады тае *“Крыніцы”*, дзе тая *“Беларуская маладзёжная”* і пазнейшае *Радыё 101,2*!

Нас, учорашніх студэнтаў і аспірантаў, не могуць пакінуць абыякавымі і словы пра тое, што *“к 1992 г. планируется укомплектовать все школы учителями белорусского языка и литературы за счет увеличения набора на соответствующие отделения. Открыто вечернее отделение по этой специальности в Белгосуниверситете, расширен прием в аспирантуру. С каждым годом растет число различных курсов по обучению белорусскому языку. В пединститутах и на педагогических потоках университетов в ближайшее время намечается большинство общественных дисциплин преподавать на белорусском языке, чтобы ими могли свободно владеть учителя-предметники. Вводится вступительный экзамен по белорусскому языку в этих вузах”* (с. 147). Так, не сакрэт, што на пачатку 1990-х набор студэнтаў на аддзяленні беларускай мовы і літаратуры быў значна пашыраны, аднак пераважная большасць выпускнікоў апошніх гадоў цяпер па сваёй спецыяльнасці сталася незапатрабаванай, бо колькасць гадзін беларускай мовы і літаратуры ў школах была рэзка зніжана. Разам з тым, з 1996 году ў ВНУ краіны вернута абавязковае размеркаванне, таму няшчасным выпускнікам даводзіцца адпрацоўваць два гады, калі не настаўнікамі роднае мовы, дык хоць настаўнікамі фізкультуры (яны больш патрэбныя), або нават і выхавальнікамі ў дзіцячых садках.

Уражанне адноснай ідэалагічнай адстароненасці і гістарычнай аб’ектыўнасці дадзенага раздзелу манаграфіі канчаткова знікае пасля таго, як спадарыня Т. Салавянчык на с. 148 сцвярджае, што *“наука в Беларуси стала развиваться только после установления советской власти”* (?!) (с. 148).

Як і ў першай частцы манаграфіі, у другой таксама маюцца пэўныя памылкі, прычыну якіх мы сваім розумам не можам растлумачыць інакш, як невалоданнем літаратурнай мовай: *“Незнание правильных регулярных образований характерно при употреблении названий детенышей животных:* ***цыпленок — цыплянё, утенок — квачонак, качаня****”* (с. 166). Даруйце, што

ж няправільнага ў беларускім слове *качаня*? А напісанне па-расійску назвы цэнтральнай беларускай кінастудыі *“Беларусьфільм”* праз *о* — *“Белорусьфильм”* (с. 167) можна растлумачыць хіба жаданнем аўтара выглядаць ісцінна рускім чалавекам.

Пасаж на с. 147 увогуле выклікае сумнеў у тым, што шматлікія рэдактары (і карэктары — калі яны ўвогуле былі) уважліва чыталі манаграфію. Цытуем цалкам: *“В республике ведется большая работа по подготовке новых учебников, пособий, словарей. Издаются журналы* “Беларуская мова і літаратура ў школе”*,* “Спадчына”*, в которых публикуются многочисленные материалы в помощь учителю. Для учителей белорусского языка и литературы издана научно-методическая библиотечка, а для школьников — серия книг* “Скарбы мовы” *и* “Народныя пісьменнікі Беларусі”. *Подготовлены и утверждены новые учебные планы для общеобразовательных школ с русским и белорусским языками обучения, в которых увеличено количество часов на изучение белорусского языка в 6—7 классах. С 1989/90 г. предусмотрено изучение белорусского языка со 2-го класса в школах с русским и белорусским языками обучения. Для этого подготовлены необходимые учебно-методические пособия. Укрепляется также учебно-материальная база преподавания. Во всех школах города созданы кабинеты белорусского языка и литературы. По словам учителей, вырос интерес учеников к изучению родного языка и литературы. Уже три года подряд городская команда старшеклассников занимает призовые места на Республиканской олимпиаде школьников по белорусскому языку. Есть надежда, что в ближайшие годы языковая ситуация в республике изменится”*. Зусім незразумела, які горад маецца на ўвазе. І прычым тут увогуле нейкі горад, калі гаворка ў даследаванні ідзе пра ўсю Беларусь. Здаецца, абсалютна заканамерна, што каманды старшакласнікаў пэўных гарадоў (ці раёнаў) займаюць прызавыя (як, зрэшты, і ўсе астатнія) месцы на Рэспубліканскай алімпіядзе старшакласнікаў па беларускай мове.

Апрача ўжо згаданых вышэй памылак і чыпятак, яны сустракаюцца таксама на с. 14, 15, 23, 53, 54, 108, 110, 121, 131, 134, 165, 220 (напрыклад, адсутнасць пазначэння мяккасці гуку [дз’] у транскрыпцыі, напісанне слова *каралі* праз рускае *и*, няправільная пастаноўка націску, пастаноўка дужак толькі з

аднаго боку, напісанне слова *беларуская* з двума *с* і г. д.). Аўтары манаграфіі маюць пэўныя праблемы не толькі з пісьменнасцю, логікай, веданнем гісторыі, але і з матэматыкай. Вось некаторыя прыклады блытаніны ў лічбах: *“Так, на вопрос, какое из трех словосочетаний является правильным:* Три белых облачка*,* Три белые облачка*,* Три белые облачки*, 89 % реципиентов городских школ подчеркнули первое* — Три белых облачка*, т. е. выбрали правильное для русского языка словосочетание, но 12 % учащихся посчитали правильным* Три белые облачки *<…>”* (с. 92). 89 % + 12 % = 101 % са 100 % магчымых, і гэта пры тым, што не ўказваецца, колькі ж працэнтаў школьнікаў выбрала трэцюю магчымасць — тады набралося б усіх 110 %. Яшчэ прыклад: *“За указанный период почти в 6 раз снизилась численность поляков, считающих свой язык родным (с 48,6* (у названай табліцы, дарэчы, падаецца лічба 46,8 — **Аўт.**) *до 13,1%*)” (с. 237). Між тым, калі мы не памыляемся, 48,6 : 13,1 = 3,7. Чытаем далей: *“Вслед за белорусскоязычными еврейские школы занимали второе место по численности: в 1928 г. — 209 человек, в 1929 г. — 224, в 1930 г. — 274, в 1932 г. — 221”* (с. 241). Мо маецца на ўвазе колькасць не чалавек, а школ? Яшчэ прыклад: *“Миграция из сел в города достигла значительных размеров — 42% (по данным на 1970 г.)”* (с. 177—178). Зусім незразумела, што паказвае лічба 42%. Аднак найвялікшы перл трапіўся нам на с. 171: *“Чаще всего численность организации 7,13 человек”*. Каментар, думаем, непатрэбны.

Увогуле, кніжка вельмі павучальная. Па яе прачытанні мы ў чарговы раз пераканаліся ў слушнасці правіла, што ўсё добра ў свой час. Пераляжала кніга — лепей яе ўжо не чапаць. Калі ж вырашылі выдаваць, зрабіце ласку, прывядзіце матэрыял у адпаведнасць актуальнаму стану і сучасным патрабаванням, тройчы вычытайце (балазе на тое было 8 год), а тады ўжо сцвярджайце, што застарэлыя звесткі *“нисколько не умаляют научный потенциал данной работы”* (с. 4). Як на наш роздум, дык вельмі нават змяншаюць. А яшчэ больш змяншаюць яго абсурдныя агульныя фразы супрацоўнікаў вядучай даследчай установы краіны пра тое, што *“Белорусский литературный язык — национальная гордость белорусов. …И все же наш прекрасный белорусский язык имеет право на жизнь”* (с. 155). Дык не пакідайце ж мовы нашай беларускай!

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 4 (18) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя:
analityka@yahoo.com
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: 06-10-2001
[image]

Юлія Канцэвіч, Сяргей Сматрычэнка

Летаргія беларускай лінгвістыкі

Типология двуязычия и многоязычия в Беларуси. НАН РБ, Ин-т языкознания им. Якуба Коласа, Бел. респ. фонд фундамент. исслед. Под ред. А. Булыко, Л. Крысина. — Менск: Беларуская навука, 1999.

СЯРГЕЙ СМАТРЫЧЭНКА перакладчык, выкладчык БДУ, сталы супрацоўнік часопісу “ARCHE”.

ЮЛІЯ КАНЦЭВІЧ выпускніца філялягічнага факультэту БДУ.

Добра, калі ўсё робіцца ў час. Калі ў час выдаюцца людзям заробкі, пенсіі ды стыпендыі, своечасова гаворацца патрэбныя словы, прызначаюцца выбары, выдаюцца кнігі. Добра, але не ўсім і не заўжды ўдаецца трымацца гэтага правіла. Вось і гэтая рэцэнзія ўжо мо прыпазнілася, але кніга, на якую яна напісана, мусіла выйсці год 10 таму.

Кніжка называецца *“Типология двуязычия и многоязычия в Беларуси”*. Цана, як для 1999 году выдання, зусім не малая — 2 761 000 рублёў, яшчэ старымі грашыма. Гляньма ж бліжэй на гэты “шэдэўр” лінгвістычнае думкі, праца над якім доўжылася 5 год (з 1986 да 1991), перагорнем старонкі з шэрай газетнай паперы, сабраныя пад мяккай вокладкай.

Што адразу кідаецца ў вочы — манаграфія надзвычай няроўная і разнародная. Зрэшты, гэта заганная ўласцівасць многіх калектыўных працаў, напісаных людзьмі з рознымі навуковымі поглядамі і падыходамі. Загладзіць гэтую няроўнасць асобных частак — справа рэдактара. Горш, калі і рэдактараў адразу ажно пяць — ім бы між сабой разабрацца (на тытульным аркушы пазначаны навуковыя рэдактары А.М. Булыка і Л.П. Крысін, у выходных звестках кнігі як рэдактары значацца *В.Г. Колосовская* і *Г.В. Малахова*, а ва ўводзінах яшчэ чытаем: *“Всю работу, связанную с изданием монографии, а также ее окончательное редактирование осуществил кандидат филологических наук А.А. Лукашанец”*).

Манаграфія складаецца з дзвюх частак — *“Сопоставительная структурно-типологическая характеристика белорусского и русского языков”* і *“Функциональная характеристика языков, распространенных на территории Беларуси”*. Пачнем па парадку.

На самым пачатку кнігі знаходзім заяву рэдактараў аб прэтэнзіі на *“полноту и объективность исследования”* (с. 3), аднак ужо ў другім раздзеле, *“Сопоставительная характеристика морфологических систем”*, досыць падрабязна, на 12 старонках, супастаўляюцца марфалагічныя сістэмы расійскай і беларускай моваў, але… толькі на ўзроўні назоўнікаў, прыметнікаў ды дзеясловаў. А затым, на с. 30—31, чытаем наступны пасаж: *“Нами приведены далеко не все расхождения в морфологических*

системах сопоставляемых языков. Наречия, например, в целом отличаются или звуковым оформлением, или наречными суффиксами, которые отражают расхождения во флексиях изменяемых слов, от которых образованы наречия”. А дзе ж дэкларацыяваная паўната даследавання? Цікава, што ўвогуле ані слова не сказана пра супастаўленне, напрыклад, дзеепрыметнікаў і дзеепрыслоўяў, пра што ў першую чаргу гаворыцца студэнтам-філолагам ва ўсіх універсітэтах краіны на занятках стылістыкі, бо ўтварэнне, пашыранасць і ўжыванне гэтых дзеяслоўных катэгорый у расійскай і беларускай мовах значна адрозніваюцца. Ёсць у гэтым раздзеле і звычайныя недагляды, напрыклад: *“Значение высокой, предельной степени качества усиливается присоединением приставки* наи- *к форме на* -ейш-*:* наибольший, наилучший*”* (с. 27). Няўжо *лучший* і *больший* — гэта формы на *-ейш-*? Або вось яшчэ вясёленькі прыклад: *“Хлопчык жывейшы за дзяўчынку; хлопчык жывейшы, як (чым) дзяўчынка”*. Нават расійска-беларускі слоўнік пад рэдакцыяй Якуба Коласа, Кандрата Крапівы і Пятра Глебкі, які нярэдка справядліва крытыкуецца за мноства русізмаў, падае да расійскага слова *живой* у значэнні *проворный, быстрый* толькі адпаведнікі *жвавы, рухавы*, а ў значэнні *оживленный — жвавы, бойкі*. Так што прыклад атрымаўся з разраду *“Ленин — живее всех живых”*. Дарэчы, а дзе ж *“хлопчык жывейшы ад дзяўчынкі”*? Здаецца, спадарыня Г. Вештарт, аўтарка дадзенага раздзелу манаграфіі, забылася згадаць яшчэ і такі спосаб утварэння параўнальных канструкцый у беларускай мове, які ў дыялектнай мове нямала пашыраны.

Наступны раздзел — *“Сопоставительная характеристика лексики”*, выклікае яшчэ больш пытанняў. Атрымліваецца, што амаль уся лексіка для аўтаркі (гэтым разам спадарыні В. Нікалаевай) зводзіцца да стараславянізмаў. Безумоўна, ахапіць усю лексіку кожнай з дзвюх моваў — задача невыканальная ў межах адной манаграфіі, аднак навошта тады так прэтэнцыёзна называць раздзел і ўвогуле замахвацца на “паўнату і аб’ектыўнасць” даследавання. Нават студэнты пры пэўнай неадпаведнасці назвы дыпломнага даследавання яго зместу маюць вялікія непрыемнасці пры яго абароне, а тут — сур’ёзная праца, напісаная супрацоўнікамі беларускай Акадэміі навук. Таксама дзіўна, чаму аналіз лексікі (на прыкладзе пераважна стараславянізмаў) мае аднабаковую скіраванасць —

толькі ад расійскай мовы да беларускай. Зважаючы на ўсё гэта, нам падаецца залішне смелым цверджанне, што прыведзеная *“система корреляций русских и белорусских параллельных форм отразила своеобразную картину их взаимоотношений, а также более отчетливо выявила особенности каждого языка”* (с. 43). Няўжо пэўная колькасць стараславянізмаў, прысутных у расійскай мове і адсутных або не цалкам адэкватных (*“по известным причинам”* (с. 36)) у беларускай, можа выявіць асаблівасці ўсёй беларускай мовы? У недасведчанага чалавека гэта можа выклікаць хіба ўражанне яе непаўнавартаснасці. Цікава, дарэчы, якія ж такія асаблівасці выявіла згаданая сістэма карэляцый? Вось жа: *“…для русских старославянизмов характерна бóльшая способность образовывать многочисленные словообразовательные связи”* (с. 43). Слушна. Аднак нам даводзілася займацца супастаўляльным даследаваннем безэквівалентнай лексікі і словаўтваральных лакун у чэшскай, расійскай і беларускай мовах, і мы можам з упэўненасцю сказаць, што ў гэтым плане беларуская мова значна багацейшая за расійскую (пра чэшскую цяпер гаворкі няма, хаця і ў гэтым выпадку параўнанне было б не на карысць расійскай) і ў яе значна шырэйшыя словаўтваральныя магчымасці. У гэтым кожны можа пераканацца, пагартаўшы хаця б слоўнічак І. Шкрабы *“Самабытнае слова”*. Вось так: варта толькі абстрагавацца ад стараславянізмаў (а мо яны былі выбраныя наўмысна?), як усё можа паўстаць у цалкам іншым святле. Дарэчы, пра слоўнікі. Зусім незразумела, якімі слоўнікамі карысталася спадарыня Нікалаева, прыводзячы некаторыя пары расійска-беларускіх адпаведнікаў, напрыклад: *вожделение — хаценне* (а дзе *пажадлівасць*, *жаданне*, *жадоба*, *прагнасць*, якія мо лепш пасуюць у гэтым выпадку? (усе гэтыя прыклады ўзятыя намі толькі са слоўніка пад рэдакцыяй Якуба Коласа, Кандрата Крапівы і Пятра Глебкі, каб не наклікаць на сябе абвінавачанні ў карыстанні нацыяналістычнымі слоўнікамі кшталту Байкова–Некрашэвіча ці, барані Божа, В. Ластоўскага, або, урэшце, слоўнічкам біблійнае лексікі, складзеным некалі А. Разанавым і публікаваным у часопісе *“Крыніца”*, № 9, 1994)), *возопить — закрычаць* (*залямантаваць*, *загаласіць*?), *врата — дзверы* (*вароты*, *брама*?), *благодеяние — дабро* (*дабрадзейства*?), *враг — нячысты, нячысцік* (!?) (*вораг*?), *изречь — рэкнуць* (!?) (*вымавіць*, *сказаць*, *выказаць*?), *разверзаць*

— *разяўляць* (*раскрываць, расчыняць*?). Слова *варвар* у спадарыні Нікалаевай таксама называецца стараславянізмам (с. 37), хоць гэта, відавочна, запазычанне са старжытнагрэцкай, якое ў беларускую мову, дарэчы, трапіла напачатку праз польскую ў форме *барбар*. І яшчэ: як у гэтым раздзеле, так і ў некаторых іншых (гл., напрыклад, с. 43, 59), неаднаразова прыводзяцца звесткі вынікаў нейкіх таямнічых анкетаванняў і тэстаў, і пры гэтым у пераважнай бальшыні выпадкаў няма ніякіх тлумачэнняў, хто, дзе, калі і кім анкетаваўся (тэставаўся). Для навуковай працы гэта, мякка кажучы, некарэктна.

Каб скончыць з "паўнатой і аб'ектыўнасцю", згадаем, што ў раздзеле *"Формы и типы интерференции при других видах двуязычия и многоязычия"* поўна і аб'ектыўна разглядаецца польска-беларускі білінгвізм, менш поўна, але не менш аб'ектыўна — літоўска-беларускі, і гэтак сама поўна і аб'ектыўна ігнаруюцца ўсе астатнія (у тым ліку ўкраінска-беларускі). Згадваецца толькі, што *"кроме белорусско-литовской интерференции существуют также польско- и русско-литовская"* (с. 111), а таксама, што *"кроме двуязычия на территории республики существует и многоязычие. Трехъязычными бывают чаще всего польскоязычные жители, владеющие также белорусским и русским языками. К четырехъязычным в большинстве случаев относятся представители литовского населения: кроме своего родного языка они в той или иной степени (достаточной, однако, для общения в большинстве коммуникативных ситуаций) знают русский, белорусский, в меньшей мере польский"* (с. 111).

Дзеля цікавасці мы адмыслова знайшлі ў бібліятэцы вынікі перапісу насельніцтва 1999 г., каб прасачыць, як усё ж такі змяніўся ў параўнанні з 1979 і 1989 гадамі нацыянальны склад насельніцтва Беларусі і, адпаведна, моўная сітуацыя. У выніку да табліцы, прыведзенай на с. 113 манаграфіі, дадалася яшчэ адна калонка:

Як нам падаецца, прыведзеныя ў табліцы звесткі досыць паказальныя і не патрабуюць адмысловага каментару. Для цікавасці прывядзем яшчэ некалькі лічбаў са звестак перапісу насельніцтва 1999 г.:

беларусаў, што назвалі беларускую мову роднай — 85,6% (у 1979 г., адпаведна, — 83,5%, у 1989 г. — 80,2%);
расійцаў, што назвалі роднай мовай беларускую, — 9,1% (103 723 чалавекі) ад усіх расійцаў Беларусі (у 1989 г. — 1,52% (17 341 чалавек; у кнізе, дарэчы, памылкова пазначана 1 734));
украінцаў, што назвалі роднай мовай расійскую — 42,8% ад усіх украінцаў Беларусі (у 1989 г. — 51%); беларускую — адпаведна 14,3% (у 1989 г. — 6%);
габрэяў, што назвалі роднай мовай ідыш — 5,4% ад усіх габрэяў Беларусі; (у 1989 г. — 11,2%), расійскую — 77 % (у 1989 г. — 89%), беларускую — 17,1% (у 1989 г. — 2%; у кнізе памылкова пазначана лічба 20%);
жыхароў Беларусі, што маюць вышэйшую адукацыю, — 1 133 500 чалавек (134,5% ад 1989 г.).
Супярэчнасцяў не ўдалося пераадолець нават у межах аднаго раздзелу. Так, спадар І. Войніч на с. 235 піша, што *“польское население в Беларуси в большинстве своем выходцы из Польши”*, а праз 4 старонкі, як бы ў апраўданне, дадае: *“Тот примечательный факт, что подавляющее большинство поляков по национальности назвали своим родным языком белорусский, свидетельствует о зависимости национальной принадлежности от традиционного католического вероисповедания. Это находит свое подтверждение в устных высказываниях населения: “Ну какой я поляк? Записали поляком — вот я и поляк””*. Дык мо ўсё ж большасць польскага насельніцтва — тутэйшыя акаталічаныя беларусы?
Цікавая сітуацыя атрымалася з габрэямі. Агульная іх колькасць зменшылася ў цяперашні час да 27 800 чалавек (1999 г.) — г. зн. да 0,28 % ад агульнай колькасці насельніцтва Беларусі, або ў 4 разы ў параўнанні з перапісам 1989 г., звесткі якога ў дадзеным выпадку выкарыстоўваюцца ў манаграфіі. А ці здагадаюцца чытачы, куды пераважна мігруюць габрэі? Ахвотна працытуем: *“С конца XIX в. их численность уменьшилась в результате миграции в Америку, в советское время — в результате миграции в центральные районы бывшего СССР, в Крым и на Дальний Восток”* (с. 236). Вось жа — пра Ізраіль ані згадкі.
Другі раздзел другой часткі, *“Функционирование белорусского и русского языков в основных сферах общения”*, можна чытаць адно як гістарычную ілюстрацыю, гэтак, як мы чытаем

падручнік гісторыі, але не болей за тое. Таму дзіўна і няўцямна для нас гучаць асобныя месцы, дзе пра наяўную на мяжы 1980—1990 гадоў моўную сітуацыю гаворыцца ў цяперашнім часе. Напрыклад: *“Двуязычие в сфере массовой коммуникации представлено четырьмя подсферами — печатью, телевидением, радиовещанием и кино. В звукозаписи оно представлено в минимальной степени, так как лишь единичные пластинки с белорусскоязычными произведениями, литературными и песенными, выпущенные центральными предприятиями, изредка появляются в розничной торговле”* (с. 120); *“Теперь из 11 республиканских газет на белорусском языке издаются 6”* (с. 125); *“Местное телевидение ведет трансляцию по трем программам: двум общесоюзным и одной республиканской”* (с. 136); *“За последние 10 лет Госкомиздатом БССР выпущено 38 словарей на белорусском языке, но все они в основном являются узконаучными, для школ же выпущено только 5: русско-белорусский словарь для начальных классов (1985), орфографический словарь для начальных школ (1977), толковый словарь белорусского языка для средней школы (1979), орфографический словарь для средней школы (1978), словарь физических и астрономических терминов (1979)”* (с. 143; вельмі дзіўна, дарэчы, чаму напісана *“за последние 10 лет”*, тым часам як матэрыял відавочна пісаўся не ў 1987, а ў 1990 ці 1991 годзе, пра што сведчаць спасылкі на 1990 год у іншых месцах гэтага самага падраздзелу манаграфіі); *“В настоящее время в школах Минска, Новополоцка, Бреста, Барановичей, Витебска, Гродно, Лиды, Новогрудка, Бобруйска открыты 1-е классы с белорусским языком обучения, но эти классы еще очень малочисленны (в некоторых из них обучается всего лишь по 10—13 школьников)”* (с. 146). Вельмі дзіўнае пачуццё ахоплівае, калі чытаеш у сучаснай кнізе падобныя словы. Нібы трапляеш на пачатак апошняй беларусізацыі, калі ніхто яшчэ нават не ўяўляў, што міне колькі год і ў краіне запануе Лукашэнка. Некаторыя абзацы навейваюць лёгкую настальгію, часам з налётам гаркоты: *“С января 1988 г. на двух языках стал выходить журнал для юношества и молодежи* “Крыніца” *(*“Родник”*), издание современное по своей общей позиции, по поднимаемым проблемам. Белорусский язык* “Крыніцы” *отличается от других изданий общей тенденцией к большей дифференциации от русского языка. Тираж этого журнала*

достиг в 1990 г. 61 550 экземпляров” (с. 124*); “Двуязычными передачами часто являются* “Сельская раніца”*,* “Мікрафон перабудовы”*,* “Навука, тэхніка, вытворчасць”*,* “Мінскія навіны”*,* “Дзень нашага жыцця”*,* “Беларуская маладзёжная”*,* “Увайсці ў кожны дом” *и др.”* (с. 134). Дзе тыя наклады тае *“Крыніцы”*, дзе тая *“Беларуская маладзёжная”* і пазнейшае *Радыё 101,2*!

Нас, учорашніх студэнтаў і аспірантаў, не могуць пакінуць абыякавымі і словы пра тое, што *“к 1992 г. планируется укомплектовать все школы учителями белорусского языка и литературы за счет увеличения набора на соответствующие отделения. Открыто вечернее отделение по этой специальности в Белгосуниверситете, расширен прием в аспирантуру. С каждым годом растет число различных курсов по обучению белорусскому языку. В пединститутах и на педагогических потоках университетов в ближайшее время намечается большинство общественных дисциплин преподавать на белорусском языке, чтобы ими могли свободно владеть учителя-предметники. Вводится вступительный экзамен по белорусскому языку в этих вузах”* (с. 147). Так, не сакрэт, што на пачатку 1990-х набор студэнтаў на аддзяленні беларускай мовы і літаратуры быў значна пашыраны, аднак пераважная большасць выпускнікоў апошніх гадоў цяпер па сваёй спецыяльнасці сталася незапатрабаванай, бо колькасць гадзін беларускай мовы і літаратуры ў школах была рэзка зніжана. Разам з тым, з 1996 году ў ВНУ краіны вернута абавязковае размеркаванне, таму няшчасным выпускнікам даводзіцца адпрацоўваць два гады, калі не настаўнікамі роднае мовы, дык хоць настаўнікамі фізкультуры (яны больш патрэбныя), або нават і выхавальнікамі ў дзіцячых садках.

Уражанне адноснай ідэалагічнай адстароненасці і гістарычнай аб’ектыўнасці дадзенага раздзелу манаграфіі канчаткова знікае пасля таго, як спадарыня Т. Салавянчык на с. 148 сцвярджае, што *“наука в Беларуси стала развиваться только после установления советской власти”* (?!) (с. 148).

Як і ў першай частцы манаграфіі, у другой таксама маюцца пэўныя памылкі, прычыну якіх мы сваім розумам не можам растлумачыць інакш, як невалоданнем літаратурнай мовай: *“Незнание правильных регулярных образований характерно при употреблении названий детенышей животных:* ***цыпленок — цыплянё, утенок — квачонак, качаня****”* (с. 166). Даруйце, што

ж няправільнага ў беларускім слове *качаня*? А напісанне па-расійску назвы цэнтральнай беларускай кінастудыі *“Беларусьфільм”* праз *о* — *“Белорусьфильм”* (с. 167) можна растлумачыць хіба жаданнем аўтара выглядаць ісцінна рускім чалавекам.

Пасаж на с. 147 увогуле выклікае сумнеў у тым, што шматлікія рэдактары (і карэктары — калі яны ўвогуле былі) уважліва чыталі манаграфію. Цытуем цалкам: *“В республике ведется большая работа по подготовке новых учебников, пособий, словарей. Издаются журналы* “Беларуская мова і літаратура ў школе”*,* “Спадчына”*, в которых публикуются многочисленные материалы в помощь учителю. Для учителей белорусского языка и литературы издана научно-методическая библиотечка, а для школьников — серия книг* “Скарбы мовы” *и* “Народныя пісьменнікі Беларусі”. *Подготовлены и утверждены новые учебные планы для общеобразовательных школ с русским и белорусским языками обучения, в которых увеличено количество часов на изучение белорусского языка в 6—7 классах. С 1989/90 г. предусмотрено изучение белорусского языка со 2-го класса в школах с русским и белорусским языками обучения. Для этого подготовлены необходимые учебно-методические пособия. Укрепляется также учебно-материальная база преподавания. Во всех школах города созданы кабинеты белорусского языка и литературы. По словам учителей, вырос интерес учеников к изучению родного языка и литературы. Уже три года подряд городская команда старшеклассников занимает призовые места на Республиканской олимпиаде школьников по белорусскому языку. Есть надежда, что в ближайшие годы языковая ситуация в республике изменится”*. Зусім незразумела, які горад маецца на ўвазе. І прычым тут увогуле нейкі горад, калі гаворка ў даследаванні ідзе пра ўсю Беларусь. Здаецца, абсалютна заканамерна, што каманды старшакласнікаў пэўных гарадоў (ці раёнаў) займаюць прызавыя (як, зрэшты, і ўсе астатнія) месцы на Рэспубліканскай алімпіядзе старшакласнікаў па беларускай мове.

Апрача ўжо згаданых вышэй памылак і чыпятак, яны сустракаюцца таксама на с. 14, 15, 23, 53, 54, 108, 110, 121, 131, 134, 165, 220 (напрыклад, адсутнасць пазначэння мяккасці гуку [дз’] у транскрыпцыі, напісанне слова *каралі* праз рускае *и*, няправільная пастаноўка націску, пастаноўка дужак толькі з

аднаго боку, напісанне слова *беларуская* з двума *с* і г. д.). Аўтары манаграфіі маюць пэўныя праблемы не толькі з пісьменнасцю, логікай, веданнем гісторыі, але і з матэматыкай. Вось некаторыя прыклады блытаніны ў лічбах: *“Так, на вопрос, какое из трех словосочетаний является правильным:* Три белых облачка*,* Три белые облачка*,* Три белые облачки*, 89 % реципиентов городских школ подчеркнули первое* — Три белых облачка*, т. е. выбрали правильное для русского языка словосочетание, но 12 % учащихся посчитали правильным* Три белые облачки *<…>”* (с. 92). 89 % + 12 % = 101 % са 100 % магчымых, і гэта пры тым, што не ўказваецца, колькі ж працэнтаў школьнікаў выбрала трэцюю магчымасць — тады набралося б усіх 110 %. Яшчэ прыклад: *“За указанный период почти в 6 раз снизилась численность поляков, считающих свой язык родным (с 48,6* (у названай табліцы, дарэчы, падаецца лічба 46,8 — **Аўт.**) *до 13,1%*)” (с. 237). Між тым, калі мы не памыляемся, 48,6 : 13,1 = 3,7. Чытаем далей: *“Вслед за белорусскоязычными еврейские школы занимали второе место по численности: в 1928 г. — 209 человек, в 1929 г. — 224, в 1930 г. — 274, в 1932 г. — 221”* (с. 241). Мо маецца на ўвазе колькасць не чалавек, а школ? Яшчэ прыклад: *“Миграция из сел в города достигла значительных размеров — 42% (по данным на 1970 г.)”* (с. 177—178). Зусім незразумела, што паказвае лічба 42%. Аднак найвялікшы перл трапіўся нам на с. 171: *“Чаще всего численность организации 7,13 человек”*. Каментар, думаем, непатрэбны.

Увогуле, кніжка вельмі павучальная. Па яе прачытанні мы ў чарговы раз пераканаліся ў слушнасці правіла, што ўсё добра ў свой час. Пераляжала кніга — лепей яе ўжо не чапаць. Калі ж вырашылі выдаваць, зрабіце ласку, прывядзіце матэрыял у адпаведнасць актуальнаму стану і сучасным патрабаванням, тройчы вычытайце (балазе на тое было 8 год), а тады ўжо сцвярджайце, што застарэлыя звесткі *“нисколько не умаляют научный потенциал данной работы”* (с. 4). Як на наш роздум, дык вельмі нават змяншаюць. А яшчэ больш змяншаюць яго абсурдныя агульныя фразы супрацоўнікаў вядучай даследчай установы краіны пра тое, што *“Белорусский литературный язык — национальная гордость белорусов. …И все же наш прекрасный белорусский язык имеет право на жизнь”* (с. 155). Дык не пакідайце ж мовы нашай беларускай!

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 4 (18) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя:
analityka@yahoo.com
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: 06-10-2001
[image]

Валеры Пазьнякоў

Крыху пра нашы нацыянальныя рысы

А. І. Лакотка. Нацыянальныя рысы беларускай архітэктуры. — Менск: Ураджай, 1999.

ВАЛЕРЫ ПАЗЬНЯКОЎ кандыдат гістарычных навук, супрацоўнік выдавецтва “Беларуская Энцыкляпэдыя”, сталы рэцэнзэнт гістарыяграфічнае літаратуры ў газэце “Наша Ніва”.

Фрыдрых Шэлінг

Архітэктура — мастацтва каралёў.

Невядомы мысьляр

Архітэктура —
гэта альфабэт
волатаў, набор
самых вялікіх
знакаў, якія
калі-небудзь
бачыў чалавек.

Гілбэрт
Чэстэртан

Вялікая
архітэктура —
гэта
найвялікшае
сьведчаньне
чалавечай
велічы.
Франк-Лойд
Райт
Анарэ дэ
Бальзак

Архітэктура — застылая музыка.
Архітэктура — выразьніца нораваў.
Існуе процьма сьведчаньняў пра адметнае значэньне архітэктуры. Эпіграфы можна доўжыць і доўжыць, калі няма ўласных думак. Ёсьць яшчэ адно вызначэньне: архітэктура — выразьніца нацыянальнага духу. Прыкладна так называецца апошняя кніга Аляксандра Лакоткі.
Такая кніга павінна была зьявіцца даўно. Хаця, ці мала якія кнігі павінны былі зьявіцца даўно, а мы іх яшчэ ня маем? Архітэктуру, дойлідзтва разглядалі як праяву народнага ці прафэсійнага мастацтва, як этнаграфічную зьяву. Цяпер — быццам як увасабленьне духу народу.
Якія ж такія нацыянальныя рысы мае беларуская архітэктура? А простага адказу кніга не дае. Такое адчуваньне, што ўсё, што адбылося ў дойлідзтве, для аўтара і ёсьць праявай нацыянальных асаблівасьцяў беларусаў. З такім жа посьпехам

“Нацыянальнымі рысамі” можна было б назваць любую абагульняльную кнігу па беларускай архітэктуры. Ёсьць падазрэньні, што аўтар пайшоў менавіта па такім шляху. То бо, узяў сваю папярэднюю кнігу “Дойлідзтва” (з сэрыі “Беларусы”, у 8-мі тамах) і пераназваў яе, заадно перакампанаваўшы. Ці выявіліся пры гэтым нацыянальныя рысы?
Аўтар вырашыў увесь наяўны матар’ял разьмеркаваць па разьдзелах: “Вёска”, “Мястэчка”, “Горад”. Вядома, калі размова йдзе пра нацыянальную ідэю, то гэта патрабуе пэўнага “лёзунгавага” мысьленьня, і такая разьбіўка архітэктуры ўпісваецца ў “лёзунгавы” стыль. Бяда ў тым, што чым прасьцейшая схема (а тры часткі — гэта вельмі проста), тым болей шанцаў, што яна акажацца няслушнай.

Пачынаецца кніга зь “Вёскі”. Шмат хто з сучасных беларусаў выйшаў зь вёскі. А вось уся Беларусь сукупна — наўрад ці.
І аўтар пачынае свой расповед з гарадзішчаў, то бо з старажытных гарадкоў жалезнага веку. Потым пераходзіць да старажытнарускіх часоў. Нельга сказаць, што тут усё бездакорна. Сьцьвярджэньне, што *“ў адрозненне ад пагосту сяло не абшчынны, а вотчынны цэнтр”* парадаксальнае сваім супрацьлеглым рэчаіснасьці сэнсам. Пераходзячы да XVI ст., аўтар заняўся фальваркамі, бо трохчленная схема кнігі патрабавала далучыць іх да вёсак. Ну, гэта стары хіб беларускай гістарыяграфіі. І толькі на старонцы 56 аўтар упершыню адкрыта ставіць пытаньне па тэме кнігі: якія нацыянальныя асаблівасьці мелі драўляныя цэрквы Беларусі. Іх своеасаблівасьць А. Лакотка бачыць у прымяненьні бруса замест круглякоў, ашалёўцы, каскадах і ярусах у вышынным разьвіцьці аб’ёмаў, раньнім адмаўленьні (у параўнаньні з расейскім дойлідзтвам) ад грувасткіх самцовых дахаў. Лёгка заўважыць, што гэтыя рысы ў большасьці сваёй выкліканыя ўплывам мураванай архітэктуры. Гэты факт не адзначаны аўтарам, відаць, таму, што ён прыступіць да разгляду мураваных сьвятыняў пазьней, пры асьвятленьні забудовы мястэчак і гарадоў. А хіба ў вёсках не было мураваных цэркваў і касьцёлаў? Вось адзін зь недахопаў такога падзелу кнігі. І яго працяг — аповед пра драўляныя касьцёлы. Аўтар зьмясьціў яго ў разьдзеле пра вёскі, хоць большасьць прыведзеных прыкладаў — местачковыя. Так прынцып “усе драўляныя збудаваньні —

вясковыя” яшчэ раз сябе абвергнуў. Зноў жа, драўляныя касьцёлы капіявалі мураваныя, пра якія гаворка будзе наперадзе. Чым адметныя драўляныя касьцёлы Беларусі, аўтар ня здолеў ратлумачыць: у Расеі іх няма, а зь іншых суседніх зямель зьвесткі не абагульненыя.

Разам зь вёскамі ў першым разьдзеле кнігі аб’яднаныя панскія сядзібы. Такое няўдалае абагульненьне прыводзіць да сьмешнага. Напрыклад, у энцыкляпэдыях часам паведамляецца, што нейкі фэўдал нарадзіўся… у вёсцы. Як працяг тэндэнцыі — аб’яднаньне ў кнізе А. Лакоткі разам зь вёскамі і сядзібаў лясьнічых. На жаль, аповед аўтара пра панскія дамы не дайшоў да завяршэньня, а менавіта “панская” архітэктура Беларусі — цалкам адметная старонка нашага дойлідзтва ў параўнаньні з суседнімі народамі. Беларускія этнографы заўсёды не любілі паноў, хоць панская культура зь цягам часу становіцца ўсё больш прывабнай і блізкай сучаснаму чалавеку.

Пра гэта сьведчыць і сёньняшняе будаўніцтва катэджаў. Яно асьветлена таксама ў разьдзеле “Вёска”, хоць па-сучаснаму гэта ў большасьці прыгарадныя пасёлкі. І тут аўтарская характарыстыка гэтага дойлідзтва вельмі сьціслая: *“Апошняе вылучаецца немэтазгоднымі і завышанымі аб’ёмамі і плошчамі, на забеспячэнне якіх не разлічаныя мясцовыя сеткі водазабеспячэння, ацяплення”*. І гэта ўсё пра найбольш пэрспэктыўны кірунак нашага будаўніцтва? А дзе аналіз архітэктуры? Не дарма ж колькі гадоў таму “Народная газета” зьмяшчала фота найбольш адметных катэджаў пад красамоўнай назвай “Замкі Беларусі”.

Пэрлам сучаснай вясковай архітэктуры аўтар лічыць забудову Росі. Архітэктура сапраўды неблагая, толькі нясе яна выразны гарадзкі характар. А словазлучэньне *“жылы гарадок у пасёлку Рось”* не бянтэжыць? Як гэта гарадок можа быць унутры пасёлку? Гарадок па-нашаму — гэта мястэчка. Дый сама Рось здавён была мястэчкам. Так што сучасная забудова Росі — гэта своеасаблівае “мястэчка ў мястэчку”. Пры чым тут вёска?

У “вясковы” разьдзел аўтар палічыў патрэбным уключыць зьвесткі пра сьціплыя будынкі рэлігійнага прызначэньня — капліцы, ці, па-расейску кажучы, часоўні. Чаму раптам спатрэбілася расейская мова? А чаму ў кнізе спатрэбіліся самі капліцы? Аўтар прыводзіць каля дзясятка вызначэньняў, што

такое капліцы — і ўсё з расейскіх слоўнікаў. Згаданы нават расейскі ўказ Пятра I пра капліцы з 1723 г. Апатэозам каплічнай “русафіліі” стаў абзац: *“Што ўяўляла сабою праваслаўная капліца ў XVIII ст., добра відаць з апісанняў царкоўнага гісторыка К. Нікольскага Георгіеўскай капліцы ў вёсцы Першынскі Пачынак Валагодскай губерні...”* (далей цытата цягнецца яшчэ на паўстаронкі). Карацей, уся размова круціцца вакол праваслаўнай расейскай часоўні, так што міжволі ўзнікае пытаньне: а ці ўласьцівыя яны Беларусі? І чым праваслаўная часоўня адрозьніваецца ад каталіцкай капліцы (дарэчы, называць праваслаўную ўстанову каталіцкім імем — нонсэнс). Далей, як мае быць, ідзе аповед пра крыжы: прыдарожныя, могілкавыя, памятныя... І скончваецца ўсё мэмарыяльным комплексам у Хатыні.
Мястэчкі... Рамантычная старонка беларускай нацыянальнай архітэктуры. Можа, яна страчаная назаўсёды: усе намаганьні аднавіць тэрмін і зьяву ў рэчаіснасьці пакуль марныя. Аляксандар Лакотка зьмясьціў разьдзел пра мястэчкі акурат паміж “Вёскай” і “Горадам”. У фізычных адносінах (памеры і г. д.) яно сапраўды так, але ў гістарычна-генэалягічным — зусім не. Былі часы (да XV ст.), калі была вёска, быў горад, а мястэчка не было. Яно ўзьнікла пасьля як зьвяно паміж буйным горадам і навакольнымі вёскамі, і было, па сутнасьці, малым горадам. Цяпер, як вядома, на зьмену ўрбанізацыі настае суцэльная вёскавізацыя. На гэтым гістарычным тле пляны адраджэньня мястэчак могуць сапраўды ня зьдзейсьніцца.

Паколькі кніга Лакоткі не гістарычная ў дакладным сэнсе слова, то тэме шляхоў зьяўленьня мястэчак у ёй адведзена няшмат радкоў. Аўтар мяркуе, што зь некаторых мястэчак утварыліся гарады. Так яно магло быць, так і было, але гэта не выпадак Клецку, Крычава і Быхава. Клецак прайшоў адваротны шлях: гэты старажытны горад з XVIII ст. у дакумэнтах пачынае паступова называцца мястэчкам. Яшчэ больш дзіўнай прадстаўлена ў кнізе гісторыя Турава, які, маўляў, *“балотнае мястэчка”*, што разьвілася на аснове буйной вёскі. На падставе апошніх прыкладаў, дарэчы, можна вылучыць яшчэ адзін шлях утварэньня мястэчак, не адзначаны А. Лакоткам: у выніку заняпаду гораду (у час агульнага заняпаду Беларусі з другой паловы XVII ст.). І яшчэ адзін шлях паходжаньня мястэчак,

добра вядомы паводле крыніц і адсутны ў кнізе — іх узнікненьне “на сырым корані”, то бо фактычна на пустым месцы. Сярод мястэчак XVII ст. у кнізе дзіўным чынам апынуўся Нясьвіж, наша некаранаваная сталіца. У XIX ст. за мястэчкі аўтар уважае пазаштатныя гарады. Відаць, прычына такой блытаніны мястэчак і гарадоў у суб’ектыўным успрыняцьці невялікіх гарадкоў з пункту погляду сучаснага чалавека, гараджаніна. Але пункт погляду павінен быць гістарычным.

Каб удала разабрацца зь мястэчкамі, аўтар прапануе падзяліць іх храналягічна-мастацка на 3 групы: гатычныя, рэнэсансныя, барочныя. Выглядае лягічна і прыгожа, але пасьля нават нядоўгіх разважаньняў зьяўляюцца сумненьні. Схема абрываецца на XVIII ст., але ж мястэчкі існавалі нават да сярэдзіны XX ст. Гэта быў які стыль: клясычны, мадэрновы, ці нічога істотнага не было прыўнесена ў гісторыю мястэчак у XIX—XX стст.? Увогуле, крытэры падзелу мястэчак на прапанаваныя тры групы вельмі няясныя. Нясьвіж пры гэтым фігуруе і як рэнэсанснае, і як барочнае мястэчка (нагадаем, што гэта ў сапраўднасьці горад на ўсім працягу сваёй гісторыі). Мястэчкі зьніклі з мапы Беларусі ў XX ст. Яны сталі вёскамі, сёламі, гарадзкімі пасёлкамі, некаторыя — гарадамі. Яны згубілі сваю асноўную функцыю — быць цэнтрам мясцовага рынку (прыгадайма, што рынкаў любых формаў у СССР дужа не любілі). І аўтар сьведчыць: *“Характэрная і арыгінальная рыса местачковай забудовы — дамы-крамы — канчаткова сталі гістарычнай спадчынай”. І раптам аптымістычнае: “У сучасных умовах... магчыма адраджэнне некаторых функцый, уласцівых былым мястэчкам... Архітэктарамі сёння прапрацоўваюцца варыянты катэджаў, якія сумяшчаюць функцыі жылля і гандлёвай кропкі”.* Значыць, надзея на адраджэньне мястэчак яшчэ канчаткова не памерла? А вось наконт катэджаў-крамаў... Бачыў у “мястэчку” Нясьвіж дзівосную рэч. Камэрсанты выкупляюць на цэнтральнай плошчы (той, дзе аўтавакзал) кватэры на ніжніх паверхах, падводзяць да іх з вуліцы лесьвіцы і робяць тамака крамы (гэта пры тым, што, здаецца, яшчэ ніхто не адмяніў забароны выкарыстоўваць жылы фонд не па прызначэньні). Вось вам і жытлы — гандлёвыя кропкі.

Замкі. Яшчэ адна рамантычная старонка нашай даўніны. Яны апынуліся ў разьдзеле пра мястэчкі, хоць замак — зусім

асобнае паселішча. Яны маглі быць ля мястэчак (Мірскі замак каля мястэчка Мір), а мястэчкі маглі быць умацаванымі, як замкі (тое ж мястэчка Мір). Некаторыя замкі стаялі зусім асобна. Карацей, спроба ўключыць у разьдзел “Мястэчка” ўсё, што відавочна ня вёска і ня горад, пераканаўчай не выглядае. А што да нацыянальных рысаў нашых замкаў... У кнізе яны няўлоўныя... Дом-замак у Гайцюнішках збудаваў галяндзкі інжынэр — гэта беларускае? Хай сабе, бо тая камяніца стаіць доўга і, пэўна, служыла ўзорам для іншых. А вось драўляныя замкі, пабудаваныя на Полаччыне акупацыйным войскам цара Івана Жахлівага... Якія ж нацыянальныя рысы яны маюць? Дарма што драўляныя, яны ўвекавечаныя на гравюрах. Таму хоць яны і прыдатныя для шматлікіх “Гісторый” беларускай архітэктуры, але для “Нацыянальных рысаў” зусім не падыходзяць (дарэчы, іх “нацыянальнасьць” А. Лакотка і не пазначыў). Вось для прац пра расейскія нацыянальныя рысы — калі ласка, і яны скарыстаныя, скажам, у маскоўскай манаграфіі “Русское деревянное оборонное зодчество”. Палацы, панскія сядзібы трапілі зноў жа ў разьдзел “Мястэчка”, нягледзячы на тое, што былі і цалкам асобныя “дварцы” (тэрмін XVI ст.), панскія двары, “гасподзкія двары” (гэта ўжо XIX ст.). Аўтар чамусьці мяркуе, што палацы паходзяць ад замкаў: *“Выходзячы каранямі з нетраў замкавага дойлідства, палацы яшчэ захоўваюць часам і абарончыя рысы”*. Як прыклад прыведзены той самы гайцюніскі дом-замак, карані якога ў Галяндыі. Не, панскія сядзібы хутчэй выйшлі зь нетраў сялянскай хаты. Зусім нечакана выклад гісторыі палацаў аўтар спыняе на пачатку XIX ст. Шкада, што мы не даведаліся пра гэты від нацыянальнай архітэктуры тых часоў, калі ўласна і склалася наша нацыя.

Як мястэчка няма без царквы ці касьцёлу, то аўтар даволі падрабязна спыняецца на сакральным будаўніцтве. Аднак яно разьбіта па двух разьдзелах: “Мястэчка” і “Горад”, — і суцэльнай карціны няма. Становішча не ратуе тое, што да местачковых аднесены некаторыя гарадзкія сьвятыні (напрыклад, з Давыд-Гарадку). Адна блытаніна.

Досыць спрэчна ў кнізе пра нацыянальныя рысы беларускай архітэктуры разглядаць мячэты татараў і сынагогі жыдоў. Не беларусы яны, хоць і размаўлялі па-нашаму. І зважайма на тонкія акалічнасьці: жыды і татары жылі ў мястэчках, але

трапілі туды рознымі шляхамі: татары — з малых вёсак, а жыды — зь вялікіх гарадоў. Аднак у разьдзелах пра вёску і горад гэтыя нацыянальныя меншасьці ня згадваюцца. Іх архітэктура (вядома, яна зь вялікім уплывам беларускай) сабрана аўтарам пад шыльдай местачковай, і ў дзіўным гэтым зборы можна натрапіць і на гарадзкія (Навагрудак, Слонім) мячэты і зноў жа на гарадзкія (Быхаў, Друя, Навагрудак) сынагогі.
Тут жа, у “местачковым” асяродзьдзі, разглядаюцца гандлёвыя рады, корчмы, рудні, гуты, паташні, бровары. Было, усё было ў мястэчках. Ды ня толькі ў іх.

Горад — вяршыня беларускага дойлідзтва, згустак беларускага нацыянальнага духу. Старыя ўяўленьні, што горад Беларусі — твор духу польскага, расейскага, жыдоўскага, адкінутыя пасьля таго, як пасьляваенны горад стаў менавіта беларускім. Беларуская нацыя стала гарадзкой, значыць, горад стаўся беларускім, прынамсі ў вачах большасьці нацыі.
Шлях гораду — адбітак шляху станаўленьня дзяржавы. Думаецца, тут А. Лакотка выбраў цалкам слушны накірунак аналізу нашай архітэктуры. На жаль, былі скарыстаныя састарэлыя археалягічныя зьвесткі пра старажытную гісторыю беларускіх гарадоў, таму агульная карціна гарадзкой цывілізацыі атрымалася трохі скажоная. Трэба слушна расставіць ідэалягічныя акцэнты зьяўленьня на нашых землях мураванай архітэктуры. Узьвядзеньне Сафійскіх сабораў у Кіеве, Ноўгарадзе і Полацку — гэта не дэманстрацыя сяброўства трох братніх славянскіх народаў. Па сутнасьці, будаўніцтва Сафіі ў Кіеве было выклікам Бізантыі, царскаму Канстанцінопалю, імкненьнем стаць зь ім на адзін узровень у царкоўнай табэлі аб рангах. Будоўля наўгародзкай Сафіі — гэта выклік Паўночнай Русі “царскаму” Кіеву, ну а Полацкая Сафія — гэта дэманстрацыя незалежніцкіх імкненьняў Полацкай Русі перад Кіевам і Ноўгарадам. Тры Сафіі — тры сымбалі раздору. Меркаваная чарнігаўская Сафія ніколі не існавала, тамтэйшая вярхушка, каб дапячы Кіеву, збудавала велічны сабор Збавіцеля. Нельга пагадзіцца з ацэнкай гэтай архітэктуры як *“белакаменнай”*. Тут бачны рэцыдыў выкарыстаньня штампу расейскага прыгожага пісьменства, які дарэчы адно пры апісаньні пазьнейшага расейскага

храмабудаўніцтва: яно сапраўды вялося зь мясцовага белага каменя-вапняку. Кіеўская і Полацкая Сафіі і сучасныя ім цэрквы ўзводзіліся з цэглы-плінфы ў тэхніцы “схаванага шэрагу”, так што выглядалі дробна-паласаценька, агульная гама колераў — збольшага ружовая ці жоўтая (дарэчы, крыху ніжэй аўтар сам сябе абвяргае наконт колеру).

Увогуле адчуваецца нейкая няўпэўненасьць аўтара ў “гарадзкіх кварталах”. Не было таго, што ў Тураве мураваны храм пачалі ўзводзіць у XII ст. ды так і ня скончылі. Скончылі, але ён пасьля разваліўся, як мяркуюць, ад землятрусу. Не было скончана мураваньне менскага і ваўкавыскага храмаў (таму фраза, што мураваная царква ў Ваўкавыску існавала, па сутнасьці няслушная). Характарыстыка самых адметных гарадзенскіх цэркваў атрымала надзіва адвольную інтэрпрэтацыю: быццам муроўка іх — спалучэньне палявога каменя з плінфаю, а фасады і інтэр’еры ўпрыгожаныя дэкаратыўнай мазаікай з маёлікі. Няма там палявога камяню, ёсьць адно дэкаратыўныя ўстаўкі з шліфаваных валуноў на фасадах. Няма там мазаікі ні звонку, ні знутры, адно ўстаўкі з паліваных керамічных плітак. Пра раманскі ўплыў з Заходняй Эўропы гарадзенскія пабудовы ня сьведчаць, затое полацкі ўплыў вельмі адчувальны.

Зусім няўдалым атрымаўся пасаж пра старажытную царкву Друцку: *“Паводле летапісных крыніц, тут у XI ст. узводзіцца драўляная царква”*. Няма такіх летапісных крыніц. Толькі ў пэргамэнным Друцкім эвангельлі XIV ст. адзначана пабудова ў 1001 г. царквы. *“Факт вельмі важны, бо сведчыць аб тым, што драўляныя царкоўныя збудаванні на тэрыторыі Беларусі ўзніклі адначасова з мураванымі.”* Крыху вышэй А. Лакотка паказаў, што першы мураваны храм — Полацкі Сафійскі сабор — таксама быў збудаваны ў XI ст. Але не было зроблена ўдакладненьне — ён зьявіўся ў 1050—1060-х гг., гэта значыць, праз паўстагодзьдзя пасьля Друцкай царквы. Дзе ж тут адначасовасьць? Празь некалькі старонак аўтар ужо схільны лічыць, што драўляныя цэрквы ўзводзіліся раней за мураваныя. Пярэчаньняў тут быць ня можа.

Вельмі не пашанцавала ў кнізе А. Лакоткі пэрліне беларускай архітэктуры — Камянецкай вежы. Зразумела, гэта помнік не раманскага, а гатычнага дойлідзтва. Сьцьвярджэньне, што *“яна ўзнікла на напрамку пастаянных набегаў на ўсходне-славянскія землі рыцараў Тэўтонскага ордэна”* грашыць анахранізмам.

Дастаткова зазірнуць у Іпацьеўскі летапіс, каб пераканацца яшчэ раз, што была яна збудаваная супраць літоўцаў. Тое, што Камянецкая вежа ня Белая (г. зн. не была атынкаваная і пабеленая аж да XIX ст.), здаецца, напісана ва ўсіх кнігах па беларускай архітэктуры за апошнія 30 гадоў, дзіўна, што А. Лакотка не зьвярнуў на гэта ўвагі.

Усю інфармацыю пра гарады да XIII ст. А. Лакотка зьмясьціў у разьдзеле “Ўсходнеславянскі горад”. Наступны разьдзел — “Рэнесансны горад”. Такім чынам, гарадзкое дойлідзтва XIV—XV стст. апынулася ў ценю (зьнік “гатычны горад”!). Яшчэ больш прыкра, што зьнік магчымы разьдзел “Барочны горад”, хоць раней аўтар вылучыў і рэнэсансныя, і барочныя мястэчкі. Рызыкнем сьцьвярджаць, што барочны горад мае найбольш шанцаў стаць адным з сымбаляў нацыянальнай архітэктуры Беларусі. “Класічны горад” А. Лакотка вызначае межамі канца XVIII — пачатку XX ст. (як вынікае з матар’ялу гэтага разьдзелу). Але ў гэты час існавалі розныя мастацкія плыні: ампір, мадэрн, розныя рэтраспэктыўныя накірункі...

Нарэшце, “Сучасны горад” — прыкладна з канца першай чвэрці XX ст. Няясна, ці быў гэта час уздыму архітэктуры ці заняпаду. Тут выяўляюцца цікавыя акалічнасьці, уласьцівыя будаўніцтву ўсіх народаў і часоў: пра ўзровень архітэктуры сьведчаць найперш прэзэнтабэльныя, манумэнтальныя будынкі, а масавая забудова застаецца збольшага па-за ўвагай. А. Лакотка прыняў такія правілы аналізу, як і эстэтыку “сталінскага ампіру”. Адсюль тэза: *“Ансамбль забудовы Ленінскага праспекта (зараз праспект Ф. Скарыны) 50-х гг. становіцца ўзорам дойлідства краіны і ператварае Мінск у адзін з прыгажэйшых гарадоў Еўропы”*. Аўтарскія ацэнкі менскіх будынкаў 1980-х гг. часьцяком суправаджаюцца эпітэтам *“унікальны”*. Не тлумачыцца толькі, у чым палягае ўнікальнасьць, што было б дарэчы: унікальны — значыць, адметны, пэўна не падобны на іншаземныя пабудовы. Іншую нацыянальную адметнасьць беларускіх гарадоў А. Лакотка вызначыў вельмі дакладна — гэта адсутнасьць у гарадах *“комплексаў архітэктурна-гістарычнай спадчыны”, “...у той час, як у суседніх краінах... да пачатку 80-х гг. ужо меліся прыклады рэстаўрацыі”*. Адрозьненьні бачныя і ў паверхавасьці жылых будынкаў. Калі ў нас увайшлі ў моду жылыя хмарачосы, то ў астатняй Эўропе назіралася цалкам супрацьлеглая тэндэнцыя. Гэта важная рыса

нацыянальнай беларускай архітэктуры. А. Лакотка прыводзіць некаторыя зьвесткі пра *“традыцыйныя”* рысы сучаснай масавай забудовы, увогуле ўніфікаванай і безаблічнай: імкненьне да замкнёнага двара, адмаўленьне ад *“парадных”* пад’ездаў, імкненьне да закрытых бальконаў і інш. Карацей, ёсьць тэндэнцыя *“мініятурызаваць”* аграмадныя камяніцы і створаную імі культурную прастору. Ад сябе адзначым яшчэ некаторыя рысы нашых гарадоў, якіх вырашыў не заўважаць А. Лакотка. Гэта бронзавы (гіпсавы) істукан на цэнтральным пляцы. Там жа месьціцца шэры безаблічны будынак гарадзкога начальства (у народзе вядомы як “дом саветаў” ці “белы дом”). І яшчэ: колішні цэнтральны пляц, здавён прызначаны для гандлю, застаецца сакральнай пустэчай. Тут яркае нацыянальнае адрозьненьне ад, скажам, польскіх ці нямецкіх гарадоў і гарадкоў, дзе на цэнтральных пляцах па-ранейшаму гандлююць.

Сучаснае культавае будаўніцтва не зацікавіла аўтара, затое пачэснае месца адведзена Палацу Рэспублікі ў Менску. А. Лакотка даволі стрыманы ў ацэнцы гэтай *“унікальнай”* будыніны: *“Велізарная маса Палаца ў цэлым успрымаецца нейтральна... аднак значна горш успрымаецца... з раёнаў гістарычнай забудовы”* (г.зн. з тылу). Ні слова пра мянушку “саркафаг”, дарэчы, вельмі трапную. Нешта ёсьць у Палацы падобнае да маскоўскага маўзалею. А вось тое, што Палац — амаль копія маўзалею Ататурка ў Анкары, ніхто не заўважае. Становішча жахлівае. Выправіць яго можна хіба зносам аднаго з маўзалеяў. Як з анкарскім тое зрабіць немагчыма, застаецца “саркафаг”.

Агульныя высновы свайго дасьледаваньня А. Лакотка паспрабаваў падвесьці на трох старонках, дзе пададзены нарыс зноў жа архітэктуры ўласна Беларусі. Некалькімі словамі адзначана, што населеныя пункты Беларусі мелі свае асаблівасьці ў параўнаньні з украінскімі і расейскімі, шмат запазычылі з Захаду і адрозьніваліся адзін ад аднаго ў некаторых рэгіёнах унутры Беларусі. У канцы ўзьнёсла: можна *“...зрабіць выснову, што беларускае дойлідства сапраўды існуе як суб’ект культурна-гістарычнага працэсу, як адна са складаючых частак сусветнай культуры... Дойлідства прадстае як адна з найбольш выразных культурных прыкмет беларускага народа”*.

На гэтай аптымістычнай ноце, нікім сёньня не аспрэчанай,

сканчаецца дасьледаваньне А. Лакоткі. Толькі ці ёсьць падставы для аптымізму?
Кніга пакідае супярэчлівыя ўражаньні. Багацьце сабранага пад адной вокладкай матар'ялу не адлілося ў важныя высновы па тэме, якая заяўлена ў назьве кнігі — менавіта пра нацыянальныя рысы. Тыя меркаваньні, што дастаткова сабраць наяўныя матар'ялы зь Беларусі, а яны скажуць самі за сябе, і гэта будзе голас нацыі, — наіўныя. І шлях, абраны аўтарам для гэтага, — простая перакампаноўка сваёй ранейшай кнігі — сябе ня спраўдзіў. Па-першае, з чыста тэхнічнага боку. Па-другое, папярэдняя кніга была, хутчэй, вузка-этнаграфічная, а нацыянальнае — гэта ня толькі этнаграфічнае. Трэба памятаць, што архітэктура — гэта яшчэ і від мастацтва. Магчыма, калі б за тэму "Нацыяналныя рысы беларускай архітэктуры" ўзяўся мастацтвазнаўца, ён раскрыў бы яе інакш.
Дарэчы, такая спроба ўжо была. Гэта клясычная праца Міколы Шчакаціхіна "Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва" (1928), якая прысьвечана галоўным чынам дойлідзтву. Адной з прычын посьпехаў Шчакаціхіна ў высьвятленьні вытокаў нацыянальнай архітэктуры беларусаў была тая, што ён зьвярнуўся перш за ўсё да віленскага дойлідзтва, паказаў, што менавіта ў Вільні бяруць пачатак многія характэрныя рысы нашага будаўніцтва. А дасьледаваньне А. Лакоткі жорстка абмежавана межамі сучаснай Рэспублікі Беларусі, і калі для высьвятленьня нацыянальнага аблічча вясковай архітэктуры гэтага аказалася дастаткова, то для выяўленьня асаблівасьцяў гарадзкой архітэктуры гэта адыграла фатальную ролю. Карацей, без уліку Вільні нельга напісаць заяўленае дасьледаваньне.
І яшчэ. Перагартаўшы кнігу А. Лакоткі, можна ўпэўніцца, што ў ёй адсутнічае такая яскравая старонка нашага нацыянальнага будаўніцтва, як дачныя пасёлкі. Калі раней паміж горадам і вёскай стаяла мястэчка як прамежкавы тып паселішча, то цяпер такую ролю прынялі на сябе менавіта дачныя пасёлкі. Іх сацыяльны зьмест, вядома, зусім адрозны ад местачковага. Яны зьявіліся ў эпоху "разьвітага сацыялізму" як сродак "вырашэньня харчовай праблемы". Ну, хто цяпер адважыцца сказаць, што "дачны" лад жыцьця — гэта ня наша нацыянальная рыса?
Дык якой моваю "прамаўляюць" нашыя камяніцы? І якую музыку "граюць" нашыя кварталы? Якая яна, нацыянальная

архітэктура беларусаў? І раптам разумееш, што адказу менавіта на так пастаўленае пытаньне А. Лакотка і не імкнуўся даць у сваёй кнізе, прысьвечанай “нацыянальным *рысам* архітэктуры”.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]

№ 4 (18) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя:
analityka@yahoo.com
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: **06-10-2001**
[image]

Валеры Пазьнякоў

Крыху пра нашы нацыянальныя рысы

А. І. Лакотка. Нацыянальныя рысы беларускай архітэктуры. — Менск: Ураджай, 1999.

ВАЛЕРЫ ПАЗЬНЯКОЎ кандыдат гістарычных навук, супрацоўнік выдавецтва “Беларуская Энцыкляпэдыя”, сталы рэцэнзэнт гістарыяграфічнае літаратуры ў газэце “Наша Ніва”.

Фрыдрых Шэлінг

Архітэктура — мастацтва каралёў.

Невядомы мысьляр

Архітэктура —
гэта альфабэт
волатаў, набор
самых вялікіх
знакаў, якія
калі-небудзь
бачыў чалавек.

Гілбэрт
Чэстэртан

Вялікая
архітэктура —
гэта
найвялікшае
сьведчаньне
чалавечай
велічы.
Франк-Лойд
Райт
Анарэ дэ
Бальзак

Архітэктура — застылая музыка.
Архітэктура — выразьніца нораваў.
Існуе процьма сьведчаньняў пра адметнае значэньне архітэктуры. Эпіграфы можна доўжыць і доўжыць, калі няма ўласных думак. Ёсьць яшчэ адно вызначэньне: архітэктура — выразьніца нацыянальнага духу. Прыкладна так называецца апошняя кніга Аляксандра Лакоткі.
Такая кніга павінна была зьявіцца даўно. Хаця, ці мала якія кнігі павінны былі зьявіцца даўно, а мы іх яшчэ ня маем? Архітэктуру, дойлідзтва разглядалі як праяву народнага ці прафэсійнага мастацтва, як этнаграфічную зьяву. Цяпер — быццам як увасабленьне духу народу.
Якія ж такія нацыянальныя рысы мае беларуская архітэктура? А простага адказу кніга не дае. Такое адчуваньне, што ўсё, што адбылося ў дойлідзтве, для аўтара і ёсьць праявай нацыянальных асаблівасьцяў беларусаў. З такім жа посьпехам

“Нацыянальнымі рысамі” можна было б назваць любую абагульняльную кнігу па беларускай архітэктуры. Ёсьць падазрэньні, што аўтар пайшоў менавіта па такім шляху. То бо, узяў сваю папярэднюю кнігу “Дойлідзтва” (з сэрыі “Беларусы”, у 8-мі тамах) і пераназваў яе, заадно перакампанаваўшы. Ці выявіліся пры гэтым нацыянальныя рысы?
Аўтар вырашыў увесь наяўны матар’ял разьмеркаваць па разьдзелах: “Вёска”, “Мястэчка”, “Горад”. Вядома, калі размова йдзе пра нацыянальную ідэю, то гэта патрабуе пэўнага “лёзунгавага” мысьленьня, і такая разьбіўка архітэктуры ўпісваецца ў “лёзунгавы” стыль. Бяда ў тым, што чым прасьцейшая схема (а тры часткі — гэта вельмі проста), тым болей шанцаў, што яна акажацца няслушнай.

Пачынаецца кніга зь “Вёскі”. Шмат хто з сучасных беларусаў выйшаў зь вёскі. А вось уся Беларусь сукупна — наўрад ці.
І аўтар пачынае свой расповед з гарадзішчаў, то бо з старажытных гарадкоў жалезнага веку. Потым пераходзіць да старажытнарускіх часоў. Нельга сказаць, што тут усё бездакорна. Сьцьвярджэньне, што *“ў адрозненне ад пагосту сяло не абшчынны, а вотчынны цэнтр”* парадаксальнае сваім супрацьлеглым рэчаіснасьці сэнсам. Пераходзячы да XVI ст., аўтар заняўся фальваркамі, бо трохчленная схема кнігі патрабавала далучыць іх да вёсак. Ну, гэта стары хіб беларускай гістарыяграфіі. І толькі на старонцы 56 аўтар упершыню адкрыта ставіць пытаньне па тэме кнігі: якія нацыянальныя асаблівасьці мелі драўляныя цэрквы Беларусі. Іх своеасаблівасьць А. Лакотка бачыць у прымяненьні бруса замест круглякоў, ашалёўцы, каскадах і ярусах у вышынным разьвіцьці аб’ёмаў, раньнім адмаўленьні (у параўнаньні з расейскім дойлідзтвам) ад грувасткіх самцовых дахаў. Лёгка заўважыць, што гэтыя рысы ў большасьці сваёй выкліканыя ўплывам мураванай архітэктуры. Гэты факт не адзначаны аўтарам, відаць, таму, што ён прыступіць да разгляду мураваных сьвятыняў пазьней, пры асьвятленьні забудовы мястэчак і гарадоў. А хіба ў вёсках не было мураваных цэркваў і касьцёлаў? Вось адзін зь недахопаў такога падзелу кнігі. І яго працяг — аповед пра драўляныя касьцёлы. Аўтар зьмясьціў яго ў разьдзеле пра вёскі, хоць большасьць прыведзеных прыкладаў — местачковыя. Так прынцып “усе драўляныя збудаваньні —

вясковыя” яшчэ раз сябе абвергнуў. Зноў жа, драўляныя касьцёлы капіявалі мураваныя, пра якія гаворка будзе наперадзе. Чым адметныя драўляныя касьцёлы Беларусі, аўтар ня здолеў ратлумачыць: у Расеі іх няма, а зь іншых суседніх зямель зьвесткі не абагульненыя.

Разам зь вёскамі ў першым разьдзеле кнігі аб’яднаныя панскія сядзібы. Такое няўдалае абагульненьне прыводзіць да сьмешнага. Напрыклад, у энцыкляпэдыях часам паведамляецца, што нейкі фэўдал нарадзіўся… у вёсцы. Як працяг тэндэнцыі — аб’яднаньне ў кнізе А. Лакоткі разам зь вёскамі і сядзібаў лясьнічых. На жаль, аповед аўтара пра панскія дамы не дайшоў да завяршэньня, а менавіта “панская” архітэктура Беларусі — цалкам адметная старонка нашага дойлідзтва ў параўнаньні з суседнімі народамі. Беларускія этнографы заўсёды не любілі паноў, хоць панская культура зь цягам часу становіцца ўсё больш прывабнай і блізкай сучаснаму чалавеку.

Пра гэта сьведчыць і сёньняшняе будаўніцтва катэджаў. Яно асьветлена таксама ў разьдзеле “Вёска”, хоць па-сучаснаму гэта ў большасьці прыгарадныя пасёлкі. І тут аўтарская характарыстыка гэтага дойлідзтва вельмі сьціслая: *“Апошняе вылучаецца немэтазгоднымі і завышанымі аб’ёмамі і плошчамі, на забеспячэнне якіх не разлічаныя мясцовыя сеткі водазабеспячэння, ацяплення”*. І гэта ўсё пра найбольш пэрспэктыўны кірунак нашага будаўніцтва? А дзе аналіз архітэктуры? Не дарма ж колькі гадоў таму “Народная газета” зьмяшчала фота найбольш адметных катэджаў пад красамоўнай назвай “Замкі Беларусі”.

Пэрлам сучаснай вясковай архітэктуры аўтар лічыць забудову Росі. Архітэктура сапраўды неблагая, толькі нясе яна выразны гарадзкі характар. А словазлучэньне *“жылы гарадок у пасёлку Рось”* не бянтэжыць? Як гэта гарадок можа быць унутры пасёлку? Гарадок па-нашаму — гэта мястэчка. Дый сама Рось здавён была мястэчкам. Так што сучасная забудова Росі — гэта своеасаблівае “мястэчка ў мястэчку”. Пры чым тут вёска?

У “вясковы” разьдзел аўтар палічыў патрэбным уключыць зьвесткі пра сьціплыя будынкі рэлігійнага прызначэньня — капліцы, ці, па-расейску кажучы, часоўні. Чаму раптам спатрэбілася расейская мова? А чаму ў кнізе спатрэбіліся самі капліцы? Аўтар прыводзіць каля дзясятка вызначэньняў, што

такое капліцы — і ўсё з расейскіх слоўнікаў. Згаданы нават расейскі ўказ Пятра I пра капліцы з 1723 г. Апатэозам каплічнай “русафіліі” стаў абзац: *“Што ўяўляла сабою праваслаўная капліца ў XVIII ст., добра відаць з апісанняў царкоўнага гісторыка К. Нікольскага Георгіеўскай капліцы ў вёсцы Першынскі Пачынак Валагодскай губерні...”* (далей цытата цягнецца яшчэ на паўстаронкі). Карацей, уся размова круціцца вакол праваслаўнай расейскай часоўні, так што міжволі ўзнікае пытаньне: а ці ўласьцівыя яны Беларусі? І чым праваслаўная часоўня адрозьніваецца ад каталіцкай капліцы (дарэчы, называць праваслаўную ўстанову каталіцкім імем — нонсэнс). Далей, як мае быць, ідзе аповед пра крыжы: прыдарожныя, могілкавыя, памятныя... І скончваецца ўсё мэмарыяльным комплексам у Хатыні.
Мястэчкі... Рамантычная старонка беларускай нацыянальнай архітэктуры. Можа, яна страчаная назаўсёды: усе намаганьні аднавіць тэрмін і зьяву ў рэчаіснасьці пакуль марныя. Аляксандар Лакотка зьмясьціў разьдзел пра мястэчкі акурат паміж “Вёскай” і “Горадам”. У фізычных адносінах (памеры і г. д.) яно сапраўды так, але ў гістарычна-генэалягічным — зусім не. Былі часы (да XV ст.), калі была вёска, быў горад, а мястэчка не было. Яно ўзьнікла пасьля як зьвяно паміж буйным горадам і навакольнымі вёскамі, і было, па сутнасьці, малым горадам. Цяпер, як вядома, на зьмену ўрбанізацыі настае суцэльная вёскавізацыя. На гэтым гістарычным тле пляны адраджэньня мястэчак могуць сапраўды ня зьдзейсьніцца.

Паколькі кніга Лакоткі не гістарычная ў дакладным сэнсе слова, то тэме шляхоў зьяўленьня мястэчак у ёй адведзена няшмат радкоў. Аўтар мяркуе, што зь некаторых мястэчак утварыліся гарады. Так яно магло быць, так і было, але гэта не выпадак Клецку, Крычава і Быхава. Клецак прайшоў адваротны шлях: гэты старажытны горад з XVIII ст. у дакумэнтах пачынае паступова называцца мястэчкам. Яшчэ больш дзіўнай прадстаўлена ў кнізе гісторыя Турава, які, маўляў, *“балотнае мястэчка”*, што разьвілася на аснове буйной вёскі. На падставе апошніх прыкладаў, дарэчы, можна вылучыць яшчэ адзін шлях утварэньня мястэчак, не адзначаны А. Лакоткам: у выніку заняпаду гораду (у час агульнага заняпаду Беларусі з другой паловы XVII ст.). І яшчэ адзін шлях паходжаньня мястэчак,

добра вядомы паводле крыніц і адсутны ў кнізе — іх узнікненьне “на сырым корані”, то бо фактычна на пустым месцы. Сярод мястэчак XVII ст. у кнізе дзіўным чынам апынуўся Нясьвіж, наша некаранаваная сталіца. У XIX ст. за мястэчкі аўтар уважае пазаштатныя гарады. Відаць, прычына такой блытаніны мястэчак і гарадоў у суб’ектыўным успрыняцьці невялікіх гарадкоў з пункту погляду сучаснага чалавека, гараджаніна. Але пункт погляду павінен быць гістарычным.

Каб удала разабрацца зь мястэчкамі, аўтар прапануе падзяліць іх храналягічна-мастацка на 3 групы: гатычныя, рэнэсансныя, барочныя. Выглядае лягічна і прыгожа, але пасьля нават нядоўгіх разважаньняў зьяўляюцца сумненьні. Схема абрываецца на XVIII ст., але ж мястэчкі існавалі нават да сярэдзіны XX ст. Гэта быў які стыль: клясычны, мадэрновы, ці нічога істотнага не было прыўнесена ў гісторыю мястэчак у XIX—XX стст.? Увогуле, крытэры падзелу мястэчак на прапанаваныя тры групы вельмі няясныя. Нясьвіж пры гэтым фігуруе і як рэнэсанснае, і як барочнае мястэчка (нагадаем, што гэта ў сапраўднасьці горад на ўсім працягу сваёй гісторыі). Мястэчкі зьніклі з мапы Беларусі ў XX ст. Яны сталі вёскамі, сёламі, гарадзкімі пасёлкамі, некаторыя — гарадамі. Яны згубілі сваю асноўную функцыю — быць цэнтрам мясцовага рынку (прыгадайма, што рынкаў любых формаў у СССР дужа не любілі). І аўтар сьведчыць: *“Характэрная і арыгінальная рыса местачковай забудовы — дамы-крамы — канчаткова сталі гістарычнай спадчынай”. І раптам аптымістычнае: “У сучасных умовах... магчыма адраджэнне некаторых функцый, уласцівых былым мястэчкам... Архітэктарамі сёння прапрацоўваюцца варыянты катэджаў, якія сумяшчаюць функцыі жылля і гандлёвай кропкі”.* Значыць, надзея на адраджэньне мястэчак яшчэ канчаткова не памерла? А вось наконт катэджаў-крамаў... Бачыў у “мястэчку” Нясьвіж дзівосную рэч. Камэрсанты выкупляюць на цэнтральнай плошчы (той, дзе аўтавакзал) кватэры на ніжніх паверхах, падводзяць да іх з вуліцы лесьвіцы і робяць тамака крамы (гэта пры тым, што, здаецца, яшчэ ніхто не адмяніў забароны выкарыстоўваць жылы фонд не па прызначэньні). Вось вам і жытлы — гандлёвыя кропкі.

Замкі. Яшчэ адна рамантычная старонка нашай даўніны. Яны апынуліся ў разьдзеле пра мястэчкі, хоць замак — зусім

асобнае паселішча. Яны маглі быць ля мястэчак (Мірскі замак каля мястэчка Мір), а мястэчкі маглі быць умацаванымі, як замкі (тое ж мястэчка Мір). Некаторыя замкі стаялі зусім асобна. Карацей, спроба ўключыць у разьдзел “Мястэчка” ўсё, што відавочна ня вёска і ня горад, пераканаўчай не выглядае. А што да нацыянальных рысаў нашых замкаў... У кнізе яны няўлоўныя... Дом-замак у Гайцюнішках збудаваў галяндзкі інжынэр — гэта беларускае? Хай сабе, бо тая камяніца стаіць доўга і, пэўна, служыла ўзорам для іншых. А вось драўляныя замкі, пабудаваныя на Полаччыне акупацыйным войскам цара Івана Жахлівага... Якія ж нацыянальныя рысы яны маюць? Дарма што драўляныя, яны ўвекавечаныя на гравюрах. Таму хоць яны і прыдатныя для шматлікіх “Гісторый” беларускай архітэктуры, але для “Нацыянальных рысаў” зусім не падыходзяць (дарэчы, іх “нацыянальнасьць” А. Лакотка і не пазначыў). Вось для прац пра расейскія нацыянальныя рысы — калі ласка, і яны скарыстаныя, скажам, у маскоўскай манаграфіі “Русское деревянное оборонное зодчество”. Палацы, панскія сядзібы трапілі зноў жа ў разьдзел “Мястэчка”, нягледзячы на тое, што былі і цалкам асобныя “дварцы” (тэрмін XVI ст.), панскія двары, “гасподзкія двары” (гэта ўжо XIX ст.). Аўтар чамусьці мяркуе, што палацы паходзяць ад замкаў: *“Выходзячы каранямі з нетраў замкавага дойлідства, палацы яшчэ захоўваюць часам і абарончыя рысы”*. Як прыклад прыведзены той самы гайцюніскі дом-замак, карані якога ў Галяндыі. Не, панскія сядзібы хутчэй выйшлі зь нетраў сялянскай хаты. Зусім нечакана выклад гісторыі палацаў аўтар спыняе на пачатку XIX ст. Шкада, што мы не даведаліся пра гэты від нацыянальнай архітэктуры тых часоў, калі ўласна і склалася наша нацыя.

Як мястэчка няма без царквы ці касьцёлу, то аўтар даволі падрабязна спыняецца на сакральным будаўніцтве. Аднак яно разьбіта па двух разьдзелах: “Мястэчка” і “Горад”, — і суцэльнай карціны няма. Становішча не ратуе тое, што да местачковых аднесены некаторыя гарадзкія сьвятыні (напрыклад, з Давыд-Гарадку). Адна блытаніна.

Досыць спрэчна ў кнізе пра нацыянальныя рысы беларускай архітэктуры разглядаць мячэты татараў і сынагогі жыдоў. Не беларусы яны, хоць і размаўлялі па-нашаму. І зважайма на тонкія акалічнасьці: жыды і татары жылі ў мястэчках, але

трапілі туды рознымі шляхамі: татары — з малых вёсак, а жыды — зь вялікіх гарадоў. Аднак у разьдзелах пра вёску і горад гэтыя нацыянальныя меншасьці ня згадваюцца. Іх архітэктура (вядома, яна зь вялікім уплывам беларускай) сабрана аўтарам пад шыльдай местачковай, і ў дзіўным гэтым зборы можна натрапіць і на гарадзкія (Навагрудак, Слонім) мячэты і зноў жа на гарадзкія (Быхаў, Друя, Навагрудак) сынагогі.
Тут жа, у “местачковым” асяродзьдзі, разглядаюцца гандлёвыя рады, корчмы, рудні, гуты, паташні, бровары. Было, усё было ў мястэчках. Ды ня толькі ў іх.

Горад — вяршыня беларускага дойлідзтва, згустак беларускага нацыянальнага духу. Старыя ўяўленьні, што горад Беларусі — твор духу польскага, расейскага, жыдоўскага, адкінутыя пасьля таго, як пасьляваенны горад стаў менавіта беларускім. Беларуская нацыя стала гарадзкой, значыць, горад стаўся беларускім, прынамсі ў вачах большасьці нацыі.
Шлях гораду — адбітак шляху станаўленьня дзяржавы. Думаецца, тут А. Лакотка выбраў цалкам слушны накірунак аналізу нашай архітэктуры. На жаль, былі скарыстаныя састарэлыя археалягічныя зьвесткі пра старажытную гісторыю беларускіх гарадоў, таму агульная карціна гарадзкой цывілізацыі атрымалася трохі скажоная. Трэба слушна расставіць ідэалягічныя акцэнты зьяўленьня на нашых землях мураванай архітэктуры. Узьвядзеньне Сафійскіх сабораў у Кіеве, Ноўгарадзе і Полацку — гэта не дэманстрацыя сяброўства трох братніх славянскіх народаў. Па сутнасьці, будаўніцтва Сафіі ў Кіеве было выклікам Бізантыі, царскаму Канстанцінопалю, імкненьнем стаць зь ім на адзін узровень у царкоўнай табэлі аб рангах. Будоўля наўгародзкай Сафіі — гэта выклік Паўночнай Русі “царскаму” Кіеву, ну а Полацкая Сафія — гэта дэманстрацыя незалежніцкіх імкненьняў Полацкай Русі перад Кіевам і Ноўгарадам. Тры Сафіі — тры сымбалі раздору. Меркаваная чарнігаўская Сафія ніколі не існавала, тамтэйшая вярхушка, каб дапячы Кіеву, збудавала велічны сабор Збавіцеля. Нельга пагадзіцца з ацэнкай гэтай архітэктуры як *“белакаменнай”*. Тут бачны рэцыдыў выкарыстаньня штампу расейскага прыгожага пісьменства, які дарэчы адно пры апісаньні пазьнейшага расейскага

храмабудаўніцтва: яно сапраўды вялося зь мясцовага белага каменя-вапняку. Кіеўская і Полацкая Сафіі і сучасныя ім цэрквы ўзводзіліся з цэглы-плінфы ў тэхніцы “схаванага шэрагу”, так што выглядалі дробна-паласаценька, агульная гама колераў — збольшага ружовая ці жоўтая (дарэчы, крыху ніжэй аўтар сам сябе абвяргае наконт колеру).

Увогуле адчуваецца нейкая няўпэўненасьць аўтара ў “гарадзкіх кварталах”. Не было таго, што ў Тураве мураваны храм пачалі ўзводзіць у XII ст. ды так і ня скончылі. Скончылі, але ён пасьля разваліўся, як мяркуюць, ад землятрусу. Не было скончана мураваньне менскага і ваўкавыскага храмаў (таму фраза, што мураваная царква ў Ваўкавыску існавала, па сутнасьці няслушная). Характарыстыка самых адметных гарадзенскіх цэркваў атрымала надзіва адвольную інтэрпрэтацыю: быццам муроўка іх — спалучэньне палявога каменя з плінфаю, а фасады і інтэр’еры ўпрыгожаныя дэкаратыўнай мазаікай з маёлікі. Няма там палявога камяню, ёсьць адно дэкаратыўныя ўстаўкі з шліфаваных валуноў на фасадах. Няма там мазаікі ні звонку, ні знутры, адно ўстаўкі з паліваных керамічных плітак. Пра раманскі ўплыў з Заходняй Эўропы гарадзенскія пабудовы ня сьведчаць, затое полацкі ўплыў вельмі адчувальны.

Зусім няўдалым атрымаўся пасаж пра старажытную царкву Друцку: *“Паводле летапісных крыніц, тут у XI ст. узводзіцца драўляная царква”*. Няма такіх летапісных крыніц. Толькі ў пэргамэнным Друцкім эвангельлі XIV ст. адзначана пабудова ў 1001 г. царквы. *“Факт вельмі важны, бо сведчыць аб тым, што драўляныя царкоўныя збудаванні на тэрыторыі Беларусі ўзніклі адначасова з мураванымі.”* Крыху вышэй А. Лакотка паказаў, што першы мураваны храм — Полацкі Сафійскі сабор — таксама быў збудаваны ў XI ст. Але не было зроблена ўдакладненьне — ён зьявіўся ў 1050—1060-х гг., гэта значыць, праз паўстагодзьдзя пасьля Друцкай царквы. Дзе ж тут адначасовасьць? Празь некалькі старонак аўтар ужо схільны лічыць, што драўляныя цэрквы ўзводзіліся раней за мураваныя. Пярэчаньняў тут быць ня можа.

Вельмі не пашанцавала ў кнізе А. Лакоткі пэрліне беларускай архітэктуры — Камянецкай вежы. Зразумела, гэта помнік не раманскага, а гатычнага дойлідзтва. Сьцьвярджэньне, што *“яна ўзнікла на напрамку пастаянных набегаў на ўсходне-славянскія землі рыцараў Тэўтонскага ордэна”* грашыць анахранізмам.

Дастаткова зазірнуць у Іпацьеўскі летапіс, каб пераканацца яшчэ раз, што была яна збудаваная супраць літоўцаў. Тое, што Камянецкая вежа ня Белая (г. зн. не была атынкаваная і пабеленая аж да XIX ст.), здаецца, напісана ва ўсіх кнігах па беларускай архітэктуры за апошнія 30 гадоў, дзіўна, што А. Лакотка не зьвярнуў на гэта ўвагі.

Усю інфармацыю пра гарады да XIII ст. А. Лакотка зьмясьціў у разьдзеле “Ўсходнеславянскі горад”. Наступны разьдзел — “Рэнесансны горад”. Такім чынам, гарадзкое дойлідзтва XIV—XV стст. апынулася ў ценю (зьнік “гатычны горад”!). Яшчэ больш прыкра, што зьнік магчымы разьдзел “Барочны горад”, хоць раней аўтар вылучыў і рэнэсансныя, і барочныя мястэчкі. Рызыкнем сьцьвярджаць, што барочны горад мае найбольш шанцаў стаць адным з сымбаляў нацыянальнай архітэктуры Беларусі. “Класічны горад” А. Лакотка вызначае межамі канца XVIII — пачатку XX ст. (як вынікае з матар’ялу гэтага разьдзелу). Але ў гэты час існавалі розныя мастацкія плыні: ампір, мадэрн, розныя рэтраспэктыўныя накірункі...

Нарэшце, “Сучасны горад” — прыкладна з канца першай чвэрці XX ст. Няясна, ці быў гэта час уздыму архітэктуры ці заняпаду. Тут выяўляюцца цікавыя акалічнасьці, уласьцівыя будаўніцтву ўсіх народаў і часоў: пра ўзровень архітэктуры сьведчаць найперш прэзэнтабэльныя, манумэнтальныя будынкі, а масавая забудова застаецца збольшага па-за ўвагай. А. Лакотка прыняў такія правілы аналізу, як і эстэтыку “сталінскага ампіру”. Адсюль тэза: *“Ансамбль забудовы Ленінскага праспекта (зараз праспект Ф. Скарыны) 50-х гг. становіцца ўзорам дойлідства краіны і ператварае Мінск у адзін з прыгажэйшых гарадоў Еўропы”*. Аўтарскія ацэнкі менскіх будынкаў 1980-х гг. часьцяком суправаджаюцца эпітэтам *“унікальны”*. Не тлумачыцца толькі, у чым палягае ўнікальнасьць, што было б дарэчы: унікальны — значыць, адметны, пэўна не падобны на іншаземныя пабудовы. Іншую нацыянальную адметнасьць беларускіх гарадоў А. Лакотка вызначыў вельмі дакладна — гэта адсутнасьць у гарадах *“комплексаў архітэктурна-гістарычнай спадчыны”, “...у той час, як у суседніх краінах... да пачатку 80-х гг. ужо меліся прыклады рэстаўрацыі”*. Адрозьненьні бачныя і ў паверхавасьці жылых будынкаў. Калі ў нас увайшлі ў моду жылыя хмарачосы, то ў астатняй Эўропе назіралася цалкам супрацьлеглая тэндэнцыя. Гэта важная рыса

нацыянальнай беларускай архітэктуры. А. Лакотка прыводзіць некаторыя зьвесткі пра *“традыцыйныя”* рысы сучаснай масавай забудовы, увогуле ўніфікаванай і безаблічнай: імкненьне да замкнёнага двара, адмаўленьне ад *“парадных”* пад’ездаў, імкненьне да закрытых бальконаў і інш. Карацей, ёсьць тэндэнцыя *“мініятурызаваць”* аграмадныя камяніцы і створаную імі культурную прастору. Ад сябе адзначым яшчэ некаторыя рысы нашых гарадоў, якіх вырашыў не заўважаць А. Лакотка. Гэта бронзавы (гіпсавы) істукан на цэнтральным пляцы. Там жа месьціцца шэры безаблічны будынак гарадзкога начальства (у народзе вядомы як “дом саветаў” ці “белы дом”). І яшчэ: колішні цэнтральны пляц, здавён прызначаны для гандлю, застаецца сакральнай пустэчай. Тут яркае нацыянальнае адрозьненьне ад, скажам, польскіх ці нямецкіх гарадоў і гарадкоў, дзе на цэнтральных пляцах па-ранейшаму гандлююць.

Сучаснае культавае будаўніцтва не зацікавіла аўтара, затое пачэснае месца адведзена Палацу Рэспублікі ў Менску. А. Лакотка даволі стрыманы ў ацэнцы гэтай *“унікальнай”* будыніны: *“Велізарная маса Палаца ў цэлым успрымаецца нейтральна... аднак значна горш успрымаецца... з раёнаў гістарычнай забудовы”* (г.зн. з тылу). Ні слова пра мянушку “саркафаг”, дарэчы, вельмі трапную. Нешта ёсьць у Палацы падобнае да маскоўскага маўзалею. А вось тое, што Палац — амаль копія маўзалею Ататурка ў Анкары, ніхто не заўважае. Становішча жахлівае. Выправіць яго можна хіба зносам аднаго з маўзалеяў. Як з анкарскім тое зрабіць немагчыма, застаецца “саркафаг”.

Агульныя высновы свайго дасьледаваньня А. Лакотка паспрабаваў падвесьці на трох старонках, дзе пададзены нарыс зноў жа архітэктуры ўласна Беларусі. Некалькімі словамі адзначана, што населеныя пункты Беларусі мелі свае асаблівасьці ў параўнаньні з украінскімі і расейскімі, шмат запазычылі з Захаду і адрозьніваліся адзін ад аднаго ў некаторых рэгіёнах унутры Беларусі. У канцы ўзьнёсла: можна *“...зрабіць выснову, што беларускае дойлідства сапраўды існуе як суб’ект культурна-гістарычнага працэсу, як адна са складаючых частак сусветнай культуры... Дойлідства прадстае як адна з найбольш выразных культурных прыкмет беларускага народа”*.

На гэтай аптымістычнай ноце, нікім сёньня не аспрэчанай,

сканчаецца дасьледаваньне А. Лакоткі. Толькі ці ёсьць падставы для аптымізму?
Кніга пакідае супярэчлівыя ўражаньні. Багацьце сабранага пад адной вокладкай матар'ялу не адлілося ў важныя высновы па тэме, якая заяўлена ў назьве кнігі — менавіта пра нацыянальныя рысы. Тыя меркаваньні, што дастаткова сабраць наяўныя матар'ялы зь Беларусі, а яны скажуць самі за сябе, і гэта будзе голас нацыі, — наіўныя. І шлях, абраны аўтарам для гэтага, — простая перакампаноўка сваёй ранейшай кнігі — сябе ня спраўдзіў. Па-першае, з чыста тэхнічнага боку. Па-другое, папярэдняя кніга была, хутчэй, вузка-этнаграфічная, а нацыянальнае — гэта ня толькі этнаграфічнае. Трэба памятаць, што архітэктура — гэта яшчэ і від мастацтва. Магчыма, калі б за тэму "Нацыяналныя рысы беларускай архітэктуры" ўзяўся мастацтвазнаўца, ён раскрыў бы яе інакш.
Дарэчы, такая спроба ўжо была. Гэта клясычная праца Міколы Шчакаціхіна "Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва" (1928), якая прысьвечана галоўным чынам дойлідзтву. Адной з прычын посьпехаў Шчакаціхіна ў высьвятленьні вытокаў нацыянальнай архітэктуры беларусаў была тая, што ён зьвярнуўся перш за ўсё да віленскага дойлідзтва, паказаў, што менавіта ў Вільні бяруць пачатак многія характэрныя рысы нашага будаўніцтва. А дасьледаваньне А. Лакоткі жорстка абмежавана межамі сучаснай Рэспублікі Беларусі, і калі для высьвятленьня нацыянальнага аблічча вясковай архітэктуры гэтага аказалася дастаткова, то для выяўленьня асаблівасьцяў гарадзкой архітэктуры гэта адыграла фатальную ролю. Карацей, без уліку Вільні нельга напісаць заяўленае дасьледаваньне.
І яшчэ. Перагартаўшы кнігу А. Лакоткі, можна ўпэўніцца, што ў ёй адсутнічае такая яскравая старонка нашага нацыянальнага будаўніцтва, як дачныя пасёлкі. Калі раней паміж горадам і вёскай стаяла мястэчка як прамежкавы тып паселішча, то цяпер такую ролю прынялі на сябе менавіта дачныя пасёлкі. Іх сацыяльны зьмест, вядома, зусім адрозны ад местачковага. Яны зьявіліся ў эпоху "разьвітага сацыялізму" як сродак "вырашэньня харчовай праблемы". Ну, хто цяпер адважыцца сказаць, што "дачны" лад жыцьця — гэта ня наша нацыянальная рыса?
Дык якой моваю "прамаўляюць" нашыя камяніцы? І якую музыку "граюць" нашыя кварталы? Якая яна, нацыянальная

архітэктура беларусаў? І раптам разумееш, што адказу менавіта на так пастаўленае пытаньне А. Лакотка і не імкнуўся даць у сваёй кнізе, прысьвечанай “нацыянальным *рысам* архітэктуры”.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]

№ 4 (18) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя:
analityka@yahoo.com
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: **06-10-2001**
[image]

Віржынія Шыманец

Аўтарытарныя культуры

Вывучэнне культурнага поля такой краіны, як Беларусь, — няпростая задача. Яна ўскладняецца тым, што на Захадзе існуе бадай гэтулькі ж дэфініцый паняцця “культура”, дысцыплін у гуманітарных навуках. Так, антрапалогія прапануе нам шэраг апісальных вызначэнняў, сярод якіх найбольш вядомае належыць Эдварду Тайлару (1871 г.). Паводле Тайлара, культура ёсць *“складанай цэласнасцю, якая ахоплівае веды, вераванні, мастацтва, права, мараль, звычаі і ўсякія іншыя ўменні і навыкі, засвоеныя чалавекам як членам грамадства”*. Гэтае старое азначэнне было дапоўненае іншымі, гістарычнымі (дзе культура паўстае ў якасці лагічнага цэлага, што ёсць вынікам працэсу “сацыяльнай спадчыннасці” і перадачы вартасцей з пакалення ў пакаленне), нарматыўнымі (дзе культура альбо выяўляе лад жыцця, супольны для індывідаў, якія жывуць у нейкім грамадстве, альбо з’яўляецца сукупнасцю правілаў і ідэалаў, зададзеных дзеля працягвання працэсу сацыяльнага ўзаемадзеяння), структурнымі (культура — гістарычна сфармаваная сістэма эксплiцытных або імпліцытных

ВІРЖЫНІЯ ШЫМАНЕЦ
доктарка ўнівэрсытэту Парыж III, аўтарка дысэртацыі, прысьвечанай беларускаму тэатру першых дзесяцігодзьдзяў XX стагодзьдзя. У суаўтарстве з Аляксандрай Гужон напісала кнігу *“Parlons biélorussien, Langue et culture”* (l’Harmattan, 1997). Укладальніца зборніка *“Chroniques sur la Biélorussie contemporaine”* (l’Harmattan, 2001), на

мадэляў, якую прымае ўся група альбо яе частка), псіхалагічнымі (культура — засвоены спосаб вырашэння праблемаў), семіятычнымі (паводле Кліфарда Гірца, культура — гэта інтэрпрэтацыйная навука ў пошуку значэнняў). Да гэтага спісу трэба яшчэ далучыць сучасную “эканамічную” дэфініцыю, што зводзіць паняцце культуры да сектара індустрыяльнае вытворчасці “культурных здабыткаў” з мэтай продаж. Зазначу таксама, што “культуру” супастаўляюць з “цывілізацыяй”, набліжаючы гэтыя паняцці або разводзячы іх.

...Геаграфічнае і нацыянальнае вымярэнне слова “культура” ў сінтагме “беларуская культура” — зусім не адзінае, што стварае праблему дэфініцыі.

...Трэба таксама зразумець, чым было паняцце культуры ў краіне з аўтарытарным рэжымам, які часткова апраўдвае насілле культурнымі традыцыямі[1]. Мы ведаем, што аўтарытарныя лідэры ў сваіх дыскурсах зацікаўленыя вызначаць культуру як застылую, нерухомую сущэльнасць, якая папярэднічае палітыцы і палітычным метадам прымусу. Ацэнкавы багаж дэфініцый мусіць быць параўнаны з дэфініцыямі, што пануюць у Беларусі[2], бо паняцце “культура” выбудавалася тут разам з паняццем “нацыя” і ўпісана ў своеасаблівы працэс дзяржаўнай пабудовы[3]. Заўважым, што ў сучасны “Беларускі” ёсць тэндэнцыя ўспрымаць культуру як гістарычны феномен, які мае этнічныя карані (гэта, напрыклад, культурадэтэрмінізм, гледжання)[4]. Як вынік, прымардыялісцкія тлумачэнні “культуры” і “нацыі” робяцца чымсь самавідавочнымі, а аўтары ўнікаюць узважаных дэбатаў пра аб’ектыўнасць паняццяў.

[1] **Гэтая** **кампанія**, якая **ахрысціла** **сучасны** **беларускі** **народ** **“крывічамі”**, **ідэалагічна** **абгрунтавала** **гістарычна** **абавязковае** **супрацьпастаўленне** **“культуры”** **і** **“дзікунства”**.

[2] **Гэта** **стаўленне** **характэрна** **не** **толькі** **для** **беларускіх** **афіцыйных** **колаў**, **але** **і** **для** **пераважнай** **большасці** **беларускіх** **інтэлектуалаў**.

[3] **Гэта** **ўспрыманне** **культуры** **як** **“нацыянальнай”** **з’яўляецца** **адным** **з** **самых** **трывалых** **стэрэатыпаў** **беларускага** **грамадства**.

[4] Вэнсан Дзюбуа лічыць, што ў сучасных дзяржавах стварэнне культуры можа быць разгледжана як *“катэгорыя дзяржаўнага ўмяшання”*. Ён слушна падкрэслівае, што паняцце культуры

ёсць перадусім заходняй катэгорыяй. Яе паўстанне гістарычна звязанае з краінамі, што ішлі па шляху індустрыялізацыі. У гэтых краінах артэфакты часцей а часцей выкарыстоўваліся для “хаджэння ў народ” або ў якасці інструментаў мабілізацыі сацыяльных груп з мэтай стварэння “альтэрнатывы традыцыйным формам палітычнага прадстаўніцтва”. У Беларусі культурніцкі аргументар ніколі не быў развіты настолькі, каб пахіснуць афіцыйныя дзяржаўныя структуры альбо аўтарытарныя асновы рэжымаў, устаноўленых палітычным кіраўніцтвам. Напрыклад, з канца XIX ст. абаронцы “рэвалюцыйнага” ўжывання паняцця “беларуская культура” супрацьстаялі тым, хто рабіў з культуры сродак падтрымкі дынастычнага парадку. Гэта, дарэчы, не азначае, што ўсе адэпты культурных змяненняў падзялялі дэмакратычныя погляды, хоць і былі рэвалюцыянерамі.

Вэнсан Дзюбуа паказвае таксама, што паняцце “культуры як праблемы” спачатку зыходзіла з кола мастакоў і інтэлектуалаў, апазіцыйных дзяржаве. Аднак культура, стаўкай якой зьяўляецца ўлада, інстытуцыялізавалася як дзяржаўная катэгорыя ў наш час, хоць некаторыя прынцыпы культурнай цэнтралізацыі былі вынайдзеныя абсалютнымі манархамі. Такім чынам, калі весці размову аб рынкавай эканоміцы, рынак культурных дасягненняў і артэфактаў, гэтаксама як механізмы іх адбору і ацэнкі, сёння *“неаддзельныя ад дзяржаўнага ўмяшання, нават абумоўленыя ім”*. Апошні сказ, відавочна, пасуе да рэчаіснасці савецкай Беларусі, дзе ўсё культурнае поле лічылася менавіта дзяржаўнай катэгорыяй. Культура мусіла валодаць дакладна закадаванымі *“нацыянальнымі характарыстыкамі”*, што адпавядалі б савецкай сістэме вартасцяў. У гэтым сэнсе можна зазначыць, што кожны афіцыйны аб’ект культуры, званы нацыянальным, удзельнічаў нейкім чынам у савецкай палітычнай эстэтыцы.

Ступень інстытуцыялізацыі культуры ў якасці дзяржаўнай катэгорыі адрозніваецца ў розных краінах. Усё ж тэзіс Вэнсана Дзюбуа: *“Шматзначнасць слова “культура” дазваляе забыцца на праблему яго выкарыстання для абазначэння пэўнай палітыкі”* — дае магчымасць па-новаму разгледзець гэтае паняцце ў дачыненні да Беларусі. Адразу ж заўважым, што ад часу краху СССР і абвяшчэння незалежнасці ў 1991 г. адной з галоўных задач Беларусі была стабілізацыя дзяржаўных структур.

Савецкі Саюз кожнаму быў яшчэ памятны. У Беларусі сутыкнуліся разнапланавыя канцэпцыі культуры, якія, незалежна ад іх тэарэтычнага фундаменту, усе былі шчыльна звязаныя з думкамі аб дзяржаўнасці. Нават той, хто спрабаваў пазбегчы гэтага, сваім дыскурсам аб культуры ўсё адно ўпісваўся ў пэўныя палітычныя рамкі. Па-другое: калі мы паглядзім на гісторыю Беларусі (ці, прынамсі, тэрыторыі, што сёння завецца Беларусяй), мы ўбачым, што культурніцкі аргументар тут заўжды скарыстоўваўся і для дзяржаўнага прымусу, і для радыкальнага супраціву рэпрэсіям з боку ўладаў (Alexandra Goujon. *Language, Nationalism and Populism in Belarus)*. Таму гаворка мусіць пайсці пра спосабы, якімі могуць быць “абкультураныя” ў апалітычных тэрмінах пераважна палітычныя праблемы; варта зразумець, якім чынам паняцце культуры ў Беларусі дазволіла ўмацаваць аўтарытарныя практыкі. Гэтыя практыкі можна зразумець, толькі спасцігнуўшы, як адбывалася палітызацыя паняцця культуры.

Негатыўная культура

Адмоўнае вымярэнне паняцця “беларуская культура” выпрацоўвалася паступова, пачынаючы з XIX стагоддзя. Яно зведала разнастайныя семантычныя хістанні. З’ява тлумачыцца часткова тым, што паняцці “мова”, “нацыянальнасць”, “рэлігія”, а цяпер і “ідэнтычнасць” паступова блыталіся з паняццем “культура”. Блытаніна спрычынілася да з’яўлення шэрагу стэрэатыпаў, што сёння здаюцца неаспрэчнымі ісцінамі як у Беларусі, так і за яе межамі. Першы з гэтых стэрэатыпаў, пра які я яшчэ буду гаварыць, тычыцца ідэнтычнасці беларусаў. Некаторыя ўважаюць, што яна вызначаная. Яе блытаюць з культурай і часта выкарыстоўваюць у аналітычных даследаваннях, лічачы яе пераменнай велічынёй, прыватнай ці працэсу дзяржаўнага будаўніцтва.

Пазітыўнае разуменне паняцця “беларуская сялянская культура”, уласцівае народнікам XIX стагоддзя, звалю ўжо не згадваецца. Яго адкінулі часткова з-за тых вынікаў, якія дадалі “нацыянальная палітыка”, што вялася ў імперскай Расіі, а потым у СССР. Вось толькі адзін прыклад з лінгвістычнай сферы. У імперыі паступова ўводзілася расійская мова як “цывілізаваная”, яна рабілася мовай улады (рэлігійнай і

5. Гэтая канцэпцыя паходзіць, у прыватнасці, з інтэрпрэтацыі дарэвіцкага знаходжання, заснаванай на ідэі міжрасавага змагання.

палітычнай). І ў СССР ідэя, што культуры нераўназначныя, што існуе іерархія культур, дазволіла замацаваць за расійскай мовай статус свайго роду “дыпламатычнай” — мовы “міжнацыянальных зносінаў”, нясучае бэлькі савецкай ідэалогіі[5]. Тэзіс аб існаванні якаснай іерархіі паміж дзвюма “складанымі цэласнасцямі традыцый і вартасцяў”, што лічыліся застылымі і нерухомымі ў гэтай зоне, — расійскай культурай, вечна “вышэйшай”, і беларускай, хутчэй архаічнай вытворнай ад першай — урэшце ўвайшоў у свядомасць “простага чалавека”. Нават і сёння ўяўленне пра “мужыцкасць” беларускай мовы ў параўнанні з расійскай, неад’емным элементам і рухавіком прагрэсу, нязменна служыць аргументам для палітычных маніпуляцый. Вось жа, імперскі і савецкі расклад сілаў варта было б вывучыць у святле ўплыву гэтых дэтэрмінісцкіх аргументаў на захаванне аўтарытарных рэжымаў. Можна таксама задумацца: якім чынам “нявызначанасць”, іерархізацыя, што дасягае ўзроўню “складанай цэласнасці” (ейны змест застаецца, аднак, надта размытым), **робіць** дапушчальнай сітуацыю маналагізму ў палітыцы. **(я да гэтага**
У савецкай Беларусі культурнае будаўніцтва аба**вяралася** таксама на паняцце “класавай культуры”. З тагоп**ункту** “беларуская культура” функцыянуе пад уплывам **“найнасці** значэнняў, традыцый і вартасцяў, што характэрн**ыя культур”)** сялянства. У некаторых асяродках гэта ўзмацняе**ць** канатацыю паняцця. Уся дваістасць савецкага ку**льтуралізм** дыскурсу палягала ў тым, што пагарджаны сацыя**льны** які, лічылася, канцэнтраваў усе нацыянальныя р**ысы** “беларускага народу”, атрымаў адказнасць за ў**стаўленне** Аднак, паколькі культура класу, што разглядаўся **як** “ніжэйшы”, магла быць толькі “ніжэйшай”, тым **і** прыкрыццём сацыялізуючага дыскурсу сцвярджа**ліся** непаўнавартасць беларусаў.
Такое разуменне “беларускай культуры” мела та**кім** негатыўную канатацыю для цэлай плыні беларус**кага** нацыяналізму, які ўрэшце інтэрыярызаваў канцэ**пцыю** негатыўнай беларускай культуры. Каб супрацьс**тавіцца** ідэям і вызваліцца з іх ярма, права на культурна**е** беларусаў патрабавалі тыя, хто лічыў сваю куль**туру** “сапраўднай” русіфікацыі і саветызацыі. Сялянскі свет, яшчэ ў **ХІХ ст.** разгляданы як месца стварэння “сапраўднай беларускай

ў Эпізадычная
нявызначанасць,
якая
выяўляецца
пункце
“найнасці
культур”)
дыскурсу нацыянальны
мультыкультуралізм
каранёвага
мінулым
Беларусі
Расійскай
імперыі, а
таксама ў
сваіх
адносінах з
Расіяй
Пасляваенай
надыхванне
“сапраўдных”
ХІХ ст.

культуры”, імі стаў бачыцца як свет, сапсаваны савецкай інфармацыяй. З другога боку, для гэтых нацыяналістаў стала відавочнай, што савецкая фаза беларускай гісторыі затармазіла прагрэс “нацыяналізацыі” краіны. Улічваючы, што сама ідэя нацыянальнага будаўніцтва разглядалася як знак сучаснасці, нацыяналісты знайшлі ў саветызацыі тлумачэнне адсталасці краіны і яе цяперашняга “некультурнага” стану. Сцвярджэнне, што нацыянальная ідэнтычнасць і свядомасць насельніцтва вагалася паміж беларускасцю, польскасцю[6] і расійскасцю, служыў дадатковым доказам “адсталасці” (Ihar Babkou, *Belarus: Dual modernity*), бо падкрэсліваў адсутнасць “культурнай”, адметнай сярод іншых. Беларусь не дасягнула станаўлення цалкам адасобленай ад суседніх нацый, а “беларускі народ” прапусціў найважнейшы этап свайго развіцця, які даваў яму далучыцца да “цывілізацыі”, г. зн. да мадэрнасці. Вядома ж, гэтыя тэзісы бяруць пачатак у эвалюцыянісцкіх канцэпцыях. Апошнія накладаюцца на перапляценне культурнага і палітычнага палёў[7], а таксама на тыя перадсуды, з якімі яны нібыта пакліканыя змагацца. Так ці інакш, большасць нацыяналістаў лічыла здабыццё культурнае свабоды адзінай зарукай дасягнення палітычнай свабоды. Але, памятаючы пра гіпотэзу Вэнсана Дзюбуа, льга задацца пытаннем: што ж адбываецца, калі палітычная свабода мысліцца па шаблонах негатыўных інтэрпрэтацый культуры, а апошнія ўзводзяцца ў абсалют? Якія палітычныя правы прадугледжвае гэтая схема для “бескультурных” людзей?

У часы СССР беларускае савецкае культурнае будаўніцтва адбывалася цераз інстытуцыялізацыю фальклору. Ён быў абсалютным арыенцірам, дзякуючы якому народ меў магчымасць убачыць уласную культуру на тле культур іншых савецкіх народаў. Тым не менеш, такая пабудова толькі паспрыяла станаўленню “негатыўнай канцэпцыі”. Маляваць вобраз “прэстыжнай” або “фальклорнай” нацыянальнай культуры — таксама справа палітычнай волі і выбару. Будаваць “фальклорныя” культуры, ведаючы, што іх заўжды будуць параўноўваць з адзінай здольнай прэтэндаваць на “прэстыжнасць” — даволі просты спосаб арыентаваць пачуцці прыналежнасці асобаў да пэўнай групы, гуляючы на “здаровым сэнсе”.

7. Больш падрабязна пра гэтую з’яву гл. **Andrié Pichot**. ***La société pure de Darwin à Hitler***.

Па-за межамі Беларусі некаторыя назіральнікі грунтаваліся на блытаніне паміж ідэнтычнасцю і культурай для вытлумачэньня значэння таго ці іншага палітычнага крызісу. Напрыклад, абвяшчэнне незалежнасці ў 1991 г. было інтэрпрэтаванае, галоўным чынам, як праблема ідэнтычнасці і культуры. Даследчыкі задаваліся пытаннем, якія ідэнтычнасці, ці культура, уласцівыя насельніцтву Беларусі, сталіся прычынай абрання узрушэнняў. Яны не знаходзілі тлумачэння “*гэтым беларусам*” (найбольш часта ўжываны французскі варыянт назвы якіх — *les Biélorusses* — яўна сведчыць пра “расійскасць”) і таму высоўвалі розныя аргументы, падтэкстам якіх была думка, што незалежнасць не была сур’ёзнай палітычнай альтэрнатывай для гэтай нацыі. Найбольш папулярнай версіяй стала наступная: беларусы самі не ведаюць, на якое культурнае і ідэнтычнаснае дыскурсіўнае сесці. У якасці ілюстрацыі былі прапанаваныя тры дэтэрмінісцкія тэзісы. Першы палягаў у тым, што “нацыянальная ідэнтычнасць” і “свядомасць” — гэта пераменныя, неабходныя для дзяржаўнага будаўніцтва. Таму канстатацыя іх аслабленасці ў беларусаў станавілася дадатковым доказам таго, што насельніцтва Беларусі — з нявызначанай ідэнтычнасцю, у лепшым выпадку “зрусіфікаванае” — будзе няздольнае заняцца дзяржаўным будаўніцтвам. Таму некаторыя заходнія назіральнікі сцвярджалі, што Беларусь мае відавочны інтарэс вярнуцца ў “расійскае ўлонне”.

8 V 1994 г. Аляксандр Лукашэнка быў абраны прэзідэнтам.

Паняцце “ідэнтычнасць”, што пасля абвяшчэння незалежнасці стала суадносіцца з цэльнай супольнасцю, адначасова зводзілі да пытання аб этнічным самавызначэнні насельніцтва. Але гэтае пытанне мусіла гучаць так: ці *гэтыя беларусы*, што маюць намер развівацца самастойна, з’яўляюцца дастаткова этнічна самадастатковымі, каб быць вартымі гэтай незалежнасці? У гэтым дыскурсіўным полі, дзе аслабленасць ідэнтычнасці павінна была стаць тлумачэннем усякіх нягодаў, што адбыліся ў выніку крушэння сістэмы, азначэнне паняцця “незалежнасць” засталося няясным. Чыя незалежнасць і ад каго? Незалежнасць ад расійцаў — этнічнай групы, што раней бачылася як пануючая, нават “вышэйшага гатунку”, “Богам абранай” уладарыць над іншымі народнасцямі, пазбаўленымі іншай выразнай ідэнтычнасці, апроч “прынятай” і “нязменнай”

расійскасці — г. зн. культурная незалежнасць, дасягнутая шляхам нечага накшталт біялагічнага разрыву? А выбор незалежнасць ад маналітнай палітычнай сістэмы, дыскрэдытавала сябе сваімі таталітарнымі перакананнямі, незалежнасць палітычная? Развіццё тэзісу аб ідэнтычнасці прыводзіла да таго, што савецкая ўлада ўспрымалася абумоўленая этнічнай прыналежнасцю яе кіраўнікоў, палітычная незалежнасць Беларусі, лічылася, магла забяспечаная выключна дзякуючы культурнай некаторыя, зразуметай як біялагічная розніца. Гэты падыход падмацаваць тэзісы мясцовых нацыяналістаў (дакладней замяніць “расійскасць” на “беларускасць”), ён таксама падштурхоўваў да апаражнення ад рэаліяў незалежнасці, якою не ведалі, што рабіць. Ці меркавалі даследчыкі, апроч ідэнтычнасці, беларусы маюць яшчэ й палітычныя правы? І як можа адбыцца “пераход да дэмакратыі”, калі існуюць перадсуды і стэрэатыпы культурнай нярэфлексіі, што адсоўваюць праблематыку грамадзянства і правоў на другі план?

Паколькі асаблівасцю беларусаў з’яўляецца іх дэкларуемая, даследчыкі злоўжывалі таксама мадэллю “падвоенай ідэнтычнасці”. Яе выводзілі з сітуацыі білінгвізму, якая выглядала лагічна. Гэтая мадэль негатыўным чынам мачыла ўсю сукупнасць значэнняў і вартасцяў, што, лічыцца, складаюць культуру беларусаў. Гэты падыход знаходзіў новае развіццё, калі падчас рэферэндуму 1995 г. дзве магчымасці дзвюх розных культур, між якімі кожны, лічылася, робіць выбар, ізноў атрымалі роўны статус. Гэты выбар сцвярджаў самае, што выбар свайго палітычнага лагеру. Такое прывяла да маргіналізацыі любых праектаў грамадства, заснаваных на культурнай дыскрымінацыі. Сітуацыя таксама дазволіла некаторым нацыяналістычным актывістам за рамантычны тэзіс аб Беларусі — “свеце з двума краіне, дзе асобы натуральным чынам раздвойваюцца. Тэзіс аб раздваенні праектаваўся на ўсе ўзроўні: ад шызафрэніі на ўзроўні індывідаў да ўзнікнення нябачнай мяжы паміж усходняй і заходняй Беларуссю[9].

Нацыяналістычныя колы жадалі таксама захаваць ідэю культурнага разрыву, які сімвалічна змацоўваў бы разрыў палітычны. Гэтае пачуццё павінна было супрацьстаяць

А выбор незалежнасць ад маналітнай палітычнай сістэмы, дыскрэдытавала сябе сваімі таталітарнымі перакананнямі, незалежнасць палітычная? Развіццё тэзісу аб ідэнтычнасці прыводзіла да таго, што савецкая ўлада ўспрымалася абумоўленая этнічнай прыналежнасцю яе кіраўнікоў, палітычная незалежнасць Беларусі, лічылася, магла забяспечаная выключна дзякуючы культурнай некаторыя, зразуметай як біялагічная розніца. Гэты падыход падмацаваць тэзісы мясцовых нацыяналістаў (дакладней замяніць “расійскасць” на “беларускасць”), ён таксама падштурхоўваў да апаражнення ад рэаліяў незалежнасці, якою не ведалі, што рабіць. Ці меркавалі даследчыкі, апроч ідэнтычнасці, беларусы маюць яшчэ й палітычныя правы? І як можа адбыцца “пераход да дэмакратыі”, калі існуюць перадсуды і стэрэатыпы культурнай нярэфлексіі, што адсоўваюць праблематыку грамадзянства і правоў на другі план?

Паколькі асаблівасцю беларусаў з’яўляецца іх дэкларуемая, даследчыкі злоўжывалі таксама мадэллю “падвоенай ідэнтычнасці”. Яе выводзілі з сітуацыі білінгвізму, якая выглядала лагічна. Гэтая мадэль негатыўным чынам мачыла ўсю сукупнасць значэнняў і вартасцяў, што, лічыцца, складаюць культуру беларусаў. Гэты падыход знаходзіў новае развіццё, калі падчас рэферэндуму 1995 г. дзве магчымасці дзвюх розных культур, між якімі кожны, лічылася, робіць выбар, ізноў атрымалі роўны статус. Гэты выбар сцвярджаў самае, што выбар свайго палітычнага лагеру. Такое прывяла да маргіналізацыі любых праектаў грамадства, заснаваных на культурнай дыскрымінацыі. Сітуацыя таксама дазволіла некаторым нацыяналістычным актывістам за рамантычны тэзіс аб Беларусі — “свеце з двума краіне, дзе асобы натуральным чынам раздвойваюцца. Тэзіс аб раздваенні праектаваўся на ўсе ўзроўні: ад шызафрэніі на ўзроўні індывідаў да ўзнікнення нябачнай мяжы паміж усходняй і заходняй Беларуссю[9].

Нацыяналістычныя колы жадалі таксама захаваць ідэю культурнага разрыву, які сімвалічна змацоўваў бы разрыў палітычны. Гэтае пачуццё павінна было супрацьстаяць

9 Гл. Андрыян Меленік. *Беларуская ідэя і тэрыфрадытызм*

дыскурсу новай прэзідэнцкай улады, якая якраз нацыі ўвала мінімізаваць разрыў шляхам рэферэндуму па моўным пытанні і абвяшчэння палітыкі інтэграцыі. Пазней іншыя інтэлектуалы прапанавалі метафару іншую, чым “двухаблічны Янус”, а менавіта, вобраз “нацыі-гермафрадыта”. Тым самым яны імкнуліся патлумачыць нежаданне большасці насельніцтва браць удзел у рэферэндумным канфлікце. Рабілася гэта, што зыходзячы з тэзісу аб адсутнасці вызначанай ідэнтычнасці, ён тэрмінах арганіцызму[10].

У палітычным і інтэлектуальным асяроддзі абвінавачванне ў здрадзе праз падваенне культурнае арыентацыі было заснаванае на ідэі, што лінгвістычнае раздваенне ёсць прыкметай раздваення культурнага. Некаторыя абаронцы монакультуралізму проста-такі апантаныя такім абвінавачваннем. Аднак сучасная антрапалогія кажа, што *“індывід-удзельнік некалькіх культур прадукуе з рэзультатаў матэрыялаў сваю ўласную ўнікальную ідэнтычнасць, робячы арыгінальны сінтэз. Вынікам сінтэзу з’яўляецца не падвоеная ідэнтычнасць — калі казаць пра спалучэнне дзвюх ідэнтычнасцяў у адной асобе — а ідэнтычнасць сінкрэтычная (…). Нават калі ідэнтычнасць мае шэраг вымярэнняў, яна не губляе сваёй еднасці”* (Denys Cuche. *La notion de culture dans les sciences sociales*). Трэба яшчэ дадаць, што *“адрозненне ў ідэнтычнасці не з’яўляецца простым вынікам культурнага адрознення”*, гэтаксама як *“прыналежнасць да нейкай культуры ня значыць аўтаматычнага валодання нейкай адпаведнай ідэнтычнасцю”*.

Насілле, якое праявілася ў палітычнай сферы, абапіралася на блытаніну паміж гэтымі канцэптамі. Гэтая блытаніна ў некаторай ступені палегчыла правядзенне аўтарытарнай палітыкі ў краіне, дзе навакольнае бязладдзе павялічвалася яшчэ й з-за пачуцця ўсеагульнай страты сэнсу. Культура стала праблемай, гэтак падкрэсліваючы наяўнасць палітычнага крызісу. Але пытанні, як, чаму і хто ў тым ці іншым кантэксце прадукаваў, падтрымліваў або ставіў пад сумнеў тую ці іншую ідэнтычнасць, не былі насамрэч пастаўленыя.

Другі дэтэрмінісцкі тэзіс нагадвае аб тэорыі “сутыкнення цывілізацый”, распрацаванай Сэмюэлем П. Гантынгтанам. Аднак да Беларусі гэтую тэорыю можна стасаваць з дзвюх супрацьлеглых пазіцый. Адны лічаць, што Беларусь, знаходзячыся паміж Расіяй і Польшчай, ляжыць на

нацыі // Фрагмэнты. **Менск, № 1—2 (Лета 1999). Разважанні Мельніцкага пачынаюцца з таго, што ён легітымізуе эсэнцыялісцкія і прымардыялісцкія абароны на грамадства і свет (“арганічная гэтарыя грамадства”), бо яны, нібыта, найменш падабаюцца сацыялістам.**

цывілізацыйнай мяжы Захаду і Ўсходу. Памежнае становішча тлумачыць, чаму Беларусь не дае рады ясна вызначыцца, чым ёсць яе культура як “складаная цэласнасць традыцый і вартасцяў”. Маючы пэўнае мінулае, якое лучыць яе з суседзямі, і пэўнае геаграфічнае становішча, Беларусь павінна нарэшце выбраць свой *“лагер”* (Б. Дрвэскі). Другія, наадварот, мяркуюць, што палажэнне Беларусі — *“на скрыжаванні”* дзвюх вялікіх цывілізацый — ёсць прычынай багацця яе сістэмы традыцый і вартасцяў — сістэмы досыць арыгінальнай, каб легітымізаваць яе палітычную незалежнасць ад суседзяў (Я. Запруднік).
Трэці дэтэрмінісцкі тэзіс грунтуецца на блытаніне паміж паняццямі “культура” (складаная цэласнасць традыцый і вартасцяў), “нацыянальнасць” і “веравызнанне”. Для адных той факт, што Беларусь ёсць збольшага краінай праваслаўных вернікаў, даказвае, што беларусы мусяць лічыць сябе “расійцамі”. Для другіх Беларусь мае характарыстыкі заходняга свету, бо на яе ўплываў рымскі каталіцызм у часы уніі паміж Рэччу Паспалітай і Вялікім Княствам Літоўскім, і гэта павінна, хутчэй, падштурхнуць яе да разрыву з Усходам. Зрэшты, шматканфесійны досвед гэтага рэгіёну дазваляе сказаць, што рэлігійнае веравызнанне, як і культура, нацыянальнасць, не з’яўляецца нязменнай дадзенасцю, якая перадаецца ад пакалення да пакалення або генетычна. Акрамя таго, ніводнае з азначэнняў “нацыянальнасці” і “культуры” не звязанае з дэтэрмінізмам рэлігійнага плану. На землях, што цяпер завуцца Беларусяй, праваслаўе дамінавала не заўжды і, можа, некалі ізноў перастане дамінаваць. Калі цяпер паміж беларускіх вернікаў большасць складаюць праваслаўныя, гэта не значыць, што яны складаюць большасць ад усіх насельнікаў Беларусі. Нельга адмаўляць, што рэлігійная прыналежнасць членаў грамадства можа аказваць сур’ёзнае ўздзеянне на іхнюю сістэму вартасцяў, аднак тую прыналежнасць, як справядліва зазначыў Бэртран Бадзі, нельга рабіць адказнай за ўсю культуру. Гэтак мы паставілі б іншыя канфесіі, а таксама атэістычнае насельніцтва, па-за межы таго, што называецца культурай. Гэткі пункт гледжання апраўдваў бы няроўнасць як прынцып добрае ўлады і не ўлічваў бы адносінаў, што існуюць паміж палітычнай і рэлігійнай сферамі. Напрыклад, Аляксандр Лукашэнка ахвотна прыцягнуў праваслаўную рэлігію на службу сваім аўтарытарным памкненням: ён выкарыстоўвае яе, каб

“абкультурыць” ідэю палітычнай інтэграцыі Беларусі і Расіі, бо праваслаўе разглядаецца як традыцыя, што легітымізуе інтэграцыю. Такім чынам, тэзіс аб “цывілізацыйным канфлікце” аказваецца дарэчы, каб апраўдаць інтэграцыю. Апошняя прадстаўляецца ўладамі не ў якасці рацыянальнай палітычнай стратэгіі, а, хутчэй, як наканаванне.

Перагляд паняцця
“нацыянальная культура”
Пра культуру нацыяналізму
1980-я — гады перабудовы і разгортвання нацыяналістычных рухаў ва ўсім Савецкім Саюзе. Адпаведна, у гэты перыяд рух за перагляд ранейшае “нацыянальна-культурнае палітыкі” дасягнуў сваёй кульмінацыі. У Беларусі ён мог абаперціся і на ленінскі лозунг аб праве нацыянальнасцяў на самавызначэнне і абарону ад “великорусского шовинизма”, а таксама на ленінскую дэфініцыю “дэмакратызму”, і на новае прачытанне разважанняў Сталіна аб нацыі (1913 г.) (гэткі сінкрэтызм мы знаходзім, у прыватнасці, у кнізе Анатоля Сабалеўскага “Асоба мастака”). Гэты рух праявіўся таксама ў палітыцы фармавання культурных цэнтраў у краіне: у Беларусі галоўным культурным цэнтрам адназначна станавіўся Менск, паступова набіраючы вагу ў якасці культурнай сталіцы. Рух за перагляд ранейшай палітыкі быў высілкам не толькі нацыяналістаў, адсунутых на задворкі грамадскага жыцця: да пэўнай ступені ён падтрымліваўся ўладамі. Перагляд “нацыянальных” рысаў беларускага народу адбываўся таксама пад уплывам савецкай этналогіі і таго, якім чынам яна, пачынаючы з 1960-х гг., вывучала “народную культуру”, якая разумелася як сістэма традыцый і спецыфічных вартасцяў, уласцівых “народам”. Цудоўны прыклад такога перагляду мы знаходзім у дысертацыі Зянона Пазняка, названай “Праблемы станаўлення і развіцця прафесійнага тэатру ў пачатку XX стагоддзя (1900—1917 гг.)”[11]. Будучы нацыяналістам, З. Пазняк аспрэчвае савецкую гістарыяграфію як у факталагічным, так і ў інтэрпрэтацыйным плане. Але ж яго дысертацыя часам, выглядае, толькі радыкалізуе канцэпцыі, якімі кіраваліся савецкія гісторыкі ў сваіх пошуках каранёў, на якіх вырасла беларуская культура.

[11] Праблемы становления и развития белорусского профессионального театра начала XX в. (1900—1917). Ленінград, 1981. Аўтар абараніў дысертацыю на расійскай мове ў Ленінградзе, бо яму не далі абараніцца па-беларуску ў Менску.

Напрыклад, паняцці “падпольнай дзейнасці”, “нелегальнасці”, “забароненасці”, “апазіцыйнасці”, палітычнае ролі тэатру ў якасці аднаго са сродкаў прапаганды здаюцца крыніцамі асацыятыўнай дынамікі, што вывела беларускі тэатр на шлях “прафесіяналізацыі”. Апісанне працэсу “прафесіяналізацыі беларускай культуры” падаецца цалкам скалькаваным з савецкай гістарычнай мадэлі. Савецкія гісторыкі карысталіся ёю, каб апавесці пра прафесіяналізацыю бальшавіцкай партыі на пачатку стагоддзя (партыя спярша была падпольнай, нелегальнай і г. д.). Аднак З. Пазняк хоча давесці, што з’яўленне фактаў беларускай культуры, у тым ліку тэатральнай, было плёнам працы не толькі малаадукаваных сялянаў, але і прафесіяналаў. Таму ён узводзіць “піянераў” на Парнас. З ягонага клопату пра ўзвядзенне “беларускай культуры” ў ранг культураў сур’ёзных і высокіх паўстала даследаванне таго, якім чынам тая культура была ўніфармізаваная шляхам выпрацоўкі “прафесійнай беларускай эстэтыкі”. Такім чынам, забароненасць і падпольнасць, паводле З. Пазняка, паўплывалі на фармаванне самабытнасці беларускага тэатру як тэатру на шляху “нацыянальнага”. У той час як украінскамоўныя і расійскамоўныя трупы ўжо набылі прызнанне пры канцы XIX ст. (іх турнэ па краіне ўжо таму доказам), беларускамоўныя калектывы перайшлі да легальнага існавання толькі ў 1910 г., прычым нацыянальнае пытанне было стрыжнявым у справе культурнае самаідэнтыфікацыі. Аўтар спрабуе таксама вызначыць тое, што складае самабытнасць беларускага тэатру — “дэмакратызм” і “народнасць”[12]. Дэмакратычнасць у такім разе — гэта пытанне фармальнае эстэтыкі? Паводле З. Пазняка, эстэтыка заўжды “канкрэтна-гістарычная” і гэта тэрмін дваісты, што мае і нацыянальнае, і сацыяльнае вымярэнне, і які не можа быць зразуметы па-за яго сувяззю з фальклорам[13]. Натхняючыся азначэннем “народнага эстэтычнага ідэалу”, сфармуляваным у 1960-я фалькларыстам і этнолагам В. Я. Гусевым, у сваёй дысертацыі аўтар лічыць, што зыходзіў з інварыянту, існаванне якога лічылася “бясспрэчным, а менавіта “супольнага сэнсу”[14]. Для З. Пазняка праява “народнага эстэтычнага ідэалу” адносна гамагеннага, сведчыць аб дэмакратызме тэндэнцыі, імкненне да дэмакратызму залежыць ад працэсу “ўзбагачэння” “беларускага народу”. Апошняя катэгорыя мае на ўвазе

[12] [зацем]

[13] Аквотныя праслыць эвалюцыю ўзаемаадносінаў тэорыю фальклору СССР і могуць дасягнуць артыкулы “Фальклор” (Гусев В. Е.) і “Белорусский фольклор” (Кабашников К. П.); *Восточнославянский фольклор: Словарь научных терминов.* Мінск: Навука

унутрыгрупавую палітычную, юрыдычную, грамадскую і культурную салідарнасць, як біялагічнае і культурнае яднанне, нібыта панад усялякімі палітычнымі меркаваннямі. Можна зразумець, што гэткі тып аргументацыі скіраваны на мабілізацыю супраць назвай “беларускі народ” на палітычныя змены, непрыемныя нацыяналістам.

Для З. Пазняка яшчэ адным доказам наяўнасці дэмакратызму з’яўляецца той факт, што інтэлігенцыя і мастакі імкнуцца да беларускай мовы. Адкрыўшы ёй шлях, творцы ўзнялі (а значыць і нацыянальным) героем, узорным прадстаўніком “беларускага народу”. Такім чынам, мова народу, дагэтуль прыніжаная і названая “дэмакратычнай”, а дзяржаўная, расійская — прыладай рэпрэсій і таталітарнай ідэалогіі. Але тут аказваецца, што беларускі народ прэтэндуе хутчэй на культурныя, чым на палітычныя правы, грунтуючыся на аб’ектыўным “праве народу развіваць сваю нацыянальную культуру”. Таму “дэмакратызм” хутчэй абмяжоўвае дэмакратычныя памкненні беларускага народу пытаннем культурнай свабоды — адзінай зарукі палітычнай свабоды. Вось жа, калі паняцці “права на культуру”, “культурнай свабоды” маюць перадумовай існаванне мноства культур, сярод якіх мажліва вылучыць сваю[15], паняцце “культурная свабода” таксама можа быць антытэзай паняццю “культурны плюралізм”. Сапраўды, праект грамадства, у якім усе “сапраўдных” беларусаў патрабуецца адно салідарнае, у захаванні “прыроды” свайго народу, прадугледжвае аднолькавасць індывідуальных поглядаў. Людзі ў такім выпадку мусяць рэгулярна прысягаць на вернасць “нацыянальнай ідэі”. Што да асобаў, якія пераследуюць іншыя інтарэсы, іх рызыкуюць апынуцца ў лагеры здраднікаў гэтай ідэі. Перш за ўсяго, гэтая канцэпцыя робіць з Беларусі прадмет экспарту “Беларусь” — гэта заўжды будучыня; яна не абавязкова канкрэтнага грамадства, дзе ідэйныя дэбаты маюць на мэце да паляпшэння ўсіхнага жыцця тут і цяпер. Мы можам нарэшце запытацца: у якой ступені патрабаванні вольнага развіцця беларускай культуры, прадвызначанай этнічнымі крытэрамі, натхняюцца наступствамі савецкай нацыянальнай палітыкі, калі пары тэатраў на “мясцовай” мове, жменькі выданняў і фальклярызаванай культуры было досыць для стварэння ілюзіі

ідэалогіка, 1993.

[14] **Вёрай**
знаваць
ценафобыду,
што біялагічна

звязанае
індывідаў,
якія належаць
да адной
народнасці
маюць
дамінаванне
да
развіцця —
прыладай
тэорыі *этнасу*.
Да яе мы яшчэ
звернемся.

[15] **Можна**
сцвярджаць
Эрнэста
Геленера, які
крытыкуе
“Нацыі
і нацыяналізм”
за
супрацьпаставу
культуралізм
можна быць
скажыстаны ў
набыццявістычных
мэтах.

“дэмакратызму”?

Пры канцы 1980-х два феномены паспрыялі радыкалізацыі гэткіх поглядаў. Агонія СССР дазволіла звярнуцца да тэмы сталінскіх рэпрэсій. Выбух на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі, у выніку якога радыёактыўныя ападкі забрудзілі 70 % тэрыторыі Беларусі[16], выклікаў беспрэцэдэнтны ўздым папулярнасці ідэй аб “пагрозе для генафонду” насельніцтва гэтых тэрыторый. Размовы аб генацыдзе беларусаў за Сталіным, гэтаксама як апакаліптычныя разважанні аб генетычных змяненнях, паўплывалі на нацыяналістычны дыскурс пра культуру. Народ і культура прадстаўляліся ў іх як ахвяры прадуманага планамернага вынішчэння (Alexandra Goujon. *Genocide: A Rallying Cry in Belarus. A Rhetoric Analysis of Some Belarusian Nationalist Texts*). Гэткі ракурс дазваляў гаварыць пра існаванне этнічнай супольнасці беларусаў і змякчаць пачуццё віны за насілле, якое адбывалася ў гэтай супольнасці. Аб кім-небудзь за гвалт ускладалася на дзяржаву, якая разглядалася як “чужынская”[17]. Развіваючы гэтыя дыскурсы, іх аўтары ў падкрэсліваюць, што праблема культурнага і біялагічнага захавання беларусаў стала на працягу адносна кароткага перыяду галоўнай для грамадства. Яны заклікаюць да культурных зменаў, якія могуць быць рэалізаваны мірным, валюнтарысцкім шляхам, — адзінай гарантыі вяртання, як міфічных “вытокаў”. У межах гэтага міфу беларусы, будучы культурна і біялагічна адасобленыя ад свойх каранёў. Мы абмяжуемся адным прыкладам ідэалізацыі мінулага. 1920-я былі апісаныя нацыяналістамі як палітычна найбольш “залаты век” — з прычыны тагачаснай беларусізацыі. Тое, што перыяд беларусізацыі бачыцца сучаснымі даследчыкамі скрозь прызму пазнейшых сталінскіх рэпрэсій, і што дзеячы перыяду беларусізацыі шукалі “чыстыя” ад беларускіх традыцый”, у кантрасце з савецкім мінулым, на якім ляжыць пячатка дэградацыі, урэшце прывялі да таго, што некаторыя інтэлектуалы сталі ідэалізаваць 1920-я гады — перыяд да дыктатуры. Тое, што сфера палітыкі відавочна больш адказнасць за культуру ў 1920-я гг., магло б, здавалася, кінуць пад сумнеў слушнасць спробаў “рэабілітацыі” таго перыяду. Але сумневу не ўзнікла. Першынство нацыянальнай

[16] Аб генацыдзе беларусаў за Сталіным, гэтаксама як аб атамнага забруджвання гаварылі ў сваіх творах Ніл Гілевіч, Васіль Быкаў, Сьвятлана Алексіевіч і інш.

[17] Гэтыя ідэі ўпершыню прагучалі ў “Чарнобыльскай малітве” Сьвятланы Алексіевіч і пазней былі развіты ў яе кнізе “Чарнобыльскае забарона”.

праблематыкі засланіла той факт, што беларусізацыя (якую ставілі ў прыклад сучасным палітыкам) выбівалася з тэксту ўтварэння СССР (30 снежня 1922 г.). Не была таксама прааналізаваная ейная ключавая роля ў папулярызацыі пра бальшавіцкай улады на землях Беларусі. Беларусізацыя разглядалася хутчэй як натуральны этап “рэнацыяналізацыі” краіны і ніколі не выкрывалася як валюнтарысцкая, заснаваная на культурнай дыферэнцыяцыі і непаўторным крыніца канфліктаў (Alexandra Goujon. *Language, Nationalism and Populism in Belarus*). З пункту гледжання гэтых даследчыкаў, доўгачаканае “нацыянальнае адраджэнне”, якое прывяло да абвяшчэння незалежнасці ў 1991 г., таксама павінна прывесці да новай “беларусізацыі народу” — такой, якая апісана вышэй. Зрэшты, гэта не азначае, што высілкі адэптаў беларусізацыі былі цалкам пазбаўленыя сэнсу. Для абаронцаў гэтай стратэгіі яе поспех быў бы зарукай таго, што Беларусь стане “здаровай прасторай”, абтрасецца ад камуністычнай ідэалогіі, бадай, гарантам “паталогіі грамадства”. За выключэннем гэтага такая новая беларусізацыя выглядала хутчэй бяскрыўдным культурным праектам, чым праектам палітычным.

Тым не менеш, урадлівая глеба праекту дазваляла супрацьстаўляць савецкі “заняпад” “нацыянальнаму адраджэнню”, этнічна-кланавае адзінства — “чужынцам” дзяржаўнай пабудове, чысціню арганізму нацыі — забруджванню шляхам змяшэння. Адной з галінаў, дзе такое вымярэнне выявілася найбольш яскрава, стала лінгвістыка. Нацыяналісты выступалі за вяртанне да “тарашкевіцы”, таксама за адмаўленне ад дзвюхмоўя. Апошняе з’явілася *“метад знішчэння нацыянальнай культуры”* (Alexandra Goujon. *Le processus de formation d’une opposition politique et nationale en Biélorussie: le Front populaire biélorussien (1988—1991)*). Гл. чысціні беларускай мовы грунтавалася не толькі на адмаўленні “наркомаўкі”, але й на адмаўленні “трасянкі”, у наступства савецкай моўнай палітыкі. Трасянка — сапраўдны поспех савецкай палітыкі русіфікацыі беларускай мовы (рэформы 1933 і 1957 гг.), прычым падкрэслівалася, што ў выніку беларуска-расійскага змяшэння расійская мова часцяком дэградавала гэтак жа, як і беларуская. Першапачатковы сэнс слова “трасянка” — сумесь

ўціску, якую спрыяла стварэнне культурныя змяненні. Пра стасункі паміж нацыяналізмам і савецкай культурнай палітыкай гаварыць складана, бо ў кожнага з іх свой погляд на гэтую з’яву. Гл. Bekus, Ji-C. Attias. *La haine de soi. Difficiles identités*, Richard Rechtman.

17 У кожнага з іх свой погляд на гэтую з’яву. Гл. Bekus, Ji-C. Attias. *La haine de soi. Difficiles identités*, Richard Rechtman.

саломы, еміна для скаціны. У дачыненні да мовы "прыгожы", аднак, стала зняважлівым выразам. Феномен трасянкі ўжды аналізаваўся ў негатыўным святле. Нацыяналісты, якія хадзілі зрабіць з культурнай адрознасці беларусаў адзін з галоўных інструментаў разрыву з савецкім мінулым, упісвалі дадзены "адраджэння" ў больш амбітны праект "абцывілізоўвання" грамадства, якое, лічылі яны, дэнатуралізаваў і сапсаваў савецкі досвед. Яны спадзяваліся выкараніць негатыўныя рысы беларускага народу і асучасніць яго. Зазначым між тым, што Беларускі Народны Фронт, хоць і меў значны ўплыў на галіну культурных практык, так і не прыйшоў да ўлады. "Адраджэння" не адбылося.

Altérité suspecte et identité coupable dans la diaspora cambodgienne.

Пра культуру папулізму

Пасля свайго абрання шляхам усеагульнага галасавання ў 1994 г. прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка паступова ўсталяваў аўтарытарны рэжым. Адной з яго першых мішэняў стала нацыяналістычна настроеная інтэлігенцыя. Мы памятаем, напрыклад, "антыфашысцкую" прапагандысцкую кампанію, разгорнутую напярэдадні рэферэндуму 1995 г., калі палітычныя лагеры вызначаліся па мове. Раз беларускамоўныя прыхільнікі незалежнасці супрацоўнічалі з немцамі ў гады другой сусветнай вайны, значыць, кожнага, хто гаворыць па-беларуску, можна лічыць фашыстам. Гэткая логіка дазваляла супрацьставіць сімвал беларускай культуры — беларускую мову, прэзентаваную як мову фашызму, сімвалу савецкай культуры, прэзентаванаму як фактар народнага яднання, — расійскай мове. Прапаганда выкарыстала прыём нацыяналістаў, толькі памяняўшы знакі: дэмакраты называлі беларускую мову мовай дэмакратыі, а расійскую — уганебнай мовай прымусу. Тым часам першы прэзідэнт Беларусі атрымаў вонкавую, і ўнутраную падтрымку дзеля сваёй барацьбы супраць нацыяналістаў, надалей закляймёных пятнаццаці "нацызму". Ізноў ніхто не заўважыў, што палітыцы, перакананні, у адрозненне ад генаў, у спадчыну не перадаюцца. Маргіналізаваўшыся, нацыяналісты беларусы радыкалізаваліся, даводзячы, што беларусы, нарэшце, дэградаваў з-за савецкага мінулага і Чарнобылю, напярэдадні толькі здэградаванага прэзідэнта [18]. Такім чынам, у

[18] [пусцяць]

[19] У прапагандысцкім фільме "Нянавісць. Дзеці хлусні", паказаным па Беларускім тэлебачанні напярэдадні рэферэндуму

Лукашэнка набыў статус “культурнага наступства”, істотна паменшыла поле палітычнага змагання і звузіла магчымасці апазіцыі ягонаму прэзідэнцтву. У хуткім часе адраджэнскі кшталту “цыган”, “маскоўская марыянетка” сталі ключавым тлумачэннем яго палітычнай стратэгіі і сутнасці ягонага рэжыму.

А. Лукашэнка абаперся на сістэму савецкага гатунку, якая выточную культуру беларускага народу (Lapatnidze (Alexandre), Regamey (Amandine). *Biélorussie, Ukraine: la politique culturelle*), адначасова пляжачы апазіцыю за стварэнне “звышсавецкага мастацтва”. Апошняму супрацьстаўляўся “здаровы” жыццесцвярджальны характар савецкай культуры[19] прадукцыі. У некаторым сэнсе гэтыя абвінавачванні былі перагорнутым варыянтам нацыяналістычнага дыскурсу пра “паталогію” беларускага грамадства, якую трэба “лячыць”. А. Лукашэнка запачаткаваў пераацэнку паняццяў “гатунку”, “парадак”, “чысціня” — вядома ж, паводле іншых крытэраў, чым нацыяналісты. Мадэллю для яго ізноў паслужыла савецкая сістэма, а тэму сталінскіх рэпрэсій, Чарнобылю ці гісторыі нацыяналізму зноўку ўключылі ў катэгорыю табу. Але ж нават у межах дадзенай канцэпцыі культуры “плюралізм не павінен наносіць шкоду нацыянальнаму адзінству”, як кажа новы дэвіз, прыдуманы для апраўдання эстэтычнага аднадумства ў тэатры. Апаненты рэжыму, сярод якіх было нямала нацыяналістаў (паводле афіцыйнага дыскурсу, “адмарозкаў”), станавіліся галоўнымі носьбітамі грамадскага беспарадку, адзіным сродкам барацьбы з чым бачыліся міліцэйскія рэпрэсіі. Вось жа, жаданне вярнуцца да савецкага ладу — гэта тая самая рэканструкцыя, што і “вяртанне” да ранейшых вынаходак *прапановаў на будучыню”*, — як кажа Эманюэль Завадскі[20]. Улады выкарыстоўваюць гэтую рэканструкцыю дзеля апраўдання палітычнага прымусу.

Культурна афарбаваная аргументацыя неабходнасці разрыву з Расіяй засноўвалася таксама на антызаходнім дыскурсе. Ізноў жа, гэта нібы перагорнуты антыяшчурны дыскурс мясцовых нацыяналістаў (які толькі радыкалізаваўся з абвяшчэннем палітыкі інтэграцыі). На Захад сталі “глядзець” адказнасць за заняпад савецкай культуры гэткім жа чынам, як нацыяналісты валілі адказнасць за дэградацыю беларускай

1995 г. галоўны Сяргуком Рымашэўскага былі раскрытыкаваныя як дэкадэнцкія ў мастацтве, што нагадвае “здаровай” беларускай культуры савецкага “гатунку”.

[20] Аналагічнае нанясённю “заходнерусізму”. Падобнае ідэалогіяй Аляксандра Ціхановіча, “заходнерусізм” – гэта “мая беларуская

культуры на Ўсход, хоць першапрычынай разнастайных вытлумачэнняў было знікненне СССР як палітычнага. Антызаходні культурніцкі дыскурс мог служыць дымовай для тых, хто сумаваў па савецкай мінуўшчыне, але новае ўмацаванне сувязяў паміж усходнімі славянамі, што азначала трыюмфальнае вяртанне новай формы імперыі[20], які абапіраецца на спецыфічнае разуменне дэмакратыі. Сапраўды, А. Лукашэнка працягвае настойваць на дэмакратычнасці сваёй палітыкі. Ён сцвярджае, што праводзіць дзеля ўсталявання “непасрэднай дэмакратыі”, якая забяспечвае інстытут рэферэндуму. Рэферэндумы служаць зарукай сімбіёзу паміж уладамі і грамадствам, выразнага “народных традыцый” і вартасцяў, іншымі словамі “культуры”, аднак да такой “культуры”, якая адказвае прэзідэнцкаму папулізму.

Рэалізацыя гэтай праграмы выявілася ў аднаўленні культурных абменаў паміж Беларуссю, Расіяй і Украінай на праектам абменаў з заходнімі краінамі[21]. Паралельна антызаходні дыскурс засведчыў нежаданне функцыянераў беларускага рэжыму мірыцца з плюралізмам думак і свабодай слова. Таму, прыкрываючыся клопатам пра маральную дыскурс апраўдваў аднаўленне цэнзуры, а таксама ўмацаванне прымусу, што прыводзяць да самацэнзуры.

Калі раней этнізацыя паняцця “культура” магла служыць нацыяналістам, то пасля абрання А. Лукашэнкі семантычны прыём стаў цэнтральным у дзяржаўнай Парадаксальна, але тая этнізацыя стала служыць дэманстрацыі “натуральнага”, “адвечнага” характару ўсходніх славянаў, якія паходзяць з аднаго “супер-этнасу”, для легітымізацыі фаталісцкіх дыскурсаў аб заняпадзе беларускай культуры, адказнасць за які ўскладаецца не на аўтарытарнай палітыкі прымусу і рэпрэсій, а на натуральны працэс дэградацыі этнасу. Гэты працэс, зрэшты, акрэслівае цалкам апалітычны[22]. Развіццё этніцысцкага тэзіса разам выкарыстанага дзяржавай, прывяло яшчэ да новых дэфініцый паняцця “беларускі народ” і падрыхтоўцы новай версіі гісторыі беларусаў, якая таксама патрэбна прэзідэнцкага папулізму. Прыкладам, у 1996 г. быў выдадзены трэці том *“Беларускай энцыклапедыі”, што адкрываўся артыкулам “Беларусы”, у якім даецца навуковае*

сістэмы грамадскай думкі ад Беларусі, што належыць краінай з моцнай нацыянальнай культурай і ня мае нацыянальнай ідэі, самастойнае культурнае і палітычнае развіццё, але цяжка назваць самастойнай і самабытнай частку Расіі і таму цяжка назваць нармальнай з яе культурнай спадчынай. Гэта ня можа не цікавіць кіраўнікоў краіны, якія імкнуцца ўмацаваць сваю ўладу ў тым ліку і пры дапамозе культурных сродкаў.

[21] У гэтым ліку і *Беларуская Дэтэлевізія*

з'яўлення этнічнай тэрыторыі беларусаў, працэсу "этнакансалідацыі" і "этнагенетычнай" кансалідацыі беларусаў. "Этнічная гісторыя" ў артыкуле "Беларусы" даводзіць, што "Б. на працягу свайго шматвяковага шляху стварылі і захавалі багатую, самабытную і ўнікальную культуру, якая ўвайшла ў сусветную цывілізацыю, паказалі мужнасць і гераізм, цярпенне і працавітасць, міласэрнасць і ўменне жыць у добрасуседстве…". Гэтыя разважанні маюць на мэце адцягнуць увагу чытачоў ад бягучай культурнай палітыкі ды зняць з уладаў адказнасць за сферу культурных зменаў. Дэфініцыі з энцыклапедыі паведамляюць нам не столькі пра тое, чым насамрэч быў беларускі народ, колькі пра тое, чым бы яго хацелі бачыць[23]. Іншы прыклад: у кнізе "Нацыянальная ідэя ў беларускай літаратуры пачатку стагоддзя" Л. Гаранін, які лічыць, што этнічны элемент мусіць стаць галоўнай натхняючай сілай беларускіх творцаў, прапануе нам сваё бачанне гісторыі ўсходніх славянаў. Яно бярэ пачатак у тэорыі этнасу Ю. У. Брамлея. За выходныя пункты Гаранін узяў візантыйскі і славянскі свет, разгляданыя як *"пункт этнічнай кожнасці"*. *Русічы* зніклі акурат таму, што змяшаліся з іншымі гарадамі. Але ў XII—XIII стагоддзях адбыўся працэс адраджэння "славянскага суперэтнасу", што суправаджалася ўмацаваннем расійцаў, украінцаў і беларусаў. На гэтай стадыі вектар культурнага развіцця: яго моц, інерцыйнасць або ўзрэшты — прадвызначаецца разуменнем працэсу этнагенезу. Адзінае, тэзісы савецкай этналогіі, узведзеныя на ўзровень інстытуцыйнай культуры, не закранаюць праблемаў узаемапранікнення, культурнай мабільнасці, разнастайнасці пунктаў погляду.

Газета і "Наша Ніва".

[22 знаць]

[23] Зрэшты, кожны з гэтых пастулатаў мусіў бы падмацоўвацца звесткамі сур'ёзных сацыялагічных даследаванняў: узяць, напрыклад, пастулат аб інструменталізацыі паняцця "мужнасць" у краіне, большасць выбарцаў у якой складаюць жанчыны (яны, можна сказаць, і

абралі прэзідэнтам А. Лукашэнку), ці тэзіс аб адчужэнні людзей ад палітыкі праз працу (параўнай заяву прэзідэнта пра тое, што лепей капаць зямлю на дачы, чым займацца палітыкай).

А. Лукашэнка, нібы моцны шахматыст, умее даваць сэанс адначасовай гульні.

Панславісцкія дэкларацыі не перашкодзілі яму сабраць жменьку акадэмічных вучоных у групу для стварэння “нацыянальнай ідэалогіі”. На думку Алега Слукі, выказаную ў артыкуле “Нацыянальная ідэя — аснова

[24] Што датычыцца сувязі паміж нацыяналізмам і “высокай культурай”, гл.: Gellner E. *Nations et nationalisme*.

грамадзянскага яднання” ў “Беларускім Гістарычным Часопісе”, гэтая ідэя ёсць перспектыўнай ідэалогіяй яднання беларускага грамадства вакол асноўных мэтаў: развіцця высокатэхналагічнай прамысловасці, захавання дзяржаўнай уласнасці на зямлю, стварэння сучасных гарадоў і вёсак, фармавання “высокае культуры”[24] і ўмацавання маральнага аўтарытэту сям’і. Усё гэта разам абяцае *“шчаслівае жыццё беларускаму народу”*. А. Слука працягвае ў такім духу: надышоў час ператварэння ідэалаў

нацыянальнай ідэі ў *“штодзённы маральны кодэкс кожнага грамадзяніна Беларусі”*, бо, калі палітычныя погляды могуць *“дзяліць грамадства”*, *“росквіт Радзімы і дабрабыт людзей назаўжды застаюцца для ўсіх непарушнымі вартасцямі”*. Сп. Слука паведамляе нам таксама, што ў 1996 г. групай беларускіх навукоўцаў быў распрацаваны праект беларускае дзяржаўнае ідэалогіі. Ён быў спробай *“сфармуляваць стратэгію і тактыку развіцця сучаснага беларускага грамадства”*.

Найважнейшую місію ідэалогіі “дэмакратычнай дзяржавы” складае, паводле А. Слукі, *“выбар кірунку нацыянальнага шляху і духоўнага ўдасканалення людзей. Ад гэтага залежыць поспех дзяржаўнай палітыкі, накіраванай на рэалізацыю праграм эканамічнага і культурнага развіцця”*. Насамрэч, гісторыя даказала, што *“не можа быць эканамічнага ўздыму без духоўнага яднання людзей”*. Карацей кажучы, для А. Слукі *“дастатак у кожным беларускім доме — сцяг*

нацыянальнай ідэі”. Высвятляецца, што дыскурс аб святарным саюзе славянаў не супярэчыць таму, што дзяржава фармулюе нацыяналістычныя тэзісы на мясцовым узроўні. Гэтаксама беларусізацыя ў БССР не супярэчыла палітычнай і культурнай уніфармізацыі ў СССР. Рэжым можа пераймаць асноўныя тэзісы сваіх апанентаў, каб лепей іх абясшкоджваць. Аднак пры гэтым не абыходзіцца без семантычных маніпуляцый і ўзмацняюцца нацыяналізм і культурныя табу. Тое самае можна канстатаваць

таксама ў святле ўмацавання статусу праваслаўя, што выконвае ролю іншага аўтарытарнага ферменту інтэграцыі, носьбіта этнічнай салідарнасці. Можна ўжо ўбачыць першыя эксцэсы такога “вяртання да веры”: у шэрагу нядаўніх публікацый насельніцтва ад імя праваслаўя заклікаецца змагацца супраць “еврейского заговора”.

Вайна культур

Узмацненне жорсткасці рэжыму і, як вынік гэтага, парушэнне правоў чалавека прымушаюць некаторых інтэлектуалаў з апазіцыі ацэньваць становішча як “вайну культур”. Мультыкультуралізм, які *de facto* існуе ў Беларусі, — прадметам абмеркаванняў, а тое, што А. Лукашэнка пачынае перахапіць некаторыя аксіёмы мясцовага нацыянальнага падштурхнула нацыяналістаў да новых змяненняў у дыскурсе. Разважанні пра мультыкультуралізм у Беларусі былі іныцыяваныя гісторыкамі і інтэлектуаламі, якія спрабавалі

25 Абмежаваць ці парушэнне правоў культурнымі правамі — значыць прыняць мультыкультурысцкую канцэпцыю права, якая

вызваліцца ад савецкіх канцэпцый. Адныя, наважуючыся адкрыць малавядомыя старонкі гісторыі, знайшлі ў шматкультурным досведзе Вялікага Княства Літоўскага ў гістарычнасці сучаснай беларускай дзяржавы. Яны даводзілі, што на гэтых землях існаваў “дэмакратычны” досвед мужнага суіснавання розных культур. Іншыя шукалі альтэрнатыва савецкай сістэме ў адаптаваных да беларускіх умоваў ідэях амерыканскага камунітарызму. Справа не абмяжоўвалася простай канстатацыяй шматкультурнасці беларускага грамадства і атрыманнем з гэтага творчага плёну. Ідэя гаворка ішла аб выяўленні сучаснай “паталогіі” культуры. Таму мультыкультуралізм інтэрпрэтаваўся як вынік посткаланіяльнага становішча, прычым былы каланізатар падаваўся адзіным віноўнікам развіцця культурных адрознасцяў, якое ляжала ў аснове ягонай стратэгіі панавання над меншасцямі. У такім разе нармалізацыя постсавецкай прасторы, абазначанай як “посткаланіяльная”, палягае ў правядзенні больш акрэсленых межаў паміж рознымі культурамі — межаў, якія каланіяльная стратэгія панавання зблытала. У гэтым сэнсе знаходжанне на мяжы дзвюх культур з’яўляецца анамаліяй, бо гэта знаходжанне ў “мёртвай культурнай прасторы”, або ў “зоне шызафрэніі”. Такім чынам, вывучэнне шматкультурнага досведу ставіцца на службу культурнаму маналагізму, які, у параўнанні з савецкай нацыянальнай палітыкай, мусіць выглядаць бясспрэчна дэмакратычным. Сцвярджаецца, што “посткаланіяльная паталогія” павінна быць вылечаная. Аўтары шукаюць адказу на шматкультурны выклік у паняццях “*транскультурнасць*” або “*посткультурнасць*” (часопіс “Фрагмэнты”). Паняцце “*транскультурнасць*” дазваляе зрабіць акцэнт на мабільным, інтэрактыўным і эвалюцыйным характары культур, ігнараваць, калі неабходна, палітычныя межы, якія, лічыцца, герметычна зачыняюць культуры. Аднак “транскультурнасць” усё яшчэ запісваецца ў разрад “новых еўрапейскіх утопій XX стагоддзя” альбо ўспрымаецца як вястун глабалізацыі, падчас якой “малая беларуская культура” рызыкуе загінуць. Так што “шматкультурны посткаланіяльны свет” застаецца моцна іерархізаваным. Палітыка ў ім разглядаецца як функцыя ад культуры, што нібыта ёй папярэднічае — як быццам палітычны выбар заўжды вынікаў з культуры і ніколі не з’яўляўся

супярэчыць універсалісцкай, заклад дзенай у “правах чалавека”. Аднак жа магчымым з’яўляецца адстойванне права на культуру ў межах канцэпцыі правоў чалавека.

крыніцай выбару культуры. Апрача таго, культурны маналагізм і мультыкультуралізм працягваюць падавацца як антыподы; між тым савецкі досвед якраз паказвае, што яны могуць суіснаваць, не супрацьстоячы, і спараджаць палітычны плюралізм. Іншымі словамі, гэтыя культурніцкія схемы могуць прыстасоўвацца да кожнага рэжыму, пакуль не ўзнятыя пытанні правоў індывідаў[25] і іхняга грамадзянства па-за межамі якога-колечы культурнага дэтэрмінізму. Без гэтай умовы "вайна культур" становіцца непазбежнасцю, а праблема адсутнасці дэмакратыі не можа быць вырашаная.
Што ж да канцэпцыі "этнічнага грамадзянства", дык у канцы XX стагоддзя мы мелі магчымасць назіраць, што атрымліваецца, калі яе адстойваюць цэлыя супольнасці. Вынікам сталіся нядаўнія падзеі на Балканах.

У Беларусі культура, якая тутака ніколі не вывучалася як носьбіт палітычных стратэгій, здольных замоўчваць размаітасць пунктаў погляду, стала пры гэтым носьбітам аўтарытарызму. Спрэчкі ад імя нібыта нязменных "культур" часткова паспрыялі адмаўленню дэмакратычных палітычных праектаў. У гэтым кантэксце індывіды знянацку апынаюцца культурна дэтэрмінаванымі, што спрыяе іхняй радыкалізацыі, але таксама й нецярпімасці, аснове ўсякай рэпрэсіўнай палітыкі. Мы ж нагадаем словы Эле Бэджы: *"Культурнае братэрства не з'яўляецца дастатковай зарукай добрага кіравання. Прыналежнасць да аднолькавай культуры не абараняе нас ад глупства ці жорсткасці нашых суайчыннікаў. Можна мець тыя самыя звычаі — і быць няздольнымі пабудаваць лепшае грамадства, зрабіць яго больш справядлівым. Бо кожная культура можа стаць дэспатам нават тых, хто выступае ад яе імя".*

Пераклаў з французскай
з нязначнымі скарачэннямі В. Р. паводле Chroniques sur la Biélorussie contemporaine. *L'Harmattan, 2001.*

Кнігі і працы, цытаваныя ў артыкуле:
Беларуская Энцыклапедыя. Т. 3. Менск, 1996.

Беларуская думка XX стагоддзя: Філасофія, рэлігія, культура (Анталогія). Варшава: Польская Акадэмія навук, Інстытут славістыкі, 1998.
Гаранін Л. Нацыянальная ідэя ў беларускай літаратуры пачатку стагоддзя. Менск: Беларуская навука, 1996.
Анатоль Сабалеўскі. Асоба мастака. Менск: Мастацкая літаратура, 1992.
Курапаты — дарога смерці. Менск: "Тэхналогія", 1994.
Ihar Babkoū. Belarus: *Dual modernity* //Cultural Encounters in East Central Europe, Swedish Council for Planning and Coordination of Research, Report 98:1.
Etienne Balibar, Immanuel Wallerstein. *Race, nation, classe: Les identités ambiguës*. Paris: La découverte & Syros, 1997.
Roger Belbéoch. *Société nucléaire.* — Les Notions philosophiques: PUF, 1990. T. 2.
E. Benbassa, J.-C. Attias. *La haine de soi. Difficiles identités*. Complexe, 2000.
Denys Cuche. *La notion de culture dans les sciences sociales*. — Paris: La découverte, 1996.
Bruno Drweski. L*e sentiment national en Biélorussie comme source de questionnement de l'identité polonaise // Perspectives Biélorussiennes*, № 15, septembre 1999.
Vincent Dubois. *La politique culturelle. Genuse d'une catégorie d'intervention publique*. — Berlin, 1999.
Jean-Pierre Faye. *Languages totalitaires, La raison critique de l'économie narrative*. Paris: Hermann, 1972 i *Le language meurtrier*. Paris: Hermann, 1996.
Ernest Gellner. *Nations et nationalisme.* Paris: Bibliothéque historique Payot, 1983.
Alexandra Goujon. *Genozid: a Allying cry in Belarus. A rhetoric analysis of Some Belarusian nationalist texts // Journal of Genocide Research* (1999), 1 (3).
Alexandra Goujon. *Language, Nationalism and Populism in Belarus // Nationalities Papers*, vol. 27, ą 4, 1999.
Alexandra Goujon. *Le processus de formation d'une opposition politique et nationale en Biélorussie: le Front populaire biélorussien* (1988—1991) *// Revue d'Etudes comparatives Est-Ouest*, vol. 28, ą 1, 1998.
Samuel P. Huntington. *Le Choc des civilisations.* Paris: Editions Odile Jacob, 2000.

L’invention de la population: Biologie, idéologie et politique (sous la direction de Hervé Le Bras). Paris: Editions Odile Jacob, 2000.

André Pichot. *La société pure de Darwin a Hitler*. Paris: Flammarion, 2000.
Фрагмэнты. Менск, № 1—2 (лета 1999).
Aléna Lapatniova, Amandine Regamey. *Biélorussie, Ukraine: la politique des symboles // Nouveaux mondes*, 2000.
Jean-Pierre Warnier. *La mondialisation de la culture //*La découverte, 1999.
Jan Zaprudnik. *Belarus: At a Crossroads in History*. Boulder, San Francisco, Oxford: Westview Series on the Post-Soviet Republics, Westview Press, 1993.

Зацемы

2 “Беларуская савецкая энцыклапедыя” (далей — БСЭ) вызначае культуру як гістарычную і сацыялагічную катэгорыю: *“К. — з’ява гістарычная, якая змяняецца ў залежнасці ад развіцця прадукцыйных сіл і формаў грамадскага жыцця людзей”*. Будучы сацыялагічнай катэгорыяй, яна мусіць разглядацца ў двух планах: матэрыяльным і духоўным. Матэрыяльная культура характарызуецца ўзроўнем *“тэхнікі і тэхналогіі вытворчасці, навуковай арганізацыі грамадскай працы, кіраўніцтва ўсімі бакамі вытворчай дзейнасці, навыкаў і вопыту працоўных, формамі ўласнасці, узаемаадносінамі паміж рознымі сацыяльнымі і вытворчымі групамі людзей, структурай размеркавання створаных матэрыяльных каштоўнасцей і іх спажывання”*. Духоўная культура — гэта *“сукупнасць навуковых ведаў, формаў свядомасці, светапогляду, мастацкай дзейнасці”*. Паводле энцыклапедычнага аўтара Родзіна, багацці духоўнай культуры павінны быць пастаўленыя на службу інтарэсам народу, каб вызваліць *“яго фізічныя і інтэлектуальныя сілы”*. Сярод багаццяў, якія пералічвае Родзін — *“навуковае пазнанне і светапогляд людзей, мастацтва, асвета і адукацыя, этыка і*

эстэтыка”. Аднак дэфініцыя культуры як сацыялагічнай катэгорыі выходзіць за межы пералічанага, бо Родзін піша таксама, што *“сусветная скарбніца культуры атрымлівае ў спадчыну ўсё лепшае з таго, што створана творчай працаю ўсіх народнасцей, нацый і рас”*. Ленінская дыялектыка двух тыпаў культур (нацыянальнай і сусветнай) тлумачыцца ў святле новай дэфініцыі *“буржуазнай культуры”*, якая, аддаючы перавагу асобе, а не калектыву, выяўляе гісторыю культуры як чаргаванне *“розных тыпаў К., якія не звязаны паміж сабою генетычна”*. Наадварот, сацыялістычная культура — *“пераемніца культурнай спадчыны ўсіх народаў”*, якая *“арганічна спалучае нацыянальнае і інтэрнацыянальнае”*. Такім чынам, савецкі дыскурс аб культуры 1970-х гадоў абапіраецца на эсенцыялісцкае бачанне свету. Аказваецца, што гэты семантычны перанос адпавядае пераацэнцы, якую савецкі навуковец Брамлей зрабіў што да паняцця “этнас” як катэгорыі навуковага падыходу. Гл. таксама: У. Конан. Культура // *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі* (*далей — ЭГБ*), 1997. Т. 4.
[Вярнуцца да тэксту]

3 У БСЭ (1973 г.) *нацыя* вызначаецца як *“гістарычная супольнасць людзей, якая характарызуецца ўстойлівымі эканамічнымі і тэрытарыяльнымі сувязямі, агульнасцю мовы і асаблівасцей псіхічнага складу, што праяўляецца ў спецыфічных рысах культуры”*. Гэтая энцыклапедычная фармулёўка збольшага паўтарае аксіёмы сталінскага азначэння нацыі. Праз 20 год ЭГБ вызначыць беларускую нацыю як *“вышэйшую ступень самаарганізацыі беларускага этнасу”* (аўтар артыкулу — Павал Церашковіч). У тым жа годзе энцыклапедыя “Археалогія і нумізматыка Беларусі” прапанавала сінкрэтычнае вызначэнне на падмурку сталінскай дэфініцыі нацыі і тэорыі этнасу. Яна вылучае *этнас* як *“этнічную супольнасць, устойлівую еднасць людзей, якая склалася гістарычна на пэўнай абмежаванай тэрыторыі”*. Род, племя, народнасць і нацыя з’яўляюцца сінонімамі этнасу. Акрамя мовы, галоўнымі вызначальнымі фактарамі этнасу, паводле аўтарскай думкі, ёсць наяўнасць падобных традыцый, побыту, культуры, псіхічнага складу, уяўлення пра супольнасць гістарычнага лёсу, разумення свайго месца ў свеце, нацыянальнай (племянной, народнай) свядомасці, супольнага генафонду і экалогіі (аўтар — Уладзімер Ісаенка). [Вярнуцца]

4 У ЭГБ (1997 г.) *культуралогія* (аўтар артыкулу — Уладзімер Конан) трактуецца як *“навука пра сутнасць і тыпы культуры”*, яе сацыяльныя функцыі і заканамернасці гістарычнага развіцця, але таксама пра *“ролю культуры ў стабілізацыі* этнасу, нацыі, *грамадства”*. (Апошні тэзіс належыць не энцыклапедычнаму аўтару, а прадстаўнікам пазітывісцкай школы, якіх сп. Конан пералічвае побач з прадстаўнікамі іншых школ — антрапалагічнай, гістарычнага матэрыялізму і г. д. — **Перакл.**). [Вярнуцца]

12 Тэрмін “народнасць” двухсэнсоўны з прычыны разнастайнасці сітуацый яго выкарыстання ажно пачынаючы з XIX ст. ...Слова “народ” таксама вядомае сваёй двухсэнсоўнасцю: у розных сітуацыях яно можа абазначаць і нацыю, і натоўп. Аднак савецкая этналогія дадае яму шматсэнсоўнасці, калі засноўвае этымалогію “народу” хутчэй на грэцкім тэрміне “*ethnos*”, чым на паняцці “*demos*”. Гэты семантычны перанос таксама служыў падтрымкай для беларускіх нацыяналістаў, якія вызначалі свой народ як цэласнасць, сфармаваную па-за межамі дзяржавы і здольную вызваліцца ад уздзеяння ейных законаў. Гэтак ставілася пад сумнеў легітымнасць савецкай улады ў Беларусі. [Вярнуцца]

18 Эстэтыка ахвярнасці, прынятая апазіцыяй, мела дачыненне як да выкрыцця савецкай сістэмы, так і да чарнобыльскай тэмы. Апазіцыянеры гаварылі, што краіну накрыла чорнае ліха, моташлівы туман, здольны забрудзіць душы. Нават рэжым А. Лукашэнкі быў ацэнены як “насланнё”, “чорная навала”. Яго ўсталяванне нібыта даказвала, што сілы зла адолелі сілы дабра. У гэтым кантэксце цэлае пакаленне творцаў, часта звязаных з нацыяналістычнай апазіцыяй, узняло эстэтыку ахвярнасці як нацыянальны сцяг, ствараючы вобразы нячысцікаў, мутантаў, карацей кажучы — сучасныя карцінкі пекла. У 1996 г. праваслаўны сабор у Менску быў размаляваны перагорнутымі чорнымі крыжамі, і прэса жывілася “справай сатаністаў” на працягу вясны і часткова лета. [Вярнуцца]

22 У гэтым — уся двухсэнсоўнасць інтэрпрэтацый “культуры” ва ўмовах аўтарытарнага рэжыму. Пачынаючы ад 1997 г., галоўным лозунгам на афіцыйным культурным полі ў Менску стала: “*Нельга блытаць культуру з палітыкай”*. Але ж вядома, што ў аўтарытарным кантэксце трэба зусім нямнога, каб

мастацкі твор набыў палітычны сэнс і быў успрыняты ўладамі (а таксама й іншымі адрасатамі, часам незалежна ад першапачатковай задумкі аўтара) як падрыўны акт альбо акцыя супраціву. Такім чынам, культурныя факты таксама ацэньваюцца ў залежнасці ад кантэксту, створанага інтэнсіўнасцю палітычнага ціску і ступенню, у якой абмяжоўваецца свабода самавыяўлення. Здараюцца сітуацыі, калі творца, ведаючы, што людзі трапляюць за краты з-за сваіх палітычных перакананняў, зацікаўлены ў падтрымцы пануючага дыскурсу, што размяжоўвае “культуру” й “палітыку”, каб не адрывацца надта ад эстэтычных кодаў сучаснасці. Ён спадзяецца знайсці “трэці шлях”, адстойваючы сваю апалітычнасць. Але трэцяга шляху няма, бо апалітычная пазіцыя таксама можа быць скарыстаная ўладамі, і нават лягчэй, чым якая іншая. Адной з характарыстык дыктатуры якраз і з’яўляецца тое, што пры ёй у пэўны момант кожнаму мусова заняць пэўную пазіцыю. [Вярнуцца]

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]

№ 4 (18) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя:
analityka@yahoo.com
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: **09-10-2001**
[image]

Віржынія Шыманец

Аўтарытарныя культуры

Вывучэнне культурнага поля такой краіны, як Беларусь, — няпростая задача. Яна ўскладняецца тым, што на Захадзе існуе бадай гэтулькі ж дэфініцый паняцця “культура”, дысцыплін у гуманітарных навуках. Так, антрапалогія прапануе нам шэраг апісальных вызначэнняў, сярод якіх найбольш вядомае належыць Эдварду Тайлару (1871 г.). Паводле Тайлара, культура ёсць *“складанай цэласнасцю, якая ахоплівае веды, вераванні, мастацтва, права, мараль, звычаі і ўсякія іншыя ўменні і навыкі, засвоеныя чалавекам як членам грамадства”*. Гэтае старое азначэнне было дапоўненае іншымі, гістарычнымі (дзе культура паўстае ў якасці лагічнага цэлага, што ёсць вынікам працэсу “сацыяльнай спадчыннасці” і перадачы вартасцей з пакалення ў пакаленне), нарматыўнымі (дзе культура альбо выяўляе лад жыцця, супольны для індывідаў, якія жывуць у нейкім грамадстве, альбо з’яўляецца сукупнасцю правілаў і ідэалаў, зададзеных дзеля працягвання працэсу сацыяльнага ўзаемадзеяння), структурнымі (культура — гістарычна сфармаваная сістэма эксплiцытных або імпліцытных

ВІРЖЫНІЯ ШЫМАНЕЦ
доктарка ўнівэрсытэту Парыж III, аўтарка дысэртацыі, прысьвечанай беларускаму тэатру першых дзесяцігодзьдзяў XX стагодзьдзя. У суаўтарстве з Аляксандрай Гужон напісала кнігу *“Parlons biélorussien, Langue et culture”* (l’Harmattan, 1997). Укладальніца зборніка *“Chroniques sur la Biélorussie contemporaine”* (l’Harmattan, 2001), на

мадэляў, якую прымае ўся група альбо яе частка), псіхалагічнымі (культура — засвоены спосаб вырашэння праблемаў), семіятычнымі (паводле Кліфарда Гірца, культура — гэта інтэрпрэтацыйная навука ў пошуку значэнняў). Да гэтага спісу трэба яшчэ далучыць сучасную “эканамічную” дэфініцыю, што зводзіць паняцце культуры да сектара індустрыяльнае вытворчасці “культурных здабыткаў” з мэтай продаж. Зазначу таксама, што “культуру” супастаўляюць з “цывілізацыяй”, набліжаючы гэтыя паняцці або разводзячы іх.

...Геаграфічнае і нацыянальнае вымярэнне слова “культура” ў сінтагме “беларуская культура” — зусім не адзінае, што стварае праблему дэфініцыі.

...Трэба таксама зразумець, чым было паняцце культуры ў краіне з аўтарытарным рэжымам, які часткова апраўдвае насілле культурнымі традыцыямі[1]. Мы ведаем, што аўтарытарныя лідэры ў сваіх дыскурсах зацікаўленыя вызначаць культуру як застылую, нерухомую сущэльнасць, якая папярэднічае палітыцы і палітычным метадам прымусу. Ацэнкавы багаж дэфініцый мусіць быць параўнаны з дэфініцыямі, што пануюць у Беларусі[2], бо паняцце “культура” выбудавалася тут разам з паняццем “нацыя” і ўпісана ў своеасаблівы працэс дзяржаўнай пабудовы[3]. Заўважым, што ў сучасны “Беларускі” ёсць тэндэнцыя ўспрымаць культуру як гістарычны феномен, які мае этнічныя карані (гэта, напрыклад, культурадэтэрмінізм, гледжання)[4]. Як вынік, прымардыялісцкія тлумачэнні “культуры” і “нацыі” робяцца чымсь самавідавочнымі, а аўтары ўнікаюць узважаных дэбатаў пра аб’ектыўнасць паняццяў.

[1] **Гэтая** **кампанія**, якая **ахрысціла** **сучасны** **беларускі** **народ** **“крывічамі”**, **ідэалагічна** **абгрунтавала** **гістарычна** **абавязковае** **супрацьпастаўленне** **“культуры”** **і** **“дзікунства”**.

[2] **Гэта** **стаўленне** **характэрна** **не** **толькі** **для** **беларускіх** **афіцыйных** **колаў**, **але** **і** **для** **пераважнай** **большасці** **беларускіх** **інтэлектуалаў**.

[3] **Гэта** **ўспрыманне** **культуры** **як** **“нацыянальнай”** **з’яўляецца** **адным** **з** **самых** **трывалых** **стэрэатыпаў** **беларускага** **грамадства**.

[4] Вэнсан Дзюбуа лічыць, што ў сучасных дзяржавах стварэнне культуры можа быць разгледжана як *“катэгорыя дзяржаўнага ўмяшання”*. Ён слушна падкрэслівае, што паняцце культуры

ёсць перадусім заходняй катэгорыяй. Яе паўстанне гістарычна звязанае з краінамі, што ішлі па шляху індустрыялізацыі. У гэтых краінах артэфакты часцей а часцей выкарыстоўваліся для “хаджэння ў народ” або ў якасці інструментаў мабілізацыі сацыяльных груп з мэтай стварэння “альтэрнатывы традыцыйным формам палітычнага прадстаўніцтва”. У Беларусі культурніцкі аргументар ніколі не быў развіты настолькі, каб пахіснуць афіцыйныя дзяржаўныя структуры альбо аўтарытарныя асновы рэжымаў, устаноўленых палітычным кіраўніцтвам. Напрыклад, з канца XIX ст. абаронцы “рэвалюцыйнага” ўжывання паняцця “беларуская культура” супрацьстаялі тым, хто рабіў з культуры сродак падтрымкі дынастычнага парадку. Гэта, дарэчы, не азначае, што ўсе адэпты культурных змяненняў падзялялі дэмакратычныя погляды, хоць і былі рэвалюцыянерамі.

Вэнсан Дзюбуа паказвае таксама, што паняцце “культуры як праблемы” спачатку зыходзіла з кола мастакоў і інтэлектуалаў, апазіцыйных дзяржаве. Аднак культура, стаўкай якой зьяўляецца ўлада, інстытуцыялізавалася як дзяржаўная катэгорыя ў наш час, хоць некаторыя прынцыпы культурнай цэнтралізацыі былі вынайдзеныя абсалютнымі манархамі. Такім чынам, калі весці размову аб рынкавай эканоміцы, рынак культурных дасягненняў і артэфактаў, гэтаксама як механізмы іх адбору і ацэнкі, сёння *“неаддзельныя ад дзяржаўнага ўмяшання, нават абумоўленыя ім”*. Апошні сказ, відавочна, пасуе да рэчаіснасці савецкай Беларусі, дзе ўсё культурнае поле лічылася менавіта дзяржаўнай катэгорыяй. Культура мусіла валодаць дакладна закадаванымі *“нацыянальнымі характарыстыкамі”*, што адпавядалі б савецкай сістэме вартасцяў. У гэтым сэнсе можна зазначыць, што кожны афіцыйны аб’ект культуры, званы нацыянальным, удзельнічаў нейкім чынам у савецкай палітычнай эстэтыцы.

Ступень інстытуцыялізацыі культуры ў якасці дзяржаўнай катэгорыі адрозніваецца ў розных краінах. Усё ж тэзіс Вэнсана Дзюбуа: *“Шматзначнасць слова “культура” дазваляе забыцца на праблему яго выкарыстання для абазначэння пэўнай палітыкі”* — дае магчымасць па-новаму разгледзець гэтае паняцце ў дачыненні да Беларусі. Адразу ж заўважым, што ад часу краху СССР і абвяшчэння незалежнасці ў 1991 г. адной з галоўных задач Беларусі была стабілізацыя дзяржаўных структур.

Савецкі Саюз кожнаму быў яшчэ памятны. У Беларусі сутыкнуліся разнапланавыя канцэпцыі культуры, якія, незалежна ад іх тэарэтычнага фундаменту, усе былі шчыльна звязаныя з думкамі аб дзяржаўнасці. Нават той, хто спрабаваў пазбегчы гэтага, сваім дыскурсам аб культуры ўсё адно ўпісваўся ў пэўныя палітычныя рамкі. Па-другое: калі мы паглядзім на гісторыю Беларусі (ці, прынамсі, тэрыторыі, што сёння завецца Беларусяй), мы ўбачым, што культурніцкі аргументар тут заўжды скарыстоўваўся і для дзяржаўнага прымусу, і для радыкальнага супраціву рэпрэсіям з боку ўладаў (Alexandra Goujon. *Language, Nationalism and Populism in Belarus)*. Таму гаворка мусіць пайсці пра спосабы, якімі могуць быць “абкультураныя” ў апалітычных тэрмінах пераважна палітычныя праблемы; варта зразумець, якім чынам паняцце культуры ў Беларусі дазволіла ўмацаваць аўтарытарныя практыкі. Гэтыя практыкі можна зразумець, толькі спасцігнуўшы, як адбывалася палітызацыя паняцця культуры.

Негатыўная культура

Адмоўнае вымярэнне паняцця “беларуская культура” выпрацоўвалася паступова, пачынаючы з XIX стагоддзя. Яно зведала разнастайныя семантычныя хістанні. З’ява тлумачыцца часткова тым, што паняцці “мова”, “нацыянальнасць”, “рэлігія”, а цяпер і “ідэнтычнасць” паступова блыталіся з паняццем “культура”. Блытаніна спрычынілася да з’яўлення шэрагу стэрэатыпаў, што сёння здаюцца неаспрэчнымі ісцінамі як у Беларусі, так і за яе межамі. Першы з гэтых стэрэатыпаў, пра які я яшчэ буду гаварыць, тычыцца ідэнтычнасці беларусаў. Некаторыя ўважаюць, што яна вызначаная. Яе блытаюць з культурай і часта выкарыстоўваюць у аналітычных даследаваннях, лічачы яе пераменнай велічынёй, прыватнай ці працэсу дзяржаўнага будаўніцтва.

Пазітыўнае разуменне паняцця “беларуская сялянская культура”, уласцівае народнікам XIX стагоддзя, цяпер ужо не згадваецца. Яго адкінулі часткова з-за тых вынікаў, якія дадала “нацыянальная палітыка”, што вялася ў імперскай Расіі, а потым у СССР. Вось толькі адзін прыклад з лінгвістычнай сферы. У імперыі паступова ўводзілася расійская мова як “цывілізаваная”, яна рабілася мовай улады (рэлігійнай і

5. Гэтая канцэпцыя паходзіць, у прыватнасці, з інтэрпрэтацыі дарэвіцкага эпалюцыянізму, заснаванай на ідэі міжрасавага змагання.

палітычнай). І ў СССР ідэя, што культуры нераўназначныя, што існуе іерархія культур, дазволіла замацаваць за расійскай мовай статус свайго роду “дыпламатычнай” — мовы “міжнацыянальных зносінаў”, нясучае бэлькі савецкай ідэалогіі[5]. Тэзіс аб існаванні якаснай іерархіі паміж дзвюма “складанымі цэласнасцямі традыцый і вартасцяў”, што лічыліся застылымі і нерухомымі ў гэтай зоне, — расійскай культурай, вечна “вышэйшай”, і беларускай, хутчэй архаічнай вытворнай ад першай — урэшце ўвайшоў у свядомасць “простага чалавека”. Нават і сёння ўяўленне пра “мужыцкасць” беларускай мовы ў параўнанні з расійскай, неад’емным элементам і рухавіком прагрэсу, нязменна служыць аргументам для палітычных маніпуляцый. Вось жа, імперскі і савецкі расклад сілаў варта было б вывучыць у святле ўплыву гэтых дэтэрмінісцкіх аргументаў на захаванне аўтарытарных рэжымаў. Можна таксама задумацца: якім чынам “нявызначанасць”, іерархізацыя, што дасягае ўзроўню “складанай цэласнасці” (ейны змест застаецца, аднак, надта размытым), **робіць** дапушчальнай сітуацыю маналагізму ў палітыцы. **(я да гэтага**
У савецкай Беларусі культурнае будаўніцтва аба**вяралася** таксама на паняцце “класавай культуры”. З тагоп**ункту** “беларуская культура” функцыянуе пад уплывам **“найнасці** значэнняў, традыцый і вартасцяў, што характэрн**ыя культур”)** сялянства. У некаторых асяродках гэта ўзмацняе**ць** канатацыю паняцця. Уся дваістасць савецкага ку**льтуралізм** дыскурсу палягала ў тым, што пагарджаны сацыя**льны** які, лічылася, канцэнтраваў усе нацыянальныя р**ысы** “беларускага народу”, атрымаў адказнасць за ў**стаўленне** Аднак, паколькі культура класу, што разглядаўся **як** “ніжэйшы”, магла быць толькі “ніжэйшай”, тым **і** прыкрыццём сацыялізуючага дыскурсу сцвярджа**ліся** непаўнавартасць беларусаў.
Такое разуменне “беларускай культуры” мела та**кім** негатыўную канатацыю для цэлай плыні беларус**кага** нацыяналізму, які ўрэшце інтэрыярызаваў канцэ**пцыю** негатыўнай беларускай культуры. Каб супрацьс**тавіцца** ідэям і вызваліцца з іх ярма, права на культурна**е** беларусаў патрабавалі тыя, хто лічыў сваю куль**туру** “сапраўднай” русіфікацыі і саветызацыі. Сялянскі свет, яшчэ ў **ХІХ ст.** разгляданы як месца стварэння “сапраўднай беларускай

ў Эпізадычная
нявызначанасць,
якая
выяўляецца
пункце
“найнасці
культур”)
дыскурсу нацыянальны
мультыкультуралізм
каранёвага
мінулым
Беларусі
Расійскай
імперыі, а
таксама ў
сваіх
адносінах з
Расіяй
Пасляваенай
надыхванне
“сапраўдных”
ХІХ ст.

культуры”, імі стаў бачыцца як свет, сапсаваны савецкай інфармацыяй. З другога боку, для гэтых нацыяналістаў стала відавочнай, што савецкая фаза беларускай гісторыі затармазіла прагрэс “нацыяналізацыі” краіны. Улічваючы, што сама ідэя нацыянальнага будаўніцтва разглядалася як знак сучаснасці, нацыяналісты знайшлі ў саветызацыі тлумачэнне адсталасці краіны і яе цяперашняга “некультурнага” стану. Сцвярджэнне, што нацыянальная ідэнтычнасць і свядомасць насельніцтва вагалася паміж беларускасцю, польскасцю[6] і расійскасцю, служыў дадатковым доказам “адсталасці” (Ihar Babkou, *Belarus: Dual modernity*), бо падкрэсліваў адсутнасць “культурнай”, адметнай сярод іншых. Беларусь не дасягнула станаўлення цалкам адасобленай ад суседніх нацый, а “беларускі народ” прапусціў найважнейшы этап свайго развіцця, які даваў яму далучыцца да “цывілізацыі”, г. зн. да мадэрнасці. Вядома ж, гэтыя тэзісы бяруць пачатак у эвалюцыянісцкіх канцэпцыях. Апошнія накладаюцца на перапляценне культурнага і палітычнага палёў[7], а таксама на тыя перадсуды, з якімі яны нібыта пакліканыя змагацца. Так ці інакш, большасць нацыяналістаў лічыла здабыццё культурнае свабоды адзінай зарукай дасягнення палітычнай свабоды. Але, памятаючы пра гіпотэзу Вэнсана Дзюбуа, льга задацца пытаннем: што ж адбываецца, калі палітычная свабода мысліцца па шаблонах негатыўных інтэрпрэтацый культуры, а апошнія ўзводзяцца ў абсалют? Якія палітычныя правы прадугледжвае гэтая схема для “бескультурных” людзей?

У часы СССР беларускае савецкае культурнае будаўніцтва адбывалася цераз інстытуцыялізацыю фальклору. Ён быў абсалютным арыенцірам, дзякуючы якому народ меў магчымасць убачыць уласную культуру на тле культур іншых савецкіх народаў. Тым не менеш, такая пабудова толькі паспрыяла станаўленню “негатыўнай канцэпцыі”. Маляваць вобраз “прэстыжнай” або “фальклорнай” нацыянальнай культуры — таксама справа палітычнай волі і выбару. Будаваць “фальклорныя” культуры, ведаючы, што іх заўжды будуць параўноўваць з адзінай здольнай прэтэндаваць на “прэстыжнасць” — даволі просты спосаб арыентаваць пачуцці прыналежнасці асобаў да пэўнай групы, гуляючы на “здаровым сэнсе”.

7. Больш падрабязна пра гэтую з’яву гл. **Andrié Pichot**. ***La société pure de Darwin à Hitler***.

Па-за межамі Беларусі некаторыя назіральнікі грунтаваліся на блытаніне паміж ідэнтычнасцю і культурай для вытлумачэньня значэння таго ці іншага палітычнага крызісу. Напрыклад, абвяшчэнне незалежнасці ў 1991 г. было інтэрпрэтаванае, галоўным чынам, як праблема ідэнтычнасці і культуры. Даследчыкі задаваліся пытаннем, якія ідэнтычнасці, ці культура, уласцівыя насельніцтву Беларусі, сталіся прычынай абрання узрушэнняў. Яны не знаходзілі тлумачэння “*гэтым беларусам*” (найбольш часта ўжываны французскі варыянт назвы якіх — *les Biélorusses* — яўна сведчыць пра “расійскасць”) і таму высоўвалі розныя аргументы, падтэкстам якіх была думка, што незалежнасць не была сур’ёзнай палітычнай альтэрнатывай для гэтай нацыі. Найбольш папулярнай версіяй стала наступная: беларусы самі не ведаюць, на якое культурнае і ідэнтычнаснае дыскурсіўнае сесці. У якасці ілюстрацыі былі прапанаваныя тры дэтэрмінісцкія тэзісы. Першы палягаў у тым, што “нацыянальная ідэнтычнасць” і “свядомасць” — гэта пераменныя, неабходныя для дзяржаўнага будаўніцтва. Таму канстатацыя іх аслабленасці ў беларусаў станавілася дадатковым доказам таго, што насельніцтва Беларусі — з нявызначанай ідэнтычнасцю, у лепшым выпадку “зрусіфікаванае” — будзе няздольнае заняцца дзяржаўным будаўніцтвам. Таму некаторыя заходнія назіральнікі сцвярджалі, што Беларусь мае відавочны інтарэс вярнуцца ў “расійскае ўлонне”.

8 V 1994 г. Аляксандр Лукашэнка быў абраны прэзідэнтам.

Паняцце “ідэнтычнасць”, што пасля абвяшчэння незалежнасці стала суадносіцца з цэльнай супольнасцю, адначасова зводзілі да пытання аб этнічным самавызначэнні насельніцтва. Але гэтае пытанне мусіла гучаць так: ці *гэтыя беларусы*, што маюць намер развівацца самастойна, з’яўляюцца дастаткова этнічна самадастатковымі, каб быць вартымі гэтай незалежнасці? У гэтым дыскурсіўным полі, дзе аслабленасць ідэнтычнасці павінна была стаць тлумачэннем усякіх нягодаў, што адбыліся ў выніку крушэння сістэмы, азначэнне паняцця “незалежнасць” засталося няясным. Чыя незалежнасць і ад каго? Незалежнасць ад расійцаў — этнічнай групы, што раней бачылася як пануючая, нават “вышэйшага гатунку”, “Богам абранай” уладарыць над іншымі народнасцямі, пазбаўленымі іншай выразнай ідэнтычнасці, апроч “прынятай” і “нязменнай”

расійскасці — г. зн. культурная незалежнасць, дасягнутая шляхам нечага накшталт біялагічнага разрыву? А выбор незалежнасць ад маналітнай палітычнай сістэмы, дыскрэдытавала сябе сваімі таталітарнымі перакананнямі, незалежнасць палітычная? Развіццё тэзісу аб ідэнтычнасці прыводзіла да таго, што савецкая ўлада ўспрымалася абумоўленая этнічнай прыналежнасцю яе кіраўнікоў, палітычная незалежнасць Беларусі, лічылася, магла забяспечаная выключна дзякуючы культурнай некаторыя, зразуметай як біялагічная розніца. Гэты падыход падмацаваць тэзісы мясцовых нацыяналістаў (дакладней замяніць “расійскасць” на “беларускасць”), ён таксама падштурхоўваў да апаражнення ад рэаліяў незалежнасці, якою не ведалі, што рабіць. Ці меркавалі даследчыкі, апроч ідэнтычнасці, беларусы маюць яшчэ й палітычныя правы? І як можа адбыцца “пераход да дэмакратыі”, калі існуюць перадсуды і стэрэатыпы культурнай нярэфлексіі, што адсоўваюць праблематыку грамадзянства і правоў на другі план?

Паколькі асаблівасцю беларусаў з’яўляецца іх дэкларуемая, даследчыкі злоўжывалі таксама мадэллю “падвоенай ідэнтычнасці”. Яе выводзілі з сітуацыі білінгвізму, якая выглядала лагічна. Гэтая мадэль негатыўным чынам мачыла ўсю сукупнасць значэнняў і вартасцяў, што, лічыцца, складаюць культуру беларусаў. Гэты падыход знаходзіў новае развіццё, калі падчас рэферэндуму 1995 г. дзве магчымасці дзвюх розных культур, між якімі кожны, лічылася, робіць выбар, ізноў атрымалі роўны статус. Гэты выбар сцвярджаў самае, што выбар свайго палітычнага лагеру. Такое прывяла да маргіналізацыі любых праектаў грамадства, заснаваных на культурнай дыскрымінацыі. Сітуацыя таксама дазволіла некаторым нацыяналістычным актывістам за рамантычны тэзіс аб Беларусі — “свеце з двума краіне, дзе асобы натуральным чынам раздвойваюцца. Тэзіс аб раздваенні праектаваўся на ўсе ўзроўні: ад шызафрэніі на ўзроўні індывідаў да ўзнікнення нябачнай мяжы паміж усходняй і заходняй Беларуссю[9].

Нацыяналістычныя колы жадалі таксама захаваць ідэю культурнага разрыву, які сімвалічна змацоўваў бы разрыў палітычны. Гэтае пачуццё павінна было супрацьстаяць

А выбор незалежнасць ад маналітнай палітычнай сістэмы, дыскрэдытавала сябе сваімі таталітарнымі перакананнямі, незалежнасць палітычная? Развіццё тэзісу аб ідэнтычнасці прыводзіла да таго, што савецкая ўлада ўспрымалася абумоўленая этнічнай прыналежнасцю яе кіраўнікоў, палітычная незалежнасць Беларусі, лічылася, магла забяспечаная выключна дзякуючы культурнай некаторыя, зразуметай як біялагічная розніца. Гэты падыход падмацаваць тэзісы мясцовых нацыяналістаў (дакладней замяніць “расійскасць” на “беларускасць”), ён таксама падштурхоўваў да апаражнення ад рэаліяў незалежнасці, якою не ведалі, што рабіць. Ці меркавалі даследчыкі, апроч ідэнтычнасці, беларусы маюць яшчэ й палітычныя правы? І як можа адбыцца “пераход да дэмакратыі”, калі існуюць перадсуды і стэрэатыпы культурнай нярэфлексіі, што адсоўваюць праблематыку грамадзянства і правоў на другі план?

Паколькі асаблівасцю беларусаў з’яўляецца іх дэкларуемая, даследчыкі злоўжывалі таксама мадэллю “падвоенай ідэнтычнасці”. Яе выводзілі з сітуацыі білінгвізму, якая выглядала лагічна. Гэтая мадэль негатыўным чынам мачыла ўсю сукупнасць значэнняў і вартасцяў, што, лічыцца, складаюць культуру беларусаў. Гэты падыход знаходзіў новае развіццё, калі падчас рэферэндуму 1995 г. дзве магчымасці дзвюх розных культур, між якімі кожны, лічылася, робіць выбар, ізноў атрымалі роўны статус. Гэты выбар сцвярджаў самае, што выбар свайго палітычнага лагеру. Такое прывяла да маргіналізацыі любых праектаў грамадства, заснаваных на культурнай дыскрымінацыі. Сітуацыя таксама дазволіла некаторым нацыяналістычным актывістам за рамантычны тэзіс аб Беларусі — “свеце з двума краіне, дзе асобы натуральным чынам раздвойваюцца. Тэзіс аб раздваенні праектаваўся на ўсе ўзроўні: ад шызафрэніі на ўзроўні індывідаў да ўзнікнення нябачнай мяжы паміж усходняй і заходняй Беларуссю[9].

Нацыяналістычныя колы жадалі таксама захаваць ідэю культурнага разрыву, які сімвалічна змацоўваў бы разрыў палітычны. Гэтае пачуццё павінна было супрацьстаяць

9 Гл. Андрыян Меленік. *Беларуская ідэя і тэрыфрадытызм*

дыскурсу новай прэзідэнцкай улады, якая якраз нацыі ўвала мінімізаваць разрыў шляхам рэферэндуму па моўным пытанні і абвяшчэння палітыкі інтэграцыі. Пазней іншыя інтэлектуалы прапанавалі метафару іншую, чым “двухаблічны Янус”, а менавіта, вобраз “нацыі-гермафрадыта”. Тым самым яны імкнуліся патлумачыць нежаданне большасці насельніцтва браць удзел у рэферэндумным канфлікце. Рабілася гэта, што зыходзячы з тэзісу аб адсутнасці вызначанай ідэнтычнасці, ён тэрмінах арганіцызму[10].

У палітычным і інтэлектуальным асяроддзі абвінавачванне ў здрадзе праз падваенне культурнае арыентацыі было заснаванае на ідэі, што лінгвістычнае раздваенне ёсць прыкметай раздваення культурнага. Некаторыя абаронцы монакультуралізму проста-такі апантаныя такім абвінавачваннем. Аднак сучасная антрапалогія кажа, што *“індывід-удзельнік некалькіх культур прадукуе з рэзультатаў матэрыялаў сваю ўласную ўнікальную ідэнтычнасць, робячы арыгінальны сінтэз. Вынікам сінтэзу з’яўляецца не падвоеная ідэнтычнасць — калі казаць пра спалучэнне дзвюх ідэнтычнасцяў у адной асобе — а ідэнтычнасць сінкрэтычная (…). Нават калі ідэнтычнасць мае шэраг вымярэнняў, яна не губляе сваёй еднасці”* (Denys Cuche. *La notion de culture dans les sciences sociales*). Трэба яшчэ дадаць, што *“адрозненне ў ідэнтычнасці не з’яўляецца простым вынікам культурнага адрознення”*, гэтаксама як *“прыналежнасць да нейкай культуры ня значыць аўтаматычнага валодання нейкай адпаведнай ідэнтычнасцю”*.

Насілле, якое праявілася ў палітычнай сферы, абапіралася на блытаніну паміж гэтымі канцэптамі. Гэтая блытаніна ў некаторай ступені палегчыла правядзенне аўтарытарнай палітыкі ў краіне, дзе навакольнае бязладдзе павялічвалася яшчэ й з-за пачуцця ўсеагульнай страты сэнсу. Культура стала праблемай, гэтак падкрэсліваючы наяўнасць палітычнага крызісу. Але пытанні, як, чаму і хто ў тым ці іншым кантэксце прадукаваў, падтрымліваў або ставіў пад сумнеў тую ці іншую ідэнтычнасць, не былі насамрэч пастаўленыя.

Другі дэтэрмінісцкі тэзіс нагадвае аб тэорыі “сутыкнення цывілізацый”, распрацаванай Сэмюэлем П. Гантынгтанам. Аднак да Беларусі гэтую тэорыю можна стасаваць з дзвюх супрацьлеглых пазіцый. Адны лічаць, што Беларусь, знаходзячыся паміж Расіяй і Польшчай, ляжыць на

нацыі // Фрагмэнты. **Менск, № 1—2 (Лета 1999). Разважанні Мельніцкага пачынаюцца з таго, што ён легітымізуе эсэнцыялісцкія і прыхардыялісцкія абароны на грамадства і свет (“арганічная тэорыя грамадства”), бо яны, нібыта, найменш падабаюцца сатыялістам.**

цывілізацыйнай мяжы Захаду і Ўсходу. Памежнае становішча тлумачыць, чаму Беларусь не дае рады ясна вызначыцца, чым ёсць яе культура як “складаная цэласнасць традыцый і вартасцяў”. Маючы пэўнае мінулае, якое лучыць яе з суседзямі, і пэўнае геаграфічнае становішча, Беларусь павінна нарэшце выбраць свой *“лагер”* (Б. Дрвэскі). Другія, наадварот, мяркуюць, што палажэнне Беларусі — *“на скрыжаванні”* дзвюх вялікіх цывілізацый — ёсць прычынай багацця яе сістэмы традыцый і вартасцяў — сістэмы досыць арыгінальнай, каб легітымізаваць яе палітычную незалежнасць ад суседзяў (Я. Запруднік).
Трэці дэтэрмінісцкі тэзіс грунтуецца на блытаніне паміж паняццямі “культура” (складаная цэласнасць традыцый і вартасцяў), “нацыянальнасць” і “веравызнанне”. Для адных той факт, што Беларусь ёсць збольшага краінай праваслаўных вернікаў, даказвае, што беларусы мусяць лічыць сябе “расійцамі”. Для другіх Беларусь мае характарыстыкі заходняга свету, бо на яе ўплываў рымскі каталіцызм у часы уніі паміж Рэччу Паспалітай і Вялікім Княствам Літоўскім, і гэта павінна, хутчэй, падштурхнуць яе да разрыву з Усходам. Зрэшты, шматканфесійны досвед гэтага рэгіёну дазваляе сказаць, што рэлігійнае веравызнанне, як і культура, нацыянальнасць, не з’яўляецца нязменнай дадзенасцю, якая перадаецца ад пакалення да пакалення або генетычна. Акрамя таго, ніводнае з азначэнняў “нацыянальнасці” і “культуры” не звязанае з дэтэрмінізмам рэлігійнага плану. На землях, што цяпер завуцца Беларусяй, праваслаўе дамінавала не заўжды і, можа, некалі ізноў перастане дамінаваць. Калі цяпер паміж беларускіх вернікаў большасць складаюць праваслаўныя, гэта не значыць, што яны складаюць большасць ад усіх насельнікаў Беларусі. Нельга адмаўляць, што рэлігійная прыналежнасць членаў грамадства можа аказваць сур’ёзнае ўздзеянне на іхнюю сістэму вартасцяў, аднак тую прыналежнасць, як справядліва зазначыў Бэртран Бадзі, нельга рабіць адказнай за ўсю культуру. Гэтак мы паставілі б іншыя канфесіі, а таксама атэістычнае насельніцтва, па-за межы таго, што называецца культурай. Гэткі пункт гледжання апраўдваў бы няроўнасць як прынцып добрае ўлады і не ўлічваў бы адносінаў, што існуюць паміж палітычнай і рэлігійнай сферамі. Напрыклад, Аляксандр Лукашэнка ахвотна прыцягнуў праваслаўную рэлігію на службу сваім аўтарытарным памкненням: ён выкарыстоўвае яе, каб

“абкультурыць” ідэю палітычнай інтэграцыі Беларусі і Расіі, бо праваслаўе разглядаецца як традыцыя, што легітымізуе інтэграцыю. Такім чынам, тэзіс аб “цывілізацыйным канфлікце” аказваецца дарэчы, каб апраўдаць інтэграцыю. Апошняя прадстаўляецца ўладамі не ў якасці рацыянальнай палітычнай стратэгіі, а, хутчэй, як наканаванне.

Перагляд паняцця
“нацыянальная культура”
Пра культуру нацыяналізму
1980-я — гады перабудовы і разгортвання нацыяналістычных рухаў ва ўсім Савецкім Саюзе. Адпаведна, у гэты перыяд рух за перагляд ранейшае “нацыянальна-культурнае палітыкі” дасягнуў сваёй кульмінацыі. У Беларусі ён мог абаперціся і на ленінскі лозунг аб праве нацыянальнасцяў на самавызначэнне і абарону ад “великорусского шовинизма”, а таксама на ленінскую дэфініцыю “дэмакратызму”, і на новае прачытанне разважанняў Сталіна аб нацыі (1913 г.) (гэткі сінкрэтызм мы знаходзім, у прыватнасці, у кнізе Анатоля Сабалеўскага “Асоба мастака”). Гэты рух праявіўся таксама ў палітыцы фармавання культурных цэнтраў у краіне: у Беларусі галоўным культурным цэнтрам адназначна станавіўся Менск, паступова набіраючы вагу ў якасці культурнай сталіцы. Рух за перагляд ранейшай палітыкі быў высілкам не толькі нацыяналістаў, адсунутых на задворкі грамадскага жыцця: да пэўнай ступені ён падтрымліваўся ўладамі. Перагляд “нацыянальных” рысаў беларускага народу адбываўся таксама пад уплывам савецкай этналогіі і таго, якім чынам яна, пачынаючы з 1960-х гг., вывучала “народную культуру”, якая разумелася як сістэма традыцый і спецыфічных вартасцяў, уласцівых “народам”. Цудоўны прыклад такога перагляду мы знаходзім у дысертацыі Зянона Пазняка, названай “Праблемы станаўлення і развіцця прафесійнага тэатру ў пачатку XX стагоддзя (1900—1917 гг.)”[11]. Будучы нацыяналістам, З. Пазняк аспрэчвае савецкую гістарыяграфію як у факталагічным, так і ў інтэрпрэтацыйным плане. Але ж яго дысертацыя часам, выглядае, толькі радыкалізуе канцэпцыі, якімі кіраваліся савецкія гісторыкі ў сваіх пошуках каранёў, на якіх вырасла беларуская культура.

[11] Праблемы становления и развития белорусского профессионального театра начала XX в. (1900—1917). Ленінград, 1981. Аўтар абараніў дысертацыю на расійскай мове ў Ленінградзе, бо яму не далі абараніцца па-беларуску ў Менску.

Напрыклад, паняцці “падпольнай дзейнасці”, “нелегальнасці”, “забароненасці”, “апазіцыйнасці”, палітычнае ролі тэатру ў якасці аднаго са сродкаў прапаганды здаюцца крыніцамі асацыятыўнай дынамікі, што вывела беларускі тэатр на шлях “прафесіяналізацыі”. Апісанне працэсу “прафесіяналізацыі беларускай культуры” падаецца цалкам скалькаваным з савецкай гістарычнай мадэлі. Савецкія гісторыкі карысталіся ёю, каб апавесці пра прафесіяналізацыю бальшавіцкай партыі на пачатку стагоддзя (партыя спярша была падпольнай, нелегальнай і г. д.). Аднак З. Пазняк хоча давесці, што з’яўленне фактаў беларускай культуры, у тым ліку тэатральнай, было плёнам працы не толькі малаадукаваных сялянаў, але і прафесіяналаў. Таму ён узводзіць “піянераў” на Парнас. З ягонага клопату пра ўзвядзенне “беларускай культуры” ў ранг культураў сур’ёзных і высокіх паўстала даследаванне таго, якім чынам тая культура была ўніфармізаваная шляхам выпрацоўкі “прафесійнай беларускай эстэтыкі”. Такім чынам, забароненасць і падпольнасць, паводле З. Пазняка, паўплывалі на фармаванне самабытнасці беларускага тэатру як тэатру на шляху “нацыянальнага”. У той час як украінскамоўныя і расійскамоўныя трупы ўжо набылі прызнанне пры канцы XIX ст. (іх турнэ па краіне ўжо таму доказам), беларускамоўныя калектывы перайшлі да легальнага існавання толькі ў 1910 г., прычым нацыянальнае пытанне было стрыжнявым у справе культурнае самаідэнтыфікацыі. Аўтар спрабуе таксама вызначыць тое, што складае самабытнасць беларускага тэатру — “дэмакратызм” і “народнасць”[12]. Дэмакратычнасць у такім разе — гэта пытанне фармальнае эстэтыкі? Паводле З. Пазняка, эстэтыка заўжды “канкрэтна-гістарычная” і гэта тэрмін дваісты, што мае і нацыянальнае, і сацыяльнае вымярэнне, і які не можа быць зразуметы па-за яго сувяззю з фальклорам[13]. Натхняючыся азначэннем “народнага эстэтычнага ідэалу”, сфармуляваным у 1960-я фалькларыстам і этнолагам В. Я. Гусевым, у сваёй дысертацыі аўтар лічыць, што зыходзіў з інварыянту, існаванне якога лічылася “бясспрэчным, а менавіта “супольнага сэнсу”[14]. Для З. Пазняка праява “народнага эстэтычнага ідэалу” адносна гамагеннага, сведчыць аб дэмакратызме тэндэнцыі, імкненне да дэмакратызму залежыць ад працэсу “ўзбагачэння” “беларускага народу”. Апошняя катэгорыя мае на ўвазе

[12] [зацем]

[13] Аквотныя праслыць эвалюцыю ўзаемаадносінаў тэорыю фальклору СССР і могуць дасягнуць артыкулы “Фальклор” (Гусев В. Е.) і “Белорусский фольклор” (Кабашников К. П.); *Восточнославянский фольклор: Словарь научных терминов.* Мінск: Навука

унутрыгрупавую палітычную, юрыдычную, грамадскую і культурную салідарнасць, як біялагічнае і культурнае яднанне, нібыта панад усялякімі палітычнымі меркаваннямі. Можна зразумець, што гэткі тып аргументацыі скіраваны на мабілізацыю супраць назвай “беларускі народ” на палітычныя змены, непрыемныя нацыяналістам.

Для З. Пазняка яшчэ адным доказам наяўнасці дэмакратызму з’яўляецца той факт, што інтэлігенцыя і мастакі імкнуцца да беларускай мовы. Адкрыўшы ёй шлях, творцы ўзнялі (а значыць і нацыянальным) героем, узорным прадстаўніком “беларускага народу”. Такім чынам, мова народу, дагэтуль прыніжаная і названая “дэмакратычнай”, а дзяржаўная, расійская — прыладай рэпрэсій і таталітарнай ідэалогіі. Але тут аказваецца, што беларускі народ прэтэндуе хутчэй на культурныя, чым на палітычныя правы, грунтуючыся на аб’ектыўным “праве народу развіваць сваю нацыянальную культуру”. Таму “дэмакратызм” хутчэй абмяжоўвае дэмакратычныя памкненні беларускага народу пытаннем культурнай свабоды — адзінай зарукі палітычнай свабоды. Вось жа, калі паняцці “права на культуру”, “культурнай свабоды” маюць перадумовай існаванне мноства культур, сярод якіх мажліва вылучыць сваю[15], паняцце “культурная свабода” таксама можа быць антытэзай паняццю “культурны плюралізм”. Сапраўды, праект грамадства, у якім усе “сапраўдных” беларусаў патрабуецца адно салідарнае, у захаванні “прыроды” свайго народу, прадугледжвае аднолькавасць індывідуальных поглядаў. Людзі ў такім выпадку мусяць рэгулярна прысягаць на вернасць “нацыянальнай ідэі”. Што да асобаў, якія пераследуюць іншыя інтарэсы, іх рызыкуюць апынуцца ў лагеры здраднікаў гэтай ідэі. Перш за ўсяго, гэтая канцэпцыя робіць з Беларусі прадмет экспарту “Беларусь” — гэта заўжды будучыня; яна не абавязкова канкрэтнага грамадства, дзе ідэйныя дэбаты маюць на мэце да паляпшэння ўсіхнага жыцця тут і цяпер. Мы можам нарэшце запытацца: у якой ступені патрабаванні вольнага развіцця беларускай культуры, прадвызначанай этнічнымі крытэрамі, натхняюцца наступствамі савецкай нацыянальнай палітыкі, калі пары тэатраў на “мясцовай” мове, жменькі выданняў і фальклярызаванай культуры было досыць для стварэння ілюзіі

ідэалогіка, 1993.

[14] **Вёрай**
знаваць
ценафобыду,
што біялагічна

звязанае
індывідаў,
якія належаць
да адной
народнасці
маюць
дамінаванне
да
развіцця —
прыладай
тэорыі *этнасу*.
Да яе мы яшчэ
звернемся.

[15] **Можна**
сцвярджаць
Эрнэста
Геленера, які
крытыкуе
“Нацыі
і нацыяналізм”
за
супрацьпаставу
культуралізм
можна быць
скажыстаны ў
набыццявістычных
мэтах.

“дэмакратызму”?

Пры канцы 1980-х два феномены паспрыялі радыкалізацыі гэткіх поглядаў. Агонія СССР дазволіла звярнуцца да тэмы сталінскіх рэпрэсій. Выбух на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі, у выніку якога радыёактыўныя ападкі забрудзілі 70 % тэрыторыі Беларусі[16], выклікаў беспрэцэдэнтны ўздым папулярнасці ідэй аб “пагрозе для генафонду” насельніцтва гэтых тэрыторый. Размовы аб генацыдзе беларусаў за Сталіным, гэтаксама як апакаліптычныя разважанні аб генетычных змяненнях, паўплывалі на нацыяналістычны дыскурс пра культуру. Народ і культура прадстаўляліся ў іх як ахвяры прадуманага планамернага вынішчэння (Alexandra Goujon. *Genocide: A Rallying Cry in Belarus. A Rhetoric Analysis of Some Belarusian Nationalist Texts*). Гэткі ракурс дазваляў гаварыць пра існаванне этнічнай супольнасці беларусаў і змякчаць пачуццё віны за насілле, якое адбывалася ў гэтай супольнасці. Аб кім-небудзь за гвалт ускладалася на дзяржаву, якая разглядалася як “чужынская”[17]. Развіваючы гэтыя дыскурсы, іх аўтары ў падкрэсліваюць, што праблема культурнага і біялагічнага захавання беларусаў стала на працягу адносна кароткага перыяду галоўнай для грамадства. Яны заклікаюць да культурных зменаў, якія могуць быць рэалізаваны мірным, валюнтарысцкім шляхам, — адзінай гарантыі вяртання, як міфічных “вытокаў”. У межах гэтага міфу беларусы, будучы культурна і біялагічна адасобленыя ад свойх каранёў. Мы абмяжуемся адным прыкладам ідэалізацыі мінулага. 1920-я былі апісаныя нацыяналістамі як палітычна найбольш “залаты век” — з прычыны тагачаснай беларусізацыі. Тое, што перыяд беларусізацыі бачыцца сучаснымі даследчыкамі скрозь прызму пазнейшых сталінскіх рэпрэсій, і што дзеячы перыяду беларусізацыі шукалі “чыстыя” ад беларускіх традыцый”, у кантрасце з савецкім мінулым, на якім ляжыць пячатка дэградацыі, урэшце прывялі да таго, што некаторыя інтэлектуалы сталі ідэалізаваць 1920-я гады — перыяд да дыктатуры. Тое, што сфера палітыкі відавочна больш адказнасць за культуру ў 1920-я гг., магло б, здавалася, кінуць пад сумнеў слушнасць спробаў “рэабілітацыі” таго перыяду. Але сумневу не ўзнікла. Першынство нацыянальнай

[16] Аб генацыдзе беларусаў за Сталіным, гэтаксама як аб атамнага забруджвання гаварылі ў сваіх творах Ніл Гілевіч, Васіль Быкаў, Сьвятлана Алексіевіч і інш.

[17] Гэтыя ідэі ўпершыню прагучалі ў “Чарнобыльскай малітве” Сьвятланы Алексіевіч і пазней былі развіты ў яе кнізе “Чарнобыльскае забарона”.

праблематыкі засланіла той факт, што беларусізацыя (якую ставілі ў прыклад сучасным палітыкам) выбівалася з тэксту ўтварэння СССР (30 снежня 1922 г.). Не была таксама прааналізаваная ейная ключавая роля ў папулярызацыі пра бальшавіцкай улады на землях Беларусі. Беларусізацыя разглядалася хутчэй як натуральны этап “рэнацыяналізацыі” краіны і ніколі не выкрывалася як валюнтарысцкая, заснаваная на культурнай дыферэнцыяцыі і непаўторным крыніца канфліктаў (Alexandra Goujon. *Language, Nationalism and Populism in Belarus*). З пункту гледжання гэтых даследчыкаў, доўгачаканае “нацыянальнае адраджэнне”, якое прывяло да абвяшчэння незалежнасці ў 1991 г., таксама павінна прывесці да новай “беларусізацыі народу” — такой, якая апісана вышэй. Зрэшты, гэта не азначае, што высілкі адэптаў беларусізацыі былі цалкам пазбаўленыя сэнсу. Для абаронцаў гэтай стратэгіі яе поспех быў бы зарукай таго, што Беларусь стане “здаровай прасторай”, абтрасецца ад камуністычнай ідэалогіі, бадай, гарантам “паталогіі грамадства”. За выключэннем гэтага такая новая беларусізацыя выглядала хутчэй бяскрыўдным культурным праектам, чым праектам палітычным.

Тым не менеш, урадлівая глеба праекту дазваляла супрацьстаўляць савецкі “заняпад” “нацыянальнаму адраджэнню”, этнічна-кланавае адзінства — “чужынцам” дзяржаўнай пабудове, чысціню арганізму нацыі — забруджванню шляхам змяшэння. Адной з галінаў, дзе такое вымярэнне выявілася найбольш яскрава, стала лінгвістыка. Нацыяналісты выступалі за вяртанне да “тарашкевіцы”, таксама за адмаўленне ад дзвюхмоўя. Апошняе з’явілася *“метад знішчэння нацыянальнай культуры”* (Alexandra Goujon. *Le processus de formation d’une opposition politique et nationale en Biélorussie: le Front populaire biélorussien (1988—1991)*). Гл. чысціні беларускай мовы грунтавалася не толькі на адмаўленні “наркомаўкі”, але й на адмаўленні “трасянкі”, у наступства савецкай моўнай палітыкі. Трасянка — сапраўдны поспех савецкай палітыкі русіфікацыі беларускай мовы (рэформы 1933 і 1957 гг.), прычым падкрэслівалася, што ў выніку беларуска-расійскага змяшэння расійская мова часцяком дэградавала гэтак жа, як і беларуская. Першапачатковы сэнс слова “трасянка” — сумесь

ўціску, якую спрыяла стварэнне культурныя змяненні. Пра стасункі паміж нацыяналізмам і савецкай культурнай палітыкай гаварыць складана, бо ў кожнага з іх свой погляд на гэтую з’яву. Гл. Bekus, Ji-C. Attias. *La haine de soi. Difficiles identités*, Richard Rechtman.

17 У кожнага з іх свой погляд на гэтую з’яву. Гл. Bekus, Ji-C. Attias. *La haine de soi. Difficiles identités*, Richard Rechtman.

саломы, еміна для скаціны. У дачыненні да мовы “ерне-ыкр”, аднак, стала зняважлівым выразам. Феномен трасянкі ўжды аналізаваўся ў негатыўным святле. Нацыяналісты, якія хадзілі зрабіць з культурнай адрознасці беларусаў адзін з галоўных інструментаў разрыву з савецкім мінулым, упісвалі дадзены “адраджэння” ў больш амбітны праект “абцывілізоўвання” грамадства, якое, лічылі яны, дэнатуралізаваў і сапсаваў савецкі досвед. Яны спадзяваліся выкараніць негатыўныя рысы беларускага народу і асучасніць яго. Зазначым між тым, што Беларускі Народны Фронт, хоць і меў значны ўплыў на галіну культурных практык, так і не прыйшоў да ўлады. “Адраджэння” не адбылося.

Altérité suspecte et identité coupable dans la diaspora cambodgienne.

Пра культуру папулізму

Пасля свайго абрання шляхам усеагульнага галасавання ў 1994 г. прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка паступова ўсталяваў аўтарытарны рэжым. Адной з яго першых мішэняў стала нацыяналістычна настроеная інтэлігенцыя. Мы памятаем, напрыклад, “антыфашысцкую” прапагандысцкую кампанію, разгорнутую напярэдадні рэферэндуму 1995 г., калі палітычныя лагеры вызначаліся па мове. Раз беларускамоўныя прыхільнікі незалежнасці супрацоўнічалі з немцамі ў гады другой сусветнай вайны, значыць, кожнага, хто гаворыць па-беларуску, можна лічыць фашыстам. Гэткая логіка дазваляла супрацьставіць сімвал беларускай культуры — беларускую мову, прэзентаваную як мову фашызму, сімвалу савецкай культуры, прэзентаванаму як фактар народнага яднання, — расійскай мове. Прапаганда выкарыстала прыём нацыяналістаў, толькі памяняўшы знакі: дэмакраты называлі беларускую мову мовай дэмакратыі, а расійскую — ганебнай мовай прымусу. Тым часам першы прэзідэнт Беларусі атрымаў вонкавую, і ўнутраную падтрымку дзеля сваёй барацьбы супраць нацыяналістаў, надалей закляймёных пятнаццаці “нацызму”. Ізноў ніхто не заўважыў, што палітыцы, перакананні, у адрозненне ад генаў, у спадчыну не перадаюцца. Маргіналізаваўшыся, нацыяналісты беларускі радыкалізаваліся, даводзячы, што беларусы, нарэшце, дэградаваў з-за савецкага мінулага і Чарнобылю, маюць адзін толькі здэградаванага прэзідэнта [18]. Такім чынам, у

[18] [пусцяць]

[19] У прапагандысцкім фільме “Нянавісць. Дзеці хлусні”, паказаным па Беларускім тэлебачанні напярэдадні рэферэндуму

Лукашэнка набыў статус “культурнага наступства”, істотна паменшыла поле палітычнага змагання і звузіла магчымасці апазіцыі ягонаму прэзідэнцтву. У хуткім часе адраджэнскі кшталту “цыган”, “маскоўская марыянетка” сталі ключавым тлумачэннем яго палітычнай стратэгіі і сутнасці ягонага рэжыму.

А. Лукашэнка абаперся на сістэму савецкага гатунку, якая выточную культуру беларускага народу (Lapatnidze (Alexandre), Regamey (Amandine). *Biélorussie, Ukraine: la politique culturelle*), адначасова пляжачы апазіцыю за стварэнне “звышсавецкага мастацтва”. Апошняму супрацьстаўляўся “здаровы” жыццесцвярджальны характар савецкай культуры[19] прадукцыі. У некаторым сэнсе гэтыя абвінавачванні былі перагорнутым варыянтам нацыяналістычнага дыскурсу пра “паталогію” беларускага грамадства, якую трэба “лячыць”. А. Лукашэнка запачаткаваў пераацэнку паняццяў “гатунку”, “парадак”, “чысціня” — вядома ж, паводле іншых крытэраў, чым нацыяналісты. Мадэллю для яго ізноў паслужыла савецкая сістэма, а тэму сталінскіх рэпрэсій, Чарнобылю ці гісторыі нацыяналізму зноўку ўключылі ў катэгорыю табу. Але ж нават у межах дадзенай канцэпцыі культуры “плюралізм не павінен наносіць шкоду нацыянальнаму адзінству”, як кажа новы дэвіз, прыдуманы для апраўдання эстэтычнага аднадумства ў тэатры. Апаненты рэжыму, сярод якіх было нямала нацыяналістаў (паводле афіцыйнага дыскурсу, “адмарозкаў”), станавіліся галоўнымі носьбітамі грамадскага беспарадку, адзіным сродкам барацьбы з чым бачыліся міліцэйскія рэпрэсіі. Вось жа, жаданне вярнуцца да савецкага ладу — гэта тая самая рэканструкцыя, што і “вяртанне” да ранейшых вынаходак *прапановаў на будучыню”*, — як кажа Эманюэль Завадскі[20]. Улады выкарыстоўваюць гэтую рэканструкцыю дзеля апраўдання палітычнага прымусу.

Культурна афарбаваная аргументацыя неабходнасці разрыву з Расіяй засноўвалася таксама на антызаходнім дыскурсе. Ізноў жа, гэта нібы перагорнуты антыяшчурны дыскурс мясцовых нацыяналістаў (які толькі радыкалізаваўся з абвяшчэннем палітыкі інтэграцыі). На Захад сталі “глядзець” адказнасць за заняпад савецкай культуры гэткім жа чынам, як нацыяналісты валілі адказнасць за дэградацыю беларускай

1995 г. галоўны Сяргуком Рымашэўскага былі раскрытыкаваныя як дэкадэнцкія ў мастацтве, што нагадвае “здаровай” беларускай культуры савецкага “гатунку”.

[20] Аналагічнае нанясённю “заходнерусізму”. Падобнае ідэалогіяй Аляксандра Ціхановіча, “заходнерусізм” – гэта “мая беларуская

культуры на Ўсход, хоць першапрычынай разнастайных вытлумачэнняў было знікненне СССР як палітычнага. Антызаходні культурніцкі дыскурс мог служыць дымовай для тых, хто сумаваў па савецкай мінуўшчыне, але новае ўмацаванне сувязяў паміж усходнімі славянамі, што азначала трыюмфальнае вяртанне новай формы імперыі[20], які абапіраецца на спецыфічнае разуменне дэмакратыі. Сапраўды, А. Лукашэнка працягвае настойваць на дэмакратычнасці сваёй палітыкі. Ён сцвярджае, што праводзіць дзеля ўсталявання “непасрэднай дэмакратыі”, якая забяспечвае інстытут рэферэндуму. Рэферэндумы служаць зарукай сімбіёзу паміж уладамі і грамадствам, выразнага “народных традыцый” і вартасцяў, іншымі словамі “культуры”, аднак да такой “культуры”, якая адказвае прэзідэнцкаму папулізму.

Рэалізацыя гэтай праграмы выявілася ў аднаўленні культурных абменаў паміж Беларуссю, Расіяй і Украінай на праектам абменаў з заходнімі краінамі[21]. Паралельна антызаходні дыскурс засведчыў нежаданне функцыянераў беларускага рэжыму мірыцца з плюралізмам думак і свабодай слова. Таму, прыкрываючыся клопатам пра маральную дыскурс апраўдваў аднаўленне цэнзуры, а таксама ўмацаванне прымусу, што прыводзяць да самацэнзуры.

Калі раней этнізацыя паняцця “культура” магла служыць нацыяналістам, то пасля абрання А. Лукашэнкі семантычны прыём стаў цэнтральным у дзяржаўнай Парадаксальна, але тая этнізацыя стала служыць дэманстрацыі “натуральнага”, “адвечнага” характару ўсходніх славянаў, якія паходзяць з аднаго “супер-этнасу”, для легітымізацыі фаталісцкіх дыскурсаў аб заняпадзе беларускай культуры, адказнасць за які ўскладаецца не на аўтарытарнай палітыкі прымусу і рэпрэсій, а на натуральны працэс дэградацыі этнасу. Гэты працэс, зрэшты, акрэслівае цалкам апалітычны[22]. Развіццё этніцысцкага тэзіса разам выкарыстанага дзяржавай, прывяло яшчэ да новых дэфініцый паняцця “беларускі народ” і падрыхтоўцы новай версіі гісторыі беларусаў, якая таксама патрэбна прэзідэнцкага папулізму. Прыкладам, у 1996 г. быў выдадзены трэці том *“Беларускай энцыклапедыі”, што адкрываўся артыкулам “Беларусы”, у якім даецца навуковае*

сістэмы грамадскай думкі ад Беларусі, што належыць краінай з моцнай нацыянальнай культурай і ня мае нацыянальнай ідэі, самастойнае культурнае і палітычнае развіццё, але цяжка назваць самастойнай і самабытнай частку Расіі і таму цяжка назваць нармальнай з яе культурнай спадчынай. Гэта ня можа не цікавіць кіраўнікоў краіны, якія імкнуцца ўмацаваць сваю ўладу ў тым ліку і пры дапамозе культурных сродкаў.

[21] У гэтым ліку і *Беларуская Дэтэлевізія*

з'яўлення этнічнай тэрыторыі беларусаў, працэсу "этнакансалідацыі" і "этнагенетычнай" кансалідацыі беларусаў. "Этнічная гісторыя" ў артыкуле "Беларусы" даводзіць, што "Б. на працягу свайго шматвяковага шляху стварылі і захавалі багатую, самабытную і ўнікальную культуру, якая ўвайшла ў сусветную цывілізацыю, паказалі мужнасць і гераізм, цярпенне і працавітасць, міласэрнасць і ўменне жыць у добрасуседстве…". Гэтыя разважанні маюць на мэце адцягнуць увагу чытачоў ад бягучай культурнай палітыкі ды зняць з уладаў адказнасць за сферу культурных зменаў. Дэфініцыі з энцыклапедыі паведамляюць нам не столькі пра тое, чым насамрэч быў беларускі народ, колькі пра тое, чым бы яго хацелі бачыць[23]. Іншы прыклад: у кнізе "Нацыянальная ідэя ў беларускай літаратуры пачатку стагоддзя" Л. Гаранін, які лічыць, што этнічны элемент мусіць стаць галоўнай натхняючай сілай беларускіх творцаў, прапануе нам сваё бачанне гісторыі ўсходніх славянаў. Яно бярэ пачатак у тэорыі этнасу Ю. У. Брамлея. За выходныя пункты Гаранін узяў візантыйскі і славянскі свет, разгляданыя як *"пункт этнічнай кожнасці"*. *Русічы* зніклі акурат таму, што змяшаліся з іншымі гарадамі. Але ў XII—XIII стагоддзях адбыўся працэс адраджэння "славянскага суперэтнасу", што суправаджалася ўмацаваннем расійцаў, украінцаў і беларусаў. На гэтай стадыі вектар культурнага развіцця: яго моц, інерцыйнасць або ўзрэшты — прадвызначаецца разуменнем працэсу этнагенезу. Адзінае, тэзісы савецкай этналогіі, узведзеныя на ўзровень інстытуцыйнай культуры, не закранаюць праблемаў узаемапранікнення, культурнай мабільнасці, разнастайнасці пунктаў погляду.

Газета і "Наша Ніва".

[22 знаць]

[23] Зрэшты, кожны з гэтых пастулатаў мусіў бы падмацоўвацца звесткамі сур'ёзных сацыялагічных даследаванняў: узяць, напрыклад, пастулат аб інструменталізацыі паняцця "мужнасць" у краіне, большасць выбарцаў у якой складаюць жанчыны (яны, можна сказаць, і

абралі прэзідэнтам А. Лукашэнку), ці тэзіс аб адчужэнні людзей ад палітыкі праз працу (параўнай заяву прэзідэнта пра тое, што лепей капаць зямлю на дачы, чым займацца палітыкай).

А. Лукашэнка, нібы моцны шахматыст, умее даваць сэанс адначасовай гульні.

Панславісцкія дэкларацыі не перашкодзілі яму сабраць жменьку акадэмічных вучоных у групу для стварэння “нацыянальнай ідэалогіі”. На думку Алега Слукі, выказаную ў артыкуле “Нацыянальная ідэя — аснова

[24] Што датычыцца сувязі паміж нацыяналізмам і “высокай культурай”, гл.: Gellner E. *Nations et nationalisme*.

грамадзянскага яднання” ў “Беларускім Гістарычным Часопісе”, гэтая ідэя ёсць перспектыўнай ідэалогіяй яднання беларускага грамадства вакол асноўных мэтаў: развіцця высокатэхналагічнай прамысловасці, захавання дзяржаўнай уласнасці на зямлю, стварэння сучасных гарадоў і вёсак, фармавання “высокае культуры”[24] і ўмацавання маральнага аўтарытэту сям’і. Усё гэта разам абяцае *“шчаслівае жыццё беларускаму народу”*. А. Слука працягвае ў такім духу: надышоў час ператварэння ідэалаў

нацыянальнай ідэі ў *“штодзённы маральны кодэкс кожнага грамадзяніна Беларусі”*, бо, калі палітычныя погляды могуць *“дзяліць грамадства”*, *“росквіт Радзімы і дабрабыт людзей назаўжды застаюцца для ўсіх непарушнымі вартасцямі”*. Сп. Слука паведамляе нам таксама, што ў 1996 г. групай беларускіх навукоўцаў быў распрацаваны праект беларускае дзяржаўнае ідэалогіі. Ён быў спробай *“сфармуляваць стратэгію і тактыку развіцця сучаснага беларускага грамадства”*.

Найважнейшую місію ідэалогіі “дэмакратычнай дзяржавы” складае, паводле А. Слукі, *“выбар кірунку нацыянальнага шляху і духоўнага ўдасканалення людзей. Ад гэтага залежыць поспех дзяржаўнай палітыкі, накіраванай на рэалізацыю праграм эканамічнага і культурнага развіцця”*. Насамрэч, гісторыя даказала, што *“не можа быць эканамічнага ўздыму без духоўнага яднання людзей”*. Карацей кажучы, для А. Слукі *“дастатак у кожным беларускім доме — сцяг*

нацыянальнай ідэі”. Высвятляецца, што дыскурс аб святарным саюзе славянаў не супярэчыць таму, што дзяржава фармулюе нацыяналістычныя тэзісы на мясцовым узроўні. Гэтаксама беларусізацыя ў БССР не супярэчыла палітычнай і культурнай уніфармізацыі ў СССР. Рэжым можа пераймаць асноўныя тэзісы сваіх апанентаў, каб лепей іх абясшкоджваць. Аднак пры гэтым не абыходзіцца без семантычных маніпуляцый і ўзмацняюцца нацыяналізм і культурныя табу. Тое самае можна канстатаваць

таксама ў святле ўмацавання статусу праваслаўя, што выконвае ролю іншага аўтарытарнага ферменту інтэграцыі, носьбіта этнічнай салідарнасці. Можна ўжо ўбачыць першыя эксцэсы такога “вяртання да веры”: у шэрагу нядаўніх публікацый насельніцтва ад імя праваслаўя заклікаецца змагацца супраць “еврейского заговора”.

Вайна культур

Узмацненне жорсткасці рэжыму і, як вынік гэтага, парушэнне правоў чалавека прымушаюць некаторых інтэлектуалаў з апазіцыі ацэньваць становішча як “вайну культур”. Мультыкультуралізм, які *de facto* існуе ў Беларусі, — прадметам абмеркаванняў, а тое, што А. Лукашэнка пачынае перахапіць некаторыя аксіёмы мясцовага нацыянальнага падштурхнула нацыяналістаў да новых змяненняў у дыскурсе. Разважанні пра мультыкультуралізм у Беларусі былі іныцыяваныя гісторыкамі і інтэлектуаламі, якія спрабавалі

25 Абмежаваць ці парушэнне правоў культурнымі правамі — значыць прыняць мультыкультурысцкую канцэпцыю права, якая

вызваліцца ад савецкіх канцэпцый. Адныя, наважуючыся адкрыць малавядомыя старонкі гісторыі, знайшлі ў шматкультурным досведзе Вялікага Княства Літоўскага ў гістарычнасці сучаснай беларускай дзяржавы. Яны даводзілі, што на гэтых землях існаваў “дэмакратычны” досвед мужнага суіснавання розных культур. Іншыя шукалі альтэрнатыва савецкай сістэме ў адаптаваных да беларускіх умоваў ідэях амерыканскага камунітарызму. Справа не абмяжоўвалася простай канстатацыяй шматкультурнасці беларускага грамадства і атрыманнем з гэтага творчага плёну. Ідэя гаворка ішла аб выяўленні сучаснай “паталогіі” культуры. Таму мультыкультуралізм інтэрпрэтаваўся як вынік посткаланіяльнага становішча, прычым былы каланізатар падаваўся адзіным віноўнікам развіцця культурных адрознасцяў, якое ляжала ў аснове ягонай стратэгіі панавання над меншасцямі. У такім разе нармалізацыя постсавецкай прасторы, абазначанай як “посткаланіяльная”, палягае ў правядзенні больш акрэсленых межаў паміж рознымі культурамі — межаў, якія каланіяльная стратэгія панавання зблытала. У гэтым сэнсе знаходжанне на мяжы дзвюх культур з’яўляецца анамаліяй, бо гэта знаходжанне ў “мёртвай культурнай прасторы”, або ў “зоне шызафрэніі”. Такім чынам, вывучэнне шматкультурнага досведу ставіцца на службу культурнаму маналагізму, які, у параўнанні з савецкай нацыянальнай палітыкай, мусіць выглядаць бясспрэчна дэмакратычным. Сцвярджаецца, што “посткаланіяльная паталогія” павінна быць вылечаная. Аўтары шукаюць адказу на шматкультурны выклік у паняццях “*транскультурнасць*” або “*посткультурнасць*” (часопіс “Фрагмэнты”). Паняцце “*транскультурнасць*” дазваляе зрабіць акцэнт на мабільным, інтэрактыўным і эвалюцыйным характары культур, ігнараваць, калі неабходна, палітычныя межы, якія, лічыцца, герметычна зачыняюць культуры. Аднак “транскультурнасць” усё яшчэ запісваецца ў разрад “новых еўрапейскіх утопій XX стагоддзя” альбо ўспрымаецца як вястун глабалізацыі, падчас якой “малая беларуская культура” рызыкуе загінуць. Так што “шматкультурны посткаланіяльны свет” застаецца моцна іерархізаваным. Палітыка ў ім разглядаецца як функцыя ад культуры, што нібыта ёй папярэднічае — як быццам палітычны выбар заўжды вынікаў з культуры і ніколі не з’яўляўся

супярэчыць універсалісцкай, заклад дзенай у “правах чалавека”. Аднак жа магчымым з’яўляецца адстойванне права на культуру ў межах канцэпцыі правоў чалавека.

крыніцай выбару культуры. Апрача таго, культурны маналагізм і мультыкультуралізм працягваюць падавацца як антыподы; між тым савецкі досвед якраз паказвае, што яны могуць суіснаваць, не супрацьстоячы, і спараджаць палітычны плюралізм. Іншымі словамі, гэтыя культурніцкія схемы могуць прыстасоўвацца да кожнага рэжыму, пакуль не ўзнятыя пытанні правоў індывідаў[25] і іхняга грамадзянства па-за межамі якога-колечы культурнага дэтэрмінізму. Без гэтай умовы "вайна культур" становіцца непазбежнасцю, а праблема адсутнасці дэмакратыі не можа быць вырашаная.
Што ж да канцэпцыі "этнічнага грамадзянства", дык у канцы XX стагоддзя мы мелі магчымасць назіраць, што атрымліваецца, калі яе адстойваюць цэлыя супольнасці. Вынікам сталіся нядаўнія падзеі на Балканах.

У Беларусі культура, якая тутака ніколі не вывучалася як носьбіт палітычных стратэгій, здольных замоўчваць размаітасць пунктаў погляду, стала пры гэтым носьбітам аўтарытарызму. Спрэчкі ад імя нібыта нязменных "культур" часткова паспрыялі адмаўленню дэмакратычных палітычных праектаў. У гэтым кантэксце індывіды знянацку апынаюцца культурна дэтэрмінаванымі, што спрыяе іхняй радыкалізацыі, але таксама й нецярпімасці, аснове ўсякай рэпрэсіўнай палітыкі. Мы ж нагадаем словы Эле Бэджы: *"Культурнае братэрства не з'яўляецца дастатковай зарукай добрага кіравання. Прыналежнасць да аднолькавай культуры не абараняе нас ад глупства ці жорсткасці нашых суайчыннікаў. Можна мець тыя самыя звычаі — і быць няздольнымі пабудаваць лепшае грамадства, зрабіць яго больш справядлівым. Бо кожная культура можа стаць дэспатам нават тых, хто выступае ад яе імя".*

Пераклаў з французскай
з нязначнымі скарачэннямі В. Р. паводле Chroniques sur la Biélorussie contemporaine. *L'Harmattan, 2001.*

Кнігі і працы, цытаваныя ў артыкуле:
Беларуская Энцыклапедыя. Т. 3. Менск, 1996.

Беларуская думка XX стагоддзя: Філасофія, рэлігія, культура (Анталогія). Варшава: Польская Акадэмія навук, Інстытут славістыкі, 1998.
Гаранін Л. Нацыянальная ідэя ў беларускай літаратуры пачатку стагоддзя. Менск: Беларуская навука, 1996.
Анатоль Сабалеўскі. Асоба мастака. Менск: Мастацкая літаратура, 1992.
Курапаты — дарога смерці. Менск: "Тэхналогія", 1994.
Ihar Babkoū. Belarus: *Dual modernity* //Cultural Encounters in East Central Europe, Swedish Council for Planning and Coordination of Research, Report 98:1.
Etienne Balibar, Immanuel Wallerstein. *Race, nation, classe: Les identités ambiguës*. Paris: La découverte & Syros, 1997.
Roger Belbéoch. *Société nucléaire.* — Les Notions philosophiques: PUF, 1990. T. 2.
E. Benbassa, J.-C. Attias. *La haine de soi. Difficiles identités*. Complexe, 2000.
Denys Cuche. *La notion de culture dans les sciences sociales*. — Paris: La découverte, 1996.
Bruno Drweski. L*e sentiment national en Biélorussie comme source de questionnement de l'identité polonaise // Perspectives Biélorussiennes*, № 15, septembre 1999.
Vincent Dubois. *La politique culturelle. Genuse d'une catégorie d'intervention publique*. — Berlin, 1999.
Jean-Pierre Faye. *Languages totalitaires, La raison critique de l'économie narrative*. Paris: Hermann, 1972 i *Le language meurtrier*. Paris: Hermann, 1996.
Ernest Gellner. *Nations et nationalisme.* Paris: Bibliothéque historique Payot, 1983.
Alexandra Goujon. *Genozid: a Allying cry in Belarus. A rhetoric analysis of Some Belarusian nationalist texts // Journal of Genocide Research* (1999), 1 (3).
Alexandra Goujon. *Language, Nationalism and Populism in Belarus // Nationalities Papers*, vol. 27, ą 4, 1999.
Alexandra Goujon. *Le processus de formation d'une opposition politique et nationale en Biélorussie: le Front populaire biélorussien* (1988—1991) *// Revue d'Etudes comparatives Est-Ouest*, vol. 28, ą 1, 1998.
Samuel P. Huntington. *Le Choc des civilisations.* Paris: Editions Odile Jacob, 2000.

L’invention de la population: Biologie, idéologie et politique (sous la direction de Hervé Le Bras). Paris: Editions Odile Jacob, 2000.

André Pichot. *La société pure de Darwin a Hitler*. Paris: Flammarion, 2000.
Фрагмэнты. Менск, № 1—2 (лета 1999).
Aléna Lapatniova, Amandine Regamey. *Biélorussie, Ukraine: la politique des symboles // Nouveaux mondes*, 2000.
Jean-Pierre Warnier. *La mondialisation de la culture //*La découverte, 1999.
Jan Zaprudnik. *Belarus: At a Crossroads in History*. Boulder, San Francisco, Oxford: Westview Series on the Post-Soviet Republics, Westview Press, 1993.

Зацемы

2 “Беларуская савецкая энцыклапедыя” (далей — БСЭ) вызначае культуру як гістарычную і сацыялагічную катэгорыю: *“К. — з’ява гістарычная, якая змяняецца ў залежнасці ад развіцця прадукцыйных сіл і формаў грамадскага жыцця людзей”*. Будучы сацыялагічнай катэгорыяй, яна мусіць разглядацца ў двух планах: матэрыяльным і духоўным. Матэрыяльная культура характарызуецца ўзроўнем *“тэхнікі і тэхналогіі вытворчасці, навуковай арганізацыі грамадскай працы, кіраўніцтва ўсімі бакамі вытворчай дзейнасці, навыкаў і вопыту працоўных, формамі ўласнасці, узаемаадносінамі паміж рознымі сацыяльнымі і вытворчымі групамі людзей, структурай размеркавання створаных матэрыяльных каштоўнасцей і іх спажывання”*. Духоўная культура — гэта *“сукупнасць навуковых ведаў, формаў свядомасці, светапогляду, мастацкай дзейнасці”*. Паводле энцыклапедычнага аўтара Родзіна, багацці духоўнай культуры павінны быць пастаўленыя на службу інтарэсам народу, каб вызваліць *“яго фізічныя і інтэлектуальныя сілы”*. Сярод багаццяў, якія пералічвае Родзін — *“навуковае пазнанне і светапогляд людзей, мастацтва, асвета і адукацыя, этыка і*

эстэтыка”. Аднак дэфініцыя культуры як сацыялагічнай катэгорыі выходзіць за межы пералічанага, бо Родзін піша таксама, што *“сусветная скарбніца культуры атрымлівае ў спадчыну ўсё лепшае з таго, што створана творчай працаю ўсіх народнасцей, нацый і рас”*. Ленінская дыялектыка двух тыпаў культур (нацыянальнай і сусветнай) тлумачыцца ў святле новай дэфініцыі *“буржуазнай культуры”*, якая, аддаючы перавагу асобе, а не калектыву, выяўляе гісторыю культуры як чаргаванне *“розных тыпаў К., якія не звязаны паміж сабою генетычна”*. Наадварот, сацыялістычная культура — *“пераемніца культурнай спадчыны ўсіх народаў”*, якая *“арганічна спалучае нацыянальнае і інтэрнацыянальнае”*. Такім чынам, савецкі дыскурс аб культуры 1970-х гадоў абапіраецца на эсенцыялісцкае бачанне свету. Аказваецца, што гэты семантычны перанос адпавядае пераацэнцы, якую савецкі навуковец Брамлей зрабіў што да паняцця “этнас” як катэгорыі навуковага падыходу. Гл. таксама: У. Конан. Культура // *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі* (*далей — ЭГБ*), 1997. Т. 4.
[Вярнуцца да тэксту]

3 У БСЭ (1973 г.) *нацыя* вызначаецца як *“гістарычная супольнасць людзей, якая характарызуецца ўстойлівымі эканамічнымі і тэрытарыяльнымі сувязямі, агульнасцю мовы і асаблівасцей псіхічнага складу, што праяўляецца ў спецыфічных рысах культуры”*. Гэтая энцыклапедычная фармулёўка збольшага паўтарае аксіёмы сталінскага азначэння нацыі. Праз 20 год ЭГБ вызначыць беларускую нацыю як *“вышэйшую ступень самаарганізацыі беларускага этнасу”* (аўтар артыкулу — Павал Церашковіч). У тым жа годзе энцыклапедыя “Археалогія і нумізматыка Беларусі” прапанавала сінкрэтычнае вызначэнне на падмурку сталінскай дэфініцыі нацыі і тэорыі этнасу. Яна вылучае *этнас* як *“этнічную супольнасць, устойлівую еднасць людзей, якая склалася гістарычна на пэўнай абмежаванай тэрыторыі”*. Род, племя, народнасць і нацыя з’яўляюцца сінонімамі этнасу. Акрамя мовы, галоўнымі вызначальнымі фактарамі этнасу, паводле аўтарскай думкі, ёсць наяўнасць падобных традыцый, побыту, культуры, псіхічнага складу, уяўлення пра супольнасць гістарычнага лёсу, разумення свайго месца ў свеце, нацыянальнай (племянной, народнай) свядомасці, супольнага генафонду і экалогіі (аўтар — Уладзімер Ісаенка). [Вярнуцца]

4 У ЭГБ (1997 г.) *культуралогія* (аўтар артыкулу — Уладзімер Конан) трактуецца як *“навука пра сутнасць і тыпы культуры”*, яе сацыяльныя функцыі і заканамернасці гістарычнага развіцця, але таксама пра *“ролю культуры ў стабілізацыі* этнасу, нацыі, *грамадства”*. (Апошні тэзіс належыць не энцыклапедычнаму аўтару, а прадстаўнікам пазітывісцкай школы, якіх сп. Конан пералічвае побач з прадстаўнікамі іншых школ — антрапалагічнай, гістарычнага матэрыялізму і г. д. — **Перакл.**). [Вярнуцца]

12 Тэрмін “народнасць” двухсэнсоўны з прычыны разнастайнасці сітуацый яго выкарыстання ажно пачынаючы з XIX ст. ...Слова “народ” таксама вядомае сваёй двухсэнсоўнасцю: у розных сітуацыях яно можа абазначаць і нацыю, і натоўп. Аднак савецкая этналогія дадае яму шматсэнсоўнасці, калі засноўвае этымалогію “народу” хутчэй на грэцкім тэрміне “*ethnos*”, чым на паняцці “*demos*”. Гэты семантычны перанос таксама служыў падтрымкай для беларускіх нацыяналістаў, якія вызначалі свой народ як цэласнасць, сфармаваную па-за межамі дзяржавы і здольную вызваліцца ад уздзеяння ейных законаў. Гэтак ставілася пад сумнеў легітымнасць савецкай улады ў Беларусі. [Вярнуцца]

18 Эстэтыка ахвярнасці, прынятая апазіцыяй, мела дачыненне як да выкрыцця савецкай сістэмы, так і да чарнобыльскай тэмы. Апазіцыянеры гаварылі, што краіну накрыла чорнае ліха, моташлівы туман, здольны забрудзіць душы. Нават рэжым А. Лукашэнкі быў ацэнены як “насланнё”, “чорная навала”. Яго ўсталяванне нібыта даказвала, што сілы зла адолелі сілы дабра. У гэтым кантэксце цэлае пакаленне творцаў, часта звязаных з нацыяналістычнай апазіцыяй, узняло эстэтыку ахвярнасці як нацыянальны сцяг, ствараючы вобразы нячысцікаў, мутантаў, карацей кажучы — сучасныя карцінкі пекла. У 1996 г. праваслаўны сабор у Менску быў размаляваны перагорнутымі чорнымі крыжамі, і прэса жывілася “справай сатаністаў” на працягу вясны і часткова лета. [Вярнуцца]

22 У гэтым — уся двухсэнсоўнасць інтэрпрэтацый “культуры” ва ўмовах аўтарытарнага рэжыму. Пачынаючы ад 1997 г., галоўным лозунгам на афіцыйным культурным полі ў Менску стала: “*Нельга блытаць культуру з палітыкай”*. Але ж вядома, што ў аўтарытарным кантэксце трэба зусім нямнога, каб

мастацкі твор набыў палітычны сэнс і быў успрыняты ўладамі (а таксама й іншымі адрасатамі, часам незалежна ад першапачатковай задумкі аўтара) як падрыўны акт альбо акцыя супраціву. Такім чынам, культурныя факты таксама ацэньваюцца ў залежнасці ад кантэксту, створанага інтэнсіўнасцю палітычнага ціску і ступенню, у якой абмяжоўваецца свабода самавыяўлення. Здараюцца сітуацыі, калі творца, ведаючы, што людзі трапляюць за краты з-за сваіх палітычных перакананняў, зацікаўлены ў падтрымцы пануючага дыскурсу, што размяжоўвае “культуру” й “палітыку”, каб не адрывацца надта ад эстэтычных кодаў сучаснасці. Ён спадзяецца знайсці “трэці шлях”, адстойваючы сваю апалітычнасць. Але трэцяга шляху няма, бо апалітычная пазіцыя таксама можа быць скарыстаная ўладамі, і нават лягчэй, чым якая іншая. Адной з характарыстык дыктатуры якраз і з’яўляецца тое, што пры ёй у пэўны момант кожнаму мусова заняць пэўную пазіцыю. [Вярнуцца]

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]

№ 4 (18) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя:
analityka@yahoo.com
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: **09-10-2001**
[image]

[image]
A R C H E S k a r y n a № 4 (18) – 2001
[image]

[image]
4 [image]–[image]2001
аналітыка • эсэістыка • крытыка • рэцэнзіі

Алесь АРКУШ

Вершы

АЛЕСЬ АРКУШ паэт, лідэр Таварыства Вольных Літаратараў, галоўны рэдактар часопісу “Калосьсе”. Працуе ў Вільні на радыё “Балтыйскія Хвалі”. Аўтар кнігі эсэістыкі “Выпрабаваньне развоем” (бібліятэка часопісу “Калосьсе”, 2000). У “ARCHE-Скарына”, № 8 / 2000, было надрукаванае ягонае эсэ “Аскепкі вялікага малюнку”.

сказаў
а твой голас яшчэ доўга
гайдаецца на радыёхвалях
калі ты не дачуў
уключы свой радыёпрыймач
заўтра апоўдні

* * *

Сярод чаратоў
схавалася маленькае гнязьдзечка
з адным яечкам
з іголкаю зачараванай у сярэдзіне
так так
з той самай славутай іголкай
у якой жыцьцё цмока захоўваецца
Дый што тут паробіш:
і балота шкада асушваць
і гняздо дратаваць
і яечка біць

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 4 (18) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя:
analityka@yahoo.com
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: 09-10-2001
[image]

[image]
ARCHE Skaryna № 4 (18) – 2001
[image]

[image]
4 [image]–[image]2001
аналітыка • эсэістыка • крытыка • рэцэнзіі
[image] [image] [image]

Алесь АРКУШ

Вершы

сказаў
а твой голас яшчэ доўга
гайдаецца на радыёхвалях
калі ты не дачуў
уключы свой радыёпрыймач
заўтра апоўдні

* * *

Сярод чаратоў
схавалася маленькае гнязьдзечка
з адным яечкам
з іголкаю зачараванай у сярэдзіне
так так
з той самай славутай іголкай
у якой жыцьцё цмока захоўваецца
Дый што тут паробіш:
і балота шкада асушваць
і гняздо дратаваць
і яечка біць

АЛЕСЬ АРКУШ паэт, лідэр Таварыства Вольных Літаратараў, галоўны рэдактар часопісу “Калосьсе”. Працуе ў Вільні на радыё “Балтыйскія Хвалі”. Аўтар кнігі эсэістыкі “Выпрабаваньне развоем” (бібліятэка часопісу “Калосьсе”, 2000). У “ARCHE-Скарына”, № 8 / 2000, было надрукаванае ягонае эсэ “Аскепкі вялікага малюнку”.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 4 (18) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя:
analityka@yahoo.com
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: 09-10-2001
[image]

Барыс Ляпешка

• Філязофія самадастатковасьці
• Ад рэдакцыі

Філязофія самадастатковасьці

---

*Ч*асопіс “ARCHE”, у ліку іншых рэспубліканскіх выданьняў, даволі актыўна зьвяртаецца да ідэалягічнай праблематыкі. Тыповым па пастаўленых пытаньнях і адпаведнай аргумэнтацыі зьяўляецца матэрыял, надрукаваны ў № 1 (15) за 2001 год: “Ідэалёгія лукашэнкаўскага рэжыму”. Чытаючы працу В. Булгакава, насычаную такімі мілымі выказваньнямі на адрас апанэнтаў, як *“купка параноікаў”*, *“дамаслыя Вялічкі і Ляпешкі”*, *“прадстаўнікі “паранаідальнага кірунку” ў афіцыйнай беларускай ідэалёгіі”*, чамусьці адразу прыгадваецца Яраслаў Гашак і ягоны славуты Швэйк. Як вядома, адзін з герояў Гашка рэдагаваў часопіс “Сьвет жывёлаў” і палеміка з апанэнтамі там вялася амаль на такім жа ўзроўні. Калі, у прыватнасьці, зайшла размова пра ідэнтыфікацыю нявіннай птушкі карэзы (не ідэалёгіі), то рэдактар нарваўся на выказваньні, дзе самым нявінным было *“неадукаваная жывёліна”*, а круцейшая формула вылілася ў выказваньне *“карэза застанецца карэзай, нават калі б ваш рэдактар наклаў у штаны”*.

Цалкам натуральна, што палеміка такога кшталту бессэнсоўная і безьзьмястоўная. Дый наўрад ці можна “дабраць” грамадзкай саліднасьці ў ваччу чытацкай аўдыторыі, ідучы шляхам савецкай рыторыкі 30-х гадоў. Фразэалягічныя звароты кшталту *“обэр-бандыт Юда Троцкі”* могуць, вядома, надаць тэксту шэксьпіраўскую глыбіню й ясенінскую шчырасьць, вось толькі пры чым тут абвешчаная рэдакцыяй “ARCHE” прэтэнзія на эстэцтва?
Аднак сам па сабе прадмет размовы — маю на ўвазе ідэалёгію маладой беларускай дзяржаўнасьці — настолькі важны і актуальны, што ёсьць сэнс забыць дробныя ўкусы палітычных грызуноў і палемізаваць па сутнасьці, а не па форме. Натуральна, без прэтэнзіяў на “апошнюю кропку” ў канцы абзацу.

* * *

Першы тэзыс, на наш погляд, залючаецца ў тым, што нацыянальная ідэалёгія, як тэарэтычнае выяўленьне карэнных фундамэнтальных інтарэсаў беларускай нацыі, яшчэ толькі знаходзіцца ў стадыі фармаваньня. Кажучы больш жорстка, яе не існуе. Найперш у тым сэнсе, што яна не прызнаная інтэлектуальна і не авалодала масамі практычна. Можна прыводзіць колькі заўгодна прыкладаў пазытыўнага вырашэньня такога пытаньня: напрыклад, у Італіі эпохі Мадзіні і Гарыбальдзі, а крыху пазьней — Бэніта Мусаліні. Ці ў Нямеччыне эпохі Бісмарка, чыя “жалезная” рыторыка магла ўвагнаць у труну не аднаго клясычнага інтэлектуала, выхаванага на катэгарычным імпэратыве Канта. Тым ня менш менавіта яны, дрэздэнскія, кёнігсбэрскія, бэрлінскія прафэсары, дастаткова хутка транфармавалі сечаныя фразы канцлера аб неабходнасьці аб’яднаньня Нямеччыны “жалезам і крывёй” у прымальныя для парлямэнцкага вуха паліталягічныя максымы і лягічныя схемы. Гэта, галоўным чынам, датычыць таго, што спраўджаная, зрэалізаваная “палітычная зададзенасьць”, заснаваная на рэальных працэсах, заўсёды вышэйшая (першасьнейшая) за любыя тэарэтычныя экзэрсысы. Якімі б разумнымі, глыбокімі, угрунтаванымі на сусьветным досьведзе яны ні былі.
Да слова, амэрыканская нацыянальная ідэалёгія, замацаваная ў

вядомай Канстытуцыі, таксама ня вырасла раптоўна, на борце “Мэйфлаўэра” ці падчас міжусобнай бойні. Спатрэбіліся дзесяцігодзьдзі, каб амэрыканцы маглі з гонарам казаць пра тое, што яны жывуць у вялікай і вольнай краіне і, натуральна, што гэта было замацавана як тэарэтычна, так і фармальна. Такім чынам, няма чаго чакаць, што з дня на дзень на нас пральецца жыцьцядайны дождж у выглядзе эпахальных канцэпцыяў, адпаведных тэорыяў і поглядаў. Такога кшталту рэчы — маю на ўвазе, ведама, ідэалёгію — нацыя мусіць выпакутаваць, а не атрымаць у гатовым выглядзе. І відавочна, што ў гэтым сэнсе ні “Масква”, ні “Захад” нам не памочнікі. Мне здаецца, можна толькі вітаць намаганьні рэдакцыяў “Беларускай Думкі”, “Советской Белоруссии”, “ARCHE” за сталую цікавасьць да гэтай тэмы і імкненьне да зрухаў наперад — дзе навобмацак, а дзе й нацянькі.

* * *

Цяперака слова “ідэалёгія” і ў афіцыйных, і ў няўрадавых СМІ ўсё болей стасуецца з паняткам “дзяржава”. Крытычны патас шэрагу аўтараў, скіраваны на такога кшталту сувязь, здаецца, сама менш, празьмерным. Бо і “беларуская ідэалёгія”, і беларуская дзяржаўнасьць налічваюць ня надта вялікую колькасьць гадоў. А калі “прыбраць” савецкі пэрыяд, на чым таксама зрэдчас настойваюць, то размова пойдзе пра дзесяць год.

Мне здаецца, што тут, у рамках дадзенай праблемы, у найбольшай ступені сканцэнтравана палітычная ангажаванасьць тэарэтыкаў і практыкаў сучаснага беларускага ідэалягічнага працэсу. У тым сэнсе, што мэта апраўдвае і сродкі, і саму канцэптуальную сутнасьць тэарэтычных пабудоваў. Бо калі, напрыклад, размова ідзе пра такую ўстаноўку, як інтэграцыя ў Эўропу, то выглядае прываблівым тэзыс аб тым, што мы ўжо стагодзьдзямі знаходзімся ў яе рамках. Адпаведная аргумэнтацыя агульнавядомая. Існуе, натуральна, і іншы пункт гледжаньня, згодна зь якім “мы” і “Эўропа” — цывілізацыйныя антыподы і “скрыжавацца” ня можам ні ў водным, прабачце, ракурсе. Тут ня трэба цытаваць эпігонаў, дастаткова назваць катэхізыс адэптаў дадзенай плятформы, працу М. Данілеўскага “Расея і Эўропа”.

Праблема ж павінна разглядацца з прынцыпова іншых пазыцыяў: самадастатковасьці — у эканамічным, духоўным сэнсе — уласна дзяржавы Беларусі. І тут павінны валадарыць не летуценныя матывы, не напарфумаваныя насовачкі ў духу вэртэраўскай сэнтымэнтальнасьці, а самы жорсткі прагматызм. Што, дарэчы, і дэманструе — хай сабе і наступаючы на граблі — сучасная беларуская дзяржава. Звышзадача, калі адкінуць двудушныя фразы пра “дэмакратыю” і “правы чалавека”, гучыць гранічна адкрыта: трэба выжыць. І на сёньняшні дзень маладая беларуская дзяржаўнасьць вырашае пытаньне акурат пра здольнасьць да выжываньня — як эканамічную, ідэалягічную, так і палітычную. Далёка не выпадковым выглядае ў гэтай сувязі даволі часта чуты ад прэзыдэнта А. Лукашэнкі тэзыс пра тое, што мы “адбыліся як самастойная дзяржава”. Нават дапускаючы некаторую ўмоўнасьць гэтага палажэньня (прыгадаем, напрыклад, “недааформленыя” адносіны з Расеяй), трэба прызнаць галоўнае: задача выжываньня рэспублікі ў сёньняшні, ня самы лёгкі пэрыяд яе гісторыі, агулам вырашаная.

* * *

Нацыянальная ідэалёгія, мяркуючы па публікацыях, кепска мысьліцца без геаграфічна-цывілізацыйных вэктараў: заходняга і ўсходняга. Відаць, трэба адразу прызнаць, што нашае “славянафільства” і “заходніцтва” ёсьць карыкатурай на сапраўды глыбокія і зьмястоўна насычаныя арыгінальныя ідэйныя плыні. Па-першае, “нельга двойчы ўвайсьці ў адну й тую ж раку” і перажытае ў першай чвэрці XIX стагодзьдзя ў Расеі нам не перажыць па азначэньні. Па-другое, гістарычныя этапы яўна непадобныя, і сацыяльна-эканамічная і духоўная рэчаіснасьць мае нашмат болей прынцыповых адрозьненьняў, чым рысаў падабенства. Па-трэцяе, інтэлектуальныя сілы відавочна ня тыя: у прыватнасьці, на нашым грамадзкім небасхіле за апошні час так і не зьявіліся фігуры, роўныя сваім маштабам А. С. Хамякову ці П. Я. Чаадаеву. Як няма й знаку “Семирамид” ці “Философических писем”. Хіба што “Апологий сумасшедшего” маем звыш дастатку.
Што з гэтага вынікае? Толькі тое, што ня трэба блытаць “родавую” цягу да Расеі з тымі ці іншымі вытворнымі яе

інтэлектуальнай гісторыі. Нельга, дарэчы, выключаць, што цяга да расейскай інтэлектуальнай думкі XIX—XX стагодзьдзяў можа замаруджваць працэсы нацыянальнага адраджэньня. Але, відаць, хаця б якая глеба для фармаваньня альтэрнатываў гэтаму працэсу пакуль не сфармавалася.
І такое гіпатэтычнае пытаньне: што ж усё-ткі бліжэйшае, "цяплейшае" нашым традыцыям, нашым духоўным вытокам, нашай мэнтальнасьці — вытанчаны Ніцшэ ці шчыры Розанаў, геніяльны Шпэнглер ці мудры Салаўёў, змрочны К'еркегор ці паглыблены ў гістарычную мэлянхолію Мережкоўскі? Пытаньне якраз "гіпатэтычнае", бо культуру дзяліць нельга, яе крывяцёчныя сасуды не разьядноўваюцца. І разам з тым ёсьць "права першай кнігі", ёсьць улюбёны томік, запаветныя бачыны і біяграфіі, завучаныя на памяць. Ёсьць Пушкін — і гэтым шмат сказана.

* * *

Адной з праблемаў сучаснае філязофіі ідэалёгіі ёсьць яе скіраванасьць ці ў будучыню, ці ў мінуўшчыну. Тыповы прыклад — папрокі на адрас прадстаўнікоў цяперашняй афіцыйнай пазыцыі ў "савецкасьці", што тоесна рэліктаваму стану.
Памылка ў гэтым выпадку носіць выключна мэтадалягічны характар. Рэч у тым, што з крытэру прышласьці ўвогуле нельга зрабіць дакладнай высновы. Будучыні няма, яна рэальна не існуе. Бадай, і мінуўшчына ў гэтым кантэксьце "пад пытаньнем" — шмат у чым яно ўгрунтавана ў сьвядомасьці людзей, сацыяльным досьведзе і толькі часткова носіць матэрыяльны характар (напрыклад, археалягічны матэрыял). Але ў гэтай сыстэме катэгорыяў толькі мінулае валодае рэальнасьцю і толькі яно можа стаць апірышчам для аналізу цяпершчыны, а таксама для разгляду пэрспэктыўных ліній разьвіцьця соцыюму.
Чытач можа сказаць: гэта ж відавочна, навошта ламіцца ў адамкнёныя дзьверы. Каб жа ж так! Тая самая няспынная атака на "савецкасьць" пад лёзунгам будучыні ёсьць мэтанакіраванай палітыкай, зьвязанай з тымі ж празаходніцкімі арыентацыямі. Нам кажуць: во Польшча (Чэхія, ГДР…) стрэсла пыл сацыялізму са сваіх ног і яе ўжо не дагнаць, яна "ў Эўропе" [*па-беларуску ў*

тэксьце аўтара]. А мы са сваім анахранізмам ізноў у эўрапейскім тыле. І ні слова пра тое, што гістарычныя лёсы Польшчы і Беларусі маласупастаўныя. Што, напрыклад, не беларус гістарычна гнобіў і паліў палякаў, а ўсё было наадварот. Што ў нас дастаткова адрозная мэнтальная аўра, мэнтальнае поле. Так, жыць добра захочацца ўсім, толькі вось гэтага наўрад ці можна дасягнуць адвольнымі экстрапаляцыямі і палітычным жангляваньнем.

Калі глядзець праўдзе ў вочы, то акурат савецкая эпоха стварыла дзяржаву Беларусь. З усім прыўваходным ідыятызмам, у тым ліку партыйным, у тым ліку атэістычным. Да пачатку ХХ стагодзьдзя ў дзяржаўным сэнсе Беларусь была легендай — калі паэтычнай, калі й ня надта. А там вайна, другая, недаравальнае зьнішчэньне нацыянальных інтэлектуальных сілаў рэпрэсіўным апаратам КПСС, але пры ўсім тым менавіта тады беларуская дзяржаўнасьць пачала рабіць першыя крокі. І няма ніякага сэнсу ўпікаць каго-кольвек у анахранізьме. Так, калі б гісторыя ішла іншымі шляхамі, і крок быў бы зроблены іншы. Але маем тое, што маем. І трэба рухацца далей.

* * *

Трэба менавіта “зрабіць крок”, гэта значыць шукаць пазытыўнае, абапірацца на дасягнутае. Уяўляецца, што крытыцызм на сёньня ўжо цалкам зжыў сябе. Барыкады ў ідэалягічным працэсе ёсьць зьявай паўсюднай, але для Беларусі яны павінны стаць мінулым этапам. Можна яшчэ колькі заўгодна доўга крычаць ці “Захад!” ці “Ўсход!”, але ў роце саладчэй ня стане. Аснова для зьняцьця ідэалягічных барыкадаў можа быць знойдзена, як ужо гаварылася, у разуменьні самадастатковасьці беларускай нацыі, яе цэльнасьці, мажлівасьці існаваньня ва ўласным мэнтальным полі. Маленькая Данія дала сьвету “самага нябогу зь людзей” — Сёрэна К’еркегора. Невялічкая Чэхія падаравала інтэлектуалам “каўку” — Кафку. Галяндыя — Сьпінозу. Гэты пералік даволі доўгі, але сутнасьць не ў імёнах, а ў факце: нацыя сама, з сваіх глыбінь, вылучае нацыянальных геніяў. І вось гэта — адна з прыкметаў самадастатковасьці. На вялікі жаль, у нас геніі прыціснуты сваёй жа ўласнай талерантнасьцю,

але гэта зусім не азначае, што іх зусім не існуе. Уяўляецца, што грамадзкая сьвядомасьць павінна замірыцца з індывідуалізмам таленавітых людзей, прызнаць іх. Мы да гэтага часу носімся з ідэяй *абшчыннасьці*, калектывізму (і гэта ў аснове сваёй слушныя і патрэбныя ідэі), але, магчыма, варта даць дарогу і эгацэнтрызму, безь якога генія не існуе.
Адхіляючыся, заўважу, што нацыянальная інтэлектуальная традыцыя наагул лёгка ўспрымала аскетычныя, рыгарыстычныя плыні. А вось зьвязанае з прынцыпам задавальненьня, шчасьця мінала яе. Вось і эпікурэйцаў у нас амаль няма, а аскетаў зашмат.
Вялікія людзі прыгадаліся далёка не выпадкова. Бо ідэалёгія наўрад ці народзіцца ў пячорным розуме траглядыта. Каб узьнікла камуністычная ідэя, спатрэбіўся сьветлы розум Т. Кампанэлы і Т. Мора, ідэалёгія нацызму “высмактала ўсе сокі” зь ніцшэанства. Ёсьць свае папярэднікі ў “амэрыканскай мары” і тэорыі негрыцюду, славянафільства і заходніцтва. Іншымі словамі, дзяржава, грамадзтва не павінны глядзець на інтэлектуалаў як на іншаземцаў з падазроным радаводам. Маю на ўвазе і грамадзкую думку, і заробак.

* * *

Ну і што ў выніку? Мне здаецца, трэба рашуча адмовіцца — што да ідэалёгіі — ад такіх паняткаў, як “архаіка”, “савецкасьць”, “вэктарнасьць”, “славянафільства”, “заходніцтва”. Сьвет сапраўды адзіны, але і мы як нацыя — адзіныя. Таму катэгарыяльным цэнтрам павінна стаць “самадастатковасьць” у гранічна шырокім разуменьні гэтага слова. Калі нацыяналізм, напрыклад, не разрывае, а паглыбляе і пашырае межы “самадастатковасьці”, няма сэнсу пярэчыць такому нацыяналізму. Калі культура, інтэграцыйная па духу, кансалідуе нацыю, разьвіваючы “самадастатковасьць”, — няхай жыве культура. Калі Зьбігнеў Бжазіньскі турбуецца не абстрактнай інтэграцыяй і дэмакратызацыяй, а ростам самадастатковасьці беларускай нацыі, я гатовы стаць нэафітам новай веры. Калі расійскі ці заходні духоўны кантэкст супярэчаць руху нацыі да эканамічнай, палітычнай, інтэлектуальнай самадастатковасьці, то я супраць гэтага кантэксту.

І замест заканчэньня. Мне здаюцца вельмі важкімі словы “ідэалёгія лукашэнкаўскага рэжыму”, якімі насычаны — у той ці іншый інтэрпрэтацыі — неафіцыйныя СМІ. Справа на тое, што такім прызнаньнем не ўганараваныя сваім часам ні С. Шушкевіч, ні С. Шарэцкі, ні З. Пазьняк. Неяк не прыгадваюцца фразэалягічныя звароты накшталт “ідэалёгія шушкевіцкага рэжыму”. А гэта гаворыць толькі пра адно: ідэалёгія “лукашэнкаўскага рэжыму” ўсё ж адбылася. Няпоўна, зь недагаворкамі, у шэрагу выпадкаў бессыстэмна і супярэчліва, але — адбылася. Што сьведчыць і пра яе жыцьцяздольнасьць, і пра магчымасьць самаразьвіцьця.
Пераклад з расійскае

Ад рэдакцыі

1.
Яшчэ нядаўна будучы скіраванымі збольшага на “агульнасаюзную”, савецкую гуманітарную прастору, навукоўцы-грамадазнаўцы асвойваюць беларускі інтэлектуальны рынак. Аднак ператварэньне “савецкага грамадазнаўца” ў “беларускага інтэлектуала” шмат каму даецца зь цяжкасьцю. Сфармаваны цягам дзясяткаў гадоў сьветапоглядны стандарт выяўляе сваю дзіўную стабільнасьць, асабліва ў частцы навуковага апарату і інтэрпрэтацыйных мадэляў. А безь іх грунтоўнай рэвізіі глянуць на сьвет па-новаму праблематычна. Апрача таго, палітычны клімат у Беларусі ня надта спрыяе разрыву з традыцыямі савецкай гуманістыкі.
Тым ня менш, аблічча беларускай навукі зьмяняецца пакрыёма. Допіс у рэдакцыю “ARCHE” былога работніка Берасьцейскага абкаму КПБ, а цяпер выкладчыка філязофіі Барыса Ляпешкі — знак эманцыпацыі гуманітараў сярэдняга пакаленьня, іхнай адкрытасьці да дыялёгу з апанэнтамі “на полі праціўніка”. І

гэта вельмі важна, бо толькі адкрытасьць можа быць выходным пунктам для збліжэньня. І наадварот, з закрытасьці пачынаецца аддаленасьць.

2.

Інтэлектуальны партрэт Барыса Ляпешкі, характэрныя рысы яго мысьленьня выяўляюцца пры звароце да ягоных публікацый — ня толькі ў часопісе “Беларуская Думка”, пра якія гаварылася ў папярэдніх нумараў “ARCHE-Скарыны”. На бачынах “Советской Белоруссии” таксама рэгулярна зьяўляюцца яго публікацыі на розныя злабадзённыя тэмы. У нядаўняй публікацыі “Анатомія ілжы” (19.07.2001) Ляпешка гнеўна пратэставаў супраць арышту і “зладзейскага” перавозу ў Гаагу экс-прэзыдэнта Югаславіі Слабадана Мілошавіча (свае маралізатарскія развагі аўтар адкрывае так: “Сусьветная і ў першую чаргу славянская гісторыя дастаткова насычана падзеямі, пасьля якіх адбывалася прынамсі маральнае ўзрушэньне грамадзтва. ...У нацыянальнай, славянскай гісторыі таксама досыць шмат выпадкаў маральных узрушэньняў грамадзтва”. У нарысе “Паміж намі, правінцыяламі” ад 06.07.2001 ён іранізуе з “отечественных самобичующихся псевдоинтеллектуалов в тулупчиках с чужого плеча”, а ў эсэ “Аз есмь пуп Земли?” за 24.05.2001 вызначае Злучаныя Штаты як “супэрцывілізацыю, у аснову якой былі закладзеныя прагматызм, эгацэнтрызм, агрэсіўнасьць і прага прыбытку “ў асабліва цынічнай форме”. І дадае: “Амэрыка, краіна стандартаў, у другой палавіне XX стагодзьдзя выбілася з сусьветнага цывілізацыйнага стандарту... У гіпэртрафаваным выглядзе праявілася палітычная нецярпімасьць, мэтастазы якой нескладана пабачыць ува ўсіх кутках зямной кулі. Была пастаўленая на канвэер вытворчасьць “фігавых лісткоў”: ад “правоў чалавека” да “правільных і няправільных прэзыдэнтаў”. У эсэ “Глёбус пад камлыгай глябалізацыі” (24.11.2000) Ляпешка пайшоў далей у сваёй крытыцы “амэрыканскага ладу жыцьця”: “... амэрыканізацыя азначае прапаганду аднапалярнага сьвету з Манблянам у выглядзе канстытуцыі “айцоў-заснавальнікаў”... амэрыканізацыя... азначае навязваньне гатовых стандартаў ладу жыцьця”. Вельмі паказальныя думкі чытач знойдзе ў зацемцы “Наша праўда” (12.01.2001): “... пра агульначалавечыя

вартасьці можна і трэба ўзгадваць, але калі забясьпечаны нацыянальны інтарэс і асэнсаваныя нацыянальныя прыярытэты". "Агульначалавечыя вартасьці" паводле сваіх адмоўных канатацый у мысьленьні Ляпешкі неяк дзіўна спалучаюцца з "правамі чалавека" ("правы чалавека" неўпрыкмет ператвараюцца ў глябальную ідэалягему наступальнага характару, нават у ідэалягічны дручок, якім можна пляжыць тыя галовы, якія, нягледзячы ні на што, усё ж "не разумеюць" дабротаў, якія перад імі адкрываюцца... ("Меркаваньне: Пра сэнс гістарычных традыцый" (28.06.2000). У дадатак да ўсяго наш апанэнт — носьбіт своеасаблівага пачуцьця гумару, якое напоўніцу выяўляецца ў выразах накшталт "адказ шукай у катухах Эдыпавага комплексу, які сваёй элітнасьцю і элітарнасьцю нагадвае комплекс жывёлагадоўчы" або "задуменна-мэнтальнае калупаньне ў носе". Некаму такое пачуцьцё гумару можа падацца постмадэрнісцкім.
Гэтыя цытаты сьведчаць, што пазыцыя і стыль сп.Ляпешкі тыповыя для ягонага кола.

3.
Вэрсію ідэалёгіі, якую адстойвае Барыс Ляпешка, можна назваць "патрыятычна-крэольскай". "Патрыятычнай" таму, што яна чуйна адгукаецца на найменшыя зрухі палітычнага курсу сучаснага рэжыму (гэта стала асабліва відавочна падчас сёлетняй перадвыбарнай гонкі ў працэсе маніпуляцый лукашэнкаўскіх паліттэхнолягаў з тэмай "беларуска-расійскай інтэграцыі", якая няўзнак трапіла ў "прапагандысцкі цень"; ідэолягі рэжыму вельмі чуйна адрэагавалі на рашэньні паліттэхнолягаў: калі трэба, зробім акцэнт на інтэграцыі, а як скамандуюць, выступім і за сувэрэнітэт). "Крэольскай" жа таму, што яна ў варунках постсавецкага нэакаляніялізму ўвабрала ў сябе цяжка спалучальныя міжсобку элемэнты — іншародную культурную традыцыю і адначасна тутэйшы разнавід нацыяналізму, заснаваны перш-наперш на ідэнтыфікацыі з "маладой беларускай дзяржавай" і яе атрыбутамі (у тым ліку першым беларускім прэзыдэнтам).
Акурат фактарам нацыяналізму, а не нейкай міталягізаванай таталітарнай сьвядомасьці мы схільныя тлумачыць усе гэтыя

“выкрывальніцкія” пасажы пра “двудушныя фразы аб “дэмакратыі” і “правах чалавека”. Да слова, прыкладна такую пазыцыю займаюць і нацыяналістычныя плыні ўва ўсёй Эўропе (ад француза Лё Пэна да ўкраінца Зьмітра Карчынскага, былога лідэра УНА-УНСО).
Досыць заканамерна, што для абслугоўваньня сваёй візіі нацыяналізму як “асаблівага шляху” Ляпешка карыстаецца аргумэнтацыяй і прыёмамі той расійскай культурнай традыцыі, якая традыцыйна вызначалася ксэнафобіяй і ізаляцыянізмам: “Існуе, натуральна, і іншы пункт гледжаньня, згодна зь якім “мы” і “Эўропа” – цывілізацыйныя антыподы і “скрыжавацца” ня можам ні ў водным, прабачце, ракурсе. Тут ня трэба цытаваць эпігонаў, дастаткова назваць катэхізыс адэптаў дадзенай плятформы, працу М. Данілеўскага “Расея і Эўропа”. Пры гэтым неўпрыкмет адбываецца падмена паняцьцяў, бо аўтарскае “мы” ў гэтым выпадку ўжо абазначае ніяк не “Беларусь” і не “беларускую дзяржаву”, а хутчэй тое, што пазначана ў першай частцы загалоўку працы М. Данілеўскага. Аднак для антынамічнага, канфрантацыйнага мысьленьня афіцыйных беларускіх ідэолягаў гэткі падыход выглядае вельмі прадуктыўным, чым і тлумачацца такія частыя звароты да яго. “Нашае “славянафільства” і “заходніцтва” ёсьць карыкатурай на сапраўды глыбокія і зьмястоўна насычаныя арыгінальныя ідэйныя плыні”, — сьцьвярджае Барыс Ляпешка, і, відаць, сам не адчувае, наколькі ён мае рацыю.
(Тое самае можна сказаць і пра пасажы накшталт “на нашым грамадзкім небасхіле за апошні час так і не зьявіліся фігуры, роўныя сваім маштабам А. С. Хамякову ці П. Я. Чаадаеву. Як няма й знаку “Семирамид” ці “Философических писем”.)
Дык жа ““родавая” цяга да Расеі” выклікана прычынамі вельмі празаічнымі, таму што сфармаваная ў яе культурным полі інтэлектуальная традыцыя ў канфрантацыі з сусьветнай цывілізацыяй сталася надзіва актуальнай у першую дэкаду незалежнай Беларусі.

4.

Допіс Ляпешкі таксама сьведчыць, як мала зроблена ў справе дзяржаўнага будаўніцтва за дзесяць гадоў беларускай незалежнасьці. Ён выразна даводзіць, што ў асяродзьдзі

беларускай інтэлігенцыі дагэтуль маюць шырокае распаўсюджаньне імпэрскія міты ў духу “савецкая эпоха стварыла дзяржаву Беларусь”, “да пачатку XX стагодзьдзя ў дзяржаўным сэнсе Беларусь была легендай”. І што самае фатальнае, сярод тых элітаў, якія пайшлі на калябарацыю з лукашэнкаўскім рэжымам, не адбылося ідэнтыфікацыі з уласнай, айчыннай культурнай традыцыяй. Клішэ накшталт “маленькая Данія”, “невялічкая Чэхія”, “нацыянальная інтэлектуальная традыцыя наагул лёгка ўспрымала аскетычныя, рыгарыстычныя плыні” (відавочна, ідзецца пра расійскую, а не беларускую традыцыю) паказваюць, што беларускі інтэлектуальны афіцыёз дагэтуль дзівіцца на сьвет праз чужыя акуляры.
Палеміка на тэму ідэалёгіі сучаснага беларускага рэжыму ў цэлым пацьвярджае той відавочны факт, што ніводная палітычная сыстэма ня можа стабільна існаваць без зваротнай сувязі з сваім грамадзтвам, без вызначэньня прыцягальных пэрспэктываў разьвіцьця. У выпадку Беларусі само зацікаўленьне гэтай тэмай ускосна сьведчыць аб працэсе сувэрэнізацыі ня толькі празаходне настроенай інтэлігенцыі, але й па-прарасейску настроенай часткі інтэлектуальных элітаў.
[*Рэдактар*]

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 4 (18) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: **06-10-2001**
[image]

Барыс Ляпешка

• Філязофія самадастатковасьці
• Ад рэдакцыі

Філязофія самадастатковасьці

---

*Ч*асопіс “ARCHE”, у ліку іншых рэспубліканскіх выданьняў, даволі актыўна зьвяртаецца да ідэалягічнай праблематыкі. Тыповым па пастаўленых пытаньнях і адпаведнай аргумэнтацыі зьяўляецца матэрыял, надрукаваны ў № 1 (15) за 2001 год: “Ідэалёгія лукашэнкаўскага рэжыму”. Чытаючы працу В. Булгакава, насычаную такімі мілымі выказваньнямі на адрас апанэнтаў, як *“купка параноікаў”*, *“дамаслыя Вялічкі і Ляпешкі”*, *“прадстаўнікі “паранаідальнага кірунку” ў афіцыйнай беларускай ідэалёгіі”*, чамусьці адразу прыгадваецца Яраслаў Гашак і ягоны славуты Швэйк. Як вядома, адзін з герояў Гашка рэдагаваў часопіс “Сьвет жывёлаў” і палеміка з апанэнтамі там вялася амаль на такім жа ўзроўні. Калі, у прыватнасьці, зайшла размова пра ідэнтыфікацыю нявіннай птушкі карэзы (не ідэалёгіі), то рэдактар нарваўся на выказваньні, дзе самым нявінным было *“неадукаваная жывёліна”*, а круцейшая формула вылілася ў выказваньне *“карэза застанецца карэзай, нават калі б ваш рэдактар наклаў у штаны”*.

Цалкам натуральна, што палеміка такога кшталту бессэнсоўная і безьзьмястоўная. Дый наўрад ці можна “дабраць” грамадзкай саліднасьці ў ваччу чытацкай аўдыторыі, ідучы шляхам савецкай рыторыкі 30-х гадоў. Фразэалягічныя звароты кшталту *“обэр-бандыт Юда Троцкі”* могуць, вядома, надаць тэксту шэксьпіраўскую глыбіню й ясенінскую шчырасьць, вось толькі пры чым тут абвешчаная рэдакцыяй “ARCHE” прэтэнзія на эстэцтва?
Аднак сам па сабе прадмет размовы — маю на ўвазе ідэалёгію маладой беларускай дзяржаўнасьці — настолькі важны і актуальны, што ёсьць сэнс забыць дробныя ўкусы палітычных грызуноў і палемізаваць па сутнасьці, а не па форме. Натуральна, без прэтэнзіяў на “апошнюю кропку” ў канцы абзацу.

* * *

Першы тэзыс, на наш погляд, залючаецца ў тым, што нацыянальная ідэалёгія, як тэарэтычнае выяўленьне карэнных фундамэнтальных інтарэсаў беларускай нацыі, яшчэ толькі знаходзіцца ў стадыі фармаваньня. Кажучы больш жорстка, яе не існуе. Найперш у тым сэнсе, што яна не прызнаная інтэлектуальна і не авалодала масамі практычна. Можна прыводзіць колькі заўгодна прыкладаў пазытыўнага вырашэньня такога пытаньня: напрыклад, у Італіі эпохі Мадзіні і Гарыбальдзі, а крыху пазьней — Бэніта Мусаліні. Ці ў Нямеччыне эпохі Бісмарка, чыя “жалезная” рыторыка магла ўвагнаць у труну не аднаго клясычнага інтэлектуала, выхаванага на катэгарычным імпэратыве Канта. Тым ня менш менавіта яны, дрэздэнскія, кёнігсбэрскія, бэрлінскія прафэсары, дастаткова хутка транфармавалі сечаныя фразы канцлера аб неабходнасьці аб’яднаньня Нямеччыны “жалезам і крывёй” у прымальныя для парлямэнцкага вуха паліталягічныя максымы і лягічныя схемы. Гэта, галоўным чынам, датычыць таго, што спраўджаная, зрэалізаваная “палітычная зададзенасьць”, заснаваная на рэальных працэсах, заўсёды вышэйшая (першасьнейшая) за любыя тэарэтычныя экзэрсысы. Якімі б разумнымі, глыбокімі, угрунтаванымі на сусьветным досьведзе яны ні былі.
Да слова, амэрыканская нацыянальная ідэалёгія, замацаваная ў

вядомай Канстытуцыі, таксама ня вырасла раптоўна, на борце “Мэйфлаўэра” ці падчас міжусобнай бойні. Спатрэбіліся дзесяцігодзьдзі, каб амэрыканцы маглі з гонарам казаць пра тое, што яны жывуць у вялікай і вольнай краіне і, натуральна, што гэта было замацавана як тэарэтычна, так і фармальна. Такім чынам, няма чаго чакаць, што з дня на дзень на нас пральецца жыцьцядайны дождж у выглядзе эпахальных канцэпцыяў, адпаведных тэорыяў і поглядаў. Такога кшталту рэчы — маю на ўвазе, ведама, ідэалёгію — нацыя мусіць выпакутаваць, а не атрымаць у гатовым выглядзе. І відавочна, што ў гэтым сэнсе ні “Масква”, ні “Захад” нам не памочнікі. Мне здаецца, можна толькі вітаць намаганьні рэдакцыяў “Беларускай Думкі”, “Советской Белоруссии”, “ARCHE” за сталую цікавасьць да гэтай тэмы і імкненьне да зрухаў наперад — дзе навобмацак, а дзе й нацянькі.

* * *

Цяперака слова “ідэалёгія” і ў афіцыйных, і ў няўрадавых СМІ ўсё болей стасуецца з паняткам “дзяржава”. Крытычны патас шэрагу аўтараў, скіраваны на такога кшталту сувязь, здаецца, сама менш, празьмерным. Бо і “беларуская ідэалёгія”, і беларуская дзяржаўнасьць налічваюць ня надта вялікую колькасьць гадоў. А калі “прыбраць” савецкі пэрыяд, на чым таксама зрэдчас настойваюць, то размова пойдзе пра дзесяць год.

Мне здаецца, што тут, у рамках дадзенай праблемы, у найбольшай ступені сканцэнтравана палітычная ангажаванасьць тэарэтыкаў і практыкаў сучаснага беларускага ідэалягічнага працэсу. У тым сэнсе, што мэта апраўдвае і сродкі, і саму канцэптуальную сутнасьць тэарэтычных пабудоваў. Бо калі, напрыклад, размова ідзе пра такую ўстаноўку, як інтэграцыя ў Эўропу, то выглядае прываблівым тэзыс аб тым, што мы ўжо стагодзьдзямі знаходзімся ў яе рамках. Адпаведная аргумэнтацыя агульнавядомая. Існуе, натуральна, і іншы пункт гледжаньня, згодна зь якім “мы” і “Эўропа” — цывілізацыйныя антыподы і “скрыжавацца” ня можам ні ў водным, прабачце, ракурсе. Тут ня трэба цытаваць эпігонаў, дастаткова назваць катэхізыс адэптаў дадзенай плятформы, працу М. Данілеўскага “Расея і Эўропа”.

Праблема ж павінна разглядацца з прынцыпова іншых пазыцыяў: самадастатковасьці — у эканамічным, духоўным сэнсе — уласна дзяржавы Беларусі. І тут павінны валадарыць не летуценныя матывы, не напарфумаваныя насовачкі ў духу вэртэраўскай сэнтымэнтальнасьці, а самы жорсткі прагматызм. Што, дарэчы, і дэманструе — хай сабе і наступаючы на граблі — сучасная беларуская дзяржава. Звышзадача, калі адкінуць двудушныя фразы пра “дэмакратыю” і “правы чалавека”, гучыць гранічна адкрыта: трэба выжыць. І на сёньняшні дзень маладая беларуская дзяржаўнасьць вырашае пытаньне акурат пра здольнасьць да выжываньня — як эканамічную, ідэалягічную, так і палітычную. Далёка не выпадковым выглядае ў гэтай сувязі даволі часта чуты ад прэзыдэнта А. Лукашэнкі тэзыс пра тое, што мы “адбыліся як самастойная дзяржава”. Нават дапускаючы некаторую ўмоўнасьць гэтага палажэньня (прыгадаем, напрыклад, “недааформленыя” адносіны з Расеяй), трэба прызнаць галоўнае: задача выжываньня рэспублікі ў сёньняшні, ня самы лёгкі пэрыяд яе гісторыі, агулам вырашаная.

* * *

Нацыянальная ідэалёгія, мяркуючы па публікацыях, кепска мысьліцца без геаграфічна-цывілізацыйных вэктараў: заходняга і ўсходняга. Відаць, трэба адразу прызнаць, што нашае “славянафільства” і “заходніцтва” ёсьць карыкатурай на сапраўды глыбокія і зьмястоўна насычаныя арыгінальныя ідэйныя плыні. Па-першае, “нельга двойчы ўвайсьці ў адну й тую ж раку” і перажытае ў першай чвэрці XIX стагодзьдзя ў Расеі нам не перажыць па азначэньні. Па-другое, гістарычныя этапы яўна непадобныя, і сацыяльна-эканамічная і духоўная рэчаіснасьць мае нашмат болей прынцыповых адрозьненьняў, чым рысаў падабенства. Па-трэцяе, інтэлектуальныя сілы відавочна ня тыя: у прыватнасьці, на нашым грамадзкім небасхіле за апошні час так і не зьявіліся фігуры, роўныя сваім маштабам А. С. Хамякову ці П. Я. Чаадаеву. Як няма й знаку “Семирамид” ці “Философических писем”. Хіба што “Апологий сумасшедшего” маем звыш дастатку.
Што з гэтага вынікае? Толькі тое, што ня трэба блытаць “родавую” цягу да Расеі з тымі ці іншымі вытворнымі яе

інтэлектуальнай гісторыі. Нельга, дарэчы, выключаць, што цяга да расейскай інтэлектуальнай думкі XIX—XX стагодзьдзяў можа замаруджваць працэсы нацыянальнага адраджэньня. Але, відаць, хаця б якая глеба для фармаваньня альтэрнатываў гэтаму працэсу пакуль не сфармавалася.
І такое гіпатэтычнае пытаньне: што ж усё-ткі бліжэйшае, "цяплейшае" нашым традыцыям, нашым духоўным вытокам, нашай мэнтальнасьці — вытанчаны Ніцшэ ці шчыры Розанаў, геніяльны Шпэнглер ці мудры Салаўёў, змрочны К'еркегор ці паглыблены ў гістарычную мэлянхолію Мережкоўскі? Пытаньне якраз "гіпатэтычнае", бо культуру дзяліць нельга, яе крывяцёчныя сасуды не разьядноўваюцца. І разам з тым ёсьць "права першай кнігі", ёсьць улюбёны томік, запаветныя бачыны і біяграфіі, завучаныя на памяць. Ёсьць Пушкін — і гэтым шмат сказана.

* * *

Адной з праблемаў сучаснае філязофіі ідэалёгіі ёсьць яе скіраванасьць ці ў будучыню, ці ў мінуўшчыну. Тыповы прыклад — папрокі на адрас прадстаўнікоў цяперашняй афіцыйнай пазыцыі ў "савецкасьці", што тоесна рэліктаваму стану.
Памылка ў гэтым выпадку носіць выключна мэтадалягічны характар. Рэч у тым, што з крытэру прышласьці ўвогуле нельга зрабіць дакладнай высновы. Будучыні няма, яна рэальна не існуе. Бадай, і мінуўшчына ў гэтым кантэксьце "пад пытаньнем" — шмат у чым яно ўгрунтавана ў сьвядомасьці людзей, сацыяльным досьведзе і толькі часткова носіць матэрыяльны характар (напрыклад, археалягічны матэрыял). Але ў гэтай сыстэме катэгорыяў толькі мінулае валодае рэальнасьцю і толькі яно можа стаць апірышчам для аналізу цяпершчыны, а таксама для разгляду пэрспэктыўных ліній разьвіцьця соцыюму.
Чытач можа сказаць: гэта ж відавочна, навошта ламіцца ў адамкнёныя дзьверы. Каб жа ж так! Тая самая няспынная атака на "савецкасьць" пад лёзунгам будучыні ёсьць мэтанакіраванай палітыкай, зьвязанай з тымі ж празаходніцкімі арыентацыямі. Нам кажуць: во Польшча (Чэхія, ГДР…) стрэсла пыл сацыялізму са сваіх ног і яе ўжо не дагнаць, яна "ў Эўропе" [*па-беларуску ў*

тэксьце аўтара]. А мы са сваім анахранізмам ізноў у эўрапейскім тыле. І ні слова пра тое, што гістарычныя лёсы Польшчы і Беларусі маласупастаўныя. Што, напрыклад, не беларус гістарычна гнобіў і паліў палякаў, а ўсё было наадварот. Што ў нас дастаткова адрозная мэнтальная аўра, мэнтальнае поле. Так, жыць добра захочацца ўсім, толькі вось гэтага наўрад ці можна дасягнуць адвольнымі экстрапаляцыямі і палітычным жангляваньнем.

Калі глядзець праўдзе ў вочы, то акурат савецкая эпоха стварыла дзяржаву Беларусь. З усім прыўваходным ідыятызмам, у тым ліку партыйным, у тым ліку атэістычным. Да пачатку ХХ стагодзьдзя ў дзяржаўным сэнсе Беларусь была легендай — калі паэтычнай, калі й ня надта. А там вайна, другая, недаравальнае зьнішчэньне нацыянальных інтэлектуальных сілаў рэпрэсіўным апаратам КПСС, але пры ўсім тым менавіта тады беларуская дзяржаўнасьць пачала рабіць першыя крокі. І няма ніякага сэнсу ўпікаць каго-кольвек у анахранізьме. Так, калі б гісторыя ішла іншымі шляхамі, і крок быў бы зроблены іншы. Але маем тое, што маем. І трэба рухацца далей.

* * *

Трэба менавіта “зрабіць крок”, гэта значыць шукаць пазытыўнае, абапірацца на дасягнутае. Уяўляецца, што крытыцызм на сёньня ўжо цалкам зжыў сябе. Барыкады ў ідэалягічным працэсе ёсьць зьявай паўсюднай, але для Беларусі яны павінны стаць мінулым этапам. Можна яшчэ колькі заўгодна доўга крычаць ці “Захад!” ці “Ўсход!”, але ў роце саладчэй ня стане. Аснова для зьняцьця ідэалягічных барыкадаў можа быць знойдзена, як ужо гаварылася, у разуменьні самадастатковасьці беларускай нацыі, яе цэльнасьці, мажлівасьці існаваньня ва ўласным мэнтальным полі. Маленькая Данія дала сьвету “самага нябогу зь людзей” — Сёрэна К’еркегора. Невялічкая Чэхія падаравала інтэлектуалам “каўку” — Кафку. Галяндыя — Сьпінозу. Гэты пералік даволі доўгі, але сутнасьць не ў імёнах, а ў факце: нацыя сама, з сваіх глыбінь, вылучае нацыянальных геніяў. І вось гэта — адна з прыкметаў самадастатковасьці. На вялікі жаль, у нас геніі прыціснуты сваёй жа ўласнай талерантнасьцю,

але гэта зусім не азначае, што іх зусім не існуе. Уяўляецца, што грамадзкая сьвядомасьць павінна замірыцца з індывідуалізмам таленавітых людзей, прызнаць іх. Мы да гэтага часу носімся з ідэяй *абшчыннасьці*, калектывізму (і гэта ў аснове сваёй слушныя і патрэбныя ідэі), але, магчыма, варта даць дарогу і эгацэнтрызму, безь якога генія не існуе.
Адхіляючыся, заўважу, што нацыянальная інтэлектуальная традыцыя наагул лёгка ўспрымала аскетычныя, рыгарыстычныя плыні. А вось зьвязанае з прынцыпам задавальненьня, шчасьця мінала яе. Вось і эпікурэйцаў у нас амаль няма, а аскетаў зашмат.
Вялікія людзі прыгадаліся далёка не выпадкова. Бо ідэалёгія наўрад ці народзіцца ў пячорным розуме траглядыта. Каб узьнікла камуністычная ідэя, спатрэбіўся сьветлы розум Т. Кампанэлы і Т. Мора, ідэалёгія нацызму “высмактала ўсе сокі” зь ніцшэанства. Ёсьць свае папярэднікі ў “амэрыканскай мары” і тэорыі негрыцюду, славянафільства і заходніцтва. Іншымі словамі, дзяржава, грамадзтва не павінны глядзець на інтэлектуалаў як на іншаземцаў з падазроным радаводам. Маю на ўвазе і грамадзкую думку, і заробак.

* * *

Ну і што ў выніку? Мне здаецца, трэба рашуча адмовіцца — што да ідэалёгіі — ад такіх паняткаў, як “архаіка”, “савецкасьць”, “вэктарнасьць”, “славянафільства”, “заходніцтва”. Сьвет сапраўды адзіны, але і мы як нацыя — адзіныя. Таму катэгарыяльным цэнтрам павінна стаць “самадастатковасьць” у гранічна шырокім разуменьні гэтага слова. Калі нацыяналізм, напрыклад, не разрывае, а паглыбляе і пашырае межы “самадастатковасьці”, няма сэнсу пярэчыць такому нацыяналізму. Калі культура, інтэграцыйная па духу, кансалідуе нацыю, разьвіваючы “самадастатковасьць”, — няхай жыве культура. Калі Зьбігнеў Бжазіньскі турбуецца не абстрактнай інтэграцыяй і дэмакратызацыяй, а ростам самадастатковасьці беларускай нацыі, я гатовы стаць нэафітам новай веры. Калі расійскі ці заходні духоўны кантэкст супярэчаць руху нацыі да эканамічнай, палітычнай, інтэлектуальнай самадастатковасьці, то я супраць гэтага кантэксту.

І замест заканчэньня. Мне здаюцца вельмі важкімі словы “ідэалёгія лукашэнкаўскага рэжыму”, якімі насычаны — у той ці іншый інтэрпрэтацыі — неафіцыйныя СМІ. Справа на тое, што такім прызнаньнем не ўганараваныя сваім часам ні С. Шушкевіч, ні С. Шарэцкі, ні З. Пазьняк. Неяк не прыгадваюцца фразэалягічныя звароты накшталт “ідэалёгія шушкевіцкага рэжыму”. А гэта гаворыць толькі пра адно: ідэалёгія “лукашэнкаўскага рэжыму” ўсё ж адбылася. Няпоўна, зь недагаворкамі, у шэрагу выпадкаў бессыстэмна і супярэчліва, але — адбылася. Што сьведчыць і пра яе жыцьцяздольнасьць, і пра магчымасьць самаразьвіцьця.
Пераклад з расійскае

Ад рэдакцыі

1.
Яшчэ нядаўна будучы скіраванымі збольшага на “агульнасаюзную”, савецкую гуманітарную прастору, навукоўцы-грамадазнаўцы асвойваюць беларускі інтэлектуальны рынак. Аднак ператварэньне “савецкага грамадазнаўца” ў “беларускага інтэлектуала” шмат каму даецца зь цяжкасьцю. Сфармаваны цягам дзясяткаў гадоў сьветапоглядны стандарт выяўляе сваю дзіўную стабільнасьць, асабліва ў частцы навуковага апарату і інтэрпрэтацыйных мадэляў. А безь іх грунтоўнай рэвізіі глянуць на сьвет па-новаму праблематычна. Апрача таго, палітычны клімат у Беларусі ня надта спрыяе разрыву з традыцыямі савецкай гуманістыкі.
Тым ня менш, аблічча беларускай навукі зьмяняецца пакрыёма. Допіс у рэдакцыю “ARCHE” былога работніка Берасьцейскага абкаму КПБ, а цяпер выкладчыка філязофіі Барыса Ляпешкі — знак эманцыпацыі гуманітараў сярэдняга пакаленьня, іхнай адкрытасьці да дыялёгу з апанэнтамі “на полі праціўніка”. І

гэта вельмі важна, бо толькі адкрытасьць можа быць выходным пунктам для збліжэньня. І наадварот, з закрытасьці пачынаецца аддаленасьць.

2.

Інтэлектуальны партрэт Барыса Ляпешкі, характэрныя рысы яго мысьленьня выяўляюцца пры звароце да ягоных публікацый — ня толькі ў часопісе “Беларуская Думка”, пра якія гаварылася ў папярэдніх нумараў “ARCHE-Скарыны”. На бачынах “Советской Белоруссии” таксама рэгулярна зьяўляюцца яго публікацыі на розныя злабадзённыя тэмы. У нядаўняй публікацыі “Анатомія ілжы” (19.07.2001) Ляпешка гнеўна пратэставаў супраць арышту і “зладзейскага” перавозу ў Гаагу экс-прэзыдэнта Югаславіі Слабадана Мілошавіча (свае маралізатарскія развагі аўтар адкрывае так: “Сусьветная і ў першую чаргу славянская гісторыя дастаткова насычана падзеямі, пасьля якіх адбывалася прынамсі маральнае ўзрушэньне грамадзтва. ...У нацыянальнай, славянскай гісторыі таксама досыць шмат выпадкаў маральных узрушэньняў грамадзтва”. У нарысе “Паміж намі, правінцыяламі” ад 06.07.2001 ён іранізуе з “отечественных самобичующихся псевдоинтеллектуалов в тулупчиках с чужого плеча”, а ў эсэ “Аз есмь пуп Земли?” за 24.05.2001 вызначае Злучаныя Штаты як “супэрцывілізацыю, у аснову якой былі закладзеныя прагматызм, эгацэнтрызм, агрэсіўнасьць і прага прыбытку “ў асабліва цынічнай форме”. І дадае: “Амэрыка, краіна стандартаў, у другой палавіне XX стагодзьдзя выбілася з сусьветнага цывілізацыйнага стандарту... У гіпэртрафаваным выглядзе праявілася палітычная нецярпімасьць, мэтастазы якой нескладана пабачыць ува ўсіх кутках зямной кулі. Была пастаўленая на канвэер вытворчасьць “фігавых лісткоў”: ад “правоў чалавека” да “правільных і няправільных прэзыдэнтаў”. У эсэ “Глёбус пад камлыгай глябалізацыі” (24.11.2000) Ляпешка пайшоў далей у сваёй крытыцы “амэрыканскага ладу жыцьця”: “... амэрыканізацыя азначае прапаганду аднапалярнага сьвету з Манблянам у выглядзе канстытуцыі “айцоў-заснавальнікаў”... амэрыканізацыя... азначае навязваньне гатовых стандартаў ладу жыцьця”. Вельмі паказальныя думкі чытач знойдзе ў зацемцы “Наша праўда” (12.01.2001): “... пра агульначалавечыя

вартасьці можна і трэба ўзгадваць, але калі забясьпечаны нацыянальны інтарэс і асэнсаваныя нацыянальныя прыярытэты". "Агульначалавечыя вартасьці" паводле сваіх адмоўных канатацый у мысьленьні Ляпешкі неяк дзіўна спалучаюцца з "правамі чалавека" ("правы чалавека" неўпрыкмет ператвараюцца ў глябальную ідэалягему наступальнага характару, нават у ідэалягічны дручок, якім можна пляжыць тыя галовы, якія, нягледзячы ні на што, усё ж "не разумеюць" дабротаў, якія перад імі адкрываюцца... ("Меркаваньне: Пра сэнс гістарычных традыцый" (28.06.2000). У дадатак да ўсяго наш апанэнт — носьбіт своеасаблівага пачуцьця гумару, якое напоўніцу выяўляецца ў выразах накшталт "адказ шукай у катухах Эдыпавага комплексу, які сваёй элітнасьцю і элітарнасьцю нагадвае комплекс жывёлагадоўчы" або "задуменна-мэнтальнае калупаньне ў носе". Некаму такое пачуцьцё гумару можа падацца постмадэрнісцкім.
Гэтыя цытаты сьведчаць, што пазыцыя і стыль сп.Ляпешкі тыповыя для ягонага кола.

3.
Вэрсію ідэалёгіі, якую адстойвае Барыс Ляпешка, можна назваць "патрыятычна-крэольскай". "Патрыятычнай" таму, што яна чуйна адгукаецца на найменшыя зрухі палітычнага курсу сучаснага рэжыму (гэта стала асабліва відавочна падчас сёлетняй перадвыбарнай гонкі ў працэсе маніпуляцый лукашэнкаўскіх паліттэхнолягаў з тэмай "беларуска-расійскай інтэграцыі", якая няўзнак трапіла ў "прапагандысцкі цень"; ідэолягі рэжыму вельмі чуйна адрэагавалі на рашэньні паліттэхнолягаў: калі трэба, зробім акцэнт на інтэграцыі, а як скамандуюць, выступім і за сувэрэнітэт). "Крэольскай" жа таму, што яна ў варунках постсавецкага нэакаляніялізму ўвабрала ў сябе цяжка спалучальныя міжсобку элемэнты — іншародную культурную традыцыю і адначасна тутэйшы разнавід нацыяналізму, заснаваны перш-наперш на ідэнтыфікацыі з "маладой беларускай дзяржавай" і яе атрыбутамі (у тым ліку першым беларускім прэзыдэнтам).
Акурат фактарам нацыяналізму, а не нейкай міталягізаванай таталітарнай сьвядомасьці мы схільныя тлумачыць усе гэтыя

“выкрывальніцкія” пасажы пра “двудушныя фразы аб “дэмакратыі” і “правах чалавека”. Да слова, прыкладна такую пазыцыю займаюць і нацыяналістычныя плыні ўва ўсёй Эўропе (ад француза Лё Пэна да ўкраінца Зьмітра Карчынскага, былога лідэра УНА-УНСО).
Досыць заканамерна, што для абслугоўваньня сваёй візіі нацыяналізму як “асаблівага шляху” Ляпешка карыстаецца аргумэнтацыяй і прыёмамі той расійскай культурнай традыцыі, якая традыцыйна вызначалася ксэнафобіяй і ізаляцыянізмам: “Існуе, натуральна, і іншы пункт гледжаньня, згодна зь якім “мы” і “Эўропа” – цывілізацыйныя антыподы і “скрыжавацца” ня можам ні ў водным, прабачце, ракурсе. Тут ня трэба цытаваць эпігонаў, дастаткова назваць катэхізыс адэптаў дадзенай плятформы, працу М. Данілеўскага “Расея і Эўропа”. Пры гэтым неўпрыкмет адбываецца падмена паняцьцяў, бо аўтарскае “мы” ў гэтым выпадку ўжо абазначае ніяк не “Беларусь” і не “беларускую дзяржаву”, а хутчэй тое, што пазначана ў першай частцы загалоўку працы М. Данілеўскага. Аднак для антынамічнага, канфрантацыйнага мысьленьня афіцыйных беларускіх ідэолягаў гэткі падыход выглядае вельмі прадуктыўным, чым і тлумачацца такія частыя звароты да яго. “Нашае “славянафільства” і “заходніцтва” ёсьць карыкатурай на сапраўды глыбокія і зьмястоўна насычаныя арыгінальныя ідэйныя плыні”, — сьцьвярджае Барыс Ляпешка, і, відаць, сам не адчувае, наколькі ён мае рацыю.
(Тое самае можна сказаць і пра пасажы накшталт “на нашым грамадзкім небасхіле за апошні час так і не зьявіліся фігуры, роўныя сваім маштабам А. С. Хамякову ці П. Я. Чаадаеву. Як няма й знаку “Семирамид” ці “Философических писем”.)
Дык жа ““родавая” цяга да Расеі” выклікана прычынамі вельмі празаічнымі, таму што сфармаваная ў яе культурным полі інтэлектуальная традыцыя ў канфрантацыі з сусьветнай цывілізацыяй сталася надзіва актуальнай у першую дэкаду незалежнай Беларусі.

4.

Допіс Ляпешкі таксама сьведчыць, як мала зроблена ў справе дзяржаўнага будаўніцтва за дзесяць гадоў беларускай незалежнасьці. Ён выразна даводзіць, што ў асяродзьдзі

беларускай інтэлігенцыі дагэтуль маюць шырокае распаўсюджаньне імпэрскія міты ў духу “савецкая эпоха стварыла дзяржаву Беларусь”, “да пачатку XX стагодзьдзя ў дзяржаўным сэнсе Беларусь была легендай”. І што самае фатальнае, сярод тых элітаў, якія пайшлі на калябарацыю з лукашэнкаўскім рэжымам, не адбылося ідэнтыфікацыі з уласнай, айчыннай культурнай традыцыяй. Клішэ накшталт “маленькая Данія”, “невялічкая Чэхія”, “нацыянальная інтэлектуальная традыцыя наагул лёгка ўспрымала аскетычныя, рыгарыстычныя плыні” (відавочна, ідзецца пра расійскую, а не беларускую традыцыю) паказваюць, што беларускі інтэлектуальны афіцыёз дагэтуль дзівіцца на сьвет праз чужыя акуляры.
Палеміка на тэму ідэалёгіі сучаснага беларускага рэжыму ў цэлым пацьвярджае той відавочны факт, што ніводная палітычная сыстэма ня можа стабільна існаваць без зваротнай сувязі з сваім грамадзтвам, без вызначэньня прыцягальных пэрспэктываў разьвіцьця. У выпадку Беларусі само зацікаўленьне гэтай тэмай ускосна сьведчыць аб працэсе сувэрэнізацыі ня толькі празаходне настроенай інтэлігенцыі, але й па-прарасейску настроенай часткі інтэлектуальных элітаў.
[*Рэдактар*]

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 4 (18) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: **06-10-2001**
[image]

Барыс Ляпешка

• Філязофія самадастатковасьці
• Ад рэдакцыі

Філязофія самадастатковасьці

---

*Ч*асопіс “ARCHE”, у ліку іншых рэспубліканскіх выданьняў, даволі актыўна зьвяртаецца да ідэалягічнай праблематыкі. Тыповым па пастаўленых пытаньнях і адпаведнай аргумэнтацыі зьяўляецца матэрыял, надрукаваны ў № 1 (15) за 2001 год: “Ідэалёгія лукашэнкаўскага рэжыму”. Чытаючы працу В. Булгакава, насычаную такімі мілымі выказваньнямі на адрас апанэнтаў, як *“купка параноікаў”*, *“дамаслыя Вялічкі і Ляпешкі”*, *“прадстаўнікі “паранаідальнага кірунку” ў афіцыйнай беларускай ідэалёгіі”*, чамусьці адразу прыгадваецца Яраслаў Гашак і ягоны славуты Швэйк. Як вядома, адзін з герояў Гашка рэдагаваў часопіс “Сьвет жывёлаў” і палеміка з апанэнтамі там вялася амаль на такім жа ўзроўні. Калі, у прыватнасьці, зайшла размова пра ідэнтыфікацыю нявіннай птушкі карэзы (не ідэалёгіі), то рэдактар нарваўся на выказваньні, дзе самым нявінным было *“неадукаваная жывёліна”*, а круцейшая формула вылілася ў выказваньне *“карэза застанецца карэзай, нават калі б ваш рэдактар наклаў у штаны”*.

Цалкам натуральна, што палеміка такога кшталту бессэнсоўная і безьзьмястоўная. Дый наўрад ці можна “дабраць” грамадзкай саліднасьці ў ваччу чытацкай аўдыторыі, ідучы шляхам савецкай рыторыкі 30-х гадоў. Фразэалягічныя звароты кшталту *“обэр-бандыт Юда Троцкі”* могуць, вядома, надаць тэксту шэксьпіраўскую глыбіню й ясенінскую шчырасьць, вось толькі пры чым тут абвешчаная рэдакцыяй “ARCHE” прэтэнзія на эстэцтва?
Аднак сам па сабе прадмет размовы — маю на ўвазе ідэалёгію маладой беларускай дзяржаўнасьці — настолькі важны і актуальны, што ёсьць сэнс забыць дробныя ўкусы палітычных грызуноў і палемізаваць па сутнасьці, а не па форме. Натуральна, без прэтэнзіяў на “апошнюю кропку” ў канцы абзацу.

* * *

Першы тэзыс, на наш погляд, залючаецца ў тым, што нацыянальная ідэалёгія, як тэарэтычнае выяўленьне карэнных фундамэнтальных інтарэсаў беларускай нацыі, яшчэ толькі знаходзіцца ў стадыі фармаваньня. Кажучы больш жорстка, яе не існуе. Найперш у тым сэнсе, што яна не прызнаная інтэлектуальна і не авалодала масамі практычна. Можна прыводзіць колькі заўгодна прыкладаў пазытыўнага вырашэньня такога пытаньня: напрыклад, у Італіі эпохі Мадзіні і Гарыбальдзі, а крыху пазьней — Бэніта Мусаліні. Ці ў Нямеччыне эпохі Бісмарка, чыя “жалезная” рыторыка магла ўвагнаць у труну не аднаго клясычнага інтэлектуала, выхаванага на катэгарычным імпэратыве Канта. Тым ня менш менавіта яны, дрэздэнскія, кёнігсбэрскія, бэрлінскія прафэсары, дастаткова хутка транфармавалі сечаныя фразы канцлера аб неабходнасьці аб’яднаньня Нямеччыны “жалезам і крывёй” у прымальныя для парлямэнцкага вуха паліталягічныя максымы і лягічныя схемы. Гэта, галоўным чынам, датычыць таго, што спраўджаная, зрэалізаваная “палітычная зададзенасьць”, заснаваная на рэальных працэсах, заўсёды вышэйшая (першасьнейшая) за любыя тэарэтычныя экзэрсысы. Якімі б разумнымі, глыбокімі, угрунтаванымі на сусьветным досьведзе яны ні былі.
Да слова, амэрыканская нацыянальная ідэалёгія, замацаваная ў

вядомай Канстытуцыі, таксама ня вырасла раптоўна, на борце “Мэйфлаўэра” ці падчас міжусобнай бойні. Спатрэбіліся дзесяцігодзьдзі, каб амэрыканцы маглі з гонарам казаць пра тое, што яны жывуць у вялікай і вольнай краіне і, натуральна, што гэта было замацавана як тэарэтычна, так і фармальна. Такім чынам, няма чаго чакаць, што з дня на дзень на нас пральецца жыцьцядайны дождж у выглядзе эпахальных канцэпцыяў, адпаведных тэорыяў і поглядаў. Такога кшталту рэчы — маю на ўвазе, ведама, ідэалёгію — нацыя мусіць выпакутаваць, а не атрымаць у гатовым выглядзе. І відавочна, што ў гэтым сэнсе ні “Масква”, ні “Захад” нам не памочнікі. Мне здаецца, можна толькі вітаць намаганьні рэдакцыяў “Беларускай Думкі”, “Советской Белоруссии”, “ARCHE” за сталую цікавасьць да гэтай тэмы і імкненьне да зрухаў наперад — дзе навобмацак, а дзе й нацянькі.

* * *

Цяперака слова “ідэалёгія” і ў афіцыйных, і ў няўрадавых СМІ ўсё болей стасуецца з паняткам “дзяржава”. Крытычны патас шэрагу аўтараў, скіраваны на такога кшталту сувязь, здаецца, сама менш, празьмерным. Бо і “беларуская ідэалёгія”, і беларуская дзяржаўнасьць налічваюць ня надта вялікую колькасьць гадоў. А калі “прыбраць” савецкі пэрыяд, на чым таксама зрэдчас настойваюць, то размова пойдзе пра дзесяць год.

Мне здаецца, што тут, у рамках дадзенай праблемы, у найбольшай ступені сканцэнтравана палітычная ангажаванасьць тэарэтыкаў і практыкаў сучаснага беларускага ідэалягічнага працэсу. У тым сэнсе, што мэта апраўдвае і сродкі, і саму канцэптуальную сутнасьць тэарэтычных пабудоваў. Бо калі, напрыклад, размова ідзе пра такую ўстаноўку, як інтэграцыя ў Эўропу, то выглядае прываблівым тэзыс аб тым, што мы ўжо стагодзьдзямі знаходзімся ў яе рамках. Адпаведная аргумэнтацыя агульнавядомая. Існуе, натуральна, і іншы пункт гледжаньня, згодна зь якім “мы” і “Эўропа” — цывілізацыйныя антыподы і “скрыжавацца” ня можам ні ў водным, прабачце, ракурсе. Тут ня трэба цытаваць эпігонаў, дастаткова назваць катэхізыс адэптаў дадзенай плятформы, працу М. Данілеўскага “Расея і Эўропа”.

Праблема ж павінна разглядацца з прынцыпова іншых пазыцыяў: самадастатковасьці — у эканамічным, духоўным сэнсе — уласна дзяржавы Беларусі. І тут павінны валадарыць не летуценныя матывы, не напарфумаваныя насовачкі ў духу вэртэраўскай сэнтымэнтальнасьці, а самы жорсткі прагматызм. Што, дарэчы, і дэманструе — хай сабе і наступаючы на граблі — сучасная беларуская дзяржава. Звышзадача, калі адкінуць двудушныя фразы пра “дэмакратыю” і “правы чалавека”, гучыць гранічна адкрыта: трэба выжыць. І на сёньняшні дзень маладая беларуская дзяржаўнасьць вырашае пытаньне акурат пра здольнасьць да выжываньня — як эканамічную, ідэалягічную, так і палітычную. Далёка не выпадковым выглядае ў гэтай сувязі даволі часта чуты ад прэзыдэнта А. Лукашэнкі тэзыс пра тое, што мы “адбыліся як самастойная дзяржава”. Нават дапускаючы некаторую ўмоўнасьць гэтага палажэньня (прыгадаем, напрыклад, “недааформленыя” адносіны з Расеяй), трэба прызнаць галоўнае: задача выжываньня рэспублікі ў сёньняшні, ня самы лёгкі пэрыяд яе гісторыі, агулам вырашаная.

* * *

Нацыянальная ідэалёгія, мяркуючы па публікацыях, кепска мысьліцца без геаграфічна-цывілізацыйных вэктараў: заходняга і ўсходняга. Відаць, трэба адразу прызнаць, што нашае “славянафільства” і “заходніцтва” ёсьць карыкатурай на сапраўды глыбокія і зьмястоўна насычаныя арыгінальныя ідэйныя плыні. Па-першае, “нельга двойчы ўвайсьці ў адну й тую ж раку” і перажытае ў першай чвэрці XIX стагодзьдзя ў Расеі нам не перажыць па азначэньні. Па-другое, гістарычныя этапы яўна непадобныя, і сацыяльна-эканамічная і духоўная рэчаіснасьць мае нашмат болей прынцыповых адрозьненьняў, чым рысаў падабенства. Па-трэцяе, інтэлектуальныя сілы відавочна ня тыя: у прыватнасьці, на нашым грамадзкім небасхіле за апошні час так і не зьявіліся фігуры, роўныя сваім маштабам А. С. Хамякову ці П. Я. Чаадаеву. Як няма й знаку “Семирамид” ці “Философических писем”. Хіба што “Апологий сумасшедшего” маем звыш дастатку.
Што з гэтага вынікае? Толькі тое, што ня трэба блытаць “родавую” цягу да Расеі з тымі ці іншымі вытворнымі яе

інтэлектуальнай гісторыі. Нельга, дарэчы, выключаць, што цяга да расейскай інтэлектуальнай думкі XIX—XX стагодзьдзяў можа замаруджваць працэсы нацыянальнага адраджэньня. Але, відаць, хаця б якая глеба для фармаваньня альтэрнатываў гэтаму працэсу пакуль не сфармавалася.
І такое гіпатэтычнае пытаньне: што ж усё-ткі бліжэйшае, "цяплейшае" нашым традыцыям, нашым духоўным вытокам, нашай мэнтальнасьці — вытанчаны Ніцшэ ці шчыры Розанаў, геніяльны Шпэнглер ці мудры Салаўёў, змрочны К'еркегор ці паглыблены ў гістарычную мэлянхолію Мережкоўскі? Пытаньне якраз "гіпатэтычнае", бо культуру дзяліць нельга, яе крывяцёчныя сасуды не разьядноўваюцца. І разам з тым ёсьць "права першай кнігі", ёсьць улюбёны томік, запаветныя бачыны і біяграфіі, завучаныя на памяць. Ёсьць Пушкін — і гэтым шмат сказана.

* * *

Адной з праблемаў сучаснае філязофіі ідэалёгіі ёсьць яе скіраванасьць ці ў будучыню, ці ў мінуўшчыну. Тыповы прыклад — папрокі на адрас прадстаўнікоў цяперашняй афіцыйнай пазыцыі ў "савецкасьці", што тоесна рэліктаваму стану.
Памылка ў гэтым выпадку носіць выключна мэтадалягічны характар. Рэч у тым, што з крытэру прышласьці ўвогуле нельга зрабіць дакладнай высновы. Будучыні няма, яна рэальна не існуе. Бадай, і мінуўшчына ў гэтым кантэксьце "пад пытаньнем" — шмат у чым яно ўгрунтавана ў сьвядомасьці людзей, сацыяльным досьведзе і толькі часткова носіць матэрыяльны характар (напрыклад, археалягічны матэрыял). Але ў гэтай сыстэме катэгорыяў толькі мінулае валодае рэальнасьцю і толькі яно можа стаць апірышчам для аналізу цяпершчыны, а таксама для разгляду пэрспэктыўных ліній разьвіцьця соцыюму.
Чытач можа сказаць: гэта ж відавочна, навошта ламіцца ў адамкнёныя дзьверы. Каб жа ж так! Тая самая няспынная атака на "савецкасьць" пад лёзунгам будучыні ёсьць мэтанакіраванай палітыкай, зьвязанай з тымі ж празаходніцкімі арыентацыямі. Нам кажуць: во Польшча (Чэхія, ГДР…) стрэсла пыл сацыялізму са сваіх ног і яе ўжо не дагнаць, яна "ў Эўропе" [*па-беларуску ў*

тэксьце аўтара]. А мы са сваім анахранізмам ізноў у эўрапейскім тыле. І ні слова пра тое, што гістарычныя лёсы Польшчы і Беларусі маласупастаўныя. Што, напрыклад, не беларус гістарычна гнобіў і паліў палякаў, а ўсё было наадварот. Што ў нас дастаткова адрозная мэнтальная аўра, мэнтальнае поле. Так, жыць добра захочацца ўсім, толькі вось гэтага наўрад ці можна дасягнуць адвольнымі экстрапаляцыямі і палітычным жангляваньнем.

Калі глядзець праўдзе ў вочы, то акурат савецкая эпоха стварыла дзяржаву Беларусь. З усім прыўваходным ідыятызмам, у тым ліку партыйным, у тым ліку атэістычным. Да пачатку ХХ стагодзьдзя ў дзяржаўным сэнсе Беларусь была легендай — калі паэтычнай, калі й ня надта. А там вайна, другая, недаравальнае зьнішчэньне нацыянальных інтэлектуальных сілаў рэпрэсіўным апаратам КПСС, але пры ўсім тым менавіта тады беларуская дзяржаўнасьць пачала рабіць першыя крокі. І няма ніякага сэнсу ўпікаць каго-кольвек у анахранізьме. Так, калі б гісторыя ішла іншымі шляхамі, і крок быў бы зроблены іншы. Але маем тое, што маем. І трэба рухацца далей.

* * *

Трэба менавіта “зрабіць крок”, гэта значыць шукаць пазытыўнае, абапірацца на дасягнутае. Уяўляецца, што крытыцызм на сёньня ўжо цалкам зжыў сябе. Барыкады ў ідэалягічным працэсе ёсьць зьявай паўсюднай, але для Беларусі яны павінны стаць мінулым этапам. Можна яшчэ колькі заўгодна доўга крычаць ці “Захад!” ці “Ўсход!”, але ў роце саладчэй ня стане. Аснова для зьняцьця ідэалягічных барыкадаў можа быць знойдзена, як ужо гаварылася, у разуменьні самадастатковасьці беларускай нацыі, яе цэльнасьці, мажлівасьці існаваньня ва ўласным мэнтальным полі. Маленькая Данія дала сьвету “самага нябогу зь людзей” — Сёрэна К’еркегора. Невялічкая Чэхія падаравала інтэлектуалам “каўку” — Кафку. Галяндыя — Сьпінозу. Гэты пералік даволі доўгі, але сутнасьць не ў імёнах, а ў факце: нацыя сама, з сваіх глыбінь, вылучае нацыянальных геніяў. І вось гэта — адна з прыкметаў самадастатковасьці. На вялікі жаль, у нас геніі прыціснуты сваёй жа ўласнай талерантнасьцю,

але гэта зусім не азначае, што іх зусім не існуе. Уяўляецца, што грамадзкая сьвядомасьць павінна замірыцца з індывідуалізмам таленавітых людзей, прызнаць іх. Мы да гэтага часу носімся з ідэяй *абшчыннасьці*, калектывізму (і гэта ў аснове сваёй слушныя і патрэбныя ідэі), але, магчыма, варта даць дарогу і эгацэнтрызму, безь якога генія не існуе.
Адхіляючыся, заўважу, што нацыянальная інтэлектуальная традыцыя наагул лёгка ўспрымала аскетычныя, рыгарыстычныя плыні. А вось зьвязанае з прынцыпам задавальненьня, шчасьця мінала яе. Вось і эпікурэйцаў у нас амаль няма, а аскетаў зашмат.
Вялікія людзі прыгадаліся далёка не выпадкова. Бо ідэалёгія наўрад ці народзіцца ў пячорным розуме траглядыта. Каб узьнікла камуністычная ідэя, спатрэбіўся сьветлы розум Т. Кампанэлы і Т. Мора, ідэалёгія нацызму “высмактала ўсе сокі” зь ніцшэанства. Ёсьць свае папярэднікі ў “амэрыканскай мары” і тэорыі негрыцюду, славянафільства і заходніцтва. Іншымі словамі, дзяржава, грамадзтва не павінны глядзець на інтэлектуалаў як на іншаземцаў з падазроным радаводам. Маю на ўвазе і грамадзкую думку, і заробак.

* * *

Ну і што ў выніку? Мне здаецца, трэба рашуча адмовіцца — што да ідэалёгіі — ад такіх паняткаў, як “архаіка”, “савецкасьць”, “вэктарнасьць”, “славянафільства”, “заходніцтва”. Сьвет сапраўды адзіны, але і мы як нацыя — адзіныя. Таму катэгарыяльным цэнтрам павінна стаць “самадастатковасьць” у гранічна шырокім разуменьні гэтага слова. Калі нацыяналізм, напрыклад, не разрывае, а паглыбляе і пашырае межы “самадастатковасьці”, няма сэнсу пярэчыць такому нацыяналізму. Калі культура, інтэграцыйная па духу, кансалідуе нацыю, разьвіваючы “самадастатковасьць”, — няхай жыве культура. Калі Зьбігнеў Бжазіньскі турбуецца не абстрактнай інтэграцыяй і дэмакратызацыяй, а ростам самадастатковасьці беларускай нацыі, я гатовы стаць нэафітам новай веры. Калі расійскі ці заходні духоўны кантэкст супярэчаць руху нацыі да эканамічнай, палітычнай, інтэлектуальнай самадастатковасьці, то я супраць гэтага кантэксту.

І замест заканчэньня. Мне здаюцца вельмі важкімі словы “ідэалёгія лукашэнкаўскага рэжыму”, якімі насычаны — у той ці іншый інтэрпрэтацыі — неафіцыйныя СМІ. Справа на тое, што такім прызнаньнем не ўганараваныя сваім часам ні С. Шушкевіч, ні С. Шарэцкі, ні З. Пазьняк. Неяк не прыгадваюцца фразэалягічныя звароты накшталт “ідэалёгія шушкевіцкага рэжыму”. А гэта гаворыць толькі пра адно: ідэалёгія “лукашэнкаўскага рэжыму” ўсё ж адбылася. Няпоўна, зь недагаворкамі, у шэрагу выпадкаў бессыстэмна і супярэчліва, але — адбылася. Што сьведчыць і пра яе жыцьцяздольнасьць, і пра магчымасьць самаразьвіцьця.
Пераклад з расійскае

Ад рэдакцыі

1.
Яшчэ нядаўна будучы скіраванымі збольшага на “агульнасаюзную”, савецкую гуманітарную прастору, навукоўцы-грамадазнаўцы асвойваюць беларускі інтэлектуальны рынак. Аднак ператварэньне “савецкага грамадазнаўца” ў “беларускага інтэлектуала” шмат каму даецца зь цяжкасьцю. Сфармаваны цягам дзясяткаў гадоў сьветапоглядны стандарт выяўляе сваю дзіўную стабільнасьць, асабліва ў частцы навуковага апарату і інтэрпрэтацыйных мадэляў. А безь іх грунтоўнай рэвізіі глянуць на сьвет па-новаму праблематычна. Апрача таго, палітычны клімат у Беларусі ня надта спрыяе разрыву з традыцыямі савецкай гуманістыкі.
Тым ня менш, аблічча беларускай навукі зьмяняецца пакрыёма. Допіс у рэдакцыю “ARCHE” былога работніка Берасьцейскага абкаму КПБ, а цяпер выкладчыка філязофіі Барыса Ляпешкі — знак эманцыпацыі гуманітараў сярэдняга пакаленьня, іхнай адкрытасьці да дыялёгу з апанэнтамі “на полі праціўніка”. І

гэта вельмі важна, бо толькі адкрытасьць можа быць выходным пунктам для збліжэньня. І наадварот, з закрытасьці пачынаецца аддаленасьць.

2.

Інтэлектуальны партрэт Барыса Ляпешкі, характэрныя рысы яго мысьленьня выяўляюцца пры звароце да ягоных публікацый — ня толькі ў часопісе “Беларуская Думка”, пра якія гаварылася ў папярэдніх нумараў “ARCHE-Скарыны”. На бачынах “Советской Белоруссии” таксама рэгулярна зьяўляюцца яго публікацыі на розныя злабадзённыя тэмы. У нядаўняй публікацыі “Анатомія ілжы” (19.07.2001) Ляпешка гнеўна пратэставаў супраць арышту і “зладзейскага” перавозу ў Гаагу экс-прэзыдэнта Югаславіі Слабадана Мілошавіча (свае маралізатарскія развагі аўтар адкрывае так: “Сусьветная і ў першую чаргу славянская гісторыя дастаткова насычана падзеямі, пасьля якіх адбывалася прынамсі маральнае ўзрушэньне грамадзтва. ...У нацыянальнай, славянскай гісторыі таксама досыць шмат выпадкаў маральных узрушэньняў грамадзтва”. У нарысе “Паміж намі, правінцыяламі” ад 06.07.2001 ён іранізуе з “отечественных самобичующихся псевдоинтеллектуалов в тулупчиках с чужого плеча”, а ў эсэ “Аз есмь пуп Земли?” за 24.05.2001 вызначае Злучаныя Штаты як “супэрцывілізацыю, у аснову якой былі закладзеныя прагматызм, эгацэнтрызм, агрэсіўнасьць і прага прыбытку “ў асабліва цынічнай форме”. І дадае: “Амэрыка, краіна стандартаў, у другой палавіне XX стагодзьдзя выбілася з сусьветнага цывілізацыйнага стандарту... У гіпэртрафаваным выглядзе праявілася палітычная нецярпімасьць, мэтастазы якой нескладана пабачыць ува ўсіх кутках зямной кулі. Была пастаўленая на канвэер вытворчасьць “фігавых лісткоў”: ад “правоў чалавека” да “правільных і няправільных прэзыдэнтаў”. У эсэ “Глёбус пад камлыгай глябалізацыі” (24.11.2000) Ляпешка пайшоў далей у сваёй крытыцы “амэрыканскага ладу жыцьця”: “... амэрыканізацыя азначае прапаганду аднапалярнага сьвету з Манблянам у выглядзе канстытуцыі “айцоў-заснавальнікаў”... амэрыканізацыя... азначае навязваньне гатовых стандартаў ладу жыцьця”. Вельмі паказальныя думкі чытач знойдзе ў зацемцы “Наша праўда” (12.01.2001): “... пра агульначалавечыя

вартасьці можна і трэба ўзгадваць, але калі забясьпечаны нацыянальны інтарэс і асэнсаваныя нацыянальныя прыярытэты". "Агульначалавечыя вартасьці" паводле сваіх адмоўных канатацый у мысьленьні Ляпешкі неяк дзіўна спалучаюцца з "правамі чалавека" ("правы чалавека" неўпрыкмет ператвараюцца ў глябальную ідэалягему наступальнага характару, нават у ідэалягічны дручок, якім можна пляжыць тыя галовы, якія, нягледзячы ні на што, усё ж "не разумеюць" дабротаў, якія перад імі адкрываюцца... ("Меркаваньне: Пра сэнс гістарычных традыцый" (28.06.2000). У дадатак да ўсяго наш апанэнт — носьбіт своеасаблівага пачуцьця гумару, якое напоўніцу выяўляецца ў выразах накшталт "адказ шукай у катухах Эдыпавага комплексу, які сваёй элітнасьцю і элітарнасьцю нагадвае комплекс жывёлагадоўчы" або "задуменна-мэнтальнае калупаньне ў носе". Некаму такое пачуцьцё гумару можа падацца постмадэрнісцкім.
Гэтыя цытаты сьведчаць, што пазыцыя і стыль сп.Ляпешкі тыповыя для ягонага кола.

3.
Вэрсію ідэалёгіі, якую адстойвае Барыс Ляпешка, можна назваць "патрыятычна-крэольскай". "Патрыятычнай" таму, што яна чуйна адгукаецца на найменшыя зрухі палітычнага курсу сучаснага рэжыму (гэта стала асабліва відавочна падчас сёлетняй перадвыбарнай гонкі ў працэсе маніпуляцый лукашэнкаўскіх паліттэхнолягаў з тэмай "беларуска-расійскай інтэграцыі", якая няўзнак трапіла ў "прапагандысцкі цень"; ідэолягі рэжыму вельмі чуйна адрэагавалі на рашэньні паліттэхнолягаў: калі трэба, зробім акцэнт на інтэграцыі, а як скамандуюць, выступім і за сувэрэнітэт). "Крэольскай" жа таму, што яна ў варунках постсавецкага нэакаляніялізму ўвабрала ў сябе цяжка спалучальныя міжсобку элемэнты — іншародную культурную традыцыю і адначасна тутэйшы разнавід нацыяналізму, заснаваны перш-наперш на ідэнтыфікацыі з "маладой беларускай дзяржавай" і яе атрыбутамі (у тым ліку першым беларускім прэзыдэнтам).
Акурат фактарам нацыяналізму, а не нейкай міталягізаванай таталітарнай сьвядомасьці мы схільныя тлумачыць усе гэтыя

“выкрывальніцкія” пасажы пра “двудушныя фразы аб “дэмакратыі” і “правах чалавека”. Да слова, прыкладна такую пазыцыю займаюць і нацыяналістычныя плыні ўва ўсёй Эўропе (ад француза Лё Пэна да ўкраінца Зьмітра Карчынскага, былога лідэра УНА-УНСО).
Досыць заканамерна, што для абслугоўваньня сваёй візіі нацыяналізму як “асаблівага шляху” Ляпешка карыстаецца аргумэнтацыяй і прыёмамі той расійскай культурнай традыцыі, якая традыцыйна вызначалася ксэнафобіяй і ізаляцыянізмам: “Існуе, натуральна, і іншы пункт гледжаньня, згодна зь якім “мы” і “Эўропа” – цывілізацыйныя антыподы і “скрыжавацца” ня можам ні ў водным, прабачце, ракурсе. Тут ня трэба цытаваць эпігонаў, дастаткова назваць катэхізыс адэптаў дадзенай плятформы, працу М. Данілеўскага “Расея і Эўропа”. Пры гэтым неўпрыкмет адбываецца падмена паняцьцяў, бо аўтарскае “мы” ў гэтым выпадку ўжо абазначае ніяк не “Беларусь” і не “беларускую дзяржаву”, а хутчэй тое, што пазначана ў першай частцы загалоўку працы М. Данілеўскага. Аднак для антынамічнага, канфрантацыйнага мысьленьня афіцыйных беларускіх ідэолягаў гэткі падыход выглядае вельмі прадуктыўным, чым і тлумачацца такія частыя звароты да яго. “Нашае “славянафільства” і “заходніцтва” ёсьць карыкатурай на сапраўды глыбокія і зьмястоўна насычаныя арыгінальныя ідэйныя плыні”, — сьцьвярджае Барыс Ляпешка, і, відаць, сам не адчувае, наколькі ён мае рацыю.
(Тое самае можна сказаць і пра пасажы накшталт “на нашым грамадзкім небасхіле за апошні час так і не зьявіліся фігуры, роўныя сваім маштабам А. С. Хамякову ці П. Я. Чаадаеву. Як няма й знаку “Семирамид” ці “Философических писем”.)
Дык жа ““родавая” цяга да Расеі” выклікана прычынамі вельмі празаічнымі, таму што сфармаваная ў яе культурным полі інтэлектуальная традыцыя ў канфрантацыі з сусьветнай цывілізацыяй сталася надзіва актуальнай у першую дэкаду незалежнай Беларусі.

4.

Допіс Ляпешкі таксама сьведчыць, як мала зроблена ў справе дзяржаўнага будаўніцтва за дзесяць гадоў беларускай незалежнасьці. Ён выразна даводзіць, што ў асяродзьдзі

беларускай інтэлігенцыі дагэтуль маюць шырокае распаўсюджаньне імпэрскія міты ў духу “савецкая эпоха стварыла дзяржаву Беларусь”, “да пачатку XX стагодзьдзя ў дзяржаўным сэнсе Беларусь была легендай”. І што самае фатальнае, сярод тых элітаў, якія пайшлі на калябарацыю з лукашэнкаўскім рэжымам, не адбылося ідэнтыфікацыі з уласнай, айчыннай культурнай традыцыяй. Клішэ накшталт “маленькая Данія”, “невялічкая Чэхія”, “нацыянальная інтэлектуальная традыцыя наагул лёгка ўспрымала аскетычныя, рыгарыстычныя плыні” (відавочна, ідзецца пра расійскую, а не беларускую традыцыю) паказваюць, што беларускі інтэлектуальны афіцыёз дагэтуль дзівіцца на сьвет праз чужыя акуляры.
Палеміка на тэму ідэалёгіі сучаснага беларускага рэжыму ў цэлым пацьвярджае той відавочны факт, што ніводная палітычная сыстэма ня можа стабільна існаваць без зваротнай сувязі з сваім грамадзтвам, без вызначэньня прыцягальных пэрспэктываў разьвіцьця. У выпадку Беларусі само зацікаўленьне гэтай тэмай ускосна сьведчыць аб працэсе сувэрэнізацыі ня толькі празаходне настроенай інтэлігенцыі, але й па-прарасейску настроенай часткі інтэлектуальных элітаў.
[*Рэдактар*]

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 4 (18) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: **06-10-2001**
[image]

Леанід Галубовіч

Сны Ігара Бабкова, запісаныя Францішкам Эн

Ігар Бабкоў. Адам Клакоцкі і ягоныя цені. — Менск, 2001.

“Тое, што я думаю пра інтэлектуальны раман, я ўсё роўна вам не патраплю сказаць. Бо думанне пра інтэлектуальны раман і ёсць інтэлектуальным раманам. У першых чатырох раздзелах трэба разабрацца, чым ёсць думанне як такое, потым даследаваць праблему інтэлекту й ягоных межаў, недзе напрыканцы сказаць штосьці пра раман як жанр літаратуры, а ў пасляслоўі прызнацца, што аўтара няма й ніколі не будзе. Я пішу (скажу шчыра) проста раман, а напішу я яго, калі ён сам напішацца, не раней.”
З гутаркі Ігара Бабкова з Валянцінам Акудовічам для часопісу “Крыніца” (№ 1, 1997 г.) да постаці “ТЫ”
Калі гэтую, па-сучаснаму *вытанчаную*, кніжыцу паставіць на бібліятэчнай паліцы побач з чарговым таўсматым томам якога-

небудзь беларускага неакласіка ці народнага літаратара, то, нечакана для сябе, мы выявім на свае вочы гратэскавае становішча нашага сучаснага літаратурнага працэсу...
З аднаго боку — *малады*, па-еўрапейску вышкалены твар, з другога — *выстараны* і спакутаваны воблік прамінулага жыцця...
Мажліва, што не ўсе пагодзяцца з падобнай трактоўкай, асабліва — з канстатацыяй "прамінулага жыцця"... Што ж, я не буду настойваць на бясспрэчнасці гэтай тэзы, бо ў кожнага з нас свае стасункі з часам і свой погляд на светабыццё. І гэта адзіная непарушная традыцыя, якой немагчыма вырачыся...
Ігар Бабкоў — беларускі інтэлектуал першай незалежніцкай хвалі, аўтар паэтычных зборнікаў *Solus Rex* (1992) і "Герой вайны за празрыстасьць" (1998), а на сённяшні дзень — галоўны рэдактар альманаху філасофіі, культуралогіі і літаратуры "Фрагмэнты"...

люстэркі
адбіліся ў
люстэрках;
тыражаваны
свет
выйшаў за
межы:
мізэрная эпоха,
—

пісаў ён у сваім першым зборніку вершаў, імпрэсій і калёквіюмаў і дадаваў у звязку з роздумам над трагічным лёсам Акутагавы: *"Чалавек жыў. І няўжо ўсяму гэтаму (о, Божухна!) вынікам — невыразнае філалагічнае балбатанне, якое вызначае месца чалавека ў гісторыі літаратуры? Няўжо тое месца, адкуль ён сёння глядзіць на нас, меней значнае, меней сапраўднае ды меней злучае нас аднаго з адным?"*
Вось і ў новай сваёй кніжцы — "Адам Клакоцкі і ягоныя цені" — Ігар Бабкоў, найперш як філосаф, спрабуе "сфакусаваць" тую *процьму* падсвядомасці, якая не падлягае светавыяўленню...
А таму, *"упершыню ў беларускім літаратуразнаўстве скарыстоўвае посткаляніяльны панятак галюцыягеннай прысутнасьці Сябе як Іншага..."*

Вядома, што філосафы могуць разважаць нават тады, калі разважаць няма пра што. Таму ніколі не трэба здзіўляцца іх марнаслоўнасці ды інтэлектуальнаму нахабству шукаць сёмае неба альбо дно бездані...
І “раман у дзесяці гісторыях з жыцьця адважнага асьветніка й энцыкляпэдысты Яна Адама Марыі Клакоцкага і ягоных ценяў” укладваецца ў кароткі змест няўцямных сноў. Бо згодна з сюжэтам гэтай кніжкі яе “галоўны герой” запісваў сны людзей XIX стагоддзя. Ці не таму, што сам меў вырак ад Прыроды быць *бяссонным*. Ну не сніліся чалавеку ўласныя сны, хоць ты плач. Вось і зажадалася яму займець сны чужыя. Гэтак падчас здараецца і з літаратарам, які не можа напісаць уласны раман, а таму толькі тое і робіць, што *спісвае* сюжэты чужога жыцця ў свой нататнік...
Нешта падобнае здарылася і з Янкам Купалам, які, канстатуючы наяўнасць такіх сноў, насамрэч запісваў толькі непрывабную яву нацыянальнага быцця ва ўласнай “транскрыпцыі”:

Мне
бацькаўшчынай
цэлы сьвет,
Ад родных ніў я
адвярнуўся...
Адно... ня збыў
яшчэ ўсіх бед:
Мне сьняцца
сны аб Беларусі!

У рэшце рэшт, нататнік спісаны, а раман так і не пачаты. Але ў тым і палягае ўся закавыка філасофскай задумы: раскласці разрозненыя сюжэты чалавечых жыццясноў так, каб яны прачытваліся як адна непадзельная гісторыя канкрэтнага чалавека альбо цэлага народу...
Прасцей кажучы, кніжку з наскоку не возьмеш. Для гэтага трэба мець добрае інтэлектуальнае здароўе. Тым жа, хто жыве *незалежна ад уласнай галавы,* яе ўвогуле нельга браць у рукі. І для проста цікаўных людзей яна нічога значнага не ўяўляе. А для несамастойных у мысленні ідэі гэтай кніжкі, хоць яны і акрэсленыя вельмі туманна, увогуле могуць стацца своеасаблівым “опіумам”, паколькі маюць прэтэнзіі на

“перадачу праўды без дапамогі слоў”: “Пры гэтым рэцыпіент мусіць быць інтэлектуальна і духоўна падрыхтаваны. Але нават і тады ніхто ня можа даць аніякіх гарантыяў”.
Дарэчы, пра самое імя *як бы* нашага галоўнага героя...
Аўтар піша так: *“Не ведаю, ці сапраўднае імя. Тады шмат хто назаўсёды стаўся іншым. Сапраўднае імя было недаравальнай раскошай. (...) Мушу сказаць, гіпотэза, што Адам Клакоцкі гэта насамрэч адно зь імёнаў Бога, таксама абмяркоўвалася, хаця, па зразумелых прычынах, без асаблівага імпэту...”*
Зрэшты, на якое імя ў гэтым постмадэрновым “рамане” ні адгукніся, за якую сюжэтную вяровачку ні пацягні, якую старонку ні “прыадчыні” — усё адно патрапляеш у безвыходны лабірынт вечнага часу альбо часавай наканаванасці...
Гэта разумее і аўтар, таму піша шматлікія ўступы, тлумачэнні ды пасляслоўі, а, у рэшце рэшт (ці не трымаючы чытача ўвогуле за ідыёта?), усоўвае яму ў рукі *“ключы ад незамкнёнай брамы”* гэтае кніжкі, і ажно ў дзесяці пунктах разжоўвае *недалёкім сучаснікам*, як зразумець гэты “раман” і самога яго аўтара...
Насамрэч усё вельмі проста. Бо ўся складанасць заключаецца ў наўмысным заблытванні і ператасоўванні вядомага...
Безумоўна, гэта значна цяжэй, чым гульня ў падкіднога дурня, але прасцей, чым матэрыяльна зацікаўленае марнаванне часу гульнёю ў покер...
Большасць тэкстаў сшытая ў адно прасторавае палатно белымі ніткамі з тых “абрыўкаў”, што на працягу апошняга часу з’яўляліся на старонках перыядычных выданняў як самастойныя... Скажу па памяці, што гэта было цікавае і разнапланавае чытанне... Там быў свой стыль пісьма і мыслення, рэзка адрозны ад традыцыйнага, былі асабістыя прэтэнзіі на элітарнасць і спробы самадалучэння да “эўрапейскай” культуры...
Адных літаратараў гэта раздражняла, другіх — абнадзейвала, трэціх — закалыхвала... Я быў пасярэдзіне.
Хоць, як зазначае ў сваім наватворы наш аўтар: *“часам так хочацца ўсё перапісаць як было насамрэч адкінуўшы непатрэбныя самастылізацыі забыўшыся на даўгія й беспасьпяховыя спробы ўціснуць жыцьцё ў тэкст і захаваць адно крыху безнадзейнасьці самотнай безнадзейнасьці калі глядзіш з закратаванага вакна чацьвертага паверху вар’ятні й вакол столькі псыхаў гэта табе*

не выкладчыкі дыямату якіх вы лічылі крыху ненармальнымі магчыма яны й былі такімі ўсё жыццё жыць паводле дыялектычнай лёгікі такое дарма не праходзіць...”.
Сюжэтная лінія “раману”, бясспрэчна, беларуская. Яго канва ўтрымлівае даволі вялікі *ахапак* нацыянальнага гістарычнага часу, мабыць, патэнцыяльна меўшы на мэце падтэкставы “эпахальны” замах, і ці не з гэтай немалаважнай прычыны аўтар і “абазваў” альбо, скажам больш прыстойна, — *абраў* менавіта *раманны* жанр уласнанапісанага...
Хоць мы не будзем пярэчыць і такой аўтарскай версіі, калі прачытаем ва ўсё тым жа тэксце, што *“на адным з нумараваных аркушаў рукой Яна Клакоцкага выведзены сказ, надзвычай характэрны для тутэйшай мэнтальнасьці (я мяркую, ён належыць яму самому), які ўсё ставіць на сваё мейсца: “Тое, чаго няма, кранае мяне сваёй далікатнай адсутнасьцю””.*
Не ведаю толькі, чаму так холадна паставіўся да нашага далёкага земляка *“Тодара Дастаеўскага”* і яго героя *“Янкі Карамазава”* “Ян Клакоцкі”. Ці не таму, што *“Фёдор Михайлович пісаў гнеўныя словы пра жидов и полячишек, альбо прымаўся ўважліва вывучаць свой радавод”?*
Адказ, на мой погляд, напрошваецца знутры самога пытання і з вусцішных вуснаў таямнічага аўтара.
Я прабачаюся за частае і занудна-доўгае цытаванне, але іначай “брама раману” аніяк не прыадчынялася, таму я змушаны тое рабіць, каб хоць як прасунуць галаву ў расколіну сюжэту і зазірнуць “за кулісы” яго стылістычных напластаванняў...
“Маё прыватнае мейсца на Шырокім Менскім Праспэкце ў Нікуды. Нэйтральная тэрыторыя, дзе можна паліць цыгарэту й думаць пра сваё. Сапраўды: пра сваё. Хаця што мы маглі лічыць сваім у гэтым сьвеце? Боль? Нянавісьць? Але ж гэта іхная тэрыторыя. Выдавала на тое, што адзіна магчымае выйсьце было ў маўклівай салідарнасьці: кавярня, кубачак кавы. Тайніца чалавечага твару, ціхая ўлада магчымасьцяў. Цішыня рэчаў. Гэта не было домам, не было прытулкам. Даўна прамоўлена, — наш дом унутры нас. Але ж і ўнутры мы не пачувалі сябе гаспадарамі. Мы хацелі любіць, а вымушаныя былі ненавідзець, мы прагнулі радасьці, нам вярталі боль. Мы былі выгнанцамі й шукалі свой дом у бяздомнасьці.”
Бо — і надалей, кажучы словамі тэксту: *“Усе мы тут — пэрсанажы, у чаканьні Аўтара. Аўтар заснуў, ня трэба яго*

будзіць”. (Разбуджаны, ці не стане ён цэнзарам сабе самому?) Праўда, гэта не тычыцца настойлівага аўтара нашага раману, які ўсё ж, раз за разам, спрабуе знайсці сваю Айчыну. Аднак, у адрозненне ад многіх, яго пошукі палягаюць па-за вонкавымі межамі Бацькаўшчыны, а менавіта — на памежжы свядомага і падсвядомага. Гісторыя, культуралогія і філасофія калі і не знаходзяць тут поўнага ладу і гармоніі, то, прынамсі, пазбягаюць міжасабовых лакальных канфліктаў, пакідаючы чытачу крозы дзеля ўласных спадзеваў...

Бо й напраўду ж, *“дзе ты, сьвятая зямля? Хіба толькі там цяпер ноч і ўсе папросту леглі спаць: і Буда, і Заратуштра, і Ісус. А мы тут пэрсанажы абсурднага раману, навобмацак шукаем тое, што даўна ёсьць і вядома, і непераможна? (...) Мы нібы акторы ў боскім тэатры, галоўнага рэжысэра якога ніхто ў вочы ня бачыў. Да нас, лялек, — да нашай душы — прымацаваныя матузкі — голад і пажада, гнеў і каханьне, — торгаючы за іх, нас скіроўваюць у той альбо іншы бок. Нам дадзеная мова, — зь якой мэтай і кім, мы дасюль не разумеем. Магчыма гэта проста забаўка, каб нам ня так сумна было сядзець у нашым цёмным скляпеньні. Мы падманваем адно аднаго з дапамогай мовы, мова падманвае нас з дапамогай сваіх прыгожых словаў, якія, мы ўсё яшчэ спадзяемся, усё ж такі камусьці нешта гавораць...”*

Адназначна, што і ў гэтым месцы лепш за нашага аўтара не скажаш. То будзем яму ўдзячны за гэта...

У Франсіска Гоі ёсць афорт “Сон розуму нараджае пачвараў”... На жаль, а мо на дабро, “сны” аўтара рэцэнзаванай тут кніжкі спараджаюць *толькі гульню разумных асацыяцый* на спрадвечныя і заўжды злабадзённыя тэмы нацыянальнага беларускага жыцця ў яго пераламленні скрозь прызму сучаснага інтэлектуальнага мыслення.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 4 (18) – 2001

[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: **06-10-2001**
[image]

Павал Абрамовіч

Проза для няўдачнікаў

Станкевіч Юры. Любіць ноч — права пацукоў. — Менск: Мастацкая літаратура, 2000.

1.

Раман Юр’я Станкевіча “Любіць ноч — права пацукоў” выклікаў цікавасць у чытачоў і крытыкаў і газетай “Літаратура і мастацтва” быў адразу названы *“адным з самых мужных, праўдзівых і сумленных твораў, што пабачылі свет апошнім часам”* (1 студзеня 1999 году). Сказана гучна. Не менш яскрава выказалася Святлана Алексіевіч, якая ў пераднавагоднім нумары газеты назвала гэта раман самай яркай з’явай у беларускай літаратуры за мінулы год. *“У беларускай літаратуры з’явіўся твор еўрапейскага ўзроўню”*, — наўпрост адрэзала яна.

Нагадаю сюжэт раману. У правінцыйным мястэчку Янаўску (маці аўтара, дарэчы, у час напісання твору жыла ў Барысаве),

заселеным пераважна расійскамоўнымі вайскоўцамі і ваеннымі пенсіянерамі, раптоўна з'яўляюцца ўцекачы з Усходу. Пасяліўшыся на ўскрайку, яны наладжваюць гандаль наркотыкамі, гвалцяць мясцовых дзяўчат. Перасяленцы (*"набрыдзь", "пошасць", "прыхадні", "чужынцы"* — так называе іх сам аўтар) пачуваюць сябе вольна: янаўскія мянты прадаліся ім, а напужаныя жыхары гораду лічаць за лепшае не ўмешвацца. І толькі настаўніца Люба, побач з хатай якой размясціліся бежанцы, спрабуе неяк абараніць сябе і свайго маленькага сына, які нарадзіўся з хваробай Даўна. Рукамі паслугачкі-пакаёўкі Васіліны перасяленцы забіваюць настаўніцу. За некалькі дзён да смерці Люба адпраўляе ліст брату Данілу з просьбай аб паратунку. Даніла спешна прыязджае ў Янаўск і, помсцячы за смерць сястры, уступае ў бязлітасную схватку з прыхаднямі і іх тутэйшымі памагатымі. У рэшце рэшт ён дабіваецца таго, што бежанцы пакідаюць атручаны імі горад, з'язджаюць у сталіцу. Такім чынам, зло застаецца непакараным, яно проста сыходзіць у іншае месца. Заканчваецца раман сімвалічнай сцэнай узыходу сонца над *"друхлымі будынкамі і кволымі, самотнымі дрэвамі"* і словамі асірацелага хлопчыка-*"даўнёнка"* (наватвор Станкевіча), пачутымі ім у свой адрас ад дзяцей перасяленцаў: *"Мы грэбаныя псіхі"*. Гэткую канцоўку сам аўтар называе *"хэпі-эндам"*.

Месца дзеяння ў рамане — Беларусь. Час — другая палова 90-х гадоў мінулага, XX-га, стагоддзя. Агульны заняпад. Беларусь Станкевіча — гэта краіна *"ўбогіх і жабракоў"*, выradкаў з рабскай псіхалогіяй, якія не зважаюць на ўласную галечу і дэградацыю, на тое, што чужынцы захопліваюць іх тэрыторыю, а дзяцей "саджаюць на іглу". *"Усім жыць трэба, усе хочуць есці, піць анягож"*, — гаворыць сусед Любы Іосіф Манюка, чыю дачку, і ён ведае пра гэта, згвалцілі юнакі-бежанцы. Апісваючы Янаўск, Станкевіч не шкадуе чорнай фарбы: *"...у многіх дамах вокны былі выбітыя і закладзеныя фанерай, а то і заткнутыя рыззём, каналізацыйныя люкі зеўралі пустатой, там-сям іржавелі паваленыя агароджы, а каля харчовых крамаў тоўпіліся брудныя мужчыны і жанчыны з азызлымі азіяцкімі тварамі ў чырвоных пражылках... <...> там-сям ляжалі, праважаючы яго [Данілу] залепленымі гноем вачыма, худыя*

заражоныя лішаём, бадзяжныя сабакі…”.
Кожны твор Станкевіча поўніцца гэткімі жорсткімі натуралістычнымі апісаннямі. У аповесці “Прузі” чытаем: *“Купка падлеткаў віравала ля крамы. Ліневіч пачуў лаянку, нейкае няўцямнае балбатанне, воклічы, якія паўтаралі ўрыўкі рэкламных ролікаў з тэлебачання. У некаторых з падлеткаў былі ненатуральна малыя галовы ды іншыя прыкметы выраджэння. За хлебам стаяла невялікая чарга. Паліцы былі пустыя, толькі гарэлкі было розных гатункаў і шмат”.* Або ў аповесці “Збіральнік страху”: *“…вось ідзе насустрач чалавек, схільны да німфаманіі, а вось жанчына з цэлым наборам хвароб: тут і дыябет, і істэрыя, і будучы інсульт; вось спяшаецца, размаўляючы з сабой, мужчына з азыслым тварам хворага на посталкагольны псіхоз, а вось пенсіянер з кіёчкам, які не ведае, што дажывае апошні год, а вось шукае недапалак звычайны бадзяга, які мусіць неўзабаве сканаць дзе-небудзь у падвале, а вось бацькі з хворай спадчыннасцю прагульваюць хлопчыка-даўнёнка”.*
Увесь час Станкевіч даследуе адну і тую ж тэму — лёс беларускай нацыі. І кожны раз, з маніякальнай паслядоўнасцю, ён ставіць дыягназ: выраджэнне. Беларусы не выжывуць, сцвярджае Станкевіч (*“усе мы грэбаныя псіхі”*, *“тут усе мёртвыя”*), яны хворыя, слабыя, безабаронныя, раз’яднаныя. І нават у душах ягоных дадатных герояў расчараванне і сумнеў ва ўласных сілах. Прыкладам, у рамане “Любіць ноч…” Антон Кніга, які прайшоў пекла сталінскіх лагероў і цяпер дапамагае Данілу, кажа: *“У мяне ўражанне, што мы сапраўды мусім дарэмна затыкаць тую плаціну, якую ўжо прарвала, і ваду назад не вернеш, праўда, а варта, можа, толькі сябе ратаваць…”.* (Ці не ўласцівыя бяссілле і няўпэўненасць самому Станкевічу, які, па ўласным прызнаньні ў “ЛіМе” 6 лістапада 1998 г., паўшоў “насуперак сабе”, калі з аглядкай на іншых зрабіў раман “па магчымасці акрэсленым, рэалістычным і аптымістычным (нават з хэпі-энд)”? Ці дапушчальныя для творцы наагул нейкія ўступкі і патуранні чужому густу?)
Неўпрыкмет для большасці насельніцтва ў нашай краіне наступіў апакаліпсіс, сцвярджае Станкевіч. Сёння не Бог жыве на Беларусі, а Д’ябал. Гэта ён, не тоячыся, робіць сваю чорную справу ў аповесці “Прузі”. Гэта пра яго шэптам кажа сантэхнік Ілля ў “Бесапатаме”: *“Вы б не клікалі таго, хто даўно ўжо тут,*

а дзе ж яму быць, як не на зямлі, угноенай васьмюдзесяццю мільёнамі кюры?..”.

2.

“Мне, на жаль, вядомыя людзі, якія чыталі французскіх і расійскіх раманістаў, каб што-небудзь даведацца пра жыццё ў вясёлым Парыжы або сумнай Расіі”, — з іранічным “шкадаваннем” пісаў Уладзімір Набокаў. Уявім сабе чытача, які ніколі не быў у Беларусі і які спрабуе — даверлівы! — скласці ўласнае меркаванне пра нашу краіну па рамане Станкевіча. Хутчэй за ўсё яго перасмыкне ад гэткіх “чарнушных” рэалій *“аднаго з самых праўдзівых і сумленных”*, як піша “ЛіМ”, твораў, і ён дасць зарок трымацца падалей ад той нялюдскай, пракажонай Беларусі.

Ніхто не мае права забараніць Юр’ю Станкевічу ўспрымаць і апісваць навакольны свет так, як здольны ён і толькі ён. Мінуліся савецкія часы кантролю і рэгламентавання думак і пачуццяў. Але ж Станкевіч, які шчыра верыць у магію камянёў, перасяленне душаў, блуканні падчас медытацый па розных кутках Сусвету і шмат што іншае (пра што сведчыць яго творчасць, якая мае выразны містычны кірунак), павінен верыць і ў наступнае: мастацкімі сродкамі ён творыць уласную рэчаіснасць (назавем яе Р-2), не менш рэальную за нашу (Р-1). За існаванне Р-2 ён нясе асабістую адказнасць. Падзеі, якія адбываюцца ў кнігах Станкевіча, у Р-2, здольныя ўплываць на Р-1 і яе насельнікаў (у дадзеным выпадку, на чытачоў). Вось і Р-2 Станкевіча моцна паўплывала на чытачоў і рэцэнзентаў яго рамана “Любіць ноч — права пацукоў”. Апошнія, як відаць з іх тэкстаў, ва ўсім пагадзіліся са Станкевічам (так, выраджэнне; так, чужынцы; так, *“злавесны лёс”*). Іншымі словамі, яны прынялі аўтарскае бачанне беларускай рэчаіснасці, Станкевічаву мадэль Беларусі за ўласную і адзіную, зблыталі Р-2 з Р-1, забыліся, што існуюць не ў раманах Станкевіча, а кожны ў сваёй Беларусі.

Гэта вельмі дрэнная звычка — атаясамліваць “эстэтычную рэальнасць” (мастацкі твор) з той, што каляхуе-віруе за вокнамі твайго дома. Адны чытачы проста накладваюць перажыванні і думкі галоўнага героя на ўласныя, нервова сочаць за ходам падзей у творы, і калі фінал не задавальняе іх,

то злосна адкідваюць кнігу са словамі “У жыцці так не бывае!” Іншым з тае ж прычыны (“нерэалістычна”, “ненатуральна”) не падабаюцца Кафка або Джойс. (Адзін расійскі літаратурны крытык узгадваў, як у той час, калі творы Булгакава толькі “пайшлі ў масы” пачуў у чарзе: *“А мне Булгакаў адразу не спадабаўся, бо ў яго каты гавораць”*.) Наіўныя, яны шчыра перакананыя у тым, што рэальнасць, якую стварыў аўтар, павінна поўнасцю супадаць з той, у якой існуюць яны! Янаўск не існуе на вядомай усім нам геаграфічнай мапе Беларусі, але ён абазначаны на мапе Беларусі Станкевіча. І таму давайце разглядаць Янаўск менавіта на гэтай мапе, у межах Р-2, дзе гэты горад і яго жыхары выглядаюць цалкам рэалістычнымі.

3.

Непакоіць наступнае: ці не пойдуць заўтра тыя, хто падчас чытання раману “Любіць ноч...” атаясамліваў Р-1 і Р-2, вызваляць Беларусь ад бежанцаў, азіятаў, небеларусаў па прыкладзе Данілы Прусака? Ці не перадасца ім нянавісць Антона Кнігі да ўсіх “тутэйшых”, людзей з генетычна нізкай, калі карыстацца тэрміналогіяй герояў Станкевіча, нацыянальнай самасвядомасцю? Або ці не паўтораць яны ўслед за іншымі галоўнымі героямі Станкевіча, што ў Беларусі Д’ябал жыве, што тут *“утварылася балота з паўзунамі”* і час пакаваць клункі?

Станкевіч яўна правакуе сваіх чытачоў, спрыяе ўзнікненню ў іх адмоўных пачуццяў (агрэсія, нянавісць, няўпэўненасць, расчараванне, агіда, боль, безвыходнасць, роспач). Умела выкарыстоўваючы мастацкія прыёмы, ён заражвае чытача катастрафізмам. Зло ў Станкевіча, як правіла, абстрактнае, безаблічнае, з ім нельга змагацца, як і прыхадні — *“выканаўцы непаразумелага... і адхіленага ў часе валявога акту”* ў “Любіць ноч...”, як незлічоная, пражэрлівая саранча ў “Прузі”, як нябачная Смерць у “Бесапатаме”. Паводле Станкевіча застаецца толькі замірыцца з лёсам (*“На беларусаў, слабейшых за іншыя нацыі, ідзе гон”*, — кажа адзін з персанажаў “Прузі”).

Аднак мацнейшыя духам чытачы, тыя, хто ведаюць, што іхная Беларусь не ёсць Беларусяй Станкевіча, тыя, хто ўсведамляюць, што Станкевіч — стваральнік пякельна-чорнай Р-2, містык-

песіміст, які адрокся ад жыццёсцвярджальнай пісьменніцкай місіі быць *“прарокам і вучыцелем”* роднага народу (Ластоўскі), не праглынуць атруту, згатаваную аўтарам і не падсілкуюць народжаны ім свет адмоўнай энергіяй. Яны толькі пасміхнуцца з апантанай схільнасці Станкевіча да чорнай палітры, паспачуваюць яму, загорнуць ягоную кнігу.

* * *

Адчай, безвыходнасць, расчараванне — ці не на гэтых трох кітах трымаецца мацярык беларускай літаратуры? З часоў Багрыма і Багушэвіча і да сённяшніх дзён трымаецца ў нашай літаратуры традыцыя — костка ад косткі народнай, — якая захоўвае песімістычны светапогляд. Усё той жа праклён шлюць чужынцам і “тутэйшасці”, усё пра тое ж пытаюцца ў Бога (*“За што, о Божа праведны, магутны, / Караеш так няшчасны свой народ...”*, Янка Купала). У савецкі час нашы пісьменнікі і паэты, каб выжыць, надзелі “ружовыя акуляры”, і радаваліся разам з усімі, і млелі ад шчасця ў прадчуванні раю зямнога, збавення... ад роспачы і зняверанасці, увабраных з малаком маткі.
Сёння страх і песімізм вярнуліся ў беларускую літаратуру. Дастаткова толькі прабегчы вачыма назвы твораў сучасных літаратараў, каб адчуць іх эмацыянальны фон — “Смута” А. Федарэнкі, “Акулы, кракадзілы, шакалы” Г. Марчука, “Дзеці ночы” А. Казловіча, “Чарнобыльская малітва” С. Алексіевіч, “Любіць ноч — права пацукоў”, “Бесапатам”, “Збіральнік страху” Ю. Станкевіча. Уладзімер Някляеў у інтэрв’ю газеце “Літаратура і мастацтва” (17 лістапада 2000 году) кажа, што працуе цяпер над творам *“на тэму нашай сучаснай гісторыі”* з красамоўнай назвай “Крэматорый”.
Аднак ёсць пісьменнікі, чый песімізм — светлы. Як у Васіля Быкава, чытаючы творы якога *“ўзрастае прага ачышчэння”* (С.Яновіч, “ARCHE-Скарына”, №8-2000). Як у светлай памяці Вячаслава Адамчыка. І гэта ўжо іншая традыцыя беларускай літаратуры.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …

№ 4 (18) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя:
analityka@yahoo.com
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: 06-10-2001
[image]

Генадзь Туровіч

Зьбіральнік жахаў

Станкевіч Юры. Любіць ноч — права пацукоў. — Менск: Мастацкая літаратура, 2000.

Анатацыя да кніжкі папярэджвае чытачоў: *“У прозе Юр’я Станкевіча шмат абсалютна новага, нязвычнага як па форме, так і па зьмесьце…”* Гэтая перасьцярога ў самую пару… Ці часта даводзіцца чытаць *раман, напісаны сямю, па колькасьці частак у творы, сказамі*?

Напэўна, кожны з нас памятае школьных настаўнікаў, якія прызвычайвалі сваіх вучняў выказваць уласныя думкі дакладна, найлепш — простымі сказамі. І аргумэнт для гэтага быў пазычаны ў расейскага клясыка: “Сьцісласьць — сястра таленту”. Здаецца, Ю. Станкевіч быў добрым вучнем у сваіх настаўнікаў. Сапраўды так, бо кожная думка ў рамане

Ю. Станкевіча выказана аўтарам простым сказам, але пабудаваны яны з такім разьлікам, што першая зь іх абавязкова павінна знайсьці працяг у другой. Выходзіць працяглы ланцужок, учапіўшыся за які, як за нітку Арыядны, ідзеш сьледам за думкамі пісьменьніка, як па лябірынце. Праўда, рызыка патрапіць у пастку чытачу не пагражае. Раман Ю. Станкевіча не настолькі вялікі па аб'ёме, каб быць прачытаным болей чым за гадзіну. Чытаецца на адным уздыху. Праз коску, рысачку, клічнік і пытальнік чытач завяршае сваё падарожжа па жахлівай рэчаіснасьці нашай краіны.
Ю. Станкевіч піша настолькі пазнавальна, што, нават калі б на вокладцы наагул адсутнічала ягонае імя, ні для каго ня стала б сакрэтам, хто аўтар гэтых твораў. Сьвет Ю. Станкевіча — гэта сьвет наркаманаў, прастытутак, участковых міліцыянтаў і дактароў, шараговых настаўнікаў і навукоўцаў, апантаных звышкаштоўнымі ідэямі... Магу паспрабаваць прадказаць — героем наступнай аповесьці Ю. Станкевіча стане звар'яцелы карыстальнік разбэшчанага Інтэрнэту...

Цалкам зразумелая заклапочанасьць аўтара сучасным станам беларускага грамадзтва, але засяроджанасьць, калі не сказаць зацыкленасьць аўтара на адных і тых жа зьявах (напрыклад, амаль што ў кожным сваім творы пісьменьнік узгадвае "апушчаных") прымушае пісьменьніка таптацца на месцы. Пісьменьнік, што доктар, павінен ня толькі вызначыць дыягназ, але і прапанаваць лекі для вылечваньня хваробы. На жаль, у аповесьцях Ю. Станкевіча гэтага нямашака, ён засяроджвае ўвагу на праблемах і не паказвае выйсьця. Таму незразумела, навошта ён наагул пісаў свае аповесьці. Тое, што наша грамадзтва цяжка хворае, вядома было і да Ю. Станкевіча.
І хварэць яно пачало не ў 1994 годзе, як падаецца многім, у тым ліку і празаіку. І ад таго, што пісьменьнік ужывае багата экзатычных словаў, лепей нам ня стане. *"Псэўдапрэзыдэнт, псэўдадзяржава, псэўданацыя, псэўдалітаратура..."* (с. 250—251) — гэта ўсё пра нас, а што далей? Ну, зафіксавалі мы на паперы розныя жудасьці, так, жывем дрэнна, а будзем жыць яшчэ горш, што далей? Дзе выйсьце з тупіка? Няўжо ў расізьме і барацьбе супраць засільля "чорных"?
Зразумела, чаму прозай Дастаеўскага захапляюцца на Захадзе, чаму Мэрылін Манро гэтак марыла выканаць ролю Грушанькі з

“Братоў Карамазавых”. Людзі спрабуюць зьмяніць сьвет, і раз-пораз у іншых краёх гэта ім удаецца, а нашае грамадзтва застаецца нязьменным, адкрытае для ўсялякіх прайдзісьветаў і шэльмаў, усялякай набрыдзі, якая запаланіла яго і гвалціць удзень і ўночы. Гэтая набрыдзь сталася нават сакрэтнай зброяй улады. Ёй адкрыта пужаюць Захад. Але самае складанае і цяжкае на нашай зямлі — зьмяніць чалавека. Мінаюць стагодзьдзі, а чалавек застаецца. Нейкім чынам яго прызвычаілі да тэхнічных выгод і іншых дасягненьняў заходняй цывілізацыі, але далучыць да агульначалавечых вартасьцяў немагчыма без мэтанакіраванай палітыкі ўлады. У гэтым сэнсе патас раману Ю. Станкевіча можна разглядаць як заклік да згуртаваньня найлепшых сілаў грамадзтва з мэтай нешта зьмяніць у лепшы бок. І калі у нейкага палітыка, што ідзе на выбары, нямашака ўласнай праграмы, хай прачытае кніжку Ю. Станкевіча, яна дапаможа яму ўбачыць некаторыя праблемы сучаснага беларускага грамадзтва — наркаманію, прававую безабароннасьць простага чалавека перад гвалтам міліцыянтаў, дэмаграфічную палітыку ўладаў, міграцыйныя працэсы, выміраньне людзей у раёнах, забруджаных радыёнуклідамі. Аповесьць “Рыфма” — не дэтэктыў, а ўсё тая ж простая канстатацыя факту. Аповед пра вельмі здольную ў мовах дзяўчыну, якая робіць спробу ажыцьцявіць мару беларуса — даказаць, што чалавек, які мае розум, знойдзе спосаб вырвацца з гэтай брыдоты, зьедзе на Захад і займее там прыстойнае (заможнае) жыцьцё. Такім чынам, адзіны сродак выйсьці ў людзі — мець добрыя веды. Вось якім чынам гераіня Ю. Станкевіча апавядае пра свае “ўнівэрсытэты”: “*Мае бацькі сьпіваліся. Я ратавалася ў бібліятэках. Мне проста пашанцавала, што школа, куды я пайшла вучыцца, была побач, і ня простая, а спэцыялізаваная, з ангельскай мовай. Там вучыліся дзеці, якія зімой, у перапынак, елі апэльсыны, былі такія прыкінутыя, я маю на ўвазе іх вопратку, што мне было сорамна сядзець зь імі побач. За сябе, вядома.* ***Я магла вызначыцца нечым іншым. Гэтым іншым была мова*** (тут і далей вылучана намі — **Аўт.**). *Пасьля школы я ішла ў чытальную залю. У выхадныя — чытальная заля з раніцы. Да закрыцьця. Дома былі залётныя госьці, п’янь, тлум і бруд. Я сама вывучала мову. Перачытала шмат кніг.* ***Я магу цытаваць з Хопкінса, Хаўсмана, Батлера, Эліёта, Рыльке***” (с. 163). Рыльке, праўда,

аўтар не ангельскі, а нямецкі. Гэтая памылка застаецца на сумленьні аўтара, як і пасаж пра зімовыя апэльсыны. Здаецца, ужо гадоў дзесяць гэта зусім ня дзіва, хутчэй гэты эпізод патрэбна разглядаць як уласна пісьменьніцкую настальгію па ня надта заможным дзяцінстве... Ня будзем рабіць камэнтару наконт таго, што нешта вельмі падобнае пісаў Я. Еўтушэнка ў “Ягадных мясьцінах”. Ну хай сабе, гэта невялікія прабелы, але ж чаму, калі яна мае магчымасьць чытаць у арыгінале, дык усе цытаты з Рыльке (с. 161, 165) па тэксьце прыведзеныя на расейскай мове безь перакладу на беларускую ці ангельскую? Заўважыў я і яшчэ адну паказальную памылку. “*Грошы яны забралі, а пячатку пачалі круціць у руках і чыталі ўголас: “Бізнэсмэн Хведар Рыгоравіч Сак*”” (с. 263). Згодна з заканадаўствам Рэспублікі Беларусі, на ёй павінен быць надпіс: “Прыватны (ці індывідуальны) прадпрымальнік Хведар Рыгоравіч Сак”, і ніякіх там “бізнэсмэнаў” нашае заканадаўства не прадугледжвае. Гэта, зрэшты, тыя рэаліі беларускага жыцьця, якія Ю. Станкевіч праз свае чорныя акуляры якраз не заўважае.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 4 (18) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя:
analityka@yahoo.com
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: **06-10-2001**
[image]

Уладзімер Сакалоўскі

Вырваны з агню

Müller Werner. Aus dem Feuer gerissen. Dittrich Verlag: Köln, 2001.

Кніга “Вырваны з агню”, падрыхтаваная Вэрнэрам Мюлерам, убачыла свет у вядомым нямецкім выдавецтве *Dittrich*. Яна вяртае нас да падзей другой сусветнай вайны і на прыкладзе жыцця габрэя Пятра Рубцэвіча (Рабінава) і яго сям’і апавядае пра драматычны лёс габрэяў Усходняй Еўропы. Апісанні ўсіх тых жахлівых *акцый*, у час якіх тысячы габрэяў былі па-зверску расстраляныя, разрываюць сэрца.

На фоне нязноснага жыцця ў гета і масавых знішчэнняў габрэяў Пінску і яго ваколіц разгортваецца дзівосная гісторыя выратавання нямецкім афіцэрам габрэйскага юнака Пятра. Многія людзі і да сёння не вераць, што такое магло адбыцца. Таму Пятро Рабцэвіч прыклаў усе сілы, каб свет даведаўся пра гэтую трагічную і ў той жа час гераічную гісторыю, бо хацеў

захаваць памяць пра жудасныя злачынствы і пра пакуты ні ў чым не вінаватых людзей, сцвердзіць уласную годнасць, вартую свайго выратавальніка. І ён не толькі знайшоў Гюнтэра, але і аддзячыў яму тым, што гэтая незвычайная гісторыя не памерла разам з ім, а ў людской памяці застанецца імя “чалавека-праведніка” — Гюнтэра Круля.
Кніга Мюлера — гэта спроба аднавіць у памяці вобраз габрэйскай грамады, якая ўжо больш не існуе.
Кніга пачынаецца з эмацыйнага аповеду пра Пятровых бацькоў, якія падчас першай сусветнай вайны з Валыні пераехалі ў Беларусь і пасяліліся ў вёсцы Мокрая Даброва, дзе жыло каля 200 габрэйскіх сем’яў, былі тры сінагогі і дзве габрэйскія разніцы. Грунтоўна апісваецца беднае жыццё вясковай габрэйскай сям’і. Узяць, напрыклад, навучанне дзяцей: іх даводзілася вучыць спярша ў польскай школе, а пасля з “дарэктарам” перавучваць дома, каб яны не страцілі роднай мовы. Апавядальнік даволі падрабязна апісвае габрэйскія рэлігійныя святы, паказвае антысеміцкую палітыку польскай улады, якая не цуралася нават падбухторвання да габрэйскіх пагромаў. Іх учыняў ОЗН (Абоз Нацыянальнага Задзіночання). Да 1935 г., пакуль жывы быў Пілсудскі, адкрытага антысемітызму не дапускалі. Пасля яго смерці на сценах з’явіліся плакаты “Бацька габрэяў памёр”, а ў школах пачалі цкаваць габрэйскіх дзяцей. Ва ўніверсітэтах студэнты-габрэі маглі сядзець толькі на апошніх лавах, паступіць туды габрэям было надзвычай цяжка. Многія студэнты з багатых габрэйскіх сем’яў з’язджалі вучыцца за мяжу.

У кнізе дадзены партрэт Пінску 1938—39 гадоў. Асаблівую ўвагу апавядальніка прыцягваюць палітычныя і канфесійныя адносіны ў ім, расклад палітычных сілаў. У горадзе выдавалася 5 габрэйскіх газетаў. Такое стабільнае, хоць і далёкае ад дасканаласці жыццё закончылася з пачаткам савецка-польскай вайны.
Апісваючы пачатак другой сусветнай, апавядальнік пункцірна пазначае тагачасны палітычны кантэкст: захоп Чэхаславаччыны Нямеччынай, аншлюс Аўстрыі, патрабаванне Гітлера перадаць Нямеччыне Данцыгскі калідор, сакавіцкая мабілізацыя ў Польшчы. У пачатку верасня ў Пінску з’явіліся першыя цягнікі з параненымі, першыя ўцекачы, асабліва габрэі, якія ратаваліся

ад нямецкай навалы. Польскія габрэі апавядалі жудасныя гісторыі пра расправы нацыстаў. За гэта іх дэпартоўвалі ў Сібір ці Казахстан на той падставе, што яны агітавалі супроць Гітлера і нямецкага вермахту, “сяброў Савецкага Саюзу”.
З 20 верасня 1939 г. пінчукі сталі савецкімі грамадзянамі і атрымалі савецкія мясцовыя пашпарты, аднак такі пашпарт без спецыяльнага пасведчання не даваў права выезду за былую савецка-польскую мяжу. Жыццё ў Пінску мянялася, але не сказаць, што ў лепшы бок. Усё габрэйскае трапіла пад забарону. За кароткі час былі зачыненыя ўсе сінагогі і ешывы. Габрэйскія святы нельга было святкаваць, калі яны не супадалі з савецкімі. Зачыніліся габрэйскія газеты. Засталася толькі адна, а навіны на габрэйскай мове перадавалі на радыё толькі раз у дзень, хаця бальшыню насельніцтва гораду складалі габрэі.
Распачалася нацыяналізацыя габрэйскіх крамаў, прадпрыемстваў. Усіх дамаўласнікаў абвясцілі буржуазіяй і дэпартавалі ў Сібір ці Казахстан. Зрэшты, некаторыя засталыя ў Пінску габрэі нават зайздросцілі ім, казалі, што гэтыя людзі прынамсі будуць жыць.
Пачатак савецка-нямецкай вайны выклікаў чарговы прыліў страху ў габрэйскага насельніцтва. Людзі хацелі ўцякаць, але савецкія памежнікі не пускалі іх далей за былую савецка-польскую мяжу.
Захапіўшы Пінск, немцы адразу пачалі расстрэлы мірнага насельніцтва. А ў жніўні яны перайшлі да акцый масавага знішчэння. Адначасова габрэям было забаронена карыстацца магазінамі, прадукты яны маглі купляць толькі на рынку.
7 жніўня быў агучаны першы злавесны загад: усе габрэі, што не працуюць, павінны а восьмай раніцы з’явіцца на вакзале: іх адправяць на працу. Некалькі соцень чалавек прыйшлі, але іх павезлі не на працу, а на бульбянішча, дзе і расстралялі. Некалькі чалавек цудам ацалелі і апавялі, на якую такую “працу” іх павезлі. Назаўтра загад паўтарыўся ізноў, але ніхто не прыйшоў. Тады немцы пачалі ўрывацца ў дамы. Забіралі ўсіх мужчын, у тым ліку хлапцоў і старых, хворых стралялі на месцы. Гэтым разам каля 10000 габрэяў-мужчын завезлі з Пінску пад Казляковічы і там 9 жніўня расстралялі. Дамы нябогаў пасля гэтага зрабавалі: асабліва квапіліся на золата, срэбра, медзь і парцаляну. 10 жніўня немцы загадалі ацалелым

габрэям нашыць на левым баку грудзей жоўтую зорку — “зорку Давыда”. Габрэям забаронена было вольна перасоўвацца па горадзе за межамі гета, забаронена хадзіць па тратуарах, толькі па праезнай частцы, забараняліся кантакты паміж юдзеямі і хрысціянамі. На рынак габрэям таксама ўрэшце забаранілі хадзіць, і, такім чынам, яны былі асуджаныя на галодную смерць. Не дазвалялася нават купляць дроваў. У верасні 1941 г. у габрэяў забралі пашпарты і выдалі замест іх пасведчанні на жоўтай паперы са штампам “Юдэ”. Мясцовая ўкраінскамоўная і польскамоўная прэса палівала габрэяў брудам.

Апавядальнік дае даволі падрабязную карціну жыцця ў гета. Туды назганялі гэтулькі людзей, што на чалавека прыпадала не больш за паўметра жылой плошчы. Пятро з роднымі (усяго шасцёра) туліліся ў адным пакойчыку. Аперазанае калючым дротам і абстаўленае вартавымі гета нагадвала канцлагер. Колькасць габрэяў у ім стала павялічвалася, бо ўвесь час з мястэчак і вёсак прыганялі новых людзей. Выходзіць з гета было дазволена толькі тым, хто працаваў, таму толькі гэтыя людзі мелі мажлівасць здабыць сёе-тое з прадуктаў у дадатак да мізэрнага рацыёну. У гета звялася нават трава, яе з’ядалі на корані. Многія насельнікі гета хварэлі на дызентэрыю і дыстрафію. Бальніцы ж у гета не было. Немачы не шкадавалі старых і дзяцей: яны мёрлі найперш. Штодня хавалі ад 100 да 150 чалавек. Заходзіць у гета маглі толькі габрэі, на ўваходзе іх абшуквала польская паліцыя. Калі знаходзілі што-кольвек забароненае, расстрэльвалі на месцы. Хлебны паёк у гета складаўся з 80 г хлеба на дзіця, 120 г — для непрацоўных дарослых, 200 г — для працуючых. Раз на тыдзень у краму “габрэйскай рады” (“юдэнсрату”) прывозілі гэты рацыён хлеба. Ды яго яшчэ й не ставала на ўсіх. У чарзе таўкліся тысячы, і сачыць за парадкам, каб хто каго не забіў за кавалак хлеба, мусіла габрэйская самаахова.

Самым страшным днём была нядзеля: не ставала вады, ежы. За тых, хто ішоў на працу, штодзень бралі ў закладнікі 300 чалавек. Калі нехта з працы не вяртаўся, то расстрэльвалі яго сям’ю і 300 закладнікаў. *“Я мог бы збегчы,* — з сумам канстатуе Пятро, — *але як падумаю, колькі народу пазабіваюць з-за мяне… Вольна выйсці адсюль было немагчыма, як і правесці акты тэрору ці сабатажу. У гета ўсе былі роўнымі. Гаварылі ціха, каб іншыя не чулі.”*

Сярод людзей панавала пачуццё безнадзейнасці. Усе ведалі, што яны асуджаныя на расстрэл. Гэта з жахам усведамляў кожны. Нават дзеці трох-чатырох гадоў гулялі толькі ў такія гульні, у якіх расстрэльвалі габрэяў. *“У нас не было аніякай надзеі. Мы на гарызонце бачылі толькі адно — смерць. У нас заставаўся толькі адзін шлях — у магілу”*, — кажа Пятро.
Ляжаць бы Пятру ў адным з незлічоных равоў, калі б у Пінск не прыехаў новы начальнік вайсковага ўпраўлення водных шляхоў Гюнтэр Круль. Гэта быў малады нямецкі афіцэр. З’явіўшыся ў горадзе, ён адразу распарадзіўся карміць работнікаў-габрэяў і выдаваць ім поўную зарплату. Рэжым памякчэў: габрэям дазволілі есці ў сталоўцы.
Пятро пазнаёміўся з Крулем, калі падлучаў тэлефон у ягоным пакоі. Тут і адбылася першая размова паміж імі. Круль пачаў з таго, што аддаў Пятру загад зняць куртку з жоўтай нашыўкай. Гэта паўтарылася і на другі дзень. На трэці раз Пётр загадзя пакінуў куртку ў калідоры. З цягам часу звычныя працоўныя кантакты перараслі ў нешта большае.
Неўзабаве Круль сказаў Пятру: *“Я хачу цябе выратаваць. Толькі не ведаю, як гэта зрабіць”*. Падумаўшы, ён прапанаваў перасяліць Пятрову сям’ю ў іншы горад: Кобрынь, Берасце ці Кіеў. Пятру не верылася ў магчымасць паратунку. Сумневы знікалі ў меру таго, як Круль распавёў пра сваю сям’ю і пра тое, што ён ужо выратаваў двух габрэяў і, каб мог, выратаваў бы ўсіх. А калі Пётра запытаўся, чаму ён хоча выратаваць яго, той адказаў: *“Ты мне казаў, што Гітлер хоча знішчыць увесь габрэйскі народ, каб праз сотні гадоў ніхто й не ведаў, што такі народ быў. Думаю, што ў сваім сэрцы ты не забудзеш сваёй габрэйскасці. Вось чаму я хачу цябе выратаваць”*. Круль казаў, што не разумее, чаму Гітлер знішчае габрэяў і іншыя народы. Гюнтэру было 25 гадоў, Пятру 19. Між імі завязалася сапраўдная дружба, яны сустракаліся кожны дзень.
У жніўні 1942 году пайшлі чуткі пра блізкую ліквідацыю гета: пра гэта гаварылі і хрысціяне, і габрэі, прыбылыя з іншых гарадоў. Пінскія габрэі жылі ў прадчуванні смерці. Пётра доўга не насмельваўся гаварыць з сям’ёй пра свой шанец ацалець. Дзень масавага забойства між тым няўмольна набліжаўся. Ужо былі знішчаны габрэі ў Дарагічыне. Круль падганяў Пятра, патрабаваў, каб ён хутчэй пагаварыў з бацькамі. Вечарам, калі

Пётр паведаміў бацькам пра магчымасць ад'езду, маці сабрала яго ў дарогу і сказала адно: *“Вельмі добра, што ты знайшоў выхад. Ратуйся”*.
На пачатку верасня 1942 году з Кіева на вайсковым караблі прыплыў унтэр-афіцэр Фругаўф, які з групай рабочых аднаўляў водную артэрыю Кіеў—Пінск. Пінск пры нямецкай акупацыі адміністрацыйна ўваходзіў у склад Украіны, і ў Кіеве знаходзілася транспартная ўправа, якой падпарадкоўваўся горад на Піне. Круль папрасіў Фругаўфа, каб той дамовіўся з начальнікам тэлефоннай сеткі Кіева зондэрфюрэрам Штойдэ аб пераводзе Пятра на працу ў Кіеў.
У кастрычніку на былым аэрадроме Пінску пачалі капаць равы. Працавалі сяляне з бліжніх вёсак. Пайшлі чуткі, што іх капаюць для габрэяў. Круль падрыхтаваў для Пятра спецыяльнае пасведчанне — начны пропуск. Цяпер яго не суправаджалі ні на працу, ні з працы. Гэтак доўжылася да 28 кастрычніка. У той дзень Пятро бачыў сваякоў у апошні раз.
Пятро з болем у сэрцы ўспамінае: той ноччу ён якраз блага спаў. А 5-й раніцы пачуліся стрэлы, звяга. Зондэркаманды і паліцыя абкружылі гета. Круль ледзьве паспеў вывесці Пятра да сябе на кватэру. Праз дзве гадзіны пасля таго, як замкнуліся дзверы гэтай утульнай кватэркі ля гмаху Калегіюму, на аэрадроме ўжо гучалі першыя стрэлы. З габрэяў пакінулі ў жывых толькі каля 150 кваліфікаваных рабочых, якія працавалі на заводзіках і ва ўстановах, што абслугоўвалі патрэбы вермахту. Пінскага гета, у якім жыло каля 28000 чалавек, не стала. *“За адзін дзень 29 кастрычніка былі знішчаны ўсе мае родзічы, мае сябры і знаёмыя і ўсё маё жыццё.”*
На працы не ведалі, куды знік Пятро. А ён з 29 кастрычніка да 22 лістапада таіўся на кватэры ў Круля. Усе надзеі былі на ліст з Кіева. *“Пэўна, Круль мог сказаць мне: я выратаваў цябе, а цяпер ідзі, куды хочаш, аднак ён так не зрабіў, хаця я нават настойваў на гэтым”*, — кажа Пятро.
22 кастрычніка Круль нарэшце атрымаў ліст з Кіева, зрабіў для Пятра новы аўсвайс на прозвішча Рабцэвіч. З таго часу апавядальнік стаў Пятром Рабцэвічам. Круль адвёў яго на вакзал, пасадзіў у вагон з нямецкімі салдатамі і на ўсякі выпадак даў пісталет.
Прыбыўшы ў Кіеў, Пятро ўладкаваўся на працу, карыстаючыся пратэкцыяй зондэрфюрэра Штойдэ. Аднойчы Пятро сустрэў

унтэрафіцэра Фругаўфа, але той зрабіў выгляд, што яны не знаёмыя.
У чэрвені 1943 г. Пятро апошні раз сустрэўся з Крулем, які быў у Кіеве. Пасля Курскай бітвы нямецкую транспартную ўправу эвакуявалі ў Польшчу. Пятро ж застаўся ў Кіеве. Калі 6 лістапада 1943 г. Кіеў быў вызвалены, ён адразу пайшоў уладкоўвацца на працу. Для гэтага неабходна было напісаць падрабязную аўтабіяграфію і запоўніць анкету для НКВД. У аўтабіяграфіі ён напісаў чыстую праўду — як з габрэя стаў славянінам — і што хоча зноў стаць габрэем. Пятро звярнуўся ў міліцыю, але яму не раілі мяняць прозвішча да вызвалення Пінску. Толькі ў 1956 г., калі наступіла хрушчоўская адліга, ён стаў Пятром Рувінавічам Рабцэвічам, пашпартным габрэем.
За год да гэтага, летам 1955 г., Пятро Рабцэвіч зноў адведаў Пінск. *“Калі я выйшаў з цягніка, у мяне было пачуццё, нібыта зямля паплыла ў мяне з-пад ног. З вакзалу Глафіра Сцяпанаўна (былая суседка) вяла мяне вуліцамі, дзе размяшчалася гета. Усю дарогу я толькі плакаў... Ісці па вуліцах, дзе хадзілі мой бацька, мая матка, мае сёстры і браты, дзе я жыў, было невыносна.”*
Пасля ён паехаў на месца, дзе габрэяў расстрэльвалі. На месцы расстрэлаў ізноў размясцілі аэрадром. Збудаваць помнік, натуральна, ніхто не даўмеўся. Толькі праз нейкі час паставілі камень з надпісам: *“Памяці 30 тысяч савецкіх грамадзян, замучаных і расстраляных нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1942—43 гадах у гэтым раёне”*. Пра тое, што савецкія грамадзяне былі ўсе габрэямі, не згадвалася. Цяпер побач стаіць новы помнік, дзе на трох мовах (беларускай, ідышы і габрэйскай) напісана, што тут былі расстраляныя больш за 22000 габрэяў (хаця іх было 28000), а таксама партызаны і палонныя.
А ў Пінску, “сталіцы гуркоў”, на месцы былога гета цяпер віруе базар. Пятро Рабінаў штогод у кастрычніку прыязжджае ў Пінск, каб ушанаваць памяць палеглых. Выратавальнік жа Пятра, Гюнтэр Круль памёр у 1979 г., а яго сям’я жыве недалёка ад Кёльну.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]

Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя:
analityka@yahoo.com
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: **06-10-2001**
[image]